Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»

# Вёскі Докшыцкага краю

*Матэрыялы па тэорыі і практыцы краязнаўчых заняткаў ва ўстановах адукацыі*

Рэцензент:
дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі» С.А.Януковіч
Укладальнік:
намеснік дырэктара дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі», кіраўнік аб’яднання па інтарэсах
“Турызм” А.У. Вайцяховіч

Рэкамендавана
педагагічным саветам дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»
«31» студзеня 2015 г., пратакол № 1

**Вёскі Докшыцкага краю** / уклад. А.У. Вайцяховіч. – ДУДА «Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі». – Докшыцы, 2015. – 365 с.

У дадзеным зборніку прапануецца вопыт работы аб’яднання па інтарэсах “Турызм” па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню праз далучэнне навучэнцаў да турысцка-краязнаўчай і экскурсійнай дзейнасці.

У зборнік уключаны матэрыялы аб гісторыі, культуры, археалогіі сельскіх паселішч Докшыцкага раёна, біяграфія знакамітых людзей нашага рэгтёна.

Адрасуецца класным кіраўнікам, педагогам-арганізатарам, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, педагогам дадатковай адукацыі турысцка-краязнаўчага і эколага-біялагічнага профіляў.

© Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі» Віцебскай вобласці

# Прадмова

Адыходжу я ад вёскі, адыходжу.
Як падумаю,
Дык сэрца зашчыміць.
Гэту страту адчувае, мусіць, кожны,
Гэта страта, мусіць, кожнаму баліць.
Хоць любоў мая да вёскі не старэе,
Толькі ўсё ж мае гады не там бягуць.
Прыязджаю,
Калі мама прыхварэе
І пляменнікі у армію ідуць.
Для цябе я —
Адыходнік твой нязлоўны,
Прызнаюся табе, вёска, не хлушу...
Заглядаю я ў вёску, як у слоўнік,
Каб упэўніцца, што правільна пішу.

*Юрась Свірка*

***ВЁСКА*** (ад старажытнарускага «весь») – у вузкім гістарычным сэнсе невялікае земляробчае паселішча, адзін з відаў сельскіх населенных пунктаў. У шырокім значэнні паняцце «вёска» ахоплівае не толькі ўсе віды сталых паселішчаў, жыхары якіх — сяляне, сельскагаспадарчыя рабочыя і інш. — заняты пераважна ў сельскай гаспадарцы, паляванні, рыбалоўстве і інш., але і ўвесь комплекс сацыяльна-эканамічных, культурна-бытавых і прыродна-геаграфічных асаблівасцей і ўмоў жыцця вёскі як сацыяльна-эканамічнай катэгорыі, якая проціпастаўляецца гораду.

Сацыяльна-эканамічная спецыфіка вёскі вызначаецца непасрэднай сувяззю яе жыхароў з зямлёй, гаспадарчым асваеннем тэрыторыі і выкарыстаннем яе прыродных рэсурсаў праз накіраваную, пераўтваральную дзейнасць у розных галінах сельскай гаспадаркі. Адсюль разгрупаванне вёскі, параўнальна невялікія памеры, сезонная цыклічнасць працы і інш. Усе бакі жыцця вёскі і сама вёска як сацыяльна-эканамічная катэгорыя перажылі значныя змены ў ходзе гістарычнага развіцця грамадства.

На Беларусі вёска — асноўны тып сельскага паселішча, на працягу стагоддзяў была хавальніцай самабытных народных традыцый, што стварала грунт для нацыянальнага адраджэння і этнічнага самазахавання беларускага народа.

Да VIII – XIX стагоддзя вёскамі былі практычна ўсе паселішчы, пакуль у выніку аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі не сталі ствараццa гарады і мястэчкі. У гэты ж час пры пераходзе ад радавой да суседскай абшчыны (грамады) з'яўляюцца асобныя сялянскія двары-сядзібы.

Да сярэдзіны XVI стагоддзя пераважала скучаная (бессістэмная) планіроўка вёскі, калі сялянскія хаты размяшчаліся асобнымі групамі. У выніку валочнай памеры пашырылася вулічная планіроўка, што стала адметнай рысай беларускіх вёсак на працягу стагоддзяў. Колькасць двароў

звычайна не перавышала некалькіх дзесяткаў. Група суседніх вёсак утварала сельскую акругу (воласць), якая вызначалася аднароднасцю насельніцтва, значным падабенствам духоўнага і эканамічнага жыцця.

Тыпалогія і вонкавае аблічча паселішчаў вызначалася асаблівасцямі таго ці іншага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі. Усё неабходнае для жыцця сялян выраблялася ў вёсцы, гаспадарка мела натуральны характар.

У феадальны перыяд вёскі былі прыватнаўласніцкія і дзяржаўныя; існаваў пазаэканамічны прымус, які даваў магчымасць землеўласнікам забіраць у сялян прыбавачны прадукт. У час спусташэнняў, выкліканых войнамі, асабліва ў XVII – XVIII стагоддзях, феадалы заахвочвалі перасяленцаў у разбураныя раёны вызваленнем ад падаткаў на некалькі гадоў, такім чынам ствараліся новыя тыпы паселішчаў — «воля», «слабада», якія потым ператвараліся ў звычайныя вёскі. Пасля адмены прыгону (1861) адбыліся істотныя змены ў жыцці вёскі, павялічыўся рух сялян у горад і на хутары.

Сталыпінская аграрная рэформа пачатку XX стагоддзя заканадаўча паскорыла працэс эвалюцыі ад сялянскай пераважна натуральнай гаспадаркі да гандлёва-рыначнай сельска-гаспадарчай вытворчасці.

У выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года паводле Дэкрэта аб зямлі была ліквідавана памешчыцкая ўласнасць на зямлю, асноўным тыпам гаспадаркі ў вёсцы стала дробная індывідуальная гаспадарка, большасць сялян была паднята да ўзроўню сераднякоў. У вёсцы праводзілася ліквідацыя непісьменнасці, ствараліся ячэйкі РКП(б) і камсамола, прафсаюзныя арганізацыі, якія вялі работу па выхаванні сялян у «пралетарскім» духу, выкараненні дробнапрыватніцкай псіхалогіі, паскаралася развіццё кааперацыі. Стварэнне буйных гаспадарак — калгасаў і саўгасаў — у выніку калектывізацыі ў канцы 1920 — пачатку 1930-х гадоў прывяло да карэннага пералому ў векавым жыццёвым укладзе вёскі. Сярод жыхароў вёскі з'явіліся механізатары, кіруючыя кадры сярэдняга звяна, павысіўся культурна-тэхнічны ўзровень сялян. Разам з тым вёска панесла вялікія страты: прынцып добраахвотнасці пры калектывізацыі, парушаўся, у выніку раскулачвання, іншых форм рэпрэсій заможныя сяляне (а таксама шмат сераднякоў) высяляліся. Агульная колькасць жыхароў вёскі ў выніку міграцый сялян у гарады СССР і па іншых прычынах зменшылася у 1930-я г. на 1 млн. чалавек.

Вялікі ўрон вёсцы быў нанесены ў гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі і спалілі 9200 вёсак (620 разам з жыхарамі), знішчылі 782,2 тысяч чалавек.

У пасляваенны час ішоў працэс адбудовы вёскі, у Заходняй Беларусі праведзена калектывізацыя. У 1960-80-я г. на аснове нарошчвання матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі вырас дабрабыт і культурны ўзровень вёскі, усё больш вёсак забудоўваліся па спецыяльных праектах. Адначасова ўдзельная вага вясковага насельніцтва скарацілася да 35%, каля 1/3 яго складаюць пенсіянеры, за апошнія 30 гадоў знікла больш як 10 тысяч вёсак.

# Анцыпары

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

У 1905 годзе, калі Анцыпары ўваходзілі ў склад Валкалацкай воласці Вілейскага павета, у ёй налічвалася 186 жыхароў (цяпер менш 20). Для Анцыпар характэрна выразная вулічная планіроўка. У даўнія часы звычайна падзелы наразаліся перпендыкулярна дарозе, што перасякала поле, і апошняя аднaчасова станавілася вясковай вуліцай. Распаўсюджанне вулічнай вёскі – важнае дасягненне рэформы ў сферы перапланіроўкі паселішчаў.

Раней ніводная сядзіба не абыходзілася без свірна (клеці) – зрубнай пабудовы, пастаўленай на камяні на некаторым узвышэнні над зямлёй, са скляпеністай столлю, зробленай суцэльным закатам. З боку ганка мелася слупавая галерэя (прыклетнік). Для нашага раёна характэрны падвоеныя клеці. Пры гэтым асноўная ўяўляла сабой зруб – чатырохсцен, а спараная – далучаны праз шулы трысцен. Такія клеці захаваліся і ў Анцыпарах.

# Асавы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце.*



**Вуліца ў Асавах.**

З\`явілася вёска на лясных расцяробах гушчару. Сяляне з навакольных вёсак прыходзілі на гэта месца, каб рашчысціць зямлю ад каранёў. Так адзін за другім яны сталі асядаць на гэтай зямлі. Будавалася жыллё, а зямля вакол яго, выцерабленая і прыгодная для земляробства, пачала засявацца. Відаць, корань слова "асяваць", "сеў", далей яго разглядаюць ў выглядах: "асеў", "асавы" што і дало назву ўзніклага паселішча.




У 2-й палавіне XIX – пачатку XX стагоддзяў Асавы вядомыя як сяло, цэнтр Асаўской воласці Барысаўскага павета. У 1863 годзе адчынена народнае вучылішча, у якім адным з першых настаўнікаў працаваў Міхаіл Туміловіч. Ён скончыў курс у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У 1886 у вёсцы знаходзілася валасное праўленне, 3 царквы, касцёл, народнае вучылішча, у якім вучылася 20 хлопчыкаў.



У 1909 годзе ў Асавах пражывае 346 чалавек. У гады грамадзянскай вайны ў 1919 годзе каля вёскі здзейснілі свой подзвіг 13 чырвонаармейцаў. Яны служылі ў складзе палка пад камандаваннем Васіля Іванавіча Чуйнова. Цаной свайго жыцця яны здолелі спыніць наступленне войск белапанскай Польшчы. На заходняй ускраіне вёскі знаходзіцца помнік гэтым чырвонаармейцам. Па словах мясцовых жыхароў, шыльдачку з помніка восенню 2008 года садралі навучэнцы школы-інтэрнат гарадского пасёлка Бягомль, калі прыязджалі сюды на палявыя работы. Аднак цяпер шыльда знаходзіцца на сваім месцы.

У пачатку 1930-х гадоў у Асавах створаны калгас “Парыжская камуна”, працавала кузня. А ў студзені 1931 года арганізавалася цяслярская арцель “Звязда”. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 15 двароў і загубілі 78 жыхароў (членаў партызанскіх сямей). В мае 1943 года появилась еще одна сожженная деревня. Вось як аб гэтым піша С. С. Максімаў ў артыкуле “Гісторыя адной здрады”, размешчанай на старонках Інтэрнэта: “Жители деревни Осовы Докшицкого района Витебской области,



узнав о приближении немцев, укрылись в лесу. Но их разыскали, согнали в сарай на окраине, заперли, подожгли и открыли стрельбу по заживо горящим старикам, детям и женщинам. К 149 хатынцам прибавилось 78 жителей Осовы”.

У цэнтры вёскі на ўшанаванне іх памяці ў 1967 годзе пастаўлена стэла.

На заходняй ускраіне вёскі знаходзіцца вясковая хата, адна сцяна якой складзена з камянёў. Гэта сцяна паступова пераходзіць у так званую агароджу, якая прымыкае да гаспадарчай пабудовы.



У лесе за паўтара кіламетра на паўночны ўсход ад Асавоў ляжыць валун ружовага граніту рапаківі з уключэннем крышталёў палявога шпату. Валун ізаметрычнага абрысу расколаты спадзіста нахіленай на паўночны ўсход трэшчынай. Верхняя яго частка адносна ніжняй ссунута на 40 сантыметраў да паўночнага захаду. Даўжыня валуна 2,2 метра, шырыня 2,1 метра, вышыня 1,3 метра (ніжняя частка ўзвышаецца на 0,55 метра). Хутчэй за ўсё, падчас раставання ледавіка гэты валун, умёрзлы ў лёд, апынуўся ў сярэдзіне двух гарызантальных слаёў таго лёду. Пры зрушэнні аднаго з слаёў (магчыма, верхняга) валун быў раздзелены на дзве часткі.

21 ліпеня 1952 года ў вёсцы Асавы нарадзіўся Дзмітрый Мікалаевіч Шыла. У 1970 годзе скончыў Мінскае сувораўскае вучылішча, а ў 1974 годзе – Арджанікідзеўскае вышэйшае агульнавайскавое вучылішча імя А. І. Яроменкі. З 1974 года па 1979 год служыў на афіцэрскіх пасадах у Групе савецкіх войскаў у Германіі. З 1979 года па 1982 год з’яўляўся слухачом Ваенна-дыпламатычнай акадэміі Савецкай Арміі, пасля чаго служыў на афіцэрскіх пасадах у воінскіх часцях Туркестанскай ваеннай акругі (СССР) і Рэспублікі Афганістан. З 1987 года па 1991 год – старшы супрацоўнік апарата ВАТ у Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспубліцы Шры-Ланка. З 1991 года – памочнік начальніка, а з 1993 года – начальнік упраўлення знешніх сувязей Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. У 1997 годзе скончыў Акадэмію ўпраўлення пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і ўзначаліў Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. У 2003 годзе назначаны на пасаду намесніка Генеральнага сакратара Савета Межпарламенцкай асамблеі СНД. Мае дзяржаўныя ўзнагароды – ордэн “Знак Пачота”, ордэн “Чырвонай Зоркі”, медаль “За баявыя заслугі”, а таксама ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, МПА СНД і МПА ЕўрАзЭс.



# Асецішча

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Упершыню Асецішча ўпамінаецца ў 1570 годзе як сяло ў Вялікім княстве Літоўскім, уладанне Тышкевічаў. Граф Васіль Тышкевіч (Цішкевіч) набыў яшчэ маёнтак Асецішча дзякуючы шлюбу з прадстаўніцай знатнага княжацкага роду Чартарыйскіх – Аляксандрай Сямёнаўнай. Пасля гэтага шлюбу пан Тышкевіч да 1528 года па велічыні сваіх зямельных уладанняў стаў сярэднім феадалам, да якіх мы ўмоўна адносім тых зямельных уласнікаў, што са сваіх маёнткаў ставілі ў войска Вялікага княства Літоўскае ад 11 да 50 узброенных коннікаў (“коней”).

У 1890 годзе была адкрыта школа, каторая знаходзілася ў прыватнай кватэры. Настаўнікам быў унцер-афіцэр Георгій Калбаса, які скончыў курс народнага вучылішча. Яго ўзнагарода ў школе складала 10 рублёў за зіму.

У 1897 годзе ў Асецішчах пражывала 300 чалавек (зараз каля 30), існавала лаўка, піцейны дом. Пасля рэвалюцыі адчынена пачатковая школа, у 1924 годзе ў ёй вучылася 29 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі. У 1933 годзе арганізавалі калгас “Чырвоны Кастрычніка”, пабудавалі кузню. У гады Вялікай Айчыннай вайны Асецішча было спалена фашыстамі. Вось як успамінае адзін эпізод з вайны ўраджэнец Асецішча Пётр Мінавіч Янкоўскі: *“…У 1944 годзе партызаны замініравалі подступы да вёскі Асецішча. Калі немцы спрабавалі ўвайсці ў гэты населены пункт, два матацыклісты падарваліся на міне. Праўда, на досвітку гітлераўцы ў вёску ўсё ж увайшлі, а мясцовыя жыхары не паспелі ўцячы ў лес. 17 вяскоўцаў немцы пастроілі ў рад, зрабілі тры шчэпкі са стаячых побач людзей і пагналі на міны. Тыя, хто ішлі першымі, адразу загінулі. Мой бацька трапіў у шпіталь у горад Лепель. Да яго ў шпіталь прыйшлі сыны Міхаіла Кургеля (сам М. Кургель перайшоў да немцаў і паехаў з імі, а яго сыны ўступілі ў Армію Краёву) і сказалі, каб яго сын, гэта значыць я, прыйшоў да іх, інакш бацьку расстраляюць у першую чаргу. Бацьку тады ўдалося ўцячы, і толькі пасля вайны, калі мы з ім сустрэліся, ён расказаў мне эпізод пра міны”.*



Старажытныя могілкі ў Асецішчы

У ваколіцах Асецішча знаходзяцца два гарадзішчы. Адно гарадзішча знаходзіцца ў 300 метрах на ўсход ад вёскі, у лесе, пры ўпадзенні ракі Сергуч у Асеціцкае (Вольшыцкае) возера, ва ўрочышчы Крайская зямля. Умацавана валам і ровам. Пляцоўка памерам 57×46 метраў. Знойдзены фрагменты глінянага посуду, косці жывёл, кавалкі шлаку. Адносіцца да днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур (3-4 ст.).

Другое гарадзішча размешчана за 3.5-4 кіламетры на захад ад вёскі, на высокім узгорку

“Замак” каля былога хутара Кадлубішча. Пляцоўка памерам 71×57 метраў. Культурны пласт захаваўся па краях пляцоўкі.знойдзены фрагменты глінянага посуду, косці жывёл, кавалкі шлаку. Адносіцца да днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур (3-4 ст.).

Недалёка ад вёскі знаходзіцца возера Вольшыца. Яго плошча амаль 4 квадратныя кіламетры. Найбольшая глыбіня складае 2,7 метра. Даўжыня возера 3,32 кіламетры, а шырыня – 1,9 кіламетра. Даўжыня берагавой лініі 9,75 кіламетра. Аб’ём вады каля 5 млн. м³. возера належыць басейну ракі Сургуч (працякае праз возера). Схілы катлавіны і берагі нізкія, забалочаныя. Дно плоскае, выслана сапрапелем, месцамі ілам. Празрыстасць вады дасягае дна. Вольшыца моцна зарастае.


**Н.П. Хадасевіч-Лежэ. Аўтапартрэт**

У Асецішчы 5 лістапада 1904 года нарадзілася вядомая мастачка Хадасевіч-Лежэ Надзея Пятроўна. У 1-ю Сусветную вайну сям’я Хадасевічаў знаходзілася як бежанцы ў Горным (Украіна), потым Бялёва (Расія). Там наведвала школу, мастацкі і балетны гурткі. Потым стала студэнткай Вышэйшых дзяржаўных мастацкіх майстэрняў у Смаленску, дзе выкладаў Казімір Малевіч. Захапіўшыся творчасцю французскага жывапісца і графіка Фернана Лежэ, вырашыла пераехаць у Францыю. Аднак жыццёвыя абставіны прымусілі некалькі гадоў правесці ў Варшаве, дзе працавала кухаркай, прыбіральшчыцай, нянькай, мадысткай у капялюшным салоне. У 1921-24 гадах вучылася ў школе прыгожых мастацтваў у Варшаве. У хуткім часе выехала ў Парыж, працягвала вучобу ў Акадэміі жывапісу Ф. Лежэ да 1929 года. Стала выдаваць часопіс “Сучаснае мастацтва” на польскай і французскай мовах. З 1940 па 1944 гады была ўдзельніцай руху Супраціўлення. Пасля вайны выйшла замуж за Ф. Лежэ.

Надзея Пятроўна аўтар многіх мазаічных партрэтаў, кампазіцый для аэрапортаў у Парыжы і Вашынгтоне. Стварыла музей Ф. Лежэ ў Б’ёце (Прыморскія Альпы, 1960) і на радзіме мастака ў Лізоры (Нармандыя, 1970). Мела персанальныя выставы ў Маскве, Мінску (1972). Падаравала Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі вялікую колькасць злепкаў і рэпрадукцый шэдэўраў сусветнага мастацтва, твораў Ф. Лежэ і ўласных работ. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), Ганаровага легіёна Францыі. Памерла 8 мая 1983 года.

Дзесьці ў 1845 годзе ў маёнтку Асецішча нарадзіўся Любінскі (Любянскі) Фелікс Мацей Аўгусцінавіч. Дваранін. Па канфірмацыі М.М. Мураўёва ад 29 ліпеня 1863 года за ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў

аддадзены на ваенную службу без пазбаўлення правоў. Быў залічаны радавым у былы 5-ы, пазней 1-ы (на 1873 год) Заходне-Сібірскі вялікага князя Уладзіміра Аляксандравіча батальён. У 1867 годзе ў сувязі з немагчымасцю далейшага выканання вайсковай службы пераведзены ў цывільнае ведамства. Застаўся на жыхарстве ў горадзе Омск. Дзякуючы хадайніцтву сястры Адэлаіды Аўгусцінаўны Крайскай атрымаў дазвол на вяртанне на сталае месца жыхарства. 15 ліпеня 1873 года выбыў у Лепельскі павет, дзе пражывала сястра. У жніўні 1873 года атрымаў дазвол вярнуцца ў Асецішча Барысаўскага павета.

Листовка бригады РОНА к партизанам

В деревне Осетище Бегомельского района вами была издевательски избита шомполами пожилая женщина Новицкая, которая, кроме своей печки, ничего не знала и не видела. Этот факт подтвержден медицинским освидетельствованием, и о нем очень «мило» отзываются мирные жители не только у вас, но и здесь. Акт помещен в печати, где вы» можете узнать подробности. Подтвердить его может выродок рода человеческого, махровый бандит, находящийся у вас в большом почете, командир 6 бандитского отряда бригады Железняк, производивший экзекуцию собственноручно.

# Асінавік

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Асінавік вядомы з 2-й паловы XVII стагоддзя, каля яшчэ ўваходзіў у склад Мінскага павета Рэчы Паспалітай. На той час вёска належала Хмялеўскім. З 1793 года ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі. У 1909 годзе ў Асінавіку пражывала 144 чалавекі (зараз каля 30). У гады Вялікай Айчыннай вайны была спалена немцамі.

За 0,5 кіламетра на паўночны захад ад Асінавіка, ва ўрочышчы Гарадок, або Замак знаходзіцца гарадзішча. Паводле мясцовых паданняў тут закапаны тры брычкі з грашыма. Пляцоўка гарадзішча 56×52,5 метра ўмацавана дзвюма кальцавымі валамі і равамі, з напольнага (паўночнага) боку – трэцім валам. Знойдзены абломкі глінянага штрыхаванага посуду, абпаленыя камяні, косці жывёл, кавалкі шлаку. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі (3-4 ст.).

Бліжэй да вёскі Сасновая знаходзіцца могільнік (магілы-жальнікі) позняга сярэдневякоўя (XVI-XVIIст.). Ва ўрочышчы Каралёў Стан, у лесе, паміж вёскамі Сасноўка і Асінавік, каля дарогі, на месцы вельмі старадаўняга могільніка стаяў каменны крыж. У сяродкрыжы высечана схематычная выява чалавека з каронай на галаве, мячом у правай руцэ і шчытом у левай. Унізе лацінскія літары "RSB", якія даследчыкі чытаюць як "Rex Stefan Batoru"("кароль Стафан Баторый" ). Ніжэй два кругі – адзін у адным. Па баках папярочкі высечаны крыжыкі. Гэты старажытны выраб звалі "Крыж Стафана Баторыя", або Каралеўскі камень. Паводле паданняў, на гэтым месцы абедаў кароль Стафан Баторый, і кругі азначаюць міску.



Паводле яшчэ аднаго падання, каля крыжа ў 1812г. французы закапалі нарабаваныя ў Расіі каштоўнасці. У 1988г. крыж Стафана Баторыя быў перавезены ў Мінск у Парк камянёў.

У ваколіцах Асінавіка бярэ пачатак невялічкая рака Дзяражына. Яе даўжыня складае 5,5 кіламетраў. Рака з'яўляецца правым прытокам ракі Поня (басейн Дняпра).

У 1971 годзе з Асінавікам аб'ядналася вёска Асінаўскія Навасёлкі.

16 сакавіка 1896 года ў Асінавіку нарадзіўся Мальчык Уладзімір Нічыпаравіч – генерал-маёр авіяцыі (1940). Удзельнік грамадзянскай вайны. У арміі з 1915 года, у Чырвонай Арміі з красавіка 1918 года. У 1918-23 гадах служыў на Паўночным і Заходнім франтах у якасці лётчыка, а потым стаў начальнікам аддзела, памочнікам начальніка штаба ВПС фронту. У 1926 годзе скончыў Ленінградскую школу лётчыкаў-назіральнікаў, а ў 1935 годзе Ваенную акадэмію імя Фрунзе. У Вялікую Айчынную вайну з’яўляўся намеснікам начальніка штаба ўпраўлення ВПС Архангельскай ваеннай акругі і Закаўказскага фронту. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1946 года ў адстаўцы. Памёр 25 студзеня 1965 года.

# Асінікі

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

Ёсць каля вёскі, былая панская сяліба. Назву сваю Парневічы атрымала яна па прозвішчу пана Парневіча, які валодаў тамашнімі землямі.

Было гэта не вельмі даўно. У панскай сям'і расло трое дзяцей: дзве дачкі і сын. А парабкамі ў маёнтку служылі мясцовыя сяляне. Здарылася так, што адна з дачок пана Парневіча, Магдэля, пакахала простага парабка. Хлопец таксама яе кахаў. Але пажаніцца яны не маглі. Даведаўся пра гэта пан Парневіч і адправіў хлопца ў салдаты, дзе той трагічна загінуў. Даведалася пра гэта панская дачка Магдэля і не змагла змірыцца, не захацела жыць без каханага. Выйшла яна цёмнай ноччу з маёнтка, адыйшла трохі ў лес, ды і засталася там назаўсёды – павесілася. Гавораць, што дух яе назаўсёды пасяліўся ў тых мясцінах і з'яўляецца па начах на месцы былога маёнтка. А хто запозніцца часам і ўначы ідзе недалёка ад гэтага месца, то можа пачуць розныя таямнічыя гукі. Кажуць: гэта маладая паненка прыходзіць на панскі двор і шукае кагосьці. Але яе ніхто не бачыў.

Ходзіць сярод людзей і такое павер'е, што адзін раз у дзесяць год апоўначы месячнай ноччу з'яуляецца яна каля вёскі. І вось яе тады можна ўбачыць. Яшчэ кажуць, яна нібы спрыяе закаханым. Таму, на каго яна паглядзіць, выпадае шчасце.

А панская сям'я пасля Магдэлінай смерці хутка выехала ў Польшчу, бо, кажуць, здань паненкі кожную ноч прыходзіла да старога Парневіча. Не змог ён выносіць гэтага, але ў Польшчы пажыў нядоўга.

Другая паненка хацела выйсці таксама за парабка. Стары Парневіч даў згоду, ды зрабілася ёй нешта з галавой, памуціўся розум. Дык той хлопец сам адказаўся ад жаніцьбы.

А гадоў дзесяць назад прыязджаў у Асінікі сын былога пана, стары чалавек. Захацеў перад смерцю родныя мясціны пабачыць.

Зараз у вёсцы пражывае каля 15 чалавек.

# Атрахімаўка

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*



**Ля Атрахімаўкі**

Першыя вядомыя звесткі пра вёску датуюцца XIX стагоддзем. У той час гэта быў фальварак, у якім пражывала 8 жыхароў (зараз каля 20).

У час паўстання ў 1863-64 гадах пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага ў Атрахімаўцы адбылася цікавая падзея. У красавіку 1863 года ў фальварку спыніўся адзін з паўстанцкіх атрадаў. Другі пайшоў у Вольберавічы. Атрахімаўку паўстанцы абралі таму, што яе цівун Банадысь Мікульскі быў у іх складзе. Бягомльскі святар Сымон Нячаеў праз свайго чалавека даведаўся, што паўстанцы запланавалі 20 красавіка напасці на Докшыцы і разбіць там роту царскіх войскаў. Нячаеў напісаў "водзыў" ротнаму камандзіру і адправіў паперу на тройцы з сельскім старастам. Паўстанцы са свайго боку сачылі за паводзінамі Нячаева і старасты і наладзілі засаду, каб затрымаць веставога. Аднак той паспеў праскочыць. Сутычкі гэтага атрада з царскімі войскамі не адбылося.

# Атрубак

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Вёска вядома з канцы XVI стагоддзя, калі ўваходзіла ў склад маёнтка Беразіно, уласнасць Пацаў. З 1793 года вёска ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі. У 1884 годзе адкрыта школа. На пасаду настаўніка быў прызначаны селянін з Загалаўя Якаў Ралавец, які скончыў на той час Бярэзінскае народнае вучылішча. У школе навучаліся 15 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. На 1897 год у Атрубку пражывае каля 520 чалавек, дзейнічае царква і хлебазапасны магазін. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена немцамі. Зараз тут пражывае каля 50 жыхароў.

У Атрубку ў 30-я гады XX стагоддзя пражываў селянін Уладзімір Мікалаевіч Кішулька. На ягоным прыкладзе можна даведацца, якія абсурдныя абвінавачванні прад'яўляліся людзям у часы сталінскіх рэпрэсій: *"...оперуполномоченный Докшицкого РО НКВД БССР младший лейтенант Ходариков И.П., рассмотрев поступившее в НКВД БССР материалы о преступной деятельности Кишулько В.Н., нашёл: что Кишулько В.Н. в 1935 году перешёл государственную границу из бывшей Польши в СССР, где и был Особым совещанием осуждён и сослан в Особый лагерь ОГПУ "Серово", но в этом же году из лагеря бежал, перешёл границу из СССР в Польшу, при побеге унёс с собой ватнюю куртку и сапоги. Числится в розыске.*

12 мая 1941 года гражданин Кишулько В.Н. был осуждён на 8 лет исправительно-трудовых лагерей и для отбытия срока направлен на станцию Владивосток".

У 1964 годзе ў вёсцы Атрубак знойдзены клад, які складаўся з некалькі соцень манет (1,5-грашовікі Рэчы Паспалітай, талер Злучаных Правінцый, білон, серабро). Датуецца клад 1694 годам. Дарэчы, гэты клад выкапала свіння. У цэлым, у Беларусі тройчы фіксаваліся "свінячыя клады". У 1921 годзе на акраіне Слуцка свіння вывернула з зямлі гаршчок з лівонскімі і галандскімі манетамі XVII стагоддзя. Падобная гісторыя паўтарылася ў 1961 годзе ў вёсцы Вёска Старобінскага раёна, дзе жывёліна выкапала літоўскія і польскія манеты XVII стагоддзя.

# Атрубак

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Па дарозе ў Маладзечна
Месца ёсць, якое вечна,
І ў думках і ў сне
Не дае спакою мне.
Месца гэта блізка-блізка,
З мамай звязана, з калыскай,
У душы маёй і сэрцы
Будзе жыць да самай смерці.
Атрубак – дзяцінства вёска,
Жыцця светлая палоска,
Мае родныя мясціны.
Засталіся ўспаміны.
Апусцеў і дом, і сад,
І ўсё пайшло на спад,
А на дзверы ў мой куток
Смерць павесіла замок.

Цяпер цёмная палоска
Ахінула маю вёску.
Як няўмольна час бяжыць!
Няма каму ў вёсцы жыць.
Палавіна пустых хат,
І не вернуцца назад
Яе людзі з таго свету,
Песня іх ужо дапета.
Ля дарогі стаіць хата,
У ёй калісьці небагата
Жылі родныя мне людзі.
Так было, так вечна будзе:
Хата ёсць, бацькоў няма,
Сіратой глядзіць яна.

*Ніна Мілюкова*

Пра назву вёскі існуе адна неверагодная легенда. Раней людзі пераязджалі з аднаго месца на другое з дапамогай коней ці валоў. На валах, у асноўным, ездзілі паны. Адзін мясцовы пан вельмі шкадаваў свайго вала. Калі трэба было падагнаць вала, ён біў яго па хвасце.

І вось аднойчы пан так лупянуў вала па хвасце, што той адваліўся. Мясцовасць, дзе гэта здарылася, сталі называць – Атрубак.

Сама вёска вядома з XIX стагоддзя. У 1892 годзе адчынена тут школа царкоўнай граматы. У 1905 годзе ў гэтай мясцовасці знаходзіліся тры аднаіменныя паселішчы: вёска Атрубак (287 жыхароў), сяло Атрубак (37 жыхароў) і фальварак Атрубак (уладанне Савіцкіх, 11 жыхароў). У гады Вялікай Айчыннай вайны вёску спалілі фашысты. Зараз у ёй пражываюць каля 65 чалавек.

# Бабцы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1884 годзе ў Бабцах адкрылася школа граматы для хлопчыкаў (15 чалавек). Настаўнічаў у ёй унцер-афіцэр Максім Камінскі. Яго ўзнагарода складала 15 рублёў за зіму. Закон Божы выкладаў свяшчэннік П. Васюковіч.

У 1897 годзе Бабцы ўваходзілі ў Бягомльскую воласць Барысаўскага павета Мінскай губерні. На той час тут налічвалася 495 жыхароў. У 1915 годзе адчынена народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу.

У маі 1943 года намецка-фашысцкія акупанты спалілі ў Бабцах 78 двароў і загубілі 29 жыхароў. Зараз у вёсцы пражывае каля 100 чалавек.

Каля вёскі, пры дарозе на вёскі Кальнік і Гарадзёнка, знаходзіцца камень з загадкавым надпісам. Згодна з паданнем, камень пастаўлены на магіле нейкага забітага чалавека. Аднойчы нібыта спрабавалі зрушыць яго з месца, запрэглі 10 коней, але так і не скранулі.

А яшчэ быў паміж вёскамі Бабцы і Бераснёўка Залуцкі камень. У 1812 годзе французскія войскі ішлі вайной на Маскву праз Беларусь. Усе заможныя жыхары ўцякалі ў Маскву і нават далей. Варожыя войскі паланілі маладых дзяўчат, забівалі старых, забіралі хатнюю жывёлу. У гэтай мясцовасці жыла прыгажуня Марфа са сваім бацькам. Яны былі заможныя жыхары, шляхта. На іх працавала многа бедных людзей. Марфа з бацькам шчыра дзякавалі тым людзям, якія сумленна выконвалі іхнія загады. Нікога не пакрыўдзілі. Каб зберагчы сваё багацце, яны аддалі сялянам закапаць іхняе золата пад самы вышэйшы камень. Залуцкія (такое ў іх было прозвішча) спадзяваліся, што пасля заканчэння вайны яны вернуцца. І дастануць сваё багацце. Але шляхам на Маскву яны, відаць, загінулі. Мясцовыя жыхары былі вельмі сумленныя людзі і таму не чапалі чужога. У пяцідзесятыя гады жыхар вёскі Бабцы Аляксей спрабаваў дастаць золата. Колькі не капаў ён пад камень – нічога не атрымлівалася. Урэшты камень стаў на метр ніжэйшы. Пасля гэтага Аляксей нечакана памёр. Людзі пачалі казаць, што камень зakляты.

У пачатку дзевяностых другі жыхар вёскі Бабцы Васіль пры дапамозе магутнага крана здолеў забраць камень і распілаваў яго на помнікі. Але і яго пакрыўдзіў камень. Каля горада Кіеў ён трапіў у аўтамабільную катастрофу. Толькі дзякуючы медыкам з Бараўлян ён застаўся жывы.

Цяпер мясцовыя людзі кажуць, што чужое дабро шчасце чалавеку не прынясе. Было пад тым каменем золата ці не было, сёння пра гэта ніхто не ведае. Адно бясспрэчна, камень помсціў чалавеку за парушаны спакой.

# Барсукі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Па ўсіх мясцовых легендах лічыцца, што назва вёскі паходзіць ад жывёліны Барсука, якіх было шмат на берагах тады яшчэ паўнаводнай рэчкі Галядза (левы прыток ракі Сэрвач, басейн Віліі). Даўжыня гэтай ракі цяпер складае толькі 24 кіламетры і бярэ пачатак на паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі. Цікава, што раней раку называлі Балядка. Потым у савецкія часы назву змянілі. Толькі ў канцы 1990-х гадоў рацэ вернута гістарычная назва.

Пры прыгонным праве зямлёй гэтай валодаў пан Зубрыцкі. У 1864 годзе выйшаў указ цара аб надзеле сялян зямлёй за выкуп.

У 1870 годзе маёнтак Барсукі належаў Пржэсмыцкаму. Вёскі маёнтка (1870): Падомхі, Барсукі, Азарцы, Карпаўка. Пазней зямля, хутчэй за ўсё, распрададзена. Цэнтр маёнтка знаходзіўся пры дарозе Докшыцы – Крулеўшчына. Захаваліся пасадкі дрэў вакол былога маёнтка.

У 1920 годзе ў Барсуках адкрыта прыватная школа, у якой настаўнічала Коган Елізавета Васільеўна. Яна працавала дома, прадметы выкладаліся на беларускай мове. У 1921 годзе школу закрываюць. У кастрычніку 1921 года была адкрыта польская школа ў сялянскай хаце ў старой частцы вёскі.

Цікавасць выклікае і аднапавярховы драўляны будынак, збудаваны ў форме літары Г, хутчэй за ўсё, напрыканцы 1930-х гадоў (ёсць меркаванне, што яе пачалі будаваць у 1936 годзе, а ў 1938 годзе школа прыняла першых вучняў), калі пасля смерці Пілсудскага па яго распараджэнню на “Крэсах Усходніх” было ўзведзена каля 300 школ. З’яўляецца тыповым будынкам характэрнага для тых часоў “закапаскага стылю”, у якім узведзена шмат пабудоў на тэрыторыі Віленскага ваяводства. У гады Вялікай Айчыннай вайны школа захавалася толькі таму, што тут была штаб-кватэра нямецкіх войскаў.



З 1921па 1939 год Барсукі ўваходзяць у склад Польшчы. У 1929 годзе 51 дзесяціна ў Барсуках – уласнасць Фердынанда Яцыны (Новаполле).

У 1941 годзе ўтвораны калгас імя Чапаева, які ў 1949 годзе пераіменаваны ў калгас “Камсамолец”. У 1971 годзе з Барсукамі зліваецца сумежная вёска Астраўлянка. У гэтым жа годзе ў Барсуках устаноўлены помнік на ўшанаванне 105 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1973 годзе ў Барсукі перасяліліся жыхары з вёсак Кірціна і Цімашова.



Калісьці каля Барсукоў стаяў вялікі каменны крыж, але ў 1970-я гады пры пашырэнні дарогі яго скінулі ў канаву і засыпалі.

# Баяры

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Першае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1897 года. У пачатку XX стагоддзя ў Баярах пражывала 336 жыхароў. У 1923 годзе адчынена пачатковая школа, у якой першым настаўнікам працаваў Іван Бацэка. Зараз у Баярах пражывае каля 50 чалавек.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Баярах начальнік медыцынскай службы партызанскай брыгады "Жалязняк" урач Васілій Іванавіч Ляшчынскі развярнуў рухомы шпіталь. Сюды звозілі для адпраўкі за лінію фронту раненых з другіх абласцей і раёнаў.

8 ліпеня 1941 года ў Баярах нарадзіўся Беларускі педагог, заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі (1994) Гайдук Аляксандр Іванавіч. Аляксандр Іванавіч скончыў Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт, дзе ў 1965-80 гадах працаваў спачатку загадчыкам лабараторыі, асістэнтам кафедры сухапутнага транспарту, лесу і дарожных машын, старшым выкладчыкам гэтай кафедры, а потым намеснікам дэкана лесаінжынернага факультэта. З 1980 па 1986 гады ў Мінскім палітэхнікуме займаў пасаду намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце, з 1986 гада дырэктар Мінскага тэхналагічнага тэхнікума (з 1999 года Мінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж). Аўтар навуковых прац у галіне праектавання будаўніцтва і эксплуатацыі дарог.



На заходняй ускраіне Баяр бярэ пачатак рака Студзёнка, правы прыток Бярэзіны (басейн Дняпра). Даўжыня ракі Студзёнка 14 кіламетраў, трэцяя яе частка каналізаваная.

# Баяры

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце*

Дакументальныя звесткі пра Баяры адносяцца да XIX стагоддзя. У 1901 годзе тут адчынена школа царкоўнай граматы. З 1921 года па 1939 год вёска ўваходзіла ў склад Польшчы. Каля вёскі ў тыя гады знаходзіўся аднаіменны фальварак.

У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 20 двароў і загубілі 13 жыхароў. У 1949 годзе тут быў арганізаваны калгас імя Дзяржынскага. Зараз у Баярах пражывае каля 15 чалавек.

# Бедзіна

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Бедзіна вядома як маёнтак у Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе маёнтка створана вёска. У 1933 годзе тут быў створаны калгас, працавала кузня. Зараз у Бедзіна пражывае не больш 10 чалавек.

Недалёка ад вёскі ва ўрочышчы Галодныя могілкі знаходзіцца могільнік (магілы-жальнікі). Яны адносяцца да позняга сярэдневякоўя (XVI – XVIII).

У гады Вялікай Айчыннай вайны, адразу пасля ўварвання немцаў у Бягомль, некаторы час у Бедзіна жыў з сям'ёй будучы камісар партызанскай брыгады "Жалязняк" Герой Савецкага Саюза Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч. Месца ён падабраў падыходзячае. Вёска знаходзілася ў лясной мясцовасці, далёка ад вялікіх дарог. Да таго ж у Бедзіна пражывалі блізкія родзічы жонкі – маці і сям'я брата. Аднак Манковіча ўсюды шукалі карнікі. У розных месцах былі развешаны плакаты, дзе прапаноўвалася вялікая сума грошай за яго галаву. Знайшоўся адзін здраднік, які выдаў месцазнаходжанне Манковіча. Немцы тэрмінова выслалі ў Беразіно карны атрад, які павінен быў зрабіць аблаву ў Бедзіна. Перад тым, як выступіць, камандзір гэтага атрада выклікаў да сябе старастаў некалькіх вёсак у якасці праваднікоў. Сярод старастаў быў свой чалавек – Лявон Янкоўскі. Ён, саслаўшыся на хваробу, адправіўся дадому. А дома пасадзіў на каня сувязнога, даў яму запалкі, як умоўны знак, і загадаў хутка іх даставіць у Бедзіна Манковічу.

Толькі на 15 хвілін сувязны апярэдзіў карнікаў. Калі яны акружылі вёску, у ёй ужо нікога не было – ні падпольшчыкаў, ні жыхароў. Тады начальнік нямецкага атрада загадаў спаліць вёску. Але гэтаму запярэчыў камендант аховы маста праз раку Бярэзіна. Бедзіна было прыпісана да яго гарнізона для забеспячэння харчаваннем. Аднак гітлераўцы не пакінулі вёску без нагляду. Яны спалілі ўсе аддалённыя пабудовы, якія размяшчаліся каля лесу.

А вось яшчэ адзін эпізод з ваеннай гісторыі вёскі. 30 жніўня 1943 года вораг сіламі батальёна ў 9:30 павёў наступленне на вёску Бедзіна. З узлеску, што перад вёскай, немцы абстралялі з батальённых мінамётаў і кулямётаў населенны пункт. У гэты час у Бедзіна знаходзілася аддзяленне другой роты В.А. Краўцова. Партызаны абстралялі праціўніка, а потым адыйшлі ў бок Федаркоў. Немцы занялі вёску, а калі пакідалі яе, прыхапілі 10 кароў, некалькі коней і спалілі чатыры хаты. Дарэчы, для абароны Бедзіна ў Федарках па трывозе была паднята другая рота, якая фарсіраванным маршам праследавала ворага.

# Беразіно

*Цэнтр сельскага Савета*

Назва вёскі паходзіць ад ракі Бярэзіна. Але існуе і другая легенда. Жыў у адной мясцовасці адзін мужык – Архіп. Вялікі гультай быў. Усе з яго смяяліся, калі ён спаў у полі, замест таго, каб рабіць работу. Жонка кожны дзень яго папракала. І вось яна яго рашыла прывучыць. Паслала яна Архіпа ў ноч пасвіць каня. А каб мужык не заснуў – разам з ім адправіла старэйшага сына. Прыйшлі бацька з сынам на луг. Бацька загадаў сыну аднаму пасвіць каня, а сам заваліўся спаць. Але і сын не сумеў дагледзіць жывёліну. Задраў яе воўк. Спужаўся Архіп, што жонка яго зусім са свету зжыве. Адправіў сына дадому, а сам пайшоў, куды вочы глядзяць. Па дарозе са злосцю размахнуўся і як лупянуў нагой у купіну. А ад туль пасыпаліся залатыя манеты. Прынёс Архіп скарб дадому і яшчэ з парога заявіў:

- Ты, жонка, як хочаш, але я куплю і той кавалак зямлі, дзе мне сёння пашанцавала. Хоць там і беразно, але хочацца, каб памяць засталася.

Разбагацеў Архіп. Усе свае шматлікія вялікія будынкі паставіў ля таго самага лугу, у тым самым беразняку. Людзі ўжо сталі зваць той хутар – Беразном, ад яго ж слова. Потым, з цягам часу, перайначылася назва і зрабілася – Беразіно, але гэта было значна пазней, калі цэлае паселішча на тым месцы вырасла. Да гэтага часу жывуць тут нашчадкі таго гультая Архіпа, але яны, у адрозненне ад далёкага продка, працалюбівыя.

У дакументальных крыніцах упершыню паселішча Беразіно ўпамінаецца як сяло ў пацвярджальнай грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскае Вітаўта, выдадзенай 13 студзеня 1407 года віленскаму ваяводзе Войцеху Манівіду. У розныя часы належала Манівідам, Судзімонтавічам, Гальшанскім, Чартарыйскім, Тышкевічам, Пацам, Тавянскім. У канцы XVI стагоддзя пры Пацах стала мястэчкам, цэнтрам вялікага маёнтка.

У 1682 годзе Канстанцый Пац заснаваў тут драўляны касцёл і манастыр бернардзінцаў. Комплекс да нашага часу не збярогся, але яго выява вядома па піктаграфічнай карце бернардзінскіх манастыроў у Вялікім княстве Літоўскім, выгравіраванай у 1760-я гады і надрукаванай у 1787 годзе. Згодна ёй, касцёл уяўляў 3-нефавую базіліку, да якой з паўднёвага боку далучаўся 2- павярховы П-падобны кляштар. Уваход быў аформлены вялікім арачным парталам. Да тарца паўднёвага бакавога нефа



асіметрычна прылягала адна высокая вежа, якая складалася з чатырох ярусаў чацверыкоў аднолькавага сячэння. Вежу ўвенчваў невысокі самкнёны 4-гранны купал. Працаваў касцёл да 1832 года. У 1832 годзе царскія ўлады зачынілі кляштар, а пад канец XIX стагоддзя адабралі касцёл і зрабілі з яго яшчэ адну праваслаўную царкву. У 1910-13 гадах каталікі збудавалі новы касцёл. Аднак пасля ўсталявання Рыжскага міру Беразіно апынулася на савецкай тэрыторыі. У 1922 годзе каталіцкая парафія ўжо не мела святара.

У 1856 годзе ў Беразіно адкрылася царкоўна-прыходская школа, дзе настаўнікам быў дзяк Антон Ржэцкі. А ў 1863-73 гадах пабудавана новая праваслаўная царква на сродкі прыхаджан і дзяржаўнага казначэйства. З 1869 года тут адкрыта народнае вучылішча. Яно ў асноўным утрымлівалася на сродкі мясцовай грамады і часткова казны. Размяшчалася ў арандаваным грамадскім будынку. У 1874 годзе з дзяржаўнага казначэйства было выдаткавана 70 рублёў 20 капеек, а ад сялянскай абшчыны – 110 рублёў 80 капеек. Настаўнікам працаваў выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Сцяпан Гомза, законанастаўнікам праваслаўнага спавядання быў свяшчэннік, выхаванец Мінскай духоўнай семінарыі Лука Антонавіч Багданоўскі.




У 1886-87 навучальным годзе для вучылішча было адпушчана з дзяржаўнага казначэйства 64 рублі 20 капеек, а ад мясцовай сялянскай абшчыны – 259 рублёў 46 капеек. Вучыліся 52 школьнікі (з іх 3 дзяўчынкі). Настаўніцай у гэты час працавала Сцепаніда Віктараўна Сіткевіч, якая скончыла Парыцкае духоўнае жаночае вучылішча. Законанастаўнікам праваслаўнага спавядання быў свяшчэннік Іван Стаяновіч. Дарэчы, у 1884 годзе Іван Стаяновіч звяртаўся да ўлад з прапановай аб адкрыцці ў Беразіно зноў царкоўна-прыходскай школы. Стаяновіч аргументаваў сваю просьбу тым, што ў воласці, дзе пражывала 4412 чалавек, аднаго вучылішча недастаткова. Размясціць школу планавалася ў свабодным пакоі, які меўся ў памяшканні вучылішча. Настаўніца Сцепаніда Сіткевіч дала на гэта згоду, але дырэкцыя народных вучылішч Мінскай губерні вырашыла пытанне па-іншаму. Палічыўшы, што ў Беразіно на 610 душ абодвух полаў ужо ёсць навучальная ўстанова, школу адкрылі ў Атрубку.

У 1900-1901 навучальным годзе ў вучылішча прыйшло яшчэ больш вучняў – усяго 60 школьнікаў (у тым ліку 10 дзяўчынак). Іх настаўніцай па-ранейшаму была С.В. Сіткевіч, але жалаванне яе стала вышэйшым – 240 рублёў, ссыпкі на 30 рублёў, кватэра.

У 1897 годзе ў Беразіно пражывала 785 чалавек (зараз каля 500). Было тры лаўкі, дзве царквы, народнае вучылішча, два хлебазапасныя магазіны, карчма, валасное праўленне, адбываліся тры кірмашы на год. Пасля Польска-Савецкай вайны Беразіно стала памежнай вёскай, у якой для аховы дзяржаўнай мяжы быў створаны пагранічны атрад. А з 20 жніўня 1924 года Беразіно стала цэнтрам сельскага Савета. У наступны год будуецца смалакурны завод, а ў 1928 годзе заснаваны паравы млын. У 1933 годзе арганізаваны калгас “Чырвонае Беразіно”, дзейнічала лесапілка, сукнавалка, кузня. У 1936 годзе створана МТС.



У чэрвені 1942 года са 176 двароў гітлераўцы спалілі 170 і загубілі 7 жыхароў.

Паколькі Беразіно знаходзіцца на стратэгічным напрамку на дарозе Докшыцы – Лепель, тут адбылося шмат падзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. У лістападзе 1942 года ў вёсцы некаторы час базіраваўся штаб партызанскай брыгады “Жалязняк”.

У пачатку мая 1943 года карнікі зверскі замучылі і павесілі двух партызан – Завайчынскага Пятра Ягоравіча і Кульба Васіля Сцяпанавіча. Нягледзячы на забарону немцаў дапамагаць партызанам, гэтыя мужныя людзі прыносілі ім вопратку, прадукты харчавання, а то і самі ўдзельнічалі ў баявых аперацыях. Віселіцы фашысты ўстанавілі на перакрыжаванні дарог Лепель – Докшыцы і Атрубак – Бягомль. Зараз на гэтым месцы стаіць помнік воінам і партызанам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мясцовыя жыхары пахавалі потым гэтых людзей на бярэзінскіх могілках.



У 1957 годзе быў пабудаваны новы будынак школы на 280 месцаў.

У цэнтры вёскі каля дарогі ў 1968 годзе пастаўлена стэла на ўшанаванне памяці 67 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

Летам 2012 года ў Беразіно асвечана праваслаўная царква Святога Духа. У храм перабудавалі вясковую краму, якую вернікам аддалі задарма. Грошы на будаўніцтва збіралі мясцовыя жыхары, шмат дапамог мясцовы фермер Васіль Мацкевіч. Першую Літургію адслужыў тумілавіцкі настаяцель Пётр Іоська. Гэта першая хрысціянская святыня,



збудаваная ў Беразіно за перыяд незалежнасці. Мінулыя семдзесят год на тэрыторыі Бярэзінскага сельсавета не было ніводнай хрысціянскай святыні.

За адзін кіламетр на паўднёвы ўсход ад вёскі, на ўзгорку пад назвай “Талерка” на правым беразе ракі Бярэзіна знаходзіцца гарадзішча вышынёй 17-18 метраў. Пляцоўка памерам 49×47 метраў. З поўдня, паўднёвага ўсходу і паўднёвага захаду вал і роў. У 1991 годзе навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ала Уладзіміраўна Ільюцік вывучыла гэтае паселішча. Даследчыца раскапала на гарадзішчы 40 квадратных метраў пляцоўкі ў паўднёвай частцы паселішча. Таўшчыня старажытных адкладанняў у раскопе складала ад 0,2 да 0,8 метра. У час раскопак знойдзены больш як 300 абломкаў ляпнога посуду, якім карысталіся жыхары гарадка. Часта трапляліся косткі хатняй і дзікай жывёлы. Іх каля сотні экземпляраў. Не раз сустракаліся і перапаленыя костачкі. Частку атрыманых знаходак складаюць металургічныя шлакі, звязаныя з вырабам жалеза. Так, кемлівыя жыхары “варылі” жалеза на паселішчы. З яго кавалі выраблялі патрэбныя рэчы. А.У. Ільюцік знайшла толькі серп і шыла. Тры праселкі ў пашкоджанным стане (у выглядзе абломкаў) і нарыхтоўка гавораць аб занятках жанчын прадзеннем і ткацтвам.

На паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Выскадніца, знаходзіцца курганны могільнік. У ім налічваецца 18 насыпаў. Другі курганны могільнік знаходзіцца за паўтара кіламетра на поўнач ад маста цераз раку Бярэзіна, на левым беразе, ва ўрочышчы Адверніца. Два насыпы, адзін вышынёй каля аднаго метра і дыяметрам два метры, другі за 20 метраў ад першага ў заходнім напрамку вышынёй каля паўметра і дыяметрам паўтара метра. Недалёка ад насыпаў знойдзены каменныя рубіла, сякера з адбітай палавінай абуха. У двары жыхара Беразіно І. Казлоўскага ляжаў камень правільнай авальнай формы (20×30 см) з ёмістасцю. Паводле сведчання гаспадара, яго знайшлі паблізу курганоў.

У краязнаўчай літаратуры называюцца старыя могілкі ва ўрочышчы Гарадок. У газеце “Звязда” за 1926 год (№278) быў надрукаваны артыкул за подпісам “Фома Балотны”. Аўтар расказваў, што ва ўрочышчы Гарадок у лесе каля вёскі Беразіно Бягомльскага раёна знаходзіцца конусападобная акапаная гара. Побач з гарой былі старадаўнія могілкі з надмагільнымі плітамі з надпісамі. Але ў тым жа годзе мясцовая кааперацыя вывезла іх на падмуркі.

Акрамя таго, вядома некалькі вялікіх курганоў пад назвай Валатоўкі на беразе ракі Бярэзіна каля Беразіно. А дзесьці ў 1970 годзе паблізу вёскі быў знойдзены арабскі дырхем. Ён перададзены ў школьны краязнаўчы музей.

А аднойчы, калі рабочыя камунальнай службы разбіралі ў вёсцы стары хлеў, яны знайшлі каля сотні патронаў часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Высветлілася, што гаспадар дома збіраў боепрыпасы па палях і лясах у ваколіцах Беразіно. Аднак пазней выехаў з вёскі, а “сувеніры” засталіся.



У 1961 годзе ў Беразіно нарадзілася беларуская спартсменка, трэнер па дзюдо і самба Міхаль Галіна Уладзіміраўна. Яна скончыла Беларускі інстытут фізічнай культуры. Неаднаразовы прызёр і пераможца ўсесаюзных і міжнародных спаборніцтваў. Чэмпіёнка СССР па дзюдо ў вагавой катэгорыі 72 кілаграмы ў 1988 годзе ў Архангельску. Чэмпіёнка СССР у 1989 годзе, свету ў ЗША у 1989 годзе і Еўропы ў 1993 годзе ў горадзе Ржэў Расія. Майстар спорту міжнароднага класа па дзюдо і самба. Бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў сярод ваеннаслужачых у 1998 годзе ў харвацкім Заграбе ў асабістым і камандным заліку. З 1994 года знаходзіцца на трэнерскай рабоце. З’яўляецца трэнерам Мінскага абласнога таварыства “Дынама”. Са сваімі выхаванцамі выязджала на спаборніцтвы ў Данію, Польшчы, Францыю, Індыю, іншыя краіны. Сярод яе выхаванцаў – тры майстры спорту, сярэбраны і бронзавы прызёры маладзёжнага першынства Еўропы па самба ў 1999 годзе.



У 1923 годзе ў Беразіно нарадзіўся Кургей Уладзімір Ігнатавіч. З 1941 года працаваў на танкавым заводзе ў Ніжнім Тагіле Свярдлоўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 года на Варонежскім, 1-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах, стралок-наводчык танкавага экіпажа. Удзельнічаў у Курскай бітве 1943 года, Берлінскай аперацыі 1945 года. Удзельнік парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года. Вось як успамінае парад Перамогі сам Уладзімір Ігнатавіч: *“…45-ы танкавы полк 1-й танкавай арміі, у якім я служыў у час Вялікай Айчыннай вайны, сустрэў ранак 9 мая 1945 года ў Берліне. Цяжка перадаць словамі тую бязмежную радасць, якая ахапіла нас, воінаў, што прайшлі нялёгкі шлях ад Масквы да Сталінграда, Курска і Кіева да фашысцкай бярлогі.*

Аднойчы мяне выклікаў да сябе камандзір палка палкоўнік Маргуноў і паведаміў, што штаб дывізіі патрабуе з нашага палка воіна, які вызначыўся ў баях, ардэнаносца, і што выбар паў на мяне. Я не ведаў, для чаго спатрэбіўся, але ў той жа дзень быў у штабе дывізіі. Разам з іншымі танкістамі мяне накіравалі ў Дрэздэн, дзе размяшчаўся штаб арміі. Тут мы адчулі, што рыхтуецца нешта важнае. У няведанні былі нядоўга. Камандуючы арміяй генерал Катукоў аб’явіў, што ў Маскве адбудзецца парад Перамогі. Нам выпаў вялікі гонар прадстаўляць на ім нашу танкавую армію ў складзе 1-га Беларускага фронту. У пачатку чэрвеня нас прывезлі ў Маскву і выдалі новую парадную форму. Мы цалкам аддаліся перадсвяточнай трэніроўцы. І вось доўгачаканы дзень 24 чэрвеня настаў. Раніцай зводны полк 1-га

Беларускага стаяў у вызначаным месцы. Імжыў дождж, але настрой ва ўсіх быў радасны, прыўзняты. І не толькі ў нас, воінаў. Мы чулі, як з песнямі і музыкай набліжаліся да Краснай плошчы масквічы, а тыя, хто не ўдзельнічаў у дэманстрацыі, запаўнялі тратуары. Лікаванне было ўсеагульным.

Роўна ў 10 гадзін раніцы пачаўся парад. Пад баявымі, апалёнымі агнём і прабітымі кулямі сцягамі, пад музыку ваенных маршаў зводныя палкі франтоў, адбіваючы чаканны крок, выйшлі на Красную плошчу. 200 байцоў-ветэранаў пад барабанны бой кінулі да падножжа Маўзалея Леніна 200 сцягоў пераможанай нямецка-фашысцкай арміі. Гэта было сур’ёзным напамінаннем для іншых аматараў ваенных авантур.

Пасля гістарычнага парада Перамогі кожны яго ўдзельнік вярнуўся ў сваю часць, дзе працягваў службу. Да 1947 года служыў у Германіі і я. потым дэмабілізаваўся, прыехаў ў родную вёску Беразіно і стаў працаваць у Бярэзінскім сельскім Савеце”.

Узнагароджаны ордэнамі Славы 3-й ступені, айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Памёр Уладзімір Ігнатавіч у 1973 годзе.

У 1920 годзе нарадзілася Мальчык Валянціна Юльянаўна. У час Вялікай Айчыннай вайны ў радах Савецкай Арміі змагаліся сотні тысяч жанчын. Сярод іх цяжкімі дарогамі вайны крочыла і наша зямлячка Валянціна Юльянаўна.

Дваццацігадовай дзяўчынай, змяніўшы цывільную вопратку на ваенную форму, яна з першых дзён апынулася ў крывавым віры вайны. Валя ў час паяўлялася там, дзе патрэбна была дапамога. Выносіла з-пад агню раненых байцоў. Спакой і вытрымка, з якімі працавала дзяўчына, перадаваліся воінам, натхнялі іх на ратныя подзвігі.

Да гэтага часу сняцца ёй жахі дзён, праведзеных у фашысцкім акружэнні пад Кіевам. Воінская часць, у якой служыла Валянціна, з баямі прабівалася з акружэння. Фронт аддаляўся. Сілы таялі. У лясах Браншчыны засталася толькі жменька змагароў. Надзеі на злучэнне з фронтам не заставалася. Тут Валянціна Юльянаўна даведалася, што не толькі на Браншчыне, але і ў роднай Беларусі пачынае расці народны партызанскі рух, і дзяўчына вырашыла прабівацца на радзіму. У красавіку 1942 года яе ўжо хавалі ад ворагаў беларускія лясы. А праз некалькі дзён была ўжо на Бягомльшчыне. У роднай вёсцы часта паяўляліся партызаны. І першая сустрэча з імі вырашыла далейшы лёс дзяўчыны. Яна стала партызанкай. “Валя Мальчык – стойкі і мужны баец Н-скага атрада. Усюды, дзе б яна не ўдзельнічала ў баях у якасці байца або медсястры, паказвае прыклад адвагі і стойкасці” (“Савецкі патрыёт” № 22 ад 25 кастрычніка 1943 года).

Партызаны-жалезнякоўцы добра памятаюць бой з акупантамі восенню 1943 года пад вёскай Саланое. Пяты партызанскі атрад, у якім была і Валя, вырашыў разграміць гарнізон у Саланым. На зыходныя рубяжы выйшлі ўдачна. Ушчыльную падыйшлі да варожых умацаванняў і з крыкамі “ура!” кінуліся на штурм.

Але тут здарылася непрадбачанае. Атакуючыя аказаліся ў шчыльным кальцы варожага агню. Фашысцкія кулямёты білі ва ўпор. 2-й роце былі прычынены значныя страты. Пад агнём фашыстаў Валянціна Юльянаўна перапаўзла ад аднаго раненага да другога, перавязала іх, дапамагала выбрацца з-пад абстрэлу. Так яна ўратавала 17 чалавек. Трох цяжка параненых з іх зброяй выцягнула на сябе. Вынесла таксама ручны кулямёт, разлік якога загінуў. Фашысты напалі на след групы Валі і наладзілі пагоню. Але дзяўчына перахітрыла ворага і даставіла раненых і зброю ў брыгаду. Не мінула і яе самой бяда. Вясной 1944 года пад Любавай ішоў гарачы бой жалязнякоўцаў з карнікамі. Валя ляжала ў партызанскім ланцугу і вяла агонь па ворагу. І тут выбух, непрытомнасць. Ачнулася яна раненая на руках сваіх таварышаў.

Пасля вайны Валянціна Юльянаўна Мальчык пасялілася ў Беразіно. Тут яна да 1970 года працавала медсястрой у мясцовай бальніцы. Мужам яе стаў былы партызан-жалезняковец Міна Іванавіч Казлёнак.



Аднак вядома гэта мястэчка яшчэ і тым, што 13 мая 1905 года тут нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Манковіч Сцяпан Сцяпанавіч. З 1929 года Манковіч знаходзіўся на савецкай і гаспадарчай рабоце. У 1939 годзе стаў сакратаром Бягомльскага райкома КП(б)Б. У ліпені 1941 года Манковіч па загаду ўрада быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. З сакавіка 1942 года партызаніў у навакольных лясах, а потым стаў камісарам партызанскай брыгады "Жалязняк". Адначасова са жніўня 1942 года па снежань 1943 года з'яўляўся сакратаром Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б. пасля вайны ў 1946 годзе скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б). працаваў на савецкай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.



Памёр Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч 18 красавіка 1978 года. Яго імем названы вуліца ў Бягомлі і школа ў яго роднай вёсцы. Перад школай у 1982 годзе ўстаноўлены бюст.

# Бераснёўка

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У першыню ў дакументальных крыніцах Бераснёўка ўпамінаецца ў 1879 годзе ў царкоўных дакументах пры пераліку населенных пунктаў Бягомльскага прыхода Барысаўскага павета. У 1886 годзе тут была сядзіба Бераснёўка, якая належала Буглаку.

У гэтыя гады тут працаваў вінакурны завод, які даваў 7626 вядзёр віна. Зараз ён выкарыстоўваецца як сельскі дом культуры. Сцены ўпрыгожаны "разынкавай муроўкай" – украпленнямі чорнага шчэбню. У 1870-74 гады пабудавана спіртасховішча. У Бераснёўцы былі дзве лаўкі і хлебазапасны магазін. У 1927 годзе будуецца вапнавы, а ў 1930 годзе цагельны заводы. Па меры ўшчыльнення забудовы, аднавулічныя паселішчы пераўтварыліся ў шматвулічныя. Звычайна восямі новых вуліц былі дарогі. Менавіта перасячэнне дарог вызначыла крыжападобную планіроўку вёскі Бераснёўка.



**Бераснёўскі СДК**

У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 20 жыхароў. Зараз тут пражывае каля 125 чалавек.

У Бераснёўцы жыве дачка вядомай падпольшчыцы, кіраўніка падпольнай групы ў Глінным Аляксандры Андронаўны Ніканавай Ларыса Дзмітрыеўна Глазко. Ларыса Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1936 годзе. У 1943 годзе, калі загінула ад рук фашыстаў яе мама, дзяўчынцы было толькі 7 гадзікаў. Яна тады мала што разумела, ведала толькі, што вайна – гэта вельмі страшна. З таго, што найбольш запомнілася – пастаяннае знікненне на некалькі дзён яе мамы, потым яе з'яўленне, зноў уход і г.д. А яшчэ – просьбы, забароны бабулі (бацькавай маці), каб Аляксандра не ўвязвалася ў гэту не жаночую справу, каб глядзела дзяцей (у Ларысы была яшчэ і малодшая сястрычка). Яна пастаянна перасцерагала нявестку, каб не ішла на пагібель, каб не сіраціла дзяцей.

Куды знікала мама, дзяўчынка тады не ведала. Памятае толькі, што кожны раз, калі яна вярталася з задання, бабуля настойліва казала: "Ну, усё, больш не пойдзеш. А пойдзеш – бяры і дзяўчынку з сабой. Я глядзець дзіця больш не буду".

Праходзіў час, і падпольшчыца зноў адпраўлялася на заданне. А аднойчы ўзяла з сабой і Ларысу. "Памятаю, як доўга мы ішлі невядомымі дарогамі. Ля пояса я была чымсьці абвязана. Гэта цяпер ведаю, што

лістоўкамі. Аднойчы, ратуючыся ад бамбёшкі, сядзелі ў вадзе, а галаву ў кустах хавалі.

А вось дзень, калі маму арыштавалі, напэўна, не забуду ніколі. У хату зайшло шмат немцаў. Мы адчулі – гэта канец. Усе плакалі: і бабуля, і мы – дзеці. Не плакала толькі мама, як быццам бы ведала, што так і павінна было ўсё скончыцца. Як цяпер памятаю яе твар. Тады немцы забралі і маю цётку Ганну Навіцкую (бацькаву сястру). Павезлі ў машыне, бабуля праводзіла іх. Больш я сваю маму не бачыла. Кожны дзень бабулю вазілі на допыт. Яна думала, што і яе расстраляюць, а таму, клапоцячыся пра нас з сястрой, гаварыла: “Як пачуеш, што мяне расстралялі, ідзі ў жыта, а адтуль – у Хмялеўшчыну, а потым у Шалагіры да цёткі Арыны”.

На шчасце, бабуля мая засталася жывой. Але колькі ж, бедная, яна перанесла гора, жаху: людзі адварочваліся ад нас, бо баяліся, што немцы могуць западозрыць іх за сувязь з партызанамі. Але цяжэй за ўсё была невядомасць. Пра маму і цётку нічога не было чуваць. А потым адна жанчына сказала: “Алена, пабілі тваіх у Атрубку”.

З таго часу прыходзіла дадому вечарам і ўся мокрая: шукала целы дачкі і нявесткі. Адзін вечар яе ўсё не было і не было. А калі прыйшла, то як толькі пераступіла парог, адразу і ссунулася ля сцяны.

Целы мамы і цёткі яна знайшла ў яме, якая была вырыта пад сцяной хлява. Загінулі юныя падпольшчыцы ад рук фашыстаў жудаснай смерцю. Іх мучылі, гвалтавалі, выразалі на целе зоркі і, нарэшце, расстралялі. Пахаваны яны ў вёсцы Шалагіры”.

…Пасля вайны Ларыса Дзмітрыеўна доўгі час жыла ў Казахстане. А ў 1980 годзе з мужам вярнуліся ў Беларусь.

Жудасную трагедыю ўспамінае і мясцовая жыхарка Матруна Кірылаўна Пахомчык, якую ў вёсцы клічуць “баба Моця”. Летам 1942 года ў Бераснёўку ўварваліся карнікі. Пахапалі застаўшыхся мужчын, сагналі ў адну пуню і пачалі біць за дапамогу партызанам. Пра свайго бацьку Матруна Кірылаўна ведае, што ён сапраўды рабіў партызанам драўляныя прыклады на вінтоўкі, а астатнія сваю тайну панеслі з сабой. Збіўшы людзей так, што сцены былі чырвонымі ад крыві, павялі ўсіх расстрэльваць. Але расстралялі толькі шасцярых, астатніх чамусьці адпусцілі. Расстраляных закапалі ноччу ў агульнай яме, а пазней перапахавалі па людскі на могілках. Дома ў Пахомчыка засталося пяцёра дзяцей.

А ў страшны дзень, калі хавалі Кірыла Сяргеевіча Камінскага і іншых расстраляных, яго дачка нарадзіла сына Мікалая. Хлопчык мог загінуць немаўляткай некалькі разоў. Немцы кідалі скрутак сабакам, хацелі ўдарыць аб сасну, ды маці, як птушка кідалася на абарону свайго дзіцяці. Бог засцярог, Мікалай Генадзьевіч вырас, жыве на зямлі замест дзеда, усіх загінуўшых і памятае, якой цаной дадзена яму жыццё.

Бераснёўка – радзіма Героя Савецкага Саюза Арсенція Гаўрылавіча



Юхнаўца. Ён нарадзіўся ў 1916 годзе ў сялянскай сям'і. У 1938 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію, удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. У 1940 годзе стаў працаваць трактарыстам у Бягомльскай МТС. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў вадзіцелем, франтавым разведчыкам, артылерыстам. Удзельнічаў у абароне Масквы, у Курскай бітве, у вызваленні Беларусі і Польшчы. Памочнік камандзіра ўзвода старшына А.Г.Юхнавец вызначыўся ў баях пад Брэстам. 27



ліпеня 1944 года ён выявіў калону варожых аўтамашын і выклікаў агонь артылерыі на сябе. У выніку гэтага смелага ўчынку ўдалося знішчыць 30 аўтамашын з ваенным грузам і 150 гітлераўцаў. Загінуў Арсенцій Гаўрылавіч 20 жніўня 1944 года ў баях пад Варшавай. Пахаваны ў вёсцы Множ (Польшча). Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена 25 верасня 1944 года. За свае заслугі ў час баёў на Курскай дузе ў 1943 годзе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Імем А.Г.Юхнаўца названы вуліца ў гарадскім пасёлку Бягомль і школа ў вёсцы Бераснёўка. На доме, дзе ён нарадзіўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

У лесе каля вескі Бераснеука ляжыць вялізны камень.

Вялікі, чорны, маўклівы – увесь заросшы мохам. Толькі вясной, пакуль яго бакі не пакрыты мяккім зяленым дыванам, на адным з бакоў валуна можна прачытаць словы "Певень-камень".

Старыя людзі расказваюць, што раней недалека ад гэтага месца жыў пан. Пан быў справядлівы, нікога не крыўдзіў, але ж не дай Божа каму зрабіць дрэнны ўчынак: украсці што-небудзь, скаціну не дагледзець, схлусіць і г. д. З такімі людзьмі пан хутка распраўляўся.

Служыў у пана ляснік па мянушцы Певень. Сапраўднага імя ніхто не памятаў, бо Певень прыйшоў аднекуль здалек, паступіў да пана на службу і амаль ніколі не паказваўся сялянам на вочы. Сваю мянушку ен атрымаў за высокі рост і птушыную паходку. Служыў певень слаўна, любіў лес, ведаў усе сцежкі-дарожкі. Пану вельмі падабаўся гэты чалавек.

Аднойчы на свята пан запрасіў Пеўня да сябе ў палац. Шмат гасцей было там у той час. Певень прыйшоў. Яго запрасілі за стол, напаілі і смачна накармілі. П'яны певень пачаў скардзіцца на свае жыцце, расказаў аб сваім няшчасным каханні.

Калі Певень толькі прыйшоў прасіцца на службу да пана, ён пазнаёміўся з панскай дачкой. Дзявочая маладосць і прыгажосць зачаравалі хлопца. Закахаўся ён вельмі моцна. Дзяўчына ж ведаць яго не хацела ...

Прайшло некалькі год. Вось яна сядзіць разам са сваім мужам і весела смяецца. І гэта ў той момант, калі боль сціскае сэрца нясчаснага Пеўня. Раззлаваўся ляснік і ноччу, калі ўсе паснулі, уварваўся ў пакоі панначкі, схапіў яе і павёз у лес.

Шмат дзён шукалі Пеўня ... Нарэшце знайшлі, і раз'юшаны пан загадаў павесіць лесніка. Пахавалі яго ў лесе пад каменем валуном. На камні пан загадаў высеч словы "Певень-камень", каб толькі мянушка захавалася, памяць аб дрэнным учынку і больш нічога.

Існуе і другая легенда. У маленькай весачцы жылі людзі бедна, але дружна.

Захварэў у адной жанчыны муж і памер. Засталася яна з сынам. Сын у яе быў маленькі – восьмы год яму ішоў, а пан патрабаваў яго сабе ў батракі замест бацькі. Пайшоў хлапчук служыць да пана. Каб выкупіць сына, маці пачала зарабляць грошы ... Але дзе там! Веска малая, людзі бедныя ...

Пайшоў аднойчы хлопчык дадому адпачыць, сеў ля акенца і глядзіць у двор. Па двары важна ходзіць пеўнік. "Які прыгожы ... ", - думаў малы і выйшаў у двор, каб разгледзець птушку. Пеўнік спужаўся хлопчыка, пачаў уцякаць, а той пабег за ім. Забеглі яны ў лес. Каля вялікага валуна пеўнік спыніўся і пачаў капацца ў зямлі. Хлопчык зацікаўлена сачыў за птушкай. Раптам пад лапкамі пеўніка нешта зазіхацела. Угледзеўшыся, хлапчук зразумеў, што гэта грошы. Іх было столькі, што адкупіца ад пана змагла б уся веска ... Удзячныя жыхары высеклі на валуне словы "Певень-камень".

# Бераспонне

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Сваю гісторыю вёска бярэ з XVIII стагоддзя. Праўда назва тады ў яе была іншая – Двор, бо пасяліў тут мясцовы пан сваіх дваровых людзей. У 1886 годзе тут была сядзіба, у якой меўся вінакурны завод. Старыя людзі ўспамінаюць, што пан рабочых сваіх карміў добра, а па святах наліваў і чарку бясплатна. У памяці жыхароў захавалася прозвішча толькі апошняга ўладальніка маёнтка – пан Катовіч. Ён быў сярэдняга дастатку, але меў мануфактуру ў Барысаве, а ў Бераспонні на рацэ працавала паравая мельніца, была электрастанцыя. Панскі дом стаяў у самым прыгожым месцы – на ўзвышшы, дзе зліваюцца разам Беразіна і Поня. Гэта акалічнасць пазней і дала назву Бераспонню.



**Рэшткі панскай сядзібы**

Дарэчы, у 80-я гады мінулага стагоддзя паглядзець на радавое гняздо прыязджаў нашчадак таго пана. Пастаяў, паглядзеў на падмуркі, што захаваліся, пагутарыў з людзьмі і паехаў.



**Рака Беразіна ў ваколіцах Бераспоння**

У савецкія часы маёнтак быў пераўтвораны ў вёску. У 1925 годзе пабудавалі смалакурны завод. У 1944 годзе нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 8 жыхароў.

Зараз у Бераспонні пражывае каля 8 чалавек.

# Бірулі

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Вёска з назвай Бірулі вядома, бадай што, кожнаму жыхару нашага раёна. Верагодна, назва асацыіруецца з возерам, якое зараз мае назву Медзазол, але на геаграфічных картах і ў даведніках XIX стагоддзя яно называлася Мядзел. Слова гэта балцкага паходжання і азначае “лясное”. Аднак існуе і легенда назвы вёскі, якая змешчана ў кнізе “Віцебшчына ў легендах і паданнях” за 2000 год. Вось яна...

“Было гэта вельмі даўно, у тыя яшчэ гады, калі Бог са сваімі святымі як простыя людзі па зямлі хадзілі. Аднаго разу хадзіў Бог па зямлі з Пятром, якога ён больш за ўсіх святых любіў. Стаміліся абодва. Вельмі спякотна было. Тут бачаць адна жанчына ў полі працуе. Вырашылі падыйсці і распытаць яе. Падыйшлі і пытаюць, “Што ёй трэба для лепшага жыцця?” А дзяўчына, падумаўшы, адказала, што было б добра, каб у яе быў памочнік, які б дапамагаў ёй у працы на полі. Бог паабяцаў, першага каго спаткае – адправіць на дапамогу жанчыне.

І вось бачаць – пад грушай-дзічкай ляжыць здаравенны хлапчына з разяўленым ротам. Ляжыць і не міргае нават. Гэты лайдачына ленаваўся нават грушу сарваць, дык вось і лёг, рот разявіў і чакае, пакуль яна сама яму ўпадзе. Успомніў тут Бог пра маладую жнейку і вырашыў даць ёй у пару гэтага хлопца.

- Гэтага біруля? Дык ён жа нічога рабіць не стане, - усхадзіўся Пятро.

-Дадзім мы ёй гэтага хлопца, дык гультай будзе на працавітую глядзець і пачне ёй дапамагаць, а калі абодва лянівыя, то з голаду памруць. Адкуль яны, бірулі, як ты кажаш, толькі на зямлі бяруцца?..

Так яны і зрабілі, як Бог вырашыў. Вось адкуль назва пайшла – ад слова, якое азначае “маўклівы”, “сярдзіты”, “лянівы”. Так Бірулі і сталі”.

Вёска Бірулі ўпершыню ўзгадваецца ў метрычных кнігах Тумілавіцкай уніяцкай царквы 11 лістапада (па старым стылі) 1808 года.



Багата археалагічная спадчына Біруль. За два кіламетры на поўдзень ад вёскі, на ўзгорку “Шведская гара” знаходзіцца гарадзішча. Вышыня яго 10 метраў а пляцоўка памерам 56×48 метраў. З паўночнага боку ўмацавана трыма валамі і ровам. На вяршыні ўзгорка валы канцамі заходзяць адзін на другі і ўтвараюць уваход на гарадзішча. З усходняга і паўднёвага бакоў забалочаная пойма возера Медзазол. У час раскопак тут знойдзены фрагменты глінянага штрыхаванага посуду, абпаленыя камяні, кавалкі шлаку. Матэрыялы паказваюць, што жыццё тут існавала ў 3-2 стагоддзях да н.э. – 4-5 стагоддзі н.э. А па мясцоваму павер’ю гэтую гару насыпалі шведы.

У 1938 годзе ўладальнік маёнтка Парэчча Пётр Юзафовіч паведаміў у Археалагічны музей Віленскага ўніверсітэта імя Стафана Баторыя пра вялікі курганны могільнік (больш за 100 насыпаў) у сваім парку і часткова ў лесе, побач з вёскамі Бірулі і Несцераўшчына. Ён запрашаў правесці раскопкі. У гэтым жа годзе археалагічная экспедыцыя ўніверсітэта працавала на Глыбоччыне, і мясцовы краязнаўца інжынер Леанард Пякарскі расказаў таксама археолагам пра вялікі курганны могільнік пад возерам Медзазол. Археолагам удалося абследаваць курганы. Восенню 1938 года віленскі ваявода Людвіг Бацянскі вылучыў грошы на правядзенне раскопак гэтай курганнай групы. На Медзазол накіравалася археалагічная экспедыцыя ў складзе Алены Цэгак-Галубовіч, яе мужа Уладзіміра Галубовіча і рысавальшчыка Баляслава Рагінскага. Могільнік размяшчаўся на польска-савецкай мяжы (з 1921 года па 1939 год мяжа праходзіла па возеры Медзазол і дзяліла яго напалам) і складаўся з некалькіх курганных груп. Было раскапана 16 насыпаў. Выяўлены пахаванні па абраду трупаспалення і трупапалажэння (у грунце і ямах). Знойдзены бранзалеты, зашпількі, пярсцёнкі, гузікі, пацеркі з бронзы і шкла, жалезныя сякеры, наканечнікі стрэл і коп’яў, дзве арабскія манеты сярэдзіны X стагоддзя. Больш падрабязна аб выніках раскопак змешчана ў польскім навуковым часопісе “Пшэглёнд археолёгічны” (1938-39. Т.16). Уцэлым, гэта адзін з найбуйнейшых курганных могільнікаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі.





На поўнач ад вёскі на мясцовых могілках знаходзіцца капліца, пабудаваная ў 1900 годзе. У ёй пахаваны пан Пётр Юзэфовіч, які памёр 21 лістапада 1900 года. Надпіс на надмагільным помніку зроблены яшчэ дарэвалюцыйным рускім правапісам. Капліца пабудавана з цэглы. Квадратная, 4-схільны гонтавы дах па цэнтры завершаны цыбулепадобнай макаўкай на 8-гранным барабане.

Падчас савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гадоў у Бірулях стаяў лагер польскіх войскаў. Пасля гэтай вайны згодна з Рыжскай мірнай дамовай ад 18 сакавіка 1921 года Бірулі ўвайшлі ў склад Польшчы. Але жыхары вёскі катэгарычна не хацелі лічыць сябе польскімі грамадзянамі і напісалі пісьмо ў Мінск аб сваім жаданні жыць у савецкай дзяржаве. Такіх памежных вёсак было дастаткова, і ў выніку ўдакладнення дзяржаўнай мяжы ў 1922 годзе Бірулі апынуліся ў складзе БССР, за што, між іншым, і заплацілі жыццямі многіх сваіх аднавяскоўцаў, загінуўшых потым у полымі сталінскіх рэпрэсій. У 1930 годзе ў вёсцы быў арганізаваны калгас “Чырвоны ўдарнік”. Яго

першым старшынёй быў абраны Дзмітрый Антонавіч Хілько. Трыццатыя гады мінулага стагоддзя адзначаны многімі трагічнымі падзеямі. Найбольш заможныя сяляне былі высланы за межы Беларусі. Яшчэ 9 мужчын былі арыштаваны падчас так званага "хапуна" – масавых рэпрэсій. Усе яны былі расстраляны як "ворагі народа", а першага старшынё калгаса расстралялі ў святочны дзень 8 сакавіка 1938 года. У студзені 1944 года нямецка-фашысцкія акупанты знішчылі вёску і 12 жыхароў. Зараз у Бірулях пражывае менш 40 чалавек.

Каля Біруль знаходзіцца возера Медзазол. Плошча яго 3,02 км², найбольшая глыбіня 5,3 метра. Даўжыня 3 кіламетры, а найбольшая шырыня 1,5 кіламетра. Даўжыня берагавой лініі 9,2 кіламетры. Аб'ём вады 8,1 млн. м³. схілы катлавіны нізкія, забалочаныя, тарфяністыя, на паўднёвым захадзе зліваюцца са схіламі, пясчаныя. Дно сапрапелістае. Возера моцна зарастае, шырыня паласы расліннасці 80-100 метраў, пашырана да глыбіні 1,5-2 метраў. Зараз тэрыторыя возера Медзазол аб'яўлена заказнікам.



Медзазол выбірае між зол
Ёлкі халодны золак,
Нейтральную паласу,
Змрочнага лесу касу
Якую вартуе Хрыстос драўляны,
Твар – суцэльная рана –
Цячэ на курган суніцаю,
Цяжкай травою ніцаю,
Ня мне іх зьбіраць і касіць,
У мёртвага Бога прасіць.
Чорны мой сум і сны недасьпелыя –
Лебядзі белыя, лебядзі белыя,
Уздымуцца на крыло і...
Прападуць на дно.

Парэчча – былы маёнтак на ўсходзе Докшыччыны на беразе возера Медзадзол, на поўнач ад вёскі Бірулі, побач з колішняй савецкай мяжой. Гэта сапраўдная знаходка для археолагаў. Тут размешчаны 130 старажытных курганоў, стаянка чалавека часоў каменнага веку, сярэдневяковыя могілкі. Гэта нездарма, бо побач працякае рака Бярэзіна, а таксама існуе маляўнічае і багатае рыбай возера Медзазол.

Што ж датычыцца ўладальнікаў вёсак Парэчча і Біруль, то гэта Юзэфовічы – старажытны шляхецкі род, які меў свой герб "Ляліва". Заснавальнік мясцовай галіны роду Кірыла Юзэфовіч па ўказу расійскай імператрыцы Кацярыны ІІ за актыўны ўдзел у вайне супраць Рэчы Паспалітай у 1796 годзе стаў уладальнікам Тумілавіч з навакольнымі вёскамі.

Першыя згадкі пра Парэчча адносяцца да 1795 года, калі яно ў складзе маёнтка Тумілавічы перададзена царскімі ўладамі Юзэфовічу, але праз колькі

дзесяцігоддзяў маёнтак Парэчча быў аддзелены ад Тумілавіч. У “Слоўніку геаграфічным Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх” згадваецца, што апрача фальварка Юзэфовічаў, мелася вёска Парэчча, якая складалася з 12 двароў (можа, маецца на ўвазе в. Бірулі, якая знаходзіцца побач з маёнткам?). У маёнтку Парэчча, да якога адносіліся таксама фальваркі Табарышча і Шалашы, тады было 40 s валокі. Аднак, згодна з метрычнымі кнігамі, у Парэччы ў другой палове XVIII – пачатку XIX стагоддзяў жылі сяляне з прозвішчам Біруля. Магчыма, перанаселенасць Парэчча прымусіла ўладальнікаў выдзеліць землі для новых пасяленняў. Спачатку гэта было пасяленне Несцераўшчына (першы запіс датуецца 30 лістапада (па старым стылі) 1786 года, а затым праз 22 гады – Бірулі).

У снежні 1863 года каля Парэчча адбыўся бой паміж паўстанцкім атрадам Генрыка Дмахоўскага і докшыцкім гарнізонам царскага войска пад кіраўніцтвам палкоўніка Нізаўскага, у выніку якога паўстанцы пацярпелі паражэнне, а Дмахоўскі забіты. Дзесьці тут павінна быць магіла паўстанцаў, якую, па словах жыхароў Тумілавіч, даглядаў у 1930-я гады ўладальнік Антанаполья Сушкевіч. Вось як апісвае гэтыя падзеі “Ольберовичской Крестовоздвиженской церкви приходский священник Иулиан Еленский.

*Докшицко-Борисовскому благочинному Лесневскому*

*от 28 декабря 1864 г .*

*... Мятежник Дмаховский вступив в мой приход с шайкою в 280 человек и объявив крестьянам золотые свои грамоты, после ночлега двинулся на обед в мызу Поречье, куда прихожанин мой, крестьянин д. Отрубок Артемий Францевич Михаль так удачно привел роту солдат Низовского полка, которая, обойдя мятежницкий караул и, оставив его позади себя, в малое то время, как мятежники расположились к отвалу и приготовлению обеда нечаянно, как с неба сверкнуло на мятежников градом пуль, которые, убаюкав тут же на месте предводителя шайки Дмаховского на вечный сон, рассеяли его шайку, как рассевает сильный ветер горсть негодной пыли...*



* * *

*О чем и доношу Вашему Высокопреподобию.*

*Ольберовичской Крестовоздвиженской церкви приходский священник Иулиан Еленский”.*



Яго магілу, на якой усталяваны каменны крыж з ледзь заметнай выявай воіна, удалося прыпісаць менавіта Дмахоўскаму дзякуючы

праўнучцы генерала Юзэфовіча – Юстыні Пятроўне Васілевіч. Яшчэ да 1939 года да магілы Генрыха Дмахоўскага кожную вясну ў дзень яго гібелі вучнямі Докшыцкай школы арганізоўваліся вандроўкі з ускладаннем кветак. Дарэчы, Генрых Дмахоўскі – вядомы скульптар, яго работы па сёняшні дзень упрыгожваюць залы Кангрэсу ЗША.

Па звестках за канец XIX стагоддзя, у Парэччы П.А. Юзэфовічу належалі 873 дзесяціны. У 1929 годзе яго нашчадку Пятру Юзэфовічу належалі 400 дзесяцін у Парэччы і 179 у Табарышчы, а Эміліі Юзэфовіч у фальварку Шалашы, ад якога зараз засталіся толькі рэшткі склепу на полі каля аднаіменнай вёскі – 71 дзесяціна. Насельніцтва Парэчча ў 1930 годзе складала 11 чалавек.



У 2003-05 гг. тут праводзіліся раскопкі археолагам з Мінску А. Вайцяховічам. Ад самаго ж фальварка захаваліся толькі падмуркі пабудоў, ды старадаўняя ліпа непадалёк ад возера.



У ліпені 2008 года археолаг Андрэй Вайцяховіч зноў наведаў гэтыя мясціны. Былі раскапаны некалькі курганоў. Дапамагаў яму ў раскопках і аўтар гэтых радкоў. Былі знойдзены жалезная сякера, скол з крэмнія, а таксама рэшткі двух чалавек у адной магіле.

# Будачы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1897 годзе гэта паселішча вядома пад дзвюма назвамі – Будачы і Сцюдзёнае. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 10 двароў (перад вайной было 14) і загубілі 3 чалавек. Зараз у вёсцы пражывае каля 19 жыхароў.

У 1923 годзе ў Будачах нарадзіўся член Бягомльскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі ў Вялікую Айчынную вайну Уладзімір Васільевіч Таракан. Член ВЛКСМ з 1938 года. У 1941 годзе скончыў Бягомльскую сярэднюю школу. У час нямецка-фашысцкай акупацыі збіраў зброю і боепрыпасы для партызан атрада “Барацьба”, распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро. Ён устанавіў самаробны радыёпрыёмнік, запісваў зводкі і потым вывешваў іх на платах пасёлка Бягомль. Акупанты з ног збіліся ў пошуках падпольшчыка. Камісар брыгады “Жалязняк” С.С. Манковіч планаваў выцягнуць Валодзю з Бягомля ў больш бяспечнае месца. Але не паспеў зрабіць гэтага. Валодзя Таракан стаў ахвярай сваёй няўдалай спробы ўцягнуць у падпольную работу настаўніцу Вольгу Мазейку. У яго была поўная ўпэўненасць, што яна стане верным сябрам у яго небяспечнай справе. Тым больш, што яны кахалі адзін аднаго. Так лічыў Валодзя. Аднак Вольга думала інакш. Прыгожая, стройная яна прыглянулася нямецкаму афіцэру і хутка сайшлася з ім. Валодзя цяжка перажываў такое падзенне сваёй каханай. Аднойчы ён загаварыў з ёй. Ён спадзяваўся, што яна адумаецца. Больш таго, Валодзя думаў, што Вольга, выкарыстоўваючы сваё становішча, стане дапамагаць падпольшчыкам. І яна “згадзілася”. Ён паказаў свой радыёпрыёмнік. Валодзя і не падазраваў, што даўно ўжо знаходзіцца пад каўпаком фашыстаў. Заставалася выявіць толькі валодзевага памочніка. Аднак гэтага зрабіць не ўдалося. Тады яго арыштавалі. Калі патрыёта прывялі ў камендатуру, маёр Шварц сам вырашыў учыніць допыт. Ён хацеў даведацца – хто яшчэ дапамагаў Валодзю. Пасля доўгіх допытаў Валодзя “згадзіўся”. Ён патрабаваў, каб яму далі ліст паперы і ручку. Маёр узрадаваўся і падыйшоў да Валодзі. Той моцным ударам нагі ў жывот паваліў немца. Камсамолец ужо хацеў дацягнуцца да пісталета, але тут адчыніліся дзверы. Юнак кінуўся да акна і скочыў уніз. Грымнуў стрэл, каторы і загубіў Валодзю. Ужо мёртвага камендант загадаў павесіць Валодзю а да грудзей пачапіць ліст бляхі з надпісам “Бандыт”. Тры дні труп вісеў на базарнай плошчы Бягомля.

Аднак і Вольгу не мінула кара. У снежні 1942 года яна з немцамі паехала ў Мінск. Потым праз паўгода вярнулася ў партызанскую зону з павіннай. Ёй паверылі, думалі, што пад пагрозай жыцця яе вымусілі супрацоўнічаць з немцамі. Вырашылі накіраваць яе на месца жыхарства ў

Беразіно. Аднойчы, на танцах, адзін з партызан заўважыў у кішэні Мазейкі паперку. З цікавасці ён выцягнуў яе. А там аказаліся звесткі пра партызанскую брыгаду "Жалязняк". На допыце Вольга расказала, як яна выдала немцам Валодзю Таракана і прызналася, што яшчэ раз хацела ўслужыць акупантам.



8 ліпеня 1991 года каля вёскі адкрыўся санаторый "Баравое". Мае два карпусы. Са снежня 2000 года працуе водалячэбніца (падводны душ-масаж, каскадны душ, гейзер, мужчынская і жаночая саўны), кабінеты гразелячэння, электрасну, фізіятэрапеўтычны, зал трэнажораў і інш. З 2002 года вядучымі напрамкамі сталі гастраэнтэралагічны і гінекалагічны. Працягваецца таксама лячэнне і рэабілітацыя хворых з траўмамі і захворваннямі апорна-рухальнага апарату, сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм, некаторых відаў практалагічнай паталогіі, захворванняў прастаты, аказваюцца стаматалагічныя і касметалагічныя паслугі. Акрамя традыцыйных для санаторыя дыягнастычных і лячэбных методык (УГВ, ЭКГ і інш.), маецца шэраг спецыяльных метадаў дыягностыкі і лячэння: паластная магніта- і лазератэрапія, аспірацыённа-пункцыянальная біяпсія і інш. Са свідравіны, размешчанай на тэрыторыі санаторыя, здабываюць лячэбна-сталовую з нізкай мінералізацыяй ваду "Баравая", якая ўжываецца для прафілактыкі і лячэння страўнікава-кішэчных захворванняў, хваробы пячонкі і прастаты, мочакамянёвай хваробы, парушэння абмену рэчываў.

# Будзілаўка

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Вёска вядома з XIX стагоддзя. Для яе характэрна ярка выразная вулічная планіроўка – калі надзелы наразаліся перпендыкулярна дарозе, што перасякала поле, і апошняя станавілася адначасова і вясковай вуліцай. У 1909 годзе ў Будзілаўцы адкрываецца народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу. У 1924 годзе ў гэтай школе навучаліся 32 вучні. У 1933 годзе быў утвораны калгас “Шлях Будзённага”, працавала кузня. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 18 жыхароў. Зараз у Будзілаўцы пражывае каля 40 чалавек.

У Будзілаўцы нарадзіліся некалькі герояў, якія сваёй дзейнасцю ў гады Вялікай Айчыннай вайны зрабілі важкі ўклад у агульную Перамогу. Адзін з іх Ганчар Уладзімір Георгіевіч. Ён нарадзіўся ў 1923 годзе ў сялянскай сям’і. член ВЛКСМ з 1939 года. У 1941 годзе скончыў 9 класаў Бягомльскай сярэдняй школы. Працаваў у сельскай гаспадарцы. У гады вайны быў падпольшчыкам, распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, збіраў для партызан атрада “Барацьба” зброю і боепрыпасы. У чэрвені 1942 года У.Г.Ганчар быў арыштаваны і расстраляны немцамі.

Вялікі ўклад у барацьбу з фашыстамі ўнёс і Печань Мікалай Антонавіч, які нарадзіўся ў 1915 годзе. Членам ВЛКСМ стаў у 1936 годзе. У 1938 годзе скончыў Мар’нагорскі сельгастэхнікум і працаваў аграномам у Бярэзінскай МТС. У вайну збіраў зброю, боепрыпасы і медыкаменты для партызан атрада “Барацьба”. У снежні 1942 года арыштаваны і расстраляны.



**Уладзімір Гіль**

У 1923 годзе ў Будзілаўцы нарадзіўся Печань Улас Мікалаевіч. У 1937 годзе ўступіў у рады членаў ВЛКСМ, а ў 1941 годзе скончыў Бягомльскую сярэднюю школу. У вайну быў падпольшчыкам, збіраў зброю і боепрыпасы, распаўсюджваў лістоўкі. У чэрвені 1942 года арыштаваны гітлераўцамі і расстраляны.

Усім ім на могілках у 1979 годзе былі пастаўлены стэлы. Магілы патрыётаў знаходзяцца на мясцовых могілках.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Будзілаўцы адбылася адна знамянальная падзея. 16 жніўня 1943 года паміж 9 і 10

гадзінамі раніцы ў адной з хат вёскі адбыліся перамовы паміж Уладзімірам Уладзіміравічам Гіль-Радыёнавым і камандзірам партызанскай брыгады “Жалязняк” Іванам Піліпавічам Цітковым аб пераходзе 1-й Рускай нацыянальнай брыгады на бок партызан. З гэтага чысла брыгада стала называцца 1-я Руская антыфашысцкая брыгада. На баку партызан брыгада У.У. Гіль-Радыёнава правяла нямала паспяховых баявых аперацый супраць фашыстаў. А вясной 1944 года на Ушаччыне радыёнаўцы трапілі ў блакаду і панеслі вялікія страты. Тады ж 14 мая 1944 года загінуў і сам камбрыг.

# Будзічы

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

Згодна легендзе, у час Паўночнай вайны (1707 год) шведы разбуралі вясковыя хаты, каб хутчэй замасціць дарогу напрасткі праз балота. (Рэшткі гэтай дарогі захаваліся і носяць назву – Масцішча). Людзі былі вымушаны ставіць часовыя буданы. Адсюль і назва вёскі – Будзічы. Сяляне, кінутыя ў экстрэмальныя жыццёвыя ўмовы, вымушаны былі шукаць выхад з цяжкага становішча. Хто ведае, можа гэта і дапамагло стаць ім майстрамі, якія сваім умельствам былі вядомы далёка за межамі свайго раёна. Ніхто не мог зрабіць лепшай малатарні, лепшага ветрака, лепшага калаўрота – як будзічане. Гэтыя промыслы на той час давалі сялянам значныя заробкі.

Для Будзіч характэрна вулічная планіроўка. Гэта звязана з тым, што забудова паступова ўпарадкоўвалася, рабілася кампактнай, а з часам, у выніку сямейных раздзелаў палос зямлі і шчыльнай. Звычайна надзелы наразаліся перпендыкулярна дарозе, што перасякала поле, і апошняя станавілася адначасова і вясковай вуліцай.



**Вяночны двор в. Будзічы**

На прыкладзе Будзіч можна праназіраць усю гісторыю народнага дойлідства гэтай часткі Віцебшчыны. Калісьці прасцейшы сялянскі двор цалкам размяшчаўся пад адной страхой. А калі да жылля прыбудоўваўся хлеў значных памераў, з праездам і ўнутранным дзенніком, то ён меў уласную страху, спалучаную са страхой хаты. Нарэшце, гаспадарчыя пабудовы ставіліся чатырохкутнікам, а хата – сені-камора (клець), ці, інакш кажучы, жылое звяно, размяшчалася дыяметральна. Пры гэтым з боку ганка ставіліся свірны, клеці, істопка, вазоўня і ўтвараўся чысты двор. З супрацілеглага боку размяшчаліся хлявы і гаспадарчы двор. Жылое звяно магло перамяшчацца з дыяметральнага становішча на флангавае. Такі тып двара, пабудаванага ў пачатку XX стагоддзя ў вёсцы Будзічы быў перавезены ў Беларускі музей пад адкрытым небам. Яго жылое звяно першапачаткова складалася з хаты, сенцаў і варыўні. Пазней гаспадар да старой хаты дабудаваў новую. Насупраць жылога звяна стаялі два свірны, злучаныя паветкай, у якой нейкі час знаходзілася кавадла. Далей меліся шырокія вароты, праз якія можна было трапіць на дзяннік. На гаспадарчым двары знаходзілася стайня, два хлеўчыкі для свіней і авечак, хлеў для каровы, паветка і камора з акном, у якой улетку жылі парабкі і батракі. Стайня была злучана са свірнам агароджай з бярвення, закінутых у шулы (замётам). Такі ж замёт меўся і пад паветкай, паміж кароўнікам і каморай. Увесну, калі трэба было вывозіць у поле гной, замёт лёгка разбіраўся і воз мог заехаць на дзяннік з вуліцы і выехаць на



**Калодзеж-журавель сядзібы з в. Будзічы**

прыгуменне. З боку вуліцы і прыгумення жылое звяно злучалася адпаведна са свірнам і каморай брамамі з варотамі і каліткай. У двары знаходзіўся калодзеж-журавель і доўбленыя жалабы, па якіх вада падавалася на дзяннік да хлявоў.

Менавіта ў Будзічах у ХХ стагоддзі першымі пачалі ўмуроўваць у прыпечак пліту. Акрамя печкі ставілі таксама грубкі (сценкі, лежакі). Мясцовай асаблівасцю з'яўляецца канструкцыя грубкі з нішай, у якой умуравана пліта. У сенцах меліся вуглавая шафа, некалькі паліц для посуду і інструментаў, ашосткі, на якіх сушыліся мяхі, лаўка, некалькі плеценых і бандарных бочак, лесвіца на гарышча, часам жорны. У варыўні адгароджваліся засекі для розных відаў караняплодаў.

Для Будзіч характэрна ўжыванне шархуноў – самагучальных музычных інструментаў. Іх яшчэ называлі шархунцы, шалестуны, шумёлы, бомы, бразготкі. Інструмент складаецца з некалькіх (да 11) бронзавых (часам і медных) пустацелых шарыкаў розных памераў са шротам унутры, з прорaзямі па баках і вушкам у верхняй частцы. Пры патрэсванні ўзнікае меладычнае звонкае рознагалосае гучанне. У старажытнасці, паводле аргеалагічных звестак, шархуны былі элементам жаночага ўпрыгожання і выконвалі не толькі эстэтычную, але і абярэгавую функцыю. У XIX стагоддзі шархуны традыцыйна выкарыстоўвалі ў вясельным абрадзе: іх на скураным паску чаплялі коням на шыю. З 2-й паловы XIX стагоддзя шархуны сталі састаўным канструктыўным элементам бубна. Спрадвеку шархуны на Беларусі выраблялі мясцовыя кавалі.

У час Вялікай Айчыннай вайны Будзічы, размешчаныя ў глушы, пры балоце і лесе, падвяргаліся небяспецы. Хаця партызаншчына закранула гэтыя мясціны толькі краем, бо тут знаходзіўся не баявы, а гаспадарчы атрад немцаў. Яны зганялі людзей на будаўніцтва дарог, брукаванне вуліц. Аднак назву "вогненная вёска" можна прымяніць і да Будзічаў.

Зараз у вёсцы пражывае каля 35 чалавек.

# Буй

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*




У пачатку XX стагоддзя Буй уваходзіў у Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала каля 80 чалавек і мелася 149 дзесяцін зямлі. З 1921 года па 1939 год Буй знаходзіўся ў складзе Польшчы.

У ліпені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 10 двароў. На 2004 год у Буі пражывалі 4 чалавекі.



У 2007-08 гадах у Буі сталі распрацоўваць пясчаны кар'ер. У выніку гэтага тут была знойдзена нібыта нейкая сцяна з праходам у выглядзе аркі. Бачна, што сцяна складзена з цэглы. На жаль, ніякіх раскопак тут не праводзілі.

# Бярозаўка

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Ля хаціны дзеда Стася
Згуртаваўся раз народ
Там гудзелі і прасілі:
“Напішы дзед радавод.
Радавод для нашай вёскі.
Старажыл ты паміж нас,
І разумны – самы-самы!
І на пенсіі – ёсць час.
Напішы, дзядуля, чуеш?
Хто і дзе, калі тут жыў
Усе прозвішчы, мянушкі
На бумагу палажы.
Хай дастануцца нашчадкам,
Што ў Бярозаўцы жывуць
Твае запісы пра вёску.
Ад каго ім больш пачуць?”
Сеў дзядуля ў задуменні
Каля хаткі на ўслон.
Як жа вырашыць задачу –
Доўга думаць мусіў ён.
Як жа цяжка было дзеду
Сваю памяць варушыць
Прыгадаў: хто тут пры Польшчы
Мусіў працаваць і жыць.
Хутары стаялі ў россып:
На ўзгорку жыў Малаш,
Каля лесу гаспадарыў
Ён жа сам: Каросцік Стась.
Ля мястэчка: у нізіне,
Там Ігнацкі шчыраваў.
Івашкевіч – ля крынічкі
Сваю хатку збудаваў.
А, здаецца, каля кладкі
Хутар Беленькага быў.
Гаспадар, ой, моцны, хваткі –
Пчаляром талковым слыў.
Ля дарогі, што на Поню,
Жыў Надольскі Казімір;
Для ўсіх дзяўчатак вёскі
Прыгажун быў і кумір.
Сядзеў дзедка на ўслоне
І патыліцу часаў:
Помніць ён як Мірусь Гурскі,
Сабе месца выбіраў.
Але ж выбраў! Ну, халера!
Каля грэблі дом купіў!
А зямелька ж там радзіла:
Шмат год бульбачку садзіў.
Корсак, Ліпчык, Блажыевіч,
Конан, Машка і Кароль,
А яшчэ – Мацко і Воран –
Маладосці яго боль.
Вось дзе, брат, жылі дзяўчаты;
Самы цымус! Самы смак!
А за імі жыў Махальскі –
З імянушкай смешнай – “Рак”.
А – мянушкі! Ой, брыдота!
Каго толькі не было!
“Чорт”, “Гарбуз”, “пан Шмель”, “Юзюка”,
“Ястраб”, нават – “Памяло”!
“Крот”, “Батлей”, “Скабар” і “Кога”,
“Абезьяна” і “Ваўчо”.
Усміхнуўся дзед у вусны:
Абзывалі і яго…

***

Напішу пра ўсё ўнукам
Вырашае ўрэшце дзед:
Хай жа ведаюць нашчадкі
Хто пакінуў у вёсцы след.

А вось якая існуе легенда пра паходжанне назвы вёскі Бярозаўка.

Гэта было вельмі даўно... Сярод лесу стаяла адна хаціна, а жыла ў ёй бедная, але прыгожая дзяўчына – Алена. Ля хаціны цёк чысты, блакітны ручай. Пакахала аднойчы дзяўчына Алена аднаго маладога паніча, які прыехаў сюды з далёкага краю, жыў ён у панскім маёнтку. Сустрэліся яны каля ручаіны, калі малады паніч быў на паляванні. Потым былі сустрэчы, пацалункі, абяцанкі. Але каханне паніча было нядоўгім. Паехаў ён у далёкую краіну. Алена засталася адна. Доўга яна чакала маладога паніча, клікала яго, слязьмі залівалася. Але ён не прыйшоў. Прасіла дзяўчына ручай, сонейка, каб вярнулі каханага. Але нічога не дапамагло. Засталася Алена адна. Доўга яна стаяла ў адзіноце на тым месцы, дзе сустрэліся яны з панічам. А потым, як гавораць людзі, знікла, сышла Алена, а куды, ніхто не ведае. Мабыць паніча пайшла шукаць. А ля ручаіны вырасла танклявая белая бяроза. Яна і дала пачатак бярозаваму гаю за вёскай. А ля хаціны дзяўчыны пачалі сяліцца людзі, а месца, дзе сяліліся, пачалі называць “ля бярозы”, “ля бярозкі”, Бярозаўкай.

Што датычыцца сучаснай гісторыі вёскі, то высвятляецца адзін цікавы факт. На карце 1914 года для афіцэраў нямецкай арміі вёска Бярозаўка нават не значыцца. На ёй нанесены Бубны, Гняздзілавічы і нават Kripyla (Крыпулі). Можна зрабіць вывад, што Бярозаўка была вельмі маленькай вёсачкай і ніякага стратэгічнага палажэння ў ваенным плане не мела. Гэта карта знаходзілася ў былога настаўніка Забродзьеўскай школы, краязнаўцы Максама Максімавіча Ушакова.



“Слоўнік геаграфічны Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх” падае наступныя звесткі аб Бярозаўцы: *“Бярозаўка (Berezówka, Brzozówka), фальварак, павет Вілейскі, 3-я акруга паліцэйская, гміна Параф’янава (12 вёрст), касцёл філіяльны парафіі Будслаў, бровар, млын, станцыя паштовая* [паштовая станцыя адносілася да Бярозаўкі толькі фармальна – на самай справе яна была у суседніх Крыпулях, што ляжаць пры паштовым тракце з Дзісны ў Вілейку – заўв. К.Ш.]. *У 1865 годзе ўласнасць Свентаржэцкіх”*. Да маёнтка адносіліся вёскі Вараны, Анісаўка, Крыпулі, Мацееўцы, Глінішча.

З 1921 года па 1939 год Бярозаўка ўваходзіла ў склад Польшчы. З 1940 года па 1954 год вёска была цэнтрам Крыпульскага сельскага Савета. У 1949 годзе арганізаваны калгас імя Жданава. Абеліск “Вечная памяць землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны” быў адкрыты ў 1969 годзе. Ён быў узведзены на сродкі калгаса імя Жданава, старшынёй якога быў Грыневіч К.С. Казімір Станіслававіч ініцыіраваў гэту справу, а ўсе калгаснікі яго падтрымалі. Помнік вырашылі ўзвесці сваімі рукамі. Абеліск атрымаўся вельмі прыгожы, зорка на ім у цямны час сутак свяцілася. На металічную пліту абеліска былі нанесены прозвішчы 33 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Зараз у Бярозаўцы пражывае каля 290 чалавек.

У цэнтры вёскі можна ўбачыць рэшткі былой сядзібы, якую пабудавалі Свентаржэцкія. У XIX стагоддзі ёй валодаў Уладзімір Свентаржэцкі. Існуе меркаванне, што ён быў родзічам вядомага палітычнага дзеяча Беларусі Баляслава Часлававіча Свентаржэцкага, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-64 гадоў. Б.Свентаржэцкі служыў у Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе, а як член Мінскага губернскага камітэта ўдзельнічаў у распрацоўцы ўмоў сялянскай рэформы 1861 года. З 1863 года знаходзіўся ў эміграцыі ў Францыі.



Двор Уладзіміра Свентаржэцкага вызначаўся памерамі. Дваровых было каля 26 чалавек, прыгонных сялян – 216 (41 двор). Зямлі даводзілася па 3 дзесяціны на двор. Павіннасці былі нялёгкімі: па 156 мужчынскага і жаночага прыгону з двара, 8 згонаў з чалавека, 2 курыцы з двара, 20 штук яек, 3 гарнца ягад, 60 штук грыбоў, дзве дарогі ў год па 150 вёрст у абодва канцы, начная варта па чарзе.

Сядзіба стваралася ў некалькі этапаў, таму вызначыць дакладна яе першапачатковую планіроўку цяжка. У апошні час прыняла эклектычныя рысы. З XIX стагоддзя добра захаваліся 2 вадаёмы на мясцовым вадатоку, адзін з іх (заходні) асабліва вялікі (да 2 га). Маляўнічае люстэрка вады з востравам, якое абкружана вербамі з экзатычнымі кронамі, прыдае сядзібе рысы велічнасці з боку ўезда. На беразе ў 1862 годзе быў пабудаваны бровар (зараз выкарыстоўваецца як млын), тыповае вялікае збудаванне (28 на 8 м) з цэглы з павышаным цэнтральным аб’ёмам і двума ніжэйшымі бакавымі. Яго гадавая прадукцыя складала 17 тысяч вёдзер спірту.



Сядзіба не мае выразнай асноўнай восі. Вадаёмы і парк кампазіцыйна не звязаны з яе параднай часткай. Сядзібны дом размяшчаўся збоку адносна вадаёмаў і парку, да яго прымыкаў гаспадарчы двор. Парк спланаваны па тыпу эканамічнага ў выглядзе баскета. Яго ўтвараюць лінейныя пасадкі ліпы рознага ўзросту. Усходняя алея мае ўзрост больш за 150 гадоў і з’яўляецца фрагментам былой сядзібнай кампазіцыі. Размешчана на адной восі з дамбай паміж вадаёмамі. Ліпы ўтвараюць суцэльную сцяну, месцамі ў ніжняй частцы ствалы зрасліся, вышынёй 25-27 метраў. Усходняя алея закладзена прыкладна ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Яна добра захавалася,

праходзіць уздоўж вуліцы вёскі: шырыня 6 метраў, вышыня дрэў 22-25 метраў. Прастора баскета служыла садам.



У канцы яго была пабудавана Козел-Паклеўская капліца (захаваліся сцены). Капліца адносілася да парафіі Будслаў і ўпершыню згадваецца ў 1849 годзе. Ізаляванасць, утульнасць капліцы надавала абсадка з боку сада двума радамі бэзу і рабіннікам. Адпаведна ім пракладзены паўкруглы канал, цераз які на восі капліцы меўся масток. У садзе, бліжэй да палаца, ліпы, пасаджаныя шчыльна ў выглядзе авала, утвараюць альтанку. У ёй была падлога, стаяў стол.



16 лістапада 2003 года ўведзена ў строй Капліца Маці Божай Вострабрамскай. На беларускай зямлі гэта другая падобная святыня. Першая капліца была пабудавана ў Мосары (Глыбоцкі раён) і асвечана ў 1996 годзе.

**Мілы куточак...**

Мілы куточак-Бярозаўка, вёска
Чаруюць нам вока-абапал бярозкі,
гаі, пералескі і сцежкі-дарогі,
балотца , палі ад Казёнкі да Поні.
Сучаснасць,мінулае і даўніна,
Сышліся, спляліся ў куточку здаўна.
Млын старажытны і бровар каменны,
Знаёмы ў Бярозаўцы шмат пакаленням,
Каплічка, старыя руіны ад замка,
Дарога-каменка, ласкава так “Брамка”.
Вабяць, чаруюць пясчотай вярбіны
Ручай каля млына, пявучы, журлівы,
А ліпы высокія-цуда-алейка
Жыве больш стагоддзя дрэваў сямейка
Пры Польшчы яшчэ збудаваная школа
Вабіць званочкам і зараз наўкола

А ў возера сіняе-нібы ў
люстэрка
Глядзіцца касцёл-вернікаў
мерка
Вёска-радзіма-герояў-калыска,
Кветкі заўсёды ля абеліска
Сучасная вёска-кругом прыгажосць!
Пошта, садочак і крамы ёсць,
Хаты, прыгожая архітэктура,
У цэнтры славуты наш
Дом Культуры
Дарога шырокая, роўная, зграбная,
Дворыкі ў кветках, сядзібы
прывабныя
Людзі ў вёсцы, як пчолкі шчыруюць
Каб сёння і заўтра яна працвітала,
У шчасці жыла, каб гора не знала

**Легенда аб паходжанні вёскі**

Нашу вёску Бярозаўкай клічуць здаўна
Бо жыве ў народзе легенда адна
Тут на хутары ў беднай хаціне
Прыгажуня жыла – сіраціна
Вочы ясныя – колеру нашых нябёс,
Вусны – ружы, а стан як у гонкіх бяроз
У руках яе праца кіпела
Сэрца, добрае, шчырае мела.
Заблудзіўся ля хутара панскі сынок,
Як ўбачыў дзяўчыну, далей ехаць не змог
На яе ён не мог надзівіцца
Вусны – ружы, а вочы – крыніцы
І ў чароўную гэту хвіліну
Закахалася ў хлопца дзяўчына
Палюбіла яго, падарыла красу
Дазваляла расплесці дзявочу красу,
Абмануў паніч яе сірацінку
Цесна панічу ў беднай хацінцы,
Абяцаў, як паедзе ў чужую краіну
Не забудзе ніколі, красуню дзяўчыну.
Прыйдзе час – на цябе ажанюся
Абяцаў – хутка, хутка вярнуся.
А дзяўчынка, як тая бярозка стаяла
І чакала, чакала, чакала.
Усіх прасіла: і сонейка, і й долы:
Памажыце, мне мілыя ў горы…
Ручаямі цяклі яе слёзы –
Абярнулася дзеўка – бярозай.
Прыгажосцю сваёй маніць модцаў яна
У Бярозаўцы селяцца людзі здаўна

# Бярозкі

*Цэнтр Бярозкаўскага сельскага Савета*

Вёска Бярозкі вядома з XIX стагоддзя. У 1936 годзе тут створана МТС. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска аказалася ў партызанскай зоне, дзе падпольную работу ўзначалілі Франц Гурыновіч і Ілля Насеннік. У канцы красавіка 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Котбус" немцы абстрэльвалі Бярозкі нават з самалётаў. І менавіта ў гэты перыяд здзейсніў тут свой подзвіг партызан В. Тарасевіч. Вось як гэта ўспамінае камандзір партызанскай брыгады "Жалязняк" Іван Піліпавіч Ціткоў: *"Бой з карнікамі на ўчастку абароны 4-га атрада брыгады "Жалязняк" перамясціўся да пераправы праз раку Вілія. Каля вёскі Мацеева ворагу ўсё ж удалося перабрацца на наш бераг і развіць поспех у бок вёскі Бярозкі. Тут, на лясной дарозе, на немцаў патрапіў сувязны 4-га атрада Тарасевіч. Гітлераўцы хацелі ўзяць партызана жывым і кінуліся да яго каня. Тарасевіч выхапіў з сумкі супрацьтанкавую гранату і кінуў яе пад каня. Грымнуў выбух, які пахараніў самога героя і да дзесяці фашыстаў. Скора сюды паспелі коннікі на чале з У. Кліманскім і прымусілі немцаў адступіць".*



У 1964 годзе ў Бярозках пастаўлены абеліск на Брацкай магіле 81 партызану брыгады "Жалязняк" і 6 савецкім воінам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.



А ў 1980 годзе каля будынка праўлення саўгаса ўстаноўлены бюст Герою Савецкага Саюза Аляксандру Іванавічу Чэрнышу.

У 1970 годзе ў Бярозках знойдзены скарб, які налічваў 32 экземпляры. Ён складаўся з 15, 20 капеек, палцінікаў, паўпалцінікаў, рублёў Расіі, злотага, 5 злотых, 20 капеек – 40 грошаў, 25 капеек – 50 грошаў, 30 капеек – 2 злотых, ¾ рублёў - 5 злотых Царства Польскага; серабро. Скарб датуецца 1823 годам.

У 2008 годзе ў Бярозках пабудавалі аграгарадок.

# Валасатка

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Паселішча за 4 кіламетры на паўднёвы захад ад Докшыц. Да канца 18 стагоддзя было ў складзе маёнтка Докшыцы, які належаў капітуле жамойцкай. У 1795 годзе - дзяржаўная ўласнасць, 52 душы мужчынскага і 52 жаночага полу. Пасля таго, як горад Докшыцы быў забраны ў казну, Валасатка стала цэнтрам маёнтка Докшыцы (уласнасць Іосіфа Свяціцкага). Да маёнтка адносіліся паселішчы Дамашы, Крывічане, Вецяра, Плітніца, Крыкуны, Лаці, Рулякі, Загарані, Чарніца. Пазней маёнтак распаўся на шэраг больш дробных.



**Распяцце на ўскраіне няіснай вёскі Валасатка**

Паводле “Слоўніка геаграфічнага”, Валасатка ў XIX стагоддзі была фальваркам, уласнасцю Грыгаровічаў, 170 дзесяцін, пазней стала дзяржаўнай ўласнасцю. Адносілася да праваслаўнай парафіі Гняздзілава (Казённае). Паводле мапы 1876 года – 6 двароў. У 1909 годзе згадваюцца вёска (6 двароў, 40 жыхароў) і фальварак (4 двары, 4 жыхары) Валасатка. У 1921 годзе ў вёсцы Валасатка Докшыцкай гміны 17 дамоў, 83 жыхары, згадваецца і фальварак Валасаткі Параф’янаўскай гміны (напэўна, гэтае паселішча пазней аб’ядналася з вёскай Валасатка). Солтысам вёскі ў 1920-21 гадах быў Міхал Румшэвіч. У 1930 годзе 26 двароў, 93 жыхары, 235 дзесяцін зямлі, з якой 61 гектар належаў Стэфану Альхімовічу.

У 1848 годзе тут пабудавана капліца – помнік драўлянага дойлідства. Уяўляе сабой невялікае 6-граннае ў плане збудаванне з драўлянага бруса, каркаснай прадукцыі. Аснова капліцы – невысокі цокаль (зруб), устаноўлены на валунах. Нясучую канструкцыю складаюць 6 вуглавых брусаў, якія апіраюцца на цокаль, а ўверсе злучаны гарызантальнымі бэлькамі. Паміж брусамі – сцены з гарызантальных дошак з нашчыльнікамі. Завершана капліца невысокім гонтавым шатром з макаўкай. У інтэр’еры шацёр апіраецца на крыжавіну. На адной з граняў капліцы – дзвярны праём, на процілеглых дзвюх – вузкія аконныя праёмы ўверсе. У





інтэр’еры ўстаноўлена скульптура XVIII стагоддзя “Укрыжаванне з перадстаячымі”, выкананае народнымі майстрамі. У цэнтры кампазіцыі ўкрыжаваны Хрыстос, па баках ад яго Дзева Марыя і Іан Прадцеча. Над уваходам у каплічку вісіць таблічка з надпісам “Zmiłuj się nad nami, Panie. Od nagłej nespodzewanej śmerci i gnewu Twego zachowaj nas. Ratuj [od] choroby cholery. 1848 R” (“Змілуйся над намі, Пане. Ад трагічнай нечаканай смерці і гневу Твайго захавай нас. Ратуй [ад] хваробы халеры. 1848 г”.).

Па народнаму павер’ю капліцу пабудавалі пасля таго, як у гэтай мясцовасці адбыўся мор. Многа людзей памірала. Ніякія лекі не дапамагалі. Пасля таго, як людзі пабудавалі капліцу і сталі тут маліцца, хвароба адступіла.

1 студзеня 1950 года ў Валасатцы нарадзіўся Андарала Аляксандр Іванавіч. Пасля заканчэння ў 1967 годзе сярэдняй школы ў горадзе Докшыцы працаваў на вытворчасці, служыў ў арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам у Бярозаўскай сярэдняй школе.




У 1971 годзе паступіў, а ў 1976 годзе скончыў аддзяленне "Біялогія і хімія" факультэта **<u>естествознания</u>** Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага, пасля чаго стаў працаваць у гэтай навучальнай установе.

У 1980 годзе паступіў у аспірантуру Мінскага дзярдаўнага педагагічнага інстытута на спецыяльнасць "Тэорыя і гісторыя педагогікі". Пасля заканчэня ў 1983 годзе аспірантуры і абароны кандыдатскай дысертацыі працуе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага, а затым у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка: асістэнт (1983 г.), старэйшы выкладчык (1984 г.), дацэнт (1985 г.), намеснік дэкана факультэта (1987 г.), дэкан факультэта (2000 г.), прарэктар універсітэта (2001 г.). Рэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДПУ (2003 г.), першы прарэктар БДПУ (2005 г.).

Вобласць навуковых інтарэсаў А.І. Андаралы — гісторыя і тэорыя вышэйшай педагагічнай адукацыі. Ён аўтар больш за 50 навуковых прац. Ажыццяўляе навуковае кіраўніцтва аспірантамі і суіскальнікамі. Падрыхтаваў аднаго кандыдата навук. З’яўляецца членам савета па абароне кандыдатскіх дысертацый па спецыяльнасці — "Агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі".

Аляксандр Іванавіч Андарала з’яўляецца членам каардынацыйнага савета па павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, старшынёй рэспубліканскага бюро метадычнага аб’яднання па спецыяльнасці "Педагогіка і методыка пачатковага навучання", вучоным сакратаром універсітэта, вучоным сакратаром савета па абароне дысертацый.

# Валкалата

*Цэнтр Валкалацкага сельскага Савета*

Балота, узгоркі ды рэчкі,
Уздоўж вуліц стракатыя хаты.
З загадкавай назвай мястэчка.
То гэта ж яна, Валкалата.
Адкуль і чаму прыйшла назва,
Не ведаюць нават старыя.
Спытаць мне аб гэтым, мо, вязаў:
Маўчаць дрэвы, хоць і жывыя.
Дом люду быў тут, сінагога.
І школа здаўна працавала.
І верылі людзі ў Бога,
Каменны касцёл збудавалі.
Заўсёды ў працы руплівай
Мае землякі паспявалі:
Ці ранняй вясной, ці ў жніўні
З цямна да цямна працавалі.

На дзетак глядзелі з надзеяй,
Ім зычылі лепшую долю...
Гады, нібы птушкі ляцелі,
Хапала і шчпсця, і болю.
Няма сінагогі, яўрэяў
Фашысты забілі вайною...
А сонейка свеціць і грэе
Улетку і ранняй вясною.
Жыццё прадаўжаецца зноўку,
Па крыху ідзе чарадою.
Салоўкі спяваюць на золку,
Мятуць завірухі зімою.
А вёска ўсё прыгажэе,
Шчэ радуе вока палетак.
Шкада, люд так хутка старэе,
Ды менш нараджаецца дзетак.

***Ганна Шылько***

Гэта было даўно. На гэтым месцы, дзе цяпер вёска Ваўкалаты, жыў некалі вядомы ў наваколлі паляўнічы Ваўкалат. Памяць аб ім і захавалася ў назве мястэчка. Страляў ён трапна, на слых. Пачуе, бывае, што цецярук недалека балбочыць ці зязюля кукуе, ён прыслухаецца і застрэліць птушку здалеку, не бачачы.

Да гэтага часу існуе мноства маладаступных, зарослых "воўчым кустоўем куткоў". Таму лёгка дапусціць, што ў мінулыя часы ў лясных нетрах вадзілася шмат ваўкоў. Мясцовыя паляўнічыя рабілі аблавы і забівалі драпежнікаў. На паляванне звычайна выходзіла ўся вёска. Са стрэльбамі – лічаныя паляўнічыя, іншыя ўдзельнікі – хто з чым: адны са спецыяльнымі бразготкамі, другія – з розным посудам, трэція абаранялі ад ваўкоў "латамі", іншыя крычалі і "цюкалі" на ўвесь лес.

Такое паляванне вельмі складанае і небяспечнае. Самым галоўным было даведацца, дзе асцярожны і разумны звер хавае сваё логава. Паляўнічыя ўмелі імітаваць воўчы голас, ведалі "воўчую навуку". Ваўка трэба было прывабіць. Калі да ваўка падысці ў патрэбны час, толькі каб не скочыў, падаць голас, ён абавязкова адкажа. Паляўнічыя ўмелі добра распазнаваць ваўкоў па голасу. Яны валодалі гэтым майстэрствам і прываблівалі, вызывалі ваўкоў голасам. За гэта умельства "ваўком выць" чалавека называлі ваўкалакам. Адсюль і сталі вёску называць Валкалаты.

Аднак, гэта легенды. А ўпершыню вёска Валкалата ўпамінаецца ў 1522 годзе. На тыпалогію мястэчка ў старадаўнія часы вялікі ўплыў рабіў ландшафт. Як і балотныя сельскія паселішчы, былі вядомы і балотныя мястэчкі. Валкалата – яркі прыклад таму. Гэта мястэчка ўзнікла сярод прасторнай балоцістай нізіны ракі Сэрвач, на скрыжаванні старажытных гандлёвых шляхоў мясцовага значэння: з Докшыц да Мядзеля і з Будслава да Дунілавіч і Пастаў. Цэнтрам мястэчка было скрыжаванне вышэйпазначаных дарог. У такім выпадку плошча фарміравалася шляхам выкарыстання часткі прасторы паміж дарогамі і часцей за ўсё набывала трохвугольную форму. На павароце ў бок Яблонцаў стаіць драўляны дом местачковага ўзору: пасярэдзіне – ганак, злева з дзвярамі ў тарцовай сцяне відаць былая крама, справа – жылыя пакоі гаспадара. Уся пабудова накрыта вальмавай страхой.

У 1524 годзе маёнтак Валкалата належыў Альжбэце Багданаўне, удаве князя М. Радзівіла. Маёнтак уваходзіў у склад Мядзельскай воласці Вялікага гнява Літоўскага. Пасля смерці Альжбэты (прыкладна 1540 год) Валкалата перайшла да яе дачкі Алёны Радзівілаўны, жонкі князя Ю. Алелькавіча-Слуцкага. Пазней уласнасць князёў Слуцкіх. У XVII стагоддзі Валкалата вядома як мястэчка Ашмянскага павета, належала Далмат-Ісайкоўскім, які ў 1624 годзе заснаваў тут касцёл.



Хата-лаўка ў вёсцы Валкалата. XIX ст.

З 1793 года Валкалата ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі і стала належыць Зяньковічам, потым Бжастоўскім, Аскеркам, Жышкам. У 1859 годзе адчынена народнае вучылішча, якое ўтрымлівалася на сродкі сялян, і часткова, дзяржаўнага казначэйства. Вучылішча мела свой школьны будынак. Адным з першых настаўнікаў быў выхадзец з сялян Ягор Сакалоў, які атрымаў хатняе выхаванне. У 1886-87 навучальным годзе на ўтрыманне вучылішча сяляне выдзелілі 209 рублёў; у ім вучылася 30 хлопчыкаў. А настаўнікам у гэты год быў Дзмітрый Жукоўскі, які скончыў курс у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Законанастаўнікам каталіцкага спавядання быў ксёндз Нікодым Цыцан (жалаванне ён не атрымліваў).

У пачатку XX стагоддзя ў вучылішчы налічвалася 85 вучняў (19 із іх былі дзяўчынкі). Настаўнікам працаваў выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Вікенцій Рыжкевіч, які атрымліваў 150 рублёў ад дзяржаўнага казначэйства і ссыпку ад сялян.

У канцы XIX стагоддзя сярод сялян Валкалацкай воласці даволі распаўсюджаным было ткацтва і пража: ткалі мешкавіну, падкладачны матэрыял, на сарочкі і тонкае; ткалі грубае сукно, іншыя шарсцяныя вырабы (цясёмкі, паясы). Свае вырабы сяляне прадавалі на кірмашах і базарах.



У 1884-93 гадах у Валкалатах быў пабудаваны Касцёл Святога Іаана Хрысціцеля. Гэта найбольш старажытнае культавае збудаванне. Парафія была



заснавана яшчэ ў 1524 годзе Лізаветай Радзівіл. У гэты ж год, па словах саміх жыхароў Валкалат, быў пабудаваны тут першы касцёл. Ён быў драўляны. Расказваюць, што пазней царскія ўлады меркавалі забраць яго і замяніць на царкву. Пробашч Нікадэм Цыцын вельмі хацеў замяніць драўляныя сцены храма на каменныя і звярнуўся да ўлад з просьбай аб рамонце касцёла. Яму дазволілі, але папярэдзілі, каб было зроблена хутка. Разабралі стары касцёл і пабудавалі новы. Не было яго чым накрыць, і людзі выкарысталі палатно. Затым пакрылі бляхай. Да цяперашняга часу захавалася званіца, якая была пабудавана ў 1748 годзе. Існуючы цяпер мураваны касцёл узведзены ў псеўдабарочным стылі, кансекраваны біскупам віленскім А. Звяровічам. Як гэта было характэрна для дойлідства Віцебшчыны таго часу, сцены збудавання змураваны з бутавага каменю, а дэкаратыўныя дэталі выкананы з цэглы і атынкаваны. Алтары ўпрыгожаны скульптурнымі выявамі святых і анёлаў, дэкаратыўнай разьбой. У фігурных філёнгавых рамах размешчаны каштоўныя абразы, сярод якіх абраз “Маці Божая з дзіцем” (1667). Падобны барочны дэкор мае арган, вырашаны як соеасаблівы карынфскі порцік са складаным фігурным завяршэннем і валютамі па баках. Многія элементы начыння інтэр’ера паходзяць з больш ранняга касцёла, які існаваў на гэтым месцы.

Вельмі любяць мясцовыя жыхары-католікі, праваслаўныя, іншаверцы гэты храм, даражаць яго гісторыяй. Ганарацца тым, што валкалацкі касцёл Святога Яна – пастаянна дзейнічаючы. Пачынаючы ад моманту ўзвядзення і да гэтых дзён, ён прымае ўсіх, хто жадае наблізіцца да веры. На тэрыторыі касцёла знаходзяцца надмагільныя помнікі, пліты, на якіх яшчэ можна прычытаць надпісы, прозвішчы тагачасных святароў і пробашчаў: Аўгусціновіч – 1847 год, дэкан Нікадэм Цыцын – 1901 год, ксёндз Баляслаў Сакалоўскі 1873 – 1911 гады.





Нават у гады Вялікай Айчыннай вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі каталіцкі храм у Валкалаце працягваў дзейнічаць. Але мясцовыя жыхары схавалі ў зямлю на тэрыторыі касцёла ад ворагаў два вялікія званы. У канцы 80-х гадоў ХХ стагоддзя старэйшы жыхар Іван Мацюшонак паказаў месца захоўвання аднаго з іх. Звон адкапалі і ўладкавалі на месца. Другі ж не знойдзены да гэтага часу.





У Валкалаце быў заложаны парк. У апошні час ім валодалі Васілеўскія. Займае маляўнічы лагчынападобны схіл і з трох



бакоў абкружаны алеямі, якім, верагодна, больш за два стагоддзі. Самая велічная (шырыня 8 метраў) паўночная алея,ліпы якой вышынёй 26-28 метраў змыкаюцца кронамі і ўтвараюць зялёны карыдор. У 30-я гады XX стагоддзя ў парку пабудаваны два свірны. Адзін з іх выдзяляецца паўпаверхам з маленькімі ў выглядзе шчылін вокнамі, мае мансардны дах і галерэю. Тут жа захаваліся і мураваныя сцены былых панскіх склепаў.

А вось які артыкул можна знайсці ў газеце “Наша ніва” ад 18 лістапада 1910 года: “…Воўкалатцы народ культурны. Якіе трэба машыны для гаспадаркі, яны самі умеюць рабіць і, нават, яшчэ прадаюць у суседнія воласьці. Так, напрыклад, ніхто не зробіць лепшай малатарні, лепшага калаўроту, лепшага ветрака, - як воўкалатцы. Іншыя зімы майстры бяруць за калаўроты па 150 – 200 – 300 рублёў, малатарні прадаюць па 70 – 100 рублёў. Гэтыя промыслы даюць вялікія заработкі некаторым сялянам. – Апрача гэтых, простых, машын, яны умеюць робіць другія, мудрэйшыя – паравыя. Разніца ў карысці для гаспадаркі ад тых і другіх машын вялікая. Першыя машыны можна прадаваць, рабіць імі для сябешто-нібудзь – і нікога не баяцца. Другімі-ж можна рабіць толькі забраўшыся ў балото або ў лес, дзе ніхто ня ходзіць, і то ня смела, а паставішы кругом калавурных. Машыны гэтыя – праваркі. У сярэдзіне акцябра вось якое здарэньне было з праварком. Памалаціўшы дабро, сяляне вёсак Яблонцы і Кузельшчына захацелі самі сябе пачаставаць, што цэлае лето працавалі. Намалоўшы жыта, знайшлі яны віннікі, суседа з другой вёскі, каб ён выціснуў ім крошку гарэлкі. Віннік знайшоў месца на балоце, між лесу, каб тым і другім гаспадаром было пароўню хадзіць на варту і на “пакаштаваньне”. Рашчына была разведзена і праварок пайшоў у ход. Трэба-ж было ў гэты раптоўны час сялянам Кузельшчыны пасварыцца. Скрыўджэны селянін пайшоў і заявіў вураднiку, што гоняць гарэлку. Вураднік са стражнікамі паехаў лавіць віннікаў. Праездзіўшы цэлую ноч па балоці, паліцыя на рэсьце напаткала сьлед і дабралася да праварка. Віннікі, увідеўшы няпрошэных госьцей, давай Бог ногі. Адзін ад страху і бота атчураўся і ляцеў дамоў вёрст пяць з босай нагой. Паліція, найшоўшы праварок, ні надта думала гнацца за бегунамі, і за гэто віннікі кажуць вялікае дзякуй. Адзін стражнік хоць і ні воўкалацец, а лебядзевец, ня менш панімаў граматы хадзіць каля праварка, як і воўкалатцы. Агледзіўшы усе кублы, ён не пазволіў урадніку вязці іх дамоў, вувярнуўшы усю дабрыню на сьнег, бо ешчэ былі два заторы не пачынаныя, а трэці канчаўся. Ён сказаў вураднiку ехаць з другім стражнікам дамоў, сам застаўся глядзець за парадкам, “каб часам агонь не звёўся пад катлом”.

Што датычыцца далейшай гісторыі Валкалатаў, то з 1921 года па 1939 год вёска ўваходзіла ў склад Польшчы. 12 кастрычніка 1940 года Валкалаты сталі цэнтрам сельскага Савета. У 1975 годзе тут устанавілі два помнікі: У.І. Леніну і на ўшанаванне памяці 45 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Зараз у вёсцы пражывае каля 380 чалавек.

У цэлым, Валкалаты з'яўляліся да 1941 года своеасаблівым цэнтрам, дзе пражывала шмат яўрэяў. Вось як апісвае іх жыццё ў даваенны і ваенны час Руслан Серада ў артыкуле "Яўрэі вёскі Валкалаты", які змешчаны ў інтэрнэце:

"Обычное западнобелорусское местечко, где бок о бок с белорусами жили евреи, поляки, татары.

Довоенные волколатские фамилии: Аксельрод, Лазовик, Менкес, Ходос. Но в основном старожилы помнят своих соседей по именам, а кому какая фамилия принадлежала – затрудняются сказать.

Евреи селились в центре местечка. Одни семьи жили зажиточно, другие еле сводили концы с концами.

Биньямин, например, был зажиточным человеком. Его семья, как и его соседа Залмана, занималась выпечкой хлеба и булок. Обе семьи имели небольшие лавки, которые приносили постоянный доход. Старожилы помнят расторопную хозяйку-пекарку жену Залмана – Рейзл. Особенно славилась ее булка "ситница", сероватого цвета с чуть кисловатым привкусом. Рецепт этой булки пекари держали в секрете. Эта семья еще торговала сельскохозяйственным инвентарем, кожей и пивом.

Семья старика Исраэля держала корчму, где всегда было свежее пиво и лимонад "Сеналька". За прилавком мужу помогала жена Рыся.

Сын Исраэля – Элиягу, жил отдельно от отца со своей семьей и занимался более прибыльной торговлей, по доходам приравнивая себя к зажиточным Биньямину и Залману. Он торговал мануфактурой.

Менкес Шмая занимался перепродажей скота.

Берка держал магазинчик, где торговал мануфактурой, сельхозинвентарем и дешевой селедкой, которую быстро раскупали крестьяне. Семья жила зажиточно.

Гедалья занимался мелкой торговлей и ремеслом.

Пинхас – сын Залмана, женился на дочери Гедальи – Песи. Арендовал дом. Торговал.

Лозовик Давид занимался ремеслом и торговал красками для пряжи и ткани.

Хаим был ремесленником.

Хацкель – самый бедный еврей местечка. Занимался ремеслом и торговал сахарином. Детей было много (семь или восемь), и нужда была постоянной спутницей этого трудяги.

Так из одиннадцати семей сложилась маленькая еврейская община местечка Волколата.

Возле дома, где жила семья Гедальи, была молельня. Вел службы старик Исраэль. Его образ был очень колоритен, и он, более чем кто из евреев, запомнился старожилам местечка и соседних деревень. Дети-белорусы запомнили его молящимся в талите, в бархатной ярмолке, со спадающей на грудь широкой седой бородой.

В сентябре 1939 года Западная Беларусь вошла в состав СССР. Польская власть сменилась на советскую. Политические перемены почти не

затронули волколатских евреев. Все шло, как и ранее. Лишь в 1940 году выехал куда-то с семьей Берка и умер старик Исраэль. Похоронили главу общины на еврейском кладбище в местечке Дуниловичи.

В июне 1941 года немецкие солдаты пришли в Волколату как-то незаметно. Большие дороги обходили местечко стороной, и очередное изменение власти прошло без сильных потрясений. Советские активисты подались на Восток, и жизнь людей затихла в предчувствии неведомого.

Немцы, по прибытии в местечко, назначили старосту и стали благоустраивать окрестности. Всю молодежь направили на ремонт дорог. Люди разных национальностей были собраны на работу, и ни у кого в тот момент не возникало мысли о надвигающейся трагедии.

Июль-сентябрь 1941 года прошли без кровавых акций по отношению к местному населению.

Поздней осенью из Дуниловичей в Волколату приехал небольшой отряд немцев и, построив все десять семей евреев в колонну, погнал в Дуниловичское гетто. Евреи заранее знали о переселении и за несколько дней до отправки раздали часть имущества соседям, надеясь все же вернуться….

Во время ликвидации гетто в Дуниловичах трем дочерям Исраэля удалось бежать. Они поздно вечером пришли в дом Зофира Станиславовича Буялича в деревню Виржи, в трех километрах от Волколаты, и попросили о помощи. Хозяин пожалел беглянок и решил помочь. Хотя знал, чем грозит укрывательство евреев ему, его жене и трем дочерям.

Пару дней Буялич прятал Меру, Сару (Розу) и Дину на печи, а после ночью перевел в баню, которую через день протапливал. В бане девушки прожили около трех недель, но там прятаться стало опасно, соседи интересовались, почему стали так часто топить баню. Зофир Станиславович решил пойти к своему односельчанину старику Антонию Любецкому, чтобы посоветоваться, что делать дальше с Исраэлевыми дочками. Старик решил взять девушек к себе, так как жил он на краю деревни с внучкой Юзефой и к ним мало кто из соседей заходил. Ночью Буялич перевел беглянок к Любецким, где они прожили около месяца. Потом их переправили к партизанам в Мядельский район.

В конце 50-х годов в семью Любецких пришло письмо из Соединенных Штатов Америки от одной из спасенных девушек.

Поделившись вестью о письме с семьей Буялич, Любецкий решил сжечь его, не дожидаясь неприятностей со стороны властей, не оставив себе и адреса. В письме спрашивалось о судьбе Любецких и Буяличей, но так как из Виржей ответа не последовало, переписка прекратилась".

У межах вёскі бярэ пачатак рака Патачанка (Габка) – правы прыток Сэрвачы (басейн Віліі). Даўжыня ракі 14 кіламетраў. У пойме ракі знаходзіцца возера Станіслаўскае. Рэчышча каналізаванае, прымае сцёк з меліярацыйных каналаў.

Валкалаты сталі радзімай знакамітых кампазітараў.

25 лютага 1906 года ў Валкалатах нарадзіўся беларускі грамадска-палітычны дзеяч, этнамузыказнавец, кампазітар Каруза Павел Іосіфавіч. З 1925 года ўдзельнічаў у беларускім грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі. У 1927 годзе становіцца старшынёй ЦК Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і рэдактарам яе друкаванага органа – газеты “Беларуская крыніца”. Неаднаразова прыцягваўся польскімі ўладамі да судовай адказнасці. Пад уплывам збіральніка і папулярызатара беларускага музычнага фальклору, выдаўца, педагога і кампазітара А.А. Грыневіча збіраў беларускі мелас, які выкарыстоўваў у кампазітарскай і выканаўча-харавой практыцы як дырыжор хору Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры.

У 1928 годзе Павел Іосіфавіч заканчвае Віленскую кансерваторыю. У гэты ж год ад насельніцтва Свянцяншчыны абраны паслом (дэпутатам) у польскі сейм. У 1934 годзе пераязджае ў Мінск, дзе яго адразу арыштавалі і саслалі на Салаўкі (Расія). Пасля 13-гадовага тэрміну зняволення ў 1947 годзе зноў вяртаецца ў Беларусь, працаваў у Доме народнай творчасці ў Маладзечна. У 1949 годзе зноў арыштаваны і сасланы ў Сібір.

Пасля рэабілітацыі ў 1957 годзе вярнуўся ў Вільнюс. Працаваў у Дзяржаўным ансамблі польскай песні і танца ў Літве. Супрацоўнічаў з фальклярыстамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, друкаваўся ў часопісе “Мастацтва Беларусі”, газеце “Літаратура і мастацтва”. Аўтар “Камернай сімфоніі”, заснаванай на беларускім меласе, шэрагу песень на словы Я. Купалы, Я.Коласа і іншых беларускіх паэтаў.

У 1944 годзе нарадзіўся Наско Эміль Вікенцьевіч. У 1984 годзе закончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу кампазіцыі прафесара Я.А. Глебава і пад яго ж кіраўніцтвам – асістэнтуру-стажыроўку ў 1989 годзе. З 1985 года з’яўляецца членам Саюза кампазітараў Беларусі. Творчы шлях Э. Наско пачаўся яшчэ ў студэнцкія гады. Ягоная “Полацкая сюіта” для баяна, заснаваная на народных інструментах Полаччыны, увайшла ў абавязковую праграму Рэспубліканскага конкурсу імя І. Жыновіча. У сярэдзіне 80-х гадоў XX стагоддзя Э. Наско стварае шэраг вакальна-інструментальных твораў розных жанраў – сюіты, паэмы, балады, песні. У наступныя гады галоўнае месца ў творчасці кампазітара занялі вакальныя цыклы. Яны раскрываюць тэмы вайны і дзяцінства, глыбіню чалавечых пачуццяў. Побач з камернымі вакальнымі цыкламі Э. Наско піша і цыклы хароў, а пазней – харавы канцэрт. Новыя мастацкія дасягненні кампазітара на мяжы 80-90-ых гадоў звязаны з творамі буйной формы. Неаслабная цікавасць да баяна прывяла да стварэння Канцэрта і Рапсодыі, асаблівасцю музычнай мовы якіх з’яўляецца фальклорная стылістыка.

У 1947 годзе ў сям’і Наско з’явіўся яшчэ адзін будучы кампазітар – Станіслаў Вікенцьевіч. У 1974 годзе закончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу кампазіцыі дацэнта П.П. Падкавырава. Членам Саюза кампазітараў Беларусі стаў у 1991 годзе.

Станіслаў Наско з’яўляецца аўтарам шматлікіх аркестравых, сцэнічных, камерна-вакальных і інструментальных твораў, арыентаваных на разнастайную аўдыторыю. Яго сачыненні змяшчаюць у сябе шырокі спектр эмоцый. Значнае месца ў творчасці займае музыка, якая адлюстроўвае нацыянальныя пачуцці кампазітара. Творчая манера кампазітара адзначаецца спалучэннем розных стылявых вытокаў. У аркестровай музыцы С. Наско апіраецца на сістэму сучасных сродкаў выразнасці. Творы фальклорнай арыентацыі маюць цікавыя моманты стварэння аўтэнтычнага эфекту, што прываблівае да музыкі С. Наско народных выканаўцаў.

# Валодзькі

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце.*

Па народнаму павер'ю ў гэтай мясцовасці быў дзірван ды быльнёг. Але чалавек рашыў збудаваць хаціну на пустыры. Першым пасяліўся здатны гаспадар, якога звалі Валодзька. Адгэтуль і пайшла назва – Валодзькі.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя вёска ўваходзіла ў Парплішчанскую воласць Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 год знаходзілася ў складзе Польшчы. З 1940 года па 1959 год Валодзькі былі цэнтрам Крулеўшчынскага сельскага Савета. У 1949 годзе тут арганізавалі калгас імя Кірава. У 1969 годзе ў Валодзькі перасяліліся жыхары вёскі Качаны, а ў 1977 годзе – жыхары вёскі Сосіна. Зараз у Валодзьках пражывае каля 130 чалавек.

Цікавы выпадак тут адбыўся ў жніўні 2008 года. У магазін вёскі Валодзькі патэлефанавала невядомая і паведаміла, што ў памяшканні магазіна знаходзіцца выбуховае прыстасаванне. У ходзе праведзенага комплексу мерапрыемстваў выбуховае прыстасаванне не знойдзена. Высветлілася потым, што тэлефанавала жыхарка гэтай жа вёскі вучаніца 5 класа.

"Чортаў камень" – чорны і з паглыбленнямі, ёсць ва ўрочышчы Саснаватка ля вёскі Валодзькі, што паміж Крулеўшчынай і Порплішчам. Бабулькі кажуць, што "на Саснаватцы чэрці боб малоцяць".

Фальварак Віцантова (у польскамоўных дакументах згадваецца як Вінцэнтава) размяшчаўся пры чыгунцы Крулеўшчына – Маладзечна паміж Янушэвам і Валодзькамі. Ён узнік у першай палове XIX стагоддзя на землях маёнтка Порплішча Радзівілаў. У сярэдзіне XIX стагоддзя праз шлюб перайшоў ва ўласнасць князя Вітгенштэйна. Пазней стаў уласнасцю князёўны Марыі Львоўны Гагенлое-Шыленгерфсць, якая распрадала свае землі ў 1892 годзе. Той фальварак быў на поўдзень ад чыгункі.

Напачатку 20 стагоддзя землі фальварка былі падзелены чыгункай дзве часткі. На поўнач ад чыгункі ў 1920-я гады ўзнік фальварак Віцантова 1-е, стары фальварак стаў называцца Віцантова 2-е. Па звестках за 1929 год, Віцантова 1-е належала Марыі Пачкоўскай (145 дзесяцін), Віцантова 2-е - Мечыславу Раманоўскаму (161 дзесяціна). Спісы паселішчаў 1930 года даюць наступныя звесткі: Віцантова 1-е – 16 чалавек, 132 дзесяціны зямлі, Віцантова 2-е – 15 чалавек, 145 дзесяцін зямлі. Кожны з іх меў некалькі "запашнікаў" – арандатараў, у Раманоўскага ў Віцантове 2-м была т.зв. "млечарня", якая дзейнічала і ў час нямецкае акупацыі.

Зараз у Віцантове нічога не засталося ад колішніх фальваркаў.



Вячаслаў Раманоўскі, апошні ўладальнік фальварка Вінцэнтова Дзісенскага павету. Вязень ГУЛАГУ. Памёр у высылцы, Барнаул, 1941

# Варганы

*Вёска ў Парплішчанскім сельскім Савеце.*

Карпаты, Уральские горы, Кавказ –
Всё это, конечно, приятно для глаз.
Но ехать куда-то за тысячи вёрст,
Чтоб тропкой крутою добраться до звёзд?!
Есть в местности нашей высокий курган.
Сюда приезжай и увидишь всё сам.
Здесь лес зеленеет и птицы поют,
Кавказская прелесть, Карпатский уют.
Быть может, здесь князь-воевода лежит,
С дружиной своею разбитой зарыт.
А, может быть, ветер-шалун, бегунок
Восточный бархан нам, шутя, приволок.
Не знаю, откуда здесь взялся курган –
Наверное, даром от предков нам дан.
Тот знак, что они нам оставили тут,
Варганской горою в народе зовут.

*Виолетта Новицкая*



Варганы багаты сваімі археалагічнымі помнікамі. Самы галоўны – Варганская гара. На ёй размешчаны: на вяршыні – гарадзішча, а на схілах – селішча I тысячагоддзя. Яшчэ ў XIX стагоддзі краязнаўцамі запісана шмат паданняў пра гэты пагорак. Вось што можна прачытаць пра яго ў інтэрнеце: “Шмат тысячаў гадоў таму на землі Беларусі прыйшло апошяе зледзяненне. Тады ледавік не дайшоў нават да паўднёвых межаў Беларусі, а яго край дапоўз не дапоўз нават да месца, дзе стаяць сёння Докшыцы. Паміж Глыбокім і Докшыцамі ён і спыніўся. Як памяць аб сабе ён пакінуў ланцуг высачэзных узгоркаў на водападзеле басейнаў Нёмана і Віліі, а таксама вялізнае і маляўнічае возера Сэрвач. Самым вялікім пагоркам з тых, што пакінуў пасля сябе ледавік, аказалася Варганская гара, якая добра відаць нават з адлегласці 10 кіламетраў. Такое стратэгічна выгаднае ўзвышша не магло не спадабацца нашым продкам, якія заснавалі тут напачатку ўмацаванае гарадзішча, потым селішча. На Варганскай гары ёсць нейкі таямнічы камень. Хутчэй за ўсё, некалі там было капішча (язычніцкае свяцілішча). Назву “Варганы” многія звязваюць са словам vargini, якое азначае “займацца чарадзействам”. І ў пазнейшыя часы пра гару складаліся шматлікія легенды, паводле якіх тут праваліўся пад зямлю нейкі будынак, паводле іншых – гару нанасілі шапкамі жаўнеры ў часы вайны са шведамі.

На гэтую гару яшчэ ў даваенны час хадзілі ў паходы навучэнцы Докшыцкай сямігадовай школы. І зараз гэты авеяны легендамі край з непаўторнай прыродай можа стаць месцам, прывабным для турыстаў".

Лічуць таксама, што на гары закапаны вялікі скарб. На карасць гэтага сведчыць і той факт, што ў ваколіцах Варганоў знаходзілі два клады. У адным: манеты часоў Сігізмунда III – серабро з выявай Сігізмунда, жалезныя і медныя манеты. У другім – манеты часоў Рэчы Паспалітай.

Гарадзішча "Варганская гара" размешчана на вышыні 40 метраў. Пляцоўка авальная, выцягнутая з поўначы на поўдзень, памерам 60×50 метраў. Пры даследаванні выяўлена ляпная гладкасценная і штрыхаваная кераміка. Гарадзішча належыць да днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі і датуецца не пазней 3-4 стагоддзя нанай эры.

Да 5-6 стагоддзя плямёны днепра-дзвінскай культуры і культуры штрыхаванай керамікі знаходзіліся на апошняй стадыі патрыярхальна-родавага ладу. У далейшым пачаўся распад родавай і зараджэнне тэрытарыяльнай сельскай абшчыны. Населенныя крэўнымі сваякамі гарадзішчы сталі тормазам гаспадарчага прагрэсу – перашкаджалі асваенню новых зямель і гандлёваму абмену. З цягам часу балцкія культуры сталі зліваціца ў адну, якая ў археалагічнай літаратуры атрымала назву банцараўскай. Адным з праяўленняў гэтага працэсу быў пераход ад умацаваных паселішчаў (гарадзішчаў) да адкрытых (селішчаў). Тыпічным прыкладам паселішчаў гэтай эпохі служыць селішча на паўднёвым схіле Варганскай гары. Пры раскопках селішча знойдзены сляды зрубнага наземнага жытла з печчу-каменкай, кернаміка 6-8 стагоддзя н.э., жалезныя серп і шыла, дзве гліняныя формачкі для адліўкі бронзавых упрыгожванняў, біканічныя прасліцы.

Каля Варганоў знаходзяцца тры курганныя могільнікі. Адзін з іх размешчаны за паўкіламетра на паўднёвы ўсход ад гарадзішча. Тры курганы даўжынёй 8-9 метраў і шырынёй 5-7 метраў, вышынёй 1 метр. Пахавальны абрад – трупаспаленне. У адным кургане пахаванне было пад насыпам на гарызонце, у другім – ў ямцы дыяметрам 40 сантыметраў, глыбінёй 20 сантыметраў, накрытай перавернутым гаршком. У пасудзіне знаходзіліся перапаленыя косці і жалезная гітарападобная спражка. Могільнік датуецца 8-9 стагоддзямі, належыў крывічам.

Другі могільнік размяшчаецца за адзін кіламетр на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Калдоба. Тры насыпы дыяметрам 7-8 метраў, вышынёй да 1,5 метра. Вядомы яшчэ з XIX стагоддзя, але раскопкі тут не праводзіліся.

### Легенда, апублікаваная ў часопісе"Ziemia Dzisnenska"ў 1931 годзе "Чорная лужа"

У гэтым нумары "Ziemi Disnenskaj" хацеў бы падзяліцца мясцовай легендай. Легенда, можа, не вельмі праўдзівая, але ж абапіраецца на праудзівыя гістарычныя факты, якія наш народ упрыгожыў сваей фантазіяй. Размова пойдзе тут не пра дакладнае гістарычнае паданне, а пра народную байку з тутэйшым характерам. Людзі памятаюць пра гэтую легенду,

перадаючы ад бацькі да сына, у думках пераносяцца ў тыя даунія часы, - і так традыцыя жыве. Колькі разоў, слухаючы "гутаркі" старога апавядальніка, пераносішся ў даўнія часы, перажываем даунія хвіліны разам з нашымі прадзедамі. Байка гэтая мае такое вялікае павучанне, што нельга пакінуць яе незаўважанай, не падзяліцца ёй з чытачамі. Мы, народжаныя тут, на гэтай зямлі, звязваемся сімвалічна з нашым мінулым праз легенду, мы павінны яе спазнаць, зразумець, стварыць сапраўдны вобраз мінулага.
За паўкіламетр ад Ваганскай тары у паўднёва-за-ходнім накірунку цягнецца балота, зарослае лесам. Праз тое балота праходзщь дарога з Глыбокага да Параф"янава. Падарожнік, ідучы туды, убачыць малыя пагоркі, пакрытыя кустамі. Гэта курганы. Вясковыя людзі называюць іх "валатоўкамі", што азначае старыя магілы. Праз балота цячэ ручаёк. Месца тое вяскоуцы называюць "чорная лужа". Калі спытаеш старога вяскоўца, што азначае тая назва, то той стары зачне "баяць старую байку" пра даўнія часы. Было тое дауно "яшчэ гары не было, панічок, як кажуць", напала на нашу зямлю чужое войска, якое з нашым на тым месцы сутыкнулася у вялікай бітве. Бітва была так зацягнута, што заміж вады струменем плыла чорная кроў. "Кажуць, што былі гэта нейкія шведы". "У памяць пра тую бітву назвалася тое месца?" - пытаем у бабулі. "Так кажуць". Пэуна быў тут вялікі бой, бо вельмі шмат тут старых кургаоў. Людзі іх раскопваюць, бяруць пясок на дарогу. Пры гэтым знаходзяць старыя паржавелыя шпагі і іншыя металічныя рэчы. Шмат ужо раскапаных магіл, але дастаткова засталося і некранутых. Добра б было, каб улады не дазволілі нішчыць напамінак, які нагадвае пра мінулае нашай зямлі. Язэп Драздовіч. (не блытаць з мастаком Язэпам Драздовічам, які жыў у гэты час і, дарэчы, маляваў Варганскую гару) "Ziemia Dzi?nenska" 1931 г. Nr 1 (Пераклад з польскай мовы Ул. Скрабатуна).

Нягледзячы на багатую археалагічную старонку Варганоў, пра саму вёску вядома мала. Да 1917 года школы ў Варганах не было. У 1920 годзе была арганізавана пачатковая школа, якая першапачаткова размясцілася ў хаце Уладзіміра Барысевіча. З 1921 года па 1939 год яна знаходзілася ў складзе Польшчы. У гэтыя часы навучанне ў школе вялося на польскай мове. У 1949 годзе тут арганізаваны калгас імя Гастэлы. У 1970 годзе пабудавана новая школа на 150 месц. У 1971 годзе ў Варганы перасяліліся жыхары вёскі Дуброўка. Калісьці каля вёскі працаваў цагельны завод, сыравінай для якога было Варганскае радовішча глін. Зараз у Варганах пражывае каля 165 чалавек.



Калі вы едзіце з Докшыц на Глыбокае, то можыце звярнуць увагу на апошнюю хату ў Варганах. Ля ўваходу ў двор стаяць два вялікія помнікі з каменя. Яны – самаробныя. Іх аўтар – сапраўдны майстр каменных спраў Аляксандр Аляксандравіч Калбасіч. Вельмі цікавы жыццёвы шлях гэтага чалавека. Нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч у 1925 годзе. Юнацтва прыйшлося як раз на жудасныя

ваенныя гады. Неяк капалі Аляксандр з сястрой бульбу, а немцы шукалі партызан. Замест іх, калі не пашанцавала знайсці, у лютай злосці пахапалі простых вясковых хлопцаў і адправілі ў лагер у Прыбалтыку. Там яму давялося прабыць транаццаць месяцаў. З 1500 чалавек у жывых засталося толькі 200.пасля вызвалення мытарствы Аляксандра не скончыліся. Далейшы ягоны шлях у штрафбат на Далёкі Усход. Дзевяць год ён правёў там. Яму яшчэ пашанцавала ў тым плане, што не даваў прысягу. Хто прымаў яе, быў асуджаны на 20 год Калымы. Менавіта знаходзячыся ў лагеры, і ўбачыў Аляксандр Аляксандравіч такія помнікі. Там вырашыў, калі вярнецца дадому жывым, навучыцца ствараць падобнае сам. З 1957 года ён працуе з гэтым матэрыялам. Дзесяць год дзёўб камяні для дарожнага ўпраўлення, потым – на будаўніцтве. Па дзесяць машын у дзень калоў і адпраўляў на станцыю. З “яго” каменя зроблены падмурак для інтэрната ў Браславе, рэстарана ў Глыбокім, многае іншае. Месяц часаў камень у Хатыні пры ўзвядзенні мемарыяльнага комплекса.



Але тады ён адчуваў сябе больш рамеснікам, будаўніком, муляром. А сапраўды адводзіць душу майстр, ствараючы помнікі па сваёй задумцы і фантазіі. Спачатку гэта было чыстым хобі. Але неяк у Глыбокае прыехалі яўрэі з Германіі і Францыі. Іх уразіў помнік, створаны нашым майстрам. Яны набылі яго і ўстанавілі на самотна-памятным месцы, дзе ў час вайны фашысты расстралялі яўрэяў. З заказамі таксама звяртаюцца каталіцкія с вяшчэннікі. А яшчэ Аляксандр Аляксандравіч вырабляе па заказах надмагільныя помнікі.

Над адным помнікам мог працаваць цэлы год. Два урачыстыя каменныя прыгажуны падрыхтаваў пры жыцці для сябе і жонкі.

Неяк у Варганах адбылася аўтамабільная аварыя на дарозе як раз насупраць хаты Калбасічаў. На шчасце, людзі засталіся ў жывых. Пасля яны выказвалі падзяку А.А. Калбасічу, што іх выратаваў вялікі каменны крыж, зроблены ім, які ўзвышаецца ля дарогі.

Пра сустрэчу з Аляксандрам Калбасічам цікава расказаў Зміцер Бартосік у эфіры “Радыё Свабода” у верасні 2007 года: “Вёску Варганы, калі едзеш да Глыбокага з боку Менску, не заўважыць немагчыма. Вёска ляжыць пры высачэзнай, парослай лесам гары, вяршыню якой відаць за добры дзясятак кілямэтраў. А на ўезьдзе ў вёску погляд падарожніка прыцягваюць тры высокія крыжы, высечаныя з каменю. Такое казачнае спалучэньне вялікай гары і каменных крыжоў наводзіць на думку, што тут жыве нейкі волат. І гэта праўда. Волат пад гарой сапраўды жыве. Завуць яго Аляксандрам Калбасічам. Яму 83 гады, дваццаць зь якіх ён, у самым росквіце жыцьця, аддаў лягерам. Спачатку нямецкаму працоўнаму, а пасьля

калымскаму савецкаму. Невысокі, але вельмі жылісты стары гасьцінна запрашае за стол. Відаць, што ўвагай журналістаў ён не абдзелены.

Аляксандар: “У 1943 годзе немцы партызан лавілі. А мне было гадоў сямнаццаць. Дык дзе яны партызан наловяць? Мужыкоў набралі такіх, як я. Пагналі. Амбар быў вялікі, панскі, яшчэ даўнейшы. Чалавек сто пяцьдзясятназьбіралі па вёсцы. Такія чуткі пайшлі, што паляць людзей. Сядзім мы да вечару, можа, да дванаццаці гадзін. Гаворым: пэўна ж спаляць нас”.

Карэспандэнт: “Вы сядзелі ў гэным амбары?”

Аляксандар: “У гэтым амбары. Немцы акружыўшы стаяць. Са зброяй. А тады падыходзіць доўгая машына. Усіх нас у машыну — і ў Латвію завезьлі. І там напісалі “беларускі бандыт” кожнаму на сьпіне. Нас 1500 чалавек. За трынаццаць месяцаў засталося толькі 220”. Вызвольны 1944 год “беларускаму бандыту”, якога некалькі разоў немцы зьбіраліся расстраляць, ніякага вызваленьня не прынес. Калбасіч едзе на Калыму.

Карэспандэнт: “За што?”

Аляксандар: “А за тое, што ў немца быў. І ўсё. Болей яны не размаўлялі. Хто быў ваеннапалонны — адразу дваццаць пяць. Ніякіх размоваў. А ў мяне быў “воўчы білет”. Далі год турмы, а тады далі вечную ссылку мне”.

Карэспандэнт: “На Калыме?”

Аляксандар: “На Калыме. Я дзевяць з паловай гадоў адбыў. А пасьля далі амністыю, як Сталін здох”. Там, у гулагаўскім пекле, малады моцны беларус маліўся богу аб вызваленьні і вучыўся калоць камяні.

Аляксандар: “Я так навучыўся камяні калоць — не паверыце. Вось, як табурэтка камень, я сем машын за дзень накалоў каменю. За тры ўдары. Так навучыўся”.

Карэспандэнт: “А што самае цяжкае было на Калыме?”

Аляксандар: “Лазіць па шурфах самае цяжкае было. Дзе ты ўсё раскажаш. Туды завезьлі, далі майку, картовыя штаны амэрыканскія, целагрэйку і летнюю фуражачку. А мароз як зімануў — 50 градусаў. Нас памясьцілі, баракаў не было, на сьнезе. Дык за ноч сто пяцьдзясят чалавек замярзала”.

Невялічкі старэнькі Калбасіч паказаў мне свой галоўны інструмэнт. Сталёвы молат.

Аляксандар: “За адзін удар расколваю — і ўсё. Молатам. Во бачыце, як гладка атрымалася. Дванаццаць кіляграм молат. І вось гэтым кантам б’еш па камяні. Разы тры ўдараю, камень напалам, і ўсё. Ад гэтага молата. Гэта дзесяць кіляграм. У мяне быў дванаццаць, але скралі”.

Карэспандэнт: “У мяне завароткі кароткія такім молатам працаваць, а ў вас яшчэ — ого! Аляксандар Аляксандравіч, вы не шкадуеце, што жыцьцё паслала вам такія... Калыма, немцы… Такія цяжкасьці. Азіраючыся назад”.

Аляксандар: “Канечне, крыўдна было, але нічога ня зробіш. Такі лёс”.

Карэспандэнт: “Вы на лёс не наракаеце?”

Аляксандар: “Не”.

А на вясковай вуліцы сядзяць нашы вечныя вясковыя пэнсіянэркі. Што праўда, радасьці ад "харошай" пэнсіі з кожным месяцам усё меней. А вось патрабаваньняў да "залатой рыбкі", дзяржавы, усё болей.

Карэспандэнт: "Як жывецца вам на пэнсіі?"

Старая: "Дрэнь. Адны жывем. Няма каму дапамагчы. Просіш, просіш. Дрэнна. Не дапамагае дзяржава. Каб якога чалавека далі — мужчыну, каб што рабіў, дапамагаў".

Карэспандэнт: "А дзеці ня хочуць дапамагчы?"

Старая: "А дзеці… У іх свая работа. Гарэлку п'юць".

Карэспандэнт: "А тут моладзь якая ёсьць, у Варганах?"

Старая: "Слаба. Амаль няма..."

Моладзі тут сапраўды небагата. Напрыклад, моладзьдзю тут лічыцца 50-гадовы нежанаты Саша. Хударлявы, гаспадарлівы, у акулярах. Саша любіць глядзець БТ і аддана верыць Лукашэнку. Напэўна, на такіх не вельмі патрабавальных і працалюбных мужыках і трымаецца цяпер сельская гаспадарка.

Саша: "Будуюць фэрму новую. Думаюць у наступным годзе сьвінафэрму, комплекс будаваць. Сушылку ставіць".

Карэспандэнт: "Вам работа ёсьць?"

Саша: "Ёсьць".

Карэспандэнт: "А колькі плацяць, калі не сакрэт?"

Саша: "Які сакрэт? Сто восемдзесят я з сакавіка месяца атрымліваў прыкладна. На сушылцы быў, паўмесяца зерне сушылі. Амаль шэсьцьсот".

Больш за ўсё Сашу хвалюе не памер заробкаў, а адсутнасьць жонкі.

Саша: "Тут пэрспэктывы няма асабліва".

Карэспандэнт: "Няма нявестаў?"

Саша: "Няма".

Колькі разоў Саша знаёміўся па перапісцы з гарадзкімі кабетамі, але ўсе яны, на Сашаву бяду, у вёску ехаць не жадаюць.

Саша: "Я ім не зайздрошчу. На вёсцы лепей. Паветра сьвежае, прырода побач. Галоўнае, каб заробкі добрыя былі, і ўсё. Там нічога зайздроснага ў іх няма. Яны як у крэпасьці жывуць".

Пажадаўшы Сашу плённых пошукаў другой палавіны, я накіраваўся ў госьці да Кацярыны Каваленкі. Спадарыня Кацярына — былая дырэктарка Варганскай пачатковай школы. Мне яе рэкамэндавалі як вялікую знаўцу паданьняў пра Варганскую гару. Але краязнаўствам нашая размова не абмежавалася. Спадарыня Кацярына, 80-гадовая высокая рухавая кабета, вельмі ўзрадавалася журналісту "Свабоды".

Кацярына: "Такое паданьне было доўгае. Што на гары сядзіць жаба. Сядзіць жаба трохпудовая. І так яна там стогне. Можа, у якім шасцідзясятым годзе, аўтобус толькі стаў хадзіць тут. Едуць і гавораць: "А ці праўда, што тут жаба стогне трохпудовая?" Хто едзе, той гаворыць, што на гары Варганскай трохпудовая жаба.

Пасьля, як паляцеў Гагарын, хлопцы спускаліся ў бочцы з гары. Быццам гагарынцы яны былі".

Карэспандэнт: “Ніхто не пабіўся з гагарынцаў?”

Кацярына: “Не, не пабіліся, нічога. А там у нас быў лес. Дык у лесе гэтым знаходзілі людзей забітых. Такія былі выпадкі”.

Нашу размову перарваў муж спадарыні Кацярыны. Я лішні раз пераканаўся, як добра быць у Беларусі журналістам амэрыканскага радыё.

Стары: “А зь якой газэты журналіст? З Лукашэнкавай?”

Карэспандэнт: “Не”.

Кацярына: “Для Радыё Свабода”.

Стары: “А можа, ён ня еў, карэспандэнт?”

Карэспандэнт: “Еў”.

Стары: “А можа, у яго грошай няма?”

Карэспандэнт: “Ёсьць”.

Стары: “А можа, у цябе дзеўкі няма?”

Карэспандэнт: “Ёсьць. Усё ёсьць”.

Кацярына: “Усё ёсьць. Ідзі, не замінай!”

А што было, калі б я быў супрацоўнікам БТ? Пра гэта лепш ня думаць. Але вернемся да размовы са спадарыняй Кацярынай.

Карэспандэнт: “Вы памятаеце, як сюды прыйшлі саветы?”

Кацярына: “Ой, дужа добра памятаю”.

Карэспандэнт: “Гэта было страшна?”

Кацярына: “Вельмі страшна. Гэта было дзіка. Людзі былі адны за тое, каб прыйшлі саветы — моладзь. Гэта камсамольцы былі, падпольныя камсамольцы. Ведаеце, ехала Чырвоная Армія. Яны ехалі на конях. Коні такія былі калгасныя. Вупраж была страшная. Ня тое, як немцы ішлі — сапраўды было бачна, што ідзе нейкая цывілізацыя. І тут выйшлі з кветкамі сустракаць. А ім няможна было гаварыць з намі. І вось адзін толькі чалавек, салдат, падышоў да цёткі маёй. “Людцы мае, каб вы ведалі, якая ўлада едзе, вы б галасілі”. Вось што”.

Карэспандэнт: “Які сьмелы чалавек”.

Кацярына: “Сьмелы. Дзіўна, як ён так сказаў. “Каб вы ведалі, якая ўлада едзе, вы б плакалі ўсе”.

Мяне заўжды дзівяць гісторыі ўцёкаў заходніх беларусаў у савецкі “рай”. Бо па гэты бок мяжы ўсе ведалі пра бальшавіцкія парадкі. У сям’і Кацярыны чыталі часопіс “За мяжой”.

Кацярына: “Ну, такая праўдачка. Ісьцінная. І як НКВД за славечка садзяць, за колас садзяць. Усё гэта было”.

Карэспандэнт: “Гэта была адкрытая інфармацыя?”

Кацярына: “Адкрытая”.

Карэспандэнт: “І пры гэтым былі падпольныя камсамольцы?”

Кацярына: “Былі. Пайшло тры чалавекі, якіх адразу ж у Менску расстралялі. Іх тады сходу расстрэльвалі”.

Карэспандэнт: “За лепшай доляй?”

Кацярына: “Так, так. Свабода! Там жа свабода! На нашай старане пяюць, танцуюць, гуляюць, гавораць! А там ніхто ні слоўца. Яны толькі галовы ўніз — і работаюць. Дык нашы крычалі: “Вы што там, анямелі, ці

што? У вас языкі паадразалі, што вы гаварыць ня хочаце?" Ніхто ні слоўца ня скажа, ні-ні. Не падыме галавы".

Спадарыня Кацярына распавяла, што непадалёку ад Варганоў была яшчэ адна гара. Але яе зраўнялі бульдозэрамі й зрабілі там глыбоцкі сьметнік.

На Варганскую гару рэсурсаў не хапіла. Яна будзе стаяць вечна. Як і пастаўленыя Калбасічам у навакольлі каменныя крыжы. Пакідаючы вёску, як добры знак на будучыню, я ўбачыў каля крыжоў купку дзяцей са сьвятаром. Касьцёлу ў Варганах няма. Ксёндз прыехаў да сваіх маленькіх прыхаджанаў. І яны яму сьпявалі псальмы на мове, якая таксама нікуды ня зьнікне.

Дзеці: "Разам засьпявай! Бо зь неба на цябе глядзіць айцец. І ведае ўсё, чаго хочаш ты. Чакае, калі ты даверыш сэрца".

Фальварак Чарамошнік да 1939 года знаходзіўся пры дарозе Глыбокае—Докшыцы, непадалёк ад Варганскай гары. Сёння на месцы фальварка — калгаснае поле. Засталося на пагорку некалькі старых ліп ад прысадаў, якія бачны з шашы.

Паводле плану, які быў складзены ў 1910 годзе, фальварак Чарамошнік Віленскай губерні, Дзісненскага павету, Глыбоцкай воласці, знаходзіўся ва "ўладанні сялянаў Андрэя Юр'ева і Анелі Андрэевай Шарабайка". Фальварак меў: зямлі сядзібнай — 1,62 дзесяціны; зямлі ворыўнай — 40,6; сенакоснай — 26,12; лесу хваёвага — 12,0; пад дарогамі — 0,44. Разам — 80,78 дзесяцін.

З 1920 года па 1939 год Чарамошнік, ці Чэрэмошнік (Czeremosznik) — фальварак у Віленскім ваяводстве, Дзісненскага павету (сталіца г. Глыбокае), Порплiскай гміны. Насельніцтва — 14 чалавек, зямлі — 76 дзесяцін. Найбліжэйшая чыгуначная станцыя — за 12 кіламетраў у Глыбокім. Апошнім уладальнікам фальварка быў Канстанцін Шарабайка, які тройчы з сям'ёй быў у спісе на высылку ў ГУЛАГ. Апошні раз уратаваў ад высылкі пачатак вайны. Памёр ад дызентэрыі ў жніўні 1943 года ў Чарамошніку.



Вячаслаў Раманоўскі, уладальнік фальварка Вінцэнтова (злева) і Канстанцін Андрэевіч Шарабайка, апошні ўладальнік фальварка Чарамошнік. Фота з сямейнага альбома Ларысы Шарабайка, г. Глыбокае

*Уладзімір Скрабатун*

# Варлань

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя вёска ўваходзіла ў склад Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета. У 1909 годзе налічвалася 288 жыхароў. У той час Варлань адносілася да Бярэзінскага праваслаўнага прыхода. У 1933 годзе тут утвораны калгас "Наша Перамога", працавала кузня. Пад час Вялікай Айчыннай вайны ў Варлані размяшчаўся вялікі гарнізон праціўніка, які ў 1944 годзе быў разгромлены партызанамі Барысаўска-Бягомльскай зоны.

Зараз у Варлані пражывае каля 35 чалавек.

# Ваўча

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце.*

Па народнаму павер'ю, раней на месцы вёскі рос вельмі густы і непраходны лес. А ў ім вадзілася надта многа ваўкоў, якія жудасна вылі па начах. Жыхары наваколля баяліся гэтага месца і называлі яго Ваўчой. Але ж знайшліся некалькі адчайных людзей, якіх лёс прымусіў пасяліцца ў такім гіблым месцы, дзе адзінай светлай плямкай была маленькая рэчка. Наўкол жа яе знаходзілася вялікае балота. Людзі адбудаваліся і нават паставілі маленькую царкву. У ёй жыхары маліліся Богу, каля яе сцен хавалі памерлых. Многа ці мала прайшло часу, ніхто не ведае, але паселішча знікла, ад яго застаўся толькі пагорак. Падсохла і балота, парадзеў лес, сышлі кудысьці і тыя страшныя ваўкі. І ўжо іншыя пакаленні людзей сталі засяляць гэта месца. Жывучы і працуючы на зямлі, яны адшукалі крыжы і часткі пахаванняў. Гэтае месца стала святым і яго назвалі "царкавішчам". Цяпер на гэтым месцы стаяць дзве вялікія прыгожыя бярозы. А вёска так і засталася называцца Ваўча.

Ваўча – адно з самых старажытных паселішчаў Докшыцкага раёна. Упершыню яно ўпамінаецца ў 1395 годзе, калі вялікі князь Вялікага княства Літоўскае Вітаўт падараваў сяло капітулу кафедральнага касцёла святога Станіслава ў Вільні. Ваўча стала цэнтрам вялікага маёнтка Віленскага каталіцкага біскупства. У лацінскамоўным тэксце прывілея Вітаўта прыводзіцца даволі разгорнутае апісанне новых уладанняў капітула: "…сёлы з людзьмі, …з усімі даходамі, судовымі і іншымі плацяжамі, пажыткамі, ворывам, лугамі, пашамі, лясамі, гаямі, дубравамі, сажалкамі, рыбалоўнымі ўгоддзямі, барамі, борцямі, паляўнічымі гонамі, птушынымі ловамі, усімі абшарамі і дадаткамі, так, як папярэднікі нашы і мы самі трымалі ў нашым карыстанні, даруем дарам вечным і непарушным на вечныя часы". З гэтага апісання можна зразумець, што ваўчане займаліся не толькі (а можа, і не столькі) земляробствам, але і бортніцтвам, паляваннем, рыбалоўствам і ляснымі промысламі.

З канца XVI стагоддзя захаваліся некалькі цікавых дакументаў, прысвечаных сялу Ваўча. Гаспадарчая дзейнасць сяла кіравалася ўраднікам, астатнія пытанні вырашала сялянская абшчына на чале са старцам. У 1582 годзе ваўчанскі ўраднік Матысь Сасноўскі, які прабыў на гэтай пасадзе дзесяць год, раптам разграміў і разрабаваў панскі двор і, прыхапіўшы сабраныя падаткі, уцёк у сяло Мсціж, якое належыла Астафію Тышкевічу. Пры гэтым Сасноўскі звярнуўся ў суд са скаргай на жыхароў сяла Бягомль, якія быццам бы напалі і разрабавалі яго дом. Што адбылося ў маёнтку на самай справе, сказаць цяжка, але нейкі канфлікт паміж ураднікам і сялянамі, безумоўна, меў месца.

У 1596 годзе ўзнік канфлікт паміж ваўчанамі і жыхарамі суседняга сяла Забар’е, якое належыла Марціну Юр’евічу Тышкевічу. Ваўчане абвінавацілі забарцаў у тым, што тыя абрабавалі іх борці і караннікі (род вулляў), якія знаходзіліся ў Кастрыньскім лесе. Для вырашэння канфлікту была склікана капа – сходка прадстаўнікоў абедзвух абшчын, якая збіралася на мяжы абшчынных тэрыторый і вырашала суд паводле старажытнага звычаёвага права. Традыцыя копнага суда ўзыходзіць, напэўна, да старажытнарускіх і больш позніх часоў. Гэта быў даволі эфектыўні інструмент вырашэння спраў, які быў афіцыйна прызнаны дзяржавай (артыкулы пра копны суд ёсць ва ўсіх трох Статутах ВКЛ). Аднак у гэтым выпадку аўтарытэт капы аказаўся недастатковым для вырашэння канфлітку. Калі жыхары Ваўчы на чале са старцам Няхедам Панцялеевічам прывялі доказы злачынства (за якое, між іншым, належала пакаранне смерцю), прыпёртыя жыхары Забар’я раптам выхапілі схаваныя загаддзя кіі, камяні і нават коп’і (ашчэпы), клікнулі стаіўшыхся непадалёку сяброў і пачалі жорстка збіваць ваўчан. Тыя вырваліся ледзь жывыя.

У XVI – XVII стагоддзі гэты маёнтак таксама ўпамінаецца сярод уладанняў Віленскага каталіцкага біскубства; частка сяла Ваўча ў гэты час належыла Тышкевічам, потым Пацам. Паводле інвентара маёнтка Вілейка 1797 года, сяло Ваўча ў яго складзе належаў Віленскаму манастыру візітак. Пражывала тады тут 152 жыхары абодвух палоў, працавала карчма і млын. У 1891 годзе ў Ваўчы пабудавалі Свята-Петра-Паўлаўскую царкву. Яна была з дрэва і стаяла на падмурку. Над званіцай была макаўка. Сцены чляніліся 4 вялікімі і 2 малымі аконнымі праёмамі. Гэта царква з’яўлялася творам народнага дойлідства.

У 1907 годзе ў Ваўчы адкрыта народнае вучылішча. У 1913 годзе для школы пабудаваны драўляны будынак. На базе народнага вучылішча пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана пачатковая савецкая школа. У 1924 годзе ў ёй вучылася 46 дзяцей (з іх 12 дзяўчынак). Іх настаўнікам быў Павел Бабіцкі. У 1933 годзе ў Ваўчы арганізавалі калгас, сталі працаваць вадзяны млын, цыркулярка, ваўначоска і кузня. Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёсцы пражывала каля 530 чалавек. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 20 двароў і загубілі 24 жыхары. Зараз у Ваўчы пражывае каля 170 чалавек.

Л.Д. Побаль у кнізе “Археалагічныя помнікі Беларусі. Жалезны век” (Мінск, 1983), спасылаючыся на архіўныя звесткі, згадвае гарадзішча ва ўрочышчы Губкі або Акопішча каля Ваўчы. Аднак больш даследаваным з’яўляецца курганны могільнік, які знаходзіцца за паўкіламетра на захад ад вёскі, у лесе, на правым беразе ракі Верхняя (прыток ракі Бярэзіна). Тут знойдзены 22 курганы (земляныя і каменныя) і каля 100 каменных магіл. Амаль усе ў аснове абкладзены буёнымі камянямі, ёсць насыпы, цалкам абкладзеныя камянямі. На поўдзень ад жальнікаў знаходзяцца больш позняя

могілкі з невялікіх абкладзеных камянямі падоўжаных узвышшаў, адзначаных вялікімі камянямі. Пахавальны абрад трупапалажэнне і трупаспаленне на гарызонце на рытуальным вогнішчы, якое часта мела каменную агароджу. Знойдзены жалезныя наканечнікі дзіды, нож, паясная спражка, бронзавыя паясныя кольцы, віты бранзалет, падковападобная фібула; ганчарны і міскападобны гаршчок з салярным кляймом. Адносіццаі да X – пачатку XI стагоддзяў.




Праз вёску працякае рака Студзёнка, правы прыток ракі Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 14 кіламетраў. Рэчышча на працягу 4,2 кіламетры каналізавана. У Ваўчы яна перасякаецца дарогай Бягомль – Барысаў. Дзякуючы гэтаму ўтворана невялічкая плаціна, якая дазволіла стварыць у Ваўчы невялікае возера.

15 ліпеня 1907 года ў Ваўчы нарадзіўся Батура Мікалай Фёдаравіч. Удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе. У Вялікай Айчыннай вайне з ліпеня 1941 года. Удзельнік Маскоўскай (1941-42) і Сталінградскай (1942-43) бітваў, Берлінскай аперацыі 1945 года. Вызваляў Украіну Малдавію Польшчу. Пасля вайны служыў у Германіі, Беларусі, Расіі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені і адным – 2-й ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1955 года ў званні падпалкоўніка выйшаў у адстаўку. Памёр 8 лістапада 1998 года.

# Верацеі

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце.*

У пачатку XX стагоддзя ўваходзіла ў склад Асаўской воласці Барысаўскага павета, 28 двароў, 190 жыхароў. Зараз у ёй пражывае каля 10 чалавек. У 1913 годзе адчынена народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу. У 1924 годзе ў ёй вучылася 48 дзяцей (з іх 12 дзяўчынак).

Страшная трагедыя адбылася ў вёсцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Са слоў мясцовага жыхара Шыла Пятра Іванавіча вядома, што ў час першай нямецкай блакады ў 1943 годзе немцы ўстроілі ў Верацеях аблаву. Нягледзячы на тое, што людзі хаваліся ў лесе, немцам удалося схапіць многа людзей. Іх пагналі на сенавал Курныша Аляксея і падпалілі. А 20 чэрвеня 1944 годзе жыхароў вёсак Чупры, Тоўшчы, Верацеі, смалакурнага завода "Смалакурня" (усяго 60 чалавек) жывымі спалілі ў Верацеях. Жыхары потым сабралі астанкі людзей і пахавалі на могілках. Зараз на верацейскіх могілках стаіць брацкая магіла.

18 чэрвеня на канале ОНТ адбылася прэм'ера дакументальнага фільма "Над пропастью во лжи" цыкла "Преступление века". Фільм распавядае пра спаленне 20 чэрвеня 1944 г. жыхароў вёсак Верацеі, Тоўшчы і Чупры на Докшыччыне пры ўдзеле жаўнераў 5-ай роты 13-га беларускага батальёна СД. Двое былых жаўнераў батальёна Барыс Баршчэўскі і Францішак Катовіч былі прысуджаныя ў траўні 1987 г. да вышэйшай меры пакарання".

"Но вот уже несколько недель стрельбы не было слышно, и в июне 1944 года некоторые сельчане, взяв с собой детей, решили выйти из леса и заняться восстановлением разрушенных домов в деревне Толщи. И попали в оцепление полицаев 5-й роты 13-го белорусского батальона СД.

Подсудимый: Во время березинской операции мы сжигали деревню Толщи. Нас, полицейских, было 27 и 3 немца…

Судья: Что же вам мешало сжечь вместо своих людей немцев? Их же всего было три!

Подсудимый: Просто боялись, не было толчкаЭ.

"Сведкамі падчас суда называліся таксама імёны іншых удзельнікаў карнай акцыі: Андрэй Бамбіза, Сяргей Рымдзёнак. Былі агучаныя сведчанні аб удзеле жаўнераў 13-га батальёна ў акцыях у менскім гета, суправаджэнні машынаў, абсталяваных газавымі камерамі, ва ўрочышча Трасцянец пад Менскам увосень 1943 г".

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела ідэалагічнай работы Докшыцкага райвыканкама Іосіф Падрэз хутка ў Докшыцкім раёне з'явіцца памятны знак спаленым у гады Вялікай Айчыннай вайны жыхарам трох вёсак. Яго праект зараз знаходзіцца на стадыі распрацоўкі. Усяго на

стварэнне памятнага знака Віцебскі аблвыканком плануе выдзеліць 10 мільёнаў рублёў (2009).

У 1898 годзе ў Верацеях нарадзіўся Аўласка Антон Адамавіч. З 1918 года Антон Іванавіч у Чырвонай Арміі, удзельнік баёў з арміямі Калчака, Дзянікіна, Урангеля. У 1920 годзе за баявыя заслугі быў узнагароджаны імянным гадзіннікам. У час Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным партызанскага атрада брыгады "Жалязняк", узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

13 верасня 1939 года ў Верацеях нарадзіўся Ляўданскі Эдуард Ігнатавіч – Беларускі вучоны ў галіне хімічнай тэхналогіі і тэхнікі. Доктар тэхнічных навук з 1970 года, прафесар з 1973 года. У 1968 годзе скончыў Беларускі тэхналагічні інстытут. З 1978 года працаваў у гэтай жа навучальнай установе. Напісаў навуковыя працы па даследаванні працэсаў раздзялення газавадкасных плыняў, стварэнні новых канструкцый цэнтрабежных апаратаў і сепаратараў для ачышчэння і перапрацоўкі збожжа. У 1976 годзе атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР.



На паўднёвым усходзе ад вёскі бярэ пачатак рака Камяніца, правы прыток ракі Лонва (басейн Віліі). Даўжыня ракі 15 кіламетраў, плошча вадазбора 43 квадратныя кіламетры.

# Верацеі

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце.*

Пра вёску вядома мала. У 1949 годзе тут арганізавалі калгас “XIX партз’езд”. Зараз у ёй пражывае каля 40 чалавек.



Кастусь Акула – адзін з самых вядомых беларускіх эміграцкіх пісьменнікаў і грамадскіх дзеячоў. Сапраўднае імя Кастуся Акулы – Аляксандр Ігнатавіч Качан. Нарадзіўся ён 16 лістапада 1925 у даволі вялікай тады вёсцы Верацеі тагачаснай Глыбоцкай гміны Дзісенскага павета, а зараз Крулеўшчынскага сельсавета Докшыцкага раёна. Апроч Алеся, бацькі – Ігнат і Паўліна, мелі яшчэ восем дзяцей ды дванаццаць гектараў зямлі. Маці пісьменніка цяжка захварэла і памерла напрыканцы жніўня 1939 года, пахавана на цвінтары Росы ў Вільні. Бацька пасля вайны быў рэпрэсіраваны па 58 артыкуле крымінальнага кодэксу СССР і загінуў у 1951 годзе ў канцлагеры каля Барысава.

Кастусь Акула (тады яшчэ Качан) скончыў напачатку польскую чатырохкласную школу ў Верацеях, пазней вучыўся ў савецкай сямігодцы ў Крулеўшчыне. У час нямецкай акупацыі ён скончыў кароткачасовыя настаўніцкія курсы ў Глыбокім і некалькі месяцаў працаваў у Порплішчанскай сямігодцы. Пасля ён пакінуў працу і паступіў у восьмы, апошні клас Віленскай Беларускай гімназіі. Ужо ў той час ён пачаў пісаць самыя першыя свае вершы, якія друкаваліся ў “Беларускай газеце” і “Голасе вёскі” – беларускіх газетах, што выдаваліся ў часы нямецкай акупацыі. Першы свой верш пісьменнік пісаў яшчэ пад сваім імем, пазней з’явіўся першы псеўданім – Міхась Козыр. Аднак яму так і не давялося скончыць гімназію. Перашкодзіла гэтаму тое, што у часе адной з паездак у Менск ён



быў схоплены і правёў тры месяцы ў канцлагеры на Камароўцы. Пасля вызвалення ён вярнуўся дамоў і ў чэрвені 1944 года паступіў дабравольцам у школу камандзіраў Беларускае Краёвае абароны. У хуткім часе школа была эвакуіравана на захад. Спачатку былі баі ў Эльзасе, потым французкае Супраціўленьне, затым 2-гі польскі корпус генерала Андэрса 8-й Брытанскай арміі. За баявыя подзвігі ў змаганні з фашызмам Кастусь Акула ўзнагароджаны медалём "За вайну", "Залатой Зоркай Італіі". У 1946-м годзе скончыў Брытанскую афіцэрскую школу і ў чыне капрала зноў вярнуўся ў Італію. Пасля дэмабілізацыі эмігрыраваў у Канаду, дзе працаваў па кантракце на фермах.

У 1945 годзе Аляксандр Качан змяніў сваё сапраўднае імя на псеўданім Кастусь Акула. Нейкі час ён жыў у Вялікабрытаніі, пасля па кантракце паехаў на працу на фермах у Канадзе. Пасля сканчэння кантракту пісьменнік перасяліўся ў Таронта, дзе стаяў каля вытокаў заснавання беларускай

нацыянальнай арганізацыі – Згуртавання беларусаў Канады. Доўгі час ён быў старшынёй гэтай арганізацыі. Там жа ён прыклаў шмат намаганняў, каб у Таронце паўстала парафія імя Св. Кірыла Тураўскага Беларускай аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, шмат зрабіў, каб адчыніць у Канадзе дом адпачынку для беларусаў "Слуцак". Была заснавана беларуская каса самапомачы. Пазней Кастусь Акула заснаваў газету "Беларускі эмігрант", быў яе рэдактарам. Ужо пасля таго, як газета спыніла сваё існаванне, спадар Кастусь заснаваў у 1974 годзе часопіс ветэранаў Беларускай Краёвай абароны "Зважай", які выдаваўся да 1996 года. Супрацоўнічаў таксама з рускамоўным парыжскім часопісам "Современник", беларускай газетай "Бацькаўшчына".

У той час, як ён змагаўся за нацыянальна-культурнае адраджэнне на канадскай зямлі, у Беларусі яго кляймілі. Пад лістом супраць яго, апублікаваным у тагачаснай прэсе, падпісаліся некалькі беларускіх пісьменнікаў. У "Літаратурнай газеце" выйшаў верш Алеся Бажко "На вузкай кладцы", дзе спадар Кастусь называўся "агентам ЦРУ" ды "платным амерыканскім вызваліцелем Беларусі".

На Канадскай зямлі Кастусь Акула працягнуў сваю літаратурную дзейнасць. Першай кнігай стала дакументальная аповесць "Змагарныя дарогі", у якой расказваецца пра баявы шлях навучэнцаў школы афіцэраў Беларускай Краёвай абароны ад эвакуацыі з Менску да сканчэння вайны. Кніга ўпершыню была выдадзена ў беларускім выдавецтве "Пагоня" ў Таронце у 1962 годзе. Другі раз яна была перавыдадзена накладам 6000 паасобнікаў у 1994 годзе ў Мінску і адразу ж Беларускі ПЭН-цэнтр прысудзіў пісьменніку прэмію імя Францішка Багушэвіча. Кніга ўвайшла ў складзены газетай "Наша ніва" у 1995 годзе спіс 100 найлепшых беларускіх кніг 20 стагоддзя.

Другім творам пісьменніка стала кніга на англійскай мове "Tomorrow is yesterday", якая так і не была перакладзена на родную мову. Трэці твор – раман у трох кнігах "Гараватка", які быў напісаны ў 1965 – 1981 гг. У аснову гэтага твора пакладзены рэальныя падзеі, якія адбываліся ў 20 стагоддзі на радзіме пісьменніка. Вёска Літоўцы, жыццё жыхароў якой паказваецца ў творы – гэта не што іншае, як вёска Верацеі, мястэчка Гаці – гэта Крулеўшчына. Кнігі гэтага раману - "Дзярлівая птушка", "Закрываўленае сонца" і "Беларусы, вас чакае зямля", распавядаюць, адпаведна, пра пакуты беларускага народа пад уладай Польшчы, СССР і нямецкай акупацыі. Сустракаюцца ў творы і згадкі пра Глыбокае, у прыватнасці, падрабязна расказана пра савецкую турму ў Беразвеччы. Усе падзеі паказаны ў рамане праўдзіва, без усялякай ідэалагічнай афарбоўкі.

У 1969 годзе ў Манрэалі праходзіла сусветная выстава ЭКСПО-67. Кастусь Акула вызначыўся тады тым, што прывітаў гасцей з СССР словамі "Мы сердечно приветствуем вас на свободной канадской земле и ненавидим антинародный кремлевский режим точно так же, как и вы его ненавидите", а потым у час выступлення намесніка міністра замежных спраў СССР Касыгіна, Палянскага ён раскідаў некалькі брашур з антысавецкімі

матэрыяламі ды голасна выкрыкнуў некалькі лозунгаў : “Смерць маскоўскім забойцам”, “Свабоду беларусам”, “Няхай жыве незалежная Беларусь”.

Яшчэ адна кніга – зборнік прозы і паэзіі “Усякая усячына” выйшла у Таронта ў 1984 годзе. У яго ўвайшлі розныя вершы пісьменніка, якія друкаваліся як у беларускіх газетах часоў нямецкай акупацыі, так і пасля вайны за мяжой. Таксама там ёсць яго аўтабіяграфічны твор “Россыпы”, п’еса “Тараканы ў саладусе” і твор “Запіскі Яўхіма Крайняга”.

Ужо пасля выхаду пісьменніка на пенсію ў 1990 годзе, у 1991 годзе, выйшла яшчэ адна кніга - “За волю”, дзе паказана жыццё нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыі ў Канадзе.

Некалькі разоў Кастусь Акула наведаў Беларусь, у тым ліку двойчы – у 1991 і 1994 гадах быў у родных мясцінах. Ён рэгулярна ахвяруе грошы на беларускія выданні, што выходзяць за мяжой. У 1995 годзе ён даў грошы на выданне аднаго з першых нумароў газеты “Вольнае Глыбокае”.

Памёр Кастусь Акула 29 студзеня 2008 года.

У 1941 годзе ў Верацеях нарадзілася Легастаева Аліна Антонаўна. Доўгі час жыла ў Крулеўшчыне са сваімі бацькамі, вучылася ў Крулеўшчынскай сярэдняй школе. Выдала два зборнікі вершаў. Друкавалася ў часопісах “Дальний Восток”, “Беларуская думка”, “Полымя”, “Маладосць”, у газетах Літвы і Украіны. Апошні час жыве ў Лагойску.

# Ветахмо

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Упершыню вёска ўпамінаецца ў 1566 годзе як урочышча ў складзе Вялікага княства Літоўскае. З 1793 года ў складзе Расійскай імперыі. У 90-х гадах XIX стагоддзя ў Ветахмо дзейнічала перасовачная царкоўна-прыходская школа. Выкладчыкам быў селянін Міхаіл Каляга, які скончыў курс народнага вучылішча і атрымліваў за сваю працу 6 рублёў за навучальны год. Вучылася ў школе 8 хлопчыкаў. Закон Божы выкладаў мясцовы свяшчэннік Іосіф Туміловіч, які скончыў курс Мінскай семінарыі.

У 1905 годзе ў вёсцы налічвалася 360 жыхароў (зараз каля 65 чалавек). З 1921 года па 1939 год вёска ўваходзіла ў склад Польшчы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў ваколіцах вёскі адбыўся адзін выпадак. Вось як аб гэтым успамінае ў сваёй кнізе “Брыгада “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў:

*«...О том, как иногда приходилось действовать партизанам, даёт представление такой боевой эпизод. 18 апреля 1943 года разведывательно-диверсионный взвод 3-го отряда под командой лейтенанта Г. Мордачева был направлен на железную дорогу Молодечно - Полоцк для разведки и подрыва пути. Гитлеровцы в это время гнали в сторону фронта поезда ... с соломой и сеном. Мы догадывались, что это маскировка. Нужно было сбросить под откос хотя бы один из них, чтобы раскрыть характер перевозок. Взводу предстояло действовать в условиях, когда железная дорога усиленно охранялась. Ночью поезда редко ходили. Перед тем как открыть дневное движение, фашисты прочесывали всю местность в полосе дороги.*

*Сам лейтенант Мордачев был опытный разведчик-подрывник; его прислали из советского тыла в 1942 году. Во взводе имелось тридцать пять бойцов (шесть разведывательно-диверсионных групп). К железной дороге они вышли у деревни Ветохма. Погода была пасмурная, порошила снежная крупа. Оставив несколько бойцов у деревни, с другими лейтенант отправился на поиск участка для минирования. Одну мину им все же удалось установить под рельсы. Можно было уходить. Но командир хотел подорвать поезд наверняка и задержался с отходом.*

*В это время у деревни Ветохма послышалась стрельба. Оживились гитлеровцы и возле железной дороги. Дав сигнал на отход, лейтенант с двумя группами бойцов бросился на помощь своему тыловому прикрытию. Гитлеровцы, которых было не менее роты, уже обошли ту группу и перебежками сближались с ней, пытаясь захватить партизан живыми. Мордачев с одиннадцатью бойцами находился на опушке леса, в тылу вражеских цепей, в каких-нибудь пятидесяти шагах от них. Решение созрело· быстро. Партизаны рассыпались в реденькую цепочку и с криком «ура!», стреляя из*

*автоматов, бросились в атаку. Немцы побежали кто куда, оставив на месте велосипеды, часть оружия, трупы офицера и нескольких солдат. Партизаны выполнили задание, не имея потерь.*

*Этот случай проявления решительности и взаимовыручки был подробно разобран с партизанами в отряде».*

Конан Павел Мікалаевіч. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт. Конан Павел Мікалаевіч нарадзіўся 7 красавіка 1960 года ў вёсцы Ветахмо Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў фізіка-матэматычную школу-інтэрнат № 18 пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава (1977), механіка-матэматычны факультэт МДУ (1982), вочную аспірантуру механіка-матэматычнага факультэта МДУ (1989) Спецыялізаваўся па кафедры аэрамеханікі і газавай дынамікі. Кваліфікацыя – механік. З 1989 года працуе на кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.



Вобласць навуковых інтарэсаў – механіка вадкасцей і газу. Распрацаваў эфектыўныя лічбава-аналітычныя метады рашэння задач гідрадынамікі з невядомымі свабоднымі межамі. Кандыдацкая дысертацыя: “Рух і ўстойлівасць пласта вадкасці на паверхні цыліндру” (навуковы кіраўнік – прафесар МДУ Шкадаў Віктар Якаўлевіч).

Чытае курсы лекцый “Матэматычныя мадэлі механікі суцэльных асяроддзяў”, “Тэорыя гідрадынамічнай устойлівасці”, “Плыні вязкай вадкасці”, “Тэарэтычная механіка” студэнтам механіка-матэматычнага факультэта БДУ.

# Вецяры

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Паселішча Вецяра знаходзіцца за паўтара кіламетра на ўсход ад ускраіны горада Докшыцы. Вёска пачынаецца пры самым ушацкім тракце, далей вуліца ідзе ў паўночным кірунку і вядзе ў кірунку Бярэзіны, уздоўж якой калісь было шмат балотаў, якія ў савейкі час былі асушаныя. Калісці тут былі тры паселішчы – Дамашы, Крывічаны і Вецяра, якія пасля Другой сусветнай вайны былі аб’яднаныя ў адно.

Вёска Дамашы ўпершыню згадваецца ў 1621 годзе, калі ў была падаравана Станіславам Кішкам капітуле жамойцкай. У 1795 годзе - 20 двароў, 74 душы мужчынскага і 78 – жаночага полу. У 1821 годзе 17 двароў. У сярэдзіне 19 стагоддзя – у складзе маёнтка Блонь. У 1910 годзе 13 двароў. У 1930 годзе - 20 двароў, 66 жыхароў, 71 дзесяціна зямлі.

Вёска Крывічаны ў некаторых дакументах канца 18 - пачатку 19 стагоддзя згадваецца пад назвай Крывы Канец. У 1795 годзе ў складзе маёнтка Докшыцы, 24 двары, 119 душ. У 1821 годзе 9 двароў. Пазней у складзе маёнтка Блонь. Напрыканцы 19 стагоддзя 13 двароў. Паводле карты 1916 года, на ўсход ад вёскі стаяў ветраны млын. У 1920 годзе солтысам вёскі быў Юльян Шэвель. У 1930 годзе 42 двары, 201 жыхар, 219 дзесяцін зямлі.

У 1795 годзе вёска Вецяра была ў складзе маёнтка Докшыцы, 22 двары, 166 душ. У 1821 годзе 20 двароў. У сярэдзіне 19 стагоддзя маёнтак Вецяра належаў тром саўладальнікам – Пшэсмыцкаму (22 душы), Турчынскаму (10 душ) і Ярцаву (35 душ). Паводле “Слоўніка геаграфічнага”, у другой палове 19 стагоддзя 200 дзесяцін у Вецяры належалі Руткевічам і 63 дзесяціны – уласнасць Шнітко. Частка Вецяры належала да маёнтка Блонь Прушынскага.

З 1861 года, пасля адмены прыгоннага права, Вецяра стала цэнтрам адной з сельскіх абшчын Докшыцкай воласці, якая ў 1922 годзе перайменавана ў Таргуноўскую. Солтысам абшчыны ў 1920-22 гадах быў Міхал Шэвель. Солтысам вёскі Вецяра быў Пётр Шнітко.

Напрыканцы 19 стагоддзя ў Вецяры быў 21 двор. У 1909 годзе 27 двароў, 128 жыхароў. У 1921 годзе 34 дамы, 189 жыхароў. 5 двароў у вёсцы часткова ці цалкам згарэлі падчас баёў 9 траўня 1920 года. У 1930 годзе ў вёсцы Вецяра 41 двор, 171 жыхар, 180 дзесяцін зямлі. У сярэдзіне 1930-х гадоў адбылася хутарызацыя вёскі.

Па звестках за 1922 год, існавалі фальваркі Вецяра І і Вецяра ІІ. Адзін з іх, дакладна, належаў Вікторыі Руткевіч. У 1930 годзе згадваецца фальварак Вецяра, 35 чалавек, 200 дзесяцін зямлі, з якіх 65 гектараў належалі Вікторыі Руткевіч. Ёй жа належала аддаленае на два кіламетры на поўдзень Гельянова. У 1930-я гады праз шлюб фальваркі Вецяра і Гельянова перайшлі ва ўласнасць Красоўскага. Фальварак, па словах мясцовых жыхароў, быў спалены ў часе Другой Сусветнай вайны партызанамі.

Старажылы прыпамінаюць яшчэ адзін эпізод з часоў вайны. Неяк на вяселле ў Вецяру прыйшлі паліцэйскія з Докшыц. Гэтым скарысталіся партызаны, якія напалі на тых паліцаяў, аднаго з іх забілі. Паліцаі ж праз некалькі дзён арыштавалі і расстралялі былых камуністаў, дэпутатаў сельсавета з Вецяры, Таргуноў, Свінога, працоўных саўгаса з Норвідполля, хоць тыя не мелі аніякага дачынення да нападу.

У 1949 годзе створаны калгас імя Дзяржынскага. У хуткім часе да Вецяры далучаны вёскі Крывічане, Дамашы і фальварак Трусы (да нашага часу знік). Пачатковая школа, што размяшчалася ў Крывічанах, да самага закрыцця называлася Крывічанскай. Нягледзячы на сваю блізкасць ад Докшыц, Вецяра адносіцца да Тумілавіцкага сельсавета. У 2004 тут (з улікам далучаных Дамашоў і Крывічанаў) 96 двароў, 176 жыхароў. Ёсць крама і ферма. Да нядаўняга часу працавала пачатковая школа. Дзякуючы блізкасці Докшыц, вёска заняпадае не так імкліва, як іншыя паселішчы гэтага краю.

Хто не ведае мясцовых назваў, не здолее знайсці могілкі ў Вецяры. Справа ў тым, што могілкі, якія ўсе называюць Вецяранскімі, знаходзяцца на ўсходняй ускраіне Докшыц. Там хаваюць нябожчыкаў не з горада, а з некалькіх вёсак на ўсход ад Докшыц: Вецяры, Таргуноў, Свінога, Плітніцы. На многіх надмагіллях, апрача імя і гадоў жыцця, напісана і назва вёскі, у якой жыў чалавек, пахаваны тут. Непадалёк – брацкая магіла вайскоўцаў, загінуўшых пры вызваленні Докшыц ад фашыстаў.

Калісьці на могілках стаяла капліца. Пра яе існаванне распавёў мне докшыцкі краязнаўца Мікалай Чысцякоў. Ён, нягледзячы на свае семдзесят восем, капліцу не бачыў, а толькі чуў аб ёй з вуснаў старажылаў. Пісьмовыя ж крыніцы не пакінулі нам аніякіх звестак аб яе існаванні.



**Могілкі вёскі Вецяра, якія зараз ужо ў межах Докшыц. На іх калісь стаяла капліца**

# Вешкі

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Аб паходжанні вёскі існуе адна легенда. Даўным-даўно на месцы цяперашніх Вешак размяшчаліся тры вёскі – Каменіца, Малінаўка і Антонаўка. У кожнай хаце была вялікая сям'я. сыны, калі вырасталі, жаніліся, аддзяляліся ад бацькі. Будавалі свае хаты і паступова тры вёскі зліліся ў адну. Зямлі пачало не хапаць. І вырашылі потым перадзяліць зямлю. Кожны надзел аддзялілі высокімі вешкамі. Так і ўзнікла новая назва вёскі – Вешкі.

У дакументальных крыніцах упершыню ўпамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 года пры пераліку населенных пунктаў Вітуніцкай воласці Барысаўскага павета. У 1897 годзе ў вёсцы налічвалася 390 жыхароў, існаваў хлебазапасны магазін. У пачатку ХХ стагоддзя вёска Вешкі 1-я. з ёй межавала вёска Вешкі 2-я, маёнткі Вешкі 1-я і Вешкі 2-я. у пачатку 30-х гадоў ХХ стагоддзя тут быў арганізаваны калгас "Новае жыццё", працавала кузня. Зараз у вёсцы пражывае каля 30 чалавек.



9 лістапада 1902 года ў Вешках нарадзіўся Беларускі кампазітар, хармайстр, фальклярыст Сакалоўскі Несцер Фёдаравіч. У 1931 годзе ён скончыў Мінскі музычны тэхнікум, а з 1932 года па 1935 год вучыўся ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. У 1926-31 гадах ён з'яўляўся акцёрам і хармайстрам БДТ -3, у 1931-37 гадах – кіраўнік самадзейных хораў. Несцер Фёдаравіч адзін з арганізатараў і хармайстр ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай дзяржаўнай філармоніі (1937-41). У 1943-44 гадах з'яўляўся мастацкім кіраўніком Палескага абласнога ансамбля песні і таца, а ў 1944-46 гадах – начальнік аддзела мастацкай самадзейнасці Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, з 1946 года старшы рэдактар рэдакцыі музычнай літаратуры Белдзяржвыдавецтва. Н.Ф. Сакалоўскі напісаў музыку да Дзяржаўнага гімна БССР, многіх хораў, песень на вершы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Машары, А. Русака, М. Чарота, А. Якімовіча і іншых, інструментальных мініяцюр, вакальных сюіт на тэмы беларускіх народных песень. Найбольш папулярны твор – "Песня пра Нёман". Запісаў і апрацаваў больш за 500 беларускіх народных песень і наігрышаў. Імя Н.Ф. Сакалоўскага прысвоена Гомельскаму каледжу мастацтваў. Памёр 13 лістапада 1950 года. Яму прысвечана кніга І.Г. Нісневіча "Кампазітар Нестар Сакалоўскі" (Мінск, 1969).

А вось што піша пра сям'ю Сакалоўскага газета "Народнае слова" № 104 ад 8 верасня 2009 года: "Толькі 13 хат засталося ад вялікай некалі вёскі Вешкі на Докшыччыне, дзе ў 1902 годзе з'явіўся на свет Нестар Сакалоўскі. З

яго радні адшукалася Святлана Славікоўская, прабабуля якой была стрыечнай сястрой кампазітара з матчынага боку. Святлана Уладзіміраўна працуе па гаспадарчай частцы ў Бярозкаўскай СШ-садзе. І, канешне ж, захоўвае сямейныя паданні пра адметнага родзіча.

Кажа, што Сакалоўскія былі «не жабракі і не беднякі, жылі крэпкавата, тры пары валоў мелі, па святах у царкву хадзілі, Нестараў бацька – у ботах».

Нестар рос вельмі чуйным да музыкі. Маці добра спявала. У бацькі быў гармонік, у дзядзькі Міхалюка – скрыпка, але малому іх не давалі, бо трэба было граць на вяселлях, па святах. У іхняй хаце нярэдка здараліся вячоркі. Зладзілі хлапчуку бубен, дык ён браў яго з сабою нават свіней пасвіць. Бацька Нестара курыў люльку, аднойчы заснуў гэтак – і хата згарэла.. А сям'я вялікая. Большым сынам сказаў: «Шукайце свой шлях, пры сабе пакіну толькі малога» – і з жонкай ды Нестарам рушыў у Мінск.

Наноў разжывацца было цяжка, бацька стаў дворнікам, маці – прачкай. Нестар трапіў у школу ажно... у 15 гадоў. Затое ў школе той вучылі і музычнай грамаце. Хлопец хутка адолеў ігру на балалайцы.

Усё жыццё Сакалоўскага звязана з народнай песняй. Удзел у знакамітым па тым часе творчым клубе «Беларуская хатка», праца ў хоры; на службе ў арміі ён ротны запявала, у Беларускім перасоўным драмтэатры Уладзіслава Галубка – акцёр і хормайстар. Дзе б ні быў – занатоўваў беларускі, украінскі, яўрэйскі музычны фальклор. Здолеў скончыць музычны тэхнікум і распачаў кампазітарскую творчасць, а яшчэ ў некалькіх калгасах паблізу Мінска арганізаваў харавую самадзейнасць. Калі ў 1937 г. быў створаны Дзяржаўны ансамбль песні і танца, Сакалоўскі і тут заняў пасаду хормайстра.

Тады, да вайны, і патрапіла ў госці да Нестара Фёдаравіча яго стрыечная сястра з Докшыччыны – Соф'я Сакалоўская, прабабуля С. Славікоўскай. Да скону потым згадвала, як пасадзілі яе на чырвоны кут у вялікай хаце з адмысловымі выцінанкамі на вокнах – убранства было на сялянскі манер: «Я ніхто, а гэткая пашана. У Нестара ўжо сям'я мелася, якраз нешта святкавалі. Былі госці – усе вучоныя такія, але простыя, прыветлівыя».

# Вешняе

*Вёска ў Парпліщчанскім сельскім Савеце*

Упершыню Вешняе ўпамінаецца ў 1558 годзе. Але, верагодна, вёска існавала і раней. У XV стагоддзі вялікія падараванні ў заходняй частцы Докшыччыны атрымаў трокскі ваявода Багдан Саковіч. Яму ж у 1485 годзе дасталася частка Даўгінава. У спадчыну Саковіча, якая належыла яго дачцэ Альжбэце, жонцы Мікалая Радзівіла, уваходзілі Ваўкалата, Праходы, Вешняны (Вешняе).

На 1886 год вёска вядома як сядзіба Вілейскага павета, існаваў вінакурны завод, працаваў ветраны млын. З 1921 года па 1939 год Вешняе ўваходзіла ў склад Польшчы. Тады тут пражывала каля 210 чалавек (зараз каля 40). У 1950 годзе арганізаваны калгас імя Хрушчова.

Каля вёскі знаходзіцца возера Сэрвач. Плошча яго каля 4,5 квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня 5,2 метра. Даўжыня 3,83 кіламетра, найбольшая шырыня 2,9 кіламетра. Даўжыня берагавой лініі каля 13 кіламетраў. Аб’ём вады ў возеры каля 13 мільёнаў кубічных метраў. Схілы катлавіны вышынёй 1-3 метра, разараныя, на захадзе невыразныя. Берагі нізкія, месцамі сплавінныя. Пойма забалочаная, пад хмызняком, на захадзе пераходзіць у забалочаную, парослую лесам нізіну.дно выслана сапрапелем, на поўначы – торфам; мелкаводдзе пясчанае. Шырыня паласы прыбярэжнай надводнай расліннасці 15-20 метраў і пашырана да глыбіні 1,5-2 метры. Зараз возера Сэрвач аб’яўлена гідралагічным заказнікам.

# Вілейка

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Вілейка вядома з 1558 года як маёнтак у складзе Вялікага княства Літоўскае. Першым вядомым уладаром вёскі быў Цішкевіч. Гэта паццвярджэнне можна знайсці пасля таго, як у 1571 годзе памёр Васіль Цішкевіч. Як вынікае з яго завяшчання, складзенага ў 1570 годзе, Вілейка адышла дзецям ад другога шлюбу – Астафію і Аляксандры (апошняя была спачатку жонкай А. Хаткевіча, затым князя к. Астрожскага і, нарэшце, М. Язлавіцкага). Аляксандра Цішкевічаўна (Тышкевічаўна) і яе муж Язлавіцкі валодалі Вілейкай і іншымі маёнткамі яшчэ ў 1594 годзе. А ўжо ў 1600 годзе Вілейкай валодаў Херубін Дыбоўскі – муж Барбары Паўлаўны з роду Пацаў. Другім мужам Барбары быў унук Юрыя Цішкевіча – Іосіф. Барбара і Іосіф Цішкевічы ў 1607 годзе былі абвінавачаны стрыечным братам Барбары Янам Дамінікавічам Пацам у нявыплаце доўгу, які з першапачатковай сумы ў 2700 коп грошаў вырас да 10 тысяч коп. паводле законаў Вялікага княства Літоўскага, у такім выпадку крэдытору маглі быць перададзены даходы з маёнткаў злоснага неплацельшчыка, пакуль не выбіралася ўся сума. Той, хто не дапускае крэдытора да "экзекуцыі" доўга на сваіх маёнтках, мог быць прыгавораны да баніцыі – выгнання з дзяржавы. Менавіта так і адбылося з Іосіфам Тышкевічам і яго жонкай, якія адмовіліся даць магчымасць Пацу выбраць доўг у маёнтку Вілейка.

У далейшым Вілейка разам з вялікім абшарам уздоўж ракі Бярэзіна апынулася цалкам ва ўладанні Яна Паца і яго нашчадкаў. Цікава, што Пацы не раз апыналіся ў такім становішчы, як некалі Тышкевіч: у 1644 годзе сын Яна Паца Ян Казімір быў прыгавораны да экзекуцыі 16 тысяч злотых на Вілейцы на карысць ігумені менскага жаночага манастыра, у 1630 годзе ён жа павінен быў такім чынам пагасіць доўг Л. Дзеравінскаму ў памеры 12 тысяч злотых.



Фота Яна Балзункевіча. Пачатак 20 ст.

У 1667 годзе ў маёнтку Вілейка было 80 дымоў (двароў). У 1702 годзе згадваецца Вілейская царква Праабражэння Гаспадняга, якой, згодна фундацыйнага запіса ад 23 жніўня 1707 года, Мікалай Андрэй Пац падараваў 2,5 валокі зямлі. Аднак у некаторых крыніцах (часопіс "Ave Maria" № 10 за 1997 год. Артыкул "Каля вытокаў Віліі". Аляксандр Лакотка) згадваецца не царква, а касцёл. Па гэтых крыніцах гэты касцёл стаяў у Вілейцы ўжо ў XVI стагоддзі.





Уцэлым, лёс вілейскага касцёла складаны і поўны драматызму. Яго гісторыя складаецца з трох этапаў. Першы – ад XVI стагоддзя і да 1818 года, калі тут быў касцёл, спачатку пры Пацах, а пазней пры візітках. Інвентар ад 23 красавіка 1793 года сведчыць, што вёска ў той час адносілася да маёнтка Кржчэнішкі Вілейскага ваяводства. Вілейка налічвала 14 двароў, якія належалі чатыром шляхцічам і простым чыншавікам, што арэндавалі двары ў маёнтку. У хуткім часе вёска стала належаць віленскаму жаночаму кляштару візітак, аб чым сведчыць інвентар ад 20 мая 1797 года.

Далей дакументы сведчаць, што той будынак, які захаваўся да нашага часу, узведзены ў 1818 годзе (другі этап). Што здарылася з папярэднім збудаваннем – невядома. Новы будынак 1818 годатаксама быў узведзены візіткамі. Пасля паўстання 1830-31 гадоў сяло і маёнтак канфіскаваны і перададзены ў казну.



Трэці этап пачаўся ў 1860 годзе. На дзяржаўную субсідыю 1122 рублі ў выніку капітальнага рамонту былы касцёл пераабсталявалі ў Праабражэнскую царкву – так ажыццяўлялася царская праграма замены каталіцызму праваслаўем. З каштоўнага начыння ў царкве былі набор літургічных сасудаў і тры Евангеллі – два з простым абкладам з фінціфамі, а адно з абкладам з фіялетавага аксаміту са срэбраным і залочаным аздабленнем. Побач з храмам знаходзіліся могілкі, абнесеныя драўлянай агароджай. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў святаром віленскай царквы быў Акім Андрыеўскі, які ў Мінску меў дом на Паўночным завулку, 18.

У 1861 годзе ў Вілейцы адчынена народнае вучылішча. Яно знаходзілася ў грамадскім арандаваным будынку і ўтрымлівалася на сродкі дзяржаўнага казначэйства і збораў з мясцовых сялян. У 1874 годзе з дзяржаўнага казначэйства было выдаткавана 169 рублёў 43,25 капеек, а 54 рублі 6,75 капеек – ад сялян. У гэты час тут працаваў настаўнікам выхаванец Жыровіцкага духоўнага вучылішча Сільвестр Іванавіч Пігальскі, а законанастаўнікам праваслаўнага спавядання быў свяшчэннік, выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі Уладзімір Вікенцьевіч Мацкевіч. у 1879 годзе пры праваслаўнай царкве дзейнічала папячыцельства. Прыход налічваў каля 1,3 тысячы вернікаў, з іх пісьменнымі было не больш чым 3%.

У 1887-87 навучальным годзе на ўтрыманне вучылішча было адпушчана з дзяржаўнага казначэйства 159 рублёў 93 капейкі, а ад сялян – 100 рублёў 7 капеек. 30 хлопчыкаў вучыў Васіль Піваварчык, які скончыў курс Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, закон Божы, як і раней, выкладаў У.В. Мацкевіч.

У пачатку XX стагоддзя школу наведвала 48 дзяцей (сярод іх 7 дзяўчынак), іх вучылі: настаўнік, выхаванец Нясвіжскай настаўніцкай

семінарыі Андрэй Навумавіч Анціповіч (жалаванне 200 рублёў і кватэра); законанастаўнік праваслаўнага спавядання свяшчэннік, выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі Акім Андрыеўскі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі народнае вучылішча пераўтворана ў савецкую пачатковую школу, у якой вучыліся таксама дзеці з многіх навакольных вёсак і хутароў (у 1924 годзе – 76 вучняў).

У 1933 годзе ў Вілейцы арганізавалі калгас, стала працаваць кузня. Менавіта на 30-я гады прыходзіцца заняпад царквы. Яна зачынена. Крыжы скінулі, званы невядома куды звезлі, абразы спалілі ці разрабавалі. Але моцная пабудова, зробленая выдатнымі майстрамі з якаснай драўніны ўпарта супраціўляецца бязлітаснаму часу. Абадралі паціху шалёўку, прагніла страха, пахіліліся макаўкі вежаў, але і цяпер выдатны помнік драўлянай архітэктуры дамінуе ў сілуэце вёскі. Каля драўлянага храма захаваліся рэшткі "Святой" крыніцы.

Што датычыцца забудовы вёскі, то яна мела некаторыя свае асаблівасці. Яе можна праслядзіць на прыкладзе забудовы фальварка Вілейка. Які знаходзіўся побач з вёскай Вілейка. Фальварак складаўся з сядзібнага дома, які нагадваў традыцыйную сялянскую хату на 2 паловы (хата-сені-хата) з ганкам на слупах і саламянай ці дранкавай страхой. Насупраць ганка была пляцоўка з клумбай пасярэдзіне (тут разварочваліся брычкі), абсадка дрэў і сад, двухярусны свіран (лямус), сырніца (зрубная пабудова накшталт невялікага свірна на слупах), лядоўня (склеп з вялікай ямай пасярэдзіне, дзе трымалі лёд, ці невялікі будынак з уцепленымі тынкоўкай падвойнымі сценамі, паміж якімі таксама закідвалі лёд). Уезд на сядзібу – праз браму з варотамі і вешніцамі. З супрацьлеглага боку знаходзіўся гаспадарчы двор (хлявы і прыгуменне), а таксама вытворчыя пабудовы: саладоўня, піваварня. Паколькі побач была рэчка, у Вілейцы быў вадзяны млын.



Ёсць у Вілейцы яшчэ адно месца, дзе нібыта зноў трапляеш у далёкае мінулае. Гэта старыя могілкі. Яны, бадай, самыя загадкавыя і захавалі шматлікія мемарыяльныя помнікі. Тут, сярод старых дрэў, трапляецца і абчасаны з аднаго боку валун з выявай яловай ялінкі, - найстаражытнейшага індаеўрапейскага дрэва жыцця. Шмат у старым хмызняку камянёў з выявай тэўтонскага і мальтыйскага крыжоў. Захаваліся тут і разнастайныя кавальскія крыжы. Уражваюць сваёй велічнасцю магутныя драўляныя. Ёсць помнік у выглядзе драўлянага абеліска, верх якога нагадвае трохпялёсткавае суквецце – сімвал жыцця.



У маі 1943 года ў ваколіцах вёскі адбыўся слаўны бой партызан брыгады "Жалязняк" з карнікамі. Як раз у гэты час немцы праводзілі ў Барысаўска-Бягомльскай зоне карную аперацыю "Коттбус". Каля вёскі была абсталявана абарона, якую партызаны рыхтавалі

як падманную. Аднак фашысты прынялі яе як дзеючыю. Лейтэнант Сенюгін выкарыстаў гэтую замінку ворага. Ён пасадзіў у закінутыя акопы для прыманкі немцаў усяго адно аддзяленне з двумя ручнымі кулямётамі. Астатнія сілы занялі абарону на флангах. У іх узбраенні былі станкавыя кулямёты.

“Фіктыўную” лінію абароны на працягу двух гадзін апрацоўвалі нямецкія самалёты і артылерыя. Адразу ж пасля гэтага карнікі густым ланцугом пайшлі ў атаку. Аддзяленне партызан адважна абстрэлівала немцаў то з аднаго боку, то з другога боку акопа. Гітлераўцы вырашылі пайсці ў абход. І тут зусім нечакана для фашыстаў па іх з флангаў ударылі з засады станкавыя кулямёты партызан. Ланцугі ворага перамяшаліся, адступілі назад і папалі пад перакрыжаваны агонь. Каб уратаваць становішча, фашысты выклікалі авіяцыю і ўвялі ў бой два танкі. З вялікімі стратамі немцы адышлі да Вілейкі.



А 24 чэрвеня 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі жывымі 39 жыхароў вёскі. Ў 1967 годзе на месцы іх загубы насыпаны Курган Памяці. На яго вяршыні пастаўлены абеліск з памятным надпісам і імёнамі ахвяр фашызму.

Зараз вёсцы Вілейка пражывае каля 105 чалавек.

# Віржы

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

У 1905 годзе ў вёсцы налічвалася 192 жыхары (зараз каля 100 жыхароў) З 1921 года па 1939 год яна ўваходзіла ў склад Польшчы.

За 300 метраў на захад ад вёскі Віржы знаходзіцца курган вышынёй паўметра і дыяметрам 3,5 метра. Гэты курган выявіў яшчэ ў канцы XIX стагоддзя Ф.В. Пакроўскі, аднак раскопак тут ніхто не праводзіў. У канцы 19 стагоддзя згадваецца у “Археалагічнай карце Віленскай губерні”, складзенай Ф. В. Пакроўскім, што селянін В. Падрэз раскапаў адзін курган і знайшоў там жалезны абруч.

**Паляванне**

*(амаль па Коласу)*

У вёсцы – хто ж таго не знае? –
Улетку часу не хапае
На гульні розныя, забавы,
Бо кожны там заняты справай.
Але прыгоды ўсё ж бываюць,
Сямейства наша не мінаюць.
Вось як было. Бабуля Ніна
Раз захацела свежаніны,
Купіла ў Сітцах парсючка –
Пудоў на восем таўсцячка.
“Два тыдні, мабыць, патрымаю, –
Бабуля гэтак разважае, –
І ў найбольш спрыяльны час
Наробім фаршу і каўбас”.
Ды… хочаш Бога рассмяшыць –
Яму пра планы раскажы.
Кабанчык той быў не флегматык:
Ад ранку да начы заўзята
Варочаў у хлеве ўсё і рыў,
Таптаў, грыз, трушчыў і крышыў.
Дружыць з бабуляй не хацеў
І, развярнуўшы ўрэшце хлеў,
Уцёк на волю. Мо гадзіну
Усёй вёскай на скаціну
Па агародах палявалі
І да суседа ў хлеў загналі.
Тры дні пражыў там парсючок,
А ў суботу зноў уцёк.
Забыліся і на вячэру:
Яго на новую кватэру
Загналі зноў (аж праз дзве хаты!)
“Ды гэткім чынам у Валкалатах
Жыць гэты душагуб і злыдзень
Не далей будзе як праз тыдзень!”
Бабуля вечарам суботнім
Тэлефануе на работу
Да дзядзькі Мішы: “Мой сынок,
Калі ты хочаш кумпячок
Ды хоць кавалачак пячонкі,
Хутчэй імчы дамоў па жонку
І з ёй стралой да нас ляці.
Дык справімся да дзевяці
Мы пагалоўшчыну зрабіць,
Бо можа стацца, што лавіць
Нам будзе некага зрання:
То ж чысты чорт, а не свіння!
Хлеў слабенькі за ноч разваліць –
І памінай тады, як звалі”.
Ну што тут скажаш? Форс-мажор.
Свінчу падпісан прыгавор.
Далей прайшло мо з паўгадзіны Пад
кіраўніцтвам бабы Ніны
(Наперадзе ішла з бачком)
На справу рушылі. З нажом
За ёю дзядзька Пеця ішоў,
А Міша нёс вяровак з тузін,

Калону замыкаў дзед Юзік.
Прыйшлі. Ледзь адчынілі хлеў,
Як наш кабанчык ашалеў,
Паклаў дзядулю на лапаткі,
Рвануў за вёску без аглядкі.
Ляцеў – аж вецер у вушах –
Па цёткі Магдзі гарбузах,
Па цёткі Ванды бураках
І… знік, схаваўся у кустах.
Бабуля, як военачальнік,
Каманды гучна аддавала:
“Ты, Юзік, з віду не ўпускай,
Ты, Пеця, справа забягай…”
А мама з цёцяю Марынай
Ля град стаяць былі павінны.
Трашчаць сукі ў гушчары –
І толькі рэха на двары…
“Гэй, Юзік, Юзік, ты жывы?!” –
Крычыць бабуля з крапівы.
“Я і памру тут, – ледзь не плача, –
Ці чуеш, Юзік? Дзе кабанчык?”
“Няхай бы воўк яго парваў!
Во толькі тут быў, ды прапаў…”
“Відаць, пад’елі свежаніны”, –
Упала духам баба Ніна.
А дзядзька Міша раззлаваўся,
І да дарогі ён падаўся:
“Гадоў як быццам мне не пяць,
Каб зайцам па кустах скакаць!
Управу знойдзем на скаціну:
У Валкалаты я, па Дзіму,
З ружжа ён гаду ў вуха – чырк!
І ўраз закончым гэты цырк”.
Ускочыў Міша ў машыну,
Дзвярамі ляснуў без прычыны,
Так ірвануў ён з месца, злосны,
Што б сам Шумахер
пазайздросціў…
Не прамільгнула і пяць хвілін –
Вярнуўся Міша не адзін:
З ім Дзіма быў у форме “хакі”,
З ружжом. Спужаліся сабакі.
(Даруй чытач, што не сказала
Пра іх раней. Не ўсіх назвала
Я тут удзельнікаў аблавы.
Унеслі свой уклад у справу –
Замоўчваць гэта мы не будзем
Дзядулеў Рэкс і Мішаў Рудзік).
Што ж. Марна часу не гублялі,
Захопу план распрацавалі
І, стаўшы ў лінію адну,
Пайшлі, як немцы ў вайну.
Змаглі бадзягу адшукаць.
Яго рашылі не страляць,
Бо як з той крапівы, з кустоў
Данесці гэтулькі пудоў?
Хвілін праз дваццаць на дарогу
Урэшце вывелі нябогу.
Спачатку мама ішла з Марынай,
Затым бабуля з хварасцінай,
За ёй кабанчык у вяроўках –
Ім кіраваў дзядуля лоўка.
Яму сыны дапамагалі:
Уцекача ў бакі штурхалі.
Затым з узведзеным ружжом
Для падстрахоўкі Дзіма ішоў.
І, брэшучы з апошняй сілы,
Сабакі прыкрывалі з тылу
Падчас “вайны” здабыты ўлоў.
Кіроўца стрэчных “Жыгулёў”,
Убачыўшы такі эскорт,
Ледзь-ледзь не ўрэзаўся ў плот.
…Ужо на вуліцы сцямнела,
Калі ў патэльні засквірчэла,
Запахла апетытна скварка.
Дзядуля Юзік, узняўшы чарку,
На ўсіх прысутных хітра глянуў
І тост сказаў: “За паляванне!”

Падзеі, апісаныя тут, адбыліся ў вёсцы Віржы, што за 2 км ад Валкалаты. Імёны людзей і мянушкі жывёл сапраўдныя.

Н. Несцяронак,
студэнтка БДУ.

# Вітунічы

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Па народнаму павер'ю ў адной вёсцы жылі хлопец Вітань і дзяўчына Мар'я. вельмі яны кахалі адзін аднаго. Але ў той жа вёсцы жыў жорсткі пан, які хацеў зрабіць прыгажуню Мар'ю сваёй палюбоўніцай. Ад граха далей пайшлі маладыя куды вочы глядзяць.дайшлі яны да прыгожай рэчкі і вырашылі тут застацца.мар'я прапанавала назваць мясцовасць Віталічы ў гонар каханага. Хлопец згадзіўся, але прапанаваў у сэнс слова ўкладываць тое, што ўсе людзі, якія будуць тут сяліцца, будуць ветлівыя і усім гаварыць: "Вітаю, Вас!" Так і ўзнікла назва вёскі – Вітунічы.

У пісьмовых жа крыніцах Вітунічы ўпершыню ўпамінаюцца ў 1567 годзе, калі ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскае, а потым з 1569 года ў склад Рэчы Паспалітай. Аднак у 1525 годзе сярод маёнткаў Ядзвігі Аляксандраўны Гальшанскай, якая ў той час была ўдавой пана Яна Літавора Храбтовіча, можна знайсці ўпамінанне часткі Вітуніч.



Пасля абрання ў 1575 годзе каралём Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя наступіў перадлом у вайне з Расіяй. За ваенныя заслугі кароль падараваў аднаму са сваіх афіцэраў, польскаму шляхціч Хмялеўскаму, маёнтак Вітунічы. За некалькі гадоў да таго, у 1567 годзе, Вітунічы былі ўладаннем адной з дачок Крысціны Глябовічны-Камаеўскай, якая была ў той момант удавой Станіслава Кміты. Якімсьці чынам гэты маёнтак трапіў затым не да родзічаў Камаеўскай, а ў дзяржаўную ўласнасць, з ліку якой С. Баторый і ўзнагародзіў Хмялеўскага.

У XVII стагоддзі Вітунічы – невялічкае мястэчка, у якім налічвалася 32 мяшчанскія пляцы. Тут знаходзіўся шляхецкі фальварак, што меў 20 валок зямлі.

У 1861 годзе каля Вітуніч было вінакурнае прадпрыемства пана Карказовіча. Магутнасць завода ў час вінакурэння было каля 5000 вёдзер віна.



У 1863-69 гадах на сродкі прыхаджан і дзяржаўнага казначэйства пабудавана новая драўляная царква. Яна была вырашана кубападобным зрубам малітоўнай залы, накрытым гонтавым шатром з цыбулепадобнай галоўкай на гранёным барабане. Да малітоўнай залы далучаўся працяглы прамавугольны ў плане бабінец, над якім

была ўзведзена 2-ярусная (васьмярык на нізкім чацверыку) шатровая званіца з макаўкай. Уваход арганізаваны праз нізкі прытвор. З процілеглага боку ад малітоўнай залы далучалася больш нізкая выцягнутая абсіда. Гарызантальныя абшытыя цёсам фасады чляніліся прамавугольнымі аконнымі праёмамі з сандрыкамі. У 1879 годзе прыход налічваў каля 2,3 тысячы душ прыходжан, якія, у асноўным, належалі да сялянскага саслоўя, пры царкве працавала царкоўнапрыхадское папячыцельства.

У 1884 годзе адчынена царкоўна прыходская школа. Яна размяшчалася ў аддзельным будынку. У 1890-91 навучальным годзе настаўніцай у школе працавала Алена Іванаўна Валачковіч, якая скончыла курс Мінскага жаночага вучылішча. Яе зарабатная плата складала 48 рублёў за зіму. А Закон Божы выкладаў мясцовы свяшчэннік В. Лісіцкі, які скончыў курс Мінскай семінарыі. У гэтым навучальным годзе ў школе навучаліся 30 хлопчыкаў і адна дзяўчынка.

У 1897 годзе ў Вітунічах пражывала 192 чалавекі, мелася валасное праўленне, прыходская царква, пітны дом, лаўка, хлебазапасны магазін, уведзены ў строй новы школьны драўляны будынак з гонтавым дахам. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адчынена савецкая пачатковая школа, у якой у 1924 годзе два настаўнікі вучылі 78 дзяцей. У 1933 годзе ў Вітунічах працаваў вадзяны млын. 30 мая 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 124 жыхароў. А адбылася гэта трагедыя так: “*... Нядзеля. Каторы тыдзень па ўсёй Бягомльшчыне жудасная блакада. Праўда, асноўныя баі з партызанамі перамясціліся за раку Бярозу. А тут пацішэла. Пранясецца праз вёску з Докшыц на Бягомль нямецкая машына – і зноў ахопіць вяскоўцаў непакой: а што будзе далей?*

*- Нядзеля – дзень не рабочы. І мы, вясковыя падшыванцы, - успамінае Пётр Дзянісавіч, - коней павялі на выпас. На лясной лугавіне, у Барсуках, што між Старым Запоннем і Глінішчамі, кожны спутаў свайго каня. Коні ўзяліся скубсці, а мы – гуляць.*

*... У самы разгар гульні недзе між Нябышынам і Вітунічамі раздаўся моцны грукат. Усе прыціхлі, гульня перарвалася. Чакалі новых выбухаў. Іх не было.*

*Сонца бралася пад поўдзень. Пара і абедаць. Некаторыя з падлеткаў бралі лусты з сабой, некаторыя ехалі абедаць дадому. Пятро Бобрык разам з сябрам Вінцэсем Катэкам выехалі з лесу ў Дворышчах, па дарозе з Запоння. Спыніліся. Цішыня над вёскай: ні сабак, ні пеўняў не чуваць.*

*У сяле з кожнага акна выглядаюць спужаныя людзі.*

*- На падворку чакала мяне бабуля і маці, - працягвае сведка той трагедыі. – На тварах – выраз няпэўнасці. У нейкіх пасцілках звязаны нейкія рэчы, відаць, каб у патрэбным выпадку выхапіць з хаты самае неабходнае.*

*Абедалі моўчкі. Каб парушыць цішыню, хлопец пытае ў маці пра той грукат, што так напалохаў пастушкоў. Аказваецца, нехта бачыў, што на грэблі за вёскай нямецкая легкавушка падарвалася.*

*... З боку Бягомля пачуўся гул машын. Усё мацней і мацней... Усё бліжэй і бліжэй... Доўгі грузавік з высокімі бартамі. Адзін пры адным стаяць з двух бакоў вайскоўцы ў зялёным, на галовах каскі. У адной руцэ вінтоўка, другой трымаюцца за борт. На кабіне кулямёт.*

*У момант усе пакінулі хату. І на звязаныя клункі забыліся.*

*Недзе каля магазіна грымнуў першы стрэл. А на другім канцы вёскі засакатаў кулямёт.*

*- Не помню, як апынуўся на кабыле, і чамусьці не галопам, а павольнай хадою выправіўся на загуменную дарожку. Азірнуўся: там і тут ва ўсю моц шугае агонь, а чорны дым не падымаўся ўгару: парывы рэзкага ветру з поўдня слалі дым уздоўж вуліцы, - расказвае Пётр Бобрык. Па дарозе на Глінішчы пачуў, як заціўкалі кулі над галавой. Скуліўся ў прыдарожную канаву. Клікаў за сабой кабылу – не паслухалася, завярнула ў вёску, якраз пад варожую кулю...*

*Неяк ціха і хутка дагарала сяло. Мёртвыя замоўклі навечна, жывыя, хто здолеў схавацца, маўчалі са страху. І стала зусім невыносна жудасна, калі адвячоркам з поля вярнулася скаціна: каровы такі ўзнялі рык каля сваіх папялішчаў, што, казалі, у другіх вёсках было чуваць. Нібы і скаціна аплаквала сваіх палеглых гаспадынь.*

*Тыя нямногія, што засталіся жывымі, дацямна не асмельваліся пакінуць сховішчы.*

*А потым (толькі наступнай раніцай) сталі лічыць і жыццё, і страты. Апошніх было намнога больш... З блізкага лесу выходзілі на ўскраіну, чуйна ўглядаліся, услухоўваліся, ці не грымяць маторы з-пад Асінавіка, З-пад Нябышына. Перш, чым наблізіцца да вёскі, намячалі шляхі адыходу зноў у ратавальны лес.*



**Вітунічы пасля трагедыі**

*Увесь наступны дзень быў прысвечаны пошуку сваіх, палілі ўсё ж карнікі не ў кажнай хаце. Па кавалках абгарэлай вопраткі пазнавалі блізкіх. Асцярожна складалі на пасцілку. Хавалі тут жа, недалёка, хто на ўзбочыне, хто на падворку.*

*... А зязюлі ў гэтыя дні кукавалі, як ніколі пасля. Здаецца, з усяго лесу зляцеліся ў абгарэлыя сады, і, вісну чы на закапцелых галінках, так ужо кукавалі, як быццам і яны адчулі невыказны боль роднай зямлі.*

*А людзі не плакалі. Як акамянелыя сэрцы ў непапраўным горы. У адзін дзень было расстраляна і спалена больш за 120 дзяцей і дарослых. Колькі ўзарвалася немцаў у той легкавушцы – і дагэтуль невядома. Надта ўжо неадэкватная цана была выстаўлена ў той недарэчнай партызанскай схватцы з гітлераўцамі.*

*За некалькі гадзін вёска была знішчана дашчэнту. Полымя праглынула больш за паўсотню хат з надворнымі будынкамі. Са значных пабудоў згарэлі панскі дом за сучасным возерам, дзе быў размешчаны дзіцячы садок, будынак*

*сельсавета, амбулаторыя, аптэка, пошта, два магазіны, будынак старой царкоўна-прыхотскай школы. Засталіся царква і каменны будынак новай сярэдняй школы".*





***(па успамінах былога настаўніка Вітуніцкай СШ Бобрыка Пятра Дзянісавіча)***

У цэнтры вёскі, перад будынкам канторы саўгаса "Вітунічы" на ўшанаванне памяці 124 аднавяскоўцаў, загубленных у маі 1943 года нямецка-фашысцкімі акупантамі, у 1967 годзе пастаўлена стэла.

На ўсходняй ускраіне вёскі ў брацкай магіле пахаваны 13 савецкіх воінаў і 24 партызаны брыгады "Жалязняк", якія загінулі ў баях у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1964 годзе на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна, а ў 1967 годзе ўстаноўлена стэла на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму.



1 верасня 1994 годзе ў Вітунічах пабудавана новая двухпавярховая школа. Пасля яе ў раёне школ больш не будавалі.

У 2002 годзе ў Докшыцкім раёне аспірантам Інстытута гісторыі А.В.Вайцяховічам быў даследаваны курганны могільнік каля вёскі Вітунічы.

У могільніку каля вёскі Вітунічы з чатырох даследаваных курганоў толькі ў адным было выяўлена пахаванне. Адметнай рысаю двух насыпаў без пахаванняў з'яўляецца наяўнасць камянёў, найбольш буйныя з якіх







размешчаны па цэнтру курганоў і арыентаваны па баках свету. Гэтыя насыпы могуць выконваць мемарыятыўную функцыю як кенатафы, дзе сімвалічную ролю нябожчыкаў адыгрывалі камяні.

Пры раскопках былі знойдзены наступныя рэчы:







23 ліпеня 1939 года ў Вітунічах нарадзіўся беларускі пісьменнік, публіцыст, грамадска-культурны дзеяч Кірвель Анатоль Мяфодзьевіч. У 1968-71 гадах вучыўся ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў. Працаваў у Карэліі, Валагодскай вобласці (Расія). З 1977 года жыве ў Санкт-Пецярбургу. Быў слесарам, маляром, мастаком-афарміцелем, будаўніком. Рэдактар-выдавец незалежнай газеты пецярбургскіх беларусаў "Родзічы" (выходзіць са снежня 1991 года). Старшыня суполкі міжнароднага фонду Я. Купалы, член Рады Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, прэзідэнт Незалежнай асацыяцыі аматараў прыгожага



пісьменства "Новая Беларусь", якая займаецца наладжваннем літаратурных сувязей пецярбургскай дыяспары з Бацькаўшчынай. Удзельнічаў у Мінску ў рабоце І Міжнароднага кангрэса беларусістаў(1991), Сходу беларусаў блізкага замежжа (1992), 1-3-га з'ездаў беларусаў свету (1993, 1997, 2001). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). У беларускай перыёдыцы апублікаваў шэраг літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў пра творчасць маладых беларускіх празаікаў і паэтаў пад назвай "Літаратурная палітра".

# Вознаўшчына

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце*

Пра вёску вядома мала. У 1905 годзе тут пражывалі 93 жыхары. З 1921 года па 1939 год Вознаўшчына ўваходзіла ў склад Польшчы. У 1949 годзе тут арганізавалі калгас імя Маленкова. З 16 ліпеня 1954 года па 1 студзеня 1959 года Вознаўшчына – цэнтр сельскага Савета. Зараз у вёсцы пражывае каля 5 чалавек.

Вакол вёскі раскінуўся густы хваёвы лес. Мясцовыя жыхары называюць яго Вознаўскім лесам. Ва ўсіх лясах, размешчаных бліжэй да Вознаўскага лесу водзяцца змеі. А ў Вознаўскім лесе гадаўя чамусьці няма. У сувязі з гэтым бытуе легенда па навакольных вёсках і самой Вознаўшчыне:

"…Некалі ў гэтым лесе прыпыніўся на адпачынак цыганскі табар. Ім вельмі спадабалася гэтае месца. Ды тут многа і грыбоў і ягад. Вось аднойчы маленькае цыганя гуляла па лесе,  і яго ўкусіла гадзюка. Пасля гэтага цыгане пакінулі свій лясны прытулак. А лес замовілі. Адразу усе гадзюкі зніклі з гэтага месца. Яны перапаўзлі ў суседнія лясы. Кажуць, што гэтыя гадзюкі, як тыя цыганскія вазы, паўзлі па лясных сцяжынках.

Беларускі адраджэнскі рух на рэлігійнай ніве распачаўся ўжо ў палавіне мінулага стагодзьдзя (XIX ст. — *Рэд.*), але жорсткая рэакцыя царскага рэжыму пасьля паўстаньня 1863 г. той рух паважна спаралiжавала. Аднак ніякі тэрор ня мог поўнасьцю спыніць разьвіцьцё народнага жыцьця. Яно хоць паволі, але няспынна ішло ўперад і разьвівалася ўва ўсіх сваіх галінах. Ітак ужо напрыканцы мінулага стагодзьдзя пачаў ажываць беларускі адраджэнскі рух на рэлігійнай ніве. Паважны ўклад у гэты рух зрабіў ксёндз Францішак Будзька.



Ён нарадзіўся ў вёсцы Вознаўшчына Пархвенаўскае парахвіі Вілейскага павету ў 1884 годзе ў набожнай сялянскай сям'і. Асвету атрымаў  у пачатковай школе ў Будславе, а потым у павятовай гарадзкой школе ў Вілейцы. Чуючы нахіл да сьвятарства, уступіў у Каталіцкую духоўную сэмінарыю ў Вільні. Скончыўшы яе ў 1905 годзе і атрымаўшы дыяканскія сьвячэньні, уступіў у Каталіцкую духоўную акадэмію ў Пецярбургу, дзе вучыўся на свой кошт. Там ён зышоўся з беларускімі дзеячамі й быў нават у блізкіх адносінах з прафэсарам Браніславам Эпімахам-Шыпі лам, які выкладаў грэцкую мову ў акадэміі й быў бібліятэкарам акадэмічнае бібліятэкі. У тым часе беларускія студэнты ў акадэміі яшчэ не былі зарганізаваныя, але ўжо стараліся трымацца разам і часта сходзіліся на кватэры дыякана Будзькі. Тыя сходкі потым далі пачатак Беларускаму гуртку ў акадэміі. За год навукі вычарпаліся ўсе ягоныя ашчаднасьці, дык, ня маючы магчымасьці прадаўжаць навуку ў Акадэміі, ён

вярнуўся ў духоўную сэмінарыю ў Вільню, каб атрымаць сьвятарскія сьвячэньні. Але ў тым часе сэмінарыйнае кіраўніцтва да яго паставілася непрыхільна за беларускую дзейнасьць ды загадала чакаць. Бо ён падчас навукі ў сэмінарыі ўжо пісаў беларускія артыкулы й тлумачыў на беларускую мову папулярныя рэлігійныя кнігі. Пабачыўшы, што тое чаканьне працягваецца без аніякае прычыны, ён зьвярнуўся да пралата Данісевіча, які прызнаваўся ў беларускасьці й які ў 1905—1908 гг. быў генэральным вікарыем у Магілёўскай архідыяцэзіі, і зь ягонаю дапамогаю атрымаў сьвятарскія сьвячэньні ў 1907 г. ды быў накіраваны ў Полацак на вікарыя. Тут трэба заўважыць, што за сваю беларускую дзейнасьць ён увесь час аставаўся вікарыем, але гэтым не пераймаўся й шчыра выконваў свае душпастырскія абавязкі. Казаньні ён гаварыў па-беларуску й гаварыў красамоўна, да таго ж стараўся гаварыць і ў суседніх парахвіях у тых касьцёлах, што ня мелі сваіх сталых ксяндзоў. З Полацку ён часта езьдзіў у Вулы, і туды заўсёды схадзілася багата вернікаў, каб паслухаць казаньне ў роднай мове й пасьпяваць беларускія рэлігійныя песьні. Езьдзіў таксама на фэсты ў тыя парахвіі, дзе мог гаварыць па-беларуску казаньні. Яго часта запрашаў да сябе ў Фашчоўку ксёндз Сак на ўрачыстыя працэсіі.

Калі ж у Магілёўскай архідыяцэзіяльнай курыі ня стала пралата Данісевіча, дык ксяндза Будзьку перанесьлі з Полацку ў Пецярбург на вікарыя ў касьцёле сьв. Станіслава. Тут ён ня меў магчымасьці гаварыць беларускія казаньні, але затое матэрыяльна дапамагаў беларускім выдавецтвам, асабліва першай беларускай каталіцкай газэце «Беларус», якая выходзіла ў Вільні пачынаючы ад 1913 г. да 1915 г., пад рэдакцыяй Браніслава Пачопкі. У выдавецтве гэтае рэдакцыі выйшлі ў Вільні Будзькавы кніжкі «Мятавыя лісточкі» (1913), «Некалькі слоў аб пакуце» (1914), пераклад кнігі ксяндза Банчкоўскага «Выясьнень не абрадаў Рыма-Каталіцкага касьцёла» (1914). Аднак сталічнае жыцьцё ў Петраградзе не задавальняла ксяндза Будзьку — яго цягнула да народнае гушчы. Дзеля гэтага ў 1917 г. пасьля Лютаўскае рэвалюцыі ён купіў у пазыку невялікі маёнтак, у якім была драўляная капліца. Там ён завёў сталыя багаслужэньні зь беларускімі казаньнямі й беларускімі рэлігійнымі песьнямі. У тым жа годзе ён браў удзел напрыканцы траўня на зьезьдзе беларускага каталіцкага духавенства ў Менску.

Зімою 1920 г. ксёндз Будзька ў часе падарожжа захварэў на запаленьне лёгкіх. Здарылася гэта ў Янотрудзе каля станцыі Глушаніна, што знаходзіцца паміж Віцебскам і Полацкам. Ня маючы лекарскай апекі, ён там аддаў Богу сваю душу ў сам дзень Грамніцаў 2 лютага 1920 г., маючы ўсяго 36 гадоў. Вестка аб ягонай сьмерці дайшла да родных у Заходняй Беларусі толькі праз пару месяцаў.

# Вольберавічы

(Вольбаравічы ці Ольберавічы)

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Упершыню Вольберавічы ўпамінаюцца ў 1534 годзе. Аднак па дакументах у Соф'і Манівідаўны і Мікалая Радзівілавіча былі чатыры сыны: Мікалай, Ян, Юрый і Войцех. З іх нежанаты Войцех, біскуп віленскі, памёр у 1519 годзе, а ў 1520 годзе астатнія тры браты, якія былі ўжо сталымі людзьмі, нанава падзялілі маёнткі. На долю, якую атрымаў малодшы з братоў, Юрый Мікалаевіч Радзівіл, належала, напэўна, частка насельнікаў Вольберавічаў. Пазней Вольберавічы сталі ўласнасцю яго сына – Мікалая Радзівіла Рудога, які меў тытул князя "на Біржах і Дубінках". Гэты маёнтак быў аб'ектам здзелкі паміж ім і панам Васілём Цішкевічам у 1567 годзе. Па некаторых звестках Вольберавічы і яшчэ некалькі маёнткаў былі ўзяты ў заклад за 2800 коп грошаў Цішкевічам у Мікалая Юр'евіча Цішкевіча. У юрыдычных актах 1570 года Вольберавічы ўказваюцца як сяло ў складзе Вялікага княства Літоўскае і з'яўляюцца ўладаннем Цішкевічаў.

Многа пазней Рудаміны-Дусяцкія падаравалі Вольберавічы кляштару так званых "босых" кармелітаў у Глыбокім, заснаванаму ў 1640 годзе. Пасля падаўлення паўстання 1830-31 гадоў царскі ўрад канфіскаваў не толькі маёнткі актыўных удзельнікаў паўстання, але і апошніх каталіцкіх кляштароў. Так Вольберавічы адыйшлі ў казну.

Цікавыя звесткі можна знайсці пра падзеі, якія адбываліся ў Вольберавічах пад час паўстання 1863-64 гадоў:

***«Его Высокопреосвященству Высокопреосвященнейшему Михаилу, архиепископу Минскому и Бобруйскому и разных орденов кавалеру.***

***Борисовского Уезда Докшицко-Борисовского благочиния Ольберовицкой Крестовоздвиженской церкви приходского священника Іулиана Еленского всепокорнейшее прошение.***

***21 января 1865 г.***

*Никогда бы я не осмелился наскучать моею всепокорнейшею просьбою Милостивейщего Архипастыря, если бы не вызвало меня к этому отеческая заботливость Вашего Преосвященства, объявленная всему духовенству Докшицко-Борисовского благочиния от 7 декабря 1864 года, коею дано право просить пособие по уважительным причинам, которые привели к этой необходимости.*

*Несмотря на мою осторожность и таинственность в противодействии польским мятежникам, они узнали это и поэтому мстили. Мятежник Дмаховский, польский выходец с 1831 года, формировавший шайку мятежников в лесах ... товских (неразборліва) на границах вверенного мне прихода и, имея по этому случаю особенные виды*

*на мой приход как многолюдный, первый на его дороге в леса Ильские, куда он хотел перебраться для подкрепления находящейся там шайки Козела и, как смежный с околичною польскою шляхтою, разными приемами внушал мне панический страх, чтобы я отрекся долга своего звания и верноподданической присяги. Но как вся сила его приемов не подействовала на меня, то он, Дмаховский, велел сжечь занимаемые мною духовные строения. Поджег произведен с холодных строений в полночь с 2-го на 3-е декабря Светлого Воскресенья 1863 года. А как и этот прием Дмаховского не подействовал на меня и я остался верным себе в энергическом противодействии польским мятежникам, то Дмаховский разъярился повесить меня, что и было бы исполнено мятежниками, если бы не спас меня Бог противодействием моим, в силу которого сам Дмаховский погиб с шайкой своею.*

*По причине сего, потеряв через пожар все движимое имущество, семена, хлеб и часть скота, и, кроме того, спасаясь от виселицы, я не имел ни средств, ни досуга вести хозяйство по правилам агрономии, отчего совершенно разорился. Неоправившемуся мне от сего разорения дождливое лето 1864 года еще добавило значительную беду, которая особенно чувствительна тому, кто из малоимеемого теряет еще значительную долю. Постоянные дожди означенного года произвели разлив рек, при которых находятся все фундушевые сенокосы вверенной мне церкви, и по сей причине я очень мало собрал сена, что заставило меня наравне с прочим и жителями сей местности выпродать скот за бесценок, остальной же от перегнившего корма начинает падать, что и на будущее время не дозволяет иметь хорошие надежды.*

*Все это осмеливает меня просить отеческого милосердия Вашего Высокопреосвященства в назначении мне пособия, на что и ожидаю милостивейшей резолюции Высокопреосвященнейшего Архипастыря и Отца!*

***1865 год января 18 дня***

***Место жительства моего***
***Борисовский уезд 3-го стана село***
***Ольберовичи. Приходский священник***
***Іулиан Еленский .***

***Из письма Еленского Докшицко-Борисовскому благочинному Лесневскому***
***от 28 декабря 1864 г .***

*... Но, как данный мне урок мятежником Дмаховским ни на миг не остановил дальнейших моих предприятий, которые увенчались счастливым поражением его шайки в 7 верстах от места моего жительства, где он и сам убит, то мятежники старались меня повесить с сотрудником моим, прихожанином вверенной мне церкви, крестьянином д. Угольцы Фомою Лав-*

*рентьевым Моисеенком, который с особенной ревностью и преданностью правительству исполнял все, что относилось К противодействию мятежникам. Но как по настоящее время не обращено на него, Фому Моисеенка, начальничьего внимания, потому что он, Мойсеенка, по данному ему мною совету действовал тайно, то священным долгом считаю по сему случаю донести, что Фома Моисеенка заслужил на внимание начальства, - не даром же хотели повесить его мятежники.*

*... Мятежник Дмаховский вступив в мой приход с шайкою в 280 человек и объявив крестьянам золотые свои грамоты, после ночлега двинулся на обед в мызу Поречье, куда прихожанин мой, крестьянин д. Отрубок Артемий Францевич Михаль так удачно привел роту солдат Низовского полка, которая, обойдя мятежницкий караул и, оставив его позади себя, в малое то время, как мятежники расположились к отвалу и приготовлению обеда нечаянно, как с неба сверкнуло на мятежников градом пуль, которые, убаюкав тут же на месте предводителя шайки Дмаховского на вечный сон, рассеяли его шайку, как рассевает сильный ветер горсть негодной пыли.*

*Так кончил мятежник Дмаховский виды свои на мой приход в походе своем в Ильские леса: но несчастье, причиненное мне, не кончилось по ныне. Потеряв через означенный выше пожар: строения, имущество, семена, провизию, хлеб, часть скота, хозяйственные снаряды, навоз, не имея никакой ни от кого помощи хотя бы в отпуске строевого леса для отстройки сгоревших строений, несмотря на то, что живу в казенном имении, притом же имея еще в виду виселицу, обещанную мне мятежниками, я не имел средств и досуга вести мое хозяйство в 1863-64 гг. так, как требовала агротехника и спекуляционные соображения хозяина, а потому, кроме означенного выше, я потерял еще 100 руб. серебром.*

*О чем и доношу Вашему Высокопреподобию.*

*Ольберовичской Крестовоздвиженской церкви приходский священник Иулиан Еленский.*

***Даведка.*** Святару Вольберавіцкай Крыжаўзвіжанскай царквы Юльяну Яленскаму была аказана дапамога па лініі благачыннага - 1800 рублёў, ад епархіяльнага начальства - 500 рублёў серабром.

У 1848 годзе ў Вольберавічах пачала дзейнічаць змешаная аднакласная царкоўнапрыходская школа. Яна размяшчалася ў наёмнай кватэры. У 1890-91 навучальным годзе навучаннем у школе займаўся заштатны псаломшчык Захарый Данілавіч Радзевіч, які скончыў курс Пінскага вучылішча. Узнагарода яго была 35 рублёў за зіму. А Закон Божы выкладаў мясцовы дзьякан А. Баркоўскі. У гэтым годзе вучылася 49 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак. У 1892 годзе быў пабудаваны новы драўляны будынак для школы. У 1897 годзе ў Вольберавічах налічвалася 74 двары і 420 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе царкоўнапрыходскай школы адкрыта савецкая пачатковая школа, у якой у 1924 годзе настаўніца Аўгіння Баркоўская вучыла 70 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1933 годзе ў вёсцы быў арганізаваны калгас імя

Будзеннага, пачала дзейнічаць кузня. Калі Заходняя Беларусь была пад Польшчай у Вольберавічах да 1939 года была камендатура. Быў устаноўлены жорсткі кантроль над памежнай зонай. Найбольш небяспечнай, а таму асобовай увагі, лічылася не 500-метровая паласа, а зона ў 7,5 кіламетраў. Каб трапіць у вёскі прыгранічнай паласы неабходна было загадзя прадставіць дакументы з мэтай наведвання ў пагранічную камендатуру. Наведванне было дазволена толькі ў дзённы час. Калі "госць" затрымліваўся ў паласе і прымаючы бок загадзя не праінфармаваў пагранічнікаў, то прадугледжвалася накладанне грашовага спагнання з прымаючага бока.

Забаранялася выходзіць з хаты ноччу. Кожны вечар пагранічнікі правяралі наяўнасць у хаце ўсіх, хто жыў у ёй. Таксама ў вёсках у непасрэднай блізкасці да мяжы рэкамендавалася не паліць лучынкі ў хатах, а калі была неабходнасць, то на вокны вешалі маскіровачныя сеткі.

Забаранялася блізка падыходзіць да памежнай паласы. Паводле інфарматароў, будучы дзяцьмі пад час збірання ягад у лесе, яны падлазілі пад сетку і падыходзілі ў шчыльную да кантрольнай паласы і глядзелі з цікавасцю на "палякаў". Кантрольная паласа была акуратна забаранавана.

У лютым 1943 года фашысты (Докшыцкая камуна сумесна з немцамі) зрабілі бандыцкі налёт на Вольберавічы, дзе спалілі 22 хаты з усім скарбам, забралі ўвесь скот і расстралялі двух дзяцей: 16-гадовага Барыса Крывічаніна і 10-гадовую Надзею Супранёнак, а таксама адну дзяўчынку паранілі і дзвюх дзяўчынак павезлі з сабой у Докшыцы. Астатняе насельніцтва змагло ўцячы з вёскі і выратавацца. Такія звесткі можна знайсці ў справаздачы Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б міжраённаму партыйнаму цэнтру Барысаўскай зоны.

Зусім па другому ўспамінае тую лютаўскую трагедыю камандзір партызанскай брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў у сваёй кнізе “Брыгада “Жалязняк”:

*«...Наступил февраль. Он принес новые осложнения для бригады «Железняк» на Докшицком направлении. Карательный отряд гитлеровцев в составе пятисот человек, на подводах, совершил налет на деревню Вольбаровичи, где находился лишь полевой караул из пяти бойцов от нашего l-го отряда. Партизаны приняли неравный бой с врагом и все погибли. Каратели тут же взялись за население. Они убили несколько десятков женщин, детей и стариков. Остальных жителей, босых, в одних рубашках, с детьми на руках, согнали в пустой скотный двор, обложили его соломой и подожгли. Узнав о злодеянии фашистов, мы бросили в деревню бойцов l-го и 3-го отрядов и взвод конников. На пути их встретились большие снежные заносы. Тогда партизаны оставили подводы, сняли верхнюю одежду и, утопая по пояс в сугробах, поспешили к деревне через лес. Мы были уже на высотах между деревнями Вольбаровичи и Комайск, когда фашисты во весь галоп гнали коней на Плитницу. Достать их ружейно-пулеметным огнем уже было нельзя, и партизаны кинулись спасать из огня жителей.*

*В деревне увидели страшную картину фашистских зверств. На снегу*

*лежали трупы женщин и детей с размозжёнными головами и вспоротыми животами. Убитые были и в домах. Всего погибло свыше семидесяти человек. Живые не плакали, не убивались в припадке истерики, а двигались как тени, с окаменелыми лицами. У них просто не было сил оплакивать погибших».*

Гераічную смерць прыняла ад фашысцкіх катаў разведчыца шостага атрада партызанскай брыгады "Жалязняк" Вера Сялюк, ураджэнка вёскі Вольберавічы. Вера часта выконвала розныя заданні камандавання ў Докшыцах і іншых населенных пунктах, у якіх стаялі варожыя гарнізоны. Летам 1943 года ў час выканання чарговага задання яна была апазнана здраднікам і выдадзена ворагу. Мужнай патрыётцы давялося перажыць жорсткія катаванні ў Глыбоцкай турме. Тут яна памерла, не выдаўшы фашыстам звесткі аб сваіх баявых таварышах. Яе імя можна знайсці на помніку, які быў устаноўлены ў Вольберавічах у 1969 годзе.



У кнізе "Памяць" таксама можна знайсці звесткі, што ў жніўні 1943 года нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску і загубілі 50 жыхароў (зараз у Вольберавічах пражывае каля 50 чалавек).

24 красавіка 1918 года ў Вольберавічах нарадзіўся Сялюк Мікалай Іосіфавіч. У 1938 годзе скончыў Горкаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум землеўпарадкавання. У Чырвонай Арміі з 1939 года. Са жніўня 1941 года на фронце ў складзе 266-й стралковай дывізіі (з сакавіка 1943 года – 95-я гвардзейская стралковая дывізія). Удзельнічаў у Сталінградскай і Курскай бітвах, Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Яска-Кішынёўскай аперацыях, баях ва ўсходняй Прусіі. У 1946-49 гадах служыў у Прыбалтыйскай ваеннай акрузе. У 1953 годзе скончыў ваенную акадэмію ў Маскве. У 1953 годзе працаваў у Цэнтральным фінансавым упраўленні Міністэрства Абароны СССР у Маскве. У 1969 годзе атрымаў званне палкоўнік. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

# Вуглы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Упершынё Вуглы ўпамінаюцца ў 1797 годзе як засценак Барысаўскага павета ў складзе маёнтка Вілейка, належаў Віленскамы жаночаму манастыру візітак. У пачатку XX стагоддзя налічвалася 111 жыхароў. Зараз у вёсцы пражывае каля 25 чалавек.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Вуглах у хаце Вольгі Зорыч і Ярашэвіча Андрэя знаходзіўся медсанбат. Санітарныя машыны падвозілі медыкаменты для партызан, а цяжкахворых адвозілі на Бягомльскі аэрадром, каб на самалётах вывозіць у Цэнтральны шпіталь.

# Вускрам’е

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1897 годзе ў вёсцы пражывала 182 жыхары, каля вёскі знаходзіўся засценак Вускрам’е – 16 жыхароў. У 1929 годзе тут арганізаваны калгас “Чырвонае Вускрам’е”, працавала кузня, вадзяны млын, які яшчэ ў 1887 годзе за месяц мог даць 2600 пудоў зерня. Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёсцы пражывала 282 чалавекі. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Вускрам’е і загубілі 18 жыхароў. У чэрвені 1944 года ў час правядзення карнай аперацыі “Кармаран” у наваколлі вёскі партызаны брыгады “Жалязняк” вялі цяжкія баі з фашысцкімі акупантамі. Зараз у вёсцы пражывае каля 40 чалавек.



**Крыж на паўночна-заходняй ускраіне Вускрам’я**

За чатыры кіламетры на поўнач ад вёскі, на левым беразе ракі Бярэзіна, ва ўрочышчы Перасоў знаходзіцца курганны могільнік з 16 насыпамі. Вышыня каля 1,2 метры і дыяметрам 10 метраў. На жаль раскопкі тут не праводзіліся.

Ля вёскі існуе “цудадзейны калодзеж”. Як сведчаць мясцовыя старажылы, гэтай пітной крыніцы ўжо больш за 130 гадоў і вада з яе валодае лекавымі ўласцівасцямі. З пакалення ў пакаленне людзі чэрпалі з яе гаючую сілу, кідалі ў ваду манеты. Зрэшты, калі капалі фундамент пры правядзенні аднаўленчых работ, то знаходзілі ў зямлі старадаўнія манеты. Па ваду, якая мае гаючую сілу, прыходзяць не толькі мясцовыя жыхары, сюды прыязджаюць і людзі з іншых мясцовасцей, нават з Мінска. Былі выпадкі, калі людзі вылечваліся ад немачы і хвароб, ужываючы ваду з цудадзейнага калодзежа.

У 2003 годзе настаяцелем бягомльскай царквы Валерыем і праваслаўнымі вернікамі да калодзежа зроблены першы крыжовы шлях.

Каля Вускрам’я працякае рака Мажанка, правы прыток Бярэзіны (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 11 кіламетраў.

У 1893 годзе ў Вускрам’і нарадзіўся Глазко Васіль Мікалаевіч. З 1914 года служыў у царскай арміі, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі – старшыня Бягомльскага валрэўкома. З 1918 года ў Чырвонай Арміі, ваяваў на Усходнім фронце. У далейшым працаваў на чыгунцы ў Сібіры. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём “За баявыя заслугі”, іншымі медалямі.

# Вялікае Поле

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Упершынё Вялікае Поле ўпамінаецца ў інвентары маёнтка Вілейка за 20 мая 1797 года, як засценак у яго складзе, які належыў Віленскаму манастыру візітак. Меў 3 дамы і 16 жыхароў. Зараз у вёсцы пражывае каля 10 чалавек.

Каля Вялікага Поля з невялікага балота бярэ пачатак рака Вілія. Агульная даўжыня ракі – 495 кіламетраў. У Беларусі – 264 кіламетры. У межах раёна каля 14 кіламетраў. Расказваюць, што раней рака Вілія выцякала з вялікай ямы, і вада была чыстая, а цяпер усё пазарастала, забалоцілася, а дзе-нідзе рака, магчыма, перагароджана бабровымі плацінамі (бабры тут водзяцца). Здаўна ў народзе прынята называць раку Вяллёй. І сапраўды, яшчэ ў беларуска-літоўскіх летапісах і іншых дакументахXIV – XVI стагоддзяў фігуруюць назвы Велья, Велія, Веля, Віля, Вільля (Вельля). Назва Велья па паходжанні славянскае і ўжывалася ў значэнні "вялікая". Але на тэрыторыі Літвы гэта рака мае назву Нярыс. Дарэчы, паводле аднаго падання, Вілія калісьці называлася святой Вялікай ракой і з назвы Вялікая паходзіць Вялля. Існуе яшчэ некалькі легенд. Адна з іх пра краўца Сцяпана і пра яго любаю Ульяну. Такім чынам, шэраг дадзеных сведчыць, што ў дахрысціянскія часы выток Віліі ўшаноўваўся, як і мясцовасць вакол  яго, і ў язычніцкіх павер'ях звязваўся з Вялесам і яго жаночай парай. Таксама ёсць падстава меркаваць, што Вілія ў цэлым была сакральнай ракой.

У 1905 годзе ў Вялікім Полі нарадзіўся Добыш Васіль Лукіч. У 1927-30 гадах і з 1932 года служыў у Чырвонай Арміі. У 1930-32 гадах працаваў на авіяцыйным заводзе ў Севастопалі (Украіна). З 1940 года начальнік кватэрна-эксплуатацыйнай часці Мінскага гарнізона. У 1941-46 гадах намеснік начальніка кавалерыйскага вучылішча. Пасля вайны намеснік начальніка тылу Паўднёва-Уральскай ваеннай акругі, а з 1958 года намеснік начальніка Ваеннай каманднай акадэміі супрацьпаветранай абароны імя Г.К. Жукава. З 1966 года ў адстаўцы, палкоўнік. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Жыў у горадзе Цвер, Расія.

# Гарадзёнка

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1897 годзе Гарадзёнка ўваходзіла ў склад Бягомльскай воласці Барысаўскага павета. Перад Вялікай Айчыннай вайной тут налічвалася 14 двароў і 57 жыхароў. У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 10 двароў. Зараз у вёсцы пражывае каля 10 чалавек.

У 1890 годзе ў Гарадзёнцы нарадзіўся Юхнавец Пётр Васільевіч. Ён удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1918 года ў Чырвонай Арміі, камандзір аддзялення разведчыкаў. Вызначыўся ў баях з бандай Лазнюка на Палессі ў 1919 годзе і з польскімі войскамі за мястэчка Камень Лепельскага павета ў верасні 1919 года. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. З 1930 года старшыня калгаса на радзіме. У Вялікую Айчынную вайну падпольшчык, з сакавіка 1943 года камандзір коннай групы партызанскай брыгады "Жалязняк" Мінскай вобласці. Пасля вайны працаваў старшынёй, потым брыгадзірам калгаса. Памёр 16 чэрвеня 1960 года.

# Гарадзішча

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Упершынё Гарадзішча ўпамінаецца ў інвентары маёнтка Вілейка ад 20 мая 1797 года як засценак ў складзе гэтага маёнтка, які з’яўляўся на той момант уласнасцю Вілейскага манастыра візітак. Налічвалася толькі тры дамы і 19 жыхароў. У 1909 годзе жыхароў было ўжо 84. зараз тут пражывае каля 5 чалавек.

За паўкіламетра на паўночны ўсход ад вёскі размешчана гарадзішча. Яно знаходзіцца на ўзвышшы, схілы якога невысокія (максімальная вышыня ад асновы 7,5 метра), але даволі стромкія, відаць, штучна зрэзаныя. Пляцоўка роўная, добра задзернаваная, у плане авальная (мае невялікі нахіл у паўночна-усходні бок), даўжыня (па лініі паўночны ўсход – паўднёвы захад) 60 метраў, шырыня 40 метраў. Валоў і равоў няма. З усходняга, паўднёвага і часткова паўднёва-усходняга бакоў да гарадзішча прымыкае нізкая, месцамі моцна забалочаная пойма ракі Вілія (яе выток знаходзіцца за 3-3,5 кіламетры на паўночны ўсход ад гарадзішча). Пры даследаванні знойдзены абломкі штрыхаваных пасудзін, кавалкі шлакаў, абпаленыя расколатыя камяні. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі, датуецца 3-2 стагоддзямі да нашай эры.



**Хата ў Гарадзішчы. 2009 год**

Ідучы з Вілейкі ў Гарадзішча, можна ўбачыць цудоўны помнік даўніны – курган. Курган вялікіх памераў, прыкладна метраў пяць у вышыню і ў радыўсе 15 метраў. Ён правільнай формы, мясцовыя жыхары называюць яго "Булкай", бо, сапраўды, ён падобны на булку. Колькі стагоддзяў гэтаму кургану, ніхто не ведае, і як ён узнік – таксама. Толькі легенды існуюць у народзе аб яго ўзнікненні і з'яўляюцца новыя.



Зямля на кургане не жоўты пясок, як гэта бывае звычайна, а чарназём. Але адзінай раслінай на ім з'яўляецца клён, які расце ў цэнтры кургана. Ніякіх іншых раслін на кургане ні на яго схілах няма, і гэта з'яўляецца своеасаблівай загадкай.

Гадоў 10-15 назад лясгас надумаў пасадзіць маладыя сасонкі на подступе да кургана, але ні адно дрэўца не прыжылося. Таму маладзейшае пакаленне гэтай мясцовасці склала такую вось легенду аб з'яўленні кургана.

Калі зямлян яшчэ і блізка не кранаў прагрэс, а адзіным самым хуткім відам транспарту быў конь, у сусвеце існавалі больш цывілізованыя істоты, якія пачалі наведваць Зямлю. Вось аднойчы іншапланецяне наведалі людзей. Іх касмічная "талерка" апусцілася якраз на месца, дзе цяпер курган. Калі яны сабраліся пакінуць Зямлю, то ўбачылі, што нейкі механізм карабля адказаў. Тады іншапланецяне звязаліся са сваімі сародзічамі. Прыляцела некалькі "талерак", на якіх і быў прывезены свой грунт, каб засыпаць няспраўны карабель. Было гэта, лічаць, ноччу, бо калі раніцай прачнуліся людзі, яны ўбачылі свежа насыпаны курган. Раскопваць яго ніхто не рашыўся. Грунт на кургане касмічны, таму на ім расце толькі маленькая травіца, і тая амаль сухая, а клён – гэта своеасаблівы перадатчык сігналаў у космас. А сам курган з'яўляецца плацдармам для пасадкі "талерак".

Па другой версіі – ў 1722 годзе была вайна са шведамі. У гэтай мясцовасці адбыўся вялізны бой. У ім загінула вельмі многа воінаў як шведскіх, так і рускіх. Усё поле бою было пакрыта забітымі людзьмі і коньмі. І тады мясцовыя жыхары вырашылі пахаваць мёртвых. Выкапаць для кожнага магілу было немагчыма, тады людзі надумалі зрабіць адзіную для ўсіх. Клалі забітага воіна, засыпалі яго зямлёй, потым каня, зброю. І так многа разоў. Утварыўся вялікі курган – своеасаблівы помнік загінуўшым шведскім і рускім воінам і напамінак чалавецтву аб непатрэбнасці войнаў.

Таксама лічыцца, што курган насыпаны ў 1812 годзе рускімі салдатамі ў гонар перамогі на Напалеонам. Прагнаўшы французаў, вярталіся салдаты дадому. Дарога была няблізкай. Многія салдаты страцілі на дарогах вайны сваіх сяброў. Нехта прапанаваў зрабіць помнік загінуўшым. Усе салдаты, якія праходзілі ў гэтай мясцовасці, набіралі ў шапку зямлі і сыпалі яе так, каб быў курган і каб быў ён прыгожы па форме і бачны здалёку. Калі кожны салдат, які ішоў на ўсход, зрабіў так, утварылася вялікая гара, якая нагадвала бохан хлеба (або булку), якія пяклі ў сялянскіх печах. Гэтым як бы сказана, што хлеб і вайна не сумяшчальны.

21 чэрвеня 2003 года ў Гарадзішчы адбылася адна цікавая прыродная з’ява. У гэты дзень жыхары пачулі дзіўны і ўсё нарастаючы гул, быццам ідзе калона танкаў. Такое параўнанне прыйшло ў галаву самай старэйшай жыхарцы вёскі, бабулі, якая яшчэ памятае вайну. Калі яна адчыніла дзверы хаты, то ўбачыла, як у паветры, круцячыся, лётаюць дрэвы, палкі, сукі... Адразу падумалася, што зараз падыме хату, але абышлося...

Колькі прайшло часу, не памятае ніхто з 5 жыхароў Гарадзішча. Калі гул сціх, яны выйшлі з хат і ўбачылі вырваныя з каранямі дубы, ліпы, поўнасцю выкарчаваныя сады, сарваныя дахі. Зразумелі, што прайшоў віхор. І што дзіўна, нарадзіўшыся ў балоце, ён па верхавінах дрэў, зламаўшы іх, накінуўся на вёску, але літасціва абышоў жылыя хаты, парушыў усё вакол іх. І зноў знік невядома куды. Ва ўсялякім разе ў лесе, што акружае вёсачку з усіх бакоў, дрэвы засталіся некранутыя.

# Гарадзішча

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце.*

У Гарадзішча ў госці прыязджайце,
Адпачніце ад сваіх турбот.
Ўсёй сям'ёй да нас вы завітайце,
Хлебам соллю стрэне вас народ.
Прыязджайце увесну. Паглядзіце,
Як квітнеюць майскія сады,
Толькі просьба – ціха, не шуміце,
Не спужайце птушак галасы.
Прыязджайце летам у суніцы,
Ахмялейце водарам лясоў,
Пахам хлеба, полымем зарніцы
І бязмежжам нашанскіх палёў.
Ўвосень прыязджайце на багаты,
Спелы, сакавіты ўраджай,
Калі хлеб ідзе на стол у хаты
І квітнее пладародны край.
Ўзімку прыязджайце. Запрашаем
З калядой прайсціся па дамах,
Так, як мы тут святы адзначаем,
Больш не знойдзеш ні ў якіх краях.
Запрашаем ў госці. Прыязджайце.

Гарадзішча вядома з XIX стагоддзя, калі яшчэ ўваходзіла ў Валкалацкую воласць Вілейскага павета. У 1905 годзе тут налічвалася 305 жыхароў. З 1921 года па 1939 год Гарадзішча ўваходзіла ў склад Польшчы. У 1970 годзе на тэрыторыі былой вёскі Яблонцы ўстаноўлены абеліск на ўшанаванне памяці 8 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1977 годзе Яблонцы зліліся з Гарадзішчам у адну вёску. Зараз у Гарадзішчы пражывае каля 280 чалавек.



У характары забудовы Гарадзішча пераважае вулічная планіроўка. Гэта звязана з тым, што звычайна надзелы наразаліся перпендыкулярна дарозе, што перасякала поле, і апошняя станавілася адначасова і вясковай вуліцай. Традыцыйнае жыллё складалася з трох памяшканняў: хаты, сенцаў і каморы (свірна ці варыўні). У хаце – печка з камінам, у якім меўся адвод да нішы збоку, камінка, на якім калісьці палілі лучыну ці рыхтавалі вячэру. Адвод каміна часта меў прыступкі, якія атрымоўваліся ў выніку кладкі цэглы. У XX стагоддзі ў прыпечак пачалі ўмуроўваць пліту.

Калісьці працейшы сялянскі двор цалкам змяшчаўся пад адной страхой. Як ён выглядаў, можна і зараз убачыць у Гарадзішчы. Тут, амаль у цэнтры вёскі, каля дарогі, стаіць пабудаваная недзе адразу пасля вайны хата, да глухой падоўжанай сцяны якой прыбудаваны хлеўчык. Ён знаходзіцца з хатай пад адной страхой.

Таямніцу пагоркаў, што надаюць непаўторную маляўнічасць гэтаму краю, яшчэ наканавана разгадаць вучоным-археолагам. Існуюць згадкі, што гэта рэшткі старажытнага ўмацаванага паселішча. Адсюль і назва вёскі – Гарадзішча. "Гарадзіць" – будаваць, умацоўваць. Час узнікнення бярэ карані ад першабытна-абшчыннага ладу пры пераходзе грамадства ад палявання,

рыбалоўства, збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі. На вяршынях узгоркаў захаваліся рэшткі фундаментаў пабудоў, культурны пласт чарназёму. Раней знаходзілі крыжыкі, а сярод мясцовых жыхароў ходзіць легенда аб праваліўшымся пад зямлю касцёле. Кажуць, калі прыкласці вуха да зямлі ў час імшы, то можна пачуць звон. А за гарой Брышча, у лагчыне, пад маладой рабінай знаходзіцца камень-следавік з адбіткам жаночай ступні і ямкай ад посаха.

У Гарадзішча у 1932 годзе нарадзіўся Пляшкун Франц Вікенцьевіч. Дзяцінства яго выпала на ваенныя гады. Бацька шыў маскіровачныя халаты для партызан. Тады Франц і сустрэўся з партызанам, які меў музычную адукацыю. Ён навучыў хлопца іграць на баяне, пазнаёміў з нотнай граматай. З таго часу Франц Вікенцьевіч не разлучаецца з баянам: іграў у ансамблі песні і танца Балтыйскага флоту, працаваў музычным кіраўнікам у дзіцячым доме, школе. З 1960 года быў дырэктарам Будслаўскага Дома культуры. Пры ягонепасрэдным удзеле створаны хор і ансамбль народных інструментаў, які стаў лаўрэатам Рэспубліканскага агляду-конкурсу сельскай мастацкай самадзейнасці ў 1980 годзе, выступаў перад дэлегатамі 29-га з’езда КПБ, прымаў актыўны ўдзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных 70-годдзю з дня нараджэння М. Танка. Ансамбль нязменна ўдзельнічае ва ўсіх раённых мерапрыемствах і святах, аглядах мастацкай самадзейнасці.



Даўным-даўно ў гэтай мясцовасці было вялікае возера. Вяртаўся аднойчы князь Стралевіч з паходу. Паход быў удалы: літоўцы пацярпелі паражэнне. Князевы воіны вельмі стаміліся і рушылі адпачыць на беразе возера. Яны напаілі коней, пусцілі іх пасвіцца, а самі прыляглі на мурожную траву адпачыць. Ад стомы зліваліся вочы, і хутка князева дружына задрамала.

А ворагі не хацелі мірыцца з паражэннем. Яны падышлі спадцішка і ўдарылі знянацку. Неўзабаве князь Стралевіч быў забіты. Князева дружына хутка расправілася з ворагамі, але князя Стралевіча прыйшлося пахаваць на беразе возера. І зараз возера гэта захавалася. Толькі цяпер яно не такое вялікае: дно памяльчэла, а берагі зараслі трыснягом. Толькі назва па-ранейшаму захоўвае памяць пра славутага князя Стралевіча.

# Гарэлае

*Вёска ў Бягомльскім Пасялковым Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Гарэлае ўваходзіла ў склад Асаўской воласці Барысаўскага павета. У 1917 годзе адчынена савецкая пачатковая школа, якая размясцілася ў наёмнай сялянскай хаце з саламяным дахам. У 1924 годзе настаўніца Любоў Макарэвіч вучыла 50 дзяцей. Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёсцы пражывала 284 чалавекі. У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёскі Гарэлае (усе 63 двары) і Клінніκі, расстралялі, а затым спалілі 200 мірных жыхароў. У 1964 годзе на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў вёсцы ўстаноўлена стэла. Ахвяры фашызму таксама ўвекавечаны ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”.



Можна сказаць, што назва вёскі поўнасцю адпавядае тым падзеям, якія тут адбыліся ў час вайны. Зараз у Гарэлым пражывае каля 30 чалавек.

# Глінnae

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Пра больш раннюю гісторыю вёскі практычна нічога невядома. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў Глінnae ўваходзіла ў склад Тумілавіцкай воласці. З 20 жніўня 1924 года па 20 мая 1960 года Глінnae было цэнтрам сельскага Савета. У гады калектывізацыі ў Глінскім сельскім Савеце з 190 гаспадарак было арыштавана 150. у 1933 годзе тут працавалі калгасы “Чырвоны Пуцілавец” і “Чырвоны пагранічнік”, дзейнічалі тры кузні. За час нямецка-фашысцкай акупацыі Глінnae было двойчы спалена.




У 1942-43 гадах у Глінным дзейнічала падпольная настаўніцкая камсамольская група, у склад якой уваходзілі Аляксандра Андрэеўна Ніканава (кіраўнік), М.А. Гаўрыловіч, М.В. Дземідовіч, Г.Л. Навіцкая. Патрыёты распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро сярод мясцовага насельніцтва, вялі прапаганду ў нямецка-фашысцкіх гарнізонах вёсак Глінnae, Пустаселле, Варлань. У выніку палітычнай работы падпольшчыкаў каля 20 нямецкіх салдат гэтых гарнізонаў перайшлі на бок партызан. Летам 1943 года падпольшчыкі былі схоплены і закатаваны карнікамі. У 1975 годзе на ўшанаванне іх памяці на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. А ў 1971 годзе ў Глінным пастаўлены абеліск на ўшанаванне памяці 52 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



У 1943 годзе ў Глінным размяшчаўся штаб 1-й Антыфашысцкай брыгады пад кіраўніцтвам Гіль-Радыёнава. Да гэтага часу брыгада ўжо поўнасцю перайшла на бок партызан. І менавіта ў Глінным быў распрацаваны план слаўнага пахода на Докшыцы і Крулеўшчыну. Вось як успамінае гэта камандзір брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў: *“...З Глінnага Гіль-Радыёнаў перадаў па рацыі на камандны пункт брыгады “Жалязняк”, каб мы прыехалі да яго для ўзгаднення далейшых нашых дзеянняў.*

*Прыязджаю ў Глінnae. У вёсцы шмат людзей і машын. Салдаты спалі дзе папала – у садах, у агародах, каля хат і ў кабінах аўтамашын. Па вуліцы хадзілі патрулі. Яны паказалі мне хату, дзе размяшчаўся штаб палка маёра Шэпелева.*

*З камандзірам палка і нашым афіцэрам сувязі Табачнікавым я сустрэўся на ганку штаба. Першае, што я ў іх спытаў: дзе Гіль-Радыёнаў?*

*- Уладзімір Уладзіміравіч вельмі стаміўся, - адказаў мне маёр Шэпелеў. – Ведаеце, каб зрабіць такі круты паварот (пераход на бок партызан), неабходна мець стальныя нервы. Зараз ён спіць у мяне за сталом.*

*Мне хацелася перагаварыць асабіста з Табачнікавым, і мы прайшліся з ім па вёсцы. Я спытаў яго аб настроі ў брыгадзе Гіль-Радыёнава, дзеяннях самаго камбрыга, яго памагатых.*

*Потым мы накіраваліся ў хату, дзе быў Гіль-Радыёнаў. Да гэтага часу ён ужо прачнуўся. За размовай ён расказаў нам, як прайшоў пераход яго частак на бок партызан. Праз некалькі гадзін Гіль-Радыёнаў плануе павесці брыгаду на Докшыцы, Крулеўшчыну і далей, як падскажа абстаноўка. Ён быў узрушаны, курыў адну цыгарэту за адной. Гіль-Радыёнаў разлажыў на стале карту і стаў тлумачыць ход мяркуемай аперацыі. Яна будавалася, у асноўным, на двух фактарах: нечаканае нападзенне на варожы гарнізон і на вялікім палітычным уздыме, які быў у салдат брыгады Гіль-Радыёнава ў сувязі з пераходам іх на бок партызан. Усе яны ірваліся ў бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А сам Гіль-Радыёнаў імкнуўся нанесці найбольшыя страты гітлераўцам".*



У 2007 годзе жыхарка вёскі Гліннае Святлана Ярмаковіч выйграла ў латарэю «СУПЕРЛАТО» аўтамабіль Mercedes-Benz B150!

# Гняздзілава

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Гняздзілава ўзнікла не пазней XIV стагоддзя на тэрыторыі ўладанняў Манівідаў у старажытнай Харэцкай воласці. Упершыню бортнікі “няздзілавічы” (“nezdylowycy”) упамінаюцца ў пацвярджальнай грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Вітаўта, выдадзенай 13 студзеня 1407 года віленскаму ваяводзе Войцеху Манівіду. З гэтага моманту сяляне, якіх падараваў Вітаўт, ператварыліся з дзяржаўных у прыватнаўласніцкіх: яны не залежалі ўжо ад воласці, а ўсе павіннасці давалі цівуну (ураднiку) новага пана. Ён жа атрымліваў права судзіць іх.

У 1520 годзе Гняздзілава, у выніку падзелу, адыйшло Юрыю, меншаму сыну Соф’і Манівідаўны і Мікалая Радзівіла. У 1567 годзе Гняздзілавічы згадваюцца сярод маёнткаў М.Ю. Радзівіла Рудога, які ў 1570 годзе здаваў іх у “заставу” (заклад) В. Тышкевічу. Радзівілаўская частка Гняздзілавіч была далучана да маёнтка Жупраны Ашмянскага павета. Мяркуецца, што ў той час Гняздзілавічы належалі двум уладальнікам. Так паступова сяло магло распасціся на два асобныя паселішчы – Паўночнае Гняздзілава і Паўднёвае Гняздзілава.

Маёнтак Гняздзілава пры падзеле спадчыны Крысціны Глябовічны-Камаеўскай трапіў да яе дачкі Альжбэты – жонкі Станіслава Нарушэвіча. Ён зрабіў “даважкай” да маёнтка Нарушэвічаў Відзы ў Браслаўскім павеце. У 1613 годзе сын Станіслава, Войцех Нарушэвіч, пазбавіўся гэтага “даважка”, прадаўшы маёнтак Я. Рудаміну-Дусяцкаму. Потым Рудаміны-Дусяцкія падаравалі Гняздзілава кляштару так званых “босых” кармелітаў у Глыбокім, заснаванаму ў 1640 годзе.

У 1793 годзе Гняздзілава адыйшло да Расійскай імперыі, а ў 1854 годзе тут адкрываецца школа, у якой займаліся дзеці дзяржаўных сялян. Настаўнікам быў святар Вікенцій Урбановіч. Школа была ў будынку былога бровара. 30 сакавіка 1875 года адчынена народнае вучылішча, якое ўтрымлівалася на сродкі валаснога праўлення і дзяржаўнага казначэйства. Яно знаходзілася ў грамадскім арандаваным будынку. У 1884 годзе адкрываецца змешаная школа граматы. Яна была размешчана ў непрыстасаваным для заняткаў царкоўным будынку. Выкладаннем у школе займаўся селянін М.Е. Парфяновіч, які скончыў курс народнага вучылішча і атрымліваў 15 рублёў за навучальны год. Вучняў у школе было 23 хлопчыкі і 1 дзяўчынка. У 1886-87 навучальным годзе на ўтрыманне школы было выдаткавана ад дзяржаўнага казначэйства 75 рублёў, а ад валаснога праўлення – 100 рублёў. Тут вучылася 66 дзяцей (у тым ліку 1 дзяўчынка). Настаўнікам працаваў выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Канстанцін Стубеда (жалаванне 175 рублёў, хлеба на 20 рублёў і кватэра), а выкладчыкам Закона Божага быў свяшчэннік праваслаўнага спавядання Адам

Вішнеўскі, які таксама скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (жалаванне не атрымліваў).

У пачатку XX стагоддзя налічвалася 77 вучняў (у тым ліку 3 дзяўчынкі). Іх вучыў настаўнік, выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Віктар Садоўскі, законанастаўнікам праваслаўнага спавядання быў свяшчэннік, выхаванец Віцебскай духоўнай семінарыі А. Антаневіч.

У канцы XIX стагоддзя Гняздзілава перайшло ва ўласнасць Козел-Паклёўскіх, потым – Слатвінскіх, сын якіх Міраслаў валодаў Гняздзілавам да 1939 года. Пра Слатвінскіх мы раскажам больш падрабязна крыху пазней.

А зараз пагаворым аб маёнтку.



На месцы старой барочнай сядзібы ў 1-й палове XIX стагоддзя фарміруецца вялікая прыгожая сядзіба ў стылі класіцызму. Стары сядзібны дом быў параўнальна невялікі, але прыгожы. Паркавы фасад будынка меў мураваную тэрасу, на якую выходзілі 3 портэфенетры. Мелася тэраса з балюстрадай на паркавым фасадзе. Пазней да яго прыбудоўваюцца бакавыя аб'ёмы з трохскатнымі дахамі, а да параднага фасада – плоскі аб'ём-тамбур, завершаны трохвугольным шчытом. Параўнальна вялікі палац, вядомы па фотаздымку 1894 года, заняў дамінуючае становішча ў сядзібе і быў апаясаны прыгожым вянком пасаджанага вечназялёнага самшыта. У палацы было некалькі рэпрэзентатыўных пакояў з прыгожым малюнкам паркету, белымі кафельнымі печамі, стыльнай мэбляй. Асабліва выдзяляліся галоўны хол, сталовая з дубовай абшыўкай сцен да вышыні 1,5 метра з





круглым вялізным сталом і крэсламі, абітымі скураю, партрэтная зала, у якой меўся збор фамільных партрэтаў, у асноўным копій партрэтаў роду апошніх уладальнікаў Слатвінскіх. З боку парку быў вялікі салон з камінам,



абстаўлены мэбляй у стылі Людовіка XV, абітай адамаскам. Да яго прылягаў меншы па памерах зялёны салон, абстаўлены мэбляй з магоніевага дрэва. Ён меў канапку незвычайнай формы (S-падобную) і фартэпіяна. Дом не захаваўся. На яго месцы зараз пабудаваны сушыльны ток.

У маёнтку была казарма, дзе жылі каля 20 салдат. Кіраваў атрадам капітан Сарока, а пазней – капітан Міхальскі. Званні былі такія: “плетуновы” (сяржант) – тры палоскі; капрал – дзве палоскі; “старше шерегавіц” – адна палоска. Ваенныя жылі ў канцы галоўнага будынка маёнтка, дзе размяшчалася канцэлярыя і пакой для капітана.



З левага боку ад палаца размешчана афіцына. Будынак (захаваўся) вышэйшы за палац, параўнальна вялікі (28 на 14 м), цагляны і атынкаваны. Дэкор складаюць руст, а ўверсе пояс з трыгліфамі і спараныя пілястры. Цэнтральная частка фасада вылучана неглыбокім рызалітам, які завяршаецца трохвугольным франтонам. Палац з афіцынай быў злучаны аранжарэяй.



Акрамя гэтага ў пана была лядоўня, сыраварня, кузня, вядзяны млын (у пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя ён ужо не працаваў), паравы млын, коні і асабісты аўтамабіль.

Паравы млын уяўляе сабой 2-х павярховы будынак. Тут рабілі муку і крупы. Пры млыне знаходзілася цыркулярка, на якой працаваў Мінадор. А сталярка размяшчалася недалёка ад дома Слатвінскіх. Гэта быў квадратны будынак, у якім працаваў Флер’ян Красоўскі. Сям’я ў яго складалася з 10 чалавек. Сын Юзік служыў у Польскай арміі. За ваенныя заслугі і доўгі срок службы яму далі надзел зямлі. Ён забраў усю сям’ю, уключаючы бацьку і маці, і пераехаў у Польшчу. Пасля будынак занялі ваенныя.

Каля млына была пабудавана электрастанцыя. Таксама на тэрыторыі сядзібы, каля вадаёма, размяшчаўся драўляны магазін памерам прыкладна 5 на 6 метраў. Што датычыцца параднага партэра сядзібы, то ён быў вялікі. Відаць, адпаведна пашырэнню памераў палаца змяняўся яго першапачатковы выгляд. У выніку ён мае цэнтральны традыцыйны круг, размешчаны на галоўнай восі (адпавядае пачатковаму сядзібнаму дому) і 2 бакавыя, сіметрычна размешчаныя адносна першага круга. На ім дажываюць 2 старыя ліпы са слядамі былой фармоўкі. Перад партэрам размешчаны вялікі вадаём, які візуальна пашырае паркавую прастору і з’яўляецца акцэнтам



**Маёнткавая сажалка афіцыйна называецца "Пруд №13"**

перспектывы. Ён узнік пры перапланіроўцы сядзібы на галоўнай барочнай восі. Апошні ўладальнік Міраслаў Слатвінскі планаваў пабудаваць праз вадаём мост.



За палацам на плошчы 3 га размяшчаўся парк, які захаваўся ў сваіх былых межах і спалучае рысы барочнай рэгулярнай і новай пейзажнай планіроўкі. У цэнтры яго – фрагменты чатырох ліпавых алей былых баскетаў. Адна з алей размешчана на галоўнай восі, яна нешырокая (6 м), дрэвы пасаджаны праз 2 метры. Вось замыкаецца відавым штучным узгоркам, які меў вінтавую сцяжынку, што вяла да драўлянага стала. Паўднёвы баскет мае выразныя рысы планіроўкі: адзінкавыя ліпы, быццам



калоны, стаяць сярод падросту з клёна, ліпы, ясеня. Ён служыў агародам, тут былі дом садоўніка з цэглы (захаваліся руіны), сховішча яблыкаў. З усходняга боку размяшчаўся сад (вырошчваліся раннія гатункі яблыкаў). Паркавы выгляд баскету надавала альтана з ліп да 10 метраў у дыяметры. Ліпы (захаваліся 17) нясуць сляды былой фармоўкі на вышыні 3 метраў. Дрэвы аднавілі кроны і ўтвараюць прыгожы шацёр. Супраць альтаны на ўскраіне былога баскета пад кронамі векавых ліп і клёнаў стаіць капліца Козел-Паклёўскіх, узведзеная ў неарэнесансных формах. У плане яна 8-гранная, складзена з бруса, мае гарызантальную абшыўку ўнутры і звонку. Завяршаецца прыгожым купалам з ліхтарыкам, які нагадвае ў мініяцюры купал касцёла ў Мядзелі. Крыпта капліцы складзена з валуноў і бута. Бутавая падпорная сценка складанай канфігурацыі (адпаведна граням капліцы) падкрэслівае невялічкі пагост. На ім былі пахаваны прадстаўнікі роду Шышкаў (захаваліся адзінкавыя надмагільныя пліты).

Да парку прымыкалі сады. Паўднёвы сад, які ахоплены радамі ліп, вымерз у суровую зіму 1939-40 гадоў. Другі сад плошчай 5 га, займаючы паўночна-заходнюю частку сядзібы, быў агароджаны і абсаджаны бярозамі (агароджа не захавалася).



У сядзібу вялі тры алеі. Заходняя ўязная алея была галоўнай. Уезд фіксаваўся брамай з невялічкай вартоўняй. Захаваліся два цагляныя атынкаваныя масіўныя пілоны з вузкімі гатычнай формы праёмамі для праходу і глыбокімі

паўцыркульнымі бакавымі нішамі. Пары сферычных ніш імітуюць байніцы, а завяршэнне пілонаў зубчатае на манер крапасных сцен. Ад брамы ішла бакавая дарога ў гаспадарчы двор. Тут меліся 2 кароўнікі на 120 галоў (разводзілі племянных чырванапольскіх кароў), цялятнік, канюшня, свіран. На кароўніку працавалі Міхаліна Кучко, Юзэфа Фадзевіч, Аляксандра Кішулька, Надзея Карніловіч і пісар Запольскі. А ўсёй гаспадаркай кіравалі адміністратар Канапацкі і ўпраўляючы Крукоўскі. Асабістым шафёрам ў пана Слатвінскага быў механік Кішулька Уладзімір Раманавіч.

Сядзіба мела гумнішча (характэрны элемент рэнесансных сядзіб), спланаванае ў выглядзе прамавугольніка, агароджанае ўязной брамай. Яе вялізныя пілоны былі вырваны ў 1966 годзе.

17 верасня 1939 года на гэтую тэрыторыю прыйшла Чырвоная армія. Напрыканцы 1939 года савецкія ўлады правялі апісанне ўсіх буйных маёнткаў на прадмет прыгоднасці для стварэння на іх базе саўгасаў. Вось якія звесткі пададзены аб Гняздзілаве ў дакуменце, датаваным 19 снежня 1939 года:

*“Маёнтак Гняздзілава памешчыка Слатвінскага ў Параф’янаўскай воласці Глыбоцкага павета, ад чыг. ст. Параф’янава 13 км. Ад г. Докшыцы 11 км, ад м. Параф’янава 12 км.*

*Усёй зямлі 1286 га, з іх ворнай 247 га, лугу 380 га, лесу 550 га, нязручнай 110 га, саду 5 га. Парк 3 га. Праходзіць рака. Маюцца млын, электрастанцыя, тартак, лазня, асноўны накірунак гаспадаркі жывёлагадоўчы – племяннога быдла. Засталося кароў 5, быкоў-вытворцаў , працоўных коней 18, жарабят 2, парсюк 1.*

*З пабудоў: кароўнікаў 2 на 120 галоў, цялятнік, канюшня, свіран, ток, навес, пуні. Астатнія пабудовы ёсць поўнасцю.*

*Жылымі пабудовамі маёнтак забяспечаны. Ёсць кузня і сталярная майстэрня.*

*Памешчыцкі дом даволі нядрэнны. Азімых пасеяна 50 га. Зямля, быдла і маёмасць у асноўным раздадзена былым парабкам і бедным сялянам.*

*Заключэнне: для арганізацыі савецкай гаспадаркі ўмовы недастатковыя. Азімыя пасеяны самім памешчыкам. Былыя парабкі, сяляне азімых не сеялі на памешчыцкіх землях”.*

Цяпер больш падрабязна пагаворым аб апошніх гаспадарах сядзібы ў Гняздзілаве – Слатвінскіх.

Да прыходу Савецкай улады ў Слатвінскіх было 12 маёнткаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы. Потым гэта колькасць рэзка скарацілася. Нам вядома, што ў Слатвінскага было два сыны – Мірaслаў і Людвіг. Мірaславу належалі землі, размешчаныя ў Гняздзілава і Параф’янава, а Людвігу – Дзедзіна і Замошша, што каля Крулеўшчыны. Аб лёсе бацькі панічоў амаль нічога невядома. Дакладна толькі тое, ўто ён загінуў у Мінску ад бомбы.

Маці звалі пані Марыя. Пасля гібелі мужа яна доўгі час адна выхоўвала сыноў. Але ў 50 год (прыкладна так сцвярджаюць відавочцы) яна выйшла замуж за пана Хмару, які быў намнога маладзей за яе (ён вучыўся разам з адным з сыноў). Жылі яны ў асноўным у Вільна.

Сядзіба Міраслава (старэйшага сына пана Слатвінскага) знаходзілася ў Гняздзілаве (зараз гэту мясцовасць называюць в. Двор). Міраслаў па характару быў вельмі добрым чалавекам. Ён быў сярэдняга росту, але важыў прыкладна 120 кілаграм. Нягледзячы на сваю паўнату, Міраслаў любіў зімой ездзіць на лыжах (хтосьці з парабкаў садзіўся на каня, а пан браў лейцы ў рукі і такім чынам ехаў ззаду за канём). Жонкі ў пана не было. У пана працавалі парабкі і наёмныя сяляне. Парабкі жылі неблага. Калі каму патрэбна была дапамога (адрамантаваць хату альбо прывесці ўрача) то Міраслаў, як правіла, выконваў гэтыя просьбы. Акрамя таго парабак атрымліваў 7 пудоў зерня, 120 пудоў бульбы, 12 пудоў асыпкі для кармлення жывёлы. Прывозіліся дровы. Карова парабка стаяла ў хлеве пана. Парабку патрэбна было накарміць і напаіць яе. Дзве каровы дазвалялася мець сталяру, кавалю, рымару (чалавек, які шыў збрую для коней), мельніку. Ад парабкаў патрабавалася дысцыпліна і акуратная работа. Калі парабак у чымсьці правініўся, то яму выдаваўся дакумент, па якому яго не ўсюды маглі ўзяць на працу. А так сям’я парабка заўсёды мела работу ў пана.

У пана Міраслава быў брат Людвіг, высокі з нармальным целаскладам, вясёлы і жыццярадасны чалавек. Пра яго жыццё вядома вельмі мала. Ён быў жанаты, але яго жонка загінула ў аўтакатастрофе на тэрыторыі Літвы, калі яны разам ехалі на ўласным аўтамабіле. Людвіг некаторы час жыў за мяжой. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна вяртаецца да Міраслава ў Гняздзілава. Аднак сядзібы брата ўжо не было. Восенню 1941 года партызаны (а хутчэй за ўсё людзі НКУС) баючыся, што немцы створаць тут гарнізон, спалілі сядзібу. Людвіг жыў у драўляным доме каля рэчкі побач з былўшай сядзібай. Але ў 1942 годзе партызаны забіваюць меншага пана, калі той ехаў праз Руляkоўскі лес у Докшыцы.

Аб Міраславе і яго браце Людвігу людзі адзываліся заўсёды добра. Гаварылі, што яны былі вельмі добразычлівыя і ўважлівыя да простых людзей. Пасля прыходу Савецкай улады Міраслава Слатвінскага арыштавалі на станцыі Параф’янава байцы Чырвонай Арміі і некуды звязлі. Пра далейшы лёс Міраслава і яго родных нам невядома.



15 апреля 2007 года, в воскресенье Божьего Милосердия, в католической часовне в усадьбе Гнездилово (Докшицкий район) впервые с 1939 года проводилась святая Месса, которую служил настоятель Докшицкого прихода отец Марек Пасют,



сослужили отец Андрей Жилевич и отец Андрей Букштан. В торжественной Мессе участвовали более ста жителей Гнездилова и Докшиц.

Часовня в Гнездиловской усадьбе была построена в середине 19 века как усыпальницу владельцев местного поместья Шишков и Козел-Паклевских. Как вспоминают старожилы, в войну часовню использовали в своих целях «партизаны», а в советское время местные школьники разграбили захоронения. Хулиганы вытаскивали гробы из могил на водоём и катались на них, как на лодках; приносили черепа в школу. В 2004 году пустую часовню подожгли, однако огонь своевременно успели потушить.

«Мы стоим перед святыней, в которой люди служили Богу, в которой до войны не раз проводились богослужения. Сегодня Мессу служат тут впервые за всё послевоенное время. Иисус хочет, чтобы святая Евхаристия возродила в нас веру в то, что Он - милосердный и что Он среди нас. Он хочет возродить не только материальный храм, эту часовню, но и храм духовный, которым являемся мы сами. Святую Мессу служим за всех жителей Гнездилова, за тех, которые жили до нас тут, добросовестно и тяжело работали, умерли со знаком веры, были похоронены тут и в других местах, на Гнездиловском кладбище; как за католиков, так и за православных. Также молимся за живых, которые живут здесь сегодня, также как за католиков, так и за православных; молимся за каждого жителя. Пусть Господь войдёт в наши дома, наши семьи, нашу жизнь», - сказал в начале Мессы отец Марек Пасют.



**Гняздзілаўская капліца. Верасень 2009 года.**

В ближайшее время планируется отремонтировать часовню и облагородить территорию около неё. Часовня вновь будет освящена в честь Божьего Милосердия.

У канцы 1942 года ў Гняздзілаве адбыўся адзін цікавы выпадак. Вось як успамінае пра гэта былы камандзі партызанскай брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў: *“…У заходніх раёнах Беларусі, па каторых рабіў рэйд наш 1-ы атрад, многія з фашысцкіх прыслужнікаў пры сустрэчы з намі траплялі ў прасак. Так было і ў Гняздзілаве. Мясцовы поп праваслаўнай царквы прыняў народных мсціўцаў за карнікаў. Ён нават запрасіў іх да сябе на вячэру. Потым дастаў аркуш паперы і пачаў пісаць людзей, якія супрацоўнічаюць з партызанамі і вядуць агітацыю супраць фашыстаў. У спіску была настаўніца, якая на вачах у дзяцей сарвала са сцяны партрэт Гітлера, ветэрынар, які падбухторваў маладых людзей змагацца супраць фашыстаў. Трапілі ў спісак і дзве жанчыны, якія на споведзі па сваёй слабасці сказалі штосьці пра партызан. Партызаны з “падзякай” прынялі ад свяшчэнніка гэты дакумент. Аднак у аднаго з байцоў выпадкова адхінуўся маскіровачны халат. Тут поп убачыў чырвоную зорку. Ад гэтага ён нават згубіў*

*прытомнасць. Народныя мсціўцы нават не адразу зразумелі, што здарылася. Жонка папа кінулася да свайго мужа і загаласіла на ўвесь голас. А служанка, напэўна, здагадаўшыся, хто перад ёй, плюнула яму ў твар і піхнула нагой. Потым яна сказала, што гэта быўшы кулак з Арлоўшчыны, які ўжо шмат савецкіх патрыётаў выдаў фашыстам. Ён і яе хацеў загнаць у лагер толькі за тое, што яна адмовілася стаць яго палюбоўніцай".*



Што здарылася потым з тым папом – невядома. Але здагадацца можна з вялікай верагоднасцю.

30 верасня 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску. У цэнтры Гняздзілава, насупраць клуба, на ўшанаванне памяці 61 земляка – воіна і партызана, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1970 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.



Да 1975 года ў Гняздзілаве існавала Юр'еўская царква – помнік драўлянага дойлідства. Храм меў крыжова-купальную кампазіцыю з планам у выглядзе раўнаканцовага "грэчаскага" крыжа. Зрубы роўнай вышыні былі пакрыты ўзаемнаперпендыкулярнымі двухсхільнымі дахамі з 8-гранным светлавым барабанам на сяродкрыжжы, завершаны пакатым шатром з галоўкай. Уваход быў аформлены ганкам. Архітэктоніка гэтага збудавання і яго дэкор былі традыцыйныя для народнага драўлянага дойлідства. Царква знішчана пажарам. Аднак у апошні час царкву адбудоўваюць. У верасні 2009 года яна мела такі выгляд.



Цікавая гісторыя звязана з аднаўленнем на грамадскіх пачатках праваслаўнай царквы ў Паўднёвым Гняздзілаве. Яго старэйшына Валянціна Бабро ўская распавяла наступнае. Некалі ў вёсцы Буй, якая адсюль непадалёк, маланкай забіла мужа і жонку па прозвішчу Чучман. Іх чацвярых дзяцей тады раскідалі па розных інтэрнатах. Дачка Рая з цягам часу выйшла замуж за будаўніка Анатоля Панцюхова. Зараз яны жывуць у Вільнюсе. Нярэдка наведваюць Беларусь (Анатоль з Гродзеншчыны), магілы бацькоў.

Аднавіць царкву ў Паўднёвым Гняздзілаве і прапанаваў гэты жыхар літоўскай сталіцы, дарэчы, уганараваны ў свой час званнем заслужанага будаўніка СССР. І не толькі прапанаваў, а на свае грошы набыў блокі для сцен, уласнаручна сцены гэтыя вывеў і кіруе будоўляй. Адкрыццё царквы

мяркуецца ў гонар святых Пятра і Паўла – на радасць мясцовым вернікам і ў памяць бацькоў Раісы Макараўны.

Актыўна ўдзельнічаюць у будоўлі вяскоўцы, іх дзеці і ўнукі, нават тыя, хто бывае ў Паўднёвым Гняздзілаве толькі ў водпуску, на канікулах ці па выхадных. Грошы ахвяруюць, каменне для мураванкі збіралі. Спрычынілася ізноў жа СПК «Гняздзілава»: найперш работнікамі, а яшчэ трактарам для падвозу камення, вады, цэментам, піламатэрыяламі. І школа дапамагала.

Царква аднаўляецца на падмурку сваёй драўлянай папярэдніцы. Валянціна Пятроўна памятае, як у 1960-я «пры партыі царкву не прызнавалі, іконы вывезлі. Тадышні калгасны старшыня хацеў распарадзіцца, каб яе знесці альбо пілараму там зрабіць. Ды яго маці сказала: сынок, не руш, я ахвяравала грошы для царквы. Тады завезлі сюды, як на склад, травяную муку. Ці то яна, вільготная, угрэлася ў папяровых мяшках ды ўспламянілася – гэтак бывае, ці то іскра з драбілкі трапіла, а можа дзеці, лазіўшы тут, чыркнулі запалкай – згарэла цэркаўка, як свечка». Старэйшына кажа, што вяскоўцы дужа ўдзячныя ўсім, хто адраджае яе.

У 1892 годзе ў Гняздзілаве нарадзіўся Конан Ніканор Мікалаевіч – удзельнік трох рэвалюцый, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Зімой 1905-06 гадоў разам з бацькам і іншымі сялянамі ўдзельнічаў у самавольнай вырубцы панскага лесу, правёў два тыдні пад арыштам за хворага бацьку. Восенню 1906 года паехаў у Пецярбург на заробкі, дзе з цягам часу прыняў удзел у рабочым руху. У 1913 годзе, ратуючыся ад арышту за ўдзел у маёўцы, вярнуўся ў родную вёску, адкуль восенню быў прызваны ў армію, але ў сакавіку 1914 года быў дэмабілізаваны з-за хваробы. Летам 1914 года зноў прыехаў у Пецярбург, працаваў на Пуцілаўскім заводзе качагарам. У снежні 1916 года, як адзін з завадатараў выступлення качагараў з патрабаваннем павячлічыць заробак, быў пазбаўлены броні, прызнаны годным да ваеннай службы і накіраваны ў 172-і пяхотны полк у Фінляндыю. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў абраны старшынёй ротнага камітэта, прымаў удзел у сустрэчы Леніна 3 красавіка 1917 года Фінляндскім вакзале ў Петраградзе, але неўзабаве за бальшавіцкую агітацыю адпраўлены на Заходні фронт, у Дзвінск. Пасля таго, як адведзеная з фронту ў Ржэў яго часць самаліквідавалася, вярнуўся ў Петраград, адкуль у сакавіку 1918 года быў накіраваны ў родную вёску для рэвалюцыйнай работы на акупіраванай немцамі тэрыторыі.

Пасля аднаўлення савецкай улады з’яўляўся старшынёй Параф’янаўскага валвыканкама, камісарам Вілейскага павятовага харчовага камітэта. Потым у Чырвонай Арміі і ў мірны час – на партыйнай і гаспадарчай рабоце, неаднаразова выбіраўся дэпутатам Саветаў розных узроўняў, працаваў старшынёй райвыканкама. Узнагароджаны трымя ордэнамі і шасцю медалямі. Персанальны пенсіянер Рэспубліканскага значэння. Апошнія гады жыцця правёў у Брэсце.

29 лістапада 1898 года ў Гняздзілаве нарадзіўся Ільініч Мацвей Ігнатавіч. З 1922 года на партыйнай, педагагічнай і савецкай рабоце ў Цюменскай і Чэлябінскай акругах. У 1928 годзе скончыў Свярдлоўскі Камуністычны ўніверсітэт. З 1942 года ў партызанах, кіраўнік дыверсійнай групы, у 1943-44 гадах камісар атрада, потым камісар Першамайскай брыгады Баранавіцкай вобласці. Адначасова ў ліпені-снежні 1943 года сакратар Гарадзішчанскага, а ў снежні 1943 года – ліпені 1944 года – Карэліцкага падпольных райкомаў КП(б)Б. пасля вайны да 1960 года на партыйнай і савецкай рабоце ў Баранавіцкай і Гарадзішчанскай абласцях. Узнагароджаны трымя ордэнамі, медалямі. Жыў у Маладзечна. Памёр 14 лістапада 1977 года.

За адзін кіламетр на паўночны захад ад Паўночнага Гняздзілава бярэ пачатак рака Морай, левы прыток Поні (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 7,1 кіламетра. На ўсім працягу каналізавана.

Каля Гняздзілава некалі былі манастырскія могілкі, але ў канцы XIX стагоддзя мясцовы памешчык Шышко адвёз надмагільныя камяні і выкарыстаў іх для будаўніцтва.

Каля Гняздзілава існуюць дзве групы курганных могільнікаў. Іх звязваюць са шведскімі войнамі. Быццам бы ў адных курганах пахаваны шведы, а ў другіх – коні.

# Горнава

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

У 1890-я гады адкрыта змешаная перасоўная школа граматы. Выкладаннем займаўся Рудакоўскі, які скончыў курс Пінскага вучылішча. За сваю працу ён браў па 1 рублю за кожнага вучня ў зіму. Пры гэтым яму бацькі вучняў накрывалі стол. Вучылася ў школе 7 хлопчыкаў.

У пачатку XX стагоддзя Горнава ўпамінаецца як хутар Тумілавіцкай воласці Барысаўскага павета.



У 1943-44 гадах у Горнаве ў хаце С.І. Сватка размяшчаўся штаб партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б. у 1967 годзе ў гонар партызанскай брыгады на доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Зараз ён не захаваўся. Навы памятны знак на месцы штаба ўстаноўлены ў 2005 годзе.

А за 1,6 кіламетра на поўнач ад вёскі, у лесе, размяшчалася база партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б. брыгада была створана ў сакавіку 1943 года з атрада імя А.Я. Пархоменкі брыгады "За Савецкую Беларусь". Камандзірамі ў розныя часы былі: А.Д. Мядзведзеў, М.Р. Пучкароў, М.І. Фёдараў. Імя ЦК КП(б)Б брыгадзе прысвоена ў лютым 1944 года.

Партызаны брыгады разам з іншымі партызанскімі брыгадамі Вілейскага партызанскага злучэння былі заходнім заслонам Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. У кастрычніку-снежні 1942 года разграмілі валасную ўправу і падарвалі маслазавод у вёсцы Язна. На чыгуначных і шашэйных дарогах спалілі і падарвалі 32 масты, знішчылі каля 7 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай лініі. У маі 1943 года разграмілі гарнізон у горадзе Докшыцы. Актыўна ўдзельнічалі ў "рэйкавай вайне". Толькі 3 жніўня 1943 года на чыгуначным участку Полацк – Маладзечна падарвалі больш за 250 рэек, спынілі рух на сем сутак. У ноч на 20 чэрвеня 1944 года на чыгуначным участку Вільнюс – Смаргонь падарвалі 300 рэек. З баямі вызвалілі чыгуначную станцыю Гудагай, вёскі Варняны, Міхалішкі, райцэнтр Астравец, аднавілі 18 мастоў на шашы. На час злучэння з Чырвонай Арміяй 6 ліпеня 1944 года брыгада налічвала 5 атрадаў агульнай колькасцю 338 партызан.





**Памятны камень на Юнацкай грэблі (Горнава-2)**

У 1969 годзе ў гонар брыгады пастаўлена стэла.

# Грабучае

*Вёска ў Парплішчанскім сельскім Савеце*

Сваю назву Грабучае атрымала ад слоў “грабеж”, “грабіцелі”. Справа ў тым, што раней вакол было балота, перабрацца праз якое можна было толькі па вузкай гаці. Вось на ёй ліхія людзі і грабілі падарожнікаў. Пачыналася Грабучае з сямі хат у густым лесе. Потым людзі адваёўвалі ў яго зямлю. Паселішча большала.

У 1894 годзе адчынена школа царкоўнай граматы. У 1905 годзе пад аднайменнай назвай сяло (сялянскае таварыства, 42 жыхары) і вёска (253 жыхары). З 1921 года па 1939 года Грабучае ўваходзіла ў склад Польшчы. У гэты перыяд тут пражывала 338 чалавек. З 12 кастрычніка 1940 года па 24 студзеня 1958 года вёска Грабучае было цэнтрам сельскага Савета. Была пошта, клуб, васьмігадовая школа. У 1949 годзе арганізаваны калгас імя Панамарэнкі. У 1973 годзе ў Грабучае перасяліліся жыхары з вёскі Уздзеўшчына. Зараз у Грабучым пражывае каля 95 чалавек.

У канцы XIX стагоддзя Ф.В. Пакроўскі ў “Археалагічнай карце Віленскай губерні” паведамляў, што паміж вёскамі Варганы і Грабучае размешчаны дзве групы курганоў. Усяго налічвалася 50 насыпаў. Могільнікі раздзелены лагчынай Чорная Лужа. Паводле падання, на гэтым месцы адбылася крывавая бітва.

Асонавічы знаходзіліся пры дарозе з Глыбокага на Парфенава паміж Грабучым і Вянюцінам. Гэта адно са шматлікіх у нашым краі паселішчаў, пра якія не напісана ў кнігах, не друкавалі артыкулы ў газетах, і якія зніклі з твару зямлі, з тапаграфічных мапаў і паступова знікаюць з людской памяці... І колькі яшчэ так бясслаўна знікнуць...

Звестак пра Асонавічы ў матэрыялах рэвізіі 1795 года, на падставе якіх Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі распрацаваў электронны гістарычны атлас “Менская губерня”, мне знайсці не ўдалося. Мясціны, у якіх знаходзяцца Асонавічы, паказаны на памежжы маёнткаў Чаркасы і Вешня Вілейскага павета і таму немагчыма сказаць, да якога з гэтых маёнткаў адносіліся гэтыя землі.

У 1905 годзе ў фальварку Асонавічы Багдановічаў – 360 дзесяцін зямлі, 45 чалавек. У 1921 годзе – 4 двары, 56 чалавек.

У 1930 годзе, па звестках “Skorowidza mejscowości pow. Dziśnenskiego”, у Асонавічах насельніцтва складала 65 чалавек, зямлі было 360 дзесяцін. У 1929 годзе, па звестках тагачаснага бізнес-даведніка, які мне ўдалося адшукаць у інтэрнэце, 132 дзесяціны зямлі ў Асонавічах належала Юзэфу Драздовічу, столькі ж – ягонаму брату Канстанціну. Каму належалі астатнія 96 дзесяцін, невядома. Пазней Асонавічы перайшлі Шуневічу. У 1940 годзе

Асонавічы сталі цэнтрам Грабуцкага сельсавета. Сельсавет размясціўся ў сядзібным доме.



У часе вайны непадалёку ад Асонавічаў бандыты, празваныя пазней савецкай уладай “героямі-партызанамі”, забілі святара. На месцы гэтага злачынства зараз установлены крыж.

У 1986 годзе Асонавічы перасталі існаваць. Яшчэ ў 1990 годзе стаяў адзін з будынкаў, які мясцовыя жыхары разбілі на цэглу. Цяпер тут толькі падмуркі былых пабудоў...

# Грабяні

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*



Рака Вілія каля вёскі Грабяні.

Звестак аб тым, калі з'явілася вёска – няма. Аднак вядома, што ў 1820 годзе ў Грабянях нарадзіўся Красоўскі Кліменцій Антонавіч – селянін памешчыка Гарноўскага. Красоўскі знаходзіўся ў радах паўстанцаў. Пасля арышту з 12 мая 1863 года ўтрымліваўся ў Барысаве. Паводле рашэння суда 11 сакавіка 1864 года накіраваны ў Маскву для далейшага размеркавання па вызначэнню Міністэрства ўнутранных спраў.



Партызаны брыгады "Жалязняк" вядуць бой каля вёскі Грабяні, 1943 год

Цікавы і яшчэ адзін эпізод з тых часоў. Жыхары вёскі Вілейка Хведар Дуброўскі і Антон Старычонак данеслі ўладам, што ўладальнік маёнтка Грабяні Франц Карчэўскі на дзве ночы выслаў з маёнтка ўсіх сваіх людзей, каб даць там прытулак паўстанцам, а таксама адправіў у лес дзве фурманкі з крупамі і мукой. Ф. Карчэўскага пасадзілі ў астрог. Ён быў выпушчаны з-пад арышту толькі тады, калі ў час допыту за яго заступіліся сяляне і вілейскі бацюшка Цяцерскі.

У 2-й палавіне XIX – пачатку XX стагоддзяў Грабяні ўваходзілі ў склад Вітуніцкай воласці і Вілейскага праваслаўнага прыхода Барысаўскага павета. У 1909 годзе ў Грабянях пражывала 270 чалавек. У чэрвені 1942 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 12 двароў.

Зараз у Грабянях пражывае каля 35 чалавек.

У "Апытальных лістах 1924 года па Мінскім і Барысаўскім паветах" узгадваецца гарадзішча каля хутара Грабяні.

# Дабрунь

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Па народных павер'ях здаўна ў гэтай вёсцы расла багатая, добрая рунь. Іншыя расказвалі, што жыў там пан Добруч. Ён быў вельмі добры, справядлівы, ніколі не караў, не разабраўшыся як след. І вось у знак удзячнасці назвалі вёску Дабрунь.

Першае магчымае ўпамінанне аб Дабруні адносіцца да 1696 года, калі яна ўваходзіла ў склад маёнтка Нябышына. У канцы XIX стагоддзя была адкрыта школа, дзе вучыліся дзеці сялян, што выйшлі з прыгону.

У верасні 1905 года ў Дабруні адбылася сутычка сялян з уладамі. А было гэта так:

***"З АБВІНАВАЎЧАГА АКТА ТАВАРЫША ПРАКУРОРА МІНСКАГА АКРУГОВАГА СУДА ПРА СУПРАЦІЎЛЕННЕ СЯЛЯН в. ДАБРУНЬ ВІТУНІЦКАЙ ВОЛАСЦІ БАРЫСАЎСКАГА ПАВЕТА МЯСЦОВЫМ УЛАДАМ У ЧАС ВОПІСУ МАЁМАСЦІ ЗА САМАВОЛЬНУЮ ПАСЬБУ СКАЦІНЫ ПА ЗЕМЛЯХ ПАМЕШЧЫЦЫ КАРНІЦКАЙ-РАТКЕВІЧ***

***3 верасня 1905 года***

*3 сентября 1905 года пристав 3-го стана Борисовского уезда Могильницкий прибыл в деревню Добрунь Витуничской волости Борисовского уезда для производства описи крестьянского имущества за неплатеж денег по исполнительным листам земского начальника 5-го участка Борисовского уезда за № 1384 и мирового судьи 4-го участка того же уезда № 2063 от 15 июня 1904 года и от 8 июля 1901 года в пользу помещицы Клавдии Карницкой-Роткевич за самовольную пастьбу скота, всего на сумму 46 руб. Описи должно было подлежать движимое имущество крестьян всей деревни Добрунь.*

*Еще предместник Могильницкого не взыскал ни по одному из исполнительных листов, да и сам пристав Могильницкий сначала воздерживался от взыскания, так как крестьяне, безусловно, бедные просили обождать до уборки хлеба, ссылаясь на невозможность уплатить деньги по бедности.*

*Однако же Карницкая-Роткевич обратилась с жалобой на медлительность полиции, результатом чего было предписание местного исправника произвести немедленно взыскание.*

*Прибыв в Добрунь, пристав предложил крестьянам произвести уплату добровольно, что они исполнить не согласились, причем приставом Могильницким было замечено среди крестьян сильное ожесточение против взыскателей помещиков-владельцев соседнего имения Безтроск господ Роткевичей.*

*Могильницкий должен был приступить к описи, причем приходилось описывать поросят, кадки и картофель. В шестнадцати домах была*

*произведена опись, остальные же крестьяне не допустили до ее производства, причем крестьяне Андрей Жданович, Антон и Фекла Божки первые затворили ворота своих дворов на внутренние задвижки и стали в воротах, не допуская войти в их усадьбы силою, толкая десятских, урядников, старшину, с угрозами «если кто посмеет войти во двор, то бейте по голове, чем попало».*

*При этом Фекла Божок толкнула пристава в грудь и как она, так другие вышеупомянутые лица толкали старшину, десятских и урядника. Затем крестьяне Степан Прокофьев Шульгат, Анна Черномордик, Емельян Стельмак, Елизавета Бурыбо и Иван Гаврилович, все совместно со своими женами и детьми, заперли свои ворота и, став против них, никого не допустили войти для производства описи, при этом бранили пристава, старшину и урядника и высказывали(сь) так, «и хорошо, чорт его бери, описал нескольких, пусть описывает, но если приедет производить продажу, мы ему покажем, как производить продажу нашего последнего имущества». Пристав приостановил опись и донес обо всем исправнику.*

*Вследствие донесения пристава, 10 сентября в Добрунь приехал исправник Чесноков. Вновь начали производить опись. К домам собирались крестьяне, ворота дворов оказались запертыми, приходилось отпирать самим и взламывать, открывать силою хранилища имущества. Самое сильное сопротивление было оказано, когда явились во двор Андрея Ждановича. Посыпались с улицы камни, исправник получил удар камнем в ногу, пристав - в грудь, при этом та же Фекла Божок бросила в голову урядника Гайдука камень и причинила ему легкую рану, причем многие другие крестьянки и парни набрасывались толпою на урядников и наносили им удары палками и камнями.*

*В толпе, находившейся во дворе Андрея Ждановича, под его предводительством были: Антон Божок, Иван Гаврилович, Степан Шульгат, Анна Черномордик, Емельян Стельмак и Елизавета Бурыбо и др., имена коих остались неизвестными. Все они бросали в чинов полиции камнями и палками, сопротивляясь производству описи, причем Антон Божок и Андрей Жданович несколько раз ударили палками урядника Кривицкого.*

*Товарищ прокурора (Подпись)»*

У пачатку XX стагоддзя ў Дабруні налічвалася 415 жыхароў. У 1910 годзе адчынена народнае вучылішча, для якога ў 1913 годзе пабудаваны драўляны будынак. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яно пераўтворана ў савецкую пачатковую школу. У 1924 годзе настаўнікі Ігнат Чачык і Кірыла Копцік вучылі 90 хлопчыкаў і дзяўчынак.

У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і знішчылі 8 жыхароў. Зараз у ёй пражывае каля 30 чалавек.

Недалёка ад Дабруні ў маёнтку Бястроск у 1794 годзе нарадзіўся беларускі архітэктар, выхадзец з патомных дваран Мінскай губерні Хршчановіч Казімір Вікенцій Мельхіёравіч. Пасля заканчэння ў 1819 годзе Віленскага ўніверсітэта атрымаў ступень кандыдата філасофіі. 16 сакавіка 1824 года прызначаны памочнікам універсітэцкага архітэктара. 7 мая 1825 года здаў дадатковыя экзамены і атрымаў званне архітэктар. 13 кастрычніка 1825 года К. Хршчановіч прызначаны губернскім архітэктарам (на гэтай пасадзе працаваў да 1863 года), з 1836 года тытулярны саветнік са старшынствам. Найбольш значныя работы Хршчановіча ў Мінску: адміністрацыйны будынак на рагу плошчы Свабоды і вуліцы Інтэрнацыянальнай, будынак вайсковага шпіталя, будынкі гарадской бальніцы (1840-я гады), будынак мужчынскай гімназіі, губернатарскі дом (канец 1830-х гадоў). Ён таксама аўтар праектаў: у Мінску – ратушы (1825), жылога дома Аксельрода (1844), адміністрацыйных устаноў (1847, 1852, 1853, 1857) і інш.; у Барысаве – адміністрацыйных устаноў (1843); у Пінску – жылога дома А. Ліпко (1847) і інш.

У коле мінскай інтэлегенцыі Хршчановіч лічыўся добрым знаўцам музыкі. Вядомыя музыканты, якія наведвалі Мінск, спыняліся ў яго доме і давалі невялікія канцэрты. “Минские губернские ведомости” у № 8 за 20 лютага 1859 года адзначалі: “Лучшими строениями, украшающими Минск, считаются губернский дом, громадное 3-этажное здание присутственных мест, военный госпиталь, городская больница и другие частные дома, делающие честь здешнему заслуженному губернскому архитектору статскому советнику Хршчановичу”.

У 1872 годзе ў Дабруні нарадзіўся Маскалейчык Пётр Андрэевіч. Ён быў удзельнікам руска-японскай вайны 1904-05 гадоў і 1-й сусветнай вайны 1914-18 гадоў. У 1917 годзе працаваў на металургічным заводзе ў горадзе Каменскае (з 1936 – Днерпрадзяржынск) Днепрапятроўскай вобласці. Там уступіў у атрад Чырвонай гвардыі, удзельнічаў ва ўстанаўленні Савецкай улады на Украіне, ваяваў супраць белаказакаў на Доне і Кубані. Пасля цяжкага ранення дэмабілізаваны, служыў у міліцыі. У 1928 годзе па стану здароўя выйшаў на пенсію і вярнуўся на радзіму. Памёр у сакавіку 1929 года.

# *Далёкае*

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Па народнаму павер'ю жылі некалі ў Прудніках мужык с жонкай. І быў у іх сын. Хлапчук быў ужо даволі вялікі, але такі гультаяваты, непаваротлівы. Здаецца, сядзеў бы цэлы дзень і нічога не рабіў. Аднойчы маці кажа: "Сынку, пойдзем на поплавах за Нябышынам сена грэбсці".

- Не хачы ісці, далёка!

- Пойдзем, малін потым пазбіраем.

А ён зноў за сваё:

- Далёка! Не пайду! Лепш ты мне прынясі.

І так ён упарціўся. На ўсе просьбы адказваў: "Далёка, не пайду! У далёкую дарогу не пайду!"

І так усе звыкліся з гэтым "далёка", што ўзялі і назвалі вёску, якая далей за іншыя знаходзілася ад панскага маёнтка – Далёкая вёска, а зараз проста – Далёкае.

У 1890 годзе ў Далёкім дзейнічала змешаная перасоўная школа граматы. Выкладаў у школе селянін Фама Каляга, які скончыў курс народнага вучылішча. Узнагарода для яго было 10 рублёў за зіму. Вучыліся ў школе 10 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка.

У 1908 годзе адчынена народнае вучылішча, для якога ў 1914 годзе пабудаваны драўляны будынак. У 1909 годзе ў Далёкім пражывала 159 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана савецкая пачатковая школа, у якой у 1924 годзе вучылася 65 дзяцей.

У кнізе "Памяць. Докшыцкі раён" згадваецца, што ў маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 10 жыхароў. Аднак у акце, складзеным партызанамі брыгады "Жалязняк" і мясцовымі жыхарамі аб злачыннай расправе гітлераўцаў з Докшыцкага гарнізона над жыхарамі вёскі Далёкае сказана, што трагедыя адбылася 10 красавіка 1943 года. А колькасць загінуўшых складае 13 чалавек. Вось як апісваюцца тыя падзеі ў гэтым акце: "10 апреля 1943 года немцы и полиция Докшицкого гарнизона учинили зверскую расправу над населением деревни Далекое. Комиссия в составе вышеупомянутых представителей и граждан деревни Далекое, спасшихся от смерти, установила следующее:

В то время, как окружалась деревня, большинство жителей деревни спаслось, из всего количества, т.е. 19 домов, сожжено 12, остались не сгоревшими или затушенными партизанами 7 домов. Причем, дома сгорели со всеми прилегающими постройками, продуктами питания, одеждой и различным хозяйственным инструментом и вещами. Все, что нравилось полиции и немцам из одежды и продуктов, взято полностью у населения, убито и сожжено живьем 13 человек, большинство из которых старики и

дети. Вот, как, например, погиб старик 76 лет – Карпей Игнатьевич Коляго со своей дочерью Лидией Карпеевной Коляго и внучкой 2 лет Ниной. Старик и внучка были дома, его дочь Лида, бывшая учительница, вышла в деревню, чтобы побеседовать со своими соседями и, как ей казалось, разогнать этим тоску, которая часто господствовала в деревне в связи с тяжелой войной. В это время по деревне уже визжали пули и рвались мины. Лидия удрала из деревни и залегла на луге, покрытом мелким кустарником, в 150-200 метрах от деревни. Не сиделось и старику, он вышел из избы со своей внучкой, чтобы попросить милости и воли «божеской». В это время Лидия услышала голос своей дочери, моментально подбежала к отцу, схватила дочь и, не добежав 100 метров до прежнего своего места, была убита вместе с дочерью вражеской пулей. Не умолил и старик «сынков», они тут же, возле дома, его расстреляли.

Невольно хочется плакать женщинам со слабыми сердцами, когда они рассказывают, как погибли 8-летняя Оля и 2-летний Коля, дети старосты деревни Далекое Петра Ивановича Парфеновича. Дело было так: староста ушел в ближайший партизанский отряд, чтобы получить инструкцию насчет организации в деревне весеннего сева, жена его Мария Антоновна ушла в деревню, чтобы размолоть зерно. Дома осталось трое детей: 8-летняя Оля, 6-летняя Лидия и 2-летний Коля. По деревне уже катился ружейно-пулеметный и минометный огонь. К детям матери бежать было невозможно, ибо мать уже находилась на краю гибели. Три малыша уже не раз слышали от папы и мамы, что полиция и немцы уничтожают людей, они себя тоже считали людьми и, когда узнали, в чем дело, приняли решение спасаться; и так, как все, бежали. 6-летняя Лидия бежала одна, но туда, куда и взрослые, отдавая всю свою силенку, так она и спаслась. 8-летней Оле было жалко бросить своего двухлетнего братишку Колю, и она решила бежать, неся его перед собой. Ясно, что Оле долго бежать было невозможно, в скором ее догнали какие-то черные люди и взяли в плен живьем. Оле думалось всяк и все потому, что хотелось жить, но среди этих черных людей не нашлось ни одного человека, который мог бы пожалеть детей, они заперли в один из домов детей и стариков и сожгли вместе с домом. Вместе со всеми взят в плен гражданин Иван Антонович Русакович 40 лет, совместно со своей женой Альжбетой 40 лет, дочерью Галей 6 лет, и сыном Колей 3 лет. Не помогли и объяснения Русаковича о том, что он остался, зная, что полиция и немцы - свои люди - и зря убивать не будут. Не удалось Русаковичу проверить совесть извергов, но зато все убедились, что это не люди, а человеческие отбросы. Доказательством этого может служить и тот факт, что они не пожалели лежащей в квартире 80-летней старухи Зоси Кондратьевны Парфенович. Правда, изверги сделали предсмертные услуги старухе. Старуха не могла идти из дома, чтобы не тревожить ее, они предпочли собрать всех задержанных в этот дом и сжечь не одну старуху, а всех вместе.

Не спаслась здесь гражданка деревни Веротейка Екатерина Стадольник 37 лет, со своей дочерью 13 лет, которые ненавидели немцев и решили

избавиться от них и переехали на жительство в деревню Далекое. Екатерина заболела и лежала в постели, 13-летняя дочь жалела бросить мать и так их обеих застало то, чего они боялись, их сожгли живыми.

Наглые бандиты зверски замучили 60-летнего старика Иосифа Дмитриевича Парфеновича, он не мог бежать и решил спрятаться под крыльцо своего дома, но звери обнаружили его. Перед смертью он говорил, что немецкие изверги кричали: «Вылезай, старый черт, а то тебя скоро подогреем!» и через несколько минут загорелся дом, сидеть живому дальше было невозможно, решил бежать - так и сделал. Правда, отбежал от своего дома метров 25 и его тяжело ранили, после этого прожил всего двое суток, после чего скончался.

Комиссия также установила, что все задержанные взрослые были избиты, проколоты штыками, а затем сожжены в доме Никифора Парфеновича, а дети сжигались живьем.

Акт составлен на небывалые еще в истории зверства и расправы над беззащитным населением деревни Далекое Витуницкого сельсовета Бегомльского района, в чем и подписываемся.

Подписи.

С оригиналом верно:

Зам. комиссара бригады «Железняк» Дернушков.

Зараз у вёсцы захавалася некалькі нежылых хат, размешчаных на левым беразе ракі Поня.

# Дамашкавічы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Упершынё Дамашкавічы згадваюцца як сяло ў прывелеі вялікага князя Вялікага княства Літоўскае Вітаўта, выдадзеным 13 студзеня 1407 года віленскаму старасце (пазней – ваяводзе) Войцеху Манівіду. З гэтага часу сяляне, якіх падараваў Вітаўт, ператварыліся з дзяржаўных у прыватнаўласніцкіх: яны не залежылі ўжо ад воласці, а ўсе павіннасці даравалі цівуну (ураднiку) новага пана. Ён жа атрымліваў права скдзіць іх.

У 1520 годзе пасля падзелу маёнткаў Дамашкавічы адышлі да старэйшага сына Соф'і Манівідаўны і Мікалая Радзівіла – Мікалаю. Аднак ён памёр у 1522 годзе. Троя яго сыноў і ўдава Альжбэта Саковіч здзейснілі новы падзел маёнткаў. Усе яны былі падзелены на чатыры часткі, але ў дакуменце не пазначана, каму дасталася кожная з іх. У адной з гэтых частак былі падданыя з Дамашкавічаў прыпісаны да галоўнага маёнтка Муснікі ў Літве, на паўночны захад ад Вільні. Потым Дамашкавічы належалі Кішкам, Зяновічам, Трызнам, Тышкевічам, Слізням. З 2-й палавіны XVII стагоддзя ў вёсцы існавала парафіяльная ўніяцкая царква. У 1795 годзе далучылася вёска да Расійскай імперыі. Паводле інвентару 1844 года да фальварка Дамашкавічы належалі тры вёскі – Шылы, Васількоўка, Дамашкавічы (35 мужчын і 37 жанчын, карчма з гадавым даходам 40 рублёў).

У дакументах за 1872-73 гады пра Дамашкавічы можна знайсці цікавыя звесткі: "…Местность в целой волости довольно холмистая, но ни один холм не имеет названия. При деревне Домашковичи находится озеро под названием Апличка в окружности до 3 вёрст и занимает собою, как говорят, 5 уволок земли. Замечательно, что в него не впадает и не вытекает никакого ручья, между тем вода стоит всегда на одном уровне. О происхождении этого озера существует предание, что будто бы на этом месте паслись однажды свиньи и одна из них открыла под камнем ключ, который и наполнил собою озеро.

Язык, употребляемый в разговоре местными жителями, белорусский.

Местностей, о которых бы существовали в народе предания, не имеется. Из замечательностей есть только небольшой каменный трёхэтажный дворец, построенный на берегу вышеупомянутого озера помещиком графом Слизнем в 1863 году, на высокой горе, в лесу, со множеством комнат внутри него, при полной меблировке".

На 1933 год у Дамашкавічах дзейнічаў калгас імя 16-га партз'езда і кузня. У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 6 жыхароў. Зараз у Дамашкавічах пражывае каля 310 чалавек.

Згодна "Апісанню цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі. Выпуск 2. Барысаўскі павет" (Мн.; 1879) згадваецца гарадзішча ў наваколлі вёскі

Дамашкавічы. Каля Дамашкавіч, у Васільчанскім бары, існуе сярэдневяковы могільнік з каменнымі крыжамі.

У другой палове XVIII стагоддзя ў Дамашкавічах дейнічала парафіяльная уніятская царква. Зараз у Дамашкавічах будуецца царква Георгія Перамоганосца.



Яе параўнальна невысокі будынак, пабудаваны з роўных, да бляска адшліфаваных бярвенняў чырвона-карычневага колеру, з блакітна-залацістым купалам пераважае над усёй акругай. Гэты цуд будуецца дзякуючы індывідуальнаму прадпрымальніку Мікалаю Курнышу. Па яго расказу, ему аднойчы з’явілася бачанне, што ў гэтым краі вельмі шмат цэркваў і свяшчэннікаў. Бачанне было доўгім і вельмі выяўным. Калі яно знікла, Курныш успомніў, што ў гэтай мясцовасці царква ёсць толькі ў гарадскім пасёлку Бягомль. “Значыць, трэба будаваць яшчэ” - падумаў Мікалай. А насупраць царквы, якая будуецца, знаходзіцца прыстасаваная хата, дзе айцец Валерый Цімкаў праводзіць багаслужэнне. Магчыма, ужо ў хуткім часе ён будзе праводзіць службу ў новым храме.

Што датычыцца возера, якое ўжо згадвалася раней, то зараз яно называецца Дамашкаўскае. Плошча возера 0,67 кіламетраў квадратных. Даўжыня 1,7 кіламетра, найбольшая шырыня 0,7 кіламетра. Даўжыня берагавой лініі 4,08 кіламетра а плошча вадазбору – 11,9 квадратных кіламетраў. Схілы катлавіны вышынёй 20-25 метраў (на паўночным захадзе 3-8 метраў), параслі лесам, лесам, на поўначы разараныя. Берагі зліваюцца са схілам.

На беразе Дамашкаўскага возера 3 ліпеня 1989 года адкрыты санаторый-прафілакторый “Лясное”. Санаторый мае 2 карпусы (154 месцы), якія арганічна ўпісваюцца ў мясцовы прыродны ландшафт. На тэрыторыі санаторыя функцыяніруе крыніца мінеральнай вады, якая па сваіх якасцях адпавядае Алма-Ацінскай (Казахстан) і Скуры (Грузія). З яе дапамогай лечаць хранічныя гастрыты з нармальнай, павышанай і паніжанай сакраторнай функцыяй страўніка, неўскладнённую язвенную хваробу страўніка і дванаццаціперснай кішкі, а таксама хранічныя каліты, хранічныя захворванні пячонкі і жоўцевыдзяляльных шляхоў, хранічны панкрэатыт, хваробы абмену рэчываў і г.д. У санаторыі ажыццяўляецца комплекснае лячэнне захворванняў цэнтральнай (перыферычнай) нервовай сістэмы, органаў дыхання і кровазвароту і іншых захворванняў. Адпачываючыя карыстаюцца спартыўным комплексам, бібліятэкай, кіназалам, цырульняй, танцпляцоўкай і інш., працуе магазін.

# Дармантова

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Доўгі  час у XVII стагоддзі вялікімі абшарамі правабярэжжа Поні, пачынаючы ад вёскі Крайск і канчаючы Запоннем, валодаў род Сівіцкіх. Іх родавым  гербам быў “Лебедзь”. Яны лічыліся ў Рэчы Паспалітай Земянямі, гэта значыць дробнай шляхтаю, якая ад польскіх каранёў атрымала зямлю за сваю добрасумленную ваенную  службу.

Баніфацый Дзермант Сівіцкі быў грэдскім ашмянскім суддзёй. Вось гэта другое імя”Дзермант” і дало назву вёсцы Дармантова.

У пачатку XX стагоддзя Дармантова было маёнткам у Вітуніцкай воласці. У 1909 годзе тут адчынена народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу, пераўтворана ў савецкую пачатковую школу, у якой у 1924 годзе вучыліся 94 хлопчыкі і дзяўчынкі з многіх навакольных населенных пунктаў.

У сакавіку 1927 года ў Дармантове працаваў лесапільны завод.

У цэнтры вёскі знаходзіцца помнік, які ўстаноўлены на ўшанаванне памяці землякоў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Зараз у вёсцы пражывае каля 14 жыхароў.

# в. Двор-Порплішча

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

Маёнтак Порплішча ўпершыню згадваецца ў XVI стагоддзі. У XVI стагоддзі маёнткі Порплішча і Замошша перайшлі ад Чартарыйскіх ва ўласнасць Зяновічаў. Верагодна, у XVI ці XVII стагоддзі, падчас пераходу да фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання, быў заснаваны фальварак Порплішча, што размяшчаўся за пяць кіламетраў на ўсход ад сяла.

Цэнтр яго знаходзіўся пры дарозе з Докшыц на Крулеўшчыну. У XVIII – пачатку XIX стагоддзяў належаў Радзівілам. Па звестках за 1795 год, маёнтак Порплішча быў ва ўласнасці Дамініка Радзівіла. Да яго ўладанняў у гэтым рэгіёне адносіліся 54 паселішчы: Альхоўка, Асінаўка, Астраўкі, Бацілоўшчына, Валасоўшчына, Васілеўшчына, Верацеі, Горкі (у дакуменце – “Холмы”), Гараватка, Грабянёўка, Драбінкі, Займішча, Зарэмбіна, Зуеўка, Казлы, Какосаўшчына, Крывошына, Крыўская, Крыўшчына, Кузынова, Лапліна, Літоўцы, Маркаўшчына, Міцкоўшчына, Навасёлкі, Нехвядоўка, Пабядзіншчына, Паграбішча, Паўлінова, Пачынка, Пералоі, Плескачова, Порплішча, фальварак Порплішча, Пузанова Ніва, Пузаны (“Пузаново”), Пузечына, Пятровічы, П’яніца, Рамжына, Раёўка, Росіна («Русиново»), Рэпішча, Сайкаўшчына, Сасноўка, Скудуці, Серадзены, Сябрынка, Харошая Ель, Шантары, Шарахоўка, Шэндзялішкі (Сабары), Цемішыны, Цецеравінцы, Чачукі, Ямаўшчына. У самім фальварку Порплішча было 3 двары, 14 чалавек.

У XIX стагоддзі, па некаторых звестках, пры маёнтку існаваў бровар. У першай палове 19 стагоддзя пасля шлюбу дачкі Дамініка Радзівіла з князем Вітгенштэйнам Порплішча стала належаць апошняму. У 1860-х гг маёнткі арандаваліся немцам Шмідтам, сям’я якога пахавана на могілках ў Дворы-Порплішча Некаторыя дакументальныя крыніцы 1861 года паведамляюць аб сялянскіх хваляваннях ў фальварку – сяляне пад уплывам чутак пра існаванне “сапраўднага” маніфеста аб адмене прыгоннага права адмаўляліся адбываць паншчыну звыш двух дзён на тыдзень.

На тэрыторыі маёнтка існавалі фальваркі Порплішча, Раёўка, Віцантова. У “Слоўніку геаграфічным” 1887 года пра фальварак Порплішча пазначаны наступныя звесткі: *“**Порплішча**. Фальварак прыватны над ракой Бярэзінай, у павеце Вілейскім, у 3-й аркузе паліцэйскай, за 84 вярсты ад Вілейкі, воласць Порплішча, мае 1 дом, 28 жыхароў (17 праваслаўных, 11 каталікоў). Знаходзіцца тут вятрак”.*

У 1893 годзе землі маёнтка канчаткова распрададзены.

У пачатку XX стагоддзя вёска вядома як ваколіца (сялянскае таварыства) Порплішчанскай воласці Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 год уваходзіць у склад Польшчы як фальварак Порплішчанскай гміны Дунілавіцкага павета. Зараз у вёсцы пражывае каля 25 чалавек.

Стадола ("Камяніца") у вёсцы Двор-Порплішча Пабудова ўражвае сваімі памерамі: у даўжыню камяніца каля пяцідзесяці метраў. Збудавана цалкам з каменю, накрыта зараз шыферным дахам, а раней – саламяным.



Звестак пра гэтую ўнікальную пабудову немагчыма знайсці ні ў адным выданні. Дзіўна, чаму на гэты старадаўні помнік прамысловай архітэктуры забыліся. Ніхто з мясцовых жыхароў не можа дакладна назваць час пабудовы камяніцы, аднак шмат хто кажа, што ўзводзілася яна яшчэ пры прыгонным праве, г.зн. да 1861 года. Старажылы сцвярджаюць, што ў камяніцы стаялі панскія авечкі. Самае ранняе ўпамінанне ў дакументах пра гэтую пабудову, якое ўдалося адшукаць, адносіцца да 1911 года. У тым жа дакуменце можна прачытаць пра два драўляныя свірны, што знаходзіліся побач з камяніцай.





**Стадола. Фрагмент муроўкі**

Зрэшты, у 1892 годзе землі маёнтка Порплішча, якія належалі князёўне Марыі Львоўне Гагенлоге-Шыленгерфгарсць, былі распрададзены сялянам. Камяніцу і зямлю каля яе набыў ураджэнец мястэчка Засвір Свянцянскага павета Тамаш Кісель. У часы прымусовай калектывізацыі камяніца адабрана ва ўласнасць калгаса, потым саўгаса.

На жаль, стадола не ўлічана ў зводзе помнікаў архітэктуры і культуры Беларусі, а таму не знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Пры цяперашніх адносінах беларускай улады да гісторыі і культуры, і недальнабачнасці мясцовага кіраўніцтва існуе верагоднасць страты гэтага ўнікальнага помніка архітэктуры 19 стагоддзя.

# Дзедзіна

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Гавораць, што ў даўнія часы жыў у гэтай мясцовасці пан па прозвішчу Дзядзінец. Яго маёнтак знаходзіўся ў канцы цяперашняй вёскі Дзедзіна. Парабкі, што на яго працавалі, размяшчаліся ў канюшні на дзядзінцы (задваровыя пабудовы). Іх так і назвалі – дзядзінцы, а пасля – дзедзінцы. Месца, дзе былі землі пана, і мястэчка назвалі Дзядзінец, а пасля – Дзедзіна.

У 1672 годзе на дзедзінскіх могілках збудаваны касцёл святога Міхала Арханёла, які быў знішчаны ў час Паўночнай вайны. Невядома, хто быў першым фундатарам святыні. Узведзены касцёл знаходзіўся побач са старажытнымі могілкамі, на якіх трапляюцца яшчэ і курганы. Храм адноўлены ў 1746 годзе ўладальнікам Дзедзіна, полацкім уніяцкім архіепіскапам Фларыянам Грабніцкім, які, дарэчы, адбудаваў з руінаў Сафійскі сабор у Полацку. Касцёл, круглы ў плане, меў тры алтары. У галоўным алтары знаходзіўся абраз Хрыста Укрыжаванага. У касцёле захоўвалася труна з мошчамі святой Юстыны Мучаніцы. У бочных алтарах меліся ўбраны ў срэбныя шаты абраз Найсвяцейшай Панны Марыі і абраз святога Мікалая біскупа.

Касцёл лічыўся філіяльным у складзе Докшыцкай парафіі, аднак тут служыў свой ксёндз. Напачатку XIX стагоддзя касцёлу належалі адзін морг ворнай зямлі пры пабудовах святара і чатыры маргі сенажаці ў іншым месцы. Уладальніца маёнтка Дзедзіна Грабніцкая фінансава забяспечвала касцёл. Пазней маёнтак Дзедзіна перайшоў да Слатвінскіх. Тым часам святыня паступова прыходзіла ў заняпад і ў другой палове XIX стагоддзя быў разабраны. У “Слоўніку геаграфічным Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх” (Варшава, 1881 год) ў артыкуле пра Дзедзіна аніякіх згадак пра касцёл няма. Па словах старажылаў, абразы з касцёла, калі яго разабралі, былі перанесены ў праваслаўную капліцу, што стаіць на вясковых могілках. Абразы тыя віселі ў капліцы, пакуль адзін з праваслаўных святароў, пробашч Тумілавіцкай парафіі не вывез іх кудысьці. Яшчэ ў 1930-х гадах на месцы касцёла на могілках стаяў каталіцкі крыж, аднак зараз нічога ўжо не нагадвае пра касцёл.



**Тут калісь стаяў касцёл.**

Вёска Дзедзіна згадваецца ў тарыфе маёнткаў Ашмянскага павета за 1690 год. У гэты час фальварак Дзедзіна належыў Яну Паўлу Юдыцкаму. У ім налічвалася 9 двароў (дымоў). Яму належала таксама частка Докшыц (33 дымы), 3 дымы ў Дзедзіне належалі Гераніму Раману Твардоўскаму і 2 дымы – удаве Станіслава Асінскага Марцыбеле з Беліковічаў. Напачатку XVII стагоддзя Дзедзіна стала ўласнасьцю Грабніцкіх. У 1795 годзе ўласнасць Дыянісія Грабніцкага,

да маёнтка належалі паселішчы Дзедзіна, Сценка, Рачныя, Данілаўка, Кіеўшчына.

Пры пераходзе ў склад Расійскай Імперыі ў канцы XVIII стагоддзя Дзедзіна было канфіскавана (да гэтага часу яно належала жамойцкаму біскупству). У 1812 годзе Дзедзіна, уладанне Глебніцкай, мела 29 сялянскіх дымоў і 1 шляхецкі, адзін дым належаў царкоўнай плябаніі.

У першай палове XIX стагоддзя Дзедзіна перайшло ва ўласнасць Слатвінскіх. У 1861 годзе згадваецца бровар Слатвінскіх, які мог вырабляць да 3000 вёдзер віна за год. Гэты будынак з каменю, на жаль, не захаваўся. У 1881 годзе ў маёнтку 2960 маргоў зямлі.

У 1863 годзе за сувязь з паўстанцамі Каліноўскага быў арыштаваны жыхар Дзедзіна А. Ермаловіч, аднак пазней ён быў вызвалены.

З 1921 года па 1939 год Дзедзіна ўваходзіла ў склад Польшчы. У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 37 жыхароў. Аб тым, якія жудасныя падзеі адбываліся ў Дзедзіна ў гады Вялікай Айчыннай вайны сведчыць акт, складзены камісарамі партызанскіх атрадаў брыгады Мядзведзева ад 29 лістапада 1943 года: *“...деревня Дедино сожжена полностью. В ней расстреляны: Галя Ковалевич – 17 лет, Елена Ковалевич – 9 лет, Иван Ковалевич – 30 лет, Василий Подберезский – 60 лет, Мария Подберезская – 57 лет, Иван Подберезский – 35 лет, Ольга Дайлидович – 45 лет, Софья Дайлидович – 22 года, Евгения Дайлидович – 24 года, Даниил Аникович – 40 лет. Из расстрелянных оказалось двое ребятишек. Население просило немцев не расстреливать малых ребят, но, несмотря на просьбы и слёзы населения, немцы зверски расстреляли двух ребят, трупы их бросили в огонь.*

*Кроме вышеизложенного, немецкие разбойники, поджигая Дедино, запирали в домах и поджигали стариков. Так были сожжены Татьяна Рудько – 80 лет и Мария Петрашкевич – 76 лет. Елену Синицу 18 лет увезли в Германию. Из деревни вывезено 12 лошадей, 55 коров, 35 голов мелкого рогатого скота, хлеб, оставшийся на поле, сожгли”.*

Восенню 1943 года асабліва жорсткія баі вяла брыгада імя ЦК КП(б)Б са спецыяльнымі нямецкімі карнымі атрадамі, якія знаходзіліся ў раёне. Асноўныя баявыя аперацыі разгортваліся ў раёне вёсак Сценка, Дзедзіна, Тумілавічы, Шалашы, Стараселле. Сустрэўшы рашучы адпор народных мсціўцаў, фашысты ўводзілі ў дзеянне танкі, авіяцыю і артылерыю.

9 верасня 1943 года вораг пад прыкрыццём ранішняга туману калонай да 200 чалавек падыйшоў да вышыні 200,6, якая знаходзілася за паўкіламетра ад вёскі Дзедзіна. Аднак тут яны былі сустрэты кулямётным агнём 1-га атрада. У ходзе бою праціўнік страціў 2 чалавек забітымі і адыйшоў у свае гарнізоны ў Таргуны і Камайск.

19 верасня 1943 года ў выніку сутычкі брыгаднай разведкі з нямецкай каля Дзедзіна забіты 3 гітлераўцы, партызаны страт не панеслі. Назаўтра група праціўніка ў складзе 40 чалавек зноў падышла да вышыні 200,6, збіла баявую ахову партызан і ўварвалася ў Дзедзіна. 1-му атраду быў дадзены

загад адбіць напад праціўніка. Заўважыўшы набліжэнне атрада, фашысты адступілі ў вёску Таргуны.

Актыўныя баявыя дзеянні працягваліся і ў кастрычніку 1943 года. Акупанты не пакідалі надзеі прабіцца ў партызанскую зону. 1 кастрычніка дзвюма калонамі яны зноў зрабілі спробу прарвацца да Дзедзіна і Несцераўшчыны, але былі адбіты сіламі 1-га і 2-га атрадаў. У гэтым баі немцы страцілі 8 чалавек забітымі і 11 параненымі. Былі паранены і 2 партызаны.

2 кастрычніка гітлераўцы колькасцю 300 чалавек акружылі Дзедзіна, сталі забіраць цывільнае насельніцтва і паліць вёску. 1-ы атрад пры падтрымцы 4-га на працягу 4 гадзін вёў бой з ворагам. Частку захопленага насельніцтва ўдалося адбіць, а частку карнікі павялі з сабой. Праціўнік у гэтым баі страціў 10 чалавек забітымі і параненымі. З партызан цяжка паранены адзін.

На вясковых могілках маецца пахаванне, дзе ляжаць пяць нямецкіх лётчыкаў. Таксама на гэтых могілках знаходзіцца драўляная капліца. Яна складаецца з асноўнага чацверыковага аб’ёму, накрытага чатырохсхільным



шатровым дахам з цыбулепадобнай галоўкай, і невялікага ўваходнага аб’ёму з двухсхільным дахам. Сцены ашаляваны дошкамі гарызантальна з вертыкальнай панеллю ўнізе і фрызам з зубчыкамі ўверсе. У некаторых крыніцах яна называецца Свята-Пакроўская царква, якая прыпісана да Свята-Пакроўскай царквы вёскі Тумілавічы.



**Крыж у капліцы**

Ксёндз Ідэльфонс Бобіч, тэолаг, святар, вядомы, як пісьменнік Пётра Просты, нарадзіўся ў небагатай сялянскай сям’і 22 студзеня 1890 года на Віцебшчыне ў вёсцы Дзедзіна, Дзісенскага ўезду, у гэтай вёсцы нарадзіўся яшчэ адзін беларускі сьвятар Чэслаў Сіповіч. У 1909 годзе скончыў Ковенскую гімназію. Ужо пад час вучобы ён удзельнічаў у нацыянальным руху і пачаў друкавацца. Літаратурны дэбют Пётры Простага адбыўся 25 студзеня 1907 года, у газэце "Наша ніва" быў надрукаваны расказ "Сьлёзы", у №5 1907 г.-"Воля", у №19 за 1909 г. былі надруканыя "Абразкі", прысьвечаныя Якубу Коласу. З упэўненасьцю Пётра Просты заяўляе:" Веру- ўстане сонцэ, пашле яно нам свой сьвет, разгоне туман, што спавіў цябе, Беларусь! Прыдуць для цябе лепшыя часы...Для сыноў тваіх зачнецца новае жыцьцё- вольнае, сьветлае!"(Просты, 1909:6).У 1909 годзе І.Бобіч паступіў у Віленскую духоўную сэмінарыю. дзе праявіў сябе здольным і мэтанакіраваным маладым чалавекам. Зьвярнуўшы ўвагу на таленавітага вучня кіраўніцтва накіравала яго на вучобу ў Рым. Пасьля заканчэньня навукі

доктара філязофіі благаславіў Папа Рымскі Пій X на выданьне беларускай каталіцкай газэты "Беларус", якая выходзіла ў Вільні з 1913 па 1915 год. Эпіграфам да ўсіх нумароў былі эвангельскія словы: "...шкада мне гэтага народу, бо не мае што есьці" У гэтай газэце дастаткова часта друкаваліся артыкулы І,Бобіча на рэлігійныя тэмы. У 1915 годзе ён быў пасьвечаны ў сан. Гэта быў час, калі беларуская мова крок за крокам займала сваё пачэснае месца ў каталіцкіх сьвятынях. Гэтаму садзейнічала і дзейнасьць ксяндза І.Бобіча. Будучы вікарыям Віленскага катэдральнага касьцёла, ён адначасова выкладае ў Віленскай беларускай гімназіі. Аб ім добра напісаў Мар,ян Пецюкевіч у кнізе "У пошуках зачараваных скарбаў".У 1923 годзе ксяндза-доктара назначылі ў Богам забытыя Германавічы на Шаркаўшчыне. Тут ён арганізаваў моладзь, гаворыць казаньні. На жаль да літаратурнай дзейнасьці ён больш не зьвяртаўся, зьнік з старонак беларускіх выданьняў цудоўны аўтар-Пётра Просты. У1930г. ксяндза І.Бобіча перавялі ў Іўе. Тут ён напісаў два тамы казаньняў "Родная мова Касьцёла" і "Навучайце ўсе народы". Шкада, што імя Пётры Простага амаль невядомае для сучасьнікаў, і наша задача - паспрыяць вяртаньню спадчыны Пётры Простага.

У Дзедзіна знаходзіцца курганны могільнік. Ён выяўлены краязнаўцам-аматарам Кастусём Шыталем ў канцы 2005 года. Ён знаходзіцца на тэрыторыі сучасных хрысціянскіх могілак у цэнтры вёскі. Не менш за 15 курганоў. Магчыма, частка курганоў была выкарыстана пазней для навядзення парадку на хрысціянскіх магілах. У афіцыйныя спісы археалагічных помнікаў не ўнесены.



**Вясковая вуліца. Забудова "ялінкай", калі дамы стаяць не перпындыкулярна да вуліцы, а пад вуглом**

# Дзядкі

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

Па народнаму павер’ю на гэтым месцы стаяла вялікае сяло. Людзі жылі не вельмі багата, але не тужылі. Але ўбілася ў сяло – хай яе на сухі лес нясе – халера. Пахварэлі ўсе людзі і пачалі паміраць, як мухі ўвосень. Засталіся ў вёсцы толькі некалькі дзядоў. Адсюль і назва – Дзядкі.

Што датычыцца сучаснай гісторыі паселішча, то з 1921 года па 1939 год яно ўваходзіла ў склад Польшчы. Тады тут налічвалася 385 жыхароў. У 1949 годзе арганізаваны першы калгас “Гігант”. Зараз у Дзядках пражывае каля 155 чалавек.

Каля вёскі бярэ пачатак і працякае ручай Сэрвач, левы прыток ракі Сэрвач (басейн ракі Вілія). Даўжыня ручая 12 кіламетраў.

# Дубавое

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Звесткі аб узнікненні вёскі звязаны з падзеямі вайны 1812 года. Згодна паданню французы спалілі паселішча Кожана, а жыхары перасяліліся, выбраўшы ўзгорак, акружаны дубамі. Так узнікла вёска Дубавое. Першымі жыхарамі вёскі былі сем'і Сценнікаў, Дарцоў, Ковеляў, Закрэўскіх, Пятровічаў, Калягаў. Першым гаспадаром Дубавога з'яўляўся пан Герамовіч.

З 1921 года па 1939 год Дубавое ўваходзіла ў склад Польшчы. На той час у вёсцы налічвалася 107 жыхароў.

У лютым 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 5 двароў. А праз год, 19 лютага 1944 года, 1-ы атрад партызанскай брыгады "Жалязняк" разграмілі варожы гарнізон у Дубавым. У выніку бою знішчаны штаб і тэхнічная кантора батальёна сапёрнага палка. Спалена 5 грузавых аўтамашын, 1 матацыкл. Усе памяшканні гарнізона выведзены са строю. Памяшканне штаба было спалена разам з групай нямецкіх афіцэраў, якія не пажадалі здацца. Партызаны ўзялі ў палон 26 салдат будаўнічай каманды (былыя ваеннапалонныя). Трафеі партызан склалі: 2 аўтаматы, 2 вінтоўкі, тэлефонны апарат, нівелір, 4 фотаапараты з тэхнічнымі негатывамі, дакументы тэхнічнай канторы нямецкага сапёрнага батальёна, 50 камплектаў абмундзіравання. Страты атрада: паранены камандзір атрада малодшы палітрук Барздыка Спірыдон Вікенцьевіч.

У 1950 годзе арганізаваны калгас імя Андрэева. Зараз у вёсцы пражывае каля 25 чалавек.

# Жамойск

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*



**Вуліца ў Жамойску. 2009 год.**

Упершыню Жамойск упамінаецца ў інвентары ад 20 мая 1797 года маёнтка Вілейка як засценак у яго складзе, які належаў Віленскаму манастыру візітак. На той час тут было 5 двароў і 29 жыхароў. Перад Вялікай Айчыннай вайной знаходзілася 62 двары, у якіх пражывала 227 жыхароў.



25 мая 1943 года падчас правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску разам з 27 жыхарамі. У 1967 годзе на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.

Недалёка ад Жамойска, каля лясной дарогі на вёску Баяры, ва ўрочышчы Пяці Капцы, знаходзіцца 5 насыпаў (“капцоў”).

# Заальхоўе

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*



У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Зараз тут пражывае каля 20 чалавек.

22 лістапада 1935 года ў вёсцы нарадзіўся Бабіч Віктар Канстанцінавіч. З 1962 года ён працаваў шафёрам, потым з 1965 года быў праходчыкам, машыністам самаходнага вагона, памочнікам машыніста камбайна, брыгадзірам камбайнавай брыгады, а з 1976 года электраслесар, потым дзяжурны па рамонце абсталявання камбіната "Беларуськалій" у Салігорску. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 годзе. Таксама ўзнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. З 1974 года па 1979 год з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

# Забар’е

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Упершыню Забар’е ўпамінаецца ў 1596 годзе як сяло ў складзе Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. У той час яно належала Марціну Юр’евічу Тышкевічу.

Менавіта ў гэтым годзе ў крыніцах згадваецца адзін цікавы выпадак, які адбыўся паміж жыхарамі Ваўчы і Забар’я. Ваўчане абвінавацілі забарцаў у тым, што тыя абрабавалі іх борці і каранніки (род вулляў), якія знаходзіліся ў Кастрыньскім лесе. Для вырашэння канфлікту была склікана капа – сходка прадстаўнікоў абедзвюх абшчын, якая збіралася на мяжы абшчынных тэрыторый і вырашала суд паводле старажытнага звычаёвага права. Традыцыя копнага суда ўзыходзіць, напэўна, да старажытнарускіх і больш позніх часоў. Гэта быў даволі эфектыўны інструмент вырашэння спраў, які быў афіцыйна прызнаны дзяржавай (артыкулы пра копны суд ёсць ва ўсіх трох Статутах ВКЛ). Аднак у гэтым выпадку аўтарытэт капы аказаўся недастатковым для вырашэння канфлікту. Калі жыхары Ваўчы на чале са старцам Няхедам Панцялеевічам прывялі доказы злачынства (за якое, між іншым, належала пакаранне смерцю), прыпёртыя жыхары Забар’я раптам выхапілі схаваныя загаддзя кіі, камяні і нават коп’і (ашчэпы), клікнулі стаіўшыхся непадалёку сяброў і пачалі жорстка збіваць ваўчан. Тыя вырваліся ледзь жывыя.

Ў канцы XVI стагоддзя Забар’е пазначана на карце Мінскага павета.

У 2-й палавіне XVII – XVIII стагоддзі Забар’е пераходзіць ва ўладанне Хмялеўскім. А з 1793 года Забар’е знаходзіцца ў складзе Расійскай Імперыі. Побач з вёскай размяшчаўся аднайменны маёнтак з адной гаспадаркай і 12 жыхарамі. Тут у валоданні памешчыка Русецкага быў вінакурны завод, які ў перыяд вінакурэння вырабляў 3000 вёдзер віна.

У 1897 годзе ў Забар’і пражываў 301 жыхар, меўся хлебазапасны магазін. У 1920 годзе адчынена пачатковая школа, дзе першым настаўнікам працаваў Клімент Дабрагост. У 1924 годзе ён вучыў 47 дзяцей.

У 1977 годзе да Забар’я далучылася сумежная вёска Туменцы. Зараз тут пражывае каля 30 чалавек.

# Заборцы

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя вёска Заборцы ў Параф’янаўскай воласці Вілейскага павета. На 1905 год у Заборцах пражывала 169 жыхароў. З 1921 года па 1939 год знаходзілася ў складзе Польшчы.

У 1928 годзе, калі мясцовыя ўлады ніяк не маглі знайсці грошы на ўзвядзенне Параф’янаўскай сямігадовай школы (на самай справе яна размяшчалася ў Заборцах на месцы сённяшняга школьнага стадыёна), Вацлаў Дамейка (уладальнік маёнтка ў Сітцах) дапамог з гэтай справай. Ён даў лесу на будоўлю і даў школе 12 гектараў зямлі. Вядома, што вялікі глінабітны будынак на скрыжаванні дарог у Заборцах, дзе ў 1930-я гады жылі настаўнікі, у 1921 годзе быў ва ўласнасці Дамейкаў. Аднак невядома, ці быў ён перададзены Дамейкам бясплатна, ці ўсё ж яго выкупілі тагачасныя мясцовыя ўлады. На жаль, гэты будынак, пад час прыезду ў Янукі прэм’ер-міністра Украіны Віктара Януковіча, быў знесены.

Цікава ўспамінае пра вызваленне Заборцаў ад панскай Польшчы жыхар вёскі Рапяхі А. Кур’яновіч: *“... верасень 1939 года выдаўся як ніколі сухім і нават спякотным. Ужо трэці тыдзень ішла вайна палякаў з немцамі. Тады яшчэ ніхто не ведаў і не падазраваў, што пачалася Сусветная вайна, якая забярэ дзесяткі мільёнаў жыццяў. Весткі з фронту даносіліся глуха. У вёсцы газеты і мірным часам былі рэдкасцю, а з пачаткам вайны сталі выходзіць нерэгулярна і да сялян амаль не траплялі. Адзінай крыніцай інфармацыі было радыё. Радыёпрыёмнік меўся ў настаўніка Заборцаўскай школы пана Малахоўскага. Вечарамі ён выстаўляў прыёмнік на падваконне (дом гэты ацалеў у вайну, і нават праз паўстагоддзя пасля ўз’яднання Беларусі ў ім жылі настаўнікі), і сюды збіраліся сяляне не толькі з Заборцаў, але і з іншых навакольных вёсак, каб паслухаць апошнія навіны.*

*Раніцай у нядзелю 17 верасня дзесьці ў 8 гадзін з боку Параф’янава данёсся нейкі гул, рокат. Што гэта – ніхто не ведаў, аднак было ясна, што гул ідзе не з неба, а з зямлі.*

*Наш вясковы солтыс Стась Маслоўскі, нічога не кажучы, сеў на ровар і паехаў у вёску Параф’янава, у якой знаходзілася гміна. А гул усё нарастаў. Было гэта каля 10 гадзін раніцы па мясцоваму часу (на дзве гадзіны раней цяперашняга). Нашы мужыкі сабраліся на выгане, тут жа круціліся і мы, хлапчукі. Раптам з лесу паказаўся солтыс і, крыкнуўшы на хаду “бальшавікі”, памчаўся што сіл да сваёй хаты. Тут ён сарваў шыльду з надпісам “Солтыс” і закінуў яе ў крапіву. І ў той жа час з лесу ў клубах пылу паказалася нейкая жалезная страшыдла, за ім другое, трэцяе. Не збаўляючы ходу, яны пранесліся міма аслупянелых мужыкоў. Гэта былі танкі. Да гэтага часу ніхто з вяскоўцаў іх у вочы не бачыў. Прайшло мінут дзесяць, і з лесу*

*паказаліся коннікі. Яны спыніліся і пачалі размаўляць з сялянамі. Галава аднаго конніка была забінтавана, у другога бінт быў накручаны на нагу каня. Потым толькі стала вядома, што ў Гнязділаве на польскай стражніцы адбылася сутычка. Нейкі польскі капрал залез з кулямётам у склеп і пачаў адбівацца. Магчыма, тыя хлопцы і пабывалі ў Гнязділаве.*

*А з лесу пачалі ісці танкі, бранявікі, аўтамабілі. Ішлі бясконцым патокам, так, што часам нельга было перайсці вуліцу. Людзі ўжо асмялелі. Пачалі выносіць кветкі, частавалі яблыкамі. І здзіўляла ўсіх, што байцы дарма нічога не бралі. За ўсё плацілі грошы. Так і я атрымаў 15 капеек за яблыкі, перададзеныя чырвонаармейцам.*

*Асобныя машыны збочвалі і спыняліся ў вёсцы. Завязвалася жывая гутарка. Сяляне дзякавалі за вызваленне, чуліся песні, многія з якіх, больш даўніх, ведалі і мы. А вечарам прыехаў нейкі камісар на легкавой машыне і загадаў склікаць сход. Цяпер ужо не памятаю, што гаварыў ён, аднак памятаю, што сяляне дружна апладзіравалі, крычалі "ура". Памятаю таксама, што на першым часе вырашылі пакінуць на чале вясковай улады ранейшага солтыса Маслоўскага. Чалавек ён быў памяркоўны, людзям асабістай крыўды не чыніў. Забягаючы наперад, скажу, што Маслоўскі перажыў рэпрэсіі 1940 года, якія яго чамусьці не кранулі, і дажыў спакойна свой век у Грынеўшчыне, працуючы лесніком.*

*Вечарам у суседнім маёнтку Сітцы паказвалі кіно. Белую прасціну расцягнулі паміж дрэвамі. Народу сабралася вельмі многа, прыйшлі і прыехалі на падводах з розных вёсак. А па дарозе працягвалі рухацца войскі: ішлі машыны, конніца, крочылі пехацінцы. І так не спынялася ўсю ноч.*

*Так закончыўся першы дзень вызвалення".*

У 1949 годзе ў Заборцах арганізавалі калгас імя Ф. Энгельса. Зараз у вёсцы пражывае каля 175 чалавек.

# Загалаўе

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў Загалаўе ўваходзіла ў Бярэзінскую воласць Барысаўскага павета. У 1909 годзе ў ёй пражывала 342 чалавекі (зараз каля 50).



У 1930 годзе ў Загалаўі нарадзіўся Лапчык Кузьма Іванавіч. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў скончыў школу, курсы трактарыстаў, працаваў у калгасе. З 1950 года трактарыст Бярэзінскай МТС. Адным з першых у раёне ў сакавіку 1954 года па камсамольскай пуцёўцы выехаў на асваенне цалінных і абложных зямель у Кустанайскую вобласць (Казахстан), дзе да 1960 года працаваў у саўгасе імя Джамбула. Пасля вяртання на радзіму трактарыст будаўніча-мантажнага ўпраўлення, камбайнер саўгаса "Камунар". За працу на цаліне ўзнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", медалём "За асваенне цалінных зямель", знакам ЦК ВЛКСМ "За асваенне новых зямель".

У гады Вялікай Айчыннай вайны Загалаўе было спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. А ў жніўні 1943 года партызаны брыгады "Жалязняк" разграмілі ў Загалаўі невялікі гарнізон 1-й рускай нацыянальнай брыгады пад кіраўніцтвам У.У. Гіль-Радыёнава.

У 1971 годзе ў Загалаўе перасяліліся жыхары з вёскі Цагельня.

# Загацце

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Загацце ўваходзіла ў Валкалацкую воласць Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 год знаходзілася ў складзе Польшчы. У 1969 годзе каля будынка былога саўгаса "XIX-ы партз'езд" пастаўлены абеліск на ўшанаванне памяці 45 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Зараз у вёсцы пражывае каля 40 чалавек.

30 мая 1936 года ў Загацці нарадзіўся Януковіч Генрых Іосіфавіч – беларускі вучоны ў галіне электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У 1966 годзе скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельсгай гаспадаркі і адразу стаў працаваць у Беларускім аграрным тэхнічным універсітэце. З 1981 года па 1998 год з'яўлялуся тут дэканам факультэта. У 1976 годзе атрымаў званне кандыдат тэхнічных навук, а з 1994 года стаў прафесарам.. у гэтым жа годзе стаў Выдатнікам адукацыі.

Яго навуковыя працы датычацца эксплуатацыі і рамонта сельскагаспадарчага абсталявання, пытанняў паляпшэння якасці напружання ў сельскіх электрычных сетках. Распрацаваў новы від трансфарматара з сіметрычнай формай крывой напружання.

За тры кіламетры на захад ад Загацця знаходзіцца курганны могільнік, які змяшчае тры насыпы дыяметрам 3-5 метраў і вышынёй 0,5-0,7 метра. Могільнік выявіў яшчэ ў канцы XIX стагоддзя Ф.В. Пакроўскі, а ў 1938-39 гадах абследаваў А.Р. Мітрафанаў. На жаль, раскопак тут не праводзілася.

# Заляддзе

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Перад Вялікай Айчыннай вайной ў Заляддзі пражывала каля 132 чалавек. У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 23 двары і загубілі 8 жыхароў. Зараз у вёсцы пражывае каля 30 чалавек.

Каля будынка былой школы знаходзіцца бюст Героя Савецкага Саюза Перхаровіча Франца Іосіфавіча. Ён нарадзіўся 28 мая 1894 года ў Заляддзі ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1926 года. Вучыўся ў Ваеннай акадэміі імя М.В. Фрунзе, закончыў курсы "Выстрал" у 1941 годзе. У арміі з 1915 года, у Чырвонай Арміі з 1918 года. Удзельнік грамадзянскай вайны – палкавы ад'ютант, памочнік начальніка штаба брыгады. Пасля вайны камандзір асобнай роты, начальнік штаба стралковага палка, памочнік начальніка аддзела штаба і начальнік аддзялення ў штабе Маскоўскай ваеннай акругі. У 1939-41 гадах на выкладчыцкай рабоце ў Маскве. У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1-м і 3-м Беларускіх франтах: камандзір стралковых палка, дывізіі, корпуса, камандуючы арміяй, удзельнік абароны Масквы, вызвалення Украіны, Польшчы, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацый. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 6 красавіка 1945 года за ажыццяўленне аперацыі па прарыву доўгатэрміновай абароны праціўніка і фарсіраванні Віслы. Пасля вайны на камандных пасадах, да 1951 года начальнік упраўлення ўсеагульнага ваеннага навучання Галоўнага штаба Сухапутных войск. Памёр 11 кастрычніка 1961 года.



У ваколіцах Заляддзя, ва ўрочышчы Дзедаў Шмат, пры лясной дарозе, стаяць тры каменныя крыжы – два побач, а трэці на адлегласці ад іх. У сяродкрыжжы аднаго з іх высечаны маленькі крыжык. Людзі, праходзячы каля гэтага месца, пакідаюць тут кветкі, ягады, грыбы.

# Замасточча

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Замасточча ўваходзіла ў Асаўскую воласць Барысаўскага павета і налічвала 172 жыхары (зараз у вёсцы пражывае каля 315 чалавек). Вёска знаходзілася за мостам, гэтым і тлумачыцца назва – Замасточча. У 1927 годзе заснавана ў вёсцы школа. У 1930 годзе арганізаваны калгас "Звязда", які потым у 1950 годзе аб'яднаўся яшчэ з трыма калгасамі і стаў называцца "Ленінскі шлях".

Цікавы выпадак тут, у Замасточчы, адбыўся са Сцяпанам Сцяпанавічам Манковічам і Іванам Піліпавічам Цітковым у пачатку чэрвеня 1944 года. Вось як аб гэтым успамінае камандзір партызанскай брыгады "Жалязняк" Іван Піліпавіч Ціткоў: *"...На невялікай палянцы мы з Манковічам сабралі камандны і палітычны склад. Аляксей Склярэнка паведаміў, што ў ваколіцах Замасточча хаваецца штаб 6-й фашысцкай авіяпалявой дывізіі. Партызаны ўжо нямала вылавілі салдат і афіцэраў гэтай дывізіі. А вось сам камандзір генерал Рудольф Пешель усё ніяк не пападаўся на іх шляху.*

*Партызаны ачапілі лес на дарогах, як гэта рабілі самі гітлераўцы, калі яны ўчынялі блакаду партызан. Потым паступова сталі зжымаць кальцо акружэння.*

*Мы з Манковічам адкрыта стаялі на дарозе Бягомль – Плешчаніцы, за вёскай Замасточча. Чаго нам было сцерагчыся: цяпер прыйшла пара фашыстам бегаць ад нас. Раптам у лесе застракаталі кулямёты, пачуліся вінтовачныя стрэлы. Мы выхапілі пісталеты і схаваліся за сосны. Перастрэлка то нарастала, то заціхала. Рассыпалі па лесе сваіх сувязных і пайшлі на стрэлы. З кустоў выскачыў фашыст у касцы і, выставіўшы наперад вінтоўку са штыком, кінуўся ў наш бок. Але хтосьці з партызан выстраліў па ім з аўтамата.*

*У гэтым баі партызаны ўзялі ў палон тры дзесяткі варожых салдат і афіцэраў, многіх знішчылі. Але прасочванне працягвалася. За час вылоўлівання акружаных фашыстаў, застаўшыхся ў тылу наступаючых войск 3-га Беларускага фронта, брыгада "Жалязняк" знайшла і ліквідавала 63 групы гітлераўцаў. Яна знішчыла 477 варожых салдат і афіцэраў, 1334 узяла ў палон, у тым ліку ўвесь штаб авіяпалявой дывізіі. У гэтым баі быў забіты і камандзір дывізіі – генерал Рудольф Пешель".*



У 1954 годзе ў Замасточчы адкрыта бібліятэка, а ў 1962 годзе быў пабудаваны сучасны будынак Замастоцкай сярэдняй школы.

У цэнтры вёскі ў 1967 годзе на ўшанаванне памяці 78 жыхароў вёсак Замасточча, Вуглы, Краснікі,

якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пастаўлена стэла.



У лесе, каля балота, ва ўрочышчы Горад або Гарадок, на ўзгорку вышынёй каля 15 метраў знаходзіцца гарадзішча. Яно мае два валы і два равы.



Гарадзішча вядома яшчэ з 1924 года, але абследаванне было праведзена Э.М. Зайкоўскім толькі ў 1997 годзе. Гарадзішча адносіцца да жалезнага веку.

Адразу за Замасточчам, с правага боку ад дарогі на вёску Асавы, знаходзіцца скопішча валуноў. Як яны тут аказаліся невядома.

# Замошша

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя маёнтак Замошша ўваходзіў у Докшыцкую воласць Барысаўскага павета, меўся 1 двор і 50 жыхароў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена фашыстамі. Зараз у ёй пражывае каля 15 чалавек.

З сажалкі за 100 метраў на поўдзень ад Замошша пачынаецца рака Гулянка, якая з'яўляецца правым прытокам ракі Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі каля дзесяці кіламетраў. Працякае па заходняй ускраіне Бярэзінскага біясфернага запаведніка, пераважна праз лес.

# Замошша

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

Першае ўпамінанне пра маёнтак Замошша адносяцца да 1690 года, калі ён быў ва ўласнасці Зяновічаў. Янушу Зяновічу належаў таксама і суседні маёнтак Порплішча. Па звестках гэтага дакумента, да маёнтка адносіліся 45 дымоў. Аднак, мабыць, тут кожны такі дым складаўся не з аднаго, а з некалькіх двароў, бо ў дакуменце сустракаюцца такія лічбы як 1/4, 1/6 дыма. У той час, хутчэй за ўсё, ужо існавала капліца, бо ў 1756-58 гг. збудавана новая капліца на месцы старой. У 1795 годзе да маёнтка адносіліся 19 населеных пунктаў. У 1834 годзе ў Замошшы Зяновічу належалі 110 душ. Пазней Замошша перайшло да Багдановічаў. У 1869 годзе памёр уладальнік маёнтка Тадэвуш Багдановіч і, хутчэй за ўсё, менавіта тады маёнтак перайшоў ва ўласнасць Слатвінскіх. Апошнім уладальнікам быў Людвік Слатвінскі. Калі ў 1939 годзе прыйшлі савецкія войскі, ён быў схоплены бальшавікамі і невядома дзе знік. У Замошшы размясцілася вайсковая часць, на тэрыторыі маёнтка збудаваны склад боепрыпасаў № 275, які ў 3 ліпеня 1941 года пры адступленні савецкіх войскаў быў узарваны. Пры гэтым згарэў палац. Да 1970-гадоў стаялі слупы ад ўязных варотаў і адна з пабудоў. Але і яны былі знішчаны. Потым здаралася некалькі выпадкаў, калі на неразарваных снарадах у Замошшы ўзрываліся людзі. Дзесьці ў 1939–41 гадах была знішчана капліца. Пасля вайны на месцы маёнтка збудавана ферма, якая знесена ў 2003 годзе. Зараз ад маёнтка засталіся толькі ўязная ліпавая алея ды адзін шэраг дрэў, якія паўколам акружаюць месца былой сядзібы.



Рэшткі разбуранай уязной брамы



Разрабаваны склеп-пахавальня Тадэвуша Багдановіча



Надмагільны помнік уладальніку маёнтка Тадэвушу Багдановічу, памерламу ў 1869 годзе

У 1905 годзе Замошша ўваходзіла ў склад Валкалацкай воласці Вілейскага павета. На той час тут налічвалася 85 жыхароў, 135 дзесяцін зямлі. З 1921 года па 1939 год Замошша ўваходзіла ў склад Польшчы. Зараз у вёсцы пражывае каля 10 чалавек.

У 1943 годзе ў Замошшы налічвалася 22 хаты і амаль 70 жыхароў. Многія мужчыны ў гэты час былі ў партызанах. Немцы патрабавалі выдачы партызан і іх сем’яў. Здраднікаў сярод вяскоўцаў не знайшлося і тады фашысты спалілі Замошша. Уцалеў толькі адзін зруб і невялікі свіран.

У 1951 годзе Замошша ўвайшло ў склад калгаса імя К. Варашылава.

***Елена Крупская***
*Памяти мальчишек,*
*Погибших в Замошье.*

## *ПОСЛЕДНИЙ ПУТЬ*

Какое ужасное горе,
Когда сына хоронит мать.
Ему бы учиться в школе,
А не в земле лежать.
Ему бы с девчонкой красивой
На танцы ходить и в кино,
Ему б целоваться под ивой -
Да видно судьбой не дано.
На материнские плечи
Тяжелая ноша легла.
Догорали прощальные свечи ...
Мать от гроба уйти не могла.
Ведь сынок уходил навеки,
Уходил он в последний путь,
Слёзы лились из глаз, как реки,
Что ей к жизни его не вернуть –
Такое ж настигло горе
Ещё одну мать в этот день,
Утопая в слезах, как в море,
Шла за гробом сыночка как тень.
Рыдала тогда вся округа,
Беда эта всех потрясла,
Что в землю легли два друга,
Две жизни смерть унесла.
От войны снаряды остались
И в Замошье раздался взрыв,
Все с посёлка туда сбежались,
О делах своих позабыв.
Но парнишек спасти не успели.
Разорвало двоих в один миг,
В те минуты и птицы не пели.
Матерей только слышался крик.
Не ходите в Замошье, мальчишки,
Не рискуйте вы жизнью своей,
Вы ведь тоже чьи-то сынишки.
Пожалейте своих матерей!

За адзін кіламетр на поўдзень ад вёскі ў басейне ракі Патачанка знаходзіцца Чорнае возера. Плошча яго 0,28 квадратных кіламетраў. Найбольшае глыбіня 2,4 метра. Даўжыня 660 метраў, а найбольшая шырыня 640 метраў. Даўжыня берагавой лініі каля двух кіламетраў. Аб’ём вады ў возеры складае 0,38 мільёнаў метраў кубічных. Схілы катлавіны возера невыразныя. Дно сапрапелістае, паступова зарастае. Меліярацыйнай канавай злучана з возерам Станіслаўскае. Пра Чорнае возера існуе легенда.

Даўным-даўно вада ў Чорным возеры была чыстая, празрыстая, берагі яго былі з жоўтага пясочку. Да возера вяло шмат сцяжынак. Прыходзілі звяры на вадапой, прыходзілі рыбакі, забягалі дзяўчаты і хлопцы, вадзілі карагоды. Дзяўчаты часта глядзеліся ў возера, нібы ў люстэрка. І была сярод іх адна вельмі прыгожая, але злая і ганарлівая дзяўчына. Яна заўсёды насміхалася з сяброваk, кпіла з хлопцаў.

“Я выйду замуж толькі за прыгожага, разумнага і багатага хлопца. А тут такіх няма” – гаварыла яна.

Здарылася так, што ўсе яе сяброўкі павыходзілі замуж. Можа, не за самых прыгожых і багатых, але за добрых і разумных хлопцаў. А ганарлівіца ўсё хадзіла да возера з нашмат маладзейшымі за яе дзяўчатамі. Аднойчы, угледзеўшыся ў воднае люстэрка, яна заўважыла, што пачынае губляць сваю былую красу. Кінулася са слязамі да сваёй маці – чараўніцы:

- Не змагу я вярнуць тваю красу, дачушка, - сказала маці. – А вось зрабіць так, каб іншыя дзяўчаты не любаваліся сваёй красой – у маіх сілах.

Пайшла чараўніца да возера, доўга нешта гаварыла на пяску. І вельмі хутка балота стала падступаць да возера, пясчаныя берагі ператварыліся ў тарфяныя, дно таксама стала чорным, вада – непразрыстай. І сталі людзі з той пары называць возера – Чорным.

# Запалле

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У XIX стагоддзі Запалле ўласнасць Кодзяў. Кодзь Бернард Саламонавіч (Самойлавіч) за ўдзел у “мецяжы” 1863-64 гадоў пазбаўлены дваранскіх правоў і сасланы ў Сібір. Такую ж долю меў і Кодзь Валерый Саламонавіч. А Кодзь Леанард Сігізмундавіч 1844 года нараджэння ўзяты ў палон 16 мая 1863 года каля вёскі Уладыкіна Вілейскага павета. Па канфірмацыі ад 28 жніўня 1863 года вынесена рашэнне аб пазбаўленні дваранскага звання і ссылцы на ваенную службу радавым у батальёны Амурскай вобласці. 6 верасня 1863 года адпраўлены ў Іркуцк.

Сам маёнтак Запалле рашэннем Мінскай палаты ўгалоўнага і грамадзянскага суда 24 жніўня 1871 года быў перададзены ў казну за палітычныя злачынствы Кодзяў (Леанарда).

Вось як выглядаў маёнтак Запалле ў той час: *“Из фольварка Заполье оброчных статей не имеется. Земля расположена в 3-х сменах. Одна лежит в расстоянии от фольварка в 3-х верстах около деревни Слободы. Другая около деревни Репище – расстоянием до 2-х вёрст, а третья около деревни Запонье черезполосно с крестьянами и помещиком Деревоедом. Качество земли – песчаная и подзолистая, сколько же таковой находится, присяжные понятые определить не смогли.*

*Лесные дачи. 1-я под названием Гвалтовщина граничит с помещиком Ильёй Деревоедом черезполосно, дворянином Войничем и с двух сторон Емилею Кодевою. Качество леса в ней: еловый, берёзовый, осиновый. Первый может быть употреблён только в постройках. 2-я – урочише Стан. Граничит с лесами помещика Деревинского. 3-я – Деревщизна: с помещицею Фрейтовою. 4-я – Залежи: с помещиком Железовским и Запонье – Стабровским. К этой же даче приграничивается лесная дача Котовки помещика Фрейта. Порода леса лиственная, годный только на дрова. Сенокос, принадлежащий к фольварку и усадьбам, болотный, расположен около реки Поня, тоже черезполосный с помещиком Деревоедом. Качество его неизвестно.*

*К имению Заполье крестьян-собственников нет. Годичного дохода выручается всегда с фольварка 5-ти усадеб – по заявлению арендаторей, которые не имеют письменных условий от владельца Владислава Кодя, а лишь по словесному договору уплачивали ему, как-то: 1-й Флориан Альхимович 50 рублей, 2-й Андрей Савульский 11 рублей, 3-й Игнат Гурский 10 рублей, 4-й Александр Бутвиловский 11 рублей, 5-й Франц Фёдорович 11 рублей, 6-й Викентий Гинтовт 11 рублей. Всего 104 рубля.*

*Озимой ржи засеяно девять четвертей и семь четвериков.*

*При произведении описи показано угодий в распределении усадебной, пахотной и сенокосов 127,08 десятин, лесу дровяного 126,12 десятин и*

*неудобной 1,10 десятин, всего 254,30 десятин, хозяйственных строений 31. общая стоимость имения была оценена в размере 1343 рубли 45 копеек.*



Хата ў Запаллі. 2009 год.

*Однако по случаю черезполосности и скудности земли, означенную сумму 1343 рубли 45 копеек предположено уменьшить на 268 рублей 69 копеек".*

У пачатку XX стагоддзя вёска Запалле ўваходзіла ў Вітуніцкую воласць Барысаўскага павета. У ёй пражывала 107 жыхароў. У 1918 годзе адчынена пачатковая школа, у якой вучыліся таксама дзеці з бліжэйшых дробных населенных пунктаў. У 1924 годзе настаўнікі Міхаіл Зубко і Марыя Зубко вучылі тут 70 дзяцей (з іх 15 дзяўчынак).

У 1942 годзе ў Запаллі адбыўся адзін цікавы выпадак. Вось як успамінае пра гэта былы камандзір партызанскай брыгады "Жалязняк" Іван Піліпавіч Ціткоў: *"...Наш 1-ы атрад пайшоў на Даўгінава. У населенным пункце Ізбішча ён абязброіў мясцовую паліцыю і павярнуў на Докшыцы.*

*Па шляху, у вёсцы Запалле, нам давялося ўдзяліць некаторую ўвагу аднаму польскаму памешчыку, які толькі што перасяліўся сюды са сваёй вялікай прыслугай з Францыі, куды ўцёк пасля вызвалення Заходняй Беларусі савецкімі войскамі ў 1939 годзе. Мы найшлі яго раніцай у койцы з маладой жанчынай. Схуднелыя жанчыны і чацвёра мужчын грудзьмі сталі на абарону свайго гаспадара.*

*Памешчык з перапуду ніяк не мог нацягнуць на сябе штаны. А яго жанчына, седзячы на вугле койкі, стыдліва захіналася ў прастыну. Але вось памешчык апрануўся. Від яго быў смешны: вусны ў памадзе, вусы – ніткай, на пальцах манікюр... Ён ледзь прыкметна падмігнуў сваёй сужыцельцы – і тая забілася яшчэ далей у вугал. Сямён Суслаў кінуўся да яе і выхапіў з-пад падушкі аўтамат".*

Што здарылася з гэтым памешчыкам на жаль Ціткоў не расказвае. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска Запалле была спалена фашыстамі.

Зараз у Запаллі пражывае каля 20 чалавек.

# Зарачыцк

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Зарачыцк адносіўся да Вольберавіцкага прыхода. У 1884 годзе тут адкрылася змешаная школа граматы. У 1890-91 навучальным годзе навучаннем займаўся селянін Лука Антонавіч Сялюк, які скончыў курс царкоўна-прыходскай школы, з узнагародай 20 рублёў за зіму. Школа размяшчалася ў наёмнай кватэры. Вучылася ў школе 13 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі.

У пачатку XX стагоддзя Зарачыцк уваходзіў у Вітуніцкую воласць Барысаўскага павета. У 1919 годзе тут адчынена пачатковая школа, у якой вучыліся таксама дзеці з бліжэйшых дробных населеных пунктаў. Адна з першых настаўніц гэтай школы – Вера Яневіч, якая ў 1924 годзе вучыла 52 дзяцей.

У гады калектывізацыі старшыня сельскага Савета Маркавец пагражаў асудзіць усіх, хто не пажадаў уступіць у калгас, зачытваў спіс аб прызначэнні цвёрдых заданняў па нарыхтоўках.

Перад Вялікай Айчыннай вайной у Зарачыцку было 33 двары і пражывала каля 94 чалавек. У лістападзе 1942 года каля вёскі адбыўся бой партызан 1-га атрада брыгады "Жалязняк" з немцамі. Фашысты ехалі з Докшыц на 50-ці падводах – чалавекі па тры на кожнай. На



адной з іх быў усталяваны ротны мінамёт. Начальнік штаба атрада лейтэнант Ахоненка не разгубіўся і загадаў байцам адкрыць агонь па праціўніку. Нечаканасць прынесла поспех. Гітлераўцы ўцяклі. Партызаны захапілі два дзесяткі падвод і частку зброі, у тым ліку ротны мінамёт з запасам мін.



А ў жніўні 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 21 жыхара. На мясцовых могілках знаходзяцца магілы трох членаў падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая дзейнічала ў вёсцы Гліннае. Тут пахаваны М.А. Гаўрыловіч, М.В. Дземідовіч, Г.Л. Навіцкая.

# Кадлубішча

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Вядома з XVII стагоддзя як уладанне Пацаў. У пачатку XX стагоддзя тут былі вёска (27 двароў, 151 жыхар) і фальварак (1 гаспадарка, 24 жыхары). У 1923 годзе ў Кадлубішчы адчынена пачатковая школа, у якой вучыліся таксама дзеці з многіх прылеглых населеных пунктаў. Першы настаўнік – Ганна Сыс, якая ў 1924 годзе вучыла 40 хлопчыкаў і 4 дзяўчынак. Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёсцы налічвалася 96 жыхароў. У красавіку 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску. Зараз тут пражывае каля 15 чалавек.



9 студзеня 1960 года ў Кадлубішчы нарадзіўся беларускі мовазнавец Арцямёнак Генадзь Антонавіч. У 1981 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. З 1987 года працуе ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце старшым выкладчыкам. У 1988 годзе стаў кандыдатам філалагічных навук, а з 1993 года – дацэнт. У 2000 годзе – загадчык кафедры беларускага мовазнаўства. Даследуе праблемы словаўтварэння, узаемадзеяння блізкароднасных моў, гісторыю беларускага мовазнаўства. Мае каля 50 навуковых публікацый. Адзін з аўтараў падручніка “Беларуская мова” для 10-11 класаў школ з рускай мовай навучання, выпушчанага ў 1999 годзе.

# Казлы

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Казлы ўваходзілі ў Парплішчанскую воласць Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 год у складзе Польшчы. У той час колькасць жыхароў у вёсцы даходзіла да 343 чалавек. Зараз у казлах пражывае каля 90 чалавек.

За 300 метраў на ўсход ад вёскі знаходзіцца курганны могільнік. Ён складаецца з 20 курганоў (раней было 60) вышынёй 0,8-1 метр, дыяметрам 9-10 метраў. 4 насыпы знаходзяцца непасрэдна каля могілак, астатнія за 100-150 метраў на поўдзень і на ўсход ад іх. Выявіў і абследаваў могільнік у 1971 годзе А.Р. Мітрафанаў, але раскопак ні ён, ні другія вучоныя не праводзілі.

# Кальнік

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Кальнік уваходзіў у склад Бягомльскай воласці Барысаўскага павета, 15 двароў, 118 жыхароў. У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус”, нямецка-фашысцкія акупанты знішчылі вёску і загубілі 5 жыхароў. Зараз тут пражывае каля 10 чалавек.

Паколькі Кальнік размяшчаецца на дарозе Мінск – Віцебск, ён займаў стратэгічнае становішча. У гады Вялікай Айчыннай вайны тут здарылася шмат падзей. Вось як успамінае пра адну з іх былы камандзір партызанскай брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў: *“...Аўтадарога Мінск – Віцебск з яе шматлікімі мастамі ўяўляла складанае інжынернае збудаванне. Мясцовасць, па якой яна праходзіць, чаргуецца вялікай колькасцю рэк, рэчак, балот і густымі лясамі. Вось чаму фашысты трымалі яе пад узмоцненай ахоўвай. Іх гарнізоны стаялі ў Лагойску, Плешчаніцах, Бягомлі, Лепелі і на мастах праз Бярэзіну і Сергуч. Паміж гарнізонамі пастаянна курсіравалі танкі, бронемашыны і мотапяхотныя падраздзяленні.*

*Нас гэта дарога цікавіла і па той прычыне, што яна прыцягвала да сябе франтавыя рэзервы немцаў, каторыя часта выкарыстоўваліся акупантамі для барацьбы з партызанамі. Станавілася відавочным, што пакуль мы не выведзем яе са строю, акупанты заўсёды будуць мець магчымасць кідаць супраць партызан рэгулярныя часці.*

*Але што значыць вывезці са строю такую дарогу на працяглы час? Акупанты заўсёды зганялі людзей з навакольных вёсак і хутка аднаўлялі яе. Жыхары часта нават папракалі партызан, што яны разлічваюцца за іх дыверсіі. Мы разумелі, што на дарозе неабходна разбурыць такі аб’ект, які не паддаваўся бы аднаўленню сіламі мясцовага насельніцтва, без выкарыстання дарожна-будаўнічай тэхнікі.*

*Такім аб’ектам мог быць толькі мост праз Бярэзіну каля вёскі Кальнік. Пры адыходзе савецкіх войск у 1941 годзе ён не быў узарваны. Сапёры ўжо падрыхтавалі яго да падрыву, але здзейсніць задуманае не паспелі. Цяпер ён знаходзіўся пад узмоцненай ахоўвай немцаў. Для гэтага яны тсварылі спецыяльную камендатуру № 22. Узначальваў камендатуру обер-лейтэнант Элінгер. У яго распараджэнні знаходзілася рота салдат з кулямётамі і мінамётамі. Часам, калі ішла перадыслакацыя нямецкіх войск па гэтай дарозе, каля маста ўстанаўлівалася зброя зенітнага дывізіёна. На падыходах да маста былі дзоты, акопы і хады зносін поўнага профіля, мінныя палі. Сама камендатура і гарнізон размяшчаліся ў казарме, якая была абнесена драўляна-земляным плотам у рост чалавека, з амбразурамі для вядзення агню па ўсіх накірунках.*

*Пасля рэкагнасцыроўкі мясцовасці, у штабе брыгады прыйшлі да вываду, што без цяжкай зброі гэты мост узяць нельга. Аднак такой зброі ў*

*нас не было. Рашэнне прыйшло выпадкова. Мы даведаліся, што ў гарнізоне няма харчавання. Завозілася яно па суботах на цэлую нядзелю з навакольных вёсак. Параіўшыся з Сцяпанам Сцяпанавічам Манковічам, начальнікам штаба, я вырашыў узяць гарнізон шляхам працяглай блакады.*

*На падрыхтоўку аперацыі мы затрацілі пяць дзён. Арганізацыйна і тактычна ўсё было прадумана да дробязей. Найбольшую пагрозу для нас уяўлялі рэгулярныя войскі.супраць іх танкаў у брыгады не было ніякіх сродкаў абароны, калі не лічыць двух-трох дзесяткаў ручных гранат. Праўда, партызаны ўсё ж пабудавалі супраць танкаў пасткі, лясныя завалы, залажылі фугасы з нямецкіх авіябомб.*

*Аперацыя пачалася ў ноч на 28 лістапада 1942 года. Прыкладна ў час ночы амаль адначасова па ўсёй дарозе ад Бягомля да Лепеля загарэліся кастры, зазвінелі пілы, загрукаталі тапары. Звыш трох тысяч жыхароў навакольных вёсак выйшла на разбурэнне дарогі. Перакопвалі насып, пілавалі тэлеграфныя слупы, рабілі лясныя завалы. Па гарнізонах праціўніка ў Бягомлі і на масце каля Кальніка народныя мсціўцы адкрылі агонь з вінтовак і кулямётаў. Пры гэтым, ім дазволілі выкарыстоўваць на вінтоўку па тры патроны, на кулямёт – не больш дзесяці.*

*Блакада зацягвалася.*

*12 снежня 1942 года да Манковіча прыйшоў стараста Домжарыц А.Цяліца і прынёс запіску ад самога каменданта гарнізона Элінгера. У ёй гаварылася: "Господин, товарищ староста! Убедительно прошу вас прислать хоть сколько картофеля. Возможно, у вас найдутся яйца и молоко. У нас продовольствия нет. Вот уже который день мы ждём подвоза, но партизаны не пропускают. За продукты, принесённые нам, заплачу марками, дам папирос, мыла. Надеюсь, вы не откажете в просьбе. Германские власти не забудут вас. Я жду вашего прихода сегодня"*

*Запіска каменданта гарнізона патрабавала ад кіраўніцтва брыгады прыняць тэрміновыя меры па завяршэнню аперацыі. Варожы гарнізон быў аслаблены і наўрад мог аказваць доўгае супраціўленне. Аднак неабходна было ўсё разведаць.*

*Пасля аналізу абстаноўкі мы з Манковічам вырашылі ўзмацніць абстрэл гарнізона, а дні праз два паспрабаваць дабіць яго імклівай атакай. Пад вечар варожы гарнізон упершыню за час блакады быў падвергнуты моцнаму абстрэлу з нашых станкавых кулямётаў і трафейнага мінамёта. Спачатку гітлераўцы адказвалі кулямётным агнём, аднак хутка змоўклі. Працягваў страляць толькі адзін кулямёт, які знаходзіўся каля казармы. За гэту кропку ўзяліся нашы снайперы.*

*А трэцяй гадзіне ночы з боку гарнізона разам пачалі страляць некалькі кулямётаў. Партызаны пахаваліся за дрэвы. Што бы гэта азначала? Магчыма гітлераўцы вырашылі ісці на прарыў блакады. Мы сталі чакаць. Як потым высветлілася, немцы выкарысталі магчымасць і змаглі выйсці з акружэння па балоце і трапіць у Докшыцы.*

*Партызаны падпалілі ўсе пабудовы гарнізона і мост. Аперацыя выйшла за межы мясцовага значэння. Яна палажыла пачатак разгрому другіх буйных варожых гарнізонаў, а таксама стварэнню Бягомльскага партызанскага раёна. Мы ўжо садзіліся ў санкі, калі над дарогай з'явіліся нямецкія самалёты. Яны наносілі бомбавы удар па Кальніку і ваколіцах. Прыляцелі "рамы" і доўга кружылі над палаючым мастом, потым зноў з'явіліся бамбардзіроўшчыкі. Бамбёжка працягвалася дапазна. На наступны дзень фашысты расшырылі зону бомбавых удараў. Усяго толькі на дзве гадзіны спазнілася варожая авіяцыя, каб выратаваць свой гарнізон".*



Цікава, што 30 чэрвеня 1944 года сапёр 62-га гвардзейскага мотасапёрнага батальёна Віктар Сідаравіч Кладзіеў атрымаў званне Героя Савецкага Саюза менавіта за аднаўленне пераправы па гэтым мосце. Ён, паранены, уласным прыкладам надхніў байцоў пад агнём праціўніка выканаць баявое заданне. На жаль, Кладзіеў загінуў у той жа дзень ад выбуху варожай авіябомбы. Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена пасмяротна 24 сакавіка 1945 года. На месцы подзвігу Віктара Сідаравіча устаноўлены помнік.

# Калягі

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

Пра яе вядома мала. З 1921 года па 1939 год вёска знаходзілася ў складзе Польшчы, у Параф'янаўскай гміне Дунілавіцкага павета. Тады тут пражывала 147 жыхароў. На дадзены момант у Калягах налічваецца каля 35 чалавек.



Захаваліся ў вёсцы рэшткі капліцы.



# Камайск

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Паводле некаторых звестак, каля Камайска маецца стражытнае гарадзішча. Калі гэта так, то гэтыя мясціны заселены ўжо даўно. У 1407 годзе гэтыя землі перайшлі ва уласнасць Войцеха Манівіда. Разам з Паўночным Гняздзілавам і іншымі землямі, тэрыторыя, на якой пазней узнік Камайск, праз шлюб Ядвігі Манівідаўны перайшла да Алехны Судзімонтавіча, потым да Станіслава Мантоўта, а пазней да Яна Глябовіча, дачка якога Крысціна вышла замуж за Камаеўскага.

Менавіта ад прозвішча Камаеўскі, хутчэй за усё, паходзіць назва Камайск. У такім выпадку час узнікнення Камайска можна аднесці да першай паловы 16 стагоддзя. У 1555 годзе ўласнасць Камаеўскіх падзелена на дзве часткі. Вёска Камайск увайшла ў склад маёнтка Нябышына, які ў 1567 годзе належаў дачцы Камаеўскай, потым невядомым чынам трапіў у дзяржаўную ўласнасць, а ў канцы 16 стагоддзя Стэфан Баторый перадаў гэты маёнтак шляхціцу Хмялеўскаму. У 1696 годзе ў Камайску было 48 фальварковых валок. Побач з Камайскам быў закладзены фальварак Янова, аднак у многіх дакументах маёнтак называецца Камайск. Напрыканцы 18 стагоддзя ён быў ва ўласнасці Мацкевічаў, з сярэдзіны 19 стагоддзя – Герловічаў.

У XVIII стагоддзі Камайск увайшоў у склад Рэчы Паспалітай.



11 сакавіка 1800 года ў вёсцы пабудавана драўляная Ільінская царква. Храм мае двухзрубны выгляд і складаецца з амаль квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму і прыбудаванай да яго з усходу трохграннай апсіды. Сцены рублены з брусоў, звонку гарызантальна абшыты дошкамі. Будынак накрыты агульным дахам, які ўтварае пры пераходзе ад асноўнага аб'ёму да апсіды трохвугольныя застрэшкі. Галоўны (заходні) фасад завершаны ўсечаным франтонам, над ім невысокая глухая вежка з двух'ярусным шатровым дахам. Абрыс шатровага завяршэння паўтораны і ў маленькай галоўцы над алтаром. Бакавыя сцены асноўнага аб'ёму вертыкальна расчлянёны брусамі-сцежкамі, паміж якімі прарэзаны невялікія прамавугольныя вокны з фігурнымі ліштвамі. Інтэр'ер зальны. Столь плоская, падшыўная. Алтарнае памяшканне аддзелена папярочным брусам, асвятляецца маленькімі высока размешчанымі вокнамі. Царква з'яўляецца помнікам драўлянага народнага дойлідства.





У царкве каля прастола знаходзіцца незвычайны камень. На ім, згодна з паданнем, ёсць адбітак ступні Прасвятой Багародзіцы. Калісьці сляпому жабраку было бачанне, што Прасвятая Багародзіца стаяла на гэтым камяні. Яна загадала жабраку ісці да ўладальніка гэтай мясцовасці і сказаць, што Прасвятая Багародзіца загадвае яму пабудаваць тут царкву. Жабрак так і зрабіў і стаў бачыць.

У раённай кнізе “Памяць. Докшыцкі раён” гаворыцца, што царква была пабудавана ў 1809 годзе па фундацыі Яна і Тэрэзы Мацкевічаў. Аднак у “Апісанні Барысаўскага павета” надрукаванага ў Вільні ў 1847 годзе сказана, што па фундацыі Мацкевічаў у 1809 годзе ў Камайску быў пабудаваны касцёл. Грошы на будаўніцтва таго касцёла збіралі і з жыхароў вёскі Янова. Усяго на будаўніцтва пайшло 150 рублёў серабром. Камайская парафія ў той час налічвала 258 душ.




У 1909 годзе ў вёсцы Камайск налічвалася 566 жыхароў. Дзейнічала школа. З 1921 года па 1939 год Камайск уваходзіў у склад Польшчы, а дзяржаўная мяжа з СССР праходзіла за паўкіламетра на ўсход ад вёскі. У 1930 годзе 127 двароў, 611 жыхароў, 563 дзесяціны зямлі. У лістападзе 1943 года Камайск спалены немцамі, пры гэтым ацалела царква, якая знаходзіцца воддаль ад вёскі. У 1949 годзе тут арганізаваны калгас імя Калініна, а ў 1969 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна на ўшанаванне памяці 42 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1973 годзе ў Камайск перасяліліся жыхары вёскі Янова. Зараз тут пражывае каля 220 чалавек.



У кнізе Г.В. Штыхава “Археалагічная карта Беларусі. Выпуск 2” (Мн., 1971) са спасылкай на розныя гістарычныя крыніцы ўказваецца, што каля Камайска знаходзіцца гарадзішча. Аднак другіх звестак пра гэты факт я нідзе больш не сустракаў.

Каля паўночнай ускраіны вёскі бярэ пачатак меліярацыйны Камайскі канал даўжынёй 6,9 кіламетра. Ён з’яўляецца левым прытокам ракі Поня (басейн Дняпра). Пасля пабудовы на канале дамбы каля вёскі ўтварылася штучнае Камайскае возера. Многія жыхары называюць яго святым. Справа ў тым, што тут было многа крынічак. Працякала і рака, на якой калісьці стаяў млын. Калі хросны ход ішоў да каплічкі, то абавязкова падыходзілі да адной з крынічак, хоць для гэтага трэба было збочваць з прамой дарогі. Ля крынічкі маліліся, асвяшчалі яе. Калі прыйшла Савецкая ўлада, царкву закрылі, хутары знeслі, каплічку таксама занядбалі, аб крынічках маўчалі, хаця вадой іх пры хваробах карысталіся.

А вось што піша пра свае ўражанні ад знаходжання ў Камайску Вячаслаў Дубінка ў газеце “Новы Час" за № 16 ад кастрычніка 2003 года:

**Камайскія кантрасты**

Пад час падарожжаў па сцежках старонкі роднай столькі дзівосаў пабачыш, дый такіх... Нямала захавалася помнікаў зацятае барацьбы «з рэлігійным дурманам». У мястэчку Камайск радавала вока, цешыла душу цэркаўка, выштукаваная вясковымі дойлідамі два стагоддзі таму. Да цэркаўкі па загаду раённых партдзеячаў старшыня калгаса пастараўся – і з жывёлагадоўчай фермы пабегла жыжа, рэлігійнаму туману дразда даючы. Сонца неяк сарамліва спрабуе зазірнуць у замурзаныя шыбкі зганьбаванай цэркаўкі. Прабяжыць па пачарнелым збуцвелым інтэр’еры і хутчэй адсюль, хіба што схавацца за воблакі.

Пабачыўшы нас, купку новых людзей, падышоў бліжэй вясковы настаўнік, ссівелы, стомлены, некалькі кніжак пад пахай, выдыхае горкае гучна, гнеўна:

– Свае ж і аплявалі! Быдлу анічога не трэба! Паеў, ды ў хлеў. Ім хопіць і пару мяшкоў бульбы, каб набіць кіндзюк. Мой дзед будаваў гэтую цэркаўку, а што засталося... Чорны попел у чорнай ночы...

А каля пачарнелай крамы соўгаюцца некалькі вясковых п’янтосаў. Там крамнага, дзяржаўнага пойла – залейся. Адзін паддаты другому нібыта жаліцца, а хутчэй хваліцца:

– У мяне аж сямёра дзяцей і ўсе есці хочуць... А я ж выпіць люблю...

А на ўскраі Камайска прывабіў вялікі, некалі ладны, а цяпер занядбаны дом, без жывое душы. А колькі тут рэчаў, што некалі служылі штодня, штогадзінна. Па-хлапечаму радуюцца сталічныя мастакі, яны ж некалі выйшлі з гэтых хатаў у свет непаўторны, а цяпер вось сустрэча з дзяцінствам. Дай ім памацаць аброць, пагладзіць хамут, пацягаць за аглоблі фуру для сена, цярнуць далонню па пысе белага коніка, прывязанага каля плоту, прывеціць маркотнага сабачку...

# Караліно

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1913 годзе вёска адносілася да Барысаўскага павета. У гэтам годзе тут адчынена народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу. У 1924 годзе настаўніца Юлія Парахонька вучыла 27 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі.

Перад Вялікай Айчыннай вайной тут пражывалі 93 жыхары. У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў Караліно 20 двароў і загубілі 1 жыхара.

Зараз у вёсцы пражывае каля 15 чалавек.

# Кемешаўцы

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Кемешаўцы вядомы яшчэ з 1675 года, калі па фундацыі Мацкевіча тут быў пабудаваны буйнамаштабны драўляны крыжова-купальны касцёл. На яго будаўніцтва было зрасходавана 1807 рублёў серабром. Кемешаўская парафія на той час налічвала 1372 душы. Аднак ёсць звесткі, што спачатку тут пабудавалі царкву, а ужо потым яе перарабілі ў касцёл, які быў зачынены ў 1885 годзе. У 1909 годзе парафія адноўлена. Архітэктурная кампазіцыя збудавання мела план у выглядзе выцягнутага лацінскага крыжа і двухвежавы галоўны фасад.

Па другіх крыніцах дзесьці на мяжы XVII і XVIII стагоддзяў мясцовы пан Сівіцкі пабудаваў у Кемешаўцах касцёл і на свае сродкі абсталяваў яго неабходнай маёмасцю, нават купіў арган. Вяскоўцы каталіцкага веравызнання адкрылі тут у 1911 годзе для сваіх дзяцей польскую школу. Да гэтага часу ў вёсцы пражывала каля 210 чалавек. За настаўніка нанялі хлопца Андрэя Булыгу з аплатай па 1 рублю ў год з дзіцяці, абавязаліся яго па чарзе карміць па тыдню і даваць пасцель, набылі неабходныя кнігі і прылады.

Але 24 лютага 1911 года ў вёску завітаў прыстаў 3-га стана і наведаў школу. Там знайшоў у хаце Макарэвіча 16 вучняў і настаўніка, а на стале кнігі на польскай і рускай мовах. На паліцы ўбачыў скрутак, у якім “аказалася яшчэ 2 кнігі на польскай і 6 на рускай”. Станавы перапісаў прозвішчы бацькоў: Сцяпана Макарэвіча, Восіпа Рагінскага, Вінцэся Клімантовіча, Сцяпана Алісёнка, Тэклі Мяцеліцы, Андрэя Насцюшонка, Франука Насцюшонка, Сымона Мяцеліцы, Мацея Насцюшонка. Школу прыстаў закрыў, а справу перадаў у суд. Там настаўніка і бацькоў пакаралі штрафам па 3 рублі кожнага.

У чэрвені 1942 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску

Зараз тут пражывае каля 20 чалавек.

За два кіламетры на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Камяшанскі Бор знаходзіцца курганны могільнік. Ён складаецца з сямі насыпаў вышынёй каля 4-5 метраў і дыяметрам да 6 метраў. Некаторыя курганы пашкоджаны ў час Вялікай Айчыннай вайны мясцовымі жыхарамі, якія рабілі ў іх схованкі.

У 1898 годзе ў Кемешаўцах нарадзіўся Бельскі Сямён Мікалаевіч. З 1918 года ён ваяваў у Чырвонай Арміі на Усходнім фронце. У 1921 годзе служыў у атрадзе па барацьбе з бандытызмам, які дзейнічаў у раёне Полацка і Лепеля. Потым вярнуўся ў родную вёску. У 1930-я гады працаваў у калгасе “На варце”. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, вайны з Японіяй. Узнагароджаны медалямі “За баявыя заслугі”, “За доблесную працу”, і іншымі.

# Кіякова

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

Уладальнікамі Кіякова былі Кіякоўскія. У “Гербоўніку Польшчы” Адама Банецкага знаходзім наступныя звесткі аб іх: *“КІЯКОЎСКІЯ гербу КАСЦЕША, з Кіякова ў павеце Вілейскім. Клеменс, суддзя гранічны павету Вілейскага з сынамі: Станіславам і Паўлам, Ян Гілары, Караль, у законе базыльянаў Кірыл, Дамінік Зыгмунд з сынам Бенедзіктам, Ігнацы Вінцэнт, пісар земскі павету Вілейскага і Геранім – сыны Валентына Юзэфа, скарбніка віленскага 1766, легітымізавалі шляхецтва ў 1817 годзе перад Дэпутацыяй Віленскай.*

*Эдмунд Кіякоўскі, уладальнік Кіякова ў 1886 годзе”*

Паводле метрыкаў, у 1802 годзе Клеменс Кіякоўскі быў хросным бацькам старэйшых сыноў Тадэвуша Дамейкі Стафана Аляксандра (пазнейшага уладальніка Сітцаў) і Казіміра Францішка (уладальніка Гервятаў). Магчыма, што ад яго імя ўтварылася назва фальварка Клемацова (Klemensowo, Klemensów), які таксама знаходзіўся ва ўладаннях Кіякоўскіх на беразе ракі Сэрвач каля Лісавіч.

Некаторыя прадстаўнікі роду Кіякоўскіх пахаваныя на могілках у Парфенаве. Там знаходзяцца магілы Клементыны Станіславаўны Кіякоўскай (1832 - 1858), Зянон Станіслававіч Кіякоўскі (1830 – 1872), Барбара Кіякоўская (дзявочае прозвішча Хмялёўская) (1796 – 1866), Фелікс Кіякоўскі (1829 – 1871), Паўліна Кіякоўская (дзявочае прозвішча Навіцкая, памёрла 26 жніўня 1872 года).

У рэвізіі маёнткаў 1795 года аніякіх звестак пра Кіякова не знаходзім. Тэрыторыя, што пазней увайшла ў склад маёнтка, тады адносілася да маёнтка Чаркасы Міхаіла Брастоўскага (Бжастоўскага?). Аднак дзе магла быць сядзіба ў Чаркасах? Ніякай інфармацыі пра існаванне сядзібы ў саміх Чаркасах ніколі не даводзілася сустракаць. Найбліжэйшы фальварак Караліна быў цэнтрам асобнага маёнтка. Значыць, верагодна, сядзіба маёнтка Чаркасы была якраз у Кіякове.

Кіякова згадваецца ў 1849 годзе пад назвай “Кіякаў” (Kijaków). У далейшым у многіх польскіх дакументах назва маёнтка пісалася як Кіякова. аднак на плане зямлі 1939 года сустракаецца назва "Kijaków”. У 1860 годзе да маёнтка Кіякова належалі вёскі Лісавічы, Макаравічы, Чаркасы. Да маёнтка Клеманцова, які таксама быў ва ўласнасці Кіякоўскіх, адносіліся Старая Вёска (Старое Сяло), Парэчча, Вайтовічы. Каля Вайтовіч існаваў фальварак Станіслававa, які ў 1929 годзе належаў Соф’і Кіякоўскай. Магчыма, назва паходзіць ад імені Станіслава Кіякоўскага, пахаванага на каталіцкіх могілках у Парфенаве. Надпіс на надмагільным камяні: “Stanislaw s. Klemensa Kijakowsky ur. 1796., zm. 1838. Porucznik Wojsk Polskich”

Зараз гэта невялічкая вёсачка, дзе пражывае каля 35 чалавек. Менавіта Кіякоўскія і заклалі на рубяжы стагоддзяў параўнальна вялікую сядзібу, якая мела рысы ўтылітарнай мэтазгоднасці. З часоў эклектыкі яна захавалася лепш за ўсе. Уключала палац з афіцынай, свіран, лядоўню, вяндлярню, кузню, піўніцу, парк, сад і вялізны гаспадарскі двор. У вёсцы, акрамя таго, мелася 2 дамы для рабочых (на 12 сем'яў).

Месца для сядзібы было выбрана з густам. Кіякоўскія яе заклалі на невысокай тэрасе ракі Сэрвач. Мела простую планіроўку. Палац з верандамі і тэрасамі на двух фасадах складаўся з 14 пакояў і размяшчаўся ў глыбіні парка. Да яго праз усю сядзібу вяла прыгожая алея з конскага каштана і ліпы. Гэтыя дрэвы часткова захаваліся да цяперашняга часу.

Перад домам меўся партэр з кругам, за якім па адной восі была пабудавана стайня выязных коней. Яна таксама часткова захавалася. З паркавага боку сярод сада таксама быў круг такіх жа памераў, як і парадны, з рабаткамі півоняў.





Непасрэдна сам парк быў спланаваны на паўднёва-усходняй ускраіне сядзібы. Ён у плане Г-падобны і складаўся з дрэў мясцовых відаў. Яго найбольш утульная і прыгожая частка размяшчалася з боку ракі, дзе раслі векавыя яліны, ліпы, дубы і бярозы. Адсюль адкрываецца перспектыва на раку і пойму.



Ад вялікага гаспадарскага двара захаваліся стайня і ферма. Стайня пабудавана з бруса, закладзенага ў цагляныя шулы. Фасад вылучаны двума рызалітамі са шчытамі. Іх дзвярныя праёмы маюць арачнае завяршэнне і прыгожыя дзверы работы мясцовых майстроў.



Ферма пабудавана ў 1938 годзе ў стылі "цаглянай" архітэктуры. У плане П-падобная і мела вялізныя памеры – 42 на 33 метры. Фундамент складаецца з колатага каменя, шчыльна падагнанага на цэментнай звязцы. Сцены цагляныя, а кладка тыпу рад "латок", рад "тычок". Цэгла гатавалася на цагельні ў вёсцы Валкалата. Ферма з'яўлялася ўзорам гаспадарчых пабудоў такога тыпу.



У 1939 годзе, па словах старажылаў, распачалася пабудова бровара. Быў закладзены падмурак, але дабудаваць не паспелі - у 1939 годзе прыйшла савецкая ўлада

Захаваўся таксама svіран з 15 вянцоў і незвычайная лядоўня, якая ўключае склеп, паўпаверх складзены з колатых валуноў, а франтон, вуглы, дзвярныя праёмы – з чырвонай цэглы. Выдзяляецца формай, прыгожым спалучэннем каменя, цэглы і мацункам выканання.



У 1907 годзе Кіякоўскімі будуецца капліца ў неарэнесансным стылі. Цагляны, атынкаваны будынак упрыгожаны пілястрамі. На галоўным фасадзе над лучковым дзвярным праёмам размешчана акно, а да тэрасы вялі бакавыя лесвіцы. Пад тэрасай зроблены ўваход у крыпту. Сярод сямі пахаваных у крыпце – Марыя Кіякоўская з Ябланоўскіх (1876 –1906), жонка Багдана, апошняга ўладальніка ад другой сядзібы Кіякоўскіх (належала Эдмунду), якая размяшчалася сярод поля. Захаваліся толькі падмуркі і фрагменты дрэвастою былога пейзажнага парку.



Цяжка паверыць, што калісьці капліца магла перастаць існаваць. Паўкруглыя вокны былі разбітыя, жалезныя дзверы адчынены. На ветры яны скрыпелі, скрыгаталі. З вакон вылятали вароны. Цэментная падлога была засмечана, а сцены абшарпаныя і пабітыя кулямі. У падвале былі разбураны пячуркі і нават валяліся выкінутыя чалавечыя косці. Акрамя згаданых вышэй тут былі пахаваны Эдмунд і яго сын Аляксандр. Аляксандр быў бяздзетны і выхоўваў сына сястры – Багдана. Дзе дзяваўся Багдан – невядома.



Вяскоўцы кажуць, што ён быў добрым чалавекам, не крыўдзіў працуючых на яго парабкаў і нават меў прыхільнасць да партызан. Кажуць і тое, што ён дапамагаў ім харчаваннем, а затым і сам пайшоў у лес, дзе і загінуў. Праўда, дакладных звестак пра гэта няма.

А вось унук Багдана жыве ў Польшчы і ў 1990-я гады наведваў родныя мясціны. Пакінуў мясцоваму жыхару грошы і прасіў узнавіць радавы склеп (капліцу). Чалавек той, богабаязны, узяўся за работу, а дапамагалі яму ўсе жыхары бліжэйшых вёсак. І вось гадоў 10 як дзейнічае адбудаваная белая капліца пад чырвоным дахам.





У маі 2006 года праз раку Сэрвач быў пабудаваны новы мост. Адзінаццаць дзён спатрэбілася асабоваму саставу 77 асобнага Чырвонасцяжнага маставога чыгуначнага батальёна горада Віцебск каб пабудаваць мост даўжынёй 26 і шырынёй 5 метраў. А да гэтага тут была такая пераправа, як паказана на гэтым фотаздымку.

# Клінікі

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Упершыню вёска ўпамінаецца ў 1879 годзе пры пераліку населеных пунктаў Бягомльскага праваслаўнага прыхода Барысаўскага павета. У пачатку XX стагоддзя ўваходзіла ў Асаўскую воласць таго ж павета, у якой пражывала 150 чалавек. У 1933 годзе быў арганізаваны калгас імя Калініна, працавала кузня. У маі 1943 года ў час карнай аперацыі "Коттбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 69 чалавек – так напісана ў кнізе "Памяць. Докшыцкі раён". А вось у раённай газеце "Родныя вытокі" навуковы супрацоўнік Бягомльскага музея народнай славы А. Каралевіч называе дату трагедыі 22 чэрвеня 1943 года.

А вось як успамінае той страшны дзень былы партызан Уладзімір Сушко. У гэты дзень ён зайшоў у Клінікі, каб праведаць маці. Як раз у гэты момант на вёску наляцелі немцы, пайшлі па хатах, пачалі выганяць жыхароў на вуліцу. Уладзімір схаваўся на гарышчы. Ён чуў, як маці ўсё казала: "Пан, яйкі, сала", а ў адказ – кулямётная чарга і пах дыму. Ён спусціўся з гарышча, кінуўся шукаць фотаздымак, каб хоць нешта роднае засталося ад сям'і. тым часам хату ўжо ахапіла полымя. Уладзімір толькі паспеў выкаціцца з хаты ў жыта, якое падступала да самой будыніны, а потым – у лес. Такім чынам і застаўся ў жывых. Як бачна, версія Каралевіч больш верагодна, паколькі ў маі ў жыце хавацца, напэўна, яшчэ немагчыма.

У гэты самы час такія ж крывавыя падзеі адбываліся і ў Гарэлым. Людзі яшчэ не маглі паверыць, што вось так змогуць разгарнуцца падзеі, бо некаторыя з іх з Гарэлага пабеглі ратавацца ў Клінікі. Тут іх сустрэлі ворагі кулямі. Толькі той застаўся ў жывых, хто паспеў адбегчыся трошкі далей у Будачы.

# Кляпіцы

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

Па народнаму павер’ю ў гэтай вёсцы майстры раней рабілі заклёпкі да бочак. Адсюль і назва яе.

У 1890 годзе ў Кляпіцах адкрылі перасоўную школу. Выкладаннем у школе займаўся селянін Сяргей Таляронак, які скончыў курс народнага вучылішча, з узнагародай 7 рублёў за зіму пры гатовым стале. У гэтым навучальным годзе ў школе было толькі 7 хлопчыкаў.

У пачатку XX стагоддзя Кляпіцы ўваходзілі ў Докшыцкую воласць Барысаўскага павета і ў ёй пражывала 212 чалавек. З 1921 года па 1939 год Кляпіцы ўвайшлі ў склад Польшчы. У верасні 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 1 жыхара.

У 1949 годзе ў Кляпіцах арганізаваны калгас “Чырвоны партызан”. Зараз у вёсцы пражывае каля 60 чалавек.



5 ліпеня 1947 года тут нарадзіўся генерал-маёр унутранай службы Леанід Аляксандравіч Каротчык – заслужаны супрацоўнік Міністэрства унутраных спраў Расійскай Федэрацыі. У 1968 годзе скончыў Свярдлоўскае пажарна-тэхнічнае вучылішча, а ў 1973 годзе Вышэйшую інжынерную пажарна-тэхнічную школу пры Акадэміі МУС СССР. У 1998 годзе скончыў курсы Акадэміі Дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ. Леанід Аляксандравіч прайшоў шлях ад начальніка каравула да начальніка Упраўлення дзяржаўнай пажарнай аховы горада Масква.

Узнагароджаны ордэнам Святога Данііла 2-й ступені, медалямі. Двойчы адзначаны імянной зброяй.

# Козікі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Козікі ўваходзілі ў Докшыцкую воласць Барысаўскага павета. З 1921 года па 1939 год у складзе Польшчы. На той час у вёсцы налічвалася каля 112 чалавек. Зараз тут пражывае 65 жыхароў.

19 лютага 1944 года 2-гі атрад брыгады “Жалязняк” і рота кулямётчыкаў правялі аперацыю па разгрому варожага гарнізона ў вёсцы Козікі. Атрад заняў вёску і блакіраваў хаты, дзе размясціліся немцы. У выніку бою 27 салдат і афіцэраў было знішчана. Аднак поўнасцю знішчыць аб’екты гарнізона не ўдалося. Страты партызан склалі 4 чалавекі, сярод якіх камандзір роты кулямётчыкаў лейтэнант Раманоўскі Генрых Казіміравіч. Таксама было паранена 8 партызан.

# Краснікі

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Аб паходжанні вёскі Краснікі расказвае легенда.У пана, які жыў раней у гэтых мясцінах, было 17 дачок. Падрастала каторая - выдаваў замуж.

А вось самай малодшай мужа не дасталося. Усіх сваіх дачок пан вьдаваў за багатых і знатных людзей, а для малодшай не знайшлося годнага. Засумавала дзяўчына. Доўга плакала, а потым зусім рашыла з дому ўцячы: ганьба ж у дзеўках засядзецца.

Ноччу на Купалле апранулася дзяўчына ў чырвоны сарафан, чырвоныя боты і пайшла разам з сяброўкамі святкаваць. Усе весяліліся, смяяліся, а яна адна сумавала. Прыйшла пара папараць-кветку ісці шукаць. Разайшлася моладзь парамі па лесе, а панская дачка адна пайшла і рашыла дамоў не вяртацца.

У той час у суседняй весцы жыгў хлопец-сірата Сцяпан. Любіў ён панскую дачку, як убачыў, што яна ў лес адна пайшла, непрыметна за ёй пайшоў.

Ішла дзяўчына, ішла, страшна ей стала, заплакала. Упала яе слязінка на зямлю, а адтуль з-пад зямлі лесавік выскачыў і пытае:

- Чаго плачаш, дзяўчына? Ці ад любага адстала?
- Не, не адстала, няма ў мяне любага.
- Чаго ж па лесе адна ходзіш?
- З дому пайшла. Смяюцца нада мной, што ў дзеўках засядзелася.
- А за простага мужыка замуж пайшла б?
- А чаму ж не пайсці, калі кахае ...

Лесавік выпраміўся і крыкнуў:

- Сцяпан, выходзь!

Трасучыся увесь ад страху, Сцяпан выйшаў. Лесавік яго і пытае:

- Кахаеш дзяўчыну гэту?

Сцяпан бачыў, што паненка з лесавіком размаўляла, але не чуў аб чым і рашыў, што яна ведзьма. Вось ад страху і ляпнуў:

- Не, не кахаю!

Расплакалася паненка. Гаворыць яна лесавіку:

- Разыйсціся бы мне ва ўсе бакі, каб ніхто не знайшоў ...

Будзь па-твойму, дзяўчо! - сказаў лесавік. махнуў рукой. На месце панскай дачкі чатыры стала: усе аднолькавыя, якраз як панначка. Засмяяліся дзяўчаты і пабеглі ў розныя бакі. А лесавік і кажа:

- А табе Сцяпан маё праклящце! Дрэнна ты зрабіў - дзяўчыну пакрыўдзіў, абмануў яе. Усе жыцце каяцца будзеш, усе жыцце гэтых чатырох панначак шукаць будзеш. Калі знойдзеш, то звядзі іх на гэтае месца. Злучацца яны ў адну - шчасце прыйдзе да цябе.

Засумаваў Сцяпан, ды рабіць няма чаго, пайшоў шукаць паненак па лесе. Ходзіць і крычыць: "Дзевіца красная, у чырвоным сарафане, у чырвоных чаравічках, выйдзі мне на сустрач".

Ніхто яму не адказвае. А ў поўнач чуў ён голас панначкі: "Кайся, Сцяпан!"

Прайшло шмат гадоў. Памёр Сцяпан. На месцы, дзе ён разышоўся з "краснай дзевіцай" стаіць веска Краснікі. А самыя смелыя выходзяць на перакрыжаванне і слухаюць голас паненкі:

"Кайся, Сцяпан!"

Краснікі ўпершыню ўпамінаюцца ў 1797 годзе, калі быў складзены падрабязны інвентар маёнтка Вілейка, які знаходзіўся ва ўладанні віленскага кляштара візітак і пазбег канфіскацыі. У вёсцы тады налічвалася 9 двароў.

У 1909 годзе Краснікі ўваходзілі ў Вітуніцкую воласць Барысаўскага павета і налічвалі 212 жыхароў. У 1912 годзе адкрыта народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў савецкую пачатковую школу. У 1924 годзе ў гэтай школе вучылася 37 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Цяжка было сялянам вёскі ў час калектывізацыі. У Красніках усім аднаасобнікам не давалі сенажаці, каб прымусіць усіх уступіць у калгас. Сакратар партыйнай ячэйкі асабіста арыштаваў і павёз у Бягомль 4 аднаасобнікаў-сераднякоў, якія адмовіліся пісаць заявы аб уступленні ў калгас. Іншым адказнікам былі даведзены цвёрдыя заданні па нарыхтоўках. Аднак арганізаваны такімі метадамі калгас хутка распаўся. Калектыўную гаспадарку не падтрымала вясковая бедната, якая лічыла, што ў калгасе знаходзяцца выключна заможнікі і кулакі.

У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 9 двароў і загубілі 3 жыхароў. Зараз у Красніках пражывае каля 70 чалавек.

У лесе каля вёскі знаходзіцца Сцёп-камень і Сасна-Куліна. Пра гэты камень існуе некалькі паданняў. Згодна аднаму з іх, калісьці ў вёсцы Шыленцы жыў кравец Сцяпан. Слынны гэта быў майстра. З-за гэтага карыстаўся пашанай і жыў заможна. Але хадзіў Сцяпан невясёлы, бо не было ў яго жонкі красуні. Шмат было прыгожых дзяўчат, гатовых выйсці за яго замуж, ды сэрца яго было палонена іншай. Звалі яе Ульяна або Вяльяна. Мовіць, бывала, Сцяпан да яе слова ласкавае, а яна загарыцца, як макаў цвет на дос-Вітку, ды маўчыць. Хмурыцца Сцяпан, бо праўды не ведае. Не ведае таго, што яна, як і ён да яе, усім сэрцам хінецца, ды толькі сарамлівасць дзявочая няволіць нябогу.



Доўга цярпеў пакуты кахання Сцяпан, але далей трываць не было моцы. І аднойчы апоўначы выйшаў Сцяпан у поле, стаў на крыжавых дарогах і выклікаў нячыстую сілу. За прыхільнасць дзявочую задумаў Сцяпан аддаць нячысціку сваю душу. Тут жа зашумеў лес ад ветру-буры, з чатырох дарог падымаўся пясок смерчам, а з цемры з'явіўся перад Сцяпанам у абліччы смярдзючага казла нячысцік і запытаўся пра жаданне.

Пачуўшы, што справа ідзе пра цнатлівую дзяўчыну, акрамя хлапечай душы запатрабаваў яшчэ, каб Сцяпан зняў з сябе і разбіў каменем крыжык. Збялеў хлопец ад такой блюзнерскай прапановы, але чаго не зробіш, каб атрымаць каханую. І вось пайшоў ён у бок дарожкі, дзе ляжаў камень ад жорнаў, зняў з шыі крыжык, сабраўся біць яго другім каменем. І як толькі ўзняў Сцяпан руку з каменем, у той жа момант сам ператварыўся ў камень. А з неба ўдарыў пярун і распластаў неабачлівага чорта.

Назаўтра людзі доўга шукалі свайго краўца Сцяпана дома, у полі і ў лесе. І толька ў лагчыне, знайшоўшы каля ростаняў скамянелага Сцяпана, усё зразумелі. Як дачулася Вяльяна, што стала з яе любым, у непрытомнасці пабегла ў поле і, абняўшы рукамі камень, прыпала да яго і залілася горкім, няўцешным плачам. Плакала яна ўвесь дзень і ўсю ноч, а наступнай раніцай са слёз яе з-пад каменя прабілася крыніца, а сама Вяльяна аддала Богу душу. Дзяўчыну пахавалі, і на яе магіле пабудавалі царкву.

А крыніца з-пад каменя разлілася па ваколіцах, ператварыла лагчыну ў непралазнае балота, якое людзі назвалі Шыленскім, або Кравецкім, і паплыла ў свет празрыстай рэчкай. Рэчку гэтую спачатку празвалі ў памяць пра Вяльяну Вельяй, а пазней гэтая назва стала гучаць як Вілія.

Па іншай версіі падання, пасля таго, як Сцяпан ператварыўся ў камень, адбыўся цуд. Трэба было толькі ўвечары пакласці на валун кавалак тканіны і папрасіць: “Сцяпан, пашый каптан!”, як зранку можна было забіраць гатовае адзенне, прытым цудоўна пашытае. Удзячныя людзі пакідалі ўзамен каля каменя хлеб, соль, лён. Забірала ўсё гэта Ульяна (удава Сцяпана) і карміла-апранала дзяцей. Але аднойчы п'яны жартаўнік папрасіў яму пашыць “Ні тое ні сёе”. Тады камень пакрыўдзіўся і перастаў шыць. Даведалася пра гэта Ульяна, прыбегла ў поле, упала на камень і доўга плакала. Але камень маўчаў. Слёзы ж Ульяны збіраліся ў ручаі, раку. Толькі вецер шумеў рэхам у кроне навакольных дрэў: “Ву-у-лляна ... Ву-у-лля ...” З таго часу і сталі называць раку Вулля або Вялля (Вілія).

Згодна яшчэ аднаму паданню, запісанаму ў канцы XIX стагоддзя, калісьці ў лясным урочышчы Сцёп-камень жыла сям'я - маці, сын і дачка. Сын быў непаслухмяны, а дачка надта распусная. На ўсе ўшчуванні маці за такія яе паводзіны дачка адказвала, што будзе і надалей весці ранейшы лад жыцця. Урэшце рэшт маці пракляла дачку за яе дзёрзкі адказ, і тая разлілася ракой, якую назвалі Віліяй, а сын за непаслушэнства зрабіўся каменем у выглядзе чалавека.

Наступнае паданне менш рамантычнае, ды і запісана яно нядаўна ў вёсцы Краснікі, хоць і перадавалася ад дзядоў і прадзедаў. Згодна яму, вырашыў аднойчы на Вялікдзень Сцяпан узараць зямлю. У абед, калі Сцяпан добра ўжо паспеў папрацаваць, жонка Акуліна прынесла паесці. Пакуль Сцяпан сілкаваўся, жонка ўсё бурчала на яго, папракала. Так яны і пасварыліся. Адыходзячы, Акуліна кінула: “Каб ты каменем узяўся!” Сцяпан ёй у адказ: “Каб ты Кулінай стала!” Жонка пайшла дахаты, а Сцяпан падаўся да валоў. Але як толькі ўзяўся ён за плуг, усё адразу скамянела: і Сцяпан, і

валы, і нават два збанкі. Так і ляжаць камяні з таго часу ў адным месцы. Тады ж неба і ягоную жонку пакарала. У тое імгненне, калі Сцяпан ператварыўся ў камень, яна зрабілася хвояй, якую празвалі Кулінай. Лічыцца, што гэта дрэва нельга секчы або пілаваць, інакш з яго пойдзе кроў.

Пры абследаванні Сцёп-каменя ў 1993 годзе было ўстаноўлена, што ён складзены з ружовага буйназярністага граніту і, відаць, прынесены ледавіком з поўдня сучаснай Фінляндыі або поўначы Ленінградскай вобласці каля 150 тысяч гадоў таму. Вышыня каменя над акаляючай паверхняй была 1,96 метра. З паўднёвага боку яго ўверсе былі высечаны крыж "з Галгофай", а лявей і трохі ніжэй - звычайны крыжык (крыжы пасля прыняцця хрысціянства нярэдка выбіваліся на культавых каменях, якім раней пакланяліся язычнікі, з мэтай "памяняць" іх ідэалагічную прыналежнасць). У час раскопак выявілася, што сапраўдная вышыня Сцёп-каменя, разам са схаванай у зямлі часткай, складае 2,68 метра, максімальная шырыня - да 1,3 метра, таўшчыня - каля 0,9 метра. За 4 м на паўднёвы захад ад яго ў неглыбокай западзіне ляжыць, уздымаючыся на паўметра над зямлёй, валун даўжынёй за 2,4 метра і шырынёй каля 1,8 метраў. Гэты валун у народзе лічаць скамянелыміваламі Сцяпана.

У выніку раскопак выявілася, што пад дзірваном вакол Сцёп-каменя налягае супесь цемнашэрага колеру магутнасцю каля 0,1-0,12 метра, у якой адсутнічалі знаходкі. Глыбей ішоў пласт жоўта-рудой супесі магутнасцю каля 0,3-0,4 метра. У многіх месцах раскопа трапляліся невялікія валуны і асколкі камянёў. У мацерыку прасочана яма ад слупа, у якой, магчыма, калісьці стаяў драўляны ідал.

Сасна Куліна знаходзіцца за 170 метраў на паўночны ўсход ад Сцёп-каменя, каля лясной дарогі. Перыметр яе ствала ўнізе 2,9 метра, дыяметр 0,8 метра.



Гэта афіцыйныя версіі, якія змешчаны ў кнізе "Памяць. Докшыцкі раён". Аднак існуюць легенды, расказаныя мясцовымі жыхарамі. Пра Сасну-Куліну існуе і такая легенда.

Акулініна сасна (або сасна-Акуліна) – высокае магутнае дрэва, з незвычайнымі сукамі. Існуе некалькі легенд пра гэта прыгожае дрэва. Расказваюць, што была некалі ў Баярах дзяўчына Акуліна, пайшла аднойчы ў лес па ягады або па грыбы і заблудзілася. Доўга хадзіла па лесе, плакала. Дамоў яна так і не вярнулася. Сабраліся мясцовыя жыхары і пайшлі шукаць дзяўчыну, але так і не знайшлі, толькі ўбачылі побач з дарогай сасну, якой раней на гэтым месцы не было. Вырашылі, што Акуліна ператварылася ў сасну. З того часу людзі пачалі называць дрэва сасной-Акулінай, або Акулінінай сасной.

Але існуе і другая гісторыя. Жыла некалі не то ў Баярах, не то ў Красніках дзяўчына Акуліна. Прыгожая была, разумная, працавітая. Многім

хлопцам яна падабалася, але сэрца Акуліны належала аднаму, хоць і быў ён бедны, сірата. Не згаджаліся бацькі аддаць сваю адзіную дачку за бедняка.

І вось аднойчы прыехалі да Акуліны сваты. Жаніх быў старэйшы за яе на гадоў дзесяць, непрыгожы, за тое вельмі багаты. Рады бацькі такому зяцю, але не рада была Акуліна. Не згодна яна была ісці замуж за нялюбага, але бацькі далі згоду жаніху. Колькі не плакала Акуліна, колькі не ўпрошвала маці, нічога не дапамагло. Пабегла Акуліна ў лес, плакала вельмі доўга і думала: "Лепш бы дрэвам стаяць у гэтым балоце, чым ісці замуж за нялюбага". І стала Акуліна прыгожай сасной, застылі на ёй кроплі смалы – слезы дзяўчыны.

Многа часу прайшло з той пары, не раз хацелі зрэзаць сасну, але ні адна піла не магла ўзяць моцнага дрэва. Яна як быццам каменнае. А калі хто зробіць на кары надрэз, выступаюць бурштынавыя кроплі смалы – слёзы Акуліны.

Вось якую гісторыю расказала жыхарка вёскі Баяры Глазко Ніна Андрэеуна, ёй 77 гадоу:

- Калі я была малой, то сасна і тады была магутным дрэвам. у пяцідзесятыя гады леспрамгасаўцы хацелі зрэзаць сасну. Калі яны пачалl рэзаць, яна не то запішчала, не то заплакала, ды так жаласна, што рабочыя не сталі яе рэзаць далей.

Аднак мала хто ведае, што пра Сасну-Куліну і пра Сцёп-камень існуе паэтычны твор, які запісаны ўдзельнікамі гуртка “Спадчына” Замастоцкай СШ паводле аповяда жыхаркі вёскі Замасточча Тульскай Наталлі

Як даўно было гэта,
Мо гадоў больш за 200,
Як Сцяпан і Куліна
Праклён слалі на весне.
Па вясне было гэта:
У дзянёк самы першы,
Калі людзі святкуюць
"Вялікдзень" на прадвесне.
Пасварыўшыся трохі
З сваёй жонкай Кулінай,
Асядлаўшы валоў тых,
Ён падаўся ў даліну.
І па вуліцы шпарка
Ён пайшоў за валамі.
І ўсе людзі з дакорам
Праклён слалі Сцяпану.
Каб аглох ты, аслеп ты,
Ды пабойся ты Бога,
Каб з карчамі, з рагамі
Была тая дарога.

У душы затаіўшы
Увесь свой боль на хвіліну,
Адвярнуўшыся, паклікаў
Сваю жонку Куліну.
Разам з імі праклён
Будзеш слаць, жонка, несці,
Лепш вазьмі ды к абеду
Прынясі мне паесці.
Пакуль бегла да вёскі
Галасіла Куліна.
І зязюля кукавала,
І гудзела даліна.
А Сцяпан мой з валамі
І з дубовай сахою
Мераў поле, араты,
Сваёй шпаркай нагою.
Аб чым думаў араты
Невядома нікому.
Мабыць, лёс праклінаў ён,
Праклінаў сваю долю.

Працаваў ён там шчыра,
Да дзесятага поту,
Толькі Бог свой праклён
Слаў яму за работу.
Згаласіўшыся моцна,
Затаіўшы абіду,
Сэрца шчырае раптам
Зашчаміла ў Куліны.
Узяла ў вузялочык
І пайшла ў даліну,
Па дарозе ішоўшы,
Усе згадала Куліна.
Як чакала Сцяпана,
Як шаноўна любіла.
А цяпер ён няміласць
Заслужыўшы ў Бога,
І дацяміўшы тое –
Ім не быць ля парогу.
І не жыць у сваёй хатцы
І не песціць сыночка,
Бо сягоднщя ў сне ёй
Расказала ўсё ночкай.
А Сцяпан працавіты,
Узараўшы ўсё поле,
Спачываў на ўзлеску,
Марыў лепшую долю.
І шумела бяроза,
І шумела асіна,
І зязюля ў далечы
Усё яшчэ галасіла.
Ты заснуў мо, араты,
І не чуеш нічога?
Бо не быць табе, Сцёпа,
Ля свайго больш парога.
Тут ступіла Куліна
На аратае поле
І давай праклінаці
Сваё шчасце-нядолю:
- Як ты возьмеш гарлачык,
Каб тым захлябнуўся.
Як ты возмеш кавалак,
Каб та ім падавіўся.
Каб твае тут валочкі
Ды каменнымі сталі,
Каб з каменнямі тымі
Скамянееў ты навекі.
Не стрымаўся Сцяпан тут
Ды прыстаў на калені,
Скамянелай душою
Праклён слаўу ён няўмела.
Твае косы, Куліна,
Разліліся б вадою,
Твае словы, жанчына,
Сталі б вечнай сасною.
Зашумела даліна,
Скалыхнулася далля,
Бо праклён быў ад Бога
За аратае поле.
І Куліціны косы
Там "пярэмінай" сталі,
А зазюлі на ўзлеску
Для яе кукавалі.
І Сцяпан нерухома
Там стаіць недалёка.
Скамянелай душою
Ён з валамі навекі.
Хай жа свеціць ім сонца,
А нам добра жывецца,
Бо тое месца і сёння
"Сцёпам-камнем" завецца.
Ну, а там, за дарогай,
Дзе праклён ішоў ад Бога,
Зашумела даліна,
Ёсць "сасна-Акуліна".
Т олькі ў памяці штосьці
З тых часоў засталося.
Мы раскажам нашчадкам,
Як там што адбылося.

За адзін кіламетр на поўдзень ад Краснік бярэ пачатак рака Дзяражына, правы прыток ракі Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 17 кіламетраў і цячэ яна пераважна па забалочаным лесе.

# Кромавічы

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Упершыню вёска Кромавічы ўпамінаецца ў інвентары маёнтка Вілейка за 20 мая 1797 як засценак у складзе гэтага маёнтка, які належаў Віленскаму манастыру візітак. У Кромавічах на той час налічвалася 5 двароў.



Рака Вілія ў Кромавічах

У пачатку ХХ стагоддзя ў вёсцы ўжо налічваецца 101 жыхар. У 1933 годзе тут арганізаваны калгас “На варце”, працавала кузня. У 1971 годзе з Кромавічамі злілася вёска Дзяружкі. Зараз у Кромавічах пражывае каля 75 чалавек.

Што датычыцца забудовы вёскі, то для Кромавіч характэрны працэс, калі з-за ўшчыльнення галоўнай вуліцы магчымасці развіцця валочнай сістэмы вычэрпваліся і пачыналі забудоўваць прыгуменне. Утвараліся вуліцы,паралельныя галоўнай. Яны злучаліся паміж сабой завулкамі і ўзнікала квартальная забудова.



12 лютага 1917 года ў Кромавічах нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Чэрныш Аляксандр Іванавіч. У 1935 годзе ён скончыў Мар’інагорскі сельгастэхнікум, а з 1938 года прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 годзе, савецка-фінскай вайне 1939-40 гадоў. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года на Ленінградскім, Закаўказскім і 1-м Беларускім франтах. Чэрныш вызначыўся пры вызваленні Беларусі 28 чэрвеня 1944 года каля гарадскога пасёлка Кіраўск Магілёўскай вобласці. Рота пад яго камандаваннем атакавала групу праціўніка, які наступаў, знішчыла 170, узяла ў палон 27 гітлераўцаў. На наступны дзень у раёне вёскі Панюшкевічы рота зайшла ў тыл ворага і перарэзала яму шлях да адступлення па дарозе Бабруйск – Мінск, адбіла 14 контратак танкаў і пяхоты, знішчыла 200 і ўзяла ў палон 80 гітлераўцаў. на жаль у гэтым баі Аляксандр Іванавіч Чэрныш загінуў.





Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена пасмяротна 24 сакавіка 1945 года.

У вёсцы Кромавічы на доме, дзе жыў Чэрныш, устаноўлена мемарыяльная дошка.

У Кромавічах нарадзіўся Валерый Іванавіч Шкіранда – дырэктар унітарнага прадпрыемства Мінгарвыканкома “Мінгорсвятло”. Вось што аб ім пішацца ў газеце “Вячэрні Мінск” за 10 верасня 2002 года:



Он, конечно, настоящий технарь. Говоришь с ним о его родной деревне Кромовичи в Витебской области, о речке Вилии, на берегах которой деревенька расположилась, а разговор вдруг плавно перетекает, например, на проблему автоматической синхронизации электродвигателей, обеспечивающих действие единой технологической цепочки. Он тридцать лет проработал в тресте "Белэлектромонтаж", прошел там путь от рядового инженера до заместителя генерального директора, неоднократно лично отвечал за электромонтажные работы на строящихся крупных промышленных объектах. Таких, как Солигорский калийный комбинат или цементный завод в Костюковичах... Словно шахматные задачки, продумывал схемы, позволяющие увязать работу электромонтажников и смежников — строителей, сантехников, штукатуров. И если где–то приходилось сбивать свежую штукатурку, чтобы проложить кабель, переживал, как переживает шахматист при потере фигуры. "Потрясающее ощущение, — вспоминает он сейчас, — нажал кнопку — и завод начал работать!"

Творческое отношение к делу было замечено. В 1995 году Валерия Ивановича Шкирандо назначили директором унитарного предприятия Мингорисполкома "Мингорсвет". Может быть, это и не было повышением в смысле карьерного роста: как–никак — уровень не республики, а города. Но ведь какого города!

Изучив вверенное ему хозяйство, Валерий Иванович призадумался. Лихорадка перестроечных лет не прошла бесследно. Оборудование требовало замены. В некоторых дворах, скверах, на набережных оно бездействовало годами. "Когда механизм не работает, он умирает", — с этим афоризмом директора "Мингорсвета" теперь знакомы многие его коллеги.

Результаты работы Валерия Ивановича видны каждому. Пройдитесь вечером по центральным улицам белорусской столицы. Красиво ведь! Сейчас в кабинет директора "Мингорсвета" часто входят не только специалисты–электротехники, но и художники, архитекторы. Он принимает самое активное участие в формировании эстетического образа столицы. И бывает очень рад, если еще раз убеждается: "Мингорсвету" по силам то, что не могут сделать другие. Например, подсветку Нацбанка сначала разрабатывали проектировщики из Москвы. Их работу директор "Мингорсвета" забраковал: авторы предполагали разукрасить стены здания

целыми гирляндами оборудования. Да и дорого получалось. "Мингорсвет" выполнил работу своими силами: с точки зрения технической — изящно, с экономической — дешево. Директор гордится тем, что специалисты из его проектного отдела могут за неделю решить такую задачу, какую иной проектный институт будет обдумывать полгода.

Конечно, прочитав эти заметки, некоторые минчане спросят: "Подсветка на проспекте Скорины — это хорошо, а вот почему нет света во дворах?" "Доберемся и до каждого двора, — говорил мне директор. — Многое сейчас приходится переделывать. В прежние годы требования к освещенности были ниже, да и оборудование уже устарело. В некоторых местах над электрокабелями высаживались деревья, а в других их посадили под проводами. И вот деревья выросли... Мы производим замену оборудования, стараемся не повторять прежних ошибок. Когда минчане направляют в "Мингорсвет" свои замечания по поводу уличного освещения, реагируем оперативно. Между прочим, замечаний все меньше".

Интересно устроена жизнь. В деревне Кромовичи электричества не было. Уроки Валерий Шкирандо делал при свете керосиновой лампы. Теперь он управляет светом в главном городе страны. Справляется, судя по всему, очень даже неплохо. На днях решением Мингорисполкома директору "Мингорсвета" присвоено почетное звание "Минчанин года".

# *Крыпулі*

*Цэнтр Крыпульскага сельскага Савета*

Пра паходжанне вёскі існуюць дзве легенды. Паводле адной з іх, спадабаліся людзям гэтыя мясціны. Прыгожая была тут прырода, шумелі высокія дрымучыя лясы, ласкава купалася ў сваіх берагах рака Поня. І пачалі людзі тут, у гэтым лесе, на беразе ракі высякаць высокія дрэвы, рубіць зрубы і будаваць хаты. Але хаты ставілі так, як ім хацелася, без усялякага парадку – “крыпанкай”. І таму атрымалася так, што ў вёсцы не было вуліцы. Здавалася, што дамы ў вёсцы “скрыпаліся”. І таму вёсцы далі назву – Крыпулі.

Другая легенда больш рамантычная. У даўнія часы пачалі сяліцца людзі ў вярхоўі прыгожай ракі Поня. У XVI стагоддзі тут былі пабудаваны першыя хаціны. Але ў хуткім часе мірную працу жыхароў, якія сеялі жыта, ячмень, лён, гадавалі жывёлу, хадзілі на ловы, парушыла войска рускага цара Івана Грознага. Жыхары вёскі паспелі ўцячы ў лес, схавацца ад страшэннай навалы.і толькі тры чалавекі не пакінулі свайго дома. І яны былі забіты. З таго часу вёску сталі называць “Трыпулі”. Паступовa, з цягам часу, гэта назва трансфарміравалася ў Крыпулі.

Па дакументальных крыніцах вёска Крыпулі вядома з XIX стагоддзя, калі ўваходзіла ў Параф’янаўскую воласць Вілейскага павета. У той час тут працавала паштовая станцыя. На станцыі тады працаваў пісарам дваццацігадовы Жалязоўскі Юльян Іосіфавіч – дваранін Барысаўскага павета Мінскай губерні, калежскі рэгістратар. За ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў ён быў арыштаваны. Па канфірмацыі М.М. Мураўёва ад 28 жніўня 1863 года вынесена рашэнне аб пазбаўленні дваранскага звання і адпраўцы на ваенную службу радавым у Сібірскі лінейны батальён. 6 верасня 1863 года накіраваны ў Омск. З 1876 года пражываў у Барнауле (Расія).



З 1921 года па 1939 год Крыпулі ўваходзілі ў склад Польшчы. У 1949 годзе тут арганізаваны калгас імя Якуба Коласа. Цэнтрам сельскага Савета Крыпулі сталі 16 ліпеня 1954 года. У 1966 годзе ў цэнтры вёскі пастаўлены помнік на ўшанаванне памяці 34 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Зараз у вёсцы пражывае каля 295 жыхароў.

На паўднёвай ускраіне Крыпуль бярэ пачатак рака Поня – правы прыток ракі Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 45 кіламетраў. Цячэ ў скразной даліне на поўначы Мінскага ўзвышша. Асноўны прыток – рака Варлынка (справа). Даліна ў вярхоўі трапецападобная, шырынёй 1,5-2,5 кіламетра, на астатнім шляху невыразная. Пойма асушаная, парэзаная густой сеткай меліярацыйных

каналаў. Рэчышча каналізаванае, шырынёй ад 6 да 30 метраў. Прымае сцёк з сеткі меліярацыйных каналаў.

Эдуард Зубрыцкі

## Поня

**1**

Непрыкметная рэчка Поня,
На лугах ружовыя коні,
У іх грывах вольны туман,
У вачах – блакітная поўня.
Хочаш не хочаш –
Увядуць у зман
Цыркачы лугавыя – конікі.
Так і слухаў бы іх да дня
Там, дзе сцеліцца цішыня.
Шалясцяць, звіняць снягі,
Я цалую твае берагі.
Твае хвалі цалую, Поня.
П’юць расу ружовыя коні.
І, прысвечаны шчасцем да дна,
Я з табою да золку – дня.
Па кустах чатырох старон
Салаўёў маладых маленства.
Гэты чысты, крыштальны звон –
Звон далёкі майго маленства.
Паўтаруся ж, крыштальны звон,
Мне да скону апошніх дзён.
Непрыкметная рэчка Поня,
Я шчаслівы с табой сягоння...

**2**

Я зноў к табе вярнуся, Поня.
Дапамагу ці не бядзе:
Ані затокі, ані гоні,
Ані лілеі на вадзе.
Тваё насельніцтва звялося.
Русалка – казачка сплыла.
Няма ранейшай весялосці,
Няма ранейшага святла.
На заліўных лугах, бывала ж,
Шумела – паспрабуй стрымай!
Усё наноснае змывала,
Сплаўляла аж за небакрай.
З табою рос я, рэчка Поня,
Бурштыну быў твон звон чысцей.
...Глядзіш самотна, як спакойна
Брод пераходзіць верабей.

# *Курдзекі*

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

Вёска Курдзекі вядома з XIX стагоддзя. У пачатку XX стагоддзя Курдзекі ўваходзілі ў Параф'янаўскую валасць Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 года ўваходзіла ў склад Польшчы. На гэты час у вёсцы налічвалася 238 жыхароў. Зараз тут пражывае каля 95 чалавек.

У 1886 годзе ў Курдзеках нарадзіўся ўдзельнік Лютаўскай І Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года Плюта Ігнацій Барысавіч. Ён скончыў Сітцаўскую царкоўнапрыходскую школу. Працаваў поварам у памешчыцкім маёнтку ў Сітцах. У 1905 годзе паехаў у Пецярбург і ўладкаваўся на працу спачатку рабочым на Пуцілаўскі завод, потым на паркаленабіўную фабрыку. За ўдзел у забастоўках звольнены з працы. У 1908 годзе пераязджае ў Маскву, дзе служыць у царскай арміі і вядзе агітацыю сярод салдат. У 1913 годзе зноў вяртаецца ў Пецярбург і працуе на Трубным заводзе. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі з'яўляўся членам падпольнай бальшавіцкай арганізацыі, старшынёй заўкома Трубнага завода.

У кастрычніку 1917 года з'яўляўся адным з арганізатараў і членам штаба Чырвонай гвардыі Васільеўскага раёна Петраграда. 8-13 лістапада 1917 года ўдзельнічаў у падаўленні антыбальшавіцкага выступлення Керанскага-Краснова.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўляўся дырэктарам Трубнага завода, потым на кіруючай гаспадарчай рабоце. У 1936 годзе быў рэпрэсіраваны, паўгода сядзеў у турме. Памёр у 1969 годзе, пахаваны ў Санкт-Пецярбургу.

У Курдзеках у канцы XIX стагоддзя шырокае распаўсюджванне атрымалі маляваныя дываны. Гэта былі маляваныя на тканіне (паперы, цыраце) вырабы, прызначаныя для ўпрыгожвання інтэр'ера народнага жылля. Маляваныя дываны з'яўляліся адным з відаў народнай размалёўкі. Найбольшага распаўсюджвання маляваныя дываны атрымалі ў 1930-50 гады XX стагоддзя, калі інтэнсіўная адбудова вёскі патрабавала адпаведнага народным густам аздаблення інтэр'ера. Кампазіцыя дываноў звычайна ўяўляе размешчаны ў цэнтры букет кветак у вазе, кошыку ці перавіты стужкай, акаймаваны па краях гірляндай з кветак і лісця або скіраванымі да цэнтра букетамі, рассыпанымі па ўсім полі. Часта ў кампазіцыю ўключаліся выявы птушак – ластавак, галубоў, паваў, зязюль, а таксама ініцыялы аўтараў ці заказчыкаў. У Курдзеках, дзе ўжывалі пераважна клеевыя фарбы, маляваныя дываны вызначаюцца надзвычайнай дэкаратыўнасцю і ўмоўнасцю, гучнымі лакальнымі колерамі без паўтонаў і пераходаў.

# Лапліна

*Вёска ў Парплішчанскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя ў гэтай мясцовасці былі дзве вёскі: Лапліна 1-я (159 жыхароў, 220 дзесяцін зямлі) і Лапліна 2-я (102 жыхары, 117 дзесяцін зямлі). Усе яны ўваходзілі ў Глыбоцкую воласць Дзісенскага павета Віленскай губерні. Пазней вёскі аб'ядналіся ў адну. З 1921 года па 1939 год Лапліна ўваходзіла ў склад Польшчы. На той час тут пражывала 319 жыхароў. Зараз у вёсцы жыве каля 105 чалавек.



8 студзеня 1943 года ў Лапліна нарадзіўся Рацькавіч Іван Дзмітрыевіч. У 1970 годзе скончыў Віцебскі педагагічны інстытут, а ў 1983 годзе Беларускі інстытут фізічнай культуры. Працаваў настаўнікам фізічнага выхавання ў Варганскай і Докшыцкай школах. З 1971 года працуе ў школе-інтэрнаце гарадскога пасёлка Бягомль. У 1993 годзе атрымаў званне заслужаны трэнер Беларусі. Узнагароджаны значкамі "Выдатнік народнай асветы БССР" (1983), "Выдатнік асветы СССР" (1986), Ганаровымі граматамі Міністэрства асветы Рэспублікі Беларусь, медалямі. Пераможца рэспубліканскага конкурсу "Настаўнік года" у 1995 годзе.

# Лапуты

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Яна вядома не менш як з XVII стагоддзя. Гэта вынікае з гістарычных фактаў: “У пачатку ліпеня 1812 года Докшыцы былі заняты французскімі войскамі. Акупанты тут адразу пачалі грабіць насельніцтва. Так, французскія і італьянскія салдаты корпуса Э. Багарнэ, якія праходзілі праз Докшыцы 7 і 9 ліпеня, разрабавалі і спалілі 45 хат, млын і другія пабудовы. І гэта нягледзячы на тое, што Напалеон выдаў загад, які строга караў за марадзёрства. У канцы ліпеня паручнік Фантана на чале 60 салдат накіраваўся ў маёнтак Лапуты, які належаў памешчыку Вінцэнту Блажэвічу. Апошні спадзяваўся, што Напалеон адродзіць Рэч Паспалітую, і таму добраахвотна пастаўляў правіянт французскім салдатам, якія праходзілі каля маёнтка. Нягледзячы на гэта, французы забралі ў Лапутах 40 кароў, коней, пшаніцу, крупы, яйкі, масла, сыры, увесь выпечаны хлеб. Як пісаў 25 ліпеня В. Блажэвіч у скарзе на імя Докшыцкага падкамісара С. Ваньковіча, французы “яравыя пакасілі і патравілі, сенажаць выпалілі. Усё гэта Фантана вывез у Докшыцы на патрэбу французскіх войск”. Як бачна, адносіны французаў да шляхты былі не як да саюзнікаў, а як да пераможаных.

Нашчадак Вінцэнта Блажэвіча – Агафон Блажэвіч удзельнічаў у паўстанні 1863-64 гадоў. за гэта маёнтак быў уключаны ў лік падлеглых канфіскацыі. Але паколькі ў 1856 годзе яго купілі Васілеўскія, то з маёнтка ўзятая ў казну толькі частка ўладання А. Блажэвіча: 210 дзесяцін зямлі і 36 душ абодвух полаў.

З 1921 года па 1939 год Лапуты ўваходзяць у склад Польшчы. На гэты час тут была вёска (46 дамоў і 202 жыхары) і фальварак (5 дамоў, 34 жыхары). У 1930 годзе ў Лапутах арыштаваны польскімі ўладамі мясцовы жыхар Квачонак Міхаіл Герасімавіч і прыгавораны да 6 гадоў турмы. Але пасля вызвалення з турмы ён быў забіты агентамі паліцыі.

У 1950 годзе ў Лапутах арганізавалі калгас імя Куйбышава. Зараз у вёсцы пражывае каля 250 чалавек.

# Лібараўшчына

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Лібараўшчына ўваходзіла ў Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета. З 1921 года па 1939 год была ў складзе Пальшчы. На той час у вёсцы налічвалася 82 жыхары.

Вясной 1944 года на ускрайку Лібараўшчыны акупантамі быў створаны канцлагер. Тут, на абгароджаным у некалькі радоў калючым дротам полі, пад руламі кулямётаў і злым рыканнем аўчарак, пакутавалі пад адкрытым небам, без харчу і вады многія сотні савецкіх людзей з шэрагу раёнаў Віцебскай, Мінскай, Вілейскай абласцей. Больш здаровых заганялі ў таварныя вагоны і адпраўлялі ў Германію, а астатніх фашысту перад сваімі ўцёкамі знішчылі ў бярэзніку паблізу фальварка Ходараўка, за 1,5-2 кіламетры ад вёскі Дзядкі.

У 1949 годзе ў Лібараўшчыне аргінізавалі калгас "8 сакавіка". У 1969 годзе сюды перасяліліся жыхары з хутара Серагова.

Зараз у Лібараўшчыне пражывае каля 30 чалавек.

# Ліпаўкі

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

Вёска Ліпаўкі вядома з XIX стагоддзя. У 1887 годзе тут адчынена перасоўная школа. Выкладаннем у школе займаўся селянін Андрэй Ф. Брылёнак, які скончыў курс народнага вучылішча. Яго ўзнагарода складала 15 рублёў пры гатовым стале. Вучылася ў школе 13 хлопчыкаў (1890-91 навучальны год).

Летам 1905 года ў Ліпаўкі вярнуліся з гарадоў браты Якаў Піліпавіч і Фёдар Піліпавіч Крупскія, Іван Аляксеевіч і Якім Аляксеевіч Таляронкі. Яны былі першымі буравеснікамі рэвалюцыйныхператварэнняў у навакольных вёсках, заклікалі іх жыхароў да барацьбы за лепшую долю, будучыню, жыццё без цароў і паноў. А зімой 1905-06 гадоў сяляне вёскі Ліпаўкі рашуча выступілі супраць прыгнятальнікаў. Яны не выконвалі натуральных павіннасцей, спынялі выплату падацей. А летам 1906 года пачаліся масавыя захопы памешчыцкіх зямель. Пры гэтым часта адбываліся сутычкі з паліцыяй. Сяляне з Ліпавак і яшчэ з некалькі вёсак у чэрвені 1906 года захапілі некалькі ўчасткаў зямлі ў маёнтку Замошша, аб'явіўшы іх сваёй уласнасцю. Прыбыўшая з Докшыц паліцыя застала на полі вялікі натоўп сялян, якія адмаўляліся вярнуць зямлю памешчыку. Спраўнік аддаў загад паліцыі адцясніць сялян з поля. Але сяляне, узброіўшыся каламі і палкамі, аказалі паліцэйскім энергічны адпор.

У 1894 годзе ў Ліпаўках нарадзіўся Талярэнка Іван Васільевіч. У 1918-19 гадах служыў у Чырвонай Арміі. З 1920 года член РКП (б). з 1923 года па 1938 год працаваў оперупаўнаважаным НКУС на буйных чыгуначных вузлах СССР. У час Вялікай Айчыннай вайны працуе на адказных пасадах ва ўпраўленні Кіраўскай чыгункі ў Карэльскай АССР. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, трыма медалямі. Памёр 18 красавіка 1972 года.

# Ліпск

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Вёска Ліпск вядома з XVIII стагоддзя як маёнтак у складзе Рэчы Паспалітай. Першым уладаром быў Пац. З 1793 года вёска ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі. У 1879 годзе ў Ліпску дзейнічала царква, прыпісаная да Бярэзінскага праваслаўнага прыхода. У 1886 годзе Ліпск упамінаецца як сядзіба, у якой быў малітоўны дом. Меўся таксама вадзяны млын. На 1887 год яго вытворчасць (колькасць пудоў зерня, што перамолвалася на муку за месяц) дасягала 3000 пудоў.



**Падмуркі панскай сядзібы**

У пачатку XX стагоддзя ў Ліпску налічвалася 483 жыхары. У 1922 годзе адчынена пачатковая школа, у якой адным з першых настаўнікаў працавала Любоў Белавус, у 1925 годзе яна вучыла 60 дзяцей. У пачатку 1930-х гадоў тут быў арганізаваны калгас “Усход”, працавала кузня.



У 1973 годзе ў Ліпску пастаўлены абеліск на ўшанаванне памяці 24 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Зараз у вёсцы пражывае каля 55 чалавек.

За тры кіламетры на ўсход ад вёскі, на правым беразе ракі Бярэзіна, ва ўрочышчы Масцішча (Масціца) знаходзіцца курганны могільнік. Ён складаецца з 25 насыпаў вышынёй да 2,5 метраў і дыяметрам ад 4 да 10 метраў. Насыпы ў 2-3 рады цягнуцца ўздоўж дарогі на Ліпск. У большасці курганоў уздоўж асновы ёсць неглыбокія раўкі. Насыпы задзернаваны і пакрыты рэдкім хваёвым лесам. Упершыню курганны могільнік выявіў у канцы XIX стагоддзя Ф. Вярэнька. І толькі ў 1989 годзе адзін курган раскапала Л.У. Дучыц. Яна выявіла рэшткі пахавання па абраду трупаспалення. Адносіцца да IX-X стагоддзяў.

Таксама каля Ліпска знаходзіцца могільнік (магілы-жальнікі) позняга сярэдневякоўя (XVI-XVIII ст.)

Паблізу Ліпска, у лесе, ёсць калодзеж у драўляным зрубе. Калісьці побач была капліца з распяццем. На Яблычны Спас тут збіраліся вернікі, адбывалася набажэнствы. Лічылася, што менавіта ў гэты дзень вада з калодзежа валодае незвычайнай цудадзейнай сілай і дапамагае ад многіх хвароб.



Вуліца Ліпска

Каля Ліпска захаваўся другі ў раёне камень-следавік (яшчэ адзін знаходзіцца ў Камайску). Па паверʼю след пакінула Найсвентша Панна. Падобныя камяні-следавікі распаўсюджаны амаль ва ўсім свеце. Ім пакланяліся яшчэ старажытныя егіпцяне, грэкі і рымляне. Вучоныя лічаць, што такая зʼява – гэта праява культу Сонца, якое ідзе па светастварэнні, прыносіць святло і ўрадлівасць. У часы хрысціянства гэты культ замянілі паданнямі пра сляды Божай Маці і розных святых.

За адзін кіламетр на захад ад Ліпска за могілкамі пад бярозай ляжыць невялікі валун, на якім высечана схематычная выява ваяра ці анёла. Вяскоўцы называюць яго Камень з малюнкам, але паданняў пра ябставіны зʼяўлення гэтага малюнка, на жаль, не захавалася.

У 1899 годзе ў Ліпску нарадзіўся Апенка Іван Сяргеевіч. З 1919 года служыў у Чырвонай Арміі, удзельнік баёў з арміямі Юдзеніча, быў паранены. Працаваў старшынёй калгаса, старшынёй сельскага Савета, на іншых пасадах. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.



10 лютага 1950 года ў Ліпску нарадзіўся Беларускі вучоны ў галіне геахіміі і геалогіі Аўтушка Аўтушка Міхаіл Іванавіч. Пасля заканчэння ў 1973 годзе Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта працаваў у ім дырэктарам геалагічнага музея, загадчыкам галіновай навукова-даследчай лабараторыі “Мінеральна-сыравінныя рэсурсы Беларусі”, дацэнтам кафедры мінералогіі, петраграфіі і геалогіі. З 1984 года кандыдат геолага-мінералагічных навук. У 1990-97 гадах працуе старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі, Навукова-даследчага інстытута радыялогіі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. З 1997 года загадчык лабараторыі біягеахіміі тэхнагенных радыёнуклідаў Рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства “Інстытут радыялогіі”. Асноўныя накірункі даследаванняў – геахімія і карысныя выкапні крышталічнага фундамента Беларусі, заканамернасці міграцыі радона ў паверхневых грунтах, біягеахімія тэхнагенных радыёнуклідаў, радыёэкалогія. Аўтар навуковых артыкулаў.



15 сакавіка 1944 года ў Ліпску нарадзіўся Прыднік Іван Васільевіч – беларускі сацыёлаг. У 1965 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. Працаваў настаўнікам нямецкай і англійскай моў у Вялікалятчанскай школе-інтэрнаце (Віцебскі раён), Бярэзінскай сярэдняй

школе. З 1970 года малодшы, з 1972 года старшы, а з 1994 года вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі. З 1971 года кандыдат філасофскіх навук. Даследаваў працэсы сацыяльна-культурнага і эканамічнага развіцця вёскі, сельскагаспадарчай інтэграцыі ў Заходняй Еўропе, праблемы, фактары і ўмовы стабілізацыі беларускага грамадства на пачатках сацыяльнай справядлівасці і інш. Аўтар манаграфіі “Сацыяльнае становішча сялянства ФРГ” (1973), раздзелаў у калектыўных працах “Рабочы клас у структуры сельскага насельніцтва” (1975), “Сацыяльныя змены ў сучасным сяле” (1978), “Міжгаспадарчае кааператаванне і сацыяльныя змены ў вёсцы” (1980) і інш. Памёр 12 красавіка 1997 года.

З поўдня вёску акаймляе ручай Канчанка, правы прыток ракі Гулянка (басейн Дняпра). А рака Гулянка акаймляе Ліпск з поўначы. Даўжыня ручая складае 2 кіламетры. Рэчышча на працягу трохсот метраў ад вытоку каналізаванае.

**Турысты на рацэ Гулянка...**



**... і на рацэ Канчанка**



# Літоўцы

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

З 1921 года па 1939 год Літоўцы ўваходзілі ў склад Польшчы. У той час тут пражывала 354 чалавекі. У 1949 годзе арганізаваны калгас імя Жданава. Зараз у Літоўцах пражывае каля 215 чалавек.

Каля вёскі Літоуцы, ў старым дрымучым лесе ляжыць агромністы камень з невялікімі ямачкамі-выбоінамі. Называюць гэты камень Чортавым. Чаму ж яго так назвалі?

Раней, казалі старыя людзі, у гэтым лесе вадзілася нячыстая сіла. Днем яе ні было ні слуху, ні духу. Можна было хадзіць у грыбы, у ягады. Але калі ты трапіш сюды пасля заходу сонца, што тут пачынае тварьщца! Стукат ... Лязгат ... Крыкі ...

І вось аднойчы адзін чалавек пайшоў у лес і заблудзіўся.

Раптам недзе зусім блізка чуе, як быццам нехта ляпае жалезам аб камень.

Пайшоў ён на лязгат. Наблізіўся і аж абамлеў. Сядзіць каля каменя купка нячысцікаў. А ў цэнтры іх, напэўна, самы галоўны, узабраўся наверх, крычыць, камандуе. Астатнія ж, пастаўшы каля каменя, паслухмяна насыпаюць боб у ямачкі і малоцяць, а потым ссыпаюць у кацёл.

Чалавек збялеў і так затросся з перапуду, што чэрці заўважылі яго, спалохаліся, схапілі кацёл і наўцёк. Больш яны тут не паяўляліся.

А гэты камень так і ляжыць. Ён ужо стары, аброс мохам, але выразна відаць тыя ямачкі-выбоіны.

# Лусцічы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Лусцічы ўваходзілі ў Асаўскую воласць Барысаўскага павета. Тады тут пражывала 260 чалавек.

У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 14 жыхароў. Зараз тут пражывае каля 35 чалавек.

У 1902 годзе ў Лусцічах нарадзіўся Шыла Карней Данілавіч. У Вялікую Айчынную вайну на фронце, служыў у 227-й стралковай дывізіі. Удзельнік вызвалення Докшыцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасля вайны працаваў лесніком ў Замастоцкім лясніцтве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр ў 1967 годзе.

Найвышэйшы пункт Докшыцкага раёну знаходзіцца каля вёскі Лусцічы (264,4 метры над узроўнем мора).

# Маладзеева

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Вось што гаворыцца пра гэту вёску на сайце http://www.molodeevo.by

“Согласно топонимического словаря Жуткевича название деревни происходит от фамилии помещика Молодеев или Молодов.

Согласно выписи купчей крепости от 30 апреля 1700 года, Карл-Богуслав Полубинский (Polubinski) купил вотчинное владение от супругов Антона и Кристины Стабровских имение Старосёлы с деревнями Сохоповка (Safonowka) и Молодеево - это самое старое упоминание деревни Молодеево (Старосёлы и Сафоновка на неметской карте 1940 года ). Согласно выписи вводного акта от 9 февраля 1714 года учинённая и сознанная 13 февраля того же года, Антон Полубинский введён в вотчинное владение имением Старосёлы с крестьянами в д. Сохоповке и Молодеево, доставшееся ему в наследство от его отца Карла-Богуслава Полубинского. Выпись из реформационного документа выданного 3 марта 1715 года, явленного 27 октября 1799 года в книгах земских Борисовского уезда, по которому Антон Полубинский на означенном вотчинном своём имении Старосёлы обеспечил приданное своей жены Рахели, урождённой Головнянки. Выпись конфирмационного решения суда последовавшего 14 февраля 1721 года по делу женитьбы Рахели Полубинской с Матвеем Талсевичем, относительно бывшего в её владении имения Староселы с крестьянами. Выпись из продажной сделки, последовавшей 17 декабря 1792 года и признанной в книгах земских Докшицкого уезда 8 февраля 1797 года, по которой Фома, Илларион и Устин Полубинские продали своё вотчинное имение с деревней Сохоповка и Молодеево (с крестьянами) Станиславу Певцевичу. В 1793 году в Молодеево проживало 9 семей.

С конца 18 века известна как деревня в составе усадьбы Молодеево, которая принадлежала панам Новамейским. Новамейский Александр Игнаьевич крупный землевладелец из Витунич, имел 3039 десятин земли, водяную мельницу и корчму.

В начале 19 века деревня принадлежала Иосифу Григорьевичу Желязовскому/Желяховскому (Zełazowski), дворянин, католик. Получил он ее в наследство по духовному завещанию от 30.08.1828г. В 1845 году в документах упоминается про нападение на фольварок Молодеево. В 1851-1852 годах имение Молодеево фигурировало в деле о подтверждении дворянского происхождения рода Железовских. В 1863-1875 годах в суде рассматривалось дело о споре между И.Узловской и помещиком И.Железовским о праве вледния наследством после смерти С.Желязовского. 7 июля 1883 года И.И. Желязовский был утверждён решением суда в качестве помещика в фольварке Молодеево и 9 августа 1883 года был введён

во владение фольварком. В конце 19 века усадьба панов Железовских упоминается в “Słownik geograficzny krolestwa polskiego” (Warszawa, 1880).

В документах минской губерни Молодеево записано за Желяховским Иозефатом Иосифовичем - поместье составляло 370 десятин земли и насчитывалось 16 дворов. В усадьбе числились 18 подданых мужского пола. В 1890 году Железовский построил новый панский дом на каменном фундаменте из огромных валунов. Архитектура дома была типичной для того врмени: он напоминал традиционный сельский дом на 2 половины (дом-сени-дом) с крыльцом на столбах и крышей из дранки. Интересно, что все дома в деревнях обычно располагались перпендикулярно улице, а панские дома строились параллельно ей. Добротный дом из больших смоялков стоит уже 120 лет.



Панский дом стоит на пригорке, на въезде в деревню под огромным старым вязом. Сама деревня находиться чуть дальше, на расстоянии 200 метров за ручьём. Летом 1944 года во время карательной операции “Котбус” неметская авиабомба попала в одну из половин дома, но дом выстоял, большой панский вяз мешал неметским лётчикам точно сбросить бомбу. Сейчас дом находится на стадии ремонта.



Сохранились в деревне панские вязы - огромные деревья, которые Железовский специально привёз издалека. На польских и неметских военных топографических картах 1930х годов ручей, протекающий через деревню именуется как Щедрец, но уж ена кртах 1970-х годов он носит название Зазунтова. В 1980х годах ручей запрудили и в конце деревни образовалось озеро, просуществовавшее до весны 2010 года. В результате сильного паводка дамбу размыло и озеро исчезло едва не смыв всю деревню.

В начале 20 века в Молодеево насчитывалось 16 дворов, 22 жителя. На 1 сентября 1924 года в ведомостях "о составе сельсоветов бегомльского района" за селом Молодеево числиться 16 дворов и 73 жителя, и отдельно значится "Имение Молодеево - 3 двора, 15 жителей". В 1933 году работала кузница. на 1.1.2004 - 16 дворов, 25 жителей”.



У 1933 годзе тут былі арганізаваны калгасы “Чырвоная іскра”, “Чырвоны касар”, Чырвоны ўдарнік”. Працавала кузня. Зараз у вёсцы пражывае каля 25 чалавек.

У 1905 годзе ў Маладзеева нарадзілася Гурыновіч Марыя Афанасьеўна. У 1925 годзе разам з братамі Пятром і Тумашом удзельнічала ў арганізацыі першай на Бягомльшчыне (умежах раёна да 1927 года) камуны "Чырвоны касар" у былым маёнтку Яцаўшчына. У 1929 годзе, пасля далучэння да камуны сялян з суседніх вёсак камуна была пераўтворана ў аднайменны калгас. Марыя Гурыновіч была абрана намеснікам старшыні калгаса (старшынёй камуны і першым старшынёй калгаса быў яе муж – Франц Гурыновіч), а потым (пасля пераходу мужа на партыйную работу), у 1930-35 гады ўзначальвала калгас. У 1935-41 гадах узначальвала калгас "Ленінскі шлях" у вёсцы Чысці Мільчанскія. У студзені 1935 года на 11-м з'ездзе Саветаў БССР была абрана членам ЦВК БССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельніца Бягомльскага падполля, партызанская сувязная. Пасля вызвалення Бягомльшчыны ад акупантаў у 1944 годзе зноў узначаліла калгас "Чырвоны касар". З 1949 года працавала ў калгасе "Іскра камунізму" у вёсцы Чысці Вардамскія. Пасля выхаду ў 1954 годзе на пенсію жыла ў вёсцы Маладзеева, з 1957 года з'яўлялася персанальным пенсіянерам рэспубліканскага значэння. Узнагароджана медалём "Партызану Айчыннай вайны" 1-й ступені, 5 іншымі медалямі.

Каля Маладзеева бярэ пачатак рака Зазунтава, правы прыток ракі Поня (басейн Дняпра). Даўжыня Зазунтава 5,7 кіламетра. Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае.

# Малажане

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

Па народнаму павер'ю назва паселішча ідзе з даўніны, калі тут жыло многа хлопцаў, а дзяўчат было мала. Дык са слоў "мала жон" і пайшла назва – Малажане.

У 1890 годзе ў вёсцы адчынена перасоўная школа. Навучанне ў школе праводзіў селянін Адам Раманавіч Таляронак, які скончыў курс народнага вучылішча. Узнагародай для яго было 15 рублёў за зіму і прыгатаваны стол. У першы навучальны год у школе было 16 хлопчыкаў.

З 1921 года па 1939 год Малажане ўваходзілі ў склад Польшчы. На той момант у вёсцы пражывала 278 жыхароў. У 1935 годзе ў вёсцы ўзнікла падпольная ячэйка Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі. У ёй спачатку было пяць членаў. Стваралася камсамольская ячэйка пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, якая ўжо існавала ў вёсцы. Камсамольцы распаўсюджвалі сярод насельніцтва нелегальную літаратуру, лістоўкі і адозвы, вывешвалі флагі і транспаранты. Забеспячэнне агітацыйнай літаратурай было наладжана па прынцыпу канвеера: малажанскія камсамольцы прымалі яе ад дзедзінскіх, сценскіх ці таргуноўскіх, распаўсюджвалі па наваколлі і затым перадавалі лішак у Ліпаўку, Слабаду, Порплішча і г.д. Перадачы ішлі нават у Глыбокае і Мядзель.

У 1936 годзе стала вядома, што Васіль Іванавіч Піскуновіч з Малажань, які нібыта спачуваў партарганізацыі, аказаўся агентам пастарунка паліцыі станцыі Крулеўшчына і выдаў некаторых членаў арганізацыі. Астатнія патрыёты ўцалелі толькі таму, што здраднік не ведаў усіх членаў арганізацыі. Арыштаваных падверглі катаванням, і яны былі асуджаны на розныя тэрміны зняволення. Пад арыштам і на судзе ўсе яны трымаліся годна, нікога з паплечнікаў-таварышаў не выдалі. Такім чынам падполле ў Малажанях засталося. Цудам пазбег арышту З.І. Піскуновіч. Працаваў ён кавалём. Хадзіў заўсёды ў запэцканай рабочай вопратцы. Здраднік і не мог падумаць, што такі "мурза" можа кіраваць падпольшчыкамі. А на самай справе каваль быў паважаным чалавекам на вёсцы, дапамагаў кожнаму, хто папросіць. Можа хто з суседзяў і мелі падазрэнне пра яго прыналежнасць да падполля, але маўчалі з павагі да каваля.

У верасні 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 30 двароў і загубілі 11 жыхароў.

Побач з Малажанамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся ваенны аэрадром, на якім базіраваўся 132 авіяполк. Менавіта ў гэтым авіяпалку служыў Герой Савецкага Саюза Іван Сцяпанавіч Палявы. Ён нарадзіўся ў 1907 годзе ў сяле Новамікалаеўка Наватроіцкага раёна Херсонскай вобласці (Украіна). З 1929 года служыў у Чырвонай Арміі. У 1933 годзе скончыў Ейскую ваенную школу пілотаў. З 1941 года ваяваў на



Паўднёвым Калінінскім, Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, 3-м Беларускім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Здзейсніў 125 баявых вылетаў вядучым звяна, авіяэскадрыллі, палка на дальнюю стратэгічную разведку, бамбардзіроўку войск праціўніка. Але 20 жніўня 1944 года адбыўся яго апошні палёт. Лётчык маёр Іван Сцяпанавіч Палявы, штурман Васіль Мікітавіч Ніцай і паветраны стралок-радыст старшы сяржант С.А. Шумкоў – загінулі. У гэты дзень з Малажанскага аэрадрома яны паляцелі ў Прыбалтыку бамбіць матэрыяльныя базы ворага на буйным чыгуначным вузле горада Мажэйкяй. Адбамбіліся, здавалася, удала. Уся станцыя была ў агні пажараў і ўзрываў. Але варожая зенітная артылерыя таксама вяла агонь па нашых “Ту-2”. Самалёт Палявога быў падбіты, ішоў на адным маторы. Да аэрадрома Палявы яго ўсё ж давёў, ды ў час пасадкі “Ту-2” рэзка пайшоў уніз і ўрэзаўся ў зямлю. Выратаваць экіпаж было немагчыма.

Інжынер па ўзбраенню 132 авіяпалка, ваенны таварыш Палявога І.М. Кубараў прысвяціў яму такія радкі:

Он был и строг, и справедлив,
Его любили мы, как брата.
Он это знал и сам любил
И офицера, и солдата.
Он жизнь любил и жить хотел,
Он был во всех делах примером.
В бою был храбр, отважен, смел –
Был настоящим офицером.
Неутомим, неустрашим –
Шутил, когда все с ног валились
Он был победой одержим,
Геройству все его дивились…

Экіпаж самалёта “Ту-2” пахаваны ў вёсцы Малажане. На магіле ўстаноўлены помнік.

У 1949 годзе ў Малажанах арганізавалі калгас “Чырвоны “Малажанін”. Зараз у вёсцы пражывае каля 40 чалавек.

На паўднёвай ускраіне Малажан бярэ пачатак Малажанскі меліярацыйны канал (левы прыток ракі Беразіна, басейн Дняпра). Даўжыня канала 5,1 кіламетра.

# Маргавіца

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Патрыятычны верш

Я стаю ля Японскага мора,
Пазіраю ў туманную даль.
Прада мной у трывожных прасторах
Грывы цяжкіх, засмучаных хваль.
Хвалі, хвалі! Куды вас так гоніць?
Хто прыдаў вам такую тугу?
Я пакінуць бацькоўскія гоні
Нізашто і ніяк не магу.
    Што мне тыя заморскія пляжы
    І трапічных лясоў буралом!
Майму сэрцу за ўсё болей скажа
Куст вішнёвы пад родным акном.
Ён заўсёды мне мроіцца-сніцца…
І паўсюдна ў далёкіх краях
Неразлучна са мной Маргавіца,
Беларуская вёска мая.

*Алесь Ставер*



Галоўная вуліца

Маргавіца ўпершыню ўпамінаецца ў 1879 годзе ў царкоўных дакументах пры пераліку населеных пунктаў Бягомльскага прыхода Бягомльскай воласці Барысаўскага павета. У 1933 годзе ў вёсцы створаны калгас “Вольнае жыццё”, працавала кузня. У ліпені 1939 года ў сутычцы з польскімі памежнікамі загінулі два савецкія пагранічніка – Перавяслаў і Чагір. Яны пахаваны на мясцовых могілках. У 1979 годзе на іх магілах устаноўлены стэлы.

У цэлым мясцовыя могілкі ведаюць шмат трагічных старонак ваеннага ліхалецця. Яны сталі апошнім прытулкам для многіх жыхароў навакольных вёсак і самога Бягомля. Тут знаходзіцца Брацкая магіла, у якой пахаваны 3 партызаны, якія загінулі ў чэрвені 1943 года ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1979 годзе ў памяць аб іх на магіле пастаўлена стэла.

Таксама тут знаходзяцца і дзве магілы ахвяр фашызму. У адной пахаваны каля 70 мірных жыхароў, якіх 31 мая 1943 года ў час карнай аперацыі “Коттбус” гітлераўцы спалілі жывымі ў Бягомлі ў хаце К.Д. Герасіменкі (вул. Ленінская). Сярод іх былі сяляне з вёскі Бабцы. У 1955 годзе на магіле пастаўлены абеліск.

У другой пахавана больш за 300 жыхароў Бягомля, якіх 30 мая 1943 года знішчылі гітлераўцы. У 1965 годзе на магіле таксама быў устаноўлены абеліск.

Ёсць і дзве індывідуальныя магілы. У адной пахаваны Таракан Уладзімір Васільевіч. Пра яго подзвіг падрабязна гаворыцца ў раздзеле “Будачы”. У другой пахаваны член Бягомльскай падпольнай партыйна-

камсамольскай арганізацыі ў Вялікую Айчынную вайну Фёдар Аўксенцьевіч Буланда. Ён нарадзіўся ў вёсцы Гарэлы Луг Іканскага сельскага Савета Барысаўскага раёна ў сялянскай сям'і. член КПСС з 1937 года. Удзельнік савецка-фінскай вайны 1939-40 гадоў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Да Вялікай Айчыннай вайны працаваў загадчыкам сталовай у Бягомлі. У час вайны падтрымліваў сувязь з партызанамі атрада "Барацьба". Пры дапамозе Буланды ў маі 1942 года партызаны знішчылі прадуктовы і прамтаварны склады гітлераўцаў. у чэрвені 1942 года арыштаваны і расстраляны нямецка-фашысцкімі акупантамі.

У маі 1943 года гітлераўцы спалілі вёску Маргавіца. Да вайны тут пражываў 271 чалавек. Зараз у Маргавіцы налічваецца каля 95 жыхароў.

Маргавіца з'явілася калыскай для многіх знакамітых у Беларусі людзей. Адзін з іх – Алесь Ставер (псеўданім Алесь Зарачанскі). Ён нарадзіўся 10 жніўня 1929 года. Бацька Сяргей Макаравіч і маці Хрысціна Пятроўна працавалі ў калгасе. Да Вялікай Айчыннай вайны А.Ставер скончыў 5 класаў Бягомльскай сярэдняй школы. У час вайны разам з бацькамі жыў у партызанскай зоне. Вясной 1944 года ў час блакады згубіў бацьку і братоў. Калі трапіў да немцаў, быў вывезены ў канцлагер у Германію. У верасні 1945 года вярнуўся дадому і працягваў вучыцца ў школе. Маці Хрысціна Пятроўна да вайны была дэпутатам сельскага Савета і бачыла «вучоных» дзяцей, таму вельмі хацела, каб хоць адзін з трох сыноў таксама атрымаў адукацыю. Пасля заканчэння Бягомльскай сямігодкі А.Ставер вырашыў стаць шафёрам, але маці ўгаварыла яго вучыцца далей, і ён паступіў у Мінскае педвучылішча. Час быў нялёгкі. Транспарт да Бягомля не хадзіў, а з Барысава можна было з'ездзіць дадому па харчы на паштовай машыне, таму Ставер перавёўся ў Барысаўскае педвучылішча, якое скончыў у 1949 годзе. У 1949-50 гадах быў старшым піянерважатым і адначасова выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Бягомльскай сярэдняй школе. У 1950 годзе паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Да гэтага часу ён ужо пісаў вершы, таму быў перакананы ў неабходнасці далейшай вучобы. Пасля заканчэння інстытута працаваў інспектарам школ Лагойскага рана (1954 - 55), быў літаратурным супрацоўнікам газеты «Калгасная праўда», літаратурным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1955 - 56), загадваў літаратурнай часткай Белдзяржфілармоніі (1956-61). З 1961 года малодшы навуковы супрацоунік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1975-84 гадах А.Ставер карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды Саюза беларускіх пісьменнікаў. З 1984 года знаходзіўся на творчай рабоце. Ён часта выступаў на прадпрыемствах і ў школах рэспублікі, а таксама за яе межамі, асабліва ў вайсковых часцях, меў шмат падзяк і



грамат ад камандавання вайсковых часцей. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1962).



**Хата, дзе нарадзіўся А. Ставер**

А.Ставер пачаў пісаць вершы, калі быў студэнтам Мінскага педвучылішча. Да першых яго спроб прыхільна аднесліся выкладчык літаратуры педвучылішча Я.Замерфельд, паэты А.Русецкі і П.Панчанка. Першы яго верш апублікаваны ў 1949 годзе ў барысаўскай раённай газеце «Бальшавіцкая трыбуна», а ў 1959 годзе выйшаў з друку першы зборнік яго вершаў «Золак над Бярозай». А.Ставер аўтар паэтычных зборнікаў «Ластаўкі перад дажджом» (1967), «Жураўлі ляцяць ... » (1972), «Лірнік» (1975), «Жнівеньскі вырай» (1979), «Зоры зямныя» (1989). Пісаў таксама для дзяцей (зборнікі «Касцёр не гасне», 1961; «Пад вясёлкавай дугой», 1984). Асноўныя тэмы творчасці А.Ставера – любоў да роднай зямлі, працоўныя будні і святы вяскоўцаў, гераічнае мінулае беларускага народа, маладосць і каханне. Яго паэзіі ўласцівы блізкая да фальклору вобразнасць, гутарковая інтанацыя, напеўнасць, што прыцягвае ўвагу кампазітараў. Многія вершы паэта пакладзены на музыку і сталі вядомымі, папулярнымі песнямі: «Колас, ты мой колас» (музыка М. Чуркіна), «Вячэрні вальс» (музыка Г.Вагнера), «Дзе ты, маё шчасце? » (музыка Р.Бутвілоўскага), «Канікулы», «Яркі месяц», «Песня пра Якуба Коласа» (музыка І. Кузняцова), «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Песня пра раку Бярозу», «Дзіянка» (музыка І.Лучанка), «Нікагусенькі няма» , «Касіў хлопец канюшыну» (музыка М.Пятрэнкі), «А мне ў шчасце верыцца», «Юная бярозка» (музыка Ю.Семянякі), «Беларусачка» (музыка Ю.Семянякі і А.Хлімановіча) і шмат іншых. У 1983 годзе выдадзены зборнік песень «Мой край беларускі».

Аб перажытым у гады вайны А. Ставер расказаў у рамане «Пад канвоем» (1969). Ён выдаў дзве кнігі аб партызанскай барацьбе «Да сваіх» (1974) і «Лясныя аповесці» (1986). Напісаў лірычную камедыю «Алімпіяда Салодкая» і п'есу «Слова – не верабей» (абедзве пастаўлены ў 1977). Вершы А.Ставера перакладзены на многія мовы народаў былога СССР, а таксама на балгарскую і польскую.

Загінуў у аўтакатастрофе 23 ліпеня 1995 г. Пахаваны ў Мінску.

У Маргавіцы 6 мая 1938 года нарадзіўся Юрась Свірка (Юрый Мікалаевіч, псеўданімы Банадысь Кастрыца, Гарчыца) – беларускі паэт. Бацька Мікалай Іванавіч удзельнік грамадзянскай вайны. Маці Акуліна Пятроўна ведала шмат казак, баек, любіла спяваць беларускія народныя песні. У 1953 годзе Ю.Свірка скончыў Бягомльскую сярэднюю школу, У 1959 годзе аддзяленне журналістыкі БДУ. Некалькі месяцаў працаваў стылістам у часопісе «Камуніст Беларусі». У 1959-61 гадах літаратурны

супрацоўнік рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», з 1961 года – старшы рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. З 1975 года загадчык аддзела прозы і паэзіі газеты «Літаратура і мастацтва». Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1961). Узнагароджаны медалём, Ганаровай граматай і граматамі Вярхоўных Саветаў БССР і Літоўскай ССР. Літаратурная прэмія імя А.Куляшова (1993, за зборнік паэзіі «Узаемнасць»).





Хата, дзе нарадзіўся Ю. Свірка

Першы верш Ю.Свіркі «Новы крок» надрукаваны ў газеце «Піянер Беларусі» (1952). Першы зборнік вершаў «Шэпчуцца ліўні» (1959) шырока абмяркоўваўся ў крытыцы разам з першымі кнігамі маладых паэтаў. Аўтар паэтычных зборнікаў «Вечнасць» (1963), «Баравіна» (1967), «Крэўнасць» (1971), «Аутограф» (1974), «Люблю і веру» (1975), «Памятная вярста» (1978), «Біяграфія памяці» (1981), «Ядранасць» (1983), «Паўшар'е блакіту» (1986), «Шлях да сябе». Малюнкі прыроды, жыццё і праца людзей, гераічныя і мужныя старонкі барацьбы з ворагам у перыяд Вялікай Айчыннай вайны складаюць змест паэтычных кніг Ю.Свіркі. Уласнымі вачыма ў гады вайны бачыў ён за калючай агароджай лагера для ваеннапалонных галодных і змучаных вязняў. Усё гэта пакінула след, абвастрыла асабістае перажыванне. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А.Пушкіна, М.Лермантава, А.Фета, Ф.Цютчава, Б.Пастарнака, С.Ясеніна, А.Твардоўскага, М.Ціханава, М.Браўна, Я.Смелякова, М.Луконіна, М.Дудзіна, А.Жыгуліна, вершы украінскіх, літоўскіх, малдаўскіх, грузінскіх, азербайджанскіх, армянскіх, узбекскіх, татарскіх, асецінскіх, чувашскіх паэтаў. Многія яго творы перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, грузінскую, таджыкскую, польскую, англійскую мовы. Песні на яго вершы напісалі М.Аладаў, Э.Зарыцкі, В.Кандрасюк, М.Наско, Ю.Семяняка і інш.



У 1940 годзе ў Маргавіцы нарадзіўся Пусташыла Уладзімір Міхайлавіч. У 1956 годзе ён скончыў Бягомльскую СШ і паступіў у Беларускі палітэхнічны інстытут. У 1958 годзе ў складзе студэнцкага атрада ўдзельнічаў ва ўборцы ўраджаю на цаліне (Казахстан). Загінуў пры ахове збожжа ад бандытаў. Узнагароджаны медалём “За асваенне цалінных зямель”.

А ў 1895 годзе ў Маргавіцы нарадзіўся Свірко Віктар Харытонавіч. У 1-ю сусветную вайну ваяваў на германскім фронце.

Узнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі 3 і 4-й ступеней. Удзельнік грамадзянскай вайны. Гэта адзін з двух жыхароў нашага раёна, які ятрымаў такую высокую ўзнагароду ў дарэвалюцыйнай гісторыі нашай краіны.

Багата археалагічная спадчына Маргавіц. Па аповеду Ксеніі Паўлаўны Ставер (1912 г.н.) – раней у Маргавіцы пражывала шмат татараў. Нам, малым, было вельмі цікава глядзець на іх абрад пахавання. Нябожчыка



апраналі ва ўсё белае, садзілі ў яму, абстаўлялі дошкамі, а потым засыпалі зямлёй і зверху ставілі камень з надпісам.

На тэрыторыі Маргавіцы знаходзіцца помнік археалогіі "Курганы". Па словах мясцовых жыхароў, курганы гэтыя захаваліся з часоў вайны з Напалеонам у 1812 годзе. Іх называлі валатоўкамі. Ёсць меркаванне, што Напалеон, перапраўляючыся праз Бярэзіну, схаваў недзе ў ваколіцах Маргавіцы вялікі скарб, але доказаў гэтаму няма да цяперашняга часу.

Згодна навуковым даследаванням, за 400 метраў на поўнач ад вёскі ва ўрочышчы Ляхаўка знаходзіцца курганны могільнік, які складаецца з 13 курганоў. З іх 9 насыпаў дыяметрам 8-10 метраў і вышынёй 2-3,5 метры. Адзін курган 16 метраў у дыяметры і вышынёй 5 метраў. Астатнія дыяметрам каля 6 метраў і вышынёй 0,5-1,5 метра. Усе курганы добра задзернаваныя, зараслі хвоямі і хмызняком. Уздоўж асновы насыпаў прасочваюцца раўкі.

Другі курганны могільнік знаходзіцца на паўднёвай ускраіне вёскі, за 100 метраў ад сучасных могілак. У гэту групу уваходзяць 4 курганы дыяметрам 5-8 метраў і вышынёй1-3 метра. Раскопкі ні на адным, ні на другім курганным могільніку не праволдзіліся.



А вось ва ўрочышчы Хрысцініны Лядцы, на лясным паўвостраве сярод раллі захаваліся 4 жальнічныя магілы дыяметрам 2,5 метра, а па перыметры абкладзены валунамі. Побач знаходзіцца яшчэ больш 10 магіл са стрэлападобнымі каменнымі надмагіллямі. Ёсць таксама каменны крыж. Адна жальнічная магіла была раскапана ў 1989 годзе Л.У. Дучыц. На глыбіні 80 сантыметраў знойдзены мужчынскі шкілет, арыентаваны на захад. Па заключэнню антраполагаў, пахаванаму было 55-60 гадоў. У 2002-2003 гадах Л.У. Дучыц і А.В. Вайцяховіч раскапалі яшчэ два пахаванні. Знойдзены рэшткі пахаванняў, вуголле, фрагменты глінянага посуду. Датуецца XV-XVI стагоддзямі.



Непадалёк ад гарадскога пасёлка Бягомль (насупраць Маргавіцы), у забалочанай лясной лагчыне, ва ўрочышчы Святы калодзеж, бруіцца крыніца, узятая ў зруб. Побач стаяць тры драўляныя крыжы архаічнай формы. На іх вешаюць стужкі, фартушкі, пакрываюць кавалачкамі тканіны. Сюды найчасцей ходзяць на Макавея (14 жніўня) і на Яблычны Спас (19 жніўня). Нясуць грошы, садавіну, гародніну. У Маргавіцы людзі расказваюць паданне пра гэту крыніцу. Калісьці свіння рыла тут зямлю і адкапала ваду. Так з’явілася гэта крынічка з чыста-чыстай вадой. Але ўдзельнікі гуртка “Спадчына” Бягомльскай сярэдняй школы запісалі і другую легенду пра гэту крыніцу: “Жыла некалі ў Маргавіцы ці ў яе ваколіцах дзяўчына. З суседзямі мала зналася, нелюдзімая была. Калі які мужык з жонкай пасварыцца – ідзе да яе суцяшэння шукаць. Калі жанчына якая прыбяжыць – гоніць яе, крычыць.

Хацелася дзяўчыне гэтай сілу большую мець, чым іншыя людзі. Задумала яна вядзьмаркай стаць. Даўней лічылася, што калі ноччу сустрэнешся з нячыстай сілай, паскачаш з ёй у карагодзе – сілу яе атрымаеш. Галоўнае – смяяцца як нячысцік, упрыгожанняў каб не было, ды валасы трэба ўскудлаціць.

Вось устала дзяўчына ў поўнач, распусціла косы і пайшла ў двор. Закружыла яе нячыстая сіла ў сваім карагодзе, панесла ... І тут нейкі нячысцік імя яе выгукнуў. Спалохалася дзяўчына, уцячы хацела. Ды позна, хто папаў да нячыстай сілы, таму ўжо не выратавацца.

Накінуліся на яе чэрці, пацягнулі пад зямлю. А дзяўчына плача, да людзей просіцца. Замкнулі яе чэрці ў падземнай турме і ключ выкінулі.

Там дзяўчына і па сяняшні дзень сядзіць, каецца, плача, усю турму слязьмі заліла. Прабіліся яе слезы на паверхню зямлі. Калодзеж на тым месцы зрабілі. Людзі гавораць, што вада ў ім гаючая. Лічыцца, што слезы грэшніка, які каецца – святая вада, таму і калодзеж святым называюць”.

Але хутчэй за ўсё, можна меркаваць, тут было язычніцкае капішча ў гонар старажытнага бога Велеса (апекуна свойскай жывёлы). З цягам часу і прыходам хрысціянства людзі забыліся пра старадаўнія вераванні. Святар асвяціў гэта месца, і людзі сталі хадзіць па “святую” ваду, якая дапамагае, як лічаць, ад усіх хвароб.

Праз Маргавіцу працякае рака Мажанка, правы прыток ракі Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 11 кіламетраў. Па словах Герасімёнак Ганны Мікалаеўны ў гэтай рачулцы доўгі час ляжаў вялікі камень. На гэтым камяні быў яскрава бачны след жаночай нагі. Старыя людзі гаварылі, што гэта ляцела Святая Дзева Марыя і адной нагой прыткнулася да камяня. След быў глыбокі і выразны. Але некалькі год назад у час паводкі камень знік. Ніхто не ведае куды ён падзеўся. Як скрозь зямлю праваліўся.



# Мацееўцы

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў Мацееўцы ўваходзілі ў Вітуніцкую воласць і былі прыпісаны да праваслаўнага прыхода Барысаўскага павета. У кастрычніку 1888 года тут адчынена перасоўная школа. Выкладаннем у школе займаўся селянін Міхаіл Булыга, які скончыў курс народнага вучылішча. Яго ўзнагарода складала 1 рубель ад вучня ў зіму і гатовы стол. Вучняў у 1890-91 навучальным годзе было 25 хлопчыкаў. Закон Божы ў школе выкладаў свяшчэннік Емельян Сулкоўскі, які скончыў курс Мінскай дзённай семінарыі.

У 1909 годзе ў Мацееўцах пражывалі 332 жыхары. У 1933 годзе арганізаваны калгас “Іскра сацыялізму”, працавала кузня. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена фашыстамі. Зараз у Мацееўцах пражывае каля 10 чалавек.

У 1900 годзе тут нарадзілася Паляк (Скараход) Сцепаніда Піліпаўна. З 1914 года ў Пецярбургу працавала на панчошнай фабрыцы, потым была санітаркай у Петрапаўлаўскай гарадской бальніцы (цяпер – бальніца імя Эрысмана). У час Кастрычніцкай рэвалюцыі знаходзілася на вуліцах Петраграда, перавязвала параненых чырвонаармейцаў. У перастрэлцы з казакамі і юнкерамі на Архірэеўскай вуліцы была лёгка паранена ў руку. У снежні 1917 года захварэла на тыф, пасля лячэння вярнулася ў родныя Мацееўцы. У 1923 годзе выйшла замуж, у 1930 годзе з усёй сям’ёй уступіла ў калгас. Памерла ў студзені 1976 года.

# Мацееўцы

*Вёска ў Крыпульскім сельскім Савеце*

У другой палове XIX – пачатку XX стагоддзяў Мацееўцы знаходзіліся ў Параф'янаўскай воласці і ў Вітуніцкім прыходзе Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 109 чалавек. З 1921 года па 1939 год Мацееўцы знаходзіліся ў складзе Польшчы. Зараз у вёсцы пражывае каля 40 чалавек.

У Мацееўцах нарадзіўся Уладзімір Васільевіч Малаш. Чым жа вызначыўся гэты звычайны вясковы хлопец? Вось што пра яго ўспамінае былая партызанка атрада "Баявы" Яўгенія Міхайлаўна Малаш: "Валодзя Малаш да нас у атрад прыйшоў у маі 1943 года і адразу ж усім палюбіўся – вельмі сціплы, смелы. Прайшоў падрыхтоўку і стаў добрым мінёрам, прымаў удзел у многіх баявых аперацыях.

Восенню 1943 года ў мястэчка Параф'янава прыйшлі тры маладыя хлопцы. Яны былі добра апрануты і ўзброены. Мясцовыя жыхары прынялі іх за паліцаяў. Яны зайшлі ў паліцэйскую ўправу і спалілі дакументы, узарвалі сакрэтны пункт. У гэтай групе былі Сяргей Сазнін і Уладзімір Малаш. Сярод белага дня Уладзімір Малаш разам з камандзірам групы спаліў драўляны мост на дарозе Докшыцы – Глыбокае.

У 1944 годзе, напярэдадні 1 Мая, да чыгуначнага маста непадалёку ад станцыі Параф'янава падышла група партызан, у якой быў Малаш. Яны знялі вартавых і залажылі 12 пудоў толу. Мост быў узарваны.

Фашыстам сталі вядомы імёны адважных партызан. Яны абяцалі за галовы С. Сазніна і У. Малаша добрую ўзнагароду. Але здраднікаў не знайшлося. Бясстрашныя партызаны працягвалі граміць акупантаў.

У 27 буйных дыверсійных аперацыях удзельнічаў камсамолец Уладзімір Малаш. Адважны сын беларускага народа загінуў 17 мая 1944 года пры выкананні баявога задання ў вёсцы Вайдзені Вілейскага раёна Мінскай вобласці.

9 чэрвеня 1944 года бацькі Уладзіміра атрымалі паведамленне аб гібелі сына. У ім было напісана: "Камандаванне партызанскага атрада "Баявы" з глыбокім спачуваннем паведамляе Вам аб смерці Вашага сына, які загінуў пры выкананні баявога задання ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі 17 мая 1944 года. Вечная слава герою, які аддаў жыццё за вызваленне свайго народа і Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Камандзір атрада спецпрызначэння "Баявы" маёр Новы".

Прабіты варожай куляй, камсамольскі білет Уладзіміра Малаша быў перададзены на захоўванне ў Бярозаўскую сярэднюю школу, а затым у Бягомльскі музей.

#Ількунь

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Пра назву вёскі бытуе некалькі народных паданняў. Адна з іх такая: “Даўно-даўно гэта было. Людзі жылі больш па лясах. Лясы дрымучыя, суровыя. Вось сярод такога лесу знаходзіцца мястэчка Беразіно. А раней на гэтым месцы быў сатанінскі лес. Каля гэтага лесу ніхто не будаваў сваё жыллё. Усе думалі: чым далей ад лесу – тым лепш. І жыў адзін чалавек, асілак. І была ў яго такая сіла, што не расказаць. Сілу, моц сваю скіраваў ён у дрэнны бок. Лес для асілка быў родным домам. Хто з людзей сустракаўся з гэтым асілкам у лесе, той ужо дадому не вяртаўся.

Але знайшоўся ў адной вёсцы рыцар, малады хлапец Мікула.

Зацікавіла гэта ўсе Мікулу. Аднаго дня ўзяў ён сваю зброю, сеў на вернага каня і адправіўся ў лес. Быў ён хлопец рызыкоўны, смелы і, не баючыся нікога і нічога, накіраваўся ў лясны гушчар.

Сустрэліся асілак і рыцар.

Злы асілак размахваў жалезным мячом. Ад яго ўдараў валіліся дрэвы на зямлю. Не забаяўся рыцар, залез на самае высокае дрэва і скокнуў асілку на плечы. Сваім мячом вострым знес з плеч галаву асілка.

Калі падаў злы асілак на зямлю, то зямелька пад ім пачала трэскацца, а дрэвы раптам зніклі пад зямлёй. З цягам часу тут пасяліліся людзі. Весцы далі назву Мількунь – у гонар слаўнага хлопца Мікулы.

І па сенняшні дзень стаіць на гэтым месцы веска Мількунь, а вакол яе лес, шчодры на ягады і грыбы. Радуюцца грыбам і ягадам людзі і добрым словам успамінаюць хлопца Мікулу”.

А яшчэ кажуць, што некалі даўно, калі забіралі мужчын служыць у царскую армію на 25 гадоў у "рэкруты", з вескі Кальнік уцек нейкі Міна Глазко. Уцякаў з лазні, толькі лапці на босыя ногі паспеў надзець. Апынуўся ён у бязлюдным месцы, толькі балота ды лес наўкол. Збудаваў сабе невялічкі шалаш і вырашыў "адсядзецца" у гэтай глушы. Каб нeяк пратрымаца, ноччу некалькі разоў наведаўся дадому ... Так прайшоў год ... Міна на пагорку зрубіў сабе хатку, забраў жонку, дзяцей. Абаснаваўся ў гэтым краі. Пачалі апрацоўваць зямлю. А далей, як і вядзецца, родзічы пачалі наведвацца. Яшчэ некаму прыглянулася гэта пустэча. Дарэчы, зямля, хоць і акружала топкае балота, была даволі ўрадлівая. Пачалі яшчэ людзі прыязджаць і сяліцца тут. Напэўна, таму і назвалі веску Мількунь, што першым жыхаром яе быў Міна. А сёння ў весцы жыве Глазко, Бацека, Фірага, Батура. Можа і ёсць нашчадкі Міны.

А яшчэ старыя людзі кажуць, што Мількуні столькі год, як і Маскве. Так гэта, ці не, цяпер меркаваць цяжка.

Але гэта не апошнія легенды пра Мількуні. Калі спытаеш у любога мількунца, ці ведае ён, адкуль такая назва вёскі, кожны раскажа нейкую сваю

байку. Вось, напрыклад, адна з іх: “Жыў у даваенныя часы адзін дзівак, які дрэнна размаўляў, і на слова “міна” казаў “мілька”. Так яго і празвалі – Мілька. А адгэтуль і назва вёскі пайшла. А вось і другая байка. Калісьці, у часы нашых прадзедаў, цяперашнія старэнькія вяскоўцы былі маладыя, прыгожыя і бегалі на вечарынкі ў суседнія вёскі. А дадому вярталіся з цёмным. Але родная вёска, раскіданая на пагорку, здалёк мігала ім агеньчыкамі вокнаў і двароў. Так і назвалі яе “Мількуны”, а потым – Мількунь.

Што ж датычыцца сучаснай гісторыі вёскі, то яна вядзецца з 1800 года. У 1897 годзе Мількунь уваходзіла ў Бягомльскую воласць Барысаўскага павета. На той час тут пражывала 396 чалавек. У 1911 годзе адчынена народнае вучылішча, якое знаходзілася ў наёмнай сялянскай хаце з саламяным дахам. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яно пераўтворана ў савецкую пачатковую школу, дзе ў 1924 годзе навучалася 28 дзяцей (з іх 7 дзяўчынак). У 1933 годзе былі ўтвораны калгасы “Ударнік” і імя Ягорава, працавала кузня.

Шмат пакут пеpажыла вёска ў Вялікую Айчынную вайну. Вось як успамінае адну аперацыю ў канцы 1942 года былы камандзір партызанскай брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Тіткоў: “…Узвод лейтэнанта Красуліна ўвайшоў у вёску Пустаселле як раз у той момант, калі з яе выехалі карацелі на дзесяці падводах. Мясцовыя жыхары расказалі, што гітлераўцы накіраваліся ў Мількунь. А праз некаторы час там і на самай справе паднялася кулямётная стральба. Партызаны паспяшылі на дапамогу мількунцам. Вёска гэта размяшчаецца ў нізіне. Заняўшы вышыні перад ёй, лейтэнант прыняў смелае рашэнне. Адно аддзяленне пад кіраўніцтвам свайго намесніка І. Савельева накіраваў у вёску, каб вызваць у карнікаў паніку, а два аддзяленні размясціў у засадзе пры выхадзе з Мількуні.

А ў самой Мількуні ў гэты час было самае натуральнае пекла. Карнікі палявалі на людзей, уганялі ці забівалі жывёлу. Савельеў з двума партызанамі заскочыў у першую хату. На бруднай падлозе ў лужыне крыві ляжала голая маладая жанчына. Яна была яшчэ жывой і папрасіла піць. Хутка аказаўшы ёй першую дапамогу, партызаны выскачылі на вуліцу і адкрылі агонь па фашыстах. Тыя кінуліся да сваіх коней і паспяшылі пакінуць вёску. Але тут яны трапілі пад кулямётны агонь засады. Карнікі былі поўнасцю разгромлены. Пры гэтым партызаны 2-га атрада адбілі тры дзесяткі падвод з нарабаваным хлебам і групу мабілізаваных хлопцаў і дзяўчат, якіх збіраліся саслаць у няметчыну.



Аднак больш жорсткая трагедыя адбылася ў Мількуні ў маі 1943 года, калі немцы праводзілі на тэрыторыі раёна карную аперацыю “Коттбус”. Тады майскім днём карнікі спалілі вёску і загубілі 112 жыхароў. У іх памяць, і ў памяць аб воінах, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны у



вясковым скверы ўстаноўлены помнік.

Каля Мількуні існуюць старажытныя могілкі, якія існавалі да XVIII стагоддзя. На іх захаваліся некалькі старажытных каменных крыжоў, на некаторых з іх высечаны нейкія знакі.



Зараз у Мількуні пражывае каля 25 чалавек.

# Навасёлкі Кемешаўскія

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У XIX стагоддзі вёска была ўладаннем Фрэйта, Длужнеўскіх, Савульскіх, Чаловічаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны была спалена немцамі. Зараз у вёсцы ніхто не пражывае.

25 верасня 1954 года ў Навасёлках нарадзілася Мельнікава (Праліч) Зоя Пятроўна – беларускі літаратуразнавец. У 1973 годзе скончыла Полацкае педагагічнае вучылішча, а ў 1981 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Працавала настаўніцай у Астроўшчынскай (Полацкі раён) і Лошніцкай (Барысаўскі раён) сярэдніх школах. З 1984 года выкладчык Брэсцкага педагагічнага інстытута (цяпер Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт). Кандыдат філалагічных навук з 1986 года. Даследуе гісторыю літаратуры, сучасную беларускую прозу і паэзію, літаратуру Берасцейшчыны. Аўтар манаграфіі “На горне душы…” (2001), вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў гуманітарных факультэтаў ВНУ, адзін з аўтараў праграмы і падручнікаў для агульнаадукацыйных школ “Родная літаратура” (для 5 і 6 класаў), “Беларуская літаратура” (для 10 і 11 класаў).

# Несцераўшчына

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Назва вёскі Несцераўшчына паходзіць ад імя першажыхара Нестара.

Жыў калісьці ў гэтай мясцовасці пан Юзафовіч. Добры быў чалавек, справядлівы, вельмі любіў сваіх людзей. Яму належыла шмат зямель, нават возера Медзазол. А калі прыйшоў час адыходзіць на спачын вечны, ён пакінуў перадсмяратнае пісьмо, у якім прасіў сваіх сыноў, каб яга пахавалі ў людным месцы, дзе заўседы будуць хадзіць людзі і, гэтым самым, будуць ушаноўваць яго памяць.

Сыны пана Юзафовіча звярнуліся за дапамогай да святара. Ён параіў ім пабудаваць каплічку каля тракта і пахаваць там бацьку. Панічы так і зрабілі. Даглядаць за каплічкай было паручана Нестару, самаму адданаму панскаму служку. У хуткім часе Нестар вырашыў перабрацца да каплічкі на сталае жыццё са сваёю сям'ёю. Панічы дапамаглі яму пабудаваць хату.

Вось так і ўзнікла першае паселішча, якое ў хуткім часе пачало называцца Несцераўшчынай.

Упершыню ў гістарычных звестках назва Несцераўшчына згадваецца ў 1834 годзе. Тады тут пражывала 120 чалавек. Спачатку людзі сяліліся толькі вакол узгорка, дзе жыў Несцер. Потым утварылася вуліца, якая цяпер носіць назву – Баравая. Старыя людзі завуць яе “маргамі”, таму што яна вядзе да мясцовых могілак. Толькі ў 30 – 40-я гады XX стагоддзя ўзніклі другія вуліцы: Школьная, Цэнтральная, Лугавая.

Першая школа ў Несцераўшчыне была адкрыта ў 1899 годзе. Яна знаходзілася ў звычайнай сялянскай хаце. Вучыў дзяцей проста адукаваны чалавек – Рудзько Хрысціян Іванавіч. А ў 1901 годзе з дапамогай земства быў пабудаваны першы школьны будынак на чатыры класы (сучасны школьны будынак з’явіўся ў 1966 годзе). Земства тады паклапацілася і аб настаўніцы.

З 1921 года па 1939 год Несцераўшчына знаходзілася ў складзе Польшчы. На гэты час тут пражывала больш за 300 чалавек. Недалёка ад могілак знаходзілася польская застава – стражніца. А па возеры Медзазол праходзіла мяжа, якая дзяліла яго на дзве часткі. Дзейнічала пачатковая школа. Выкладанне вялося на польскай мове.

Страшны лёс наканаваў Несцераўшчыну ў гады Вялікай Айчыннай вайны. (Дарэчы, існуе меркаванне, што першы раз вёску спалілі яшчэ шведы ў 1720 годзе). А ў чэрвені 1943 года і ў студзені 1944 года нямецка-фашысцкія захопнікі двойчы палілі Несцераўшчыну. Вось як аб гэтых падзеях гаворыцца ў акце ад 29 лістапада 1943 года, які быў складзены камісіяй у складзе камісараў партызанскіх атрадаў брыгады Мядзведзева: “…вёска Несцераўшчына (67 двароў) спалена поўнасцю, зверскі закатаваныя і растраляныя Васілевіч 53 гадоў, А.Р. Васілевіч 52 гадоў, А.М. Васілевіч 75

гадоў, Ульяна Хілько 60 гадоў, Фама Шуневіч 75 гадоў, Фядора Васілевіч 80 гадоў, М.А. Кастрынін 33 гадоў, Г.Ф. Васілевіч 24 гадоў. У гэтай жа вёсцы фашысты, злосныя з-за няўдачных баёў з партызанамі, злавілі 8 чалавек сталага ўзросту, адвезлі іх у раён вёскі Гічанцы, выкапалі яму і кінулі туды жывымі гэтых людзей і яшчэ двух грудных дзяцей. Потым расстралялі іх з кулямёта. Акрамя гэтага ў Няметчыну фашысты пагналі 14 чалавек моладзі; буйна-рагатую скаціну, авечак, коней, дамашнюю птушку, свіней, абутак і адзенне разрабавалі".



У 1949 годзе ў вёсцы арганізаваны калгас імя Леніна, які ў 1963 годзе пераіменаваны ў калгас імя Гагарына. У 1975 годзе ў цэнтры вёскі былі пастаўлены помнікі: адзін – бюст першага касманаўта планеты Ю.А. Гагарына; другі – скульптура воіна на ўшанаванне памяці 48 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У 1986 годзе ў Несцераўшчыну перасяліліся жыхары з вёскі Горнава 1-я.



Летам 2004 года ў Несцераўшчыне была пабудавана каплічка. Яе асвячэнне адбылося 16 ліпеня 2005 года.

Зараз у вёсцы пражывае каля 325 чалавек.

Каля Несцераўшчыны знаходзяцца два курганныя могільнікі. Першы знаходзіцца за паўтара кіламетра на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Буцілаўскі Лес. У яго склад уваходзяць 32 курганы, з іх 8 падоўжаных да 8-13 метраў, шырынёй ад 5 да 8 метраў і вышынёй ад 2 да 3,5 метраў. Астатнія круглыя дыяметрам ад 6 да 15 метраў, вышынёй ад 0,6-0,8 да 2,5 метраў. Уздоўж асновы відаць раўкі. Усе насыпы задзернаваныя, большасць пакрытая густым хмызняком і хваёвым лесам.

Другі курганны могільнік знаходзіцца за 1,1 кіламетра на паўночны захад ад вёскі. 36 курганоў вонкава падобныя да насыпаў першага могільніка. 4 насыпы падоўжаныя, даўжынёй 10-12 метраў, шырынёй 7-8 метраў, вышынёй 2,5-3 метра. Памеры круглых курганоў, іх захаванасць, як і ў першым могільніку. Абодва могільнікі вядомы яшчэ з 1924 года. У 1938 годзе іх абследавалі польскія археолагі А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч, а ў 1971 годзе – А.Р. Мітрафанаў.

У 1894 годзе ў Несцераўшчыне нарадзілася Лукашонак Соф'я Вікенцьеўна. Некаторы час жыла ў вёсцы Рачныя. У 1939 годзе паехала ў Францыю, дзе працавала ў багатых людзей на розных работах. Там яна пісала вершы і складала малітвы. Рукапісныя зборнікі гэтых твораў захаваліся і знаходзяцца ў яе дачкі Карніловіч Надзеі Пятроўны. Надзея Пятроўна неаднаразова запрашалася на рэспубліканскае радыё, выступала па тэлевізару. Яна вялікая знаўца народных абрадаў. Таксама прыгожа вышывае, вяжа, умее ткаць.

# Новае Запонне

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

За 2,5 кіламетры на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Калюга, на правабярэжжы ракі Поня пахаваны два лётчыкі – камандзір экіпажа, намеснік камандзіра эскадрыллі па палітычнай частцы лейтэнант Г.К. Раманенка і штурман малодшы лейтэнант А.М. Панчанка, якія загінулі 29 чэрвеня 1941 года. Аднак мала хто ведае, што ў самалёце было тры чалавекі. Трэці быў стралок-радыст старшы сяржант Пётр Кліменцьевіч Папоў. У час катастрофы ён цудам застаўся ў жывых. Вясной 1967 года ён прыязджаў у наш раён, каб пакланіцца праху сваіх баявых сяброў, паглядзець абеліск, наведаць Бягомль. Вось яго ўспаміны: “Наш авіяполк з першага дня вайны пачаў баявыя дзеянні. 5 разоў вылятаў наш экіпаж на бамбёжку ворага. Бамбардзіравалі скапленні гітлераўскіх войск у Гродна, Лідзе і іншых прыгранічных гарадах, а таксама на маршы. Нас абстрэльвалі з зенітак, атакавалі “месершміты”. За кароткі час полк страціў 6 самалётаў.



І вось на шостым баявым вылеце не вярнулася на аэрадром наша машына. У пары з другім самалётам мы ляцелі ў разведку. Трэба было выявіць варожыя мотапехчасці і перадаць па рацыі іх каардынаты. Неба кішэла нямецкімі знішчальнікамі. Прыйшлося ляцець “у прыцірку да зямлі”. Над Бягомльскім раёнам трапілі ў суцэльную нізкую воблачнасць. Я нечакана адчуў, што самалёт моцна ўстрасянула. Я стаяў у сваёй кабіне і ледзь не ўпаў. І ў тое ж імгненне ўбачыў пад самалётам лес. Успеў толькі падумаць: “Вось і ўсё”.

…Я ляжаў на спіне галавой да матораў. Апрытомнеў ад нясцерпнай гарачыні, ад страшнага пякучага болю. Сабраўшы апошнія сілы, выпаўз з самалёта, скінуў камбінезон, які гарэў, і рукамі стаў тушыць агонь на штанах. Што было далей, - не памятаю. Апрытомнеў у бальніцы ў Бягомлі ў той момант, калі па палатах расхаджвалі немцы. Лячыўся я пад выглядам пацярпеўшага мясцовага жыхара. Твар, рукі і ногі былі абпалены. На нагах апёкі 3-й ступені. З рук злезлі ўсе пазногці, я сам не мог нават напіцца. З апёкамі ног 9 месяцаў праляжаў на спіне. Але дзякуючы медработнікам, а асабліва ўрачу Я.П. Сырнікавай, я выжыў. Яна вельмі ўважліва адносілася да раненых чырвонаармейцаў. У бальніцы не было ні медыкаментаў, ні прадуктаў. Усё гэта медработнікі даставалі ў мясцовага насельніцтва, і мы з голаду не памерлі…”

У пачатку 1943 года, пасля таго, як варожы гарнізон у Бягомлі быў знішчаны партызанскай брыгадай “Жалязняк”, яго разам з іншымі раненымі чырвонаармейцамі і партызанамі адправілі самалётам на “Вялікую зямлю”. Пасля лячэння ў ваенным шпіталі камісія прызнала старшага сяржанта Папова непрыдатным па стану здароўя для далейшай службы ў авіяцыі і наогул у арміі. З таго часу Пётр жыў у родным сяле Калікіна Арэнбургскай вобласці ў Расіі, да выхаду на пенсію працаваў сакратаром выканкома сельскага Савета. Жонка яго працавала медсястрой.

На мясцовых могілках знаходзіцца магіла Якава Аляксандравіча Шаўцова – кіраўніка Бягомльскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі ў Вялікую Айчынную вайну. Я. Шаўцоў нарадзіўся ў 1916 годзе ў вёсцы Рамязы Ельскага раёна Гомельскай вобласці. З 1936 года стаў членам КПСС. Да вайны працаваў старшынёй Мсціжскага сельскага Савета, інструктарам Бягомльскага райкома КП(б)Б, дырэктарам Мацееўскай сямігадовай школы. У час вайны стварыў і ўзначаліў падпольную арганізацыю, якая падтрымлівала сувязь з партызанскім атрадам “Барацьба”. Пад кіраўніцтвам Шаўцова падпольшчыкі распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю і боепрыпасы, медыкаменты, якія перадавалі партызанам. У чэрвені 1942 года арыштаваны акупантамі і растраляны. У гэты ж час нямецка-фашысцкія акупанты паляць і Новае Запонне.

У 1971 годзе да Новага Запоння далучылася вёска Сахонаўка. А ў 1979 годзе на магіле Шаўцова ўстаноўлены помнік.

Зараз у вёсцы пражывае каля 20 чалавек.

# Новая Вёска

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

Самая распаўсюджаная легенда пра назву вёскі паведамляе аб тым, што людзі пачалі сяліцца на новым месцы. Гэта значыць пабудавалі новую вёску. У гістарычных крыніцах Новая Вёска ўпершыню ўпамінаецца ў 1886 годзе як сядзіба ў Віленскім павеце, дзе працавала сталярная майстэрня і ветраны млын. У 1905 годзе на гэтым месцы існавалі аднайменныя сяло (58 жыхароў) і вёска (160 жыхароў). Адна вясковая жыхарка Зімніцкая (1902 года нараджэння) успамінала, што ў тыя часы ў вёсцы была адна вуліца, а дамы размяшчаліся бліжэй да дарогі і вельмі блізка адзін да аднаго. Падчас восеньскіх дажджоў дарогу вельмі размывала, конскія павозкі тапіліся ў гразі так, што паўкола хавалася.

У 1906 годзе ў Новай Вёсцы ўспыхнулі хваляванні мясцовых жыхароў. Яны пагражалі спаліць панскі маёнтак. На разбор выступленняў з Докшыц прыехаўураднік. Агрэсіўна настроеныя сяляне цяжка паранілі царскага служку, спалілі яго брычку, забілі каня. Хутка ў вёску прыбыў узвод казакоў разам з прыставам, ураднікам і гарадавым. З іх дапамогай памешчыкі Слатвінскі і Рудаміна змаглі супакоіць вяскоўцаў і схіліць іх да перагавораў. Праўда, найбольш актыўныя ўдзельнікі хваляванняў былі арыштаваны. Іх арганізатар і непасрэдны ўдзельнік Якаў Крупскі таксама быў арыштаваны, але ўжо тады, калі вярнуўся ў Петраград, на Пуцілаўскі завод, дзе працаваў. Пакаранне адбываў у Петрапаўлаўскай крэпасці.

Жыхары вёскі працавалі альбо на пана, які жыў у Ходараўцы, альбо на Паўлавічскага пана Куля ў панскіх кароўніках. Недзе ў часы Кастрычніцкай рэвалюцыі людзі вымасцілі дарогу ў вёсцы камянямі. Існавала гэта брукаваная дарога аж да нашага часу, пакуль не была пакрытая асфальтам.

З 1921 года па 1939 год Новая Вёска ўваходзіла ў склад Польшчы.

За паўтара кіламетры ад вёскі ва ўрочышчы Ходораўскі Лес знаходзіцца магіла 200 італьянскіх ваеннапалонных і магіла ахвяр фашызму, дзе пахавана 600 мірных жыхароў Бешанковіцкага, Лепельскага і Ушацкага раёнаў, якіх загубілі гітлераўцы ў чэрвені 1944 года. Што ж адбылося тут у тыя чэрвеньскія дні? Аказваецца, калі ў жніўні-верасні 1943 года ў Італіі быў скінуты фашысцкі рэжым дыктатара Мусаліні, немцы абяззброілі італьянскія войскі і скарыстоўвалі іх, як і ваеннапалонных, на цяжкіх фізічных работах. Адна такая каманда са студзеня 1944 года знаходзілася на станцыі Параф’янава. Італьянцы працавалі на будаўніцтве ваенных аб’етаў грузчыкамі, ліквідавалі вынікі партызанскіх дыверсій на чыгунцы. Іх спасціг лёс вязняў канцлагера “Лібараўшчына”. Толькі да іх фашысты ўжылі такі каварны прыём: італьянцам было аб’яўлена, што іх нібыта адправяць у Італію на транспартных самалётах з Сітцаў. Яны склалі ў чамаданы і ранцы свае рэчы і ахвотна пад канвоем пайшлі на Новую Вёску. Ніхто з іх не

здагадваўся, што ідзе на смерць. Вось як успамінае тую жудасную трагедыю жыхар вёскі Дзядкі Божалка Вітольд Станіслававіч:

“У тую сонечную раніцу, 27 чэрвеня 1944 года, усе ў Дзядках пачулі перастук гарматнай кананады. Увесь гарызонт на ўсходзе быццам бы ўздрыгваўад частых тугіх udараў. А тым, што ў немцаў справы дрэнь, сведчыў і такі факт. Аэрадромная служба ў Сітцах пачала ўзрываць узлётна-пасадачныя палосы, аэрадромныя збудаванні, склады. У нас, у Дзядках, ад аглушальных выбухаў павыляталі ва ўсіх хатах шыбы. Усё, што магло гарэць, было спалена і ў Сітцах, і ў Параф’янаве. Па палявой дарозе з боку Порплішча ў напрамку на Заборцы ехалі падводы – гэта ўцякалі на захад сем’і паліцаяў і іншых прыслушнікаў немцаў. “Мужыкі!” – устрывожана загаварылі дзядкоўскія жанчыны,- “Бярыце коней і ўцякайце ў лес, у кусты. А то немцы пахапаюць конікаў і саміх вас. А як жа мы тады жыць будзем?” бацька мой быў ужо ў гадах, таму ён рашыў з вёскі нікуды не ісці. “Што будзе, то будзе,” – сказаў ён рашуча. – “А ты, сынок, бяры каня і едзь у ельнік пад Ходараўку. Баюся я за цябе, ды і каня шкада”. Апаска бацькі была недарэмнай. Мне тады споўнілася 16 гадоў. А такія маладыя хлопцы патрэбны былі для работы. І вось мы, моладзь і некалькі старых сялян – у ельніку. Трымаем у руках павады, коні пашчыпваюць рэдкую асаку і зайцаву капусту, пафыркваючы і адбіваючыся ад насядаўшых мух, сляпнёў і аваднёў. Раптам, нібы кашлянуўшы і папярхнуўшыся закукавала зязюля. Мірная карціна цёплага чэрвеньскага дня была падманлівай. Яна таіла ў сябе небяспеку. Смерць падсцерагала тады не толькі тых, хто са зброяй у руках ішоў партызанскай сцежкай, ці франтавымі дарогамі...

Разважанні перарвалі доўгія аўтаматныя і кулямётныя чэргі, раскацістыя выбухі гранат. Мы ўсе ўздрыгануліся. Ускінулі галовы і нервова павялі чуйнымі насамі коні. Быццам падавіўшыся ўласным голасам змоўкла зязюля. Рэха з вібруючым шалясценнем змоўкла ў гушчары, каб праз імгненне зноў адазвацца на новыя чэргі і выбухі. Стралялі дзесьці паблізу з боку вёскі Вялікія Сітцы.

Прывязаўшы коней да дрэў, мы асцярожна выйшлі на ўзлесак. Адгэтуль, з высокага месца, добра праглядалася прастора, абмежаваная справа ваколіцай вёскі Дзядкі, злева – дарогай на Новую Вёску і абшарам жытнёвага поля, якое распасціралася ўздоўж яе. Астраўком сярод поля зелянела дробналессе, злева ад якога быў хытар Плюта Івана, а з боку Вялікіх Сітцаў – хутар кучыца Аляксандра.

Сумненняў больш не заставалася: там, сярод гэтых зараснікаў, адбывалася нешта жудаснае. Нечакана з кустоў з боку поля выйшаў мужчына і, апасліва азіраючыся, падыйшоў да нас. Мы пазналі ў ім Пятра Скрабнеўскага. “Там немцы нейкіх любзей забіваюць,” – узбуджана, прыглушаным голасам прагаварыў ён, - “Я каля свайго хутара хаваўся з конем у лазняку. Калі пачалася стральба, папоўз па жыце і прыкладна на адлегласці ў 100 метраў некалькі хвілін назіраў. Яны падганяюць да ямы людзей, загадваюць раздзецца да споднягa і страляюць, а потым кідаюць у

яму гранаты... Глядзіце, вунь па дарозе гоняць яшчэ групу...” Мы ўсе павярнулі галовы ўбок Новай Вёскі, адкуль да Ходараўкі канваіры з сабакамі гналі вялікую групу людзей. На перакрыжаванні калона павярнулася ўлева і накіравалася туды, дзе ўсё яшчэ раздаваліся кароткія чэргі, адзіночныя выстралы, разрывы гранат. Каб лепш было бачна, я і некалькі маіх аднагодкаў залезлі на дрэвы і адтуль доўга назіралі, як немцы гналі да страшнага месца новых людзей. Некаторых, бачна, аслабеўшых ад голаду і пабояў, палонных немцы везлі на грузавіках. Назад у гэтых грузавіках ехалі толькі канваіры...



Да самага вечара былі чуваць страляніна і выбухі, крыкі і стоны людзей. На наступны дзень стральба працягвалася.

2 ліпеня, калі ўжо прыйшла Чырвоная Армія, мы пабеглі ў той жудасны лясок. Вачам адкрылася страшная карціна. У розных кутках дробналесся жаўцелі свежаў сырой глінай і пяском, закіданыя наспех голлем, 5 ям размерам прыкладна 3×4 метры. Забойцы так спяшаліся, што не засыпалі, як трэба, сваіх ахвяр. З пяску і гліны выступалі рукі і ногі. Зямля, якой былі прысыпаны забітыя, наскрозь прапіталася крывёй. Засохшая кроў бурымі пятнамі віднелася на траве.

Людзі расказвалі потым, што забойцы ў зялёнай форме некалькі разоў на працягу гэтых 2 дзён прыходзілі на хутар Кучыца Аляксандра змываць з сябе людскую кроў і “запраўляцца” гарэлкай.



На ўзлеску мы выявілі вогнішча. Тут валяліся абгарэлыя рэшткі чамаданаў, абутку, вопраткі і іншых рэчаў. Доўгі час, усё лета, ад напоўненых трупамі ям распаўсюджваўся ўдушлівы запах”.



Таксама вядома, што ў канцы другога дня масавай расправы, як ужо пачало вечарэць, у Ходараўку ў хату Францукевіча прыпоўз у адной бялізне скрываўлены італьянец. Ён быў цяжка паранены, але ў яме апынуўся ў верхнім пласце трупаў. Калі апрытомнеў, выкараскаўся з ямы і дапоўз да вёскі. Францукевіч выходжваў яго некалькі дзён.



А хто ж былі забойцы? Савецкія следчыя органы ўстанавілі, што бойню ў Ходараўцы ўчынілі карнікі “Зондэркаманды – 9” СД. Гэта каманда прыбыла надоечы ў Новую Вёску. Частка катаў размясцілася ў

хаце Веры Каротчык. У карнікаў быў своеасаблівы “падзел працы”: адна група капала ямы, другая кантралявала смертнікаў, трэцяя – забівала. Акрамя немцаў там былі і рускія, якія прадаліся акупантам.

У 1969 годзе на месцы трагедыі быў пастаўлены абеліск, а 31 кастрычніка 1992 года тут быў адкрыты мемарыяльны комплекс.

Вясновым днём
На холад бярэцца,
Быццам агнём
Апалена сэрца.
Ветру выццё
Каля жудасных ямаў.
Тваё жыццё
Быццам гіне таксама,
Як тых васьмісот
Ахвяраў нявінных.
Сорак чацвёрты год…
Пад свінцовай лавінай
Куляў шалёных
Падалі людзі.
Крыкі і стогны…
Зямля цісне грудзі…
Ваеннапалонныя
Італьянцы
Тут захароненыя
Ў магілах брацкіх.
Ім не бачыць радзіму –
Сонечную Італію –
Ні мёртвымі, ні жывымі…
Ахвярамі сталі
Тут шэсцьсот беларусаў –
Насельнікаў мірных.
Гналі іх пад прымусам
На месца гібелі –
Жахлівае месца
Злачынства
Эсэсаўцаў,
Катаў- фашыстаў.
Зямля на тых ямах тады
Цяжка ўздыхала…
Гады ідуць – не сатруць гады
Таго, што памяццю стала –
Помнікі, крыж,
Пліты намошчаны
У тое урочышча,
У тое урочышча.
Жалобна шумяць
Тут бярозкі белыя
Побач са стэлаю,
Побач са стэлаю.
Крыж мімаволі
Жагнае рука…
Слова складзена з болю:
-- Хо-да-раў-ка…

*М. Дзюбак*

Аднак знайшліся варвары, якія пасягнулі на святое. У 2008 годзе нейкія “адмарозкі” адпілавалі руку ў бронзавай фігуры.



У 1949 годзе ў вёсцы быў створаны першы калгас імя Суворава. У гэтыя гады Новая Вёска пачала разрастацца. Пачалі з’язджаць сюды гаспадары з навакольных хутароў і сядзіб. З’явілася першая пачатковая школа. Спачатку яна размяшчалася ў хаце Янкоўскага (выехаў у Польшчы). Настаўнікам быў спачатку Іваненка, а затым Пухальскі Іван Іосіфавіч. Але ўжо школа перасялілася ў хату цёткі Манечкі, што была непадалёку ад сядзібы Дубаневіча. Але яна скора згарэла. У 60-х гадах была пабудавана новая школа.

Зараз у Новай Вёсцы пражывае каля 120 чалавек.

Упершыню ў пісьмовых крыніцах Ходараўка згадваецца ў 1690 годзе ў тарыфе Ашмянскага павета як уласнасць Уладзіслава Бжастоўскага. Адносілася тады да маёнтка Сітцы. У 1795 годзе фальварак Ходараўцы адносіўся да маёнтка Вешняе, 1 двор, 1 жыхар.



Па словах старажылаў, Ходараўка належала Слатвінскім. У 1930 годзе маёнтак Ходараўка адносіўся да Порпліскай гміны Дзісненскага павета, тады ў ім пражывала 28 чалавек і было 288 дзесяцін зямлі.

Непадалёку ад вёскі ў былым маёнтку Ходараўка размяшчаецца парк. Ён быў закладзены ў канцы XIX стагоддзя. Займае ўзгорак і яго пакаты схіл. Мае маляўнічыя краявіды ва ўсходнім напрамку, але разбураецца, бо служыць загонам для жывёлы. Толькі невялікія фрагменты дрэвастою, руіны падмуркаў захаваліся на месцы былых сядзіб у Асонавічах, Булахах і інш.



У 1970 годзе ў Новай Вёсцы знойдзены сярэбраныя грошы Расійскай Імперыі, якія былі схаваны ў XIX стагоддзі.

# Новая Вілейка

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У 2-й палове XIX – пачатку XX стагоддзяў вёска ўваходзіла ў Вітуніцкую воласць і Вілейскі праваслаўны прыход Барысаўскага павета. У 1909 годзе сумежна з вёскай, дзе пражываў 41 чалавек, знаходзіўся аднайменны хутар з 10 жыхарамі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Зараз у Новай Вілейцы пражывае каля 10 чалавек.

За адзін кіламетр на поўдзень ад вёскі, у лесе, злева ад дарогі на Старую Вілейку знаходзіцца курганны могільнік, які складаецца з 65 круглых кургановў, 46 з іх дыяметрам 6-8 метраў. Вышыня насыпаў ад 0,5 да 3,5 метраў. Вакол кургановў прыкметны раўкі. Раскопак тут не праводзілі.

На поўдні ад Новай Вілейкі рака Камяніца ўпадае ў раку Лонва (басейн ракі Вілія).

# Нябышына

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Мяркуюць, што калі ў 1491 годзе памёр пан Алехна Судзімонтавіч, у яго засталіся двое дачок. Адна з іх, невядомая па імені (напэўна Ядвіга?), стала жонкай Станіслава Барташэвіча Мантоўта. Праз яе частка харэцкіх даннікаў трапіла да Мантоўта, а затым да яго дачкі. У гэту частку ўваходзілі, верагодна, і жыхары Нябышына.

Пасля абрання ў 1575 годзе каралём Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя наступіў пералом у вайне з Расіяй. За некалькі гадоў Полацкая зямля была цалкам адваяваная, прычым адной з апорных баз войска Баторыя былі ваколіцы Докшыц. За ваенныя заслугі кароль падараваў аднаму са сваіх афіцэраў, польскаму шляхціцу Хмялеўскаму маёнтак Нябышына. За некалькі гадоў да таго, у 1567 годзе, гэты маёнтак быў уладаннем адной з дачок Крысціны Глябовічны-Камаеўскай, якая была ў той момант удавой Станіслава Кміты. Якімсці чынам гэты маёнтак трапіў затым не да родзічаў Камаеўскай, а ў дзяржаўную ўласнасць, з ліку якой С. Баторый узнагародзіў Хмялеўскага.

У тарыфе 1690 года гаворыцца аб тым, што Нябышына перайшло ў рукі Гераніма Рамана Твароўскага. Тады тут дзейнічала драўляная царква, якой Мацеўш Радзевіч дакументам ад 30 жніўня 1760 года надаў дзве валокі зямлі.

У 1863 годзе маёнткам Нябышына валодаў Карказовіч Гектар Міхалавіч – дваранін Ігуменскага павета Мінскай губерні, адстаўны штаб-ротмістр, унук Валер'яна Карказовіча. Гектар Карказовіч прымаў асабісты актыўны ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў. пасля арышту ўтрымліваўся ў Мінскім гарадскім астрозе. Рашэннем ваенна-палявога суда пры Каломенскім пяхотным палку ад 14 лютага 1864 года сасланы на 15 гадоў на катаржныя работы ў Сібір.

У 1897 годзе ў Нябышына пражываў 351 чалавек, дзейнічала царкоўна-прыходская школа і хлебазапасны магазін. У гады польскай акупацыі Заходняй Беларусі ў 1921-39 гадах у Нябышына была пагранічная застава. У 1933 годзе тут быў арганізаваны калгас "Чырвоны світанак", працавалі вадзяны млын і кузня.

У маі 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 49 жыхароў. Вось як успамінае адзін з эпізодаў ваеннага ліхалецця жыхар Нябышына Ілля Копыл:

"Мы, жыхары вёскі Нябышына, называлі аперацыю "Котбус" першай нямецкай блакадай. Яна пачалася ў сярэдзіне мая 1943 года. Аб яе пачатку партызаны нам не паведалі. Аднак мы паспелі ўцячы з вёскі ў Лабоцкія балоты ўсяго за некалькі гадзін да прыходу немцаў. Невялікімі групамі па тры-чатыры сям'і кожны дзень мянялі месцы начовак. А над лесам увесь час

кружыў разведвальны нямецкі самалёт “рама”. Аднойчы мы толькі пакінулі сваё месца і адыйшлі метраў на трыста, як у наш шалаш папала бомба. Я заплакаў, так як у шалашы была мая губная гармоніка.

У вёсцы засталіся толькі старыя і хворыя. Усіх іх (а гэта чалавек 10-15) паліцаі расстралялі і спалілі ў хлеве. Потым немцы падпалілі 6 хат, у там ліку і нашу”.

А вось яшчэ адзін выпадак з успамінаў Іллі Копыл. Ён быў надрукаваны ў газеце “Народная воля” за № 111 ад 20 чэрвеня 2003 года. “В феврале 1943 года в нашу деревню Небышино днем открыто вошел, вернее, въехал партизанский отряд. Лошади были запряжены в сани. Большинство партизан было в военной форме, но были и в гражданской. Отряд был хорошо вооружен.

Командиром отряда был Федоров. Это не тот легендарный Федоров, о котором мы читали в книгах и видели фильмы, это его однофамилец.

Отряд остановился в нашей деревне на отдых на несколько дней. Прокормить их сельчанам было непросто. Пришлось резать овец и другую живность. Нам повезло, в нашем доме остановился сам Федоров.

Партизаны каждый вечер устраивали в одном из домов танцы. На танцы они приходили с оружием и танцевали с девушками, не снимая его.

Однажды один партизан пригласил на танец девушку Фаню Пашевич. Он был сильно выпивший, и она отказалась с ним танцевать. Сказала: "Я с пьяными не танцую". "Сука, -- закричал партизан, -- а с немцами танцуешь?!" -- "Я немцев ни разу не видела, они у нас танцы не устраивали", -- ответила Фаня.

Партизан внезапно в упор выстрелил, попал девушке в сердце. Через несколько часов она скончалась. Это была самая красивая, самая лучшая девушка в деревне. Командир отряда Федоров сказал: "Это война, из-за какой-то девушки я не собираюсь расстреливать своего лучшего партизана".

Затем отряд, реквизировав (отняв) у нас излишки продовольствия и фуража, двинулся дальше.

Не успели мы прийти в себя от пребывания в деревне отряда Федорова, как в конце апреля 1943 года к нам вошел отряд партизан под командованием Шляхтунова. Это была вышколенная воинская часть, как и сам Шляхтунов. Оружие: автоматы, пулеметы, противотанковые ружья.

И снова сам Шляхтунов остановился в нашем доме, может, потому, что наш дом был просторный и самый новый, мы его построили в 1940 году, а может, потому, что отец до войны был председателем колхоза. Отдохнув несколько дней и пополнив запасы продовольствия, отряд двинулся дальше.

Через пару дней в деревню Небышино влетела группа всадников. Это был комбриг Дубровский. Он прибыл встретиться со Шляхтуновым, но опоздал. Дубровский и охрана остановились в нашем дворе, уточнили, как давно и по какой дороге ушел Шляхтунов. Потом они все сели на лужайке у дома.

Один сержант вошел в дом, где в этот момент были отец и я. Сержант спросил у отца, почему он не ушел в партизаны и почему его, председателя колхоза, до сих пор не расстреляли немцы. Потом выхватил пистолет, взял отца за грудь и ткнул стволом в лицо, ругался. Отец не защищался. Я очень громко от испуга закричал. В дом вбежали двое партизан и успокоили буяна.

Через час партизаны ускакали».

Зараз у Нябышына пражывае каля 100 чалавек.

За паўкіламетра на захад ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Горкі, злева ад дарогі на былую вёску Далёкае знаходзіцца курганны могільнік, у склад якога ўваходзяць 45 круглых курганоў і адзін падоўжаны. Дыяметр насыпаў ад 5 да 14 метраў, вышыня ад 0,5 да 3,2 метра. Захаванасць курганоў добрая, насыпы задзернаваныя, пакрыты хмызняком і маладым хваёвым лесам. Курганны могільнік вядомы яшчэ з 1924 года. Абследаваў яго ў 1972 годзе А.Р. Мітрафанаў, але дасканалых раскопак тут не праводзілася.

Праз паўднёвую ўскраіну Нябышына працякае рака Поня. Пра яе цудоўныя вершы пісаў наш зямляк Эдуард Зубрыцкі. Вось адзін з іх:

**Поня**

Непрыкметная рэчка Поня,
На лугах ружовыя коні,
У іх грывах вольны туман,
У вачах – блакітная поўня.
Хочаш не хочаш –
Увядуць у зман
Цыркачы лугавыя – конікі.
Так і слухаў бы іх да дня
Там, дзе сцеліцца цішыня.
Шалясцяць, звіняць снягі,
Я цалую твае берагі.
Твае хвалі цалую, Поня.
П’юць расу ружовыя коні.
І, прысвечаны шчасцем да дна,
Я з табою да золку – дня.
Па кустах чатырох старон
Салаўёў маладых маленства.
Гэты чысты, крыштальны звон –
Звон далёкі майго маленства.
Паўтаруся ж, крыштальны звон,
Мне да скону апошніх дзён.
Непрыкметная рэчка Поня,
Я шчаслівы с табой сягоння...

* * *

Я зноў к табе вярнуся, Поня.
Дапамагу ці не бядзе:
Ані затокі, ані гоні,
Ані лілеі на вадзе.
Тваё насельніцтва звялося.
Русалка – казачка сплыла.
Няма ранейшай весялосці,
Няма ранейшага святла.
На заліўных лугах, бывала ж,
Шумела – паспрабуй стрымай!
Усё наноснае змывала,
Сплаўляла аж за небакрай.
З табою рос я, рэчка Поня,
Бурштыну быў твон звон чысцей.
...Глядзіш самотна, як спакойна
Брод пераходзіць верабей.



У 1916 годзе ў Нябышына нарадзіўся Кузьміч Мікалай Аляксандравіч. З 1942 года член Нябышынскай падпольнай партыйна-камсамольскай групы, камандзір роты 2-га атрада партызанскай брыгады “Жалязняк”. Пасля вайны следчы абласной пракуратуры, пракурор аднаго з раёнаў Брэста. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі.

У 1921 годзе ў Нябышына нарадзілася Фрол (Макорта) Ганна Фёдараўна. Да верасня 1942 года сувязная Нябышынскай падпольнай партыйна-камсамольскай групы, да 1944 года – сакратар групы, сувязная партызанскай брыгады “Жалязняк”.

# Параф’янава

*Цэнтр аднайменнага сельскага Савета*

Параф’янава — адно з самых старых паселішчаў Докшыччыны. Існуюць тры варыянты напісання назову гэтага паселішча: Парфенава, Параф’янава і Параф’янаў. Назоў Параф’янава выкарыстоўваўся ў рускамоўных дакументах і пазней стаў агульнапрынятым назовам паселішча; Параф’янаў – пісалі па-польску. Назоў Парфенава да сённяшняга часу можна пачуць у народзе, ён выкарыстоўваўся падчас нямецкай акупацыі, так піша і пісьменнік Кастусь Акула ў рамане “Гараватка”. Зрэшты, нельга дакладна сказаць, які з варыянтаў назову гэтага паселішча больш старажытны: Парфенава ці Параф’янава. У сувязі з гэтым узнікаюць дзве версіі паходжання назову паселішча: ад слова “парафія” альбо ад імя Парфен.

Па адной з легенд – ад Глыбоцкай, Докшыцкай і Валкалацкай парафій былі аддзелены землі новай парафіі. На гэтых землях быў пабудаваны касцёл. Таму лічаць, што назва вёскі Параф’янава пайшла ад слоў “Парафія нова”.

Аднак існуе і другая версія назвы вёскі, якую запісалі юныя краязнаўцы Параф’янаўскай СШ са слоў Маслоўскай Яніны Браніславаўны і Вайцяховіч Арсенія Рыгоравіча. ....Гадоў сто, а можа і дзвесце назад у гэтай мясцовасці жылі прыгажуня Яна і каваль-асілак Парфен. Яны моцна кахалі адзін аднаго. Дзяўчыне ішоў толькі 16 год. Яшчэ, здаецца, учора была падлетак, гарэза. А ў гэта лета стала ў самай пары дзяўчына, у самай красе. Калі толькі вырасла. І для іх гэта лета стала летам іх першага кахання. Але так не бывае, каб усё добра было. Калі навокал прыгожа, а на сэрцы радасна, дык абавязкова бяда зусім блізка. Бяды не здарылася б, каб не краса дзяўчыны.

Аднойчы ў Купальскую ноч пайшлі Парфен і Яна на Лысую гару шукаць папараць кветку і заблудзіліся. Доўга блукалі яны па лесе. Стаміліся. Парфен прапанаваў Яне пасядзець каля ясеня і адпачыць, а сам у гэты час пайшоў шукаць дарогу дадому. Тут раптам з-пад ясеня паказалася рука нячысціка, а голас яго зваў Яну да сябе ў карагод. Як заварожаная Яна падала руку, і невядомая сіла пацягнула яе да сябе.

- Парфен, ратуй мяне!

Пачуў гэта Парфен і хуценька прыбег да ясеня, дзе аставіў сваю каханую. Бачыць, што нячыстая сіла Яну да сябе цягне, раззлаваўся ды сам выцягнуў пачварыну з-пад дрэва. Узмаліўся нячысцік, прасіцца стаў. Золота, брыльянты прапаноўваў. Ды не згадзіўся Парфен, а ўзяў і ўтапіў нячыстую сілу ў балоце.

Сталі яны выбірацца з дрымучага лесу, ды ніяк не могуць. Але тут на небе з’явіўся нейкі агеньчык. Вырашылі яны пайсці на гэты агеньчык і не

прайшлі з дзесятак крокаў, як замест багны і лесу раптам адкрылася чыстае месца. І тут каваль-асілак праз некаторы час заклаў падмурак каплічкі. А ад імёнаў Парфен і Яна, напэўна,  і ўзнікла назва вёскі.

У XV стагоддзі працэс пераўтварэння дзяржаўнай маёмасці ў прыватную паскорыўся. У гэты час Віленскія канонікі атрымалі новыя наданні. На забеспячэнне пасады архідыякана, якая была створана ў 1435 годзе, вялікі князь Вітаўт тады ж вылучыў цэлы абшар, на якім пазней узнік маёнтак Параф'янава. Польскі гісторык Е. Ахманскі мяркуе, што гэты абшар належаў да Куранецкай воласці. Калі гэта так, то тэрыторыя параф'янаўскага маёнтка ляжала на самым ускрайку гэтай воласці, каля мяжы з Докшыцамі і Гняздзілавічамі, якія вылучыліся з Харэцкай воласці. Пры ўтварэнні гэтых маёнткаў засталіся неразмежаванымі лугі і сенажаці па рэчках Бладзь (Блядка), Лыха і Зуя (Зуйка) да самай Сэрвачы. З-за гэтых зямель пазней, у 1460 годзе, сын Яна Манівідавіча Войцех павёў спрэчку з уладальнікам Параф'янавічаў архідыяканам Мацеем. Межавая спрэчка перайшла ў спадчыну да нашчадкаў Манівідаў і цягнулася яшчэ ў XVI стагоддзі.

У XVI стагоддзі Параф'янава належала каталіцкай царкве. У 1559 годзе Параф'янава ўпамінаецца ў адным з дакументаў віленскага біскупства. Тады гэты маёнтак налічваў 66,5 сох і 17 земляў (надзелаў бедных сялян, якія не мелі цяглавай жывёлы). Такім чынам, агульная колькасць падданых складала каля 85-90 сем'яў. У XVII стагоддзі ўладанне віленскага архідыякана Параф'янава ахоплівала вёскі Азарычы, Балтрамеевічы, Выбараўшчыну, Вярэнькі, Галянішча, Грынеўшчыну, Маскалі, Несцераўку, Свіркі, Струкі, Хілаўшчыну, Целяшы, Янавічы. Праўда, памеры вёсак былі невялікімі – ва ўсім маёнтку налічвалася 239 дымоў.




Выява касьцёла ў кнізе “Задыяк на зямлі” 1650 год.

У 1624 годзе ў Парфенаве быў узведзены драўляны касцёл Імя Марыі, спалены маскоўцамі ў час вайны 1654-67 гадоў. Выява гэтага касцёла змешчана на гравюры ў кнізе Э. Зеляевіча “Задыяк на зямлі”. Касцёл адноўлены ў 1675 годзе. У 1904 на яго месцы ўзведзены новы мураваны касцёл, а стары перанеслі ўбок. Ён прастаяў дзесьці да 1925 года, калі яго, па словах старажылаў, разабралі на дровы.

З 1793 года ў выніку другога падзела Рэчы Паспалітай Параф'янава ўвайшло ў склад Расійскай Імперыі і стала цэнтрам воласці Вілейскага павета спачатку Мінскай, потым Віленскай губерні. 18 жніўня 1795 года маёнтак Парфенава Віленскай архідыяцэзіі

быў канфіскаваны, як і большасць маёнткаў, якія належалі каталіцкай царкве, і перададзены расійскаму памешчыку Ашу.

У 1884 годзе Параф’янава ўпамінаецца як мястэчка або сядзіба, дзе пражывала 45 жыхароў, мелася валаснoе праўленне, касцёл, піцейны дом. Дарэчы, у Параф’янаве ў гэты час працаваў адзін з буйнейшых вінакурных заводаў. На ім працавала 10 чалавек. Гадавы выраб спірту вагаўся ад мільёна і больш градусаў. Каля сучаснага касцёла захаваўся той самы бровар.

Паводле перапісу 1897 года ў Параф’наўскай воласці пражываў 9101 жыхар. На той час яна была буйнейшай у параўнанні з другімі валасцямі.

У канцы XIX стагоддзя сярод сялян Параф’янаўскай воласці даволі распаўсюджаным было ткацтва і пража: ткалі мешкавіну, падкладачны матэрыял, на сарочкі і тонкае; ткалі грубае сукно, іншыя шарсцяныя вырабы (цясёмкі, паясы). Свае вырабы сяляне прадавалі на кірмашах і базарах.

У 1902–1906 гадах за два кіламетры ад Парфенава прайшла Балагое-Сядлецкая чыгунка. Там была ўзведзена чыгуначная станцыя, што напачатку атрымала назоў “Парафьяново”, а з 1921 года – “Параф’янаў”. Апошні назоў ужываюць чыгуначнікі і да сённяшняга часу. Там да Першай сусветнай вайны было паравознае дэпо, якое пазней перанесена ў Сеславіна (Крулеўшчыну). Пры станцыі ўзнікла мястэчка Парфенава, дзе ў 1920-39 гг. пражывала шмат яўрэяў, у тым ліку бацька Самуэля Гейдэнсана, амерыканскага палітычнага дзеяча, бацькоў якога ў час нямецкай акупацыі выратавалі ад гібелі Станкевічы з вёскі Целяшы.

У 1908 годзе было пачата будаўніцтва новага цаглянага касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

У 1624-30 гадах у Параф’янаве быў узведзены драўляны касцёл Імя Марыі, спалены маскоўцамі ў час вайны 1654-67 гг. Першая яго фундацыя ажыццёўлена Мельхіёрам Гіляшкевічам, архідыяканам віленскім. Выява гэтага касцёла змешчана на гравюры ў кнізе Э. Зеляевіча “Задыяк на зямлі”. Касцёл адноўлены ў 1675 годзе. У 1908 годзе на яго месцы ўзведзены новы мураваны касцёл, а стары перанесены ўбок. Ён прастаяў дзесьці да 1925 года, калі яго, па словах старажылаў, разабралі на дровы.





У 1908 годзе на сродкі парафіян і намаганнямі ксяндза Б.Корна пачалося будаўніцтва мураванага касцёла, у асноўным завершанае да 1913 года. Аднак святыня была кансекравана толькі ў 1931 годзе арцыбіскупам Р.Ялбржыкоўскім. Гэты помнік архітэктуры псеўдабарока яшчэ больш выразна імітуе пашыраную ў часы барока 2-вежавую базіліку з трансептам. Сцены цалкам змураваны з цэглы і атынкаваны. Фасады ажыўляе багатая ордэрная пластыка: прафіляваныя карнізы,

пілястры, вялікія і разнастайныя па форме аб’ёмы. Унутры цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, бакавыя нефы – крыжовымі. Слупы і сцены расчлянёны падвойнымі пілястрамі і ўпрыгожаны арнаментальным роспісам і гіпсавымі гарэльефамі на тэму “Крыжовы шлях Хрыста”, выкананымі ў 1927 годзе.



Пасля нямецкай акупацыі зноў прыйшла савецкая улада. У 1951 годзе ксёндз Ян Завістоўскі быў арыштаваны ўладамі і асуджаны на 15 гадоў. Зрэшты, сядзеў ён толькі да 1954 года. Аднак з-за канфлікту з парафіяльным камітэтам яго хутка перавялі ў Браслаў. Ужо ў 1963 годзе савецкія ўлады касцёл зачынілі. Людзі пісалі ў дзяржаўныя і партыйныя ўстановы, каб дазволілі аднавіць набажэнствы. З вобласці прыехала камісія ў складзе трох чалавек, якая прапанавала мясцоваму кіраўніцтву разгарнуць у касцёле такую гаспадарчую дзейнасць, якая паступова даводзіла б яго да разбурэння. Так і сталася. У касцёле размясцілі склад Парфенаўскага спіртзавода. Касцёл запоўнілі смеццем ды рознымі скрынямі, унутр будынка заязджалі трактары і машыны. У 1974 годзе праз Парфенава ехаў у саўгас “Сітцы” Пётр Машэраў. Відавочцы распавядаюць, што ён, уражаны жахлівым станам касцёла, сказаў: “Як гэта можна было такі помнік давесці да такога стану?!” Вядома ж, нічога пасля гэтага не змянілася.

Толькі з пачаткам гарбачоўскай “адлігі” людзі пачалі пісаць звароты да ўладаў, каб вярнуць касцёл. Нарэшце, у 1988 годзе вернікі дамагліся свайго. Першую за шмат гадоў Святую Імшу правялі 2 лютага 1989 года. У 1991 годзе той жа саўгас “Сітцы”, які ў часы савецкай улады давёў да жахлівага стану касцёл, за свой кошт збудаваў цагляную плябанію. У 1992 годзе касцёл нанава асвяціў арцыбіскуп Казімір Свёнтэк. У тым жа годзе распачаў сваю працу а. Тадэвуш Кавальскі. За 11 гадоў, калі ён працаваў тут пробашчам, касцёл поўнасцю адрамантавалі і аднавілі. За гэты перыяд адноўлена і капліца ў Кіякове, адчынена новая капліца ў мястэчку Парфенава, абсталяваны парафіяльны дом. З 2001 года Святая Імша праводзіцца на беларускай мове. 26 сакавіка 2004 года ўрачыста адсвяткавана 100-годдзе касцёла.

Цікавы выпадак адбыўся пры ўзвядзенні касцёла. Памешчыкі Дамейка і Слатвінскі вырашылі ў касцёле зрабіць адмыслова для сябе яшчэ адны хоры і далі на гэта драўніну. Ксёндз Баляслаў Корн быў супраць раздзялення людзей у касцёле на багатых і бедных, не згадзіўся і ўтапіў тую драўніну ў рэчцы. Па некаторых звестках, менавіта з-за гэтага інцыдэнта Баляслава Корна перавялі ў іншае месца і прызначылі пробашчам Антоні Віканта. У 1907 годзе касцёл Імя Марыі быў урачыста асвечаны. У 1930 годзе пры касцёле адчынены клуб самадзейнасці, была зроблена мураваная агароджа. У 1935 годзе Параф’янава наведаў арцыбіскуп віленскі Рамуальд Ялбжукоўскі.

Цікавы выпадак у гісторыі касцёла здарыўся ў 1942 годзе. У той час немцы здымалі з усіх храмаў у наваколлі званы. Пробашчам парафіі тады

працаваў ксёндз Вячорак. Калі немцы пайшлі на вежу, каб зняць званы, ён зайшоў туды і нешта з імі гаварыў. Што гаварыў – невядома, але званы не знялі. Праўда, праз некалькі дзён ксяндза ўзялі пад хатні арышт, а потым забралі ў Беразвечча, дзе расстралялі. Апошнімі словамі яго былі: “Няхай жыве Бог, няхай жыве Айчына”. У тым жа Беразвеччы быў расстраляны і ксёндз Мечыслаў Багаткевіч, які нарадзіўся ў недалёкім ад Парфенава фальварку Ямнае і тут правёў першую сваю Святую Імшу. У пачатку 2000-х гадоў Папа Рымскі Ян Павел ІІ Яго, разам з шэрагам ксяндзоў, загінуўшых у гады нямецкай акупацыі, абвесціў благаславёным.



27 сакавіка 2008 года адбылося святкаванне 100-годдзя храма ў Параф’янаве. Урачыстую Святую Месу служыў Яго Прэасвяшчэнства епіскап Уладзіслаў Блін. У мерапрыемствах таксама прынялі ўдзел епіскап Рышард Карпінскі, які спецыяльна прыехаў з Польшчы, а таксама каля 70 святароў і 50 манахіняў з Віцебскай епархіі, шматлікія госці і прыхаджане.

Акрамя касцёла ў вёсцы Параф’янава ў 1999 годзе вернікі каталіцкай канфесіі на станцыі Параф’янава за сабраныя грошы набылі кінуты дом, зрабілі рамонт і хутка там пачалі ладзіць набажэнства. Дзякуючы намаганням і кіпучай дзейнасці ксяндза Параф’янаўскага касцёла Тадэвуша Кавальскага, храм зарас стаіць пад чырвоным дахам, уражваючы праязджаючых сваім прыгожым знешнім выглядам. У 2002 годзе вакол яго была пабудавана новая каменная агароджа.



У 1910 годзе ў Параф’янаве былі пабудаваны два дамы. Мясцовыя жыхары называюць іх “царскія”. Нягледзячы на амаль 100-гадовы ўзрост, выглядаюць яны знешне прыстойна (умелі будаваць нашы продкі). У царскія гады ў гэтых дамах размяшчалася адміністрацыя чыгуначнай станцыі. У адным з іх (аднапавярховым) быў чырвоны куток з вялікай залай, дзе збіраліся на свае сходы, вечары адпачынку чыгуначнікі. Пры Польшчы дом служыў пэўны час як будынак паліцыі, у 1930-33 тут знаходзіліся 4-7 класы Параф’янаўскай школы.

Двухпавярховы выкарыстоўваўся і выкарыстоўваецца як жыллё. Таўшчыня сцен тут дасягае аднаго метра. Таму на падаконніках можна спаць як на ложку. Вышыня столі ў памяшканні дасягае 3,6 метра. Пад’езд да дамоў упрыгожвае прыгожая бярозавая алея. Яе таксама называюць “царскай”.



**“Царскі дом”**

Аднак гэта не адзіныя цікавыя пабудовы ў Параф’янаве. Увагі заслугоўвае былая чыгуначная казарма – зараз жылы дом №1 па вуліцы Чыгуначнай. Аднапавярховы драўляны будынак, збудаваны ў 1903 годзе, аб чым сведчыла таблічка, якая раней вісела на паўднёвым фасадзе будынка. З’яўляецца тыповай жылой пабудовай, якія ўзводзіліся ў 1903-06 годзе пры пракладцы Балагое-Сядлецкай чыгункі. Паводле некаторых звестак, побач стаялі яшчэ дзве такія ж пабудовы, якія страчаны ў час Другой Сусветнай вайны. Пасля вайны часова выкарыстоўвалася як вакзал, зараз з’яўляецца жылым домам.





Два аднолькавыя каменныя склепы збудаваны напачатку XX стагоддзя, хутчэй за ўсё, як сховішчы для правіянту (мясасховішчы) пры чыгуначнай станцыі Параф’янава (пабудовы такога тыпу былі прадугледжаны праектам у сувязі з вялікім вайскова-стратэгічным значэннем Балагое-Сядлецкай чыгункі). Адзін са склепаў часткова разбураны і перабудаваны, другі, які складаецца з дзвюх частак, захаваўся без змен. Знаходзіцца пры вуліцы Чыгуначнай, за 150 метраў на паўднёвы захад ад чыгуначнага вакзала.



У гады польскай акупацыі з 1921 года па 1939 год тут таксама пабудавана некалькі цікавых будынкаў. Адзін з іх – крама. Збудавана з чырвонай цэглы ў 1935 годзе, аб чым сведчыць надпіс, зроблены на паўднёвым фасадзе будынка. Належала аднаму з яўрэяў. Пасля вайны выкарыстоўвалася як пошта, зараз – бібліятэка. Знаходзіцца пры развілцы дарог на Сітцы і Юркаўшчыну на поўдзень ад чыгуначнага вакзала.



Другі – свіран. Збудаваны да вайны. Старажылы называюць часам яго пабудовы 1935-37 гг. Належаў Параф’янаўскай гміне. Знаходзіцца за 200 метраў ад цэнтра вёскі, пры вясковай вуліцы, якая вядзе на Грынеўшчыну.

З 12 кастрычніка 1940 года Параф’янава стала цэнтам сельскага Савета.

Згодна кнізе “Памяць. Докшыцкі раён” – 31 мая 1942 года нямецка-фашысцкія акупанты загубілі ў Параф’янаве 270 чалавек. А ў газеце “Родныя вытокі” № 57 ад 16 ліпеня 2005 года гаворыцца, што 30 мая 1942 года на

станцыі Параф'янава было расстраляна 117 мясцовых жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Вось як успамінае гэта мясцовая жыхарка Яніна Іванаўна Вайцяховіч: "Перад вайной на станцыі Параф'янава жыло шмат яўрэяў. Іх


Тут было гета

гета ў час вайны знаходзілася ў раёне вуліц Савецкай, Камуністычнай і Садовай. Тым ранкам я выбегла на вуліцу пагуляць. Было вельмі ціха. Аднак цішыню перарваў лай сабак і крык нямецкіх салдат. Я паглядзела і ўбачыла доўгую калону людзей. Яны ішлі ў бок чыгуначнага вакзала. Па баках калоны, спераду і ззаду, ішлі салдаты з аўтаматамі і сабакамі. Людзей падвялі да глыбокай ямы, якую некалькі дзён капалі мужчыны з Параф'янава і навакольных вёсак. Салдаты выводзілі людзей з калоны групамі, падводзілі да ямы і расстрэльвалі. У час расстрэлу ад групы яўрэяў аддзялілася яркая чырвоная сукенка – дзяўчынка гадоў 13 спрабавала выратавацца. Але куля дагнала. Да ямы жывую, ці ўжо мёртвую, цягнулі па зямлі двое мужчын. У той жа дзень мы даведаліся, што расстрэльвалі яўрэяў маладыя хлопцы з нашай вёскі.

Калі немцы пакінулі вёску

Страшным быў і той дзень, калі па вуліцы вялі калону рускіх ваеннапалонных. Іх было дваццаць ці трыццаць. Змучаныя, аброслыя, яны тужліва крочылі па дарозе.

- У нашым двары быў калодзеж, таму іх завялі да нас, - узгадвае Яніна Іванаўна. – Мама пабегла за буханкай хлеба, папрасіла ў канваіра дазволу пакарміць галодных. Той згадзіўся, але загадаў парэзаць хлеб на кавалачкі і выдаваць па аднаму кожнаму палоннаму. З якой асалодай елі тыя людзі крошкі. А вось бульбу, прынесеную матуляй з варыўні, зварыць не дазволілі, аддалі палонным сырую і павялі небарак далей.

На станцыі Параф'янава да пачатку лютага 1943 года фашысты сабралі вялікую колькасць сена, збожжа, лесаматэрыялаў. Памяшканні гарнізона (каля 130 гітлераўцаў маршавых падраздзяленняў вермахта) былі агароджаны дротам, падступы ахоўвалі 3 агнявыя кропкі. У ноч на 18 лютага 1943 года партызанскія атрады брыгады "Жалязняк", каб адцягнуць увагу ворага, абстралялі казармы і ўмацаванні суседняга гарнізона ў горадзе Докшыцы, потым нанеслі ўдары па станцыі. У выніку бою партызаны разбурылі будынак вакзала, станцыйную гаспадарку, спалілі 3 склады са збожжам і сенам, лесапільны завод, пашкодзілі вадакачку і 5 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.





У 1961 годзе на Брацкай магіле 55 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у скверы, каля чыгуначнага вакзала, пастаўлены помнік – скульптура воіна.

1 верасня 1988 года ў Параф'янаве ўступіла ў строй новая школа.

11 ліпеня 2005 года на станцыі Параф'янава быў адкрыты мемарыяльны знак на месцы, дзе 30 мая 1942 года было расстраляна 117 мясцовых жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Мемарыяльны знак, які ўяўляе сабой рассечаны камень з пазалочаным надпісам, увасабляе абарванае



жыццё, каштоўней за якое няма нічога на свеце. Помнік установлены на тэрыторыіаптовых складаў раённага спажывецкага таварыства. У хуткім часе тут вырастуць, набяруць сілы кусты туі, якія пасадзілі ў памятны дзень члены дэлегацыі яўрэйскай абшчыны.

У 1970 годзе да Параф'янава далучылася вёска Шантары. Зараз тут пражывае каля 1150 чалавек.

У верасні 2008 года ў аграгарадку Параф'янава з'явіўся прыродны газ. Урачыстасці ў Параф'янаве, дзе сімвалічны факел пуску газу запаліў кіраўнік вобласці Уладзімір Андрэйчанка, спецыяльна супалі са святкаваннем 601-годдзя Докшыц.



15 чэрвеня 1902 года ў Параф'янаве нарадзіўся Бабровіч Ян (Іван) Станіслававіч (партыйныя псеўданімы Борскі Казімір Іванавіч, Сымон, Казік). Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, публіцыст. З 1916 года веставы і перапісчык папер у ваенна-дарожным атрадзе на Вілейшчыне, з 1917 года наглядчык Мінскага тэлеграфа на лініі Ратамка-Мінск. У 1918-1920 гадах вучыўся ў гімназіі і на рабфаку ў Вільні. У 1921 годзе інспектар школьнага ўпраўлення ў Мінску-Мазавецкім (Польшча). Вучыўся ў Пражскім універсітэце (1922 – 25 гадах), дзе вёў камуністычную прапаганду сярод студэнтаў беларусаў. Член Камуністычнай партыі Чэхаславакіі з 1923 года, член КПЗБ з 1926 года. З 1926 года на партыйнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Кааптаваны у ЦК КПЗБ, яго прадстаўнік пры ЦК Беларускай сялянска-работніцкай грамады і палітычны рэдактар газет БСРГ "Жыццё беларуса", "Беларуская Ніва", "Беларуская справа", "Народная справа", "Наша справа" і інш. На 6-м з'ездзе (1927) Кампартыі Польшчы выбраны кандыдатам у члены ЦК КПП. 23 снежня 1928 года арыштаваны, асуджаны да 15 гадоў турмы. Пакаранне адбываў у турмах Вронкі, Равічы, у Беластоку. 3 верасня 1932 года ў СССР у выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР. Сааўтар (з Я. Багданскім) брашуры "Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-работніцкай грамады" (1932). 18 кастрычніка 1933 года арыштаваны па справе "Беларускага нацыянальнага цэнтра" і 9 студзеня 1934 года паводле пастановы судовай калегіі АДПУ асуджаны да 10 гадоў зняволення. Пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе. 14 жніўня 1939 года Амурскім абласным судом асуджаны яшчэ на 10 гадоў пазбаўлення волі і накіраваны ў Севера-дзвінскі лагер (Амурская вобласць) дзе і памёр 8 студзеня 1943 года. Рэабілітаваны па абодвух прысудах 16 жніўня 1956 года.

6 (18) красавіка 1891 года нарадзіўся Лявон Гмырак (літаратурны псеўданім Барыс Заяц, Лявон Хмуры; сапраўднае прозвішча Мечыслаў Бабровіч). Беларускі крытык, публіцыст і празаік. Біяграфія вывучана недастаткова, магчыма, што ён з'яўляецца братам дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Я.С. Бабровіча.

Біяграфічныя звесткі пра яго змешчаны ў газеце "Беларусь" (1920, № 145), дзе надрукаваны малавядомы артыкул Максіма Гарэцкага "Лявон Гмырак (1891 – 1915)".

Бацька яго служыў ляснічым у паноў Слатвінскіх. Матка яго – полька з Варшавы. Пад яе ўплывам рос Гмырак і змалку быў вельмі рэлігійны. На адзінаццатым годзе жыцця паступіў ён у 1-ю Віленскую гімназію. Спачатку вучыўся вельмі добра і быў пераведзены ў бясплатны пансіён. Надта многа чытаў, асабліва па-польску; галава яго была забіта героямі Сянкевіча, і ён нават рабіў тады дзіцячую спробу пісаць аповесць – па-польску і з польскай гісторыі. З прыходам 1905 года чад польскага патрыятызму ў яго значна слабее; хлопца захопліваюць ідэі сацыялізму, ён заводзіць бібліятэку з забароненых кніжак, піша ў вучнёўскі часопіс. Каліж рэвалюцыя была знішчана і царскі ўрад не дараваў нават дзецям, на Гмырака таксама нехта данёс, да яго прыйшлі з рэвізіяй, знайшлі забароненыя кніжкі і павялі ў турму. Дзякуючы малалецтву, суд зменшыў кару да 6 месяцаў астрогу, якія Лявон і адседзеў у Вільні. Маці яго ў гэты час захварэла на сухоты.

Выйшаўшы на волю, Гмырак прыехаў дамоў, дзе троху чытаў, вучыў дзяцей у суседа-пана, а найболей сядзеў, заціснуўшы вусны, і слухаў ад бацькі розныя дакоры. У 1908 годзе яму ўдалося паступіць у прыватную тэхнічна-прамысловую школу ў Варшаве, якую скончыў у 1912 годзе. У Варшаве Гмырак пазнаёміўся з беларускім рухам і сам прымкнуў да яго. Гэта была новая непрыемнасць для бацькоў, і на гэты раз абое ішлі ў адно проціў няўдалага сына. Але сын незвычайна любіў усё роднае, любіў родны народ.




Восенню 1912 года Лявона забіраюць у салдаты. Некалькі месяцаў служыў ён у Маскве ў грэнадзёрах, але пазней быў адпушчаны па льгоце. Вайна 1914 года захапіла і Гмырака. Блізка году прабыў ён у апалчэнскай дружыне ў Коўне, а пасля як прапаршчык пайшоў на пазіцыю і ў баях пад крэпасцю загінуў, здабыўшы за адвагу Георгіеўскі крыж.

Паводле сведчання М. Гарэцкага, Бабровіча любілі і паважалі пісьменнікі. У сваім памінальным цыкле "Задушкі" ягоны блізкі сябра Змітрок Бядуля пісаў:

Лявон Гмырак з душой магутнай
Любіў бязмер свой край пакутны,
Сасонка Віленшчыны сумнай,
Дзіця Вяллі, ракі задумнай,

Хацеў рассеяць ён туман,
Хацеў ён волі для сялян.
Святлейшых, лепшых, шчасных дзён
Жадаў для брата свайго ён...

У 1992 годзе ў Мінску выдадзена першая кніга Л. Гмырака “Творы: Проза. Крытыка. Публіцыстыка”, у якую ўвайшла большая частка літаратурнай спадчыны пісьменніка.

Памёр 30 чэрвеня (13 ліпеня) 1915 года.



10 кастрычніка 1903 года ў Параф’янаве нарадзіўся Дукельскі Уладзімір Аляксандравіч – амерыканскі кампазітар, піяніст, паэт і перакладчык. У 1914-19 гадах вучыўся ў Кіеўскай кансерваторыі па класах фартэпіяна, тэорыі музыкі і кампазіцыі. З 1919 года з сям’ёй выехаў у Турцыю. З 1921 года ў ЗША, дзе па прапанове Дж. Гершвіна ўзяў псеўданім Дзюк Вернон, якім спачатку падпісваў песні і джазавыя кампазіцыі, а з 1955 года – усе музычныя творы. Напісаў фартэпіянны канцэрт для А.Г. Рубінштэйна (1922 год), па запрашэнні якога з 1924 года працаваў у Парыжы, дзе стварыў музыку да балета “Зефір і Флора” для трупы С.П. Дзягілева (1925 год) і Першую сімфонію (1928 год). У 1925-29 гадах пісаў музыку для тэатральных пастановак у Лондане, у тым ліку да аперэты “Івона”, музыкальнай камедыі “Жоўтая маска”. У 1929 годзе вярнуўся ў ЗША, пісаў музыку да фільмаў. Самыя вядомыя яго кампазіцыі “Красавік у Парыжы” (1932) на вершы Э. Харбурга, якую выконвалі дзесяткі музыкантаў – ад К. Бейсі да Л. Армстранга, і “Восень у Нью-Йорку” (1934), напісаная на ўласныя вершы для пастаноўкі на Брадвеі, мюзікл “Хіжына ў небе” (1940, харэаграфія Дж. Баланчына). Аўтар Другой (1930) і Трэцяй (1946) сімфоній, араторыі “Канец Санкт-Пецярбурга” (1938), оперы “Барышня-сялянка” (1958), балетаў. У апошнія гады жыцця ствараў музыку да кінафільмаў і тэатральных пастановак, песні, камерныя творы. Апублікаваў звыш 100 артыкулаў аб музыцы і тэатры, аўтабіяграфію “Пашпарт у Парыж” (Бостан, 1955), зборнік эсе аб музыцы “Слухай!” (Нью-Йорк, 1963), зборнік вершаў на рускай мове “Пасланні”, “Пакуты немаладога Вертэра” (абодва 1962), “Карцінная галерэя” (1965), “Паездка кудысьці” (1968). Перакладаў англійскіх і амерыканскіх паэтаў Э. Паўнда, Р. Фроста, К. Сандбурга, Д. Паркера і іншых. У 1942-44 гадах у званні лейтэнанта служыў у войсках Берагавой аховы ЗША. Заснавальнік і прэзідэнт “Таварыства забытай музыкі” (1947). Яго імя занесена ў Залу гонару аўтараў песень Нацыянальнай акадэміі папулярнай музыкі ЗША (1970). Памёр 16 студзеня 1969 года ў горадзе Санта-Моніка, штат Каліфорнія (ЗША).

Виталий Михайлович Боровой родился 18 января 1916 года в селе Нестеровка Борисовского уезда Минской губернии (сейчас Парафьяновский

сельсовет, Докшицкого района) в бедной крестьянской семье. После окончания семиклассной народной польской школы поступил в 4-й класс Виленской духовной семинарии. В 1936-1939 годах учился на православном богословском факультете Варшавского университета.

С марта 1942 года служил секретарем Минского архиепископа Пантелеимона (Рожновского). Чудом избежал депортации в Германию. Затем вернулся к родственникам в Минск, где 29 октября 1944 года состоялась диаконская, а 1 ноября - пресвитерская хиротонии.



В 1945 году благодаря его стараниям было возобновлено преподавание в Минской духовной семинарии, и несколько лет своей жизни он отдал этому учебному заведению. В 1953 году отец Виталий Боровой экстерном окончил Ленинградскую духовную академию со степенью кандидата богословия, в сентябре 1954 года был назначен старшим помощником инспектора академии и преподавателем истории древней Церкви. Многие годы он преподавал в Духовных академиях Русской Православной Церкви - сначала Санкт-Петербургской, в то время Ленинградской, а позже и Московской.

Широко известны его труды на ниве межхристианских и международных контактов Русской Православной Церкви. Значительным является и его вклад в межправославные отношения - отец Виталий принимал активное участие в процессе подготовки Великого Собора Православной Церкви.

С 5 июня 1959 года отец Виталий Боровой являлся сотрудником Отдела внешних церковных сношений Московского Патриархата, занимал ответственные должности, в том числе заместителя председателя отдела.

28 августа 1960 года он вошел в состав учрежденной Святейшим Патриархом Алексием I Комиссии по межхристианским связям Русской Православной Церкви (с 1963 года - Комиссия Священного Синода по вопросам христианского единства, в настоящее время Синодальная Богословская комиссия).

В течение многих лет отец Виталий Боровой являлся активным участником множества международных и межцерковных форумов, представлял Русскую Православную Церковь в межхристианских организациях, в том числе во Всемирном Совете Церквей. С 1961 по 1991 годы он являлся членом Центрального комитета ВСЦ. 10 октября 1962 года постановлением Священного Синода назначен членом делегации наблюдателей Московского Патриархата на II Ватиканском Соборе.

Совершал пастырское служение в различных храмах как в стране, так и за рубежом - отец Виталий был настоятелем Петропавловского собора города Гомеля, храма Рождества Богородицы в Женеве, Богоявленского собора в Москве. С 1984 года протопресвитер Виталий Боровой являлся почетным

настоятелем московского храма Воскресения Словущего в Брюсовом переулке.

Паміж Параф’янавым і Заборцамі цячэ невялікая рачулка. Яшчэ ў дакументах XV стагоддзя яна згадваецца пад назвай Бладзь. У народзе яна заўжды называлася Блядка, тое ж напісана і на карце другой паловы XIX стагоддзя, у “Слоўніку геаграфічным” 1880-х гадоў”, на польскіх зямельных планах. У савецкі час яе перайменавалі ў Галядзу, ды нават мясцовыя старажылы не маглі ўзгадаць, адкуль узялася такая назва. У 2004 годзе дарожнікі паспрабавалі знайсьці “кампрамісны” варыянт паміж сапраўднай назвай і літаратурнымі нормамі, напісаўшы на знаку “р. Балядка”. Зараз той знак зняты і заменены на “р. Галядза”.

А хто не ведае вядомага навукоўца, падарожніка, пісьменніка Ігната Дамейку. У адказах на пытанні, дзе і калі нарадзіўся І. Дамейка, не ўсё адназначна. Аўтар «Польскага гербоўніка» Адам Банецкі сцвярджае на падставе касцельнай метрыкі, запісанай чамусьці ў Параф’янаве, што прыйшоў ён на свет у 1802 годзе. А гэта цяпер Докшыцкі раён Віцебскай вобласці. У Параф’янаве хрысцілі і іншых прадстаўнікоў роду Дамейкаў, напрыклад, малодшага брата Ігнацага Казімежа. На тым жа мястэчку настойвае адзін з нашчадкаў вучонага (па кудзелі) Мар’юш Германовіч, які цяпер пражывае ў Францыі. За ім такія ж звесткі трапілі і ў беларускі друк. Аднак сам вучоны недвухсэнсоўна і паслядоўна месцам свайго нараджэння, родным сваім домам называў сядзібу ў Медзвядцы, абапіраючыся тут, напэўна ж, на вестках, атрыманых ад маці. Блытаніна ж з метрыкай, як мне здаецца, магла ўзнікнуць ад таго, што яна трапіла ў Параф’янава ў сувязі з пазнейшым хрышчэннем там брата Казімежа. Зрэшты, сваякі І. Дамейкі хрысціліся ледзь не па ўсёй Літве-Беларусі (метрыка бацькі, напрыклад, аказалася ў Заслаўі). І на тое былі свае прычыны (разгалінаванасць роду, звычай жанчын ездзіць на час родаў да сваіх маці).

# Парэчча

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

Вяртаюся ў Парэчча –
Кут дзяцінства!
Але чаму так пабліжэў
Далекі лес і многа ў ім прагалаў?
Чаму кусты здічэлі,
Дзе хаваліся фіялкі?
Чаму так рэчка Сэрвач
Абмялела й зарасла?
А веска як аглухла!
А некалі звінелі ж салаўямі,
Ім падпявалі нашы галасы:
Мы бегалі за майскімі жукамі,
Якіх тут было проьма ...
Стаю, здзіўляюся: чаму не тое
Мае Парэчча бачу прад сабой?
Адгадка простая:
Няўмольны час таму віной.

***Марыя Дзюбак***

У пачатку XX стагоддзя Парэчча ўваходзіла ў Параф’янаўскую воласць Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 76 жыхароў. З 1921 года па 1939 год Парэчча знаходзілася ў складзе Польшчы.

Страшны лёс наканаваў Парэчча ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як успамінае Алена Антонаўна Шылько – у час нямецкай акупацыі ўсе, каму споўнілася 15 гадоў, ішлі на работу. Мы з сястрой кожны дзень хадзілі ў Сітцы на розныя работы. У лагеры усіх працаздольных забіралі на розныя работы. Над кожным стаяў надзірацель, ахоўвалі нас моцна. Кармілі нас 1 раз у дзень. Потым людзі сталі хварэць на тыф. Адзін дзяцёнак памёр. Яшчэ адна жанчына з малым дзіцём з Будслава захварэла. За ёй прыехаў бацька і на каленях прасіў немцаў аддаць хворую дачку і ўнука. Аддалі, але ні дачка, ні ўнук не выжылі.

Аднойчы каля вёскі Курдзекі ўзарвалася на міне пара коней, на якой ехаў нямецкі афіцэр. Было данесена ў камендатуру, што міну падклалі людзі з Парэчча. Немцы вырашылі нас пакараць. 29 красавіка 1944 года яны акружылі нашу вёску. Усіх мужчын забралі з сабой. Каля вёскі Курдзекі іх заставілі капаць яму. Потым па двое забівалі над ямай. Яшчэ дваіх прымушалі глядзець, каб не вылазілі з ямы параненыя. Тых, хто стараўся выбрацца наверх, проста дабівалі. Так забілі васьмярых чалавек – шасцярых мясцовых і дваіх бежанцаў, якія жылі ў Парэччы. Але на гэтым не спыніліся

нямецкія карнікі. 1 мая 1944 года немцы зноў акружылі Парэчча, усіх жыхароў вывезлі ў Сітцы і кінулі ў лагер, які знаходзіўся каля былога панскага маёнтка. Калі нас вывезлі з Парэчча, вёску нашу спалілі.

У лагеры мы знаходзіліся да канца мая. Калі нас выпусцілі, то вяртацца не было куды. Мы жылі ў суседняй вёсцы Войтовічы, а знаёмыя з суседніх вёсак давалі нам прадукты харчавання.

Зараз тут пражывае каля 30 чалавек.






У Парэччы нарадзілася Марыя Дзюбак. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала дырэктарам Лісавіцкай базавай школы, зараз выкладае беларускую мову і літаратуру ў Сітцаўскай сярэдняй школе, якую, дарэчы, калісьці скончыла сама. Вершы пачала пісаць яшчэ ў школьныя гады. Друкавалася ў “Настаўніцкай газеце”, “Беларускай ніве”, у раённай газеце “Родныя вытокі” і іншых перыядычных выданнях. Была пераможцай многіх рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў. У сваёй першай паэтычнай кнізе “Светлыя ростані” змешчана паэма “Маёвая малітва”, у якой расказваецца пра трагедыю Парэчча ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У той трагедыі загінуў і яе дзед Аўгусцін.



22 чэрвеня 1960 года ў вёсцы Парэчча нарадзіўся Іван Мікалаевіч Будзіч. У 1977 годзе пасля заканчэння школы паступіў на мастацка-графічны факультэт педагагічнага інстытута ў горадзе Віцебск.

За час вучобы пачаў прымаць удзел у выставах экслібрыса.

У 1982 годзе паспяхова абараняе дыпломную работу па твору Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”. У гэты ж час атрымлівае запрашэнне працаваць мастаком у выдавецтве “Мастацкая літаратура”.

Пасля заканчэння інстытута з 1982 года па 1989 год працаваў настаўнікам Каменскай сярэдняй школы. А з 1989 года працуе настаўнікам у школе мастацтваў горада Лепель.

У 1992 годзе першая паездка ў Германію і выстава работ у інстытуце Штрайзермана. У 1995 годзе першая паездка ў Данію, праца ў школе і выстава работ. У 1998 годзе чарговая выстава работ у Даніі. У 1999-2000 гадах працаваў і выстаўляўся ў Германіі.

За адзін кіламетр на паўночны ўсход ад Парэчча, у лесе, знагодзіцца курганны могільнік. Тут знаходзяцца 36 насыпаў вышынёй 0,5-1,2 метра і дыяметрам 4-8 метраў. У 1971 годзе могільнік абследаваў А.Р. Мітрафанаў. Аднак раскопкі тут не праводзіліся.

# Пасекі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Пасекі ўваходзілі ў Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 96 жыхароў, мелася 84 дзесяціны зямлі. З 1921 года па 1939 год Пасекі знаходзіліся ў складзе Польшчы. У 1949 годзе тут арганізаваны калгас імя Калініна. Зараз тут пражывае каля 25 чалавек.



20 красавіка 1931 года ў Пасеках нарадзіўся Кузьміцкі Баляслаў Браніслававіч – беларускі вучоны ў галіне фармакалогіі. Доктар медыцынскіх навук з 1974 года, прафесар з 1978 года. У 1958 годзе скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. З 1959 года па 1960 год працаваў урачом Даўгінаўскай бальніцы Крывіцкага раёна Мінскай вобласці. З 1963 года працуе на кафедры фармакалогіі Мінскага медыцынскага інстытута, з 1974 года дацэнт кафедры, а з 1976 года – загадчык гэтай кафедры. У 1982 годзе становіцца загадчыкам аддзела біядаследаванняў Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай АН Беларусі. Аўтар 300 навуковых прац у галіне імунафармакалогіі, 50 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. З'яўляецца вучоным сакратаром экспертнага савета ВАК Беларусі, членам савета па абароне дысертацый, намеснікам старшыні грамадскага аб'яднання фармаколагаў Беларусі.

На захадзе ад вёскі бярэ пачатак рака Астраўлянка (левы прыток ракі Бярэзіна, басейн Дняпра). Даўжыня ракі 9 кіламетраў. Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае.

# Пералоі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Вёска Пералоі ўзнікла на тэрыторыі маёнтка Порплішча, што належаў у розныя часы Чартарыйскім, Зяновічам, Радзівілам, Вітгенштэйнам. У 1795 годзе – 23 двары, 98 душ. У 1870 годзе 25 душ мужчынскага полу. Паводле выдання "Słownik Geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich" 1887 года, Пералоі – вёска па-над ракой Барсучанкай (суч. Астраўлянка), 10 дамоў, 59 чалавек.





Па звестках за 1930 год, у вёсцы Пералоі гміны Порплішча Дзісненскага павета 32 двары, 184 чалавекі, 230 дзесяцін зямлі. У 1949 годзе арганізаваны калгас імя Суворава, пасля чаго праз некаторы час Пералоі сталі выміраючай вёскай. У XIX стагоддзі на могілках побач з вёскай збудавана драўляная капліца. Гэты драўляны чатырохкутны будынак з невялікімі акенцамі з першага погляду цяжка назваць капліцай. Ён хутчэй нагадвае лазню. Хіба што на дзвярах намаляваны фарбай крыж. Унутры яна абклеена шпалерамі, вісіць крыж са старадаўняй выразанай з дрэва фігурай Хрыста.



У 2004 годзе побач з ёй пачала будавацца новая каплічка з белай цэглы. Ніхто не падумаў аб тым, што лепш было б аднавіць старую

# Першамайск

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Першамайск уваходзіў у Докшыцкую воласць Барысаўскага павета. Тады тут пражывала 125 жыхароў. З 1921 года па 1939 год Першамайск знаходзіўся ў складзе Польшчы. У 1949 годзе тут арганізавалі калгас “1 Мая”. Дарэчы, да 1964 года Першамайск называўся Свінное.

Зараз у вёсцы пражывае каля 30 чалавек.

# Плiскi

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

У 1870 годзе маёнтак Плiскi належаў дзяржаве. У пачатку XX стагоддзя Плiскi ўваходзілі ў Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе тут пражывала 124 чалавекі. У гэтыя гады побач з вёскай знаходзілася аднайменная сядзіба, якой валодаў Рудамін.

З 1921 года па 1939 год Плiскi знаходзіліся ў складзе Польшчы. У кастрычніку 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 23 двары і загубілі 4 чалавек.

Зараз у Пліскax пражывае каля 30 жыхароў.

У XIX стагоддзі каля вёскі знойдзены дзве каменныя сякеры.

# Плітніца

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

У XIX – пачатку XX стагоддзяў Плітніца ўваходзіла ў Докшыцкую воласць Барысаўскага павета і з’яўлялася ўласнасцю Галаўнёвых. У 1887 годзе тут налічвалася 8 двароў, а ўжо ў 1909 годзе ў Плітніцы было 16 двароў і 97 жыхароў. З вёскай межаваўся аднайменны фальварак, дзе быў 1 двор з 5 жыхарамі. З 1921 года па 1939 год Плітніца ўваходзіла ў склад Польшчы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Плітніцы пашанцавала. Яна не была спалена. І хаця людзі тут ніколі не былі заможнымі, усе малазямельныя, але не жылі ў зямлянках. Стаць хутчэй на ногі дапамог смалакурны завод, які стаў працаваць яшчэ пры Польшчы. У бярэзінскіх лясах узрывалі карчы, звозілі на смалакурню і тут выраблялі дзёгаць, шкіпінар, драўнінны вугаль. Амаль усе вяскоўцы тут і працавалі. Калгаснікамі ніколі не былі. Мелі па 15 сотак, грашовую зарплату, якую калгаснікі яшчэ ўбачылі не хутка.

У пачатку 1990-х гадоў завод закрылі.

Плітніца ніколі не была вялікай вёскай. У самы свой росквіт – 60-ыя гады XX стагоддзя – мела 45 двароў, дзе жыло каля 150 чалавек. Сёння гэта колькасць зменшылася да 17 двароў, у якіх пражывае каля 25 чалавек.

# Порплішча

*Цэнтр Парплішчанскага сельскага Савета*

Цікавая гісторыя ў Порплішч,
Царква вясковая раскажа нам аб ёй.
Каля трохсот гадоў стаіць гэта каштоўнасць,
Узнятая з легенды над дрыгвой.
А пры дарозе, у цэнтры вёскі,
Мы бачым помнік-абеліск,
Заўжды сюды прыносім кветкі
І славім мужнасць, гераізм.
Да роднага, знаёмага з дзяцінства
Хінуся сэрцам, і душой .
Ты сэрцам міла кожнаю сцяжынкай,
Часцінкай я сябе лічу тваёй.
Ты ў мяне адзіная ў свеце,
Радзіма мілая мая!
Ты для мяне як хлеб, як маці –
Мой родны кут, мая зямля.

***Святлана Чачуковіч***

Згодна мясцоваму паданню, назва гэтая паходзіць ад першапачатковай - Праклішча.

Некалі даўно-даўно, у далёкія часы, калі пры славутым Глыбоцкім тракце не стаяла яшчэ ніводнай вёскі, ніводнага хутарочка, толькі лясныя звяры гаспадарылі ў тутэйшых мясцінах, а навокал ляжалі непралазныя ды непраходныя балоты, задумаў быў адзін купец з далёкіх краёў праехаць у Глыбокае на таргі. Нагрузіў ён вялікі абоз усемагчымых тавараў, наняў моцную ахову, запрасіў з сабой сяброў-купцоў і, развітаўшыся з роднымі, выбраўся ў дарогу. Праўда, яшчэ калі збіраўся, то жонка неяк адвячоркам нерашуча сказала:

- Можа б, ты, чалавеча, не спяшаўся так?

- З якой гэта нагоды я адкладваць стану? - здзівіўся той. - Для мяне кожны ўпушчаны цяпер дзень дорага каштуе. Паспрабуй зарабіць тую залатоўку ...

- Я не пра заробкі кажу, мужу, я пра іншае гамонку вяду.

- То пра што тады?

- Разумееш, мінулай ноччу мне сон дзіўны прысніўся. Ніколі такога ліха не бачыла. Калі прачнулася, то ўся мокрая з перапуду была. Спачатку хацела цябе будзіць, а потым ужо адумалася, што ты і так стаміўся, за цэлы дзень набегаўшыся.

- І што ж табе снілася?

- Як толькі я задрамала, то ўваччу паўстаў нейкі дзіўны чалавечак ... Невысокага расточку, з даўжэзнай, зблытанай барадою, з хітрымі вочкамі ... Ен нічога не га варыў, а толькі перасцерагальна махаў перад тварам рукамі, нібы не пускаў кудысьці ... Здавалася, што так і ўчэпіцца зараз за валасы ...

- Дык і што з таго, што ён рукамі махаў?

- А раптам ён гэтым самым не мяне, а цябе, мужу, перасцерагаў? Не хацеў, каб ты зараз у дарогу выбіраўся ... Прасіў счакаць крыху дома ...

- Я заусёды ў такую часіну выбіраўся, і нічога не здаралася. Адзін у глухіх мясцінах, дзе разбойнікі гаспадарылі, ездзіў, і нея  жа абыходзілася ... А на гэты раз ахоўнікаў наняў, слуг, фурманаў колькі едзе, сяброў запрасіў – і яны не адмовіліся, бо таксама выгаду нейкую хочуць атрымаць...

- Я ж не супраць таго, каб ты ехаў, а супраць таго, каб тэрмінова ... Можа, счакаў бы які тыдзень-другі?.

- А кірмаш гэтулькі ж часу цягнуцца будзе? Ты думаеш, што гаворыш?

- Каб не думала, дык нічога не казала б.

- Прабач, родная. Я толькі пра сябе ўсё думаю, а тое, што ты перажываеш, неяк і з галавы выскачыла. Прабач.

- Дык ці застанешся?

- Не, давядзецца ехаць, бо і час ідзе, і слугі будуць абы-што плявузгаць, вої пачнуць зачэпку якую шукаць, і сябры могуць адмовіцца ... Бачыш, колькі усяго назвязвалася?      .

- Так, але ж боязна мне ...

- Нічога, Богу памолімся дый паедзем. Не адзін раз ён мяне выручаў і на гэты раз не кіне.

Праз пару дзён купец той з абозам выбраўся ў дарогу. Памаліліся, развіталіся і паехалі. Ніщто не прадказвала непажаданую сустрэчу ці бяду. Гаспадар адразу пачаў падганяць возчыкаў, каб нагнаць упушчаны час, а калі праехалі пару дзён, то загадаў, як яго вопытныя людзі ні адгаворвалі, збочыць на бакавую дарогу і такім чынам значна скараціць шлях. Стары фурман прабурчаў:

- Хто так ездзіць, той з чарцямі вячэрае.

- Ты, стары, меней гамані, а выконвай, што загадана, - раззлаваўся гаспадар. - Я пагэтай дарозе ўжо ездзіў.

- А я, колькі ні езджу, ні разу не чуў, каб нехта па ёй у Глыбокае прабіваўся.

Тады сам купец разам са старым фурманам павёў пярэдні воз з таварамі. Нейкую вярсту коні ішлі, а потым заупарціліся: стаяць на месцы і б'юць капытамі. Усё ж неяк далей праціснуліся і апынуліся ў непралазных лясных нетрах.

- Ну што я гаварыў? - запытаўся стары.

Купец нічога не адказваў, бо і сам ужо добра разумеў, што завёў абоз у благую мясціну.

- Мне яшчэ мой бацька-нябожчык гаварыў, - ужо спакойна пачаў фурман, - што ў гэтых мясцінах балотнік людзей палохае, а каторыя асмеляцца ў ягоныя ўладанні ўступіць, то могуць і жыцця пазбавіцца.

- Вось яно што... Дык вось што за маленькі старысніўся маёй жонцы... Гэта, відаць, ён мяне і перасцерагаў, а я не паслухаўся ...

- Нічога, гаспадар, яшчэ не ўсё страчана, будзем неяк ратавацца.

- Што ж тут рабіць?

- Дарогу трэба шукаць.

Купец загадаў усім не рухацца з месца, а сам з фурманам пайшоў шукаць дарогу. За ім увязалася і старая кабылка.

Хутка сцямнела. Фурман з купцом спыніліся на выспачцы, бо баяліся ў гэткай цемры ў дрыгву праваліцца, і раптам зусім побач заіржала кабылка. Фурман адразу сцяміў, што да чаго, павярнуўся, схапіў яе за хвост і гаворыць:

- Толькі яна нас цяпер і выратуе. Давай, гаспадар, руку.

Купец са страху не мог ступіць ні ўзад ні ўперад.

- Ды я лепш да раніцы тут, на сухім месцы, сядзець буду, чым пайду за тваёй кабылкай.

Але фурман усё-такі пацягнуў купца за сабой. І што вы думаеце? Не паспелі яны з дзесятак крокаў прайсці, як замест багністай гразі адчулі пад нагамі цвёрдую дарогу. Вось як кабылка вывела іх на тракт. Стары фурман вярнуўся і вывеў астатніх на высокае месца.




Узрадаваны купец вырашыў у гонар свайго выратавання ўзвесці тут храм Божы.

- Месца тут праклятае, дык няхай стаіць на страх усялякім лесунам і ведзьмакам.

Спачатку нібы і сапраўды стаяла царква пры тракце, а потым каля яе, у Праклішчы, пачалі сяліцца людзі. А калі вёска пабудавалася, разраслася ды папрыгажэла, людзі перайменавалі Праклішча ў Порплішча.

Упершыню вёска Порплішча ўпамінаецца ў 1529 годзе. Невядома якім чынам невялікая частка Докшыччыны трапіла да князёў Чартарыйскіх – уладальнікаў Лагойска. Апошні з гэтай галіны, князь Сямён Аляксандравіч Чартарыйскі, у пачатку XVI стагоддзя валодаў Порплішчам і нейкім Вапленым (месцазнаходжанне апошняга невядома, але на першы погляд назва вёскі падобна да Лапліна), якія ён прадаў у гэты час яшчэ аднаму буйнаму землеўладальніку – пану Юрыю Іванавічу Зяновічу. З гэтага часу Порплішча далучана да вялікай вотчыны Зяновічаў, якая ляжала далей на поўнач, у сучасным Глыбоцкім раёне.

Па меры ўшчыльнення забудовы, аднавулічныя паселішчы пераўтварыліся ў шматвулічныя. Звычайна восямі новых вуліц былі дарогі. Так, у вёсцы Порплішча перасячэнне дарог вызначыла крыжападобную планіроўку.

У архітэктурным плане для Порплішч характэрна было, каб у кожнай сялянскай гаспадарцы знаходзілася гумно. Апошняе гумно захавалася да XX стагоддзя. Яно ўражвала памерамі. Два рады слупоў – сох, злучаных папарна, трымалі высокую страху. Слупы абапіраліся на падкладзеныя ўнізе валуны. Збоку мелася прыбудова з конным манежам



У пачатку XVII стагоддзя Порплішча ўзгадваецца як сяло Троіцкае, уладанне Забрадоўскіх. У 1627 годзе тут з дрэва была пабудавана ўніяцкая царква. Фундатарамі яе былі Францішак і Ганна Зебржыдоўскія. Праз год пры царкве было заснавана праваслаўнае брацтва. Яна была збудавана на драўляных цвіках, каб пазбегнуць удара маланкі. У 1794 годзе на яе месцы збудавана новая царква з элементамі класіцызму. Крыжова-купальны храм з планам у выглядзе лацінскага крыжа. Зрубы накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі 2-схільнымі дахамі. Над сяродкрыжжам масіўны 8-гранны светлавы барабан, завершаны гранёным





купалам з галоўкай. Абапал 5-граннага алтарнага зруба невялікія прамавугольныя ў плане рызніцы. У 1883 годзе да галоўнага фасада прыбудавана 3-ярусная вежа-званіца з бабінцам у ніжнім ярусе, накрытая невысокім 4-схільным шатром. Помнік драўлянага дойлідства 1-й паловы XVII стагоддзя. Яшчэ адзін значны рамонт у царкве адбыўся ў 1928 годзе.

З гэтай царквой звязаны яшчэ адзін цікавы выпадак, які здарыўся ў лістападзе 2008 года. Вось як аб ім гаворыцца ў інтэрнэце: “Сёння ў наш рэгіён завітала здымачная група дзяржаўнай тэлекампаніі “Лад”. Журналістаў праграмы “Белорусское времечко” зацікавіў факт аб еўрарамонце храму 17 стагоддзя, што ў в. Порплішча Докшыцкага раёну. Пад час візіту здымачнай групы святара ў храме не было і на перадавую абароны выйшлі прыхаджанкі храму, мясцовыя кабеты. “Што ты тут здымаеш? Я табе

зараз тваю бэнээфаўскую камеру паб’ю” – заявіла прадстаўнікам дзяржаўнага тэлеканала найбольш агрэсіўная жанчына. Мінакам падалося, што гэта засланцы з газеты “Вольнае Глыбокае”, якую чамусьці бабкі назвалі “Вольная воля” (Відаць, сумясціўшы ў памяці “Вольнае Глыбокае” і “Народную волю”)”.

Між іншым, як паведаміў у інтэрв’ю для Радыё Свабода адказны супрацоўнік Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі ніякага дазволу на рэстаўрацыю Порплішчанскай царквы дадзена не было. Для супрацоўніка міністэрства званок карэспандэнта з гэтай нагоды наогул стаў нечаканай навіной. Дамовіліся, што ён паспрабуе высьветліць, што ж там адбываецца?

Праз нейкі час Радыё Свабода зноў звязалася з Ігарам Чарняўскім, і вось што ён паведаміў:

Дазволаў ніякіх мы не давалі. Зараз мы ўжо выйшлі на Віцебскі аблвыканкам. У раёне ніхто не падняў слухаўку, можа, абед, ці што. Адначасна будзем уступаць у кантакт з Докшыцкім райвыканкамам, калі там сапраўды так. Нам пажадана, каб хтосьці пісьмова паслаў нам інфармацыю. Вось мы зробім прадпісанне, а раптам там нешта не так? Нам на нешта трэба абаперціся, што там сапраўды нешта такое адбываецца. Хаця мы і так цяпер будзем захады рабіць, каб разабрацца ў сытуацыі”.

У тарыфе за 1690 год гаворыцца, што маёнтак Порплішча, у якім на той час было 90 дымоў, належыў Янушу Зяновічу.

У “Эканамічных заўвагах Генеральнага межавання Мінскай губерні”, якія былі створаны расійскай адміністрацыяй у 1800 годзе, прыводзіцца спіс усіх маёнткаў, з пазначэннем колькасці двароў і жыхароў мужчынскага і жаночага полу паводле рэвізіі 1795 года. Згодна гэтых звестак – маёнтак Порплішча быў адным з буйнейшых на той час. У яго склад уваходзіла 57 паселішчаў, у якіх было 493 двары і не менш 2400 жыхароў. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што недаўлік насельніцтва ў рэвізіях мог дасягаць прыблізна 10 %, таму колькасць жыхароў, якая пазначана ў іх, на самай справе трэба крыху пабольшыць. У гэты час Порплішча знаходзілася ў Вілейскім павеце і належала Дамініку Радзівілу. У радзівілаўскім маёнтку Порплішча на двор прыходзілася толькі 4,9 жыхара, у той час як у Бераснёўцы па 7,9, а ў Беразіно нават – 9. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што паны ўмешваліся ў працэс падзелу сялянскіх гаспадарак – заахвочвалі ці, наадварот, забаранялі дарослым братам дзяліцца. У выніку пад адным дахам часта жылі па дзве, а часам па тры і болей шлюбныя пары з дзецьмі.

Праз вёску праходзіў паштовы тракт з Дзісны на Вілейку. Пасля аграрнай рэформы 1861 года сяло Порплішча стала цэнтрам воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, да якой адносіліся 27 вёсак з насельніцтвам 2657 чалавек. Сяло адносілася да сельскай грамады Раёўка. Паводле “Слоўніка геаграфічнага Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх”, у Порплішчы было 17 двароў, 135 жыхароў (66 праваслаўных і 69 каталікоў), у 1864 годзе было 48 душ рэвізскіх. Згадваецца таксама

засценак Порплішча, 2 дамы, 6 жыхароў. Паводле тагачаснай тапаграфічнай карты, ён размяшчаўся на ўсход ад вёскі, паміж Порплішчам і Пятровічамі.

У 1864 годзе ў Порплішчах адкрыта народнае вучылішча. Яно бясплатна размяшчалася ў грамадскім будынку і ўтрымлівалася за кошт дзяржаўнага казначэйства (выдаткоўвала штогод 200 рублёў) і мясцовай сялянскай абшчыны. Адным з першых тут працаваў Антон Ігнатавіч Васюкевіч, выхадзец з сялян, выхаванец Слонімскага павятовага вучылішча.

У 1886/87 навучальным годзе ў школе вучылася 33 хлопчыкі, іх настаўнікам быў Дзмітрый Шылко, які скончыў курс у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Законанастаўнікам праваслаўнага спавядання працаваў свяшчэннік, выхаванец духоўнай семінарыі Іван Наваградскі, а законанастаўнікам каталіцкага спавядання – ксёндз Альбін Дамашэвіч (жалаванне не атрымліваў).

У 1886 годзе Порплішча было цэнтрам воласці, дзе пражывала 97 чалавек, мелася валаснoе праўленне, народнае вучылішча (навучалася 33 хлопчыкі), праваслаўная царква, карчма. А ў 1897 годзе ў Порплішчах 24 двары, 186 жыхароў.

У XIX стагоддзі забудова Порплішча была размешчана ўздоўж дарогі на Параф’янава. На скрыжаванні дарог, побач з царквой, былі пабудовы царкоўнага маёнтка. Сажалка, якая размешчана побач з царквой, адносілася да гэтага маёнтка і таму называлася Паповай. У канцы XIX стагоддзя сярод сялян Парплішчанскай воласці даволі распаўсюджаным было ткацтва і пража: ткалі мешкавіну, падкладачны матэрыял, на сарочкі і тонкае; ткалі грубае сукно, іншыя шарсцяныя вырабы (цясёмкі, паясы). Свае вырабы сяляне прадавалі на кірмашах і базарах. У гэты час Порплішча было ўласнасцю Вітгенштэйна, які ўступіў у шлюб з дачкой Дамініка Радзівіла.

Значны рост сяла назіраецца на мяжы XIX і XX стагоддзяў, калі распрадала зямлю ўладальніца фальваркаў Раёўка і Порплішча княгіня Марыя Львоўна Гагенлое-Шыленгерфсць, якая валодала гэтымі абшарамі пасля Вітгенштэйнаў. У 1901 годзе тут адчынена царкоўнапрыходская школа. Колькасць вучняў у пачатку XX стагоддзя дасягала 80 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак. Іх вучылі старшы настаўнік, выпускнік Свіслацкай настаўніцкай семінарыі Гайко (жалаванне 330 рублёў і кватэра) і малодшы настаўнік, выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Ф. Шарамет (жалаванне ад дзяржаўнага казначэйства 150 рублёў, ад сялянскай абшчыны 24 рублі і кватэра; законанастаўнікам праваслаўнага спавядання прадаўжаў працаваць Іван Наваградскі.



У 1905 годзе насельніцтва Порплішча складала ўжо 364 чалавекі. Да 1916 года выраслі вуліцы ўздоўж дарог на Крулеўшчыну і Глыбокае. У 1906 годзе побач з Порплішчам прайшла Балагое-Сядлецкая чыгунка. 19 снежня 1918 года сяляне

Порплішчанскай воласці напісалі адкрытае пісьмо Уладзіміру Ільічу Леніну. У ім гаварылася: “Дарагі правадыр таварыш Ленін! Мы, сяляне, Порплішчанскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, толька што вызваліўшыся з-пад прыгнёту нямецкага імперыялізму і ўлады кулакоў і памешчыкаў, вітаем Вас як сапраўднага правадыра – барацьбіта за лепшае будучае ўсіх прыгнечаных народаў і наступаючы сацыялізм”.

Цяжкія выпрабаванні абрынуліся на жыхароў Порплішча падчас польска-савецкай вайны 1919-20 гадоў, калі некалькі разоў змянялася ўлада, а войскі прынеслі шмат шкоды мясцовым жыхарам, знішчаючы пасевы, забіраючы скаціну і харчаванне. У 1921 годзе жыхары Порплішча прасілі польскія ўлады вызваліць іх ад падаткаў з-за значных страт, панесеных у часе вайны. У часы польскай акупацыі Порплішчы працягвала расці і развівацца. З 1920 года сяло стала цэнтрам гміны Дунілавіцкага, а з 1925 – Дзісненскага павета. У 1921 годзе тут створаны пастарунак паліцыі, зімой 1921-22 гадоў адчынена школа, для размяшчэння якой улады канфіскавалі адно з памяшканняў праваслаўнай плябаніі. Дзяржава канфіскавала частку зямель царкоўнага маёнтка, да якога ў 1921 годзе адносіліся 166 дзесяцін. У 1921 годзе ў Порплішчах дзейнічалі таварыства “Асвета” і спажывецка-гандлёвае таварыства “Карысць”. У 1928 годзе ў Порплішчах адбыўся пажар, які знішчыў шмат пабудоў у вёсцы.

У 1930 годзе ў Порплішчы 71 двор, 306 жыхароў, 608 дзесяцін зямлі, праўленне гміны, пастарунак паліцыі, пошта, сямікласная школа, чыгуначны прыпынак, праваслаўная царква. Паводле “Ksiegi adresowej Polski”, у 1929 годзе тут быў млын, які належаў М. Кавалёнку, гандлем галантэрэяй займаўся І. Вайцяховіч, гандлем харчовымі таварамі – Б. і Г. Друцы. Б. Друц таксама трымаў піўную.

17 верасня 1939 года ў Порплішча з боку Докшыц увайшлі савецкія танкі. А 12 кастрычніка 1940 года Порплішча стала цэнтрам сельскага Савета.

У 1937-41 гадах ў цэнтры Порплішч ўзведзены касцёл Маці Божай Каралевы Кароны Польскай. Помнік драўлянага дойлідства. Пабудаваны мясцовымі майстрамі пад кіраўніцтвам Б.Шантара. Савецкая ўлада пасля вайны занялася руйнаваннем храмаў. У сталінскія часы быў арыштаваны і асуджаны да 10 гадоў пакарання ў ГУЛАГу праваслаўны святар Мікалай Кузьменка. Такі ж лёс спасціг у 1947 годзе ксяндза Пятра Барташэвіча. Праваслаўная царква дзейнічала на працягу ўсяго часу панавання камуністычнай улады. Зрэшты, мясцовыя жыхары ўспамінаюць, як настаўнікі аказвалі ціск на вучняў, якія хадзілі ў царкву.



У 1950-я гады з зачыненага касцёла была

знята вежа, будынак прыстасаваны пад Докшыцкую школу механізацыі, а потым у ім была школьная майстэрня, пазней, да 1990 года ў ім размяшчалася жыллё і сховішча. У 1991-93 гадах намаганямі вернікаў адноўлены. Даводзілася чуць ад старажылаў, што дваіх чалавек, якія здымалі крыж з касцёла, у хуткім часе спасцігла Божая кара. Неяк яны і яшчэ два чалавекі ў час навальніцы хаваліся ад дажджу пад хлевам. Ударыла маланка і забіла тых, хто ўдзельнічаў у разбурэнні святыні, а астатнія засталіся жывыя.

Архітэктанічная кампазіцыя касцёла складаецца з выцягнутага прамавугольнага ў плане асноўнага аб’ёму, накрытага высокім двухсхільным дахам, прамавугольнай алтарнай часткі з сіметрычнымі сакрысціямі на баках, накрытымі больш нізкімі дахамі, і шмат’яруснай чацверыкавай вежы на галоўным фасадзе. Унутраная прастора храма падзелена апорнымі слупамі на 3 нефы з бэлечнымі перакрыццямі. З боку ўвахода ўнутры асноўнага аб’ёму вылучаны нартэкс з арганнымі хорамі. Ніжні чацвярык вежы часткова выступае на галоўным фасадзе, ствараючы крыты ганак (экзанартэкс). Верхні ярус вежы і сігнатурка, якая прарэзвае вільчык даху каля алтара, накрыты традыцыйнымі чатырохсхільнымі шатрамі - “каўпакамі” са злёгку выгнутымі схіламі, што надае форме пакрыцця вытанчанасць. Сцены звонку гарызантальна ашаляваны і ўмацаваны вертыкальнымі сцяжкамі. Архітэктурнае вырашэнне святыні ўдала працягвае традыцыі драўлянага касцельнага дойлідства Беларусі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Порплішчах размяшчаўся даволі буйны нямецкі гарнізон. Вось як успамінае адзін з эпізодаў ваеннага ліхалецця Нікадзім Васільевіч Таляронак, які нарадзіўся ў вёсцы Малажане Докшыцкага раёна ў 1921 годзе:

...На чыгуначным пераездзе каля Порплішч і ў навакольных вёсках ва ўмацаваных збудаваннях (мы іх называлі бункерамі) фашысты трымалі даволі моцны гарнізон, які быў прызначаны для аховы чыгункі ад народных мсціўцаў. Мы вырашылі разграміць яго.

Аперацыя была дэталёва прадумана. Намецілі яе на ноч з 14 на 15 лістапада 1943 года. Па плану мы адначасова павінны былі напасці на нямецкую казарму, а таксама бункер у вёсцы Валодзькі, узарваць два чыгуначныя масты на бальшаку каля вёсак Барсукі і Казлы.

Прадуманы план даў добрыя вынікі. Мне давялося наступаць на бункер каля Порплішч. У гэтым умацаваным збудаванні знаходзілася, як мы даведаліся пазней 17 чалавек. Падкраўшыся да бункера, мы закідалі ў дымаход гранаты. Толькі афіцэр, які спаў асобна ад радавых, сумеў аказаць невялікае супраціўленне. Ён паспеў выстраліць з маўзера і выкінуць праз акно дзве гранаты.

Адначасова была разгромлена казарма ў Порплішчах, у якой знаходзілася 10 фашыстаў, узарваны чыгуначныя масты і масты на бальшаку. А вось бункер у Валодзьках знішчыць не ўдалося. Там павінны былі стаяць у караўуле ўкраінскія паліцаі, якія ведалі пра аперацыю, але ў апошні момант

нямецкі афіцэр замяніў іх на сваіх салдат. Таму і сустрэлі нашых партызан агнём. Давялося адступіць – добра, што без страт.

Нягледзячы на гэту няўдачу, агульныя трафеі былі нядрэнныя – 2 кулямёты, 30 вінтовак, 2 мінамёты, вялікая колькасць патронаў, мін і гранат, шмат адзення, якое было нарабавана ў насельніцтва, а таксама прадуктаў. Усяго мы нагрузілі 30 павозак. Памяшканне бункера і казармы разам з трупамі забітых немцаў спалілі.

У часе нямецкай акупацыі ў Порплішчанскай школе працаваў настаўнікам Алесь Качан, які пазней стаў пісьменнікам, вядомым як Кастусь Акула (гл. артыкул “Верацеі. Крулеўшчынскі сельсавет”).

У 1949 годзе жыхары Порплішча ўступілі ў калгас “Савецкая Беларусь”, які потым быў уключаны ў склад саўгаса “Докшыцкі”. У 1962 годзе быў заснаваны саўгас “Порплішча”, пераўтвораны ў 1979 годзе ў племзавод. Знаходжанне цэнтра саўгаса ў Порплішчы стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця вёскі. У 1966 годзе ўзведзены новы будынак сярэдняй школы. Дарэчы, Порплішчанская школа першай у раёне перайшла на адзінаццацігадовы тэрмін навучання. А яе вучні і настаўніка з’яўляліся ўдзельнікамі выставы на ВДНХ у Маскве. Пра школу быў нават зняты дакументальны фільм “Дзеці краіны Саветаў”.



Каля будынка сельскага Савета, насупраць канторы племзавода “Порплішча” на сродкі мясцовага сельсавета ў 1971 годзе ў памяць аб загінуўшых земляках у гады Вялікай Айчыннай вайны быў устаноўлены помнік воінам-землякам. У 60-я гады астанкі воінаў былі перавезены ў Докшыцы і перазахаронены ў брацкай магіле на плошчы Палявога.

У 1969 годзе ў Порплішча перасяліліся жыхары вёскі Качаны Крулеўшчынскага сельскага Савета.

20 мая 1998 года ў Порплішчах адбыўся рэспубліканскі семінар па кормавытворчасці. У ім прынялі ўдзел намеснікі міністраў, адказныя работнікі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, старшыні аблвыканкомаў, старшыні аблсельгасхарчу і іх намеснікі, вучоныя, кіраўнікі некаторых гаспадарак.



Цяпер у Порплішчах пражывае каля 750 жыхароў.

**Камінская Ірына Пятроўна** нарадзілася 22 студзеня 1933 года ў вёсцы Порплішча Докшыцкага раёна ў сялянскай сям’і.

З 1948 года па 1957 год працавала свінаркай, а з 1957 года па 1959 год даяркай саўгаса “Сітцы”. 18 студзеня 1958 года І.П. Камінскай прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы за дасягненне высокіх паказчыкаў у вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі. У 1961 годзе перайшла працаваць свінаркай у саўгас “Порплішча”.

4 лістапада 1963 года Камінская І.П. загінула ў аўтамабільнай катастрофе. На мясцовых могілках пастаўлены абеліск.

# Пруднікі

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Па народнаму павер'ю, даўным-даўно на месцы вёскі быў вялікі пруд, а вакол яго яшчэ некалькі маленькіх. У гэтых прудах вадзіліся самы. А непадалёку, у мястэчку Байстроўка (маёнтак Байстроўка, або Бястроск знаходзіўся каля былой вёскі Шунеўка. У свой час ім валодаў Карказовіч. Тут меўсмя цукровы завод, млын-таптун. У савецкі час тут была пагранзастава. У 1794 годзе ў Байстроўцы нарадзіўся вядомы беларускі архітэктар Хршчановіч Казімір Вікенцій Мельхіёравіч. Гл. артыкул "Дабрунь") жыў пан Карніцкі. І была ў таго пана дачка Адэля, якая славілася на ўсё акругу сваёй прыгажосцю. Аднойчы пайшла Адэля на гэты пруд купацца, і толькі яна даплыла да сярэдзіны, як вялізны сом схапіў дзяўчыну і пацягнуў на дно. Доўга шукалі Адэлю, але ўсё было марна. І тады, у вялікім адчаі, пан загадаў асушыць пруды. На жаль, гэта не дапамагло – цела дзяўчыны так і не знайшлі. З гора пан загадаў засыпаць пруды... Прайшлі гады. Памёр пан. А на асушанай мясціне пачала будавацца вёска. І ў памяць аб тым, што некалі на гэтым месцы былі пруды, яе назвалі Пруднікі.

Першае статыстычнае апісанне вёскі Пруднікі ўспамінаецца з мая 1851года. У пачатку XX стагоддзя Пруднікі ўваходзілі ў Вітуніцкую воласць Барысаўскага павета. На той час тут было 14 двароў і 96 жыхароў. У 1931 годзе ў кожнай з 6-ці вёсак, якія ўваходзілі ў гаспадарку, былі арганізаваны калгасы. І ў вёсцы Пруднікі быў арганізаваны калгас "Змагар", першым старшынёй якога быў Васько Язэп Іосіфавіч.

У кастрычніку 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 7 чалавек. Аднак ахвяр магло быць і больш. Па ўспамінах ветэрана Вялікай Айчыннай вайны П.І. Пафяновіча, вёску спалілі тады ўсю дашчэнту. А старых сагналі было ў адну хату, паабкладалі саломай, але, на шчасце, не падпалілі, адпусцілі ўсіх.



Каля будынка праўлення калгаса "Іскра" (зараз СПК "Прудніцкі") злева ад дарогі на Докшыцы ў 1967 годзе пастаўлены помнік землякам у выглядзе стэлы з барыльефнай выявай і імёнамі 109 загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Праязджаючы праз Пруднікі можна ўбачыць хату Анатоля Данілавіча Шульгата – гэты дом ля дарогі нельга абмінуць. Афарбаваны ў буры колер, ён як велікодная маляванка, размаляваны забаўнымі ўзорамі і карцінкамі. Тут раскінула казачныя крылы жар-птушка і пастукваюць малаточкамі смешныя чалавечкі з горада майстроў, мульцяшныя героі Воўк і Парася мірна папіваюць чай ля самавара, а розныя птушкі на даху, здаецца, вось-вось закрычаць на ўсё наваколле.

# Пугачова

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

У 1933 годзе тут арганізаваны калгас імя Пугачова, стала працаваць кузня. У гады Вялікай Айчыннай вайны гітлераўцамі тут было расстраляна 15 чалавек.

Зараз у Пугачова пражывае каля 150 чалавек.



10 мая 1935 года ў Пугачове нарадзіўся Пярэднеў Уладзімір Пятровіч – беларускі вучоны ў галіне агародніцтва і аграхіміі. У 1994 годзе стаў доктарам сельскагаспадарчых навук, а ў 1995 годзе атрымаў вучонае званне прафесар. У 1962 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію і стаў працаваць у Беларускім НДІ агародніцтва старшым навуковым супрацоўнікам. У 1969 годзе становіцца загадчыкам аддзела агародніцтва, лабараторыі аграхіміі, аграхіміі і якасці агароднінных культур. Адначасова з 1976 года па 1980 год з’яўляўся экспертам ААН. Даследаваў праблемы інтэгнсіўных тэхналогій вырошчвання агародніны, павелічэння ўрадлівасці глебы, ураджаяў, паляпшэння якасці агароднінных культур. Аўтар шматлікіх навуковых прац. У 1999 годзе стаў акадэміка Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій. Узнагароджаны ордэнам “Знак Пашаны”. Памёр Пярэднеў Уладзімір Пятровіч 27 верасня 2000 года.

На паўднёвым захадзе ад Пугачова бярэ выток рака Варлынка (правы прыток Ракі Поня, басейн Дняпра). Дліна ракі 14 кіламетраў. На ўсім працягу каналізаваная

# Пустаселле

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Вядома, што гэта вёска з’явілася значна пазней чым іншыя. Упершыню ўпамінаецца ў 1879 годзе ў царкоўных дакументах пры пераліку населенных пунктаў Бярэзінскай воласці і прыхода Барысаўскага павета. У 1901 годзе ў Пустаселлі была 41 хата, у якой пражывала 248 чалавек. У 1908 годзе тут адчынена народнае вучылішча, а ў 1914 годзе ўжо пабудавана школа. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана савецкая пачатковая школа, у якой з 1923 года працавала настаўніцай Дар’я Дземідовіч і ў 1924 годзе вучыла 53 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак.

У 1930 годзе створаны калгас “Герой працы”, стала працаваць кузня. Перад вайной тут пражывала 220 чалавек, мелася крама і малочны пункт. У першыя дні вайны на фронт пайшло 13 чалавек. Першымі партызанамі ў 1942 годзе сталі 14 жыхароў. Пазней да іх далучыліся яшчэ 16 чалавек. Дзейнічала тут і падпольная арганізацыя, якой кіраваў Віталь Дземідовіч. Фашысты не змаглі змірыцца з такой актыўнасцю жыхароў вёскі, і таму ў ліпені 1943 года Пустаселле было спалена. Акрамя гэтага, карнікі спалілі, забілі, замучылі 14 жыхароў. З усёй колькасці пайшоўшых на фронт і ў партызаны пустасельцаў дадому не вярнулася 33 чалавекі.

Цікавы эпізод часоў Вялікай Айчыннай вайны ўзгадвае былы камандзір партызанскай брыгады “Жалязняк” Іван Піліпавіч Ціткоў: “...Аднойчы, калі я ішоў у размяшчэнне 1-га атрада, які займаў абарону па рацэ Поня на ўчастку Варлань – Пустаселле, мне давялося назіраць такую карціну. У тым месцы, куды я накіроўваўся, раптам пачалася ружэйна-кулямётная стральба. Затрымаўшы каня, я прыслухаўся. Высветлілася, што стралялі толькі партызаны. Вораг адказваў толькі мінамётным агнём. Да вёскі Пустаселле я дабраўся пешшу. Камандзіра атрада знайшоў перад самай вёскай у акопе. Ён разглядаў праз бінокль варожы бераг Поні.

- Становішча такое, - далажыў ён. – Гэтыя самыя радыёнаўцы ўжо двойчы спрабавалі фарсіраваць раку каля вёскі Гліннае, але мы адбілі атаку. Зараз яны адыйшлі да Камайска.

- А чаму вашы людзі вядуць такі моцны агонь? – спытаў я. – Праціўніка ж не бачна.

- З майго дазволу, - адказаў камандзір атрада. – Прывучаю навічкоў да іх асабістых выстралаў. Няхай добра праз прыцэлы вінтовак і кулямётаў паназіраюць за варожымі пазіцыямі. Яны вядуць агонь з несапраўдных пазіцый.

Іду з ім па акопе. У многіх партызан нават прыцэлы не пастаўлены на патрэбную дыстанцыю, людзі не ведаюць, якая адлегласць да ворага, страляюць наўгад. Некаторыя нават пры стральбе закрываюць вочы, вінтоўкі ў многіх прыгаюць у руках. Пытаю ў камандзіра:

- Які сэнс ад гэткай стральбы? Марная растрата патронаў. Сколька ў вас падобных стралкоў?

Той адказаў, што не менш сотні. Прыйшлося падказаць яму, каб маладых замацавалі за вопытнымі партызанамі і арганізавалі з імі стралковую патрыхтоўку. Адначасова з гэтым я разаслаў па атрадах сваіх аружэйнікаў, каб яны папрацавалі з навічкамі”.

17 студзеня 1944 года партызаны Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны разграмілі гітлераўскі гарнізон у вёсцы Пустаселле. Ён абараняў стратэгічную дарогу Докшыцы – Лепель. Вораг панёс вялікія страты, але і страты партызан склалі 43 чалавекі забітымі і раненымі.



У 1969 годзе на ўшанаванне памяці 78 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на паўночна-заходняй ускраіне вёскі пастаўлены абеліск.

У 1909 годзе ў Пустаселлі нарадзілася Потэс Надзея Карпаўна. У 1929 годзе ўступіла ў арганізаваны ў роднай вёсцы калгас “Герой працы”, працавала паляводам, загадчыкам жывёлагадоўчай фермы, намеснікам брыгадзіра паляводчай брыгады. У 1936 годзе была абрана старшынёй калгаса імя Молатава Глінскага сельскага Савета. У маі 1938 года вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Бягомльскай выбарчай акрузе № 132. Гэта была першы дэпутат таковя вялікага ўзроўню ад нашага раёна (на той час Бягомльскі раён).



18 студзеня 1929 года ў Пустаселлі нарадзілася Марыя Цімафееўна Кавалёва (Ралавец) – беларускі мовазнавец і педагог. З 1936 года жыла ў Бягомлі. У Вялікаю Айчынную вайну з 1943 года разам з маці знаходзілася ў 1-м партызанскім атрадзе брыгады “Жалязняк”.

У 1948 годзе скончыла Глыбоцкае педагагічнае вучылішча, а ў 1952 годзе – літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Працавала асістэнтам, старшым выкладчыкам на кафедры беларускага мовазнаўства гэтага інстытута (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка). У 1967 годзе стала кандыдатам філалагічных навук.

Першая друкаваная праца, прысвечанае беларускаму дзеяслову, выйшла ў 1961 годзе. З таго часу яе публікацыі штогод друкуюцца на старонках навуковых зборнікаў, энцыклапедычных і перыядычных выданняў. Марыя Цімафееўна адзін з аўтараў шматлікіх падручнікаў і дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў, для вучняў і настаўнікаў-беларусазнаўцаў. Кола навуковых інтарэсаў М.Ц. Кавалёвай шырокае і шматаспектнае. Яе ўвага засяроджваецца на адной з самых складаных і нераспрацаваных праблем

сучаснай філалогіі – праблеме даследавання мовы мастацкага твора. Даследчыца звяртаецца да вобразнага слова класікаў беларускай літаратуры – Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Брыля, І. Мележа. Яе публікацыі выяўляюць грунтоўную лінгвістычную падрыхтаванасць, дасведчанасць аўтара, яго ўменне і разумець, і адчуваць слова ў кантэксце, рабіць арыгінальныя назіранні, змястоўныя вывады.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, значком "Выдатнік народнай асветы Беларусі" у 1970 годзе. У 1979 і 1982 гадах атрымлівала Ганаровыя граматы Міністэрства асветы БССР, а ў 1986 годзе – Ганаровую грамату СССР. З 1982 года з'яўляецца Заслужаным настаўнікам Беларусі. У 1999 годзе атрымала медаль імя Францыска Скарыны.

У 1924 годзе ў Пустаселлі нарадзіўся Пярэдня Іван Міхалавіч. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946 годзе скончыў Лепельскае педагагічнае вучылішча, а потым у 1953 годзе Мінскі настаўніцкі і у 1958 годзе педагагічны інстытуты. З 1948 па 1949 гады працаваў сакратаром Бягомльскага РК ЛКСМБ. Працаваў таксама настаўнікам і загадчыкам Загалаўскай і Глінскай пачатковых, дырэктарам Шыленскай васьмігадовай, настаўнікам і дырэктарам Докшыцкай сярэдняй школ. З 1965 года па 1979 год працуе загадчыкам Докшыцкага РАНА. На працягу 20 гадоў узначальваў Докшыцкае раённае таварыства "Веды". Выбіраўся дэпутатам раённага і гарадскога Савета дэпутатаў. Старшыня раённага савета ветэранаў вайны, працы і Узброенных Сіл. З 1963 года з'яўляецца Заслужанным настаўнікам Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі, значком "Выдатнік асветы СССР" у 1972 годзе.

# Ракітаўшчына

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Ракітаўшчына знаходзілася ў Валкалацкай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 86 жыхароў і налічвалася 202 дзесяціны зямлі. З 1921 года па 1939 год вёска ўваходзіла ў склад Польшчы. Зараз тут пражывае каля 15 чалавек.

Для Ракітаўшчыны характэрна выразная вулічная планіроўка. У даўнія часы звычайна падзелы наразаліся перпендыкулярна дарозе, што перасякала поле, і апошняя адначасова станавілася вясковай вуліцай. Распаўсюджанне вулічнай вёскі – важнае дасягненне рэформы ў сферы перапланіроўкі паселішчаў.

Раней ніводная сядзіба не абыходзілася без свірна (клеці) – зрубнай пабудовы, пастаўленай на камяні на некаторым узвышэнні над зямлёй, са скляпеністай столлю, зробленай суцэльным закатам. З боку ганка мелася слупавая галерэя (прыклетнік). Для нашага раёна характэрны падвоеныя клеці. Пры гэтым асноўная ўяўляла сабой зруб – чатырохсцен, а спараная – далучаны праз шулы трысцен. Такія клеці захаваліся і ў Ракітаўшчыне.

Тутэйшыя лугі, пералескі і балоты багатыя на кваціастае разнатраўе. Таму пчалярства тут у даўняй пашане. Шмат пчаліных домікаў можна бачыць у Ракітаўшчыне. Тут захавалася і такая традыцыйная пабудова пчалярскай гаспадаркі, як імшанік – невялічкі зруб, у які ставілі пчаліныя домікі на зіму.

# Рапяхі

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя вёска знаходзілася ў складзе Параф’янаўскай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражываў 241 чалавек. З 1921 года па 1939 год Рапяхі ўвайшлі ў склад Польшчы. У 1949 годзе арганізаваны калгас імя Андрэева.

Зараз у Рапяхах пражывае каля 60 чалавек.

Каля дарогі знаходзяцца мясцовыя могілкі. На іх можна знайсці магілы, дзе пахаваны былыя уладальнікі маёнтка ў Сітцах – Тадэвуш Дамейка, яго сын Аляксандр і нявестка Соф’я. Мясцовыя жыхары даглядаюць іх. Па іх словах, у 1930-я гады, калі гаспадаром маёнтка ў Сітцах быў Вацлаў Дамейка, жыў у Рапяхах адзін хітры мужык. Як толькі заўважыць здалёк карэту Вацлава, то адразу спашаецца на могілкі. Плача, успамінае, якія добрыя ласкавыя былі тыя, што тут пахаваны. Пан, разжалабіўшыся ад такога, шчодра адорваў селяніна. Аб хітрасці мужыка ён здагадваўся, бо гэта паўтаралася не раз, аднак грошы не шкадаваў.



За вёскай Рапяхі некалі знаходзіўся каменны крыж. Па словах мясцовых жыхароў, вышыня гэтага крыжа дасягала трох метраў. На ім была выбіта дата “1812”. Пры пашырэнні аўтамабільнай дарогі гэты крыж не змаглі зрушыць з месца і зараз ён, фактычна, пахаваны пад асфальтам.

# Рачныя

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Даўней парабкі пана Дзядзінца працавалі аж да ракі, якая працякае праз цяперашнюю вёску Рачныя. Парабкі, якія працавалі на рацэ, былі моцныя, але невысокага росту. Свае хаціны яны будавалі ўздоўж ракі. Іх называлі рачныя людзі. Вось гэта слова “рачныя” і стала назвай тых месц. Вёска таксама стала называцца – Рачныя. А за гэтай вёскай была пастаўлена драўляная сценка. Так утварылася іншае мястэчка, якое людзі памятаюць пад назвай Засценак Рачныя. Цяпер там ужо ніхто не жыве.



З 1921 года па 1939 год вёска ўваходзіла ў склад Польшчы. У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты амаль поўнасцю спалілі вёску і загубілі 32 жыхароў. Пасля вайны на ўшанаванне іх памяці быў узведзены абеліск.



У 1990-я гады ў Рачных была пабудавана невялічкая капліца. Зараз у вёсцы пражывае каля 40 чалавек.

# Сасновая (Сасноўка)

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Калісьці – да 1964 года, гэта вёска, размешчаная ў пяці кіламетрах ад гарадскога пасёлка Бягомль, мела дзіўную назву “П’яны Лес”. Адкуль гэта назва? Ёсць такая легенда, што ў 1812 годзе напалеонаўскія ваякі ў час начлегу так напіліся мясцовай гарэлкі, што ляжалі п’яныя па ўсім лесе. З гэтай падзеі і ўзяла назву вёска.

Але гэта легенда не адпавядае сапраўднасці. Напалеон у гэтых мясцінах не быў. Калі рухаўся на Маскву, яго войскі былі ў Докшыцах (25 кіламетраў ад Сасновай). На адваротным шляху Напалеон ішоў каля Барысава, перапраўляўся праз раку Бярэзіна каля вёскі Студзёнка.

Другая легенда апавядае, што ў даўнія часы лес каля гэтай вёскі быў павалены вятрамі і ляжаў, як п’яны люд. Верагодней, што гэта падзея і адлюстравалася на назве вёскі.



У пачатку ХХ стагоддзя Сасновая знаходзілася ў Бягомльскай воласці Барысаўскага павета. Перад Вялікай Айчыннай вайной тут налічвалася 278 жыхароў. У чэрвені 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску. Па ўспамінах Надзеі Іванаўны Гайдук: “...1 чэрвеня 1943 года фашысты правялі крывавую расправу ў вёсцы Сасновая. Выгнаўшы з хат усіх жыхароў, фашысцкія палачы правялі сартоўку людзей. Маладых і здаровых мужчын і жанчын адправілі на работу ў Германію, а астатніх 98 чалавек сагналі ў хлеў, расстралялі і спалілі”. У 1967 годзе на магіле загінуўшых быў устаноўлены абеліск.

А вось што піша пра свае ўражанні ад знаходжання ў Сасновай Вячаслаў Дубінка ў газеце “Новы Час" за № 16 ад кастрычніка 2003 года:

Вёска П’яны Лес. То па-бывалешнему. Брыдкую назву па загаду зверху прыбралі, ахрысціўшы Сасноўкай. Туліцца вёсачка каля старой дарогі, калі імчаць са сталіцы на Бягомаль. А вось у новахрышчонай Сасноўцы цвярозых паболей не стала. Усяго нам бачылася пад час этнаграфічна-пазнавальнай экспедыцыі, але такое. Трое ў дупель п’яных мужыкоў адключыліся, ляжаць упокат каля плоту. Бедалагі, нат і ровараў не прыпаркавалі, кінулі пад ногі. У такіх гаспадароў і разбуркі-хаты ў самотным одуме на свет дзівяцца. Нахабныя п’яныя кабеты ледзь не кідаюцца на нашу машыну, – весела з жартамі, – жыццялюбы. А непадалеёку стромкія сосны плачуць, пасечаныя стрэлачкамі-пікамі. Жывіца бяжыць у адметны посуд – жалезныя кулечкі. Плачуць смаляныя дрэвы, каб тубыльцам П’янага Лесу на пахмелку дабра нацадзіць. І не палічыць, колькі ж гектараў лесу ў наваколлі Сасноўкі з такімі

вось драпінамі, як вострай сякерай, па-жывому. Глухі лес, шчыльна прытуліліся дрэвы. Вартуюць глухую сцежку, хіба што ў Каралёў Стан чужых не пускаюць. Вось ён знакаміты агромністы валун-камень. Колькі ж стагоддзяў вартуе мясціну арыгінальны помнік. Пашпарт сівое даўніны, своеасаблівая згадка: тут у час паходу мелі прытулак ваяры караля Стэфана Баторыя.

Непадалёку трое дзецюкоў цягнуць вялікае бервяно. Ад іх пачулі:

– Шмат гадоў запар сюды наязджалі нахабныя мацакі і з доўгімі жалезнымі прэнтамі паўсюдна корпаліся, глыбока капалі, а начавалі ў палатках, пілі, моцна спявалі, мацюгаліся. Багацце шукалі. Золата каралеўскае, бачыце, – хутарскі дзядзька ў кепачцы паказвае на паляну.

Падышоў новы апавядальнік у камізэльцы і гумавых ботах, ён даглядае чатырох белых козачак. Смяецца хітравата:

– Мясцовыя і знайшлі тыя скарбы. Набылі аўто, мэблю, дыванамі пекнымі сцены абчаплялі... Але вось дзіва: сюды п’янтосы з райцэнтра едуць, як пацяплее. А вось сабакі праклятае месца абмінаюць. Заезджыя бандзюгі хутарскога сабачку палкамі да смерці, ды на дрэва падчапілі.

# Свіркі

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце*

У першыню Свіркі згадваюцца ў дакументах яшчэ ў першай палове XVI стагоддзя як вёска ў складзе маёнтка Параф'янава Віленскай архідыяцэзіі, аднак яна магла з'явіцца і куды раней.

У 1795 годзе ў Свірках было 13 двароў і 85 чалавек насельніцтва. Пазней маёнтак Параф'янава распаўся на некалькі асобных маёнткаў. Побач з вёскай Свіркі тады ўзнік панскі фальварак Свіркі, уласнасць Лойкі, да якога адносілася толькі адна вёска – Свіркі, дзе ў 1870 годзе пражывала 39 душ мужчынскага полу.

Ужо ў пачатку XX стагоддзя землі фальварка былі распрададзены сялянам і на яго месцы ўзнік засценак Лайкова, назва якога паходзіць, верагодна, ад прозвішча ранейшага ўладальніка Лойкі. Як памяць аб колішняй сядзібе, захаваліся векавыя дрэвы ўздоўж вясковай вуліцы ў Лайкове.

У энцыклапедычным выданні "Slownik geograficzny Krolewstwa Polskiego i innych krajow slawianskich" выдадзеным у 1890 годзе ў Варшаве, пра Свіркі сказана:

"Свіркі, вёска і фальварак, павет Вілейскі, у 3-й акрузе размешчаны, акруга вясковая Свіркі, 5 вёрст ад гміны і 69 вёрст ад Вілейкі, мае 12 дамоў, 6 жыхароў праваслаўных і 108 каталікаў (у 1865 годзе 65 душ рэвізскіх), уласнасць Лойкаў. У склад сельскай акругі ўваходзілі вёскі Свіркі, Азарцы, Пасекі, Паваркі – разам 113 душ прыватнаўласніцкіх"



Перад уездам у Свіркі з лева ад дарогі знаходзіцца невялікі каменны крыж. Каменных прыдарожных крыжоў, якія стаіць у Свірках, на Докшыччыне некалькі. Існуюць паданні пра "французскае" паходжанне некаторых з іх, аднак, хутчэй за ўсё, французы тут ні пры чым. У розных месцах Докшыччыны французам "прыпісваюць" і курганныя могільнікі, і вялізныя скарбы, і шмат чаго яшчэ, што аказваецца звычайнымі байкамі. Каменныя крыжы ставіліся як на магілах, так і проста ля дарог, пры ўездах у вёскі, не месцах старых паганскіх капішчаў. Гэты крыж – яшчэ адно пацвярджэнне старажытнасці і шматвяковасці гісторыі вёскі Свіркі.

А вось што піша ў сваім артыкуле "Приезжай, человек, живи... И ни дай тем самым погибнуть деревне" пра сваю вёску Уладзіслаў Вітольдавіч Пілячынскі (правапіс аўтара захаваны):

“В июне 2005 года Параф’янаўскі сельский Совет вместе с жителями отмечали 500-летие деревни Свіркі. На въезде в ее — свидетельством древности — стоит каменный крест.

И географическо, и экономично деревня мая размещено хорошо. Полагайте сами: от ее 8 километров к райцентра, 3 — к железнодорожной станции, 1 — водохранилище, рядом — шоссе Докшицы-Параф’янава, газопровод, неподалеку — животноводческий комплекс. Улица в деревне заасфальтировано, к домой подведенный вода и телефоны, работает магазин. С весны к осени деревня просто утопает в зелени, в квецені садов.

Это, да бы молвить, светлая сторона, но есть и темный. Годов 30 потому в каждом с наших 39 домой вечерами светились окна, в каждом — жили семь’и. и людям хватала работы. Что же сегодня? Живые, к большому сожалению, только 22 дома. и то в большинства — по одному, по двум пенсионеры. На животноводческом комплексе (там две фермы на 400 коров, два телятники, сенохранилище) работает только пять человек и трое с их, можно сказать, ни здешних. Где-то там, наверху, наверное, решили, что это выгоднее три разы на день привозить людей с Параф’янава, а ни строить им жилье тут.

А оно же, как на мой взгляд, можно было — выкупить лучшие дамы (а продаются они достаточно дешево), подремонтировать, настроить, где надо, новых хлеўчукоў, и пусть бы люди жили. Это затребует менее расходов, ведь ни надо делать новые насыпи с гравію и асфальтировать дороги, ни надо "тянуть" электричество (это же тоже гроши!), ни надо ждать, пока вырастут новые яблони-груши... Переезжай человек, живи сам, расти чад и ни дай тем самым погибнуть деревне!..

За советским подчас мы потеряли много исторических ценностей, теперь — пытаемся воссоздавать. Но же, когда один на один с их проблемами оставим малые деревни, второго жизни в их ни будет. А да больно, да хочется верить, что мои Свіркі попадут в план мероприятий по проведению Года родной земли”.

в. Свіркі, Докшицкий район.

# Сітцы

*Цэнтр аднаіменнага сельскага Савета*

Родная вёска! Ты – казка жывая.
Не ведаю, ява ці сон, можа сніцца.
Дуб пяты век тут дажывае...
Назва якая прыгожая – Сітцы.
Сітцы... Рассеяны хаты, як сіта.
Ці, можа, сітнёг гэту назву нам кінуў?
Сітцам дарогу ўсцілалі, нібыта
У час, калі ехала тут Кацярына.
Вежы, калоны, брама старая,

Дуб векавечны, царква, агароджа –
Усё аб мінуўшчыне напамінае,
А ўспамін той душу мне трывожыць.

***Таццяна Сарока.***

Лічыцца, што назва вёскі мае ландшафны характар: зараснікі водных сітняг і прыбярэжных раслін (сітнік). Але існуе яшчэ некалькі легенд пра назву вёскі.

Даўным-даўно пачалі сяліцца людзі ў гэтай мясцовасці. Бедныя хаткі гэтых людзей размяшчаліся ў беспарадку, там і тут, як бы ў выглядзе сіта. Адсюль – Сітцы, або Сітца, што можна зразумець як малое сіта.

Успамінаюцца радкі з паэмы Янкі Купалы “Курган”:

Сонных вёсак шары,
Хат амшалых, як мар...

Гэтыя “шары” напамінаюць, што, сапраўды, ў той час хаты ў вёсцы размяшчаліся як бы па акружнасці. Чарговаму землеўладальніку не спадабалася такое размяшчэнне сялянскіх сяліб, таму што ён інакш планаваў свае зямельныя ўгоддзі. Па яго загаду “непатрэбныя” хаты былі спалены і ў выніку ў вёсцы Сітцы засталася адзіная вуліца, якая зараз называецца “цэнтральная”.

Ёсць яшчэ адна прыгожая легенда. У даўнія часы людзі даведаліся, што праз іх мясціны будзе ехаць царыца Кацярына Вялікая. Паколькі гэтыя мясціны былі балоцістыя, было вырашана дарогу, па якой мелася ехаць царыца, выслаць тканінай – сітцам. Праязджаючы, Кацярына Вялікая здзівілася: “Ваша мясцовасць багата на сіцец!” З таго часу вёску пачалі зваць Сітцы.

Першыя згадкі пра Сітцы адносяцца да 1530 года. Тады ўжо ў Сітцах стаяла царква. Здаўна існавалі тры паселішчы з назовам Сітцы – маёнтак Сітцы, сяло Вялікія Сітцы і вёска Малыя Сітцы за два кіламетры на захад ад

іх. Толькі ў 1971 годзе Сітцы і Вялікія Сітцы былі афіцыйна аб'яднаны ў адно паселішча. У Малых Сітцах зараз жыве ўсяго каля 20 чалавек.

Напачатку 16 стагоддзя Сітцы, што былі ў складзе маёнтка Ваўкалаты, ўпамінаюцца сярод уладанняў трокскага ваяводы Багдана Саковіча, які атрымаў вялізныя абшары зямель на захадзе сучаснай Докшыччыны. Яго дачка Альжбета выйшла замуж за Мікалая Радзівіла, віленскага ваяводу. Сітцы разам з Ваўкалатамі сталі ўласнасцю Радзівілаў.

Пазней у складзе маёнтка Ваўкалаты Сітцы перайшлі да Ю. Слуцкага, потым да Ю.А. Хадкевіча, ва ўладаннях якога дворац Сітцы ўзгадваецца ў 1567 годзе. Пазней невядома якім чынам Сітцы сталі ўласнасцю Бжастоўскіх. Магчыма, якраз Бжастоўскія і заклалі тут умацаваную сядзібу ці нават замак. Менавіта нешта падобнае на замак адлюстравана на гравюры ў кнізе ксяндза Э. Зеляевіча "Задыяк на зямлі", выдадзенай у 1650 годзе. Зрэшты, больш дакладных звестак пра яго няма, аднак існуюць паданні пра яго існаванне.

Бжастоўскім належалі таксама і Ваўкалаты, якія ў 1795 годзе былі канфіскаваны і перададзены ва ўласнасць Цыцыянава. Сітцы нейкім чынам перайшлі ў той час да Пшэздзецкіх, а ў 1798 годзе – да Дамейкаў. Магчыма, тады яшчэ стаяў стары палац, які, верагодна, у першай палове 19 стагоддзя быў знішчаны пажарам. Ад яго засталіся толькі чатыры калоны ды падзямеллі. Брама і драўляная пабудова ў парку існавалі яшчэ ў 1805 годзе – да гэтага часу адносіцца малюнак альбо гравюра, дзе адлюстраваны гэтыя збудаванні. У Айчынную вайну 1812 года ў Сітцах два дні гаспадарылі французы. Як лічыцца, дзесьці ў 1830-40 гг, Аляксандрам Дамейкам быў закладзены новы драўляны сядзібны дом, што прастаяў да 1944 г.

Па звестках рэвізіі 1795 года, да маёнтка Сітцы адносіліся 17 паселішчаў. Тады ў фальварку Сітцы пражывалі 5 чалавек. У сяле Сітцы (Вялікія Сітцы) – 32 двары, 187 чалавек, праваслаўная царква. Маёнтак Малыя Сітцы, да якога прыналежала адно сяло – Малыя Сітцы, (13 двароў, 75 чалавек), належаў Станіславу Кульвінскаму, аднак пазней перайшоў ва ўласнасць Дамейкаў.

У XIX стагоддзі Вялікія Сітцы сталі цэнтрам воласці, да якой належалі ў 1866 годзе 35 вёсак (326 двароў, 3929 жыхароў). Пазней воласць была ліквідавана, яе тэрыторыя была падзелена паміж іншымі валасцямі, а самі Сітцы сталі адносіцца да воласці Парфенава. Паводле выдання "Słownik Geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich" 1887 года, у Вялікіх Сітцах было 34 дамы, 279 чалавек, праваслаўная царква, бровар, ветраны млын (належалі Дамейку).

Дзейнічала створанае ў 1864 годзе народнае вучылішча, якое размяшчалася ва ўласным будынку. Яно ўтрымлівалася за кошт дзяржаўнага казначэйства і сялянскай абшчыны Параф'янаўскага валаснога праўлення. Ад казначэйства для вучылішча адпускалася штогод 200 рублёў. Адным з першых настаўнікаў тут працавала выпускніца Віленскай жаночай гімназіі, удава губернскага сакратара Вольга Точнева. У 1874 годзе законанастаўнікам праваслаўнага спавядання быў выхаванец Мінскай духоўнай семінарыі,

мясцовы свяшчэннік Сафроній Пігулеўскі. У 1886/87 навучальным годзе ў Сітцаўскім народным вучылішчы 42 хлопчыкаў вучыў настаўнік, выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Восіп Завадскі. Закон Божы выкладаў у гэты час свяшчэннік А. Прыгадзінскі і ксёндз Альбін Дамашэвіч (жалаванне не атрымліваў).

У пачатку XX стагоддзя ў Сітцаўскім народным вучылішчы вучыліся 54 хлопчыкі, 6 дзяўчынак. Іх вучыў настаўнік, выхаванец Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Антон Хурс (жалаванне ад дзяржаўнага казначэйства 150 рублёў, ад сялянскай абшчыны – 8 рублёў і кватэра). Закон Божы выкладаў свяшчэннік праваслаўнага спавядання, выпускнік Жыровіцкага духоўнага вучылішча Пётр Чатыркін.

Па звестках за 1886 год, да Сітцаўскай праваслаўнай парафіі належылі 1982 чалавекі. На карце 1910 года адзначаны яшчэ адзін гаспадарчы двор паміж маёнткам Сітцы і Рапяхамі. Аднак ніякіх звестак пра яго пакуль не знойдзена.

У захаваўшыхся кліравых ведамасцях ёсць кароткае ўпамінанне аб тым, што Сітцаўская драўляная царква была аснована ў 1530 годзе. Аднак самыя раннія дакументальныя звесткі аб знаходжанні прыхода ў Сітцах (Ашмянскага павета), належалі пісарчуку Вялікага княства Літоўскае Канстанціну Бжастоўскаму за 1712 год. Царкве тады быў перададзены надзел зямлі, свяшчэнніку Міхаілу Ламановічу назначана жалаванне ў 6 злотых у год. За гэта ён павінен быў рэгулярна маліцца за тых, хто пахаваны на старадаўніх могілках пад Сітцаўскім палацам.

Праз паўтары стагоддзі царкве спатрэбіўся капітальны рамонт. Спецыялісты загаварылі пра будаўніцтва новага будынка. Для гэтай мэты Віленскі павятовы царкоўны будаўнічы камітэт сабраў 144 тысячы штук цэглы і 150 бочак вапны. Па невядомым прычынам будаўніцтва так і не пачалося, а ў 1882 годзе частку сабранай цэглы прадалі, а грошы за яе выкарысталі на рамонт і ўпрыгожванне старога будынка. У ведамасці за 1825 год сцвярджаецца, што ў сітцаўскай царкве маецца архіў і царкоўная бібліятэка. Тут захоўваецца 280 тамоў кніг, сярод якіх ёсць вельмі каштоўныя і даўнія. Таму ўваход у бібліятэку строга абмежаваны. Ушаноўваецца ў царкве і ікона Прападобнага Айца Серафіма Сароўскага.



20 жніўня 1906 года святаром храма быў назначаны Яўстафій Іўсцінавіч Нядзельскі. Толькі аднаму Богу вядома, як яму ўсяго за тры гады ўдалося (25 мая 1910 года будаўніцтва было пачата, а 9 чэрвеня 1913 года царкву асвяцілі) узвясці такую велічную крыжова-купальную святыню са званіцай. Пабудаваны храм быў на ахвяраванні мясцовых жыхароў і знакамітых чыноўнікаў з Масквы Навачаркаска, Санкт-Пецярбурга, святароў з бліжэйшых і далёкіх манастыроў. Напрыклад, на іконастас 1000 рублёў ахвяраваў імператар Мікалай II, 500 – імператрыца Аляксандра Фёдараўна. Пратаіерэй Іоан Кранштацкі ахвяраваў царкве 300

рублёў. Зрабілі значныя ўклады сем’і Бадыска, Рыбаковы, Кораневы, Беларосавы. Мясцовыя жыхары працавалі на будаўніцтве. Фундамент і сцены храма былі ўзведзены пад кіраўніцтвам інжынера, якога запрасілі з Германіі, аднак грошай, каб заплаціць яму за работу не хапіла і будаўніцтва было прадоўжана мясцовым майстрам Станіславам Сіняўскім. Крыжы на храме ўстаноўлены мясцовым майстрам Іосіфам Грыгаровічам.

Першая Сусветная вайна і далей грамадзянская нанеслі царкве значныя страты. 27 лістапада 1915 года Сітцаўскае прыходскае братэрства прыняло рашэнне вывезці дакументы і частку царкоўнай маёмасці. Былі вывезены і званы, бой ад каторых, па ўспамінах жыхароў, быў чуваць ва ўсім прыходзе, у маскоўскі Данілаў манастыр.

8 верасня 1916 года Сітцы і Свята-Георгіеўскую царкве наведаў Высокапраасвяшчэннейшы архіепіскап Ціхан. Дарэчы, менавіта Ціхан у 1917 годзе стаў 11-м патрыярхам у гісторыі Расіі і першым пасля 200-гадовага перапынку.

Пасля заключэння Брэсцкага мірнага дагавора Сітцаўскі прыход аказаўся на польскай тэрыторыі. Не стала хапаць сродкаў на ўтрыманне царквы. У 1926 годзе бурай была пашкоджана крыша, некаторыя памяшканні. На дапамогу прыйшлі былыя прыхаджане, каторыя эмігрыравалі жыць у Амерыку.

Пасля ўз’яднання ў 1939 годзе пачаліся ганенні на святароў. У хаце свяшчэнніка і ў будынку нядзельнай школы пасялілі рабочых – непадалёку пачалося будаўніцтва аэрадрома. Святар павінен быў хадзіць на работы, сям’я галадала, а дзеці, старэйшаму з якіх, Аляксандру, было толькі тры гады, замярзалі. Сяляне тайком ноччу вазілі святару дровы і ежу.



Немцы да царквы ставіліся лаяльна, нават прыходзілі на службу. Вакол царквы разбілі палатачны лагер для салдат і ў мэтах светамаскіроўкі крышу царквы пакрылі спецыяльным растворам.

У час Вялікай Айчыннай вайны Яўстафія Нядзельскага забілі партызаны. На месцы забойства каля вёскі Асонавічы пастаўлены крыж.



Існуе тэлеграма ад 1953 года, у якой архіепіскап просіць святара маліцца за выздараўленне І.В. Сталіна. На жаль, не вядома, ці была выканана гэта просьба.

У 1998 годзе быў куплены будынак для нядзельнай школы ў вёсцы Параф’янава. А ў 2002-03 гадах адрэстаўрыравалі фрэскі. Майстры змаглі аднавіць тую прыгажосць, якая была першапачаткова.

З усходняга боку храма знаходзяцца невялікія могілкі. Існуюць дакументальныя звесткі, аб тым, што могілкі пры храме былі з даўніх часоў, зараз шмат магіл проста знішчана часам, засталіся толькі магілы Марыі і Антаніны Нядзельскіх.

У храме знаходзіцца ікона Багародзіцы, аб якой існуе легенда, нібы яе даўным-даўно знайшлі жанчыны ў ручаі, што паміж Сітцамі і Пліскамі. Ручай упадае ў рэчку Сэрвач, таму ікона прыплыла супраць цячэння. Яна лічыцца цудадзейнай, але дакументальна факты аб яе цудадзейнай сіле не зафіксаваны. З даўніх часоў застаўся звычай: у час Хрэснага ходу выносіць гэту ікону з храма, у час вынасу жанчыны становяцца на калені пад ікону.



1 жніўня ВялікіяСітцы ператвараюцца ў Маленькі Сароў. У гэты дзень ушаноўваюць Святога Серафіма056 Сароўскага.



Ад царквы неабходна прайсці па цэнтральнай вуліцы Сітцаў далей на поўдзень каля 500 метраў. Тут знаходзіцца былая панская сядзіба, якая была закладзена прыкладна ў 2-й палове XVIII стагоддзя Бжастоўскімі. Яна несла характэрныя рысы стылю барока. Мела выразную і працяглую кампазіцыйную вось і сіметрычна-восевую пабудову. Уваход фіксуецца вялізнай трох’яруснай брамай, пабудаванай з буйнапамернай цэглы. Масіўная трохпралётная арка з вялікім цэнтральным праёмам утварае 1-ы ярус. Другі ярус прадстаўлены прамавугольным у плане аб’ёмам з невялікім надваротным памяшканнем, якое мае цыліндрычнае скляпенне. Унутр яго вядуць дзве вінтавыя лесвіцы. Завяршаецца брама невялікай вежай з купалам. Брама мела драўляны механізм, які забяспечваў ход гадзінніка з “зязюляй”, зроблены мясцовым майстрам. Калі біў гадзіннік, сяляне спынялі работу, не брыдкасловілі, а мовілі: “Радуйся, Марыя”, хвалілі айца, сына і святога духа. Цяжкаватае на выгляд збудаванне знешне нагадвае манастырскую браму-званіцу. Перад ім, сіметрычна з двух бакоў, растуць пачарнелыя ад часу бярозы. З левага боку да брамы прымыкала выцягнутае на двух узроўнях цаглянае збудаванне, якое называлася кашара. Было, відаць, мясцовай формай кардыгардый, якія будаваліся пры замках, гарадскіх валах і прызначаліся для размяшчэння варты або гарнізона.







Ад брамы ўздоўж галоўнай восі ідзе ліпавая алея. Партэр з традыцыйным кругам быў вялікі, адкрыты. За ім стаяў барочны палац Бжастоўскіх. Захаваліся часткова 4 пілоны былога порціка параднага фасада,

фрагменты скляпенняў. Порцік складаўся з 6 пілонаў і накрываў трохвугольным шчытом увесь дом і дах з гонту. А ў палацавых склепах захоўваліся разнастайныя дамашнія наліўкі, мяды, віны. Па ўспамінах пляменніцы Вацлава Дамейкі Яніны Эрман, быў, а магчыма, яшчэ захаваўся часткова падземны ход даўжынёй каля 4 кіламетраў.Падземны ход выводзіў людзей у час небяспекі ў прыдатнае месца – астраў на балоце каля Ямнага.

Перад палацам, на пад'язным крузе, расла велічная двухствольная ліпа. Каля яе ляжаў валун. Існуе легенда пра няньку, якая ненарокам выпусціла з акна палаца панскае дзіця. Гаспадары яе люта пакаралі – жывую загадалі закапаць у яму, а на магілу паставіць вялікі камень.



За палацам быў спланаваны парк у выглядзе шасці прамавугольных баскетаў. Баскеты ўтваралі алеі, у якіх ліпы былі пасаджаны вельмі шчыльна – праз 0,5 метра. Кроны дрэў фармаваліся на вышыні 5 метраў, і алеі мелі выгляд зялёных калідораў. У іх сценах былі нішы, якія служылі альтанкамі. Ад часу ліпы маюць ужо нездаровы выгляд, сухія галіны, ствалы пакрываюцца імхамі і лішайнікамі, але яшчэ выразна перадаюць асаблівасці планіроўкі барочнага парку.

У 1798 годзе маёнтак адыйшоў да роду Дамейкаў герба Дангель. Першым гаспадаром з іх быў Тадэвуш (1762 – 1838), сын Казіміра (н. ў 1725), скарбніка інфляндскага і каралеўскага, камісара віленскага, і Багуміла Адахоўскай з Свентаржэцкіх. Тадэвуш, мечнік мсціслаўскі (1788), падсудак Віленскага павета (1801), падкаморы (1817), быў жанаты на Схаласцыне (1768 – 1827). Яны мелі сыноў Стафана Аляксандра (1804 – 78), Казіміра Францa (1805 – 75) і Люцыяна Вінцэнты (н. ў 1808), якія даводзіліся стрыечнымі братамі знакамітаму Ігнату Дамейку. Яго бацька Антоні Гіпаліт (1764 – 1809) быў жанаты на Караліне з Анцутаў, даводзіўся родным братам Тадэвушу і валодаў маёнткам Мядзведкі. Наогул, род Дамейкаў меў шмат маёнткаў на абшарах сучаснай Беларусі і сярод іх Сітцы. Так, у "Літоўскай метрыцы" 1864 года адзначалася, што ў памесці Дамейкаў 104 рэвізіўныя душы, царква драўляная Святога Ежы, узведзеная ў 1710 годзе і перабудаваная ў 1819 годзе. Маецца сельская школа – 32 вучні. Праваслаўная парафія адносіцца да Мядзельскага благачыння. Акрамя школы ў Сітцах у парафіі былі царкоўныя школы ў вёсках Грабучае, Грынеўшчына, Дзядкі. У склад сельскай акругі ўваходзіла 9 вёсак (521 рэвізійная душа). Гміна Сітцы складалася з 5 сельскіх акруг.

Па спадчыне Сітцы разам з Гервятамі адыйшлі старэйшаму сыну Стафану Аляксандру, жанатаму на Сафіі з Брахоцкіх (1814 – 99). Стафан, часцей называўся Аляксандрам, быў маршалкам дваранства Віленскага павета (1832), меў званне камергераюнкера (1834), потым званне камергера і тайнага саветніка. З 1855 года і да канца жыцця з'яўляўся маршалкам дваранства Віленскай губерні. Быў вельмі лаяльны да царскай улады, асуджаў паўстанне 1863 – 64 гадоў.

Менавіта Аляксандр перапланаваў і пашырыў сядзібу. Яна набыла рысы пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Кампазіцыйным цэнтрам становіцца новы палац – невялікі драўляны аднапавярховы будынак з шасцікалонным порцікам на парадным фасадзе, крыты гонтам. На тыльным баку будынка, абвітым дзявочым вінаградам, меўся ганак з трохскатным дахам. Да будынка прымыкала аранжарэя – цэнтрычная ў плане будова з канічным дахам. У ёй нават зімой цвілі пахучыя і прыгожыя кветкі, раслі экзатычныя расліны. Зімой вялікая шкляная аранжарэя атаплівалася, а летам у ёй было душна. Да столі падымаліся пальмы, эўкаліпты, лімоны, апельсіны, цвілі ружы, араўкарыі (лічыцца, што менавіта гэту расліну Ігнат Дамейка прыслаў родзічам з Чылі). На вінаграднай лазе вырошчвалі вінаградных смаўжоў. Далікатэс адпраўлялі ў Варшаву і іншыя еўрапейскія краіны. Доўгі час за аранжарэяй даглядаў мясцовы жыхар Ульян Баравок.



Сядзібны дом Дамейкаў. На заднім пляне — аранжэрэя. Здымак 1930-х гадоў

Фарміруюцца новыя пейзажныя кампазіцыі ў паўночнай частцы сядзібы. Старажытны курган на ўскраіне парку, авеяны легендамі, служыць відавым узгоркам. Раней хадзілі чуткі, што гэта брацкая магіла нападаючых рыцараў і абаронцаў.

На мясцовым ручаі, прытоку ракі Сэрвач, ствараецца водная сістэма з дзвюх вялікіх сажалак. Яна пашырае паркавую прастору, становіцца акцэнтам перспектывы з уязной ліпавай алеяй, якая праходзіць па заходняй ускраіне сядзібы і, змяніўшы кірунак на ўсход, падыходзіць да старадаўняй брамы.

Адзначаная планіроўка добра прасочваецца цяпер. Толькі былыя групы дрэў прынялі выгляд самкнутых складаных насаджэнняў, замест газонаў расце пустазелле. Зарастаюць вадаёмы. Дрэвы разрасліся і закрылі былыя перспектывы. На ўскраіне парка знаходзіцца помнік прыроды рэспубліканскага значэння – Дуб-велікан, якому амаль 500 гадоў. Яго вышыня 26 метраў, дыяметр – 2 метры. Ён сімвалізуе стойкасць і моц, стабільнасць і размеранасць жыццёвага шляху.



У цяні дуба гулялі паненкі ў ільняных сукенках, шчабяталі пра нешта сваё, дзявочае, а дуб услухоўваўся, спачуваў, разважаў. Паводле народнага падання пад дубам адпачываў нацыянальны герой Польшчы Тадэвуш Касцюшка. За шматгадовую гісторыю пад кронай дуба адбываліся многія падзеі: і радасныя, і трагічныя. Каб ён мог размаўляць, то абавязкова расказаў бы аб трагічнай гісторыі, якая адбылася на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя.

Ішла грамадзянская вайна. Чырвоная Армія адступала і яе разбітыя часці рухаліся на ўсход. Аднойчы ў парку, як раз пад дубам, спыніўся палявы лазарэт. У суправаджэнні дзвюх маладых сясцёр міласэрнасці на дзвюх

фурманках везлі параненых чырвонаармейцаў. Жыхары Сітцаў і суседніх вёсак ад душы дзяліліся з імі хто чым мог. Накарміўшы і перавязаўшы параненых, сёстры міласэрнасці ляглі адпачываць, а санітары павялі на луг пасвіць коней. Ноччу на лазарэт наляцела банда польскіх уланаў, якая была арганізавана і ўзброена на сродкі паноў Дамейкаў. На чале яе стаяў асаднік. Бандыты шашкамі пасеклі раненых, потым прымусілі мясцовых жыхароў выкапаць у парку яму і пахаваць там ахвяры. Над маладымі медсёстрамі доўга здзекваліся, а потым у непрытомным стане, жывых, кінулі ў магілу. Забраўшы няхітры скарб палявога лазарэта, банда пакінула Сітцы. Вярнуўшыся ў свой маёнтак, Іван Дамейка не ўпадабаў, што ў яго парку пахаваны чырвонаармейцы. Ён загадаў зруйнаваць магілу і пасадзіць на ёй дрэвы, але тыя засохлі, і тады гэта месца засеялі травой. У 1940 годзе па факту гэтага забойства была ўзбуджана крымінальная справа. Удалося адшукаць і арыштаваць главара банды і некаторых яе членаў. А з чырвонаармейцаў у жывых застаўся адзін санітар.

Пабываўшы ў Сітцах, Пятрусь Броўка прысвяціў дубу верш “Балада пра дуб саўгаса “Сітцы”, у аснову якога ляглі падзеі, што адбыліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат за жыццё дзівоснага
Бачыць мне выпадала,
Дрэваў самых магутных
Я наглядаў нямала.
Бачыў у пушчах дрымотных,
Каля азёраў, крыніцаў...
Чаму ж ты параніў сэрца,
Дуб, што з саўгаса “Сітца”?
Год мо пяцьсот ці болей.
Аж да аблокаў рушыш,
Крокаў аж дваццаць зробіш,
Пакуль ля камля абкружыш.
Галлё тваё, што крэмень,
Летам мядзяна-зялёны...
Ды на цябе як гляну,
Быццам ты чым засмучоны?..
І праўда, калі распазнаеш,
Хочацца слёзам ліцца,
Што мне пра дуб расказалі
Людзі з саўгаса “Сітца”.
Глянь жа ты ўвысь і добра,-
Вершаліна дуба свіціцца,
Бачыш зялёную крону,
Абскуб яе нехта быццам?
Ўто ж па галлі пахадзілі
Сякерамі, нават пілою –
Гэта было ў сорак першым,
Часінаю вельмі цяжкою.
Гэта было ў сорак першым,
У год невыносна-крывавы.
Эсэсаўцам, вырадкам лютым,
Бач, не хапала забавы,
Ну й рагаталі ж, як чэрці,
З выдумкі быццам заўзятай,
Сагналі музыкаў палонных
У робах сюды паласатых.
Што ім бяда музыкантаў.
Затое эсэсаўцам люба –
Ах, як іграў ім, іграў ім
Аркестр духавы на дубе!..
Былі сярод тых аркестрантаў
Савецкія, сербы, французы,
Бельгійцы, англійцы, ірландцы –
Іграліся вальсы і блюзы,
Ігралі ваўсю аркестранты,
Заказы ім з долу крычалі,
А каты ў мундзірах, спадніцах,
Скакалі, скакалі, скакалі...
Да сёмага поту скакалі,
Як толькі трымалі іх ногі,
Здавалася – неба ірвалі
Пра фюрэра “хайлі” і “гохі”...

І раптам яны анямелі
І знік звар'яцелы запал,
Ім вушы прарэзаў няшчадна,
Як гром, як нястрымны абвал,-
"Інтэрнацыянал"!..
Эсэсаўцы гаўкалі: - Стой!..
Але аркестранты не чулі –
Ігралі мацней і мацней...
І з долу пасыпалі кулі!
Ды марш пралетарскі байцоў
Ніякая смерць не заглушыць.
І падалі з голля тады
Нічым не скаронныя душы.
Ім бачыўся час перамог,
І горда яны паміралі,
А трубы і нават адны,
Здавалася, самі ігралі...

***

А мне ўсё гэта расказаў,
Ніколі аб тым не забыцца,
Волат наш, сведка жывы,
Дуб, што ў саўгасе "Сітца"!

Цудоўным дубам любаваліся такія вядомыя дзяржаўныя дзеячы, як С. Прытыцкі, П. Машэраў, У. Лабанок. Пад кронай магутнага прыгажуна адзначыў сваё 50-годдзе народны артыст СССР і БССР Ф. Шмакаў. Павёз на памяць фотаздымак дуба першы састаў ансамбля "Песняры", які тады меў назву "Лявоны". Чуў дуб і палымяныя выступленні народных пісьменнікаў М. Танка, І. Шамякіна. У творах І. Мележа, П. Броўкі, М. Калачынскага ёсць радкі, прысвечаныя сітцаўскаму дубу. Пад ім піў медавуху жывая легенда Беларусі Р. Шырма, выконваў свае творы тады яшчэ малады кампазітар І. Лучанок. Гучалі тут галасы Юрыя Смірнова, Тамары Раеўскай. Гасцямі Сітцаў былі П. Панчанка, А. Ставер, В. Быкаў, Р. Барадулін і многія іншыя дзеячы культуры.



Недалёка ад дуба можна назіраць адзін з баскетаў, які знаходзіцца ў заходняй частцы сядзібы. Напэўна, пазней ён стаў месцам размяшчэння парнікова-цяплічнай гаспадаркі. Ён мае бутавую сцяну вышынёй да 2,5 метраў, таўшчынёй 0,7 метра, завершаную чарапічнай дахоўкай. Нішы сцяны, якія добра захавалася, спрыялі вырошчванню вінаграднай лазы, адзіныя расліны якой вяліся яшчэ ў апошні час. У склад бакавой агароджы быў уключаны домік агародніка, пабудаваны з цэглы, і невялічкая вяндлярня, якая адначасова служыла паркавым павільёнам. Зараз тут знаходзіцца магазін.



Пасля смерці бяздзетнага Аляксандра і Соф'і Дамейкаў у 1899 годзе ўладальнікам памесця стаў пляменнік Аляксандра Дамейкі з Гервят Вацлаў Дамейка (1854 – 1935), сын брата Казіміра, уладальніка Гервят. Апошні Дамейка быў лагодны, прыемны, здольны, адзначаны кемлівасцю да гісторыі прыроды: насякомыя, матылі, мінералы для яго былі найкаштоўнейшымі цацкамі. Вацлава любілі за добрае сэрца. Ён ніколі нікому не адмовіў, калі хто аказваўся ў бядзе. Калі Вацлаў

вяртаўся з прагулак у маёнтак, яго спынялі людзі, расказвалі пра свае нягоды і праблемы, прасілі дапамогі і ён ніколі і нікому не адказваў. Патомак Дамейкаў – Марыўш Германовіч, які зараз жыве ў Францыі, піша ўспаміны сваёй маці: “Дзядзечка Вацлаў, родны брат бабулі Леоніі, якога мы называлі “дзядзя”, звычайна суправаджаў нас у паездках, калі мы ездзілі па вёсках і адорвалі вясковых дзяцей цукеркамі, а, таксама, быў з намі пры выездах за мяжу для “навукі і здароў’я”. Дзядзя быў вельмі добры, меў залатое сэрца, нікога не пакрыўдзіў, нас жа псаваў вельмі”. Пры Вацлаве Дамейку Гервяты і Сітцы сталі адным цэлым.

І менавіта з Вацлавам звязаны апошні этап у развіцці сядзібы ў Сітцах. Быў аднаўлены гаспадарчы двор, пабудаваны жылыя дамы. Новыя пабудовы занялі паўднёва-усходнюю частку сядзібы і часткова захаваліся. Двор прамавугольны ў плане. Будынкі размешчаны па перыметры. Архітэктурную цікавасць з іх уяўляе двухпавярховы будынак з цэглы. Таўшчыня яго сцен 71 сантыметр. Ніжні паверх прадстаўлены амаль квадратнымі ў плане камерамі, перакрытымі крыжовымі скляпеннямі. Вуглы і фасады сцен умацаваны эскарпамі. Будынак знешне нагадвае манастырскі корпус або гандлёвы рад. Другі будынак вялікіх памераў 56 на 16 метраў. Канструкцыю сцен трымаюць моцныя мураваныя шулы, атынкаваныя, з украпінамі чорнага шчэбню. Пралёты даўжынёй 7 метраў закладзены шасцю сасновымі вянцамі, адзін ніжні – дубовым. У 1934 годзе сядзіба атрымала новую агароджу (дата выкладзена чорным шчэбнем), аснову якой складаюць магутныя бутавыя пілоны (130 на 80 см), завершаныя бетонавымі плітамі.





Пасля смерці Вацлава ў 1935 годзе Сітцы перайшлі да яго сястры Леанілы Паплаўскай (у дзяцінстве Дамейка) з Сурвілішак (1858 – 1951). Тады агульная плошча разам з фальваркамі Ямнае, Вянюціна, Дзеркаўшчына складала 2140 га, дзе палавіну гэтай плошчы складалі лясы. Маёнтак быў развіты, шматгаліновы. Драўляны нізкі панскі дом меў менш 12 пакояў. Захавалася да 1939 годзе шкляная аранжарэя, якую не знішчыла І сусветная вайна. Пабудовы сядзібы былі ўпрыгожаны кованымі вырабамі, якія зрабіў мясцовы майстар. Наогул, да 1939 года ў Сітцах захавалася некалькі пабудоў, размах якіх сведчыць аб тым, што менавіта тут, у Сітцах, быў сход шляхты вялікапанскай. Вялікім гонарам сям’і Дамейкаў была капліца Маткі Боскай Вострабрамскай – дакладная копія віленскай. А паставіла яе маці Вацлава і Леанілы Анеля Дамейкава з Нарушэвічаў, называемая ў сям’і “Бабуня гервяцкая”.

У снежні 1939 года маёнтак быў абследаваны ўпаўнаважанымі наркамата саўгасаў БССР. Вось што было напісана ў выніковым дакуменце, датаваным 18 снежня 1939 года: *“Маёнтак Сітцы Параф’янаўскай воласці Глыбоцкага павета, ад г. Глыбокае 35 км, ад чыг. ст. Параф’янава 7 км.*

*Усёй зямлі 2400 га, з іх ворнай 315 га, лугу 700 га, лесу 1400 га, саду 5 га, парк 1 га, ёсць аранжэрэя. З тэхнічных прадпрыемстваў ёсць вінакурны завод. Возера з рыбай за 3 км, праходзіць рака Сэрвач. З пабудоў: кароўнік на 150 гадоў, цялятнік на 30 галоў, 2 канюшні на 60 галоў кожная, свінарнік на 40 галоў, аўчарня на 30 галоў, лазня, ток вялікіх памераў, 2 пуні на 1000 пудоў кожная.*

*Ёсць млын. Жылыя пабудовы даволі прыстойныя і цалкам забяспечваюць патрэбу, астатнія вытворчыя пабудовы ёсць цалкам. Вялікую цікавасць уяўляе дом памешчыка. З быдла ёсць: 30 галоў кароў, цялят 5, нецелей 5, 3 бык-вытворцы, парода буйной рагатай жывёлы чырвонапольская. Ёсць 20 працоўных коней, 2 свінаматкі.*

*Збожжа: жыта 13 тон, аўсу 50 тон, ячменю 30 тон, вікі 10 тон, ільносемя 1 тона, люпіна 6 тон, пшаніцы 10 тон.*

*Грубыя кармы: лугавога сена 170 тон, канюшыннага сена 5 тон, саломы рознай 200 тон, мякіны 50 тон, бульбы 80 тон. Неабходна адзначыць: сенакос на адлегласці ад 1 да 2 км. Лес на 3 км ад маёнтка.*

*Сельгасмашыны і інвентар цалкам захаваныя, у тым ліку складаная малацілка з паравым рухавіком.*

*Азімых пасеяна 45 га, на дзень агляду збожжа не абмалочана цалкам.*

*Ёсць насенне канюшыны 1000 кг.*

*Заключэнне: засталося 45 сем'яў парабкаў. Маюць жаданне уступіць у савецкую гаспадарку. Арганізацваць савецкую гаспадарку ёсць магчымасць у перспектыве."*

Саўгас у Сітцах быў створаны ў лютым 1940 года. Да яго адносіліся напачатку 1773 гектары зямлі.

Панскі дом быў знішчаны партызанамі ў час Вялікай Айчыннай вайны.



У гады Вялікай Айчыннай вайны каля Сітцаў існаваў ваенны аэрадром і лагер для ваеннапалонных. Вось як успамінае пра гэта жыхарка вёскі Парэчча Шылько Алена Антонаўна: "...Каб вам стала больш зразумела, хачу зрабіць кароткае адступленне. У ваенныя гады (ды і пасля) адрэзак дарогі ад цэнтральнай сядзібы саўгаса "Сітцы" да аднайменнай вёскі пуставаў. Направа распрасціралася далёка пад лес роўнае поле. Дакладней не поле, а аэрадром, пабудаваны ў 1939 годзе, пасля ўз'яднання Беларусі. Гэты аэрадром немцы пачалі актыўна выкарыстоўваць у канцы 1943 года. За сядзібай, каля заросшага става, размясціліся доўгія нізкія баракі, абнесеныя калючым дротам у два чалавечыя росты, з вартавымі вышкамі. На аэрадроме і ў суседнім лесе, што быў літаральна перапоўнены штабелямі авіябомб, працавалі ваеннапалонныя, якія жылі ў лагеры.

Дык вось, у час нямецкай акупацыі ўсе, каму споўнілася 15 год, павінны былі хадзіць на работу. Я з сястрой кожны дзень хадзілі ў вёску Сітцы на розныя работы. Аднойчы каля вёскі Курдзекі узарваліся на міне 2

коней. Паколькі наша вёска межавала з партызанскай зонай, немцы вырашылі нас пакараць.

29 красавіка 1944 года яны акружылі нашу вёску і ўсіх мужчын забралі з сабой. Каля Курдзек загадалі ім капаць яму. Потым па 2 чалавекі ставілі каля ямы і расстрэльвалі. Так забілі 8 чалавек – 6 мясцовых жыхароў і 2 бежанцаў, якія былі прывезены ў нашу вёску.

5 мая 1944 года немцы зноў акружылі нашу вёску і усіх жыхароў пагналі ў вёску Сітцы і размясцілі ў лагеры, які быў размешчаны побач з былым панскім маёнткам. Лагер быў абнесены калючым дротам у некалькі радоў. Калі нас пагналі з роднай вёскі, Парэчча адразу падпалілі.

У лагеры усіх працаздольных забіралі на розныя работы. Над кожным стаяў надзірацель, ахоўвалі нас моцна. Кармілі нас 1 раз у дзень. Потым людзі сталі хварэць на тыф. Адзін дзяцёнак памёр. Яшчэ адна жанчына з малым дзіцём з Будслава захварэла. За ёй прыехаў бацька і на каленях прасіў немцаў аддаць хворую дачку і ўнука. Аддалі, але ні дачка, ні ўнук не выжылі.

У лагеры мы знаходзіліся да канца мая. Калі нас выпусцілі, то вяртацца не было куды. Мы жылі ў суседняй вёсцы Войтовічы, а знаёмыя з суседніх вёсак давалі нам прадукты харчавання”.

Пасля вайны 16 ліпеня 1954 года Сітцы сталі цэнтрам аднайменнага саўгаса і даволі значным паселішчам (768 чалавек па стану на 2004 год). У 1956-57 гадах саўгас “Сітцы” узбуйніўся за кошт эканамічна слабых чатырох калгасаў: імя Суворава, імя Молатава, імя Хрушчова, “Гігант”. З цягам часу пабудаваны такія прадпрыемствы, як кансервавы цэх, кандытарскі цэх, цэх безалкагольных напояў і спіртавы цэх. Таксама узведены Палац культуры на 400 месц і дзіцячы сад на 140 месцаў. Каля будынка канторы СПК “Сітцы”, у парку, у 1967 годзе на ўшанаванне памяці 30 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пастаўлены помнік – скульптура воіна.



У 1982 годзе пабудавана новая школа на 170 месц. У 2004 годзе адкрыта аддзяленне кругласутачнага знаходжання пры ТЦСАН на месцы былой участковай бальніцы. Парк Дамейкаў за гады савецкай улады паступова прыйшоў у заняпад. У 1998 годзе Сітцы наведаў праўнук Вацлава Дамейкі таленавіты французскі фатограф Марыўш Германовіч. Ён прыязджаў разам са сваім сынам Мілашам. Агледзіў былыя ўладанні сваіх прадзедаў, дакладней, тое што ад іх засталося. Яго ўразілі вялікія палі, на месцы якіх, па словах бабулі Яніны, раней былі лес, хутары, напрыклад, Юзефова, Верань.



Марыўш працуе ў Міністэрстве культуры па інвентарызацыі помнікаў даўніны. Яго персанальныя фотавыставы экспаніруюцца ў Францыі, Вялікабрытаніі, Злучаных Штатах Амерыкі, другіх краінах. Яму ўдалося пабываць у Вільнюсе і скласці па архіўных звестках радавод

рода Дамейкаў і Бжастоўскіх (копіі іх знаходзяцца ў Сітцаўскай сярэдняй школе).

У 2007 годзе ў Сітцах пачата будаўніцтва аграгарадка.

16 верасня 1926 года ў вёсцы Сітцы нарадзіўся Карповіч Мікалай Уладзіміравіч. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1952 года рахункавод, з 1953 года брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса "Сітцы". Званне Героя Сацыялістычнай працы прысвоена ў 1972 годзе за павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 9-й пяцігодцы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, "Знак Пашаны" (1966). Памёр 8 студзеня 1992 года.

Радавод Ігната Дамейкі (славуты вучоны, геолаг рэктар Чылійскага універсітэта) звязаны з Сітцамі. У 1798 годзе вялізныя абшары зямель, што адносіліся да маёнтка Сітцы пачалі належаць Тадэвушу Дамейку, роднаму дзядзьку Ігната Дамейкі. Леон Дамейка, брат Тадэвуша, быў уладальнікам маёнтка Дзеркаўшчына на Глыбоччыне і ў 1822 годзе збудаваў там касцёл. У 1829 годзе ўладальнікам маёнтка Сітцы стаў Аляксандр Дамейка, стрыечны брат Ігната (нар. у 1804 годзе). Як і Ігнат, ён прымаў удзел у працы тайных таварыстваў і, напэўна ж, супрацоўнічаў у гэтай справе з Ігнатам. Аднак пазней Аляксандр стаў на чале дваранства Віленскай губерні і тайным саветнікам, і пачаў служыць царскай уладзе, у адрозненне ад Ігната, які да канца сваіх дзён застаўся верным сваім поглядам. Аляксандр не меў дзяцей, і таму маёнтак адышоў Вацлаву Дамейку, якога і сёння старажылы ўспамінаюць добрым словам. Паводле метрычных кніг, Ігнат Дамейка быў у 1802 годзе ахрышчаны ў Параф'янаўскім касцёле. Наўрад ці маленькага Ігната везлі з Навагрудка (афіцыйна прызнанае месца нараджэння Ігната Дамейкі вёска Мядведкі Навагрудскага павета Мінскай губерні – зараз Карэліцкі раён Гродненскай вобласці) у Параф'янава, каб толькі пакрысціць. У адказах на пытанні, дзе і калі нарадзіўся І. Дамейка, пакуль яшчэ не ўсё адназначна. Аўтар «Польскага гербоўніка» Адам Банецкі сцвярджае на падставе касцельнай метрыкі, запісанай чамусьці ў Параф'янаве, што прыйшоў ён на свет у 1802 г. А гэта цяпер Докшыцкі раён Віцебскай вобласці. У Параф'янаве хрысцілі і іншых прадстаўнікоў роду Дамейкаў, напрыклад, малодшага брата Ігнацага Казімежа. На тым жа мястэчку настойвае адзін з нашчадкаў вучонага (па кудзелі) Мар'юш Германовіч, які цяпер пражывае ў Францыі і які прыязджаў на згаданыя Карэліцкія чытанні. За ім такія ж звесткі трапілі і ў беларускі друк. Аднак сам вучоны недвухсэнсоўна і паслядоўна месцам свайго нараджэння, родным сваім домам называў сядзібу ў Медзвядцы, абапіраючыся тут, напэўна ж, на вестках, атрыманых ад маці. Блытаніна ж з метрыкай, як здаецца, магла ўзнікнуць ад таго, што яна трапіла ў Параф'янава ў сувязі з пазнейшым хрышчэннем там брата Казімежа. Зрэшты, сваякі І. Дамейкі хрысціліся ледзь не па ўсёй Літве-Беларусі (метрыка бацькі, напрыклад, аказалася ў Заслаўі). І на тое былі свае прычыны (разгалінаванасць роду, звычай жанчын ездзіць на час родаў да сваіх маці). Калі гісторыкі змогуць даказаць, што нацыянальны

герой Чылі Ігнат Дамейка нарадзіўся ў маёнтку Сітцы, то ў сельскай школе з’явіцца памятны знак. А магчыма, установу адукацыі назавуць ягоным імем, паставяць помнік і адкрыюць музей.

Адзін з самых вядомых у свеце беларусаў Ігнат Дамейка (1802-1889) быў выдатным геолагам, мінеролагам, географам, этнографам, шматгадовым рэктарам Чылійскага ўніверсітэта і членам шматлікіх навуковых таварыстваў, адным з самых вядомых выхаванцаў Віленскага ўніверсітэта. Ён быў аўтарам 130 навуковых прац. Па яго шматлікім падручнікам вучыліся і вучацца студэнты Чылі, Перу, Мексікі.

2002 год быў абвешчаны ЮНЕСКА Годам Ігнацiя Дамейкa. Імем Дамейка названа малая планета, адкрытая чылійскім астраномам Карла Тарэсам у 1975 годзе, мінерал дамейкіт, які быў знойдзены самім Ігнацiем у 1844 годзе ў Чылі, аманіт чылійскі, выведзены ў Варшаве гатунак азаліі, кактус, фіялка, горад у правінцыі Араўканія на поўдні Чылі, пасёлак, універсітэт, нацыянальная бібліятэка Чылі, бібліятэка ў Буэнас-Айрысе, горны хрыбет і гара ў Андах (Кардзільера-Дамейка), вуліцы, плошчы, залы, паштовыя станцыі, некалькі ліцэяў, другіх вучэбных і навуковых устаноў у Чылі, грамадскія і спартыўныя арганізацыі, фонды і стыпендыі. У Беларусі ў вёсцы Заполле Лідскага раёна адкрыты музей вядомага земляка. Побач з Сітцамі знаходзіўся былы двор Анкудава, які звязаны з родам маці падарожніка.

Як гэта зрэдку бывае, нечакана ў жыцці чалавека здараюцца вялікія і прыемныя змены. Такая падзея напаткала нядаўна і жыхарку вёскі Сітцы Валянціну Сіндрэвіч. Выкладчыца мясцовай сярэдняй школы толькі праз некалькі тыдняў прыпомніла, што трэба неяк праверыць латарэйны білет “Суперлато”, які ёй падаравала мама да жаночага свята. І які ж быў у жанчыны шок, калі яна стала ўладальніцай аднаго з галоўных прызоў - новай двухпакаёвай кватэры ў беларускай сталіцы! Не спадзявалася ні на што, а тут раптам прываліла такая жыццёвая ўдача коштам не адну сотню мільёнаў рублёў. Цяпер можна падумаць аб пераездзе ў Мінск, у іншым выпадку такая сталічная нерухомасць каштуе вялікіх грошай, якія далёка не кожны ў глыбінцы заробіць за ўсё сваё жыццё.

# Скураты

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Чаму ў вёскі такая дзіўная назва? Можа, таму, што жылі і жывуць у ёй людзі з такім прозвішчам? Зазірнуўшы ў далёкае мінулае, даведаемся, што ў свой час польскі кароль Стэфан Баторый на шляху ў Масковію спыняўся ў гэтых мясцінах. Ёсць гістарычныя звесткі пра гэтыя падзеі. Паміж вёскамі Сасновая і Асінавік ёсць урочышча, якое носіць назву Станкруль (а магчыма Стань Круль). Лбдзі кажуць, што калісьці там было паселішча. На ўзгорку стаяў камень з надпісам "С. Баторі", выбіта на камяні талерка і лыжка. Зараз камень знаходзіцца ў Мінску ў музеі гісторыі Беларусі "Уручча-2". Гэта акалічнасць пацвярджаецца запіскамі Тышкевіча, які піша, што кароль Стэфан Баторый спыняўся ў Станкрулі і перапраўляўся праз Поню на адлегласці ў тры вярсты ад Станкрулі. Верагодна, што гэта і будзе вёска Скураты. Не было маста ў гэтым месцы, і войскі Баторыя пераходзілі раку па нацыягнутых на доўгія жардзіны скурах жывёлы. Вось і атрымала такую назву вёска, а потым жыхары атрымалі ад гэтай назвы прозвішчы.

У пачатку ХХ стагоддзя Скураты ўпамінаюцца як фальварак Тумілавіцкай воласці Барысаўскага павета, дзе была адна гаспадарка і 16 жыхароў. У час Польскай акупацыі Заходняй Беларусі ў 1921-39 гадах у Скуратах знаходзілася пагранзастава.

# Слабада

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Слабада ўваходзіла ў Бярэзінскую воласцб Барысаўскага павета. На той час тут пражывала 369 жыхароў (зараз каля 80).



У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яшчэ нядаўна тут дзейнічала васьмігадовая школа. У 1968 годзе дзяржаўная камісія падпісала акт прыёмкі ў эксплуатацыю школы на 192 месцы. Праіснавала яна каля 20 гадоў. Зараз ад яе засталіся рэшткі сцен былой спартыўнай залы.

Каля школы, ва ўрочышчы Галодны могільнік захавалася шмат каменных крыжоў. Кажуць, што там пахаваны людзі, якія памерлі ў час вялікага голаду.

# Слабада

*Вёска ў Крулеўшчынскім сельскім Савеце*

Сяло Слабада адносілася да маёнтка Замошша, які належаў Зяновічам, пазней Багдановічам. Таму ў некаторых крыніцах паселішча згадваецца як Замошская Слабада. У 1795 годзе, паводле рэвізіі, у сяле Слабада маёнтка Замошша было 26 двароў, у якіх пражывала 158 чалавек. Слабада была самым вялікім паселішчам у маёнтку. У 1870 годзе сяло Замошская Слабада адносілася ўжо да маёнтка Янушэва Рудамінаў. Па звестках перапісу



насельніцтва 1897 года, насельніцтва Слабады складала 299 чалавек. У XVIII – XIX стагоддзях у Слабадзе была ўзведзена царква (хутчэй за ўсё – уніяцкая). Зараз яна называецца царква Святой Праведнай Ганны. Аднак, па неправераных дадзеных гэтаму храму ўжо больш 300 год. Ва ўсякім разе, так указваецца ў царкоўнай хроніцы, якую склала Раіса Сцяпанаўна Бягун – дачка вядомага святара Сцяпана Бягуна. У 1925 годзе яна была зачынена, а ў 1967 годзе тагачасным кіраўнікам саўгаса "Докшыцкі" уздумалася прыстасаваць яе пад сховішча мінеральных угнаенняў. Да гонару слабадчан, ніхто з іх не выйшаў на гэту работу, нават пад пагрозай звальнення. Тады да макаўкі прывязалі трасы і трактарамі разбурылі будынак да падмуркаў. Толькі праз 20 год царква зноў адчыніла дзверы. А асвяшчэнне храма адбылося 20 кастрычніка 1997 года. Даведаўшыся аб адкрыцці храма, адна з прыхаджанак, якой пашчасціла трапіць у групу паломнікаў, прывезла з Іерусаліма святой зямлі, іарданскай вады і свечак, запаленых ад грабніцы Гасподняй. Усе гэтыя рэліквіі раздаваліся прыхаджанам.



**Царква ў Слабадзе. Здымак 1920-х г.**

У 1884 годзе пры царкве ў Слабадзе адкрыта змешаная аднакласная царкоўна-прыхадская школа. Па звестках "Отчёта о церковно-приходских школах и школах грамоты Минской епархии за 1890/91 учебный год.", у школе навучаліся ў 1890/91 навучальным годзе 15 хлопчыкаў. Настаўнікам працаваў вольнанаёмны селянін з хатняй адукацыяй Іван Сіндрэвіч, які атрымліваў 15 рублёў за зіму пры гатовым стале. Таксама навучаннем у школе займаўся мясцовы святар А. Звераў, які скончыў курс Пскоўскай духоўнай семінарыі. Свайго памяшкання школа тады не мела. Школа размяшчалася ў хатах бацькоў вучняў па чарзе, але ўжо у 1920-я гады, калі

школа стала чатырохкласнай, каля царквы быў узведзены новы будынак школы.

З 1921 года па 1939 год Слабада ўваходзіла ў склад Польшчы. У 1930 годзе ў Слабадзе было 65 двароў, пражывалі 354 чалавекі, 334 дзесяціны зямлі, частка якой належала мясцоваму святару, які здаваў яе ў арэнду малазямельным сялянам.

Цікавы выпадак успамінае Н.В. Таляронак – член ячэйкі КСМЗБ з вёскі Малажане. Гэта адбылося на свята 1 Мая 1935 ці 1936 года. Яно як раз супала з Вялікаднем. Нікадзіму Таляронку і Мікалаю Гойгелюбыло дадзена заданне на дарозе ад вёскі Малажане да вёскі Слабада раставіць чырвоныя флажкі, зробленыя членамі ячэйкі, і праз кожныя 50 метраў узбоч дарогі кінуць афішу. У гэтуж ноч у Слабадскую царкву сабраліся ўсе прыхаджане. Падпольшчыкі выканалі заданне. Як у царкве пачалася служба, Цярэнцій Сіндрэвіч і Ілья Філіпчык прасачылі, калі паліцэйскія пойдуць адзначаць Вялікдзень. У гэты ж час імгненна каля ўваходу ў царкву павесілі чырвоны сцяг і лозунг “Няхай жыве Савецкая ўлада!” Калі ж скончылася служба ў царкве, парафіяне, ідучы дадому, падымалі тыя афішы, чыталі і дзівіліся такому ўчынку: у царкву ішлі – нічога не было, а з царквы ідзём – дарога ўпрыгожана флажкамі і ўсыпана афішамі. Па звычаю праваслаўных вернікаў у 9 гадзін парафіяне зноў прыходзяць у храм на малебен. Вось цяпер яны і прачыталі той лозунг “Няхай жыве Савецкая ўлада!” Флаг на бярозе каля царквы правісеў да 12 гадзін дня, аж пакуль не працверазіліся паліцэйскія. Ліквідаваць “бальшавісцкую выхадку” прымчаліся слабадскі солтыс, камендант паліцыі з паліцэйскімі з Крулеўшчыны, павятовыя сышчыкі з Глыбокага.

У 1939 годзе каля Слабады збудаваны савецкі ваенны аэрадром, які існаваў да 1945 года (гл. арт. Малажане).

Страшэнны след у гісторыі Слабады пакінула Другая сусветная вайна. Немцы спалілі вёску. У 1942 годзе за сувязь з партызанамі былі забіты мясцовы святар Аляксандр Новік і ўся яго сям’я, а таксама яшчэ некалькі жыхароў вёскі.

Па словах мясцовай жыхаркі Таісіі Аляксандраўны Таляронак – айцец Аляксандр Новік быў вельмі добразычлівы, ён хутка змог заваяваць любоў і давер сялян (Сям’я Новікаў прыехала ў Слабаду ў канцы 1930-х гадоў з Гродзеншчыны. У сям’і было шасцёра дзяцей). Памятаю, як гаварыла маці, што наведваліся партызаны і прасілі бацюшку стаць сувязным, сачыць за справамі на станцыі (нашы хаты тады стаялі побач). Падобна, што ён згадзіўся, бо потым госці з лесу перыядычна прыходзілі да яго, але не ў хату, а ў прызначанае месца. Зімой на сустрэчу ў балота вазіла яго мая маці.

Больш падрабязна тую трагедыю памятае дачка бацюшкі Нона Аляксандраўна Новік. У 1943 годзе ёй споўнілася 15 год. “Сувязь з партызанамі меў не толькі галава сям’і, але і адзін з сыноў – Алег, 1926 года нараджэння. Магчыма, што ён нават больш дапамагаў партызанам, чым бацька. Справа ў тым, што ў яго была схільнасць да вывучэння замежных

моў, і, маючы за плячыма толькі школу, ён тым не менш добра размаўляў па-нямецку. Гэта ведалі немцы, і таму, як толькі прыязджалі ў вёску, адразу бралі хлопца за перакладчыка. Ён часцяком хадзіў на станцыю Крулеўшчына, і пасля гэтага адразу ў хату наведваўся нехта з партызан. Потым Алега запрасілі ў жандармерыю і прапанавалі ехаць вучыцца ў жандармскую школу. Абяцалі вялікую будучыню. Але бацька нейк адпрасіў сына, спасылаючыся на невядомую невылечную хваробу.

Бацьку разам з Алегам забралі адразу, як толькі згарэла хата. Гэта партызаны, каб адвесці падазрэнне і пагрозу ад іх жыцця, спалілі хату святара, але, папярэджаны, той вывез увесь скарб. Нехта бачыў, што рэчы дапамагалі выносіць партызаны, і данёс немцам. Разам з імі ўзялі і Юзіка Юнцэвіча, Валодзю Бурду. Бацюшку з сынам дапытваць пачалі тут жа, у вёсцы. Білі гумовымі шлангамі, зацісквалі пальцы ў дзверы. Перад ад'ездам у Докшыцы дазволілі выйсці да дзяцей з жонкай. Тата выйшаў да нас увесь сіні, так быў збіты. Мы кінуліся немцам у ногі, прасілі, плакалі, усё дарэмна. Тату загадалі зняць крыж, і усіх павезлі ў Докшыцы. Забіраў тату і іншых вяскоўцаў здраднік Комулька (пасля вайны яго знайшлі ў Польшчы). Маму забралі таксама і потым расстралялі разам з татам і Алегам. Зою і Ігара – нашых старэйшых – адправілі ў Германію, а нас з малодшым братам Севам партызаны схавалі на балоце".

20 жніўня 1944 года за 2 кіламетры на поўнач ад Слабады разбіўся самалёт І.С. Палявога, які пасмяротна стаў Героем Савецкага Саюза.

# Станіслаўцы

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

Пра ўзнікненне вёскі мясцовыя жыхары паведамляюць такую гісторыю. Недзе ў канцы XVIII стагоддзя (дакладнай даты не ведаюць) у гэту мясцовасць быў высланы царскімі ўладамі чалавек, якога звалі Станіслаўка. Месца гэта было вельмі гіблае, кругом былі хмызнякі, балоты. Такім чынам узнікла тут селішча Станіслаўкі. Затым і вёска стала так называцца, жыхароў якой звалі “станіслаўцамі”. З цягам часу і вёска атрымала назву Станіслаўцы.



**Глінабітная хата ў Станіслаўцах**

У пачатку існавання вёскі прыехаў сюды адзін яўрэй і пабудаваў карчму каля Будслаўскага тракта, у канцы вёскі. Падарожныя і вясковыя людзі наведвалі яе і разлічваліся з гаспадаром зярном. Жыў гэты чалавек вельмі даўно, недзе пры дзядах самых старэйшых жыхароў вёскі і куды знікла карчма і яе гаспадар потым ніхто не ведае.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў Станіслаўцы адносіліся да Валкалацкай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 263 чалавекі і мелася 554 дзесяціны зямлі. З 1921 года па 1939 год вёска ўвайшла ў с клад Польшчы. У гэты час тут мелася чатыры ўласныя млыны, да самай вайны працавала гарбарня татарына Якубоўскага Хасеня.

У 1939 годзе з-за вялікага пажару згарэла амаль палова вёскі. Віной усяму – сядзіба Антонькавых. Месца, дзе яна стаяла, людзі называюць заклятым. Сын гаспадароў малоў порах у жорнах. Ад выбуху ўзнік вялікі пажар. Потым на гэтым месцы была зноў пабудавана хата. Аднак, хто ў яе ні пасяляўся – доўга не жыў, паміраў.

Да 1939 года выкладанне ў мясцовай школе вялося на польскай мове. Школа размяшчалася ў сялянскай хаце Яна Падрэза, а потым Вольгі Штура. Настаўнікам у той час працаваў Гаўрылкевіч. Затым у вёсцы была пабудавана святліца, дзе вечароамі збіралася моладзь на вячоркі. Пазней гэты будынак аддалі пад школу. Аднак яна згарэла пры вялікім пажары.

У 1949 годзе была пабудавана першая асобная пачатковая школа, дырэктарам якой стаў працаваць Фандо Мікалай Маркавіч. Калі ў 1953 годзе прыбыў працаваць Кажарновіч Станіслаў Валяр’янавіч, пачала працаваць развіваючая сямігадовая школа. Яшчэ пры Кажарновічу стары будынак школы быў перанесены на новае месца, у якім пазней была школьная майстэрня, бібліятэка, а для навучання дзяцей пабудавалі яшчэ адзін будынак. З 1957 года па 1989 год дырэктарам школы працаваў Шабан

Мяфодзій Еўстаф'евіч. Пры ім пабудавалі яшчэ адзін будынак у былым месцы і новую школу, якая пачала сваё існаванне з 1972 года.

Станіслаўцы спачатку з'яўляліся цэнтрам калгаса імя Сталіна, які ўтварыўся шляхам аб'яднання чатырох калгасаў у 1952 годзе: калгас імя Будзёнага, калгас імя Малінкова, калгас 1 Мая, і калгаса імя Сталіна. Першы калгасны дом быў пабудаваны ў 1959 годзе. У 1962 годзе – ФАП. У 1963 годзе калгас стаў насіць назву "Імя Карла Маркса".

У 1967 годзе каля будынка праўлення былога калгаса імя Карла Маркса, на ўшанаванне памяці 9 землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены абеліск. Таксама каля помніка быў закладзены парк. А ў 1978 годзе непадалёк быў ўстаноўлены помнік Карлу Марксу.

У маі 1979 года Станіслаўцы наведаў былы першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў, да якога мясцовыя жыхары звярнуліся з просьбай аказаць дапамогу ў асушэнні балот. Просьба людзей была выканана.

У 1999 годзе калгас імя Карла Маркса быў аб'яднаны з калгасам "Памяць Ільіча".

Зараз у вёсцы пражывае каля 190 чалавек.

Станіслаўцы з'яўляюцца радзімай Ястраба Адама Ігнатавіча – 1928 года нараджэння. Ён разам са сваім сынам Францам Адамавічам (таленавітым мастаком, яго карціны маюць поспех нават за межамі Беларусі, былі выставы ў Францыі) у 1982 годзе пабудавалі і афармілі дзіцячую пляцоўку ў Станіслаўскім дзіцячым садзе. Зараз Франц Адамавіч жыве ў Мінску. Яго жонка працуе дыктарам Беларускага тэлебачання.

Больш чым дзесяць гадоў пляцоўка радавала дзяцей, а зараз яна разбурана ў сувязі з тым, што будынак дзяцячага сада аддадзены пад кватэру.

Цікавую біяграфію меў былы кравец Янкавіч Антон Антонавіч (1866 – 1946). Як успамінала яго дачка Мацюшонак Ганна Антонаўна (1901 года нараджэння) – гэта быў вядомы майстар і разумны чалавек. Сам вучыўся грамаце, затым прадоўжыў вучобу ў Вільно. Некаторы час жыў у Пецярбургу, працаваў на Пуцілаўскім заводзе. У 1905 годзе быў удзельнікам "Крэснага хода" да цара. Цудам застаўся жывым у тую страшную "крывавую нядзелю". У тым жа годзе вярнуўся на радзіму. Вучыў дзяцей грамаце, дарослых – уменню шыць адзенне. У 1918 годзе стаў камісарам у Вілейцы, быў выбраны дэпутатам на з'езд у Маскву. Але, калі прыйшлі палякі, то Янкавіч Антон так і застаўся працаваць краўцом.



Таленавітым чалавекам можна лічыць і сучасніка Сасонка Міхаіла Паўлавіча, які нарадзіўся 28 кастрычніка 1953 года. У школе ён вучыўся на выдатна, з чырвоным дыпломам скончыў Беларускі інстытут

механізацыі сельскай гаспадаркі. Быў накіраваны ў Расонскі раён, дзе два гады працаваў інжынерам-электрыкам у саўгасе “Краснаполле”. Затым быў абраны другім сакратаром Расонскага райкома камсамола. На працягу 5 год працаваў старшынёй калгаса “Новы свет” таго ж раёна. У 1985 годзе Міхаіл Паўлавіч назначаны першым сакратаром Расонскага райкома партыі. У сакавіку 1991 года стаў працаваць на пасадзе дырэктара малога прадпрыемства. А 14 мая 1995 года абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Каля вёскі знаходзіцца Станіслаўскае возера плошчай 0,46 км². Найбольшая глыбіня возера 2 метры, даўжыня 930 метраў, а найбольшая шырыня – 650 метраў. Даўжыня берагавой лініі – 2,61 кіламетр. Возера поўнасцю зарастае падводнай раслiннасцю.

# Стараселле

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Каля Сіняга Дуба было балота, дзе раслі журавіны, вадзіліся бабры, ласі і струменілася чыстая крынічка. Месца было надзіва маляўнічае і вельмі славілася ў навакольных вёсках.

Прайшоў час – сяляне атрымалі вольную. Вырашылі людзі тут абжыцца, але адным было цяжка. Папрасілі яны дапамогу ў суседзяў. І яны, хто чым мог, дапамаглі. Праз некаторы час тут стаялі ўжо дзве хаты, зямля была апрацавана, насыпана дарога. Добра было тут жыць. Пасяліліся тут людзі і з іншых мясцін і жылі ў дружбе і згодзе.

Але даведаўся пра гэта пан Сілка. Вырашыў ён паставіць сабе дом таксама ў тых месцах. Толькі не хацелася яму жыць разам з простым людам. І абжыўся крыху далей ад сялянскага паселішча. Пабудаваў сабе дом, хаты сваім рабочым. Назвалі сваю мясціну Новым Сялом, а прыбалотную – Старым Сяленнем.

На зямлю прыйшлі палякі з вайной, убачылі багатае сяло, разрабавалі яго, а дамы ўсе разбурылі. Не стала Новага Сяла. Хутка яно занеслася пяском і зраўнялася з зямлёй.

А страе пасяленне засталося і жылі людзі там весела і шчасліва. З цягам часу назву перайначылі і вёска пачала называцца Стараселлем.

Што датычыцца сучаснай гісторыі вёскі, то напачатку яна было ў складзе м. Тумілавічы бенедзікцінаў, пазней Юзэфовіча. У 1870 годзе належала Катовічу. У пачатку XX стагоддзя былі аднайменные дзве вёскі, у якіх разам налічвалася 17 двароў і 101 жыхар. З 1921 года па 1939 год



Стараселле знаходзілася ў складзе Польшчы. У 1929 годзе – М. Дорц меў 120 дзесяцін, а потым Катовіч Вінцэнт – 130 дзесяцін, Шадзеўскі Мечыслаў – 83 дзесяціны.

З 12 кастрычніка 1940 года па 16 ліпеня 1954 года Стараселле з’яўлялася цэнтрам сельскага Савета. Зараз тут пражывае каля 50 чалавек. У вёсцы пабудавана каплічка.



14 ліпеня 1929 года ў Стараселлі нарадзіўся беларускі фізік Апанасевіч Павел Андрэевіч. Вайна забрала лепшыя для вучобы часы. Школу ён закончыў у 1949 годзе, ва ўзросце 20 год. Адразу ж паступіў на фізіка- матэматычны факультэт БДУ, на аддзяленне фізікі.Бліскучыя здольнасці і выключнае працалюбства дазволілі дасягнуць выдатных поспехаў. На двух апошніх курсах БДУ Павел Апанасевіч атрымліваў імянную стыпендыю.

1953 год. Лекцыі ў БДУ чытае і пачынае там актыўную працу акадэмік Барыс Іванавіч Сцяпанаў – прафесар з Ленінграда, сапраўдны член АН СССР. Апанасевіч – яго першы і найбольш яркі вучань. 1954 год – заканчвае з адзнакай БДУ і паступае ў аспірантуру пры АН БССР. У студзені 1955 года быў створаны Інстытут фізікі, і далейшы лёс Паўла быў непарыўна звязаны з гэтым інстытутам. Тут Апанасевіч сфарміраваўся як вучоны, педагог і арганізатар навукі. Тут ён фарміруе сваю навуковую школу і праходзіць шлях ад аспіранта да дырэктара інстытута.

Першыя работы – праблемы выпраменьвання і паглынання святла. Гэтыя даследванні ляглі ў аснову яго кандыдацкай дысертацыі. Дысертацыя была абаронена ў 1958 годзе. Са з'яўленнем аптычных квантавых генератараў (лазераў) вучоны актыўна ўключаецца ў распрацоўку асноў тэорыі ўзаемадзеяння магутнага лазернага спрамянення з рэчывам і становіцца адным з вядучых спецыялістаў СССР у галіне нелінейнай оптыкі і лазернай фізікі. Павел Андрэевіч унёс значны ўклад у распрацоўку арыгінальных лазерных сістэм.

Па рэзультатах сваіх даследванняў Павел Андрэевіч Апанасевіч паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю (1974) і апублікаваў фундаментальную манаграфію"Асновы тэорыі ўзаемадзеяння святла з рэчывам", якая была выдадзена ў 1978 годзе.

1978 год – Дзяржаўная прэмія БССР.

1982 год – Дзяржаўная прэмія СССР ( сумесна з іншымі).Падрыхтаваў шмат вучоных, у тым ліку 20 кандыдатаў навук, якія потым абаранілі доктарскія дысертацыі.

1987 год – Дырэктар інстытута фізікі АН БССР.

Зараз – ганаровы дырэктар Інстытута фізікі, узначальвае навуковы савет па праблеме "Лазерная фізіка", кіруе трыма навуковымі праграмамі:"Квант","Лазер", "Лазерныя тэхналогіі 21-га стагодзя ".

# Старое Запонне

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

Старое Запонне вядома з 1567 года. Пасля абрання ў 1575 годзе каралём Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя наступіў пералом у вайне з Расіяй. За ваенныя заслугі кароль падараваў аднаму са сваіх афіцэраў, польскаму шляхцічу Хмялеўскаму, маёнтак Запонне (Апонне). За некалькі гадоў да таго, у 1567 годзе, Запонне было ўладаннем адной з дачок Крысціны Глябовічны-Камаеўскай, якая была ў той момант удавой Станіслава Кміты. Якімсьці чынам гэты маёнтак трапіў затым не да родзічаў Камаеўскай, а ў дзяржаўную ўласнасць, з ліку якой Стафан Баторый і ўзнагародзіў Хмялеўскага.

Маёнтак Запонне (з Вітунічамі і Нябышынам), частка якога ў 1627 годзе перайшла ад Кавячынскага да Я. Бурбы, у далейшым раздрабіўся на шэраг невялікіх уладанняў – уласнасць Карказевічаў, Стаброўскіх, Чаховічаў і іншых шляхецкіх родаў. Частка яго з Забар’ем і Асавінам (ці Шклянцамі) па-ранейшаму заставалася ў руках Хмялеўскіх, продак якіх атрымаў яе ад Стафана Баторыя. Захаваліся інвентары дзвюх частак гэтага раздробленага маёнтка. Адна з іх у 1663 годзе адносілася да панскай сядзібы ў Дубраўцы-Запонні. У яе ўваходзіў фальварак Вітунічы з невялікім аднайменным мястэчкам (32 мяшчанскія пляцы). Фальваркавае ворыва налічвала 20 валок зямлі, а ў карыстанні сялян навакольных вёсак было 26,5 валок.

Некаторыя звесткі пра Запонне даюцца ў тарыфе за 1690 год, якія згрупаваныя па парафіях. Так, адносна вялікі маёнтак Запонне адносіўся да Докшыцкай парафіі. У гэтым маёнтку 4 дымы належалі Адаму Стаброўскаму, а 6 – Антонію Стаброўскаму. Апрача таго, у Докшыцкай парафіі быў цэлы шэраг вельмі дробных маёнткаў: Запонне-Навасёлкі, Запонне-Мацеева і Запонне-Пупкі. У кожным з іх было ад 1 да 5 дымоў.

У канцы XIX стагоддзя небагатыя гаспадары маёнтка Запонне Чаховічы ў фальварку Саламянка мелі бровар, а да яго бралі ў суседзяў на адкорм брагай быкоў. У Запонні таксама быў пабудаваны адзін з самых магутных ветракоў на той час. У 1887 годзе яго вытворчасць (колькасць пудоў зерня, што перамолвалася на муку за месяц) складала 3000 пудоў).

У гады польскай акупацыі ў 1921-39 гадах у вёсцы знаходзілася савецкая пагранзастава.

На 2004 год у Старым Запонні налічваўся адзін жыхар.

Гэтыя мясціны багатыя сваёй аргеалогіяй. На ўсходняй ускраіне вёскі знаходзіцца гарадзішча, якое мае авальную ў плане пляцоўку памерам 59 х 51 метр. Гарадзішча з захаду і з поўначы ўмацавана валам. У 1971 годзе гэта месца абследаваў А.Р. Мітрафанаў. У культурным слоі ён выявіў абломкі штрыхаваных і гладкасценных пасудзін, дробныя кавалкі шлаку і абпаленыя

камяні. Усе знаходкі адносяцца да днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур III-VI стагоддзяў.

У 1970-я гады за паўкіламетра ад гарадзішча, на тарфяніку асушанай поймы ракі Поня знойдзены каменны выраб светла-шэрага колеру, які нагадвае форму “кубіка” з ёмістасцю і дзвюма адтулінамі ў дне. Можна меркаваць, што гэта тыгль, які служыў для выплаўкі дроту з жалеза, здабытага з балотнай руды.

А за тры кіламетры на паўночны захад ад вёскі, у лесе, знаходзіцца курганны могільнік. Тут размяшчаюцца 9 насыпаў вышынёй каля 1 метра і дыяметрам да 6 метраў.

# Старына

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Па народнаму павер'ю, у далёкай мінуўшчыне недалёка ад сучаснай вёскі Хілаўшчына было яшчэ адно паселішча. Як яно называлася, сёння ўжо ніхто не памятае.

Людзі там жылі сціплыя і працавітыя, заўсёды дапамагалі адзін аднаму. Жылі шчасліва. Здавалася лепшага месца на свеце няма. Але здарылася вялікае няшчасце – на вёску напала халера.

Дзеля таго, каб жудасная навала не пайшла гуляць далей, вёску разам з хворымі жыхарамі прыйшлося спаліць.

Праз некаторы час на радзіму вярнулася трое мужыкоў, якія да гэтага часу служылі ў войску. Гэта Гарадзёнак, Мікіцевіч і Кавалёў. Убачыўшы жудасную карціну, яны вырашылі адбудаваць вёску. Дзе заканчвалася папялішча, хлопцы паставілі крыж, высечаны з каменя (крыж захоўваецца і зараз у вёсцы), і пачалі будаваць сабе жытло.

Новае паселішча атрымала назву Старына – у гонар старой вёскі.

Каля крыжа і зараз у час рэлігіёзных святаў збіраюцца людзі, моляцца Богу.

Пра саму вёску Старына вядома толькі, што ў пачатку XX стагоддзя яна ўваходзіла ў Тумілавіцкую воласць Барысаўскага павета. З 1921 года па 1939 год Старына ўвайшла ў склад Польшчы.

У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску. Аднавіць яе змаглі толькі пасля вайны. У 1949 годзе тут утвораны калгас імя Суворава.

Зараз тут пражывае каля 25 чалавек.

# Сценка

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Як гавораць мясцовыя жыхары, раней, каб аддзяліць землі паноў, будаваліся драўляныя сценкі – умацаванні. Гэта рабілася дзеля таго, каб парабкі не пераходзілі на іншыя землі. Такая сценка была пабудавана і за вёскай Дзедзіна, дзе зараз стаіць свінарнік вёскі Сценка. Ад назвы сценка і з’явілася мястэчка Сценкі, а цяпер вёска Сценка.



У 1888 годзе ў Сценцы адкрываецца змешаная школа граматы. Яна знаходзілася ў наёмнай непрыстасаванай кватэры. У 1890-91 наввучальным годзе ў ёй займалася 18 хлопчыкаў. Выкладаннем займаўся селянін Ів.В.Марковіч, які скончыў курс народнага вучылішча. За зімнія заняткі выкладчык атрымліваў 8 рублёў.

У пачатку ХХ стагоддзя вёска ўваходзіла ў Барысаўскі павет. На той момант у ёй налічвалася 384 чалавекі. З 1921 года па 1939 год Сценка знаходзілася ў складзе Польшчы.

У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 12 жыхароў.

Восенню 1943 года асабліва жорсткія баі вяла тут брыгада імя ЦК КП(б)Б. Так, 1 верасня 1943 года разгарэўся бой на захад ад вёскі Сценка. Праціўнік накіраваў сюды атрад колькасцю больш за 80 чалавек. На ўзбраенні яго меліся 3 батальённыя мінамёты, 4 станкавыя і 9 ручных кулямётаў, дзве бронемашыны, тры танкеткі. Упарты бой працягваўся з сямі да сямнаццаці гадзін. Было забіта сем і паранена 11 гітлераўцаў. Партызаны страцілі 1 чалавека забітым. Да зыходу дня непрыяцель адступіў у гарнізон вёскі Таргуны.



Зараз тут пражывае каля 70 чалавек.

У цэнтроы вёскі, пры дарозе, знаходзіцца капліца.

У Сценцы нарадзіўся Язэп Піліпавіч Рабец – музыкант-самавучка. Ён мог падабраць на слых любую мелодыю. У маладыя гады яго запрашалі нават ў Дзяржаўную філармонію, але ён адмовіўся.

# Таргуны

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

**Маленькая Радзіма**
Люблю я гэтыя мясціны,
Люблю староначкі даўніны,
Люблю маленькую Радзіму
З прыгожай назвай – Таргуны.
Люблю я лепш за ўсё куточак,
Дзе нарадзілася, узрасла.
І луг за вёскай, і рабіну,
Што ў двары маім расла.
Люблю я лепш за ўсё пралескі,
Што ўвясну з лесу прынясла.
Тут кожны кут мне родны, блізкі,
Дзе б я далёка не была.
Люблю, калі ўзыходзіць сонца,
Люблю я жаўруковы спеў,
Які звініць у душы бясконца,
У час, калі ўжо хлеб паспеў.
Люблю я гэтыя мясціны,
Яны заўсё мне даражэй.
Мая маленькая радзіма,
Расці, квітней і прыгажэй.

*Вікторыя Корсак*

Як гавораць у народзе, невядома калі ўтварылася вёска, але вядома, чаму яе называюць Таргуны.

Было гэта вельмі даўно. Людзі займаліся гаспадаркай, у асноўным гадавалі жывёлу, вырошчвалі збажыну і лён. А каб неяк палепшыць свой дабрабыт, усе вырашылі збірацца кожны святы дзень на адным і тым жа месцы і весці там гандаль. Найбольш зручнае месца было абрана. Тут і ўзнікла ў хуткім часе паселішча.

Сюды пачалі з'язджацца не толькі мясцовыя жыхары, але і таргашы з іншых вёсак. Нават з-за мяжы прыязджалі. Так і ўзнікла вёска Таргуны.

Побач з Таргунамі здаўна існавалі два курганныя могільнікі. Адзін з іх, які знаходзіўся каля фальварка Турулька, быў знішчаны ў савецкі час пры будаўніцтве калгаснага гаспадарчага двара. Паводле паданняў, уначы там здаваліся здані. Другі ж знаходзіцца ў лясным масіве Дукаўшчына паміж Таргунамі і Гічанцамі. Старажылы кажуць таксама пра існаваньне вялікага камяня з малюнкам, які пасля вайны быў ссунуты ў балота.

Па звестках за 1795 год, Таргуны належалі да маёнтка Докшыцы Васіля Мелішкевіча. Ужо ў 1797 годзе Таргуны згадваюцца як маёмасць дзяржавы, 243 чалавекі, мелася і карчма. Прыкладна ў той перыяд побач з Таргунамі закладзена сядзіба ў Норвідполлі, да якой у першай палове 19 стагоддзя адносіліся Таргуны, уласнасць напачатку Норвіда, потым Венцлавовіча. У 1884 годзе ў Таргунах адчынена царкоўная школа граматы, дзе ў 1890-91 навучальным годзе вучыліся 25 хлопчыкаў. Як сведчыць дакумент, "Школа помещается в наёмной неудобной квартире". Пазней школу перанеслі ў будынак пры дарозе на Докшыцы каля фальварка Трусы. Таму мясцовае насельніцтва называла тую школу не Таргуноўскай, а Трусаўскай.


Рэшткі ўязной алеі

У канцы XIX стагоддзя ў Таргунах 34 двары. У XIX стагоддзі на ўскраіне вёскі збудавана праваслаўная капліца. У 1909 годзе ў вёсцы 91 двор, 464 жыхары. У 1930 годзе ў Таргунах 118 двароў, 586 чалавек, 1066 дзесяцін зямлі. Побач з Таргунамі існавалі дзве сядзібы Генрыка Венцлавовіча – Трусы і Норвідпольле і фальварак Турулька. У 1940 годзе быў створаны Таргуноўскі сельсавет (13 паселішчаў), які ў 1954 годзе далучылі да Тумілавіцкага. У часе нямецкай акупацыі ў Таргунах быў размешчаны нямецкі гарнізон, жаўнеры з якога часта ўдзельнічалі ў сутычках з партызанамі каля Дзедзіна, Тумілавіч. У верасні 1943 годзе немцы спалілі 30 двароў (пабудовы на хутарах не палілі), забілі 9 чалавек, 18 адправілі ў Германію. Партызаны спалілі фальварак Трусы і школу.



У 1949 годзе быў створаны калгас “Зара камунізму”, які, дзякуючы прадуманаму мясцоваму кіраўніцтву, стаў самым эканамічна моцным у раёне. Таму Таргуны не ператварыліся пакуль ў выміраючую вёску.

У 1967 годзе ў Таргунах насыпаны Курган на ўшанаванне памяці 80 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На яго вяршыні пастаўлена скульптурная група – воін трымае на руках загінуўшага ў баі таварыша.

У 2005 годзе тут створаны першы ў раёне так званы “аграгарадок”. Насельнітва вёскі складае больш за 630 чалавек.



16 лістапада 1893 года ў Таргунах нарадзілася Леаніла Чарняўская, пісьменьніца, перакладчыца, жонка пісьменьніка Максіма Гарэцкага.

Скончыла Марыінскую вышэйшую навучальню ў Вільні ў 1910 годзе. З 1911 года па 1918 год працавала настаўніцай пачатковай школы ў сяле Залессе на Дзісеншчыне. У 1919-1923 гадах выкладала беларускую мову ў Віленскай беларускай гімназіі, а ў кастрычніку

1923 года разам з мужам, пісьменнікам Максімам Гарэцкім, прыехала ў Менск. Затым жыла ў Горках Магілеўскай вобласці. У 1932 годзе пераехала ў Кіраў (былая Вятка), куды быў высланы муж, працавала выхавацелькай у дзіцячым садзе, потым жыла ў гарадскім пасёлку Пясочня (цяпер г. Кіраў Калужскай вобласці), у Ленінградзе (з 1947). Узнагароджана медалём.

Першая яе праца выйшла ў 1919 годзе – зборнік «Дзяціныя гульні» (Вільня). Першае апавяданне «Мікітка» апублікавала ў 1921 годзе (газета «Наша думка», Вільня). Аўтар чытанкі «Родны край» для 1, 2, 3, 4 года навучання (1919, перавыдавалася да 1936 года). Выйшлі кнігі прозы «Апавяданні», «Валуй - камісар часоў Кераншчыны», «Падарожніца», «Бяздзетуха» (усе ў 1930 годзе), «Апавяданні» (1983), кнігі для дзяцей «Варка» (1928), «Кот Знайдзён» (1929), «Андрэйка» (1930), «Перамога» (1932), «Лявонка» (1932), «Сталёвы конь» (1933), «Жук» (1960), «Казёл Мэка і Кудла» (1979).

Пераклала на беларускую мову аповесці В.Забайкальскага «Маленькія чырвонаармейцы» (1931), А.Іркутава «Пан Бергер падае ў адстаўку» (1931), Я.Хазіна «Барабаншчык рэвалюцыі» (1932), «Апавяданні старога матроса» С.Заяіцкага (1930), «Рэха» Э.Ажэшкі (Вільня, 1919), «Гісторыю аднаго мядзведзя» Э.Сэтана-Томпсана (1927), «Бунт Моці-Гёджа» Р.Кіплінга (1927), «Прыгоды Фрыдрыха Крона ў Сярэдняй Эўропе. Расстрэл рабочай моладзі ў Радожыне» Г.Краўса (1932), «Тыля Уленшпігеля» Ш. дэ Кастэра (1934), а для чытанкі «Родны край» - урыўкі з твораў А.Чэхава, А.Серафімовіча, У.Гаршына, Г.Караленкі, Д.Маміна-Сібірака і інш.

Памерла 26 верасня 1976 года.

У Таргунах у 1929 годзе нарадзіўся таксама Сяргей Карніловіч, адзін з заснавальнікаў беларускага грамадскага цэнтра “Полацак" у Кліўлендзе (ЗША).

У школу Сяргей хадзіў яшчэ за польскім часам, потым пры саветах, а давучваўся ўжо пры немцах. Але ўсё ж закончыць школу не атрымалася – неўзабаве школа была спалена.



Можна сказаць, што ўсе жахі ваеннага часу адчуў на сабе. Даставалася простым людзям як ад немцаў, так і ад партызан. Аднойчы немцы ледзь не расстралялі яго бацьку, палічыўшы, што бацька яўрэйскай нацыянальнасці (валасы кучаравыя былі). А партызаны забралі цялушку, якую бацька хаваў у балоце. Нехта падказаў партызанам, а тыя былі не тутэйшыя, закінутыя з самалёта. “Хто яны былі для іх”.

У адной з суседніх вёсак партызаны замініравалі дарогу, дык немцы сабралі жыхароў з конькмі і загадалі прайсці з баронамі па дарозе і абочынах. Сяргея таксама адправілі баранаваць, але конь быў надта наравісты, ён стаў пасярод дарогі і ні ўзад, ні ўперад. Магчыма, гэта і выратавала, бо дзве міны наперадзе ўсё ж узарваліся, загінулі людзі. Часам толькі выпадковасць вырашала пытанні жыцця і смерці.

Немцы забіралі моладзь на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Чатырнаццацігадовы хлопчык таксама трапіў на вываз. Пагрузілі ў вагоны і павезлі.

У Германіі ў баўэра прабыў нядоўга, бо рашыўся ўцячы. Але куды? Чужая краіна, чужыя людзі. Блукаў па вёсках, хутарах, галадаў. Дабраўся да нейкага горада, трапіў пад бамбёжку, дзе быў паранены. Крыўдна было, што атрымаў раненне ад снарада з роднай стараны.

Раненне было цяжкае – асколкамі яму парвала нагу. А тут набліжаецца канец вайны, капітуляцыя. Поўная неразбяруха. "Аднак жа добрыя людзі мяне падабралі і апынуўся я ў нямецкім шпіталі," – пісаў Сяргей потым дадому.

Пяць месяцаў праляжаў юнак ў шпіталі, дзе сустрэў упершыню за час сваіх выпрабаванняў, многа беларускіх хлопцаў і дзяўчат, пачуў родныя песні, мову.

Пасля выпіскі Сяргей некаторы час жыў у адной добрай нямецкай сям'і, якая дзялілася і дахам і кавалкам хлеба.

А потым быў рабочы лагер. Ад сваіх суайчыннікаў не раз чуў, што там, на радзіме, з тымі, хто пабыў у Германіі, доўга не цырымоняцца. "Таму пра дом думаў з нейкім страхам, бо чуткі пра нашу ссылку ў Сібір па прыездзе былі ў кожнага".

Ён застаўся ў Германіі. Сустрэў добрых сяброў, якім таксама, нягледзячы ні на што, была родная Беларусь. У Рэгенсбургу арганізоўваўся беларускі асяродак пад кіраўніцтвам Яна Станкевіча, куды далучыўся і Сяргей. Ян Станкевіч быў добрым моваведам, ведаў дабра гісторыю. Цікава, што ён адразу па гаворцы вызначыў, што Сяргей крывіцкі беларус з Вілейскага, Докшыцкага або Глыбоцкага раёнаў.

Вайна скончылася. І горад Рэгенсбург павярнуў да беларускасці сотні эмігрантаў. Тут адкрылася гімназія імя Янкі Купалы, тэатр "Жыве Беларусь", тут была закладзена беларуская царква. Пачыналася выдавецкая дзейнасць. Але ў пачатку 50-х гэты лагер стаў расфарміроўвацца на больш трывалую эміграцыю. Так Сяргей апынуўся ў Кліўлендзе штата Агаё (ЗША).

У 1951 годзе тут была заснавана парафія Жыровіцкай Божай Маці Беларускай Аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Сяргей закладвае касу ўзаемадапамогі, каб гэтым з'яднаць людзей, утрымаць. А хутка з земляком Кастусём Калошам за 110 тысяч доляраў купілі 10 гектараў зямлі ў ваколіцах Кліўленда. Гэта стала "беларускай" зямлёй. Сюды з'язджаліся беларусы, што было цесна. Кожную нядзелю пікнікі, беларуская кухня: клёцкі, дранікі, поліўка... Пры царкве пачала дзейнічаць суботняя беларуская школа.


Селішча "Полацк" у Стронгсвіле

Гэты свой горад яны назвалі "Полацак". Там, у Амерыцы, беларусы спявалі свой гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі...", хадзілі з бел-чырвона-белым сцягам і гербам "Пагоня". Амерыканцы ўспрынялі беларускія сімвалы і ўжо

ў 50-я гады ўшаноўвалі суверэннасць Беларусі. 25 сакавіка мэр Кліўленда вывешваў над гарадской упраавай побач з амерыканскім сцягам і беларускі, і віншаваў беларусаў з нацыянальным святам.

18 гадоў Сяргей Карніловіч быў старшынёй “Полацака”. Сам жа ён працаваў у малочнай індустрыі, займаў розныя пасады. 10-12 гадзін на працы, а дома па 8 гадзін аддаваў грамадскай справе. Ён быў старшынёй царкоўнай рады парафіі Жыровіцкай Божай Маці Беларускай Аўтакефальнай царквы. Акрамя гэтага ён шмат сродкаў выдаткаваў на лячэнне чарнобыльскіх дзяцей, выклікаў іх на лячэнне ў ЗША і плаціў за гэта столькі, колькі працягвалася лячэнне. Неаднаразова ён прысылаў медыкаменты і аднаразовыя шпрыцы Докшыцкай раённай бальніцы, а таксама сшыткі, алоўкі, ручкі Таргуноўскай базавай школе.

Яго невялікі дом у Кліўлендзе быў амаль гасцініцай, дзе бясплатна маглі жыць нават малазнаёмыя людзі, што часова знаходзіліся тут. Яго дом, як і яго сэрца былі расчынены для ўсіх.

У ліпені 1993 года, незадоўга да смерці, прымаў удзел у рабоце Першага з’езда беларусаў свету ў Мінску. Але, на жаль, Сяргея не стала 28 кастрычніка 1993 года. Адразу пасля смерці Сяргея Карніловіча ў Таргунах хацелі паставіць помнік у гонар яго. Але родныя не захацелі гэтага.

# Таўшчы

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

Паселішча ўпершыню ўпамінаецца ў інвентары маёнтка Вілейка ў 1797 годзе як засценак у складзе гэтага маёнтка, які тады належаў Віленскаму манастыру візітак. Таўшчы таксама называюцца ў 1879 годзе ў царкоўных дакументах пры пераліку населенных пунктаў бягомльскага праваслаўнага прыхода.

А ў 1944 годзе жыхароў вёсак Чупры, Тоўшчы, Верацеі, смалакурнага завода “Смалакурня” (усяго 60 чалавек) жывымі спалілі ў Верацеях. Жыхары потым сабралі астанкі людзей і пахавалі на могілках. Зараз на верацейскіх могілках стаіць брацкая магіла.

На дадзены момант у Таўшчах пражывае каля 5 чалавек.

# Трасцяніца

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Вёска месціцца на ўскрайку лесу, другім сваім бокам выходзіць на ранейшае балота, з якога цяпер меліяратары зрабілі сенажаць.

У пачатку XX стагоддзя вёска знаходзілася ў Тумілавіцкай воласць Барысаўскага павета. З 1921 года па 1939 год Трасцяніца належала Польшчы. Тады тут пражывала 66 жыхароў. З вёскай на той час межаваўся аднайменны фальварак з 29 жыхарамі.

Восенню 1943 года ў вёску Трасцяніца, дзе тады размяшчаўся Докшыцкі падпольны райкам камсамола, прыбылі першы сакратар Вілейскага абкама ЛКСМБ П.М. Машэраў і член абкама камсамола Е.І. Гуля. У доме Васіля Чарвінскага яны заслухалі справаздачу Докшыцкага райкама, якую зрабіў Уладзімір Свірыд. Работа камсамольцаў Докшыччыны была ацэнена станоўча. Многіх актыўных падпольшчыкаў і партызан прадставілі тады да ўзнагароды. П.М. Машэраў і Е.І.Гуля прабылі ў Трасцяніцы двое сутак, а потым накіраваліся ў Пліскі падпольны райкам камсамола, які размяшчаўся тады ў вёсцы Чыстае ў Галубіцкай пушчы. А праз тыдзень фашысты з самалётаў разбамбілі і часткова спалілі як Трасцяніцу, так і суседнія вёскі – Несцераўшчыну, Дзедзіна, Рачныя. Пасля гэтага падпольны райкам партыі і райкам камсамола перабраліся на хутар Сініцы, дзе працавала падпольная друкарня.

Зараз у вёсцы Трасцяніца пражываюць каля 10 жанчын-пенсіянерак. На 2003 год тут не было нават аднаго тэлефона.

# Тумілавічы

*Цэнтр аднаіменнага сельскага Савета*

Тумілавічы, альбо Тамілавічы, як называлі гэтае сяло людзі яшчэ ў першай палове 20 стагоддзя – паселішча на паўночным усходзе Докшыччыны. Па некаторых звестках, тут існуе старажытнае гарадзішча. На паўночны ўсход ад Тумілавіч, бліжэй да Несцераўшчыны, маюцца два курганныя могільнікі, яшчэ адзін могільнік – у суседняй вёсцы Шалашы. Па народнаму паверʼю назва вёскі паходзіць ад імя царкоўнага служкі Туміла.

Нашы продкі раней жылі каля сучаснай вёскі Сценка. На гэтым месцы зарас расце лес. Вёска тады называлася Кірыенка. Але потым амаль усе людзі вымерлі ад цяжкай хваробы, а тыя, каму ўдалося выратавацца, пакінулі родны кут, уцякаючы ад бяды. На тэрыторыі сучаснай вёскі засталіся могілкі і царква, дзе служыў бацюшка Туміл. З былых жыхароў вёскі засталіся ў жывых толькі два хлопцы – Кавалёў і Марковіч, бо служылі яны ў арміі. Вяртаючыся дадому, хлопцы сустрэлі збяднелага грузінскага князя Шэка, якога таксама прывезлі на радзіму. Ад гэтых людзей і паходзіць сучаснае насельніцтва гэтай вёскі. А ў гонар Туміла, які спрабаваў адвесці ліха ад людзей, і паходзіць назва вёскі.

У першай палове XVI стагоддзя жыхары Тумілавічаў, якіх налічвалася 32 сямʼі, плацілі Радзівілам даніну мёдам. У 1535 годзе быў развязаны памежны канфлікт паміж Янам Радзівілам і ўладальнікам суседняга маёнтка Галубічы, які быў аддзелены ад Тумілавіч ракой Бярэзінай, Багданам Іванавічам Зяноўевічам-Корсакам. Абодва яны абвінавачвалі адзін аднаго ў захопе зямля, нападзе на маёнткі, рабаванні і збіцці сваіх падданых. У прыватнасці, Зяноўевіч-Корсак у той час зрабіў напад на Тумілавічы. Пазней Тумілавічы перайшлі ва ўласнасць Станіслава Кішкі, біскупа жамойцкага, які, магчыма, і падараваў яго бенедзікцінам, бо вядома, што ў 1690 годзе 25 дымоў у Тумілавічах належалі бенедзікцінскаму кляштару ў мястэчку Папроць (цяпер у Літве).

Побач з сялом была закладзена сядзіба Антанаполле. У 1795 годзе, калі гэтыя тэрыторыі былі ўжо ў складзе Расійскай імперыі, Тумілавічы канфіскаваны ў бенедзікцінаў і перададзены Кірылу Юзэфовічу. Да маёнтка адносіліся 252 душы і паселішчы Тумілавічы, Стараселле, Старына, Шалашы і Парэчча. Пазней маёнтак распаўся на шэраг меншых: Юзэфовічы ў 1834 годзе валодалі Парэччам і Шалашамі, фальварак Тумілавічы належаў Садоўскаму, а Антанапольле – Карказевічу.



Старыя дрэвы пры выездзе з Тумілавіч на Старына – апошні напамінак аб сядзібе. На гэтым месцы зараз будуюць новы дом.

Па звестках за 1795 год, тут дзейнічала ўніяцкая царква. Існавала таксама карчма, якая належала дзяржаве. Ужо ў 1864 годзе была збудавана



новая праваслаўная царква. Яна пабудавана ў гонар Святога Георгія Перамоганосца. Георгій нарадзіўся ў Кападокіі ў сям'і багатых бацькоў-хрысціян. Паступіў на ваенную службу і хутка за свой розум, храбрасць атрымаў званне тысячаначальніка і стаў любімцам імператара. Убачыўшы, як знішчаюць хрысціян, загарэўся любоўю да веры Хрыстовай. Раздаў бедным маёмасць, выдаў вольную рабам і, прыйшоўшы да імператара, абвінаваціў яго ў непрыстойнасці і жорсткасці. Пасля безвыніковых угавораў адмовіцца ад Хрыста, Георгія падверглі жудасным пакутам, а потым засеклі. Гэта было ў Нікамідыі ў 303 годзе. Мошчы Святога Георгія знаходзяцца ў Палесціне.

У кампазіцыі царквы дамінуе асноўны зруб, які мае незвычайную 8-гранную форму, накрыты складаным шматсхільным дахам і вялікімі 3-



вугольнымі франтонамі над гранямі зруба. У цэнтры кампазіцыю даху ўвенчвае глухая 8-гранная вежа, завершаная высокім шатром з цыбулепадобнай галоўкай. У аснаванні шатра паўтораны матыў дэкаратыўных 3-вугольных франтончыкаў над кожнай гранню васьмерыка вежы, што надае архітэктуры збудавання мастацкую цэласнасць і выразнасць. Да асноўнага аб'ёму па восі ўваход – захад прылягаюць невялікія аднолькавыя па памерах зрубы алтара і бабінца, накрытыя двухсхільнымі дахамі. У інтэр'еры малітоўная зала перакрыта самкнёным скляпеннем з заломам, умесцы якога перакрыццё падтрымліваюць 4 слупы. Ашалёўка сцен гарызантальная. Прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены прафіляванымі ліштвамі. На поўнач ад царквы стаіць 2-ярусная каркасная званіца, а па восі ўваходу – 3-пралётная брама з фігурным франтонам. Рознастылёвыя канструкцыйныя і дэкаратыўныя прыёмы спалучаюцца ў гэтым помніку эклектычна, што не перашкаджае, аднак, стварэнню ў гэтым своеасаблівага мастацкага вобраза храма.

Тагачасныя майстры пабудавалі Тумілавіцкую царкву з дрэва амаль не ўжываючы цвікоў. Месца было выбрана з густам – у цэнтры вёскі, побач з панскім маёнткам. Дагэтуль у наваколлі значыліся толькі праваслаўныя каплічкі. Адна з іх – у вёсцы Дзедзіна – дзейнічае да сённяшняга часу. У хуткім часе пры храме стала працаваць царкоўна-прыходская школа.

Царква Георгія Перамоганосца перажыла першую сусветную вайну, Вялікую Айчынную, але ніразу не была спалена, разбурана. Нават немцы, калі палілі Тумілавічы ў лістападзе 1943 года, храм не зачапілі. Людзі,

вяртаючыся ў вёску, якая ўяўляла сабой суцэльнае папялішча, бачылі ўзнесены ў неба Храм, плакалі, станавіліся на калені і маліліся. У 1944-м, адразу пасля вызвалення, у храме аднавіліся малебны, хаця святара яшчэ не было. Даваенны настаяцель царквы Сцяпан Бягун вымушаны быў не па сваёй волі пакінуць Тумілавічы яшчэ ў 1942 годзе. Гэта быў святар, які сапраўды жыў па законах хрысціянскай веры. Вельмі любіў людзей, дапамагаў ім пераносіць бяду, гора. Немцы спачатку адносіліся да святара з даверам і ён, карыстаючыся гэтым, многім акружэнцам выдаў даведкі, што яны быццам бы родам з тутэйшых мясцін. Па вёсках збіраў кавалачкі хлеба, бульбу і вазіў усё гэта ў лагер ваеннапалонных у Докшыцы. Пазней, калі тыя, хто меў царкоўныя даведкі, надта хутка пачалі знікаць у лесе, немцы аб нечым пачалі здагадвацца. Святара строга папярэдзілі. Але, як толькі перастаў даваць даведкі, узніклі падазрэнні ў партызан. Яны і прыйшлі восенню 1942 года каб пакараць папа. Бацюшку папярэдзілі сяляне, схавалі ў саломе, а потым тайна на калёсах вывезлі ў Докшыцы. Пазней Бягун з сям'ёй выехаў у Польшчу. Там і памёр.



Вайна пакінула свой след у царкве на прастрэленых кулямі іконах. Зніклі ручнікі і іншае ўбранне. Асабліва шкада бібліятэкі. Першы пасляваенны бацюшка Міхаіл Уляхін пры дапамозе прыхаджан пабудаваў царкоўны дом. А ў 1967 годзе, пасля смерці бацюшкі Баярчука царква стала прыпісной і службу тут сталі адпраўляць святары другіх прыходаў. З даўніх часоў у вёсцы, побач з царквой, стаіць каменны крыж.



Што датычыцца званіцы, якая знаходзіцца каля царквы, дык на ёй знаходзяцца два званы. Адзін з іх – самы вялікі – мае вагу 26 пудоў і адліты ў 1913 годзе. А другі крыху меншы, аднак яго адлілі яшчэ ў 1805 годзе.



У 1852 годзе ў Тумілавічах адчынена народнае вучылішча. Яно было першым на тэрыторыі сучаснага Докшыцкага раёна, размяшчалася ў грамадскім будынку. У 1874 годзе на ўтрыманне Тумілавіцкага народнага вучылішча з дзяржаўнага казначэйства было выдаткавана 155 рублёў 75 ¾ капеек і 68 рублёў 24 ¼ капейкі са збору з сялян. Адным з першых настаўнікаў тут працавала выпускніца Мінскага духоўнага жаночага вучылішча Алена Антонаўна Хруцкая.

У 1886-87 навучальным годзе ў Тумілавічах вучылася 30 хлопчыкаў, для вучылішча з дзяржаўнага казначэйства было выдзелена 145 рублёў 75 капеек, яшчэ 68 рублёў і 25 капеек – са збору сялян і 25 рублёў – ад мясцовай абшчыны. Дзяцей вучыў настаўнік, выхаванец Мінскай духоўнай семінарыі

Восіп Чабатарэвіч, які меў званне настаўніка народнага вучылішча, законанастаўнікам працаваў свяшчэннік, выпускнік Пінскага духоўнага павятовага вучылішча Мацвей Сямёнавіч Балевіч.

У пачатку XX стагоддзя ў Тумілавіцкім народным вучылішчы 66 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак вучылі выпускнік Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі настаўнік Аляксей Данілавіч Данкевіч (жалаванне 200 рублёў і кватэра) і той жа свяшчэннік М.С. Балевіч.

У 1863 годзе да Тумілавіч дакаціліся падзеі нацыянальна-вызваленчага паўстання Кастуся Каліноўскага. Уладальнік недалёкага ад вёскі маёнтка Барбарова Рамуальд Буцвілоўскі, калі верыць царскім дакументам, пагражаў спаліць Тумілавічы, а святара павесіць. “Слоўнік геаграфічны Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх” 1892 года паведамляе аб тым, што ў сяле Тумілавічы існавала 15 двароў, Тумілавічы былі цэнтрам воласці, да якой належалі 410 двароў, 2200 сялян. Наогул, паводле “Слоўніка…”, сельская гаспадарка ў гэтым краі была занядбанай, а сяляне сеялі шмат ільну.

Паводле перапісу насельніцтва 1897 года, у Тумілавічах 55 двароў, 223 жыхары, валаснное праўленне, царква, 2 хлебазапасныя магазіны, лаўка, карчма, народнае вучылішча, у Тумілавіцкай воласці пражывалі 5905 чалавек. У 1918 годзе Тумілавічы ўвайшлі ў склад абвешчанай БНР. У адной з публікацый газэты “Беларусь” гэтага перыяду згадваецца, што ў Тумілавічах дзейнічаў адзіны на Докшыччыне беларускі культурна-асветніцкі гурток. У 1930 годзе ў Тумілавічах 46 двароў, 224 чалавекі, 305 дзесяцін зямлі. Тумілавічы былі цэнтрам гміны Дзісненскага павета, але 20 сакавіка 1929 года гміна была ліквідавана, большая частка яе далучана да гміны Докшыцы, а некалькі паселішчаў – да гміны Галубічы.

13 студзеня 1940 года створаны Тумілавіцкі сельсавет, у склад якога ўвайшлі 26 паселішчаў, 2072 жыхары. Пазней у яго склад ўвайшлі суседнія Несцераўшчынскі і Таргуноўскі сельсаветы. У чэрвені 1943 года і студзені 1944 года Тумілавічы разам з навакольнымі вёскамі спалены фашыстамі, пры гэтым загублены пяць чалавек.



У 1949 годзе тут арганізавалі калгасы “Зара” і “Праўда”. У 1967 годзе на ўшанаванне памяці 48 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены абеліск. Пазней калгас “Праўда” зліўся з больш эканамічна мацнейшым калгасам “Зара камунізму”.



22 студзеня 1954 года ў Тумілавічах нарадзіўся Козіч Валерый Паўлавіч – беларускі фізік. У 1977 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ламаносава. З гэтага ж года працуе ў Інстытуце фізіка Нацыянальнай АН Беларуси. Пачынаючы з 1978 года ён паступова становіцца малодшым, у 1985 годзе старшым, і ў 1996 годзе вядучым навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута. Яго даследаванні звязаны з пытаннямі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі. У 1984 годзе

атрымаў за свае даследаванні Прэмію Ленінскага камсамола СССР. Мае больш за 50 навуковых публікацый.

На паўднёвай ускраіне вёскі бярэ пачатак невялікая рака Мядзеліца, якая ўпадае ў раку Бярэзіна (басейн Дняпра). Даўжыня ракі 8,5 кіламетра. Рэчышча каналізаванае на працягу 4,5 кіламетры.

# Туркі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Туркі – вёска за чатыры кіламетры ад Докшыц, пры колішнім паштовым тракце Дзісна – Вілейка. У 1608 годзе сын Ганны Радзівілаўны-Кішчынай Станіслаў Кішка заснаваў у Докшыцах драўляны касцёл Найсвяцейшай Тройцы і падараваў яму фальварак Туркі з вёскамі Туркі і Альхоўка. Пазней у фальварковым доме была зроблена капліца, якая займала адзін з пакояў, аб чым ёсць згадкі ў касцёльных дакументах 1828 і 1842 гадоў. Пасля канфіскацыі ў 1843 годзе фальварка Туркі капліца была зачынена.

Фальварак Туркі быў размешчаны на поўдзень ад вёскі, у мясцовасці, якую пазней сталі называць Новыя Туркі. У часе Паўночнай вайны напачатку XVIII стагоддзя фальварак быў цалкам знішчаны шведамі, аднак пазней быў адбудаваны. Напрыканцы XVIII стагоддзя павіннасці сялянаў складалі: тры дні мужчынскай і тры дні жаночай паншчыны на тыдзень, што было менш, чым у многіх прыватнаўласніцкіх маёнтках. Кожная сям’я мела коней і кароў, што сведчыць аб адносна нядрэнным матэрыяльным становішчы сялян касцельных уладанняў у параўнанні з прыватнаўласніцкімі.

У 1795 годзе ў Турках – 44 душы мужчынскага полу і 44 – жаночага. Пасля канфіскацыі касцёльных уладанняў у 1843 годзе фальварак і вёска сталі належаць дзяржаве, адносіліся да дзяржаўнага маёнтка Ваўкалата. На карце 1876 года паказаны фальварак Туркі, а пазней землі фальварка былі распрададзены і на іх узнікла калонія Новыя Туркі, вёску ж сталі называць Старыя Туркі. У 1930 годзе ў Новых Турках было 25 двароў, 325 жыхароў, 329 дзесяцін зямлі.

Напрыканцы XIX стагоддзя ў Старых Турках было 12 двароў. У 1905 годзе – 180 жыхароў, 494 дзесяціны зямлі. З 1921 года па 1939 год Туркі ўваходзяць у склад Польшчы. У 1921 годзе – 41 дом, 219 жыхароў. У 1930 годзе 44 двары, 140 жыхароў, 415 дзесяцін зямлі. У 1940 годзе – 201 жыхар. У 1943 годзе нямецкія акупанты спалілі 4 двары, забілі 3 чалавек. У 1950 годзе створаны калгас імя Сталіна. У 2004 годзе – 45 двароў, 93 жыхары, ёсць крама. У савецкі час у Турках размясцілася цэнтральная сядзіба Докшыцкага лясніцтва.

У 1920-я – 1930-я гады на землях Заходняй Беларусі сталі масава будавацца пабудовы ў так званым “закапанскім стылі”. У гэтым стылі, запазычаным з горных раёнаў Польшчы, узводзіліся дамы для дзяржаўных служачых, праўленні гмінаў, школы, розныя ўстановы, леснічоўка. Значная частка іх была ўзведзена па тыповых праектах. Леснічоўка ў Турках таксама збудаваная паводле тыповага праекту. Аналагічны выгляд мае леснічоўка, перароблена на паляўнічы домік, ва ўрочышчы Казюкі каля Глыбокага. Па словах аднаго з работнікаў Докшыцкага лясніцтва, леснічоўка, або “гаёўка” ў

Турках была ўзведзеная ў 1938 годзе. Побач з леснічоўкай да сённяшняга дня захаваліся некалькі старасвецкіх гаспадарчых пабудоў. Выгляд самаго будынка зменены: ён абкладзены цэглай і выкарыстоўваецца як жылы дом.

У адным кіламетры на поўначны захад ад Туркоў бярэ пачатак рака Зуйка, левы прыток Сэрвачы (басейн Віліі). Даўжыня ракі 28 кіламетраў. На працягу 13, 2 кіламетраў рака каналізавана.

Праўда, цяпер ракой яе можна назваць умоўна. А раней гэта была паўнаводная рака, пра якую нават ходзяць легенды. Вось адна з іх.

Калісьці даўным-даўно жыў у гэтых мясцінах жорсткі пан. Ніхто не меў ад яго міласці. А яшчэ была прыгожая дзяўчына. Пакахаў яе дужы юнак Мікола. Радаваліся людзі, гледзячы на іх. Але нядоўга было шчасце закаханых. Напаткаў дзяўчыну пан, спадабалася яна яму. Вось і вырашыў ён забраць дзяўчыну да сябе ў маёнтак на пацеху. Прыехалі панскія цівуны за красуняй, а яна кінулася да свайго Міколы за дапамогай. Пачалі яны ўцякаць. Дабеглі да рэчкі. Мікола кінуўся ў ваду і паплыў, а дзяўчына спалохалася і пабегла па беразе. Панскія служкі, здаецца, вось-вось дагоняць яе. Упала дзяўчына на калені і пачала прасіць літасці ў неба. Адбыўся цуд. Вось ужо рукі даганятых дакрануцца да дзявочых кос... Як раптам яна ператварылася ў маленькую птушачку зуйку і паляцела за рэчку.

Мікола ж выйшаў на бераг, азірнуўся, а яго любай нідзе няма. Ад гора на вачах у стражнікаў ён пачаў ператварацца ў высокі разложысты дуб.

А людзі ў памяць аб дзяўчыне і назвалі рэчку – Зуйка.

# Угольцы

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Невялічкая вёсачка Угольцы (некаторыя называюць яе Вугольцы) знаходзіцца на памежжы Ушацкага і Докшыцкага раёнаў. Гэта былы паўночны край Бягомльшчыны.

Вась што піша пра яе Арцём Лява ў газеце “Наша Ніва” за 2004 год № 44:

**Край самлелых вёсак**

Вёска Вугольцы Докшыцкага раёну ляжыць на мяжы Бярэзінскага запаведніку.

Калісьці яе перапаўняла жыцьцё, на палях раўлі «Кіраўцы», працавала манумэнтальна пабудаваная фэрма. Вакол вёскі — бары ды балоты. Зямля заўсёды была неўрадлівая, але цэнтралізаванае плянаваньне і хімізацыя давалі свой плён. Калгасны ўраджай звозілі полем да вёскі Чарніца. Нармальную дарогу (гравійку) праклалі ад Бярэзіна да Вугольцаў пяць год таму. Прыкладна ў той час шмат хто са старажылаў разьвітаўся з алюмініевым посудам, тым самым на сваім досьведзе пазнаўшыся з такой зьявай, як паляваньне на каляровыя мэталы. Жыцьцё напрыканцы веку навучыла, адыходзячы, замыкаць дзьверы.

Дарогу праклалі, а ездзіць ня стала каму. Цяпер у вёсцы ўвечары сьвеціцца акон пяць. Жыхары — адны пэнсіянэры. Два разы на тыдзень прыяжджае аўтакрама ды ў суседнюю вёску Чарніца — раз на тыдзень аўтобус. Калгасу даўно няма. Палі зарастаюць хмызьняком ды лесам, што насоўваецца з запаведных лясоў.

Баба Вольга, што жыве па-суседзтве зь сям’ёй Асіповічаў, дзе мы спыніліся, — адна з тых, хто застаецца ў вёсцы на зіму. Яна даволі жвавая і энэргічная для сваіх гадоў кабета (ёй восемдзесят). Яшчэ два месяцы таму яна трымала карову, якая ў яе ацялілася. Шкадуе, што не прадала жывёліны раней, бо праз сваю рагулю, якая дужа нэрвавалася пасьля родаў, старая страціла вока”.

З 1921 года па 1939 год тут праходзіла дзяржаўная мяжа СССР з Польшчай.

Асабліва цяжка прыйшлося жыхарам гэтай вёскі ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” у 1943 годзе. Асноўны ўдар немцаў прыйшоўся па зоне, якую кантралявалі партызанскія брыгады “Жалязняк” і “Дубава” (У.Лабанка), штабы якіх знаходзіліся побач з Угольцамі, каля возера Маскавіца. І хоць вёска першы раз была спалена яшчэ ў ліпені 1942 года – зараз ад яе зусім нічога не засталося. Назва вёскі шмат разоў упамінаецца ў нямецкіх і партызанскіх штабных дакументах таго часу, у мемуарах сведак, як адно з месцаў найбольшых баёў. Жыхары ў асноўным паспелі сыйсці ў

балота, каб не быць знішчанымі на месцы. Але немцы пачалі абстрэльваць і бамбіць прылеглыя балоты і лясы, прачэсваць іх з сабакамі. Карнікі, аснову якіх складалі эсэсаўцы, вымусілі партызан кінуць свае базы і адыйсці кіламетраў на 50 у бок Домжарыц. Жыхары Угольцаў і суседніх вёсак засталіля сам-насам з раз’юшаным ворагам. Са 120 жыхароў Угольцаў 52 чалавекі ва ўзросце ад 2 да 50 гадоў былі накіраваны ў рабства.

Аднак мала хто ведае, што менавіта ў гэтым краі была паралізавана 3-я танкавая армія немцаў, у пачатку вайны нацэленая толькі на Маскву, але паступова вымушаная ўцягнуцца ў барацьбу з партызанамі і мясцовым насельніцтвам. Таму, відаць, і не здолела яна супрацьстаяць Чырвонай Арміі ў 1944 годзе. Яе салдаты яшчэ з месяц блукалі па балотах і лясах пасля вызвалення ў чэрвені 1944 года – так успамінае той страшны час былы малалетні вязень фашызму, а цяпер доктар тэхнічных навук, ураджэнец гэтых мясцін У.І. Майсеенка.

Зараз у вёсцы пражывае каля 15 чалавек. Яна ўваходзіць у падсобную гаспадарку Докшыцкай райсельгасхіміі (2004).



9 студзеня 1952 года ў Угольцах нарадзіўся Майсяёнак Анатоль Пятровіч – беларускі вучоны ў галіне лесаводства. У 1974 годзе скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут. Працаваў інжынерам па ахове лесу. З 1975 года працуе на Дзвінскай эксперыментальнай лясной базе Інстытута лесу Нацыянальнай АН Беларусі: старшы навуковы супрацоўнік. З 1993 года становіцца намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце. Апублікаваў больш за 50 навуковых прац.

# Улессе

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Вёска вядома з XVIII стагоддзя як маёнтак, які належыў феадалам Пацам. У 1793 годзе ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі. У 1909 годзе тут пражывае 227 чалавек.

У 1933 годзе створаны калгас “Ленінскі заклік”, стала працаваць кузня. У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 30 жыхароў.

А раніцой 10 чэрвеня 1943 года асноўныя сілы партызанскай брыгады “Жалязняк” прарвалі кальцо варожай блакады ва ўрочышчы Званок паміж вёскамі Улессе і Ліпск. Гэта адбывалася ў час карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан Бягомльскага і Докшыцкага раёнаў “Коттбус”. У гонар гэтага прарыву 10 чэрвеня 1986 года на гэтым месцы ўстаноўлены помнік.



Улессе з’яўлялася месцам, дзе мелася сядзіба героя руска-японскай вайны 1904-05 гадоў порт-артураўскага генерал-лейтэнанта Кандрацenka Рамана Ісідаравіча. З 1903 года Раман Ісідаравіч камандаваў 7-й Усходне-Сібірскай стралковай брыгадай. У руска-японскую вайну 1904-05 гадоў быў начальнікам абароны сухапуктнага фронту крэпасці Порт – Артур. Пад яго камандаваннем была нанава створана сістэма абароны крэпасці. Кандрацenka таксама кіраваў стварэннем новых відаў узбраення (ручныя гранаты, мінамёты), прыдумаў электрызацыю джрацяных загарод. Загінуў пры артылерыйскім абстрэле японцаў.

На мясцовых могілках знаходзіцца магіла члена Бягомльскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі ў Вялікую Айчынную вайну Сяргея Сяргеевіча Хацкевіча. Сяргей нарадзіўся ў гэтай вёсцы ў 1918 годзе. У 1936 годзе стаў членам ВЛКСМ. Скончыў 7 класаў сярэдняй школы ў Бягомлі. Працаваў сакратаром Бярэзінскага сельсавета. У вайну распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, аказваў дапамогу партызанам атрада “Барацьба” харчаваннем. У чэрвені 1942 года схоплены гітлераўцамі і расстраляны. У 1978 годзе на магіле падпольшчыка пастаўлена стэла.

Зараз у вёсцы пражывае каля 20 чалавек.

У Улессі пражываў Аўтушка Іван Мікітавіч (нарадзіўся у 1902 годзе ў Бягомльскім раёне). Асуджаны у 1937 годзе да высылкі ў Архангельскую вобласць, Расія. Вызвалены ў 1939 годзе. Рэабілітаваны. Вось што ўспамінае ён пра свае турэмныя мытарствы:

“Пасадзілі мяне ў лагер у 1937 годзе. На шчасце, прасядзеў нядоўга, праз 2 гады выпусцілі. Гэта ўжо і сын, і родныя пісалі просьбы ў Маскву, даказвалі, што несправядліва абышліся са мной. І вось рэдкі выпадак –

аслабанілі. На радасцях ніякіх паперак, хоць і былі яны, не захавалі. І толькі праз трыццаць з лішкам гадоў спахапіўся, стаў пісаць заявы ў пракуратуру Архангельскай вобласці, у пасёлак Ерцава Конашскага раёна, дзе і ў 70-я гады дзейнічаў так званы выпраўленчы лагер. Доўга ці коратка, аднак прыслалі ўсё ж даведку аб рэабілітацыі. Але да цяперашняга часу так толкам і незразумела – за што усётакі быў пасаджаны. Ці то слова не тое дзе сказаў, ці таму, што бацьку за кулака сталі лічыць, а разам з бацькам і мяне. А я да 1937 года паспеў і ў Чырвонай Арміі адслужыць – з 1921 па 1928 гады.

А лагер у Архангельскай вобласці размяшчаўся на тэрыторыі былых манастыроў. Гэта ж колькі людзей тады там павымірала. Зусім выпадкова трапіў я на "прэстыжную" работу – дамавіны для памерлых вырабляў. А там хто і ад голаду богу душу аддаваў, а хто проста ў лесе замярзаў. Павядуць чалавек дзесяць, а вернецца шэсць. Маразы ж былі страшэнныя. Мог бы і я на лясныя работы трапіць, але вось здарылася, што адна бяда ад другой бяды выратавала.

А першая бяда была ў тым, што пасля першай ночы, якую я правёў у лагеры, раніцай не далічыўся свайго бацінка – хтосьці яго, як кажуць, злямзіў, з нагі зняў, хацеў, напэўна, абодва сцягнуць, але не паспеў. Тым часам сталі людзей выганяць на мароз, каб па работах размеркаваць. Ну, тут ужо хочаш ці не хочаш, а ісці трэба. Выйшаў і я на снег. Адной нагой стаю, а другую уверх падціснуў. Наглядчык на мяне матам – чаго, маўляў, стаіш як бацян. Ды вось, кажу, бацінак у мяне ўкралі. Паглядзеў ён, падумаў і кажа, каб ішоў назад у барак. А іншых, абутых, адразу ж у лес пагналі. Пабыў я колькі ў бараку, наглядчык зноў з'явіўся, прынёс нейкія збітыя валёнкі. Кінуў мне і пытаецца, што, маўляў, я рабіць магу. А я і адказваю, што цяслярскай справай валодаю. Так і паставілі мяне дамавіны вырабляць. А калі б у лес, то не выжыу бы, загінуў. У мяне, у цяслярцы, хоць крыху цеплавата было. І норму можна было выканаць, а там ... Хлеба ж толькі па 600 грамаў давалі – гэта тым, хто норму выконваў. А хто з ёй не спраўляўся, дык кладзіся адразу і памірай. Якая там у лагеры ежа. Адзін хлеб. Каб суп які, дык ён ужо і не сніўся нават. Схуднеў, канечне. Каб не два гады, а больш, думаю, што не дачакаліся б мяне.

Па-рознаму было ў тыя часы. Былі калі-нікалі і паслабленні рэжыму. Дзесьці ў 1938 годзе панаехалі ў лагер ваенныя з ромбамі - праверка нейкая. Як жыццё, пытаюцца. Дрэнна, грамадзяне начальнікі – мароз на двары, а мы ў палатках кантуемся. Ноччу парусіна прамярзае, а днём ад сонца адтайвае, на нас капае. А яшчэ: у лазні паўгода не былі. Будзе вам лазня, паабяцалі яны. І сапраўды, потым у гарадскую лазню нас звазілі. Вось так і было".

# Федаркі

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Упершыню Федаркі ўпамінаюцца ў 1879 годзе пры пераліку населенных пунктаў Бярэзінскага праваслаўнага прыхода Барысаўскага павета, у якіх дзейнічалі царквы. У 1897 годзе тут пражывала 164 чалавекі. Мелася царква, якая была страчана ў 1918 годзе.

У 1933 годзе ў Федарках створаны калгас імя Варашылава, стала працаваць кузня.

У 1941 годзе, пасля акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі, каменісты на чале з сакратаром райкома КП(б)Б С.С. Манковічам пачалі падпольную барацьбу супраць гітлераўцаў. У Федарках быў створаны Бягомльскі падпольны райком КП(б)Б. 3 жніўня 1942 года Мінскі абком КП(б)Б і 11 жніўня 1942 года ЦК КП(б)Б зацвердзілі склад падпольнага райкома КП(б)Б. Сакратары С.С. Манковіч (з 3 жніўня 1942 года па 12 снежня 1943 года), Ф.І. Дзернушкоў (з 12 снежня 1943 года па 28 чэрвеня 1944 года). Друкаваны орган райкома газета «Советский патриот». Райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе “Жалязняк” і праводзіў палітыка-масавую і ваенна-арганізацыйную работу сярод насельніцтва і партызан.



У красавіку 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 2 жыхароў.

У 1976 годзе ў памяць аб стварэнні падпольнага райкома КП(б)Б у Федарках пастаўлена стэла.

Зараз тут пражывае каля 30 чалавек.

# Хмялеўшчына

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Хмялеўшчына ўваходзіла ў Тумілавіцкую воласць Барысаўскага павета. На той час тут пражывала каля 275 чалавек. У 1925 годзе адчынена пачатковая школа, у якой вучыліся 34 хлопчыкі і 9 дзяўчынак.

У гады калектывізацыі высяленнем за межы Беларусі ў Сібір пагражалі аднаасобнікам Хмялеўшчыны, якія не напісалі заявы ў калгас. Жыхароў вёскі абклалі штрафамі за забой жывёлы. Тым гаспадарам, якія ўступалі ў калгас, штрафы і забраную ў якасці штрафа жывёлу вярталі. Астатнім сялянам абяцалі, што калі яны напішуць заяву ў калгас, то ім вернуць назад іх штрафы.

А вось што ўспамінае пра гэтыя гады Марыя Рыгораўна Саковіч – 1922 года нараджэння: “...У Хмялеўшчыне я жыла да 1933 года. У 1933-м бацькоў і нас, траіх дзяцей, выслалі на вугальныя шахты ў Кузбас. Добра памятаю – мне ўсё ж было 11 гадоў – як ноччу пад вокнамі прайшлі людзі з лучынай, я яшчэ падумала, што гэта бацькі збіраюцца на млын, але потым пагрукалі ў шыбу... За што? Бацькі працавалі ў калгасе з самага пачатку – з 1929 ці 1930 года. Пытанне стаяла канкрэтна: ці ў калгас, ці на высылку. А дзед наш лічыўся заможным, меў валоку зямлі. Тое ж, што ў яго было васьмёра дзяцей і трэба было ўсіх пракарміць, а значыць, шмат працаваць, у разлік не бралася...

Як прыйшоў НЭП, серадняки сапраўды панажываліся і беднякам гэта было на руку: усё адно, калі нічога не маеш, калгас – дык калгас.серадняки пачалі падаваць заявы аб выхадзе з калгаса. Звярнулі ўсё на дзеда, зрабілі яго зачыншчыкам. І да таго часу абкладалі многімі падаткамі, а потым наогул забралі. Спачатку іх з бацькам асобна, нас асобна вязлі да Бягомля, затым – на Барысаў. Там, праўда, злучылі разам. Шлях быў доўгі, такіх пакутнікаў, як мы, набралася нямала з розных месц – Бранска, Смаленска. Так чыгункай давезлі да Масквы. Там усіх памылі, правялі дэзінфекцыю і адправілі ў цяперашнюю Кемераўскую вобласць. Там я прабыла з вясны 1933 года па 1941 год.

Жылі ў бараках. У іх бараку знаходзілася 16 сем’яў. Давялося зведаць і холад, і недахоп вады (яе вазілі бочкай). Тут памерлі дзве мае сястры. На гэтым няшчасці сям’і не скончыліся. Бацька працаваў цесляром, дзед – вартаўніком. Бацька быў вельмі мяккім па натуры, лагодным чалавекам, які нікога за сваё жыццё не пакрыўдзіў. Тым не менш у 1937 годзе яго з дзедам зноў забралі – ужо адтуль. Больш іх убачыць не давялося...”

У чэрвені 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі ў вёсцы 31 двор з 39 даваенных двароў. Пры гэтым быў забіты толькі адзін жыхар.

Зараз у Хмялеўшчыне пражывае каля 30 чалавек.

У 1921 годзе ў Хмялеўшчыне нарадзіўся Падцяроб Арсен Сцяпанавіч. У 1940 – 46 гадах праходзіў службу ў Чырвонай Арміі. У вялікую Айчынную вайну служыў у часцях, якія абслугоўвалі ўрадавую сувязь. Пасля вайны быў удзельнікам парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года. Потым скончыў Мінскую Вышэйшую партыйную школу, працаваў аграномам, брыгадзірам, старшынёй калгаса "Змагар". Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Памёр Арсен Сцяпанавіч ў 1996 годзе.



2 лістапада 1952 года ў Хмялеўшчыне нарадзіўся Загорскі Анатоль Васільевіч. У 1978 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці "Механізацыя сельскай гаспадаркі". Прыказам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 года № 35 у парадку перавода з Магілёўскага аблвыканкома назначаны на пасаду першага намесніка начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

# Целяшы

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце.*

У пачатку XX стагоддзя Целяшы ўваходзілі ў Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала 97 жыхароў, мелася 61 дзесяціна зямлі. З 1921 года па 1939 год вёска знаходзілася ў складзе Польшчы. У гэтыя гады тут пражывае каля 200 чалавек. У 1949 годзе ў Целяшах арганізоўваецца калгас "Новы шлях". У 1969 годзе сюды перасяляюцца частка жыхароў з вёскі Азарына, а ў 1970 годзе – жыхары з вёскі Яновічы.

Зараз у Целяшах пражывае каля 50 чалавек.



25 мая 1957 года ў Целяшах нарадзіўся Грабоўскі Дзмітрый Іванавіч. У 1976 годзе скончыў Полацкае педагагічнае вучылішча, а ў 1982 годзе – Мінскі педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам Ветахмянскай васьмігадовай і Слабадской сярэдняй школ. З 1985 года па 1989 год з'яўляўся дырэктарам Бягомльскага музея народнай славы. З 1989 года – настаўнік гісторыі установы адукацыі "Докшыцкая дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа № 2" імя І.С. Палявога, адначасова загадчык школьнага музея і кіраўнік суполкі "Спадчына".

# Чаркасы

*Вёска ў Сітцаўскім сельскім Савеце*

У пачатку ХХ стагоддзя Чаркасы ўваходзілі ў Параф'янаўскую воласць Вілейскага павета. У 1901 годзе тут адчынена школа царкоўнай граматы. У 1905 годзе ў вёсцы налічваецца каля 238 чалавек.



Шулы зруйнаванай фальваркавай пабудовы

Клеманцова – ранейшы фальварак, а зараз закінутае месца. У матэрыялах рэвізіі 1795 года Клеманцова яшчэ не згадваецца, гэтыя землі знаходзіліся ў складзе маёнтка Чаркасы. У ХІХ стагоддзі Кіякоўскія заклалі дзве новыя сядзібы ў маляўнічых месцах па-над Сэрваччу ў Кіякове і Клеманцове.

Напачатку ХХ стагоддзя, па словах старажылаў, Клеманцова належала Багдану Кіякоўскаму, які пазней атрымаў і двор Кіякова ад свайго бяздзетнага дзядзькі. У 1929 годзе Багдан Кіякоўскі валодаў тут 472 дзесяцінамі зямлі (апроч таго, у яго было 1200 дзесяцін у Кіякове, ды ў Соф'і Кіякоўскай у Station Станіслававе – 100 дзесяцін). Па звестках за 1930 год, у фальварку Клеманцова пражывалі 45 чалавек, меліся 3 хаты для парабкаў, сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, пачатковая школа. Паводле дакументаў, меўся у Клеманцове паравы млын, што належаў Кіякоўскаму, аднак насамрэч ён знаходзіўся не ў фальварку, а пры дарозе Сітцы–Кіякова, непадалёк ад Старой Вёскі. Напрыканцы 30-х гадоў упраўляючым маёнтка працаваў Жынгаловіч.



**Падмуркі сядзібнага дома**

За часы савецкай улады ад Клеманцова засталіся толькі падмуркі пабудоў, дрэвы ды месцамі брукаваная дарога, што звязвала сядзібу з Лісавічамі.

З 1921 года па 1939 год Чаркасы ўваходзяць у склад Польшчы. Зараз тут пражывае каля 25 чалавек.

У Чаркасах 27 жніўня 1951 года нарадзіўся Палачанін Фёдар Антонавіч. Беларускі пісьменнік. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут у 1974 годзе. Працаваў загадчыкам Лісавіцкага сельскага клуба, настаўнікам Чаркаскай пачатковай, Лісавіцкай васьмігадовай, Докшыцкай сярэдняй (№ 2) школ, метадыстам і інспектарам Докшыцкага рана, інструктарам Докшыцкага РК КПБ, загадчыкам раённай фільматэкі. З 2000 года галоўны спецыяліст аддзела адукацыі Докшыцкага райвыканкома. Акцёр Докшыцкага народнага тэатра з 1980 года.

Друкуецца з 1992 года. Аўтар кнігі "Расплата за нелюбоў" (1998), "Недаспяваная песня" (2001), "Белы абрус" (2002), "Не свая віна", "Урок на ўсё жыццё" (абедзве 2003). Творы Ф.Палачаніна вызначаюцца жанравай раз-

# Чарніца 1 і 2

*Вёскі ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

Гэтыя дзве вёскі з амаль аднолькавымі назвамі мы разгледзім разам. Назвы іх паходзяць хутчэй за ўсё ад ракі Чарніца, якая працякае побач з вёскай № 2, альбо ад вялікай колькасці чарніц у гэтых мясцінах.

Вёскі вядомы яшчэ з XIX стагоддзя. У 1870 годзе тут былі маёнткі. Адзін з іх належаў Адэлі Іванаўне Шабека. Прыгонных 3 двары, 11 чалавек. За выкупляемую зямлю (119 дзесяцін, 2138 сажаняў) атрымалі 540 рублёў пазыкі, для пагашэньня якой павінны былі штогод уносіць у казну па 32 руб 70 кап.

Другі маёнтак належаў Лаппо. У 1929 годзе гаспадарамі былі Мікульскі Юзэф – 55 дзесяцін і Раткевіч Зянон – 303 гектары.

У адной з вёсак (напэўна ў Чарніцы 2) у 1887 годзе працаваў адзін з буйнейшых вадзяных млыноў. Яго вытворчасць (колькасць пудоў зерня, што перамолвалася на муку за месяц) складала 3000 пудоў. У пачатку XX стагоддзя ў першай Чарніцы пражывалі 154 жыхары. У ёй у 1923 годзе была адчынена пачатковая школа, у якой у 1924 годзе налічвалася 43 вучні, у іх ліку толькі 4 дзяўчынкі. У гады польскай акупацыі 1921-39 гадоў каля другой Чарніцы знаходзілася пагранічная застава.

У гады Вялікай Айчыннай вайны абедзьве вёскі былі спалены гітлераўцамі. Чарніца 1 была спалена ў 1942 годзе, пры гэтым былі загублены 52 жыхары. А Чарніцу 2 спасціг такі ж лёс у 1944 годзе.

Зараз у дзвюх вёсках пражывае каля 40 чалавек.

3 кастрычніка 1960 года ў Чарніцы 2 нарадзіўся Генадзь Васільевіч Васюковіч. Ён спачатку вучыўся ў Бягомльскай, а потым у Пастаўскай школах-інтэрнатах, працаваў лесарубам у Бярэзінскім лясніцтве. У маі 1979 года прызваны ў Савецкую Армію Полацкім РВК. Пасля заканчэння службы падаў рапарт з просьбай застацца ва Узброенных Сілах СССР. У 1984 годзе прапаршчык Васюковіч накіраваны ў Афганістан. Баявыя аперацыі займалі па два-тры тыдні. Верны воінскай прысязе, Генадзь, як сапраўдны патрыёт, праяўляў смеласць і мужнасць.



Нарэшце наблізіўся і канец службы ў Афганістане, якога так чакаў сам Генадзь і ўсе родныя. Ужо былі складзены рэчы ў дарогу, падрыхтаваны дакументы і білет на самалёт. Наперадзе было толькі апошняе баявое заданне. 13 красавіка 1986 года Генадзь Васільевіч быў цяжка паранены і страціўшы

прытомнасць, загінуў. Яго пахавалі ў Оршы. За мужнасць і гераізм старшына разведвальнай роты прапаршчык Генадзь Васільевіч Васюковіч узнагароджаны медалямі “За адвагу”, “Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа” і пасмяротна ордэнам Чырвонай Зоркі.

Людміла Салянка прысвяціла Генадзю адзін са сваіх вершаў:

***Памяці земляка Васюковіча Г.В.,***
***які не вярнуўся з афганскай вайны.***

Журавы, журавы ... Вы ляціце да дому,
За бярозавы гай, там, у родным сяле
Есць матуля мая, змізарнеўшы ад стомыl,
Кожны вечар на узгорку чакае мяне.
Вы скажыце ей птахі, што хутка вярнуся.
Я уранні прыйду, да ўсходу зары.
З перамогай я, мама, прыйду, не хвалюйся,
Больш ніколі на свеце не будзе вайны.
Пабудуем мы хату сасновую потым
І паклічам у госці суседзяў усіх.
Пасаджу я бярозку ля новага плоту,
Хай красуе ў памяць сяброў дарагіх.
А калі ж не вярнуся я, мама, ніколі
Ты не плач над магілкаю кожнай вясной.
Лепш услухайся ў крык жураўліны над полем –
Гэта я жураўлем размаўляю з табой.

# Чарнічка-1,2,3,4

*Вёскі ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Маставуха – невялікая вёска па-над ракой Бярэзінай побач з шашой Докшыцы – Ушачы. Назва яе, безумоўна, паходзіць, ад моста праз Бярэзіну, які існуе ў гэтым месцы з XIX стагоддзя. Афіцыйна Маставуха носіць назву “Чарнічка-2”. Тым не менш, на шашы стаіць знак “Маставуха” і ў раскладзе руху аўтобусаў у Докшыцах напісана гэтак жа.

Усяго ў гэтым краі існуюць чатыры паселішчы з назовам Чарнічка, два – з назовам Чарніца і рака Чарніца (назва, зрэшты, узнікла не выпадкова – чарніц тут сапраўды шмат). Па звестках за 1930 год, у засценку Чарнічка-2 пражывалі 35 чалавек, якім належалі 40 дзесяцін зямлі. Зрэшты, на карце 1932 года пазначаны як два розныя паселішчы Чарнічка-2 (13 двароў) і Маставуха (1 двор). У 2004 годзе ў вёсцы Маставуха (Чарнічка-2) 8 двароў, пражывае 14 чалавек. А ўсяго ў чатырох вёсках зараз насельнікаў не больш 20.



Курганы-пахаванні "Валатоўкі"

Як памяць аб даўніх часах захаваліся тут старадаўнія курганы – “валатоўкі”, якія не значацца ў афіцыйным спісе нікаў.

ікай Айчыннай вайны тут разгортваліся баявыя дзеянні паміж партызанамі і нямецкімі акупантамі. У маі 1943 года другі атрад пад камандаваннем Шылькова заняў абарону на Бярэзіне ў раёне вёсак Чарнічка-1,2,3. Калі фашысты сканцэнтрыравалі свой агонь па нашай лініі абароны, на дапамогу да нас падыйшоў падрыўны атрад, якім камандаваў Рудакоўскі. Бой працягваўся каля 3 гадзін.нягледзячы на вялікія страты, вораг узмацняў націск. У выніку ўся брыгада была вымушана адысці да вёскі Горнава.

10 жніўня 1929 года ў фальварку Чарнічка-1 Дзісенскага павета Віленскага ваяводства (пазней аднайменная вёска Тумілавіцкага сельсавета) нарадзіўся Чысцякоў Мікалай Дзмітрыевіч. З 1937 года вучыўся ў сямігадовай польскай школе ў Докшыцах. Пасля Вялікай Айчыннай вайны з



1947 года працаваў у Докшыцкай гарадской пажарнай ахове. З 1949 года па 1953 год служыў у Савецкай Арміі. Потым працаваў на Урале. З 956 года па 1957 год вучыўся завочна ў Пермскім настаўніцкім інстытуце. У 1963 годзе вярнуўся на радзіму. З 1964 года працуе спачатку электраманцёрам падстанцыі, а потым дзяжурным электраманцёрам. На пенсіі з 1990 года. Займаецца вывучэннем гісторыі Докшыц і населенных пунктаў раёна, зборам матэрыялаў і легенд пра родныя мясціны, землякоў і іх справы, дапамагае школьным і раённаму музеям у зборы і ўдакладненні гістарычных звестак, фактаў, падзей. Часта друкуе артыкулы ў раённай газеце. Дапамагаў у падрыхтоўцы да выдання кнігі “Памяць”.

# Чачукі

*Вёска ў Парплішчанскім сельскім Савеце*

У пачатку XX стагоддзя Чачукі адносіліся да Парплішчанскай воласці Вілейскага павета. У 1905 годзе тут пражывала каля 158 жыхароў. З 1921 года па 1939 года Чачукі уваходзілі ў склад Польшчы. У Чачуках была магіла польскіх вайскоўцаў, загінуўшых падчас тых баёў.

У 1971 годзе з Чачукамі аб’ядналася сумежная вёска Горкі.

У 1990 годзе сыраварны цэх малочна-таварнай фермы “Чачукі” засвоіў вытворчасць круглага сыра “Сэрвач”. На жаль, вытворчасць праіснавала нядоўга. У сярэдзіне 1990-х гадоў на малочна-таварную ферму “Чачукі” прыязджаў прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

Зараз у вёсцы пражывае каля 125 чалавек.

# Чырвонае Беразіно

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*



Гэта адна з самых маладых вёсак Докшыцкага раёна. Яна была заснавана пасля Вялікай Айчыннай вайны ў пачатку 1950-ых гадоў. Назва вёсцы была дадзена на агульным сходзе калгаснікаў калгаса "Шлях Леніна". "Чырвонае" – даніна савецкай традыцыі, "Беразіно" – у знак таго, што на ўскрайку вёскі бярэ пачатак рака Беразіна. Першым старшынёй калгаса быў Крыкун Уладзімір Сцяпанавіч. У 1967 годзе тут ужо налічвалася 78 двароў і 232 жыхары.

У цэнтры вёскі, перад будынкам клуба, на ушанаванне памяці 28 аднавяскоўцаў-франтавікоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1968 годзе пастаўлены помнік – трохметровы слуп з 5 жалезабетонных блокаў. На сярэднім, ссунутым адносна вертыкальнай восі , - надпіс-прысвячэннем і імёны загінуўшых. На гранях верхняга блока рэльефныя выявы на тэмы ўсенароднай барацьбы з ворагам.



У 1977 годзе ў Чырвонае Беразіно перасяліліся жыхары з хутара Загарані.

Зараз у вёсцы пражывае каля 320 чалавек.

У 1879 годзе ў вёсцы Загаране нарадзіўся Дук Віктар Мікалаевіч. Удзельнік трох рэвалюцый. Працаваў на Пуцілаўскім заводзе ў Пецярбургу, на заводзе "Гартман" у Луганску. У Луганску ўдзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1905 – 07 гадоў. Затым вярнуўся ў Пецярбург, дзе прымаў удзел у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях. Стаўшы інвалідам, вярнуўся на радзіму, дзе і памёр у 1949 годзе.

# Чысці Вардамскія

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У XV стагоддзі працэс ператварэння дзяржаўнай маёмасці ў прыватную яшчэ больш паскорыўся. Каля 1440 года сын Войцеха Манівіда Ян (Івашка) Манівідавіч атрымаў дадатковыя падараванні: *«Ивашку Монивидовичу к Хорянам придано Омнишовцы и Долгиновцы»*. Справа ідзе пра жыхароў сёл, што знаходзіліся па суседстве з сучасным Докшыцкім раёнам – Амнішава (Лагойскі раён) і Даўгінава (Вілейскі раён). Пры гэтым тэрыторыя Даўгінаўскай сельскай абшчыны цягнулася ў бок Докшыччыны і захоплівала яе край. Менавіта на той яе частцы, што была падаравана Манівідавічу, узніклі, напэўна, сёлы Мільча і Вардамічы, а пазней, ужо непасрэдна на тэрыторыі Докшыччыны – Чысці Мільчанскія і Чысці Вардамскія.

Асаблівасцю лёсу харэцкіх сёлаў (як і многіх іншых паселішчаў таго часу) было драбленне іх паміж некалькімі саўладальнікамі. Гэта было вынікам таго, што феадалы пры падзеле спадчыны імкнуліся атрымаць долі, роўныя не толькі па колькасці падданых, але і па іншых акалічнасцях: аддаленасці ад небяспечных межаў дзяржавы і ад галоўнай сваёй рэзідэнцыі, якасці глебы і інш. Таму кожны браў сабе не асобнае сяло, а па пэўнай колькасці сялян у розных паселішчах. Таму жыхары дзвюх суседніх сялянскіх сяліб часам апыналіся падданымі розных гаспадароў, галоўныя маёнткі якіх знаходзіліся вельмі далёка і ад гэтага сяла, і адзін ад аднаго.

У такіх умовах былая сялянская абшчына паспытала моцную трансфармацыю. Зараз яна ахоплівала не жыхароў спрадвечнай верві, а падданых аднаго ўладальніка, якія жылі ў тэрытарыяльна блізкіх паселішчах. Звычайна адно з іх, найбольш буйное, рабілася цэнтрам уладання. Там узнікаў феадальны двор - рэзідэнцыя самога феадала ці, часцей, урадніка. Там жа, як правіла, будавалася царква. Такое паселішча звалася сялом, у польскамоўных дакументах - *вессю*, адкуль паходзіць і сучасная беларуская назва "*вёска*". Больш дробныя паселішчы вакол, звычайна не болей трох - пяці двароў, у польскамоуных дакументах зваліся "*засценкамі*". Калі сяло належала двум уладальнікам, яно паступова магло распасціся на два асобных паселішчы. Так, напрыклад, адбылося з Гняздзілавам - Паўночным і Паўднёвым, а таксама з Чысцямі - Вардамскімі і Мільчанскімі.

У 1596 годзе адбылася Берасцейкая царкоўная унія, паводле якой праваслаўная царква Беларусі і Украіны пераходзіла з падпарадкавання канстантынопальскага патрыярха ў падпарадкаванне папы рымскага. Хуткімі тэмпамі пашыралася паланізацыя шляхты, у тым ліку і карэннай беларускай, якая ў большасці пераходзіла ў каталіцызм. Паны-католікі актыўна будавалі у сваіх маёнтках не толькі ўніяцкія цэрквы, але і касцёлы, каталіцкія кляштары, надавалі ім зямельныя ўладанні. Гэты працэс не абмінуў і

Докшыччыну. У 1627 годзе сын Станіслава Кішкі (унук Ганны Радзівілаўны-Кішчынай) Януш Кішка прадаў віленскаму дамініканскаму кляштару за 12400 коп Драгамічы і Вардамічы, разам з належачымі да іх Чысцямі.

На жаль далейшай гісторыя вёскі знайсці не ўдалося. У пачатку XX стагоддзя тут налічваецца 63 двары і 494 жыхары. У 1933 годзе арганізаваны калгас “Чэкіст”, стала працаваць і кузня. У чэрвені 1942 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску.

Зараз тут пражывае каля 80 чалавек.

У 1887 годзе ў вёсцы нарадзіўся Жораў Іосіф Дзмітрыевіч. З 1914 года па 1917 год знаходзіўся на службе ў царскім войску, ваяваў на германскім фронце. У баі пад Смаргонню ўзяў у палон некалькіх нямецкіх салдат, за што быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжом, яму прысвоены чын унтэр-афіцэр. Гэта адзін з двух жыхароў нашага раёна, які ятрымаў такую высокую ўзнагароду ў дарэвалюцыйнай гісторыі нашай краіны.

# Чысці Мільчанскія

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

У XV стагоддзі працэс ператварэння дзяржаўнай маёмасці ў прыватную яшчэ больш паскорыўся. Каля 1440 года сын Войцеха Манівіда Ян (Івашка) Манівідавіч атрымаў дадатковыя падараванні: *«Ивашку Монивидовичу к Хорянам придано Омнишовцы и Долгиновцы»*. Справа ідзе пра жыхароў сёл, што знаходзіліся па суседстве з сучасным Докшыцкім раёнам – Амнішава (Лагойскі раён) і Даўгінава (Вілейскі раён). Пры гэтым тэрыторыя Даўгінаўскай сельскай абшчыны цягнулася ў бок Докшыччыны і захоплівала яе край. Менавіта на той яе частцы, што была падаравана Манівідавічу, узніклі, напэўна, сёлы Мільча і Вардамічы, а пазней, ужо непасрэдна на тэрыторыі Докшыччыны – Чысці Мільчанскія і Чысці Вардамскія.

Асаблівасцю лёсу харэцкіх сёлаў (як і многіх іншых паселішчаў таго часу) было драбленне іх паміж некалькімі саўладальнікамі. Гэта было вынікам таго, што феадалы пры падзеле спадчыны імкнуліся атрымаць долі, роўныя не толькі па колькасці падданых, але і па іншых акалічнасцях: аддаленасці ад небяспечных межаў дзяржавы і ад галоўнай сваёй рэзідэнцыі, якасці глебы і інш. Таму кожны браў сабе не асобнае сяло, а па пэўнай колькасці сялян у розных паселішчах. Таму жыхары дзвюх суседніх сялянскіх сяліб часам апыналіся падданымі розных гаспадароў, галоўныя маёнткі якіх знаходзіліся вельмі далёка і ад гэтага сяла, і адзін ад аднаго.

У такіх умовах былая сялянская абшчына паспытала моцную трансфармацыю. Зараз яна ахоплівала не жыхароў спрадвечнай верві, а падданых аднаго ўладальніка, якія жылі ў тэрытарыяльна блізкіх паселішчах. Звычайна адно з іх, найбольш буйное, рабілася цэнтрам уладання. Там узнікаў феадальны двор - рэзідэнцыя самога феадала ці, часцей, ураднiка. Там жа, як правіла, будавалася царква. Такое паселішча звалася сялом, у польскамоўных дакументах - *вессю*, адкуль паходзіць і сучасная беларуская назва "*вёска*". Больш дробныя паселішчы вакол, звычайна не болей трох - пяці двароў, у польскамоуных дакументах зваліся "*засценкамі*". Калі сяло належала двум уладальнікам, яно паступова магло распасціся на два асобных паселішчы. Так, напрыклад, адбылося з Гняздзілавам - Паўночным і Паўднёвым, а таксама з Чысцямі - Вардамскімі і Мільчанскімі.

У 1596 годзе адбылася Берасцейкая царкоўная унія, паводле якой праваслаўная царква Беларусі і Украіны пераходзіла з падпарадкавання канстантынопальскага патрыярха ў падпарадкаванне папы рымскага. Хуткімі тэмпамі пашыралася паланізацыя шляхты, у тым ліку і карэннай беларускай, якая ў большасці пераходзіла ў каталіцызм. Паны-каталікі актыўна будавалі у сваіх маёнтках не толькі ўніяцкія цэрквы, але і касцёлы, каталіцкія кляштары, надавалі ім зямельныя ўладанні. Гэты працэс не абмінуў і

Докшыччыну. У 1627 годзе сын Станіслава Кішкі (унук Ганны Радзівілаўны-Кішчынай) Януш Кішка прадаў віленскаму дамініканскаму кляштару за 12400 коп Драгамічы і Вардамічы, разам з належачымі да іх Чысцямі.

На жаль далейшай гісторыі вёскі знайсці не ўдалося. У пачатку ХХ тут налічваецца 40 двароў і 267 жыхароў.

У 1909 годзе ў вёсцы адчынена народнае вучылішча, для якога ў тым жа годзе пабудаваны драўляны будынак. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана савецкая пачатковая школа, у якой настаўнік Андрэй Кулеш вучыў 54 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак.

У 1942 годзе нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску. Зараз тут пражывае не больш 30 чалавек.

# Шалагіры

*Вёска ў Бярэзінскім сельскім Савеце*

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў Шалагіры ўваходзілі ў склад Тумілавіцкай воласці Барысаўскага павета. У 1909 годзе тут налічвалася 35 двароў і 238 жыхароў. У 1923 годзе ў Шалагірах адкрываецца пачатковая школа. У 1934 годзе ў гэтай школе навучаецца 45 вучняў (у тым ліку 7 дзяўчынак).



У жніўні 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі трох жыхароў. У гэтай жа вёсцы знаходзіцца магіла кіраўніка падпольнай камсамольскай арганізацыі Ніканавай Аляксандры Андронаўны. Гэта арганізацыя вяла сваю барацьбу з акупантамі на тэрыторыі гарнізонаў вёсак Гліннае, Пустаселле, Варлань.

Зараз у Шалагірах пражывае каля 30 чалавек.

У 1901 годзе ў Шалагірах нарадзіўся Гаўрыловіч Міхаіл Міхайлавіч. У грамадзянскую вайну ваяваў супраць нямецкіх і польскіх войск, армій Дзянікіна і Урангеля, быў чатыры разы паранены. У верасні 1939 года Міхаіл Міхайлавіч быў удзельнікам вызваленчага пахода Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. У Вялікую Айчынную вайну з 1943 года з’яўляўся камандзірам узвода, а таксама палітруком роты 1-га атрада брыгады “Жалязняк”. Пасля вайны да 1947 года працаваў дырэктарам Бягомльскай МТС. Памёр Гаўрыловіч Міхаіл Міхайлавіч у 1980 годзе.



У 1956 годзе ў Шалагірах нарадзіўся Демідовіч Васіль Мікалаевіч. У 1978 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці “Правазнаўства”. У чэрвені 1999 года назначаны старшынёй гаспадарчага суда Мінскай вобласці. З красавіка 2008 года – намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь.

Каля паўднёвай ускраіны Шалагір бярэ пачатак Слабадскі канал, які з’яўляецца левым прытокам ракі Поня (басейн Бярэзіны).

# Шалашы

*Вёска ў Тумілавіцкім сельскім Савеце*

Жылі людзі, пажывалі, гора не зналі. Але раптам напаткала іх вялікае няшчасце. Разгулялася ў іх наваколлі страшэнная хвароба. Людзі пачалі гінуць, як мухі. Дадзены быў указ: спаліць усе пабудовы, пакінуць толькі самае неабходнае, а самім жыхарам пакінуць абжытае месца.

Як людзям не шкада было свайго набытку, але ж жыццё даражэй. Вырашылі жыхары ўцякаць у глыбокі лес, а жыццё пачалі ладзіць у шалашах. Так і узнікла новае паселішча – сучасная вёска Шалашы.

У пачатку XX стагоддзя Шалашы ўваходзілі ў склад Тумілавіцкай воласці Барысаўскага павета. На гэты час тут налічвалася 22 двары і 147 жыхароў.

З 1921 года па 1939 год вёска апынулася ў складзе Польшчы. У гэты перыяд з самой вёскай межаваўся аднайменны фальварак, дзе было 2 дамы і 15 жыхароў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска была спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Восенню 1943 года асабліва жорсткія баі вяла тут брыгада імя ЦК КП(б)Б. Сустрэўшы рашучы адпор народных мсціўцаў гітлераўцы ўводзілі ў дзеянне танкі, авіяцыю і артылерыю. Так, 11 верасня 1943 года фашысты зноў паўтарылі спробу прарвацца ў партызанскую зону. На досвітку групай колькасцю сто чалавек яны падыйшлі да паўднёва-заходняй ускраіны вёскі Шалашы. Тут іх сустрэў кулямётны агонь партызан. Збіўшы баявую ахову 2-га атрада, праціўнік працягваў рухацца на вёску Несцераўшчына. Але вораг заўважыў, што на дапамогу баявой ахове спяшаюцца партызаны іншых атрадаў, і адступіў у свой гарнізон.

За 300 метраў на паўночны ўсход ад Шалашоў, абапал дарогі на вёску Несцераўшчына знаходзіцца курганны могільнік. У яго склад уваходзяць 20 курганоў, з іх 9 у плане падоўжаныя, даўжынёй 10-12 метраў, шырынёй 5-7 метраў, вышынёй 1,5-2 метры. Астатнія круглыя дыяметрам 5-10 метраў і вышынёй 0,7-3,5 метраў. Курганы задзернаваныя і зараслі хваёвым лесам. Гэты курганны могільнік у 1971 годзе адкрыў А.Р. Мітрафанаў. На жаль, раскопак тут ніхтот не праводзіў.

# Шантараўшчына

*Вёска ў Парплішчанскім сельскім Савеце*

Колькі год існуе вёска – ніхто не ведае. Але вельмі шмат, бо людзі заўсёды сяліліся перш за ўсё на берагах рэк і азёр. Вёска ніколі не была вялікім паселішчам. У 1905 годзе, калі Шантараўшчына належала князю Галіцыну, чый маёнтак быў непадалёкеу, у ёй пражывалі 82 чалавекі.

З 1921 года па 1939 год Шантараўшчына ўваходзіла ў склад Польшчы, як засценак Парплішчанскай гміны Дунілавіцкага павета. Тады тут пражывалі 24 жыхары.

У 1949 годзе ў Шантараўшчыне быў арганізаваны калгас імя Варашылава. Зараз тут пражывае каля 25 чалавек.

Каля вёскі знаходзіцца возера Сэрвач. Плошча яго каля 4,5 квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня 5,2 метра. Даўжыня 3,83 кіламетра, найбольшая шырыня 2,9 кіламетра. Даўжыня берагавой лініі каля 13 кіламетраў. Аб’ём вады ў возеры каля 13 мільёнаў кубічных метраў. Схілы катлавіны вышынёй 1-3 метра, разараныя, на захадзе невыразныя. Берагі нізкія, месцамі сплавінныя. Пойма забалочаная, пад хмызняком, на захадзе пераходзіць у забалочаную, парослую лесам нізіну.дно выслана сапрапелем, на поўначы – торфам; мелкаводдзе пясчанае. Шырыня паласы прыбярэжнай надводнай расліннасці 15-20 метраў і пашырана да глыбіні 1,5-2 метры. Зараз возера Сэрвач аб’яўлена гідралагічным заказнікам.

# Шклянцы

*Вёска ў Бярозкаўскім сельскім Савеце*

З КНІГІ "ЛІСЦЕ ЧАСУ"
Сплывае ноч за шыбамі акна,
Кастрычнік сад паціху атрасае
У лісце жоўтае ахапкамі кідае
На думкі, што дрэмлюць давідна.
Дзвярмі растанне грукне - і зноў
У свет памчыць, памчыць мяне дарога
Усё далей ад роднага парога,
Ад рук матулі, бацькавых слядоў.
Даўно іх лісце часу замяло,
Ды вечна помніць памяццю сыноўскай
І свет вачэй, і мёртвае чало,
І стынь магілы там, за вёскай.
Сляза матулі на шчацэ ці дождж?
У смузе расстаянай патанаюць Шклянцы.
Сюды не раз, не двойчы мне вяртацца
Дзе памяць сэрца ходзіць басанож...

*Эдуард Зубрыцкі*

Першае упамінанне пра вёску Шклянцы можна знайсці ў дыярыўшы падарожжа ананімнага беларускага шляхціца, які ехаў з Мінска ў Пецярбург у ліпені – жніўні 1797 года. Вось што там гаворыцца: “***Ліпеня 16.*** *За тры мілі ад Мнішава Шкленічы [в. Шклянцы], некалі мяжа п[аве]та Ашмянскага з Мінскім. Дарога тут вузкая, камяністая і шмат брадоў. Лясы [дро]бныя, непадалёк ад Шкленічаў вытокі Віліі, перад якой пачынаецца вельмі важны шлях. Шкленічы маюць чатырох уладальнікаў, сярод якіх знаходзяцца і Тышкевічы.*



*Трэба тут успомніць шляхетнасць (і ветлівасць) Я[снавяльможнага] Козела, ста[рас]ціча, аднаго з уладальнікаў Шкленічаў. (Чалавек гэты), хоць ужо не быў малады, не меў нічога агульнага з былым гайдамацтвам палякаў (якім яго суседзі вызначаліся), быў гасцінны, чалавечны і мілы, тым справядлівейшым падаваўся нам грамадзянінам, чым больш расчароўвалі сваім непакоем і гайдамацтвам некаторыя яго суседзі, якія з нашымі слугамі яму пакланяліся. Гэты высакародны чалавек быў небагаты, але трымаў бібліятэку. (З таго) збору даволі вядомыя кнігі розных жанраў настолькі, што нават прапанаваў лекі для Я[снавяльможнага] Алендс[кага] – камергера, які хварэў горлам, таксама даў зёлкі для лячэння аднаго каня, які небяспечна захварэў.*”

У 2-й палавіне XIX – пачатку XX стагоддзяў сяло Шклянцы ўваходзіла ў склад Вітуніцкай воласці і праваслаўнага прыхода Барысаўскага павета. У 1886 годзе тут налічвалася 8 двароў і 92 жыхары. Таксама меліся праваслаўная царква і дзве карчмы. Аднак, ужо ў 1897 годзе шклянцы былі вёскай, дзе пражывала 130 чалавек, знаходзіліся хлебазапасны магазін, прыпісная царква, лаўка, піцейны дом. А 14 верасня ў Шклянцах праводзіўся кірмаш.

У 1924 годзе ў вёсцы адкрываецца пачатковая школа, дзе першая настаўніца Валянціна Кажарская вучыла 56 дзяцей.

У 1944 годзе ў Шклянцах знаходзіўся штаб партызанскай брыгады "Жалязняк". І вось як адзін з эпізодаў ваеннага ліхалецця ўспамінае былы камандір гэтай брыгады Герой Савецкага Саюза Іван Піліпавіч Ціткоў: "...У вёсцы Шклянцы, дзе знаходзіліся кулямётчыкі, нашы людзі злавілі каля студні жанчыну, якая спрабавала высыпаць туды нейкі парашок. Пасля вобыску жанчыны ў яе была знойдзена атрута. Пасля прад'яўлення ёй такіх цяжкіх абвінавачванняў, жанчына стала разыгрываць з сябе псіхічна хворую: брыдкасловіла, спявала песні, плявалася. Аднак потым была вымушана расказаць пра сябе. Гэта былі не адзіночныя выпадкі. Мы жылі ў пастаяннай небяспецы і баяліся апынуцца ахвярамі хімічнай і бактэралагічнай вайны, якую вялі супраць нас фашысцкія акупанты".

На цяперашні момант у Шклянцах пражывае каля 65 чалавек.

Каля вёскі знаходзіцца некалькі курганных могільнікаў. Адзін з іх можна знайсці прама ў вёсцы, на агародах. 35 круглых курганоў, якія цягнуцца ланцугамі (2-3 рады) з захаду на ўсход. 7 курганоў маюць дыяметр 8-9 метраў і вышыню 1,5-2 метры, 4 курганы дыяметрам 4-5 метраў, вышынёй 0,5-0,6 метраў, дыяметр астатніх не перавышае 6-7 метраў і вышыні 0,7-1 метра. Каля асноў некаторых курганоў можна знайсці неглыбокія раўкі.

Другі курганны могільнік знаходзіцца за 1 кіламетр на поўдзень ад Шклянцаў, абапал дарогі на гарадскі пасёлак Плешчаніцы. Тут 10 курганоў маюць вышыню 1-2 метры і дыяметр 6-10 метраў. Абодва гэтыя курганныя могільнікі яшчэ ў 1971 годзе выявіў А.Р. Мітрафанаў. Аднак дасканалых раскопак тут не праводзілася.

Пазней былі выяўлены яшчэ два курганныя могільнікі. Адзін з іх за 1,5 кіламетра на поўнач ад вёскі, на агародах былога мястэчка Шклянцы. Тут знаходзіцца 5 насыпаў (некаторыя з іх разараны) вышынёй каля 1 метра і дыяметрам да 2 метраў.

Апошні могільнік знаходзіцца за паўкіламетра на захад ад Шклянцаў, на дарозе на вёску Бярозкі, за 20 метраў ад дарогі. У яго склад уваходзіць адзін курган вышынёй каля 2 метраў і дыяметрам да 4 метраў.

У вёсцы Шклянцы існуе паданне, што курганы насыпаны над магіламі воінаў, якія загінулі ў вайне з туркамі. Нібыта, калі хавалі забітых, ім

прывезлі плату – залатыя манеты, але спазніліся. Тады грошы паклалі ў магілы.



У цэнтры былога мястэцка Шклянцы да нашых дзён захаваўся камень, што ляжаў каля ўвахода ў царкву, якую спалілі ў 1939 гадзе ваяўнічыя атэісты. У 1990-х гадах каля каменя паставілі драўляны крыж.





Даўжыня шклянскага каменя 0,8 метра, шырыня 0,47 метра а вышыня 0,3 метра. Па геалагічнай характарыстыцы гэта чырвона-буры буйназярністы граніт з вялікай колькасцю крышталёў палявога шпату. Паглыбленне да 18 сантыметраў у плане мае форму сціснутага эліпса даўжынёй 28 і шырынёй 12 сантыметраў. За 50 метраў на поўнач ад каменя ва ўрочышчы Валатоўкі захаваўся курганны могільнік, пра які ўжо гаварылася вышэй. Можна меркаваць, што тут калісьці было сакральнае месца з паклонным каменем і побач могільнік. Таму невыпадкова, што ў часы хрысціянізацыі на гэтым месцы і быў узведзены храм.

На Дзесятуху (дзесятая пятніца пасля Вялдікання) і на Узвіжанне (27 верасня) каменю носяць ахвераванні – грошы, кветкі, садавіну. На крыж вешаюць ручнікі і фартушкі. І па сёняшні дзень ваду з паглыблення каменя лічаць гаючай.



Каля Шклянцаў на рэштках старадаўніх могільнікаў захаваліся каменныя крыжы.

9 лютага 1929 года ў Шклянцах нарадзіўся беларускі мастак Барздыка Павел Фёдаравіч. Цяпер ён працуе ў графіцы і кніжным афармленні. У 1949 годзе сям’я пераехала ў гарадскі пасёлак Плешчаніцы. У 1956 годзе ён скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, а ў 1965 годзе Маскоўскі паліграфічны інстытут. У Вялікую Айчынную вайну ў 1943 годзе быў вывезены ў Германію на прымусовыя работы. Пасля заканчэння Мінскага мастацкага вучылішча працаваў у друкарні імя Сталіна. З 1960 года з’яўляўся мастацкім рэдактарам выдавецтва “Ураджай”, а з 1967 года стаў працаваць на Мастацкім камбінаце. Барздыка Павел Фёдаравіч з’яўляецца лаўрэатам рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных конкурсаў і выставак “Мастацтва кнігі”.





У гэтай жа сям’і 14 студзеня 1944 года нарадзіўся

беларускі графік Барздыка Міхаіл Фёдаравіч. У 1973 годзе скончыў Мінскі мастацкі інстытут і адразу стаў выкладаць у ім. З 1975 года супрацоўнічае з беларускімі выдавецтвамі. Творчасць Міхаіла Фёдаравіча адметная спалучэннем філасофскага разумення жыцця і лірычнай інтэрпрэтацыі. Яго творы адзначаны сярэбраным медалём на 22-м міжнародным салоне ў Бельгіі ў 1992 годзе і залатым медалём Еўрапейскай Акадэміі Мастацтваў у 1993 годзе.

Гэта зямля дала Беларусі яшчэ аднаго знакамітага чалавека. 17 красавіка 1942 года ў Шклянцах нарадзіўся беларускі паэт і журналіст



Эдуард Іосіфавіч Зубрыцкі. У 1968 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў настаўнікам у Чашніцкім і Верхнядзвінскім раёнах. З 1971 года з'уляўся супрацоўнікам рэдакцыі верхнядзвінскай раённай газеты "Дзвінская праўда". Першыя вершы Эдуард Іосіфавіч надрукаваў у 1960 годзе ў часопісе "Маладосць". З гэтага часу яго творы пачалі з'яўляцца таксама ў часопісах "Полымя", "Беларусь", "Работніца і сялянка", рэспубліканскіх і абласных газетах, змяшчаліся ў альманахах "Дзень паэзіі", "Універсітэт паэтычны", "Квадра", "Віцебшчына літаратурная", іншых калектыўных зборніках. У 1968 годзе ён напісаў аповесць "Суэма", а ў 1993 годзе паэмыу "Жальба Сар'янскай пушчы". У 1975 годзе выйшаў зборнік яго вершаў і паэм "Блакітныя казкі". Незадоўга да яго смерці ў 2008 годзе, у свет выйшаў яго апошні зборнік вершаў.

# Шылькі

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*

**ВЕСАЧКА КВЕТКА**
Родныя Шылькі
Бачу здалек.
Быццам балотца
Глядзіць васілек.
Ціха галоўку
Схіліў да зямлі
І просіць зямельку:
"Мяне абдымі."
Весачцы-кветцы
Шэпча Зямля:
"Абдымаю я, маці твая.
Абдымаю цябе я
Ласкава і ціха,
Каб ніколі ў жыцці
Ты не ведала ліха."

*Лілія Літвін*

Раней Шылькі размяшчаліся каля самага балота. У 1905 годзе вёска ўваходзіла ў Валкалацкую воласць Вілейскага павета. На той час тут пражывалі 223 чалавекі.

У 1914 годзе пры адступленні Пілсудскага амаль усе пабудовы вёскі былі разабраны на бярвенні, з якіх быў пабудаваны накат – шлях праз балота з Шылек на Курдзекі. А ў 1920 годзе гэты накат спалілі. Вёска, там, дзе цяпер яна знаходзіцца, пачала будавацца ў 1916 годзе. Багацейшымі лічыліся тыя людзі, хто меў больш зямлі. Тыя, хто не меў сваёй зямлі, наймаліся на працу да багатых у іншыя вёскі.

Пры памешчыку ў Шыльках быў выкапаны калодзеж і зроблены дыхтоўны зруб. Вадой гэтага калодзежа карысталася многа людзей. З цягам часу калодзеж асунуўся, зарос, засыпаўся зямлёй, пра яго і забыліся. І калі вайной па вуліцы праехала артылерыя, прайшлі машыны, магчыма, нешта ў зямлі зрушылася, і з таго месца, дзе быў калодзеж, прабіўся фантан вады. Жыхары пачалі раскопваць гэта месца і ўбачылі, што зруб дубовы захаваўся, як новы. Жыхары зноў сталі карыстацца вадой з гэтага калодзежа.

З 1921 года па 1939 год Шылькі знаходзіліся ў складзе Польшчы. Адразу пасля вызвалення ў 1939 годзе з Шылькамі злілася суседняя вёска Кімстачова. У 1950-ыя гады ў Шыльках быў арганізаваны калгас “Перамога”. Зараз у вёсцы налічваецца 36 двароў і пражываюць каля 80 жыхароў.

# Юркаўшчына

*Вёска ў Параф'янаўскім сельскім Савеце*

Назва вёскі пайшла ад імя Юра. Тут некалі жыў пан Юра і быў яго маёнтак. Гэты пан быў вельмі добры. Ён справядліва адносіўся да людзей. Калі на гэту тэрыторыю прыходзілі іншаземныя захопнікі, то Юра станавіўся на абарону сялян. У гонар гэтага пана і была названа вёска.

У 1905 годзе ў Юркаўшчыне пражывала толькі 59 чалавек. З 1921 года па 1939 год вёска знаходзілася ў складзе Польшчы. Потым з 12 кастрычніка 1940 года па 16 ліпеня 1954 года Юркаўшчына была цэнтрам сельскага Савета. У 1944 годзе тут адкрыта пачатковая школа. У 1950 годзе ў школе вучылася 160 дзяцей.

У 1949 годзе тут арганізаваны калгас імя Чапаева, які потым быў пераіменаваны ў калгас "Прагрэс". А ў 1966 годзе, каля клуба, на ўшанаванне памяці 5 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены абеліск.



У 1968 годзе ў Юркаўшчыну перасяліліся жыхары з хутароў Глушка, а ў 1977 годзе – Забор'е. Зараз у вёсцы пражывае каля 140 чалавек. Дзесьці ў 2004-05 гадах была зачынена мясцовая базавая школа, урачыстае адкрыццё якой адбылося зусім нядаўна – у 1970 годзе.

Каля Юркаўшчыны, паблізу ад дарогі, можна знайсці рэшткі старадаўняга могільніка з каменнымі крыжамі.

# Юхнаўка

*Вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце*

На месцы, дзе зараз стаіць вёска, прыехаў некалі адзін чалавек дужы, высокі, а такі прыгожы, ну як у казцы. І пачаў ён зямлю тую апрацоўваць: раскарчаваў невялікі кавалачак, пазнасіў каменне, узараў ды кінуў зерне. Такое добрае жыта ўрадзіла.відаць добрая, урадлівая была тая зямля. Неяк патрапіў у тыя мясціны вандроўнік. Падзівіўся ён сіле, спрыту ды працавітасці чалавека і пытае:

- Хто ж ты будзеш такі, чалавеча?

- Прозвішча маё – Юхнавец. Зямля, - кажа, - тут вельмі ж добрая, хай бы людзі ішлі і працавалі на ёй. Раскажы ты, дзядуля, пра гэтае месца людзям. Вось толькі як называецца яно не ведаю!

- Ну, калі ты першы тут з’явіўся, то і назавём – Юхнаўка.

*Старажытныя легенды вельмі цесна і своеасабліва пераплятаюцца са святамі, якія маюць карані яшчэ ў язычніцкай, дахрысціянскай традыцыйнай абраднасці і міфалогіі мясцовага насельніцтва.*

*Вучоныя-этнографы лічаць, што татэмнай жывелай насельніцтва быў мядзведзь, і ўшаноўванню яго былі прысвечаны многія абрады і звычаі.*

*Адзін з такіх абрадаў апісаў святар Бягомльскай царквы Пётр Васюковіч. Гэтае апісанне было апублікавана ў штогадовым выданні “Апісанне царквы і прыходаў Мінскай губерні”, якое выходзіла ў канцы XIX-пачатку XX стагодзяў.*

*Там гаворыцца, што “камаедзіца” святкуецца ў гонар мядзведзя, ўстаноўленага дзеля таго, каб ён не з’еў каго-небудзь, калі людзі летам будуць хадзіць у лес за лыкам, ягадамі, грыбамі, арэхамі.*

*Жанчыны звычайна ў гэты дзень жартаўліва пужалі адна другую: “Ой, не прадзі сёння, кума, бо мядзведзь задзерыць, як пойдзеш у лес улетку па грыбы!”*

*Між тым рыхтуецца абед, які складаецца з варанага бацвіння ад рэпы, засушанай з лета бручкі. Такое блюда гатуецца дзеля таго, каб паказаць, што мядзведзь можа харчавацца раслінна ежай. Рыхтуецца і другое блюда – “камы”, ад якога свята і атрымала назву “камаедзіца”. “Камы” гатуюцца з паранага гароху, і ўся сям’я наядаецца гэтым досыта.*

*Пасля яды ўсе кладуцца спаць і, штохвілінна, пераварочваюцца на бок, равуць і рыкаюць па-мядзвежы, каб нагадаць гэтым ровам і рыканнем мядзведзя, які ляжыць у бярлозе.*

*Нарэшце, усе ўстаюць і разыходзяцца, што значыць наступнае: мядзведзь устаў ужо са сваёй бярлогі і ходзіць па лесе. На думку мясцовых сялян, мядзведзь на Дабравешчанне абуджаецца ад спячкі, вось чаму і сваю “камаедзіцу” яны святкуюць перад гэтым днём, каб праз тое сустрэць*

*мядзведзя ў добрым гумары.Асабліва захоўваюць гэта свята жыхары вёскі Ваўча, якая акружана дрымучымі лясамі, дзе водзіцца мноства мядзведзяў, якія наносяць значную шкоду, вынішчаюць цэлыя палі, асабліва гароху, а таксама даволі часта забіваюць скаціну і людзей.*

*У 90-х гадах, бываючы па справах у той жа Ваўчы, я распытваў людзей пра мясцовыя звычаі і традыцыі, але нават бабулі, што памятаюць усё ледзь не ад "француза", пра "камаедзіцу" не ўспаміналі.*

*Ускосным доказам татэмнага характару ўшанавання мядзведзя з'яўляецца назва вялікага валуна недалёка ад вескі Юхнаўка – "Мядзведзь-камень". Да нядаўняга часу існавала традыцыя "карміць" "Мядзведзьку." Каля яго, звычайна, высыпалі жменьку ягад пры першым выхадзе за ягадамі, і цікава было пазіраць, як суніцы змяняюцца чарніцамі, чарніцы – брусніцамі, а то і грыбамі.*



*Гэта камлыга буйназярністага граніту знаходзіцца за 500 метраў на паўднёвы захад ад Юхнаўкі ў лесе ля дарогі на паката-хвалістай флювіягляцыйнай раўніне (побач з лініяй электраперадач). Даўжыня каменя складае 3,7 метра, шырыня 2,4 метра, а бачная вышыня над паверхняй зямлі 2,2 метра. Абрыс камлыгі ўяўляе сабою трапецыяпадобны блок, які звужаецца наверсе і мае моцна згладжаныя вуглы. Яго форма вельмі нагадвае мядзведзя, што салодка спіць у лясным гушчары. Паводле аднаго падання, гэта акамянелы мядзведзь. Іншыя ж паданні гавораць, што пад каменем закапалі золата, і зрабілі гэта французы ў 1812 годзе. Сёння вядомыя яшчэ толькі два камяні з назвай Мядзведзь: у Сенненскім (вёска Пушкары) і ў Крупскім (вёска Знаменка) раёнах.*

*Шкада, што зараз мясцовыя людзі ў бок "Мядзведзь-каменя" па ягады амаль не ходзяць, а "варагі" не звяртаюць на яго аніякай увагі. "Мядзведзька" амаль галодны. Можа, з-за таго і ягад у лясах ля Юхнаўкі стала менш? Калісьці школьнікі Юхнаўскай тады яшчэ школы наладжвалі сюды экскурсіі. Нават верш Людміла Нікалаева (зараз, дарэчы, аспірантка БДУ па спецыяльнасці "Гісторыя Беларусі") напісала:*

*"Ёсць ля Юхнаўкі камень – Мядзведзь.*
*Мы ўсім класам хадзілі глядзець.*
*Як нам юхнаўскі Саўка сказаў,*
*Француз золата тут закапаў!"*

*Гэта легенда пра "французскае золата" суправаджае амаль кожны гістарычны помнік раена (Варганскую гару, "Замак", "Талерку", крыж Баторыя і нават Сцёп-камень. Як і фантазіі пра горы, насыпаныя "шапкамі" салдатамі ці то ПятраI, ці то Карла XII, ці Напалеона. Сумна тое, што сапраўдных носьбітаў народных легенд становіцца ўсё менш і менш.*

Матэрыялы падрыхтаваны таварыствам “Спадчына” пры музеі імя І.С. Палявога – кіраўнік Грабоўскі Д.І.

Што датычыцца сучаснай гісторыі вёскі, то ў пачатку XX стагоддзя Юхнаўка з’яўлялася засценкам у Бягомльскай воласці Барысаўскага павета. На той час тут налічвалася 53 двары і пражывала 270 жыхароў.

У 1913 годзе ў Юхнаўцы адчыняецца народная школа. Першай настаўніцай са спецыяльнай педагагічнай адукацыяй была Алена Ігнацьеўна Прэцібор. Школу наведвалі дзеці з вёсак Будзілаўка і Мількунь. Галоўны прадмет у школе да 1922 года быў Закон Божы.

У пачатку 1930-х гадоў тут стварaліся калгасы “Чырвоны сцяг”, “Зара сацыялізму”, імя Варашылава, імя Дзяржынскага, працавала кузня.

У маі 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі “Коттбус” нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 15 чалавек. А ў жніўні 1943 года партызаны брыгады “Жалязняк” разграмілі мясцовы гітлераўскі гарнізон. А адбывалася гэта так: “...Пасля “афіцыйнага” завяршэння карнай аперацыі “Коттбус” партызанская брыгада “Жалязняк” паставіла перад сабой задачу пакончыць з 1-й рускай нацыянальнай брыгадай пад камандаваннем У.У. Гіль-Радыёнава. Гэта брыгада дзейнічала ў паласе дарогі Докшыцы – Лепель і займала плацдарм на рацэ Поня, уключаючы вёскі Юхнаўка, Бераснёўка, Беразіно.

У Юхнаўцы дыслацараваўся батальён маёра Фефалава, які вельмі часта рабіў вылазкі ў бок райцэнтра. А сам маёр пагражаў адпомсціць партызанам за пераход на іх бок яго кулямётнай роты. Але партызаны не сталі чакаць пераходу на іх бок астатніх і ў ноч на 13 жніўня 1943 года поўнасцю знішчылі фефалаўскі батальён. Амаль сотня трапіла ў палон, 17 забілі. З боку партызан у баі загінулі трое.

Лёгкай перамога атрымалася таму, што сярод партызан шмат было мясцовых, якія здолелі правесці ўдалую разведку. Пра тую ноч успамінае Настасся Юльянаўна Юхнавец 1916 года нараджэння, найстарэйшая жыхарка Юхнаўкі “...Я жыла адна з маленькім сынам. Магчыма, таму ў мяне спыніўся галоўны афіцэр з дзяншчыкам Мікалаем. Можа гэта і быў сам Фефалаў, я не ведаю. Ён быў не вельмі добры, а Мікалай – душа-чалавек. Часта прыходзілі і другія афіцэры, елі, пілі гарэлку, але пры гэтым заўсёды частавалі майго маленькага сына хлебам з маслам.

Той ноччу прачнулася ад стрэлаў з боку могілак. Забегла ў хату (спала на гарышчы), а там мой пастаялец выскоквае ў вакно. Павярнуўся да мяне, ашчэрыўся і крычыць: “Падай ракетніцу”, а адкуль жа я ведаю, дзе яна? Нешта падала, падобнае на пісталет, ён мацюгнуўся і выскачыў на вуліцу. Страляніна была нядоўга. Хутка па вуліцы пабеглі партызаны. Сабралі забітых радзівонаўцаў у адно месца. Іх многа паклаў Іван Герасімёнак, забегшы ў сваю хату, якая знаходзілася ў супрацілеглым баку ад могілак, адкуль і наступалі партызаны.

Дабаўляе былы партызан Іван Яфімавіч Пярэдня: “...Забітых радзівонаўцаў тады пахавалі ў адной магіле на ўскрайку мясцовых могілак,

без высвятлення іх прозвішчаў. Праз некалькі дзесяцігоддзяў мясцовыя жанчыны Ніна Харытонаўна Юхнавец і Надзея Мікітаўна Мароз з сынам адшукалі гэта месца, упарадкавалі і прымацавалі шыльду “Ахвярам вайны 1941 – 45 гадоў”.

У выніку паспяхова праведзенай аперацыі народныя мсціўцы захапілі радыёстанцыю, гармату, 6 станковых кулямётаў, 78 вінтовак, 47 тысяч патронаў.

З ваенных гадоў можна ўспомніць і яшчэ адзін эпізод. 24 лютага 1944 года гітлераўцы колькасцю 150 чалавек зрабілі спробу пераправіцца праз раку Поня ў раёне вёскі Юхнаўка. Аднак у выніку бою з 1-м атрадам брыгады “Жалязняк” былі вымушаны адыйсці. Пры гэтым было забіта 3 і паранена 7 нямецкіх салдат і афіцэраў. Страты атрада: забіты Шаркевіч і паранены Кулік.



З 20 верасня 1960 года па 18 лютага 1964 года Юхнаўка з’яўлялася цэнтрам сельскага Савета. У 1964 годзе ў гонар аперацыі партызан па разгрому гітлераўскага гарнізона пастаўлена стэла. Яна знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, каля дарогі Докшыцы – Бягомль.

Зараз ў вёсцы пражывае каля 100 чалавек.

# Янкі

*Вёска ў Докшыцкім сельскім Савеце*

Адзіны хутар тут стаяў калісьці,
Уздоўж дарога – поле і лясы.
А зараз вёска, дзе гамоніць звонка
Вясёлы смех вясковай дзетвары.
Прайшло нямала год з тае гадзіны,
Калі адзіны гаспадар тут жыў.
А звалі яго Янка – так хрысцілі,
Адсюль і назва вёскі – Янкі мы.
Расла сям'я і прыбаўлялась люду:
Унукі, дзеці. Некалі марнець
Тут больш з'явілася народу,
І вёска стала прыгажэць.
Суровы гул вайны Айчыннай
Пранёсся чорнай птушкай і над ёй.
І помнік, што ў парку, векапомны
Напамінае мёртвым пра жывых.
Як кожны беларус, куточак мілы
Не прамяняю я ні на дары,
Ні на заморскія краіны –
Мілей і даражэй мне толькі ты.
Расці і прыгажэй, мой край любімы!
Няма мілей нічога хараства,
Як выйдзеш у поле ранняю вясною
І чуеш трэлі заліўныя салаўя.
Мой кут любімы, родная старонка,
Квітней і багацей ты з году ў год.
Няхай усходзіць сонца ясна ўранку,
Жыві ў міры, шчасці, мой народ.

*Наталля Парцянка*

Упершыню згадваецца ў 1615 годзе.

Паводле легенды назва вёскі паходзіць ад імя першага жыхара Янкі. Ён шмат дзе пабываў, шмат чаго пабачыў, і спыніўся ў гэтай мясціне таму, што яна вельмі яму спадабалася. Быў ён вясёлы, разумны ды спагадлівы, кожнаму дапамагаў ці парадай, ці справай або проста расказваў нешта цікавае. Спыняліся каля хаты праезджыя, гутарылі з Янкам і вырашалі пасяліцца каля гэткага мудрага і вясёлага чалавека. Праз некаторы час ужо цэлая вёска ўзнікла, і ўсе любілі збірацца ў Янкі, каб паслухаць аб тым, дзе ён пабываў, што цікавае бачыў у свеце. А яшчэ ў кожным пакаленні гэтага Янкі нараджаліся хлопцы. Першага з іх называлі Янкам, і былі яны вельмі падобныя на свайго продка весялосцю, розумам і спагадай. Спачатку і вёска называлася Янкі (з націскам на першым складзе), а з цягам часу націск перайшоў на апошні склад.

Па архіўных дадзеных Барысаўскага павета за 1847 год вёска Янкі ў 1837 годзе знаходзілася ва ўладанні Глыбоцкіх кармелітаў. У 1914 годзе амаль ўся вёска згарэла. У пачатку 20 стагоддзя вёска Докшыцкай воласці Барысаўскага павета.

Лаўрыновіч Еўдакія Сцяпанаўна і Каляга Ніна Іванаўна ўспамінаюць пра пана Арскага, які жыў у вёсцы ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Ён быў павятовым суддзёй пры Барысаўскім павеце.

Янкаўская базавая школа-сад мае цікавую гісторыю. Яшчэ ў 1910 годзе ў вёсцы было адкрыта чатырохкласнае народнае вучылішча, якое

размясцілася ў асабістай хаце селяніна Лабынька Валер'яна. Займалася ў ім 40 вучняў з навакольных вёсак. Заняткі праходзілі ў дзве змены.

У 1913 годзе быў пабудаваны цагляны будынак школы. Навучанне вялося на польскай мове. Першым настаўнікам у вёсцы быў Тумашэвіч. У гэтым будынку школа размяшчалася да 1944 года. Нават у час вайны ў школе праходзілі заняткі. У 1944 годзе пры адступленні немцы спалілі школу і амаль усю вёску.

Пасля вызвалення Докшыцкага раёна ў 1944 годзе школа размясцілася на былой панскай сядзібе непадалёку ад вёскі. Гэта была чатырохкласная пачатковая школа, вучылася ў ёй у той час 60 вучняў.

У 1950 годзе школа стала сямігодкай, класы размясціліся ў трох будынках. У 1954 годзе ў школе налічвалася ўжо 168 вучняў, заняткі вяліся ў дзве змены, пачатковыя класы былі аб'яднаныя (1 і 3, 2 і 4). У 1959 – 1960 гадах пабудавалі яшчэ адзін класны пакой і майстэрню, пачала працаваць сталовая.



А 25 верасня 1993 года адчыніла дзверы новая школа. У 1994 годзе наша школа была аб'яднана з дзіцячым садам у адзіны комплекс. 13 мая 2005 года школа-сад зарэгістравана як установа адукацыі "Янкаўская дзяржаўная агульнаадукацыйная базавая школа-сад Докшыцкага раёна"

Да верасня 1939 года вёска, як і ўся Заходняя Беларусь, уваходзіла у склад Польшчы. У 1940 годзе ў вёсцы створаны сельсавет.

1 ліпеня 1944 года вёска была спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Адноўлена пасля вайны. Цікава, што да дня вызвалення Янкі не пратрымаліся ўсяго адзін дзень. Як вядома, Докшыцы былі вызвалены 2



ліпеня 1944 года. У 1949 годзе вёска стала цэнтрам калгаса імя Суворава.

У 1950-ых гадах была пабудавана сучасная дарога каля Янкоў на Бягомль. Раней на гэтым месцы рос лес.

За 300 метраў на поўдзень ад вёскі на ўшанаванне памяці 26 землякоў – воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1971 годзе пастаўлены помнік – двухфігурная скульптурная кампазіцыя; на пастаменце – дошка з імёнамі загінуўшых.



Па дадзеным Докшыцкага сельскага Савета на 1 снежня 2007 года ў вёсцы налічвалася 108 двароў і 301 жыхар.

Янкі сталі радзімай для многіх знакамітых людзей нашай Бацькаўшчыны. Адзін з іх Стадольнік Іван Канстанцінавіч – беларускі празаік і паэт. Нарадзіўся Іван

Канстанцінавіч 12 верасня 1940 года. У 1945 годзе яго бацька памёр на фронце пры штурме Кёнігсберга. А маці жыла ў роднай вёсцы і працавала ў калгасе. У 1947 годзе Іван пайшоў у першы клас Янкаўскай пачатковай школы, але правучыўся толькі да зімы, бо не было абутку і не хапала гадоў. Пасля заканчэння ў 1959 годзе Докшыцкай сярэдняй школы спачатку працаваў у мясцовым калгасе імя Суворава, а потым качагарам на цаліне ў Какчатаўскай вобласці. Вярнуўшыся адтуль, зноў працаваў у калгасе, потым бібліятэкарам у Бярозаўцы. У 1960 годзе паступіў на зубаўрачэбнае аддзяленне Полацкага медвучылішча, якое скончыў у 1963 годзе. Да 1967 года быў зубным урачом і выконваў абавязкі галоўнага ўрача Мосарскай сельскай бальніцы Глыбоцкага раёна. Адначасова з 1965 года па 1971 год вучыўся завочна на факультэце журналістыкі БДУ. З 1967 года па 1971 год з'яўляўся адказным сакратаром, а потым загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі полацкай аб'яднанай газеты "Сцяг камунізму". Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1980 года. З гэтага ж года становіцца рэдактарам аддзела літаратуры, а з 1984 года – адказным сакратаром часопіса "Вожык". З 1991 года працуе адказным сакратаром часопіса "Тэатральная Беларусь".

Асобныя яго творы перакладзены на літоўскую, рускую, украінскую, армянскую і іншыя мовы. Песні на вершы Івана Стадольніка напісалі Дзмітрый Лукас, М. Пятрэнка. Стадольнік з'яўляецца аўтарам шматлікіх вершаваных подпісаў пад агітплакатамі. Жыве ў Мінску. Вось адзін з расказаў Івана Стадольніка пад назвай "Здраднікі".

"Перад самай Петрусёвай вёскай на скрыжаванні двух гасцінцаў Бярэзінскага і Камайскага – помнік загінуўшым у гэту вайну землякам. Помнік стандартны. Бетонны баец з аўтаматам і схіленай у жалобе галавой. На п'едэстале – прозвішчы і імёны франтавікоў і партызан з ягонай вёскі і суседніх. Сярод шматлікіх прозвішчаў прозвішча і Петрусёвага бацькі, які роўна за месяц да Перамогі склаў галаву пры штурме Кёнігзберга. Якраз на супраць помніка былыя соткі Петрусёвай маці. І пакуль жыла маці, ён па некалькі разоў на гаду прыязджаў убраць іх. І кожны раз падыходзіў да помніка, чытаў прозвішчы, і заўсёды было такое адчуванне, што бачыць гэтыя прозвішчы тут упершыню. Цяпер прыязджае радзей.

Спачатку, як і некалі, ідзе да помніка, колькі часу моўчкі стаіць перад ім, па некалькі разоў прачытвае прозвішчы, і калі душа напоўніцца нейкай незразумелай яму важкасцю, ідзе на магільнік да маці і як бы нясе ёй часцінку бацькавай душы.

Вось прыехаў і цяпер. Але на гэты раз каля помніка быў згорблены, ссівелы чалавек з ордэнскімі планкамі на цёмна-шэрым пінжаку. А ля агароджы стаяў чырвоны "Масквіч". Чалавек сядзеў на адной з паламаных лавак і глядзеў на вёску, якая за апошнія дваццаць гадоў ператварылася ў самы сучасны пасёлак з цаглянымі дамамі. І каб не родная састарэлая хата і некалькі суседскіх, Пятрусь ніколі б не пазнаў сваю вёску.

Чалавек яўна ўзрадаваўся Петрусёваму прыходу і піскляватым, старэчым голасам як бы праспяваў:

- Скажыце, вы тутэйшы?

- Тутэйшы, - адказаў Пятрусь.

Чалавек паказаў рукой убок мураванак, якія падступілі да самага гасцінца і паўз яго дабіраліся да суседняй вёскі Козікі, і зноў спытаў:

- А гэта вёска Янкі?
- Янкі.

Дзядок, неяк крыва ўсміхнуўшыся, працягваў:

- Ай-яй-яй, як усё перамянілася. Кругом жа некалі лясы былі. А цяпер во на ўказальніку прачытаў – і вачам сваім не паверыў. Усе вёскі кругом, як на далоні. А Нябышына не відаць адсюль.
- Не, не відаць, - адказаў Пятрусь і запытаўся: - А што, вы з тутэйшых мясцін?

- Не. Ваяваў тут. Партызаніў. Дык з-за гэтых вашых Янкоў і Нябышына мяне ледзь двойчы не расстралялі свае. Колькі мая падрыўная група ні ставіла тут мінаў, ніводная не ўзарвалася. Мяне ледзь у правакатары не залічылі. Але абышлося.

Мужчына не па гадах жвава падхапіўся і пашыбаваў да помніка. Тыцнуўшы пальцам у тое месца, дзе было напісана "Лабынька Фёдар Данілавіч", запытаўся:

- А гэты з Янкоў'?
- З Янкоў.
- Ён у маёй групе быў. Прапаў без вестак.
- Не, не прапаў, - удакладніў Пятрусь, - за дзень да вызвалення ён трапіў у палон да літоўскіх ці латышскіх легіянераў, і яны яго закатавалі. Бацька ноччу забраў і пахаваў тут, на мясцовых могілках.

У мужчыны раптоўна зайгралі на паморшчаных, але здарова-чырвоных шчочках жаўлакі і ён тыцнуў пальцам у прозвішча.

- Здраднікі! Усе вашы янкоўцы здраднікі. Я потым дачуўся, што яны паказвалі немцам, дзе мы ставім міны. Шкада, што позна дачуўся. А то б іх перакасіў з аўтамата. І праклятыя Янкі спаліў бы ўшчэнт.

Чалавек казаў праўду. Петрусю старэйшыя расказвалі, што за год да вызвалення камендант Докшыц выдаў такі загад: калі бліжэй за кіламетр ад любой вёскі падарвецца на міне хоць адна машына ці фургонка, ці будзе забіты хоць адзін салдат, веска пойдзе дымам разам з людзьмі, як бандыцкая. Вось тады, каб уратаваць вёску, мужчыны па начах пачалі дзяжурыць ля гасцінца ў спецыяльна замаскіраваных схованках. А Федзя, знаходзячыся ў групе падрыўнікоў, забягаючы на хвілінку дамоў, паведамляў баньку, калі і дзе пастаўлена міна.

Ранічкай едуць на машынах ці на фурманках немцы. Мужчыны спыняюць іх і паведамляюць:

- Пан, там міна.

-О, гут-гут. Данке! Хлопаюць па плячы, частуюць цыгарэтамі, цукеркамі. Мінёры размініраваюць дарогу, і машыны едуць далей. Такое рабілі не толькі жыхары Янкоў, але і Дубавога, і Козік, з жахам назіраючы, як недалёка гарэць вёскі. Значыць, ля іх спрацавалі міны.

Козікі і Дубавое ўцалелі аж да вызвалення. Не пашанцавала голькі Янкам. І, казалі, стаў віной таму той жа Федзя, які рызыкаваў у імя яе сваім жыццём.

Калі яго схапілі легіянеры, доўга катавалі, павыколвалі ночы, паадразалі вушы, ён, не вытрываўшы катаванняў, сказаў, што родам з Янкоў. Адступаючы, вылюдкі і спалілі ўшчэнт усю вёску. Праўда, без людзей.

Петруся вельмі зацікавіў гэты чалавек. Ён шмат чуў гісторый і пра Шунеўку, і пра Дабрунь, і пра іншыя спалёныя вёскі. Пра гэта хадзілі розныя чуткі. А тут – жывая гісторыя.

- Вы ж ведалі пра загад каменданта, - спытаў і прысеў побач са старым Пятрусь.
- Ведалі. Але калі спаляць немцы ці паліцаі вёску, вядома, чым аддзячаць ім людзі.

Пра Нябышына Пятрусь чуў вельмі мала. Яно далекавата ад Янкоў. Кіламетраў пяць ці болей. Нехта расказаў, што вёска ўцалела, нават калі партызаны каля яе ўзарвалі бацюшку. Пятрусь пра гэта і запытаўся ў чалавека.

- Ну, было гэта ў пачатку лета. Ноч цёплая-цёплая. Паставілі супрацьтанкавую міну. Спічонак з Дарафеем заснулі. Я застаўся пільнаваць, каб не наехаў хто з мясцовых жыхароў. А калі пачуецца шум матора – даць знаць хлопцам, каб своечасова маглі ўцячы. Яны заснулі мёртвым сном. Віднее. Вейкі зліпаюцца, як намагнічаныя сталі, не разняць. І раптам - "Бух!" – ускочыў. Нічога не магу зразумець: усё кругом белае. Быццам зіма наступіла. На адной узбочыне паўразарваны конь адной нагой трэпае. На другой, што бліжэй да мяне, нешта круглае валяецца

Папіхнуў нагой – барадатая чалавечая галава. Паўскаквалі хлопцы. Цямім, што да чаго. Урэшце-рэшт дакумекалі, што гэта быў поп. Пакаралі мяне, канечне. Гаўптвахтай...

- А Шунеўку не па вашай міласці спалілі? - спытаў Пятрусь.
- Не, Шунеўку спалілі да нас, - як са шкадаваннем круціць галавой мужчына. – Казалі там маладая настаўніца – патрыётка ні то застрэліла, ні то абварыла кіпенем нямецкага афіцэра.
- І імя гераіні, мусіць, ніхто не ведае?

- Незразумеўшы Петрусёвай іроніі, мужчына, заківаў галавой, ці ў знак згоды, ці са шкадаваннем, і зморшчыўшыся, прыжмурыўшы левае вока, глянуў на п'едэстал помніка, працадзіў скрозь зубы:

- А гэтым пашанцавала. Бач, героямі сталі. Здраднікі няшчасныя! Даведаўся б я раней – іншае б месца ім было, іншая слава

- А вы ў гэта верьце? – нейк аўтаматычна спытаў Пятрусь. Чалавек змаўчаў. І пачаў глядзець некуды ў нікуды.

Пятрусь устаў з лаўкі. Устаў і чалавек. Не развітваючыся, яны пайшлі кожны сваёй дарогай».

Беларуская мастачка Крываблоцкая Галіна Пятроўна нарадзілася 26 ліпеня 1953 года. У 1976 годзе скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1976 года працавала на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва, а з 1993 года працуе выкладчыкам Беларускага каледжа мастацтваў. Член Беларускага саюза мастакоў з 1985 года. Працуе ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Удзельніца мастацкіх выставак з 1976 года. Стварыла разам з В.П. Маркавец-Бартлавай сцэнічныя касцюмы для вакальна-інструментальнага ансамбля ”Песняры” і фальклорна-этнаграфічнага ансамбля “Харошкі”. Адметнай з’явай на розных этапах творчага шляху мастачкі паўстае рэпрэзентатыўная мастацка-вобразная кампазіцыя. Выкананая ў розных тэхніках і матэрыялах мовай манументальна-вобразнай панарамы, яна расказвае пра нешта значнае ў жыцці і самой Галіны, і яе народа, і краіны, у якой жыве творца.



Яе творы знаходзяцца ў канферэнц-зале гасцініцы “Беларусь”, зале Рэспубліканскага інстытута экспертызы працоўнага насельніцтва, малой зале Палаца Рэспублікі, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Літаратурным музеі Я. Купалы, Музеі беларускай культуры горада Гайнаўка (Польшча), Палацы культуры горада Бярдзічаў (Украіна), у прыватных зборах у ЗША, Індыі, Германіі, Швейцарыі і іншых.

Беларуская мастачка Маркавец-Бартлава Валянціна Пятроўна нарадзілася 24 жніўня 1951 года. У 1973 годзе скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працавала ў інстытуце Белбыттэхпраект, Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва, з 1988 года працягвае працоўную дзейнасць у Беларускай акадэміі мастацтваў, а з 1992 года становіцца загадчыкам кафедры мадэліравання адзення і мастацкага ткацтва. Дацэнтам кафедры мадэліравання адзення і мастацкага ткацтва Беларускай акадэміі мастацтваў становіцца ў 1996 годзе. Член Беларускага саюза мастакоў з 1980 года. Працуе Валянціна Пятроўна ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (габелен), а таксама ў галіне распрацоўкі і мадэліравання трыкатажных вырабаў, сцэнічных касцюмаў. Удзельніца мастацкіх выставак з 1973 года. Стварыла разам з Галінай Крываблоцкай сцэнічныя касцюмы для вакальна-інструментальнага ансамбля ”Песняры” і фальклорна-этнаграфічнага ансамбля “Харошкі”.



Творы мастачкі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Літаратурным музеі Я. Купалы, Мастацкім фондзе Расіі ў Маскве, у прыватных зборах у Польшчы, Германіі, Літве, ЗША. Узнагароджана медалямі “За заслугі ў выяўленчым мастацтве” у 2001 годзе Беларускага саюза мастакоў, “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” Міністэрства культуры Беларусі ў 2002 годзе, а таксама дыпломамі Міністэрства

вышэйшай адукацыі Беларусі і спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



Беларускі мовазнавец і перкладчык Махонь Сяргей Уладзіміравіч нарадзіўся 25 чэрвеня 1961 года. Скончыў Докшыцкую сярэднюю школу ў 1978 годзе, а ў 1983 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. З 1986 года стаў выкладчыкам ў гэтай навучальнай установе. Кандыдат філалагічных навук з 1989 года, а дацэнтам стаў у 1991 годзе. Даследуе лексіку рускай мовы, вывучае беларуска-руския моўныя адносіны. Адзін з аўтараў шматлікіх падручнікаў для агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы. Перакладае мастацкую прозу з беларускай мовы на рускую. Творы ў яго перакладзе друкаваліся ў часопісах “Беларуская думка”, “Нёман”, “Юность” і другіх.



Кандыдат тэхнічных навук Мальта Уладзімір Іванавіч нарадзіўся ў 1932 годзе ў вёсцы Кучына Янкоўскага сельсавета (цяпер не існуе). Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі з 1976 года. У 1959 годзе скончыў машынабудаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. З 1956 года працаваў інжынерам-канструктарам на заводзе аўтаматычных ліній. З 1963 года па 1983 год з’яўляўся спачатку вядучым канструктарам, а потым начальнікам аддзела, намеснікам галоўнага інжынера, галоўным інжынерам навукова-вытворчага канцэрна “Планар”. Аўтар звыш 27 вынаходніцтваў, 31 навуковай працы. У 1977 годзе ўзхнагароджаны Дзяржаўная прэмія СССР за стварэнне комплекса аўтаматычнага прэцызійнага оптыка-механічнага абсталявання для мікраэлектронікі. Таксама ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Граматай Вярхоўнага Савета СССР. Памёр 6 красавіка 1983 года.

# Янукі

*Вёска ў Валкалацкім сельскім Савеце*




У пачатку ХХ стагоддзя Янукі ўваходзілі ў Валкалацкую воласць Вілейскага павета. Тут мелася 294 дзесяціны зямлі. Менавіта ў гэты час у замкнутай пабудове пачалі адбывацца змяненні ў бок свабоднага размяшчэння пабудоў (двор з незвязаннымі пабудовамі). Хутчэй распадаліся сувязі паміж будынкамі чыстага двара. У вёсцы Янукі захавалася сядзіба, якая можа быць прыкладам гэтага працэсу. Жылое звяно сядзібы складаецца з хаты, сенцаў, якія стаяць на высокім падмурку з камянёў-валуноў. Каля ганку, пад падмуркам, маецца склеп. Насупраць хаты калісьці стаяла падвойная (спараная) клець. Зараз захаваўся калодзеж-калаўрот з механізмам пад'ёму ланцуга ў выглядзе крыжавіны. За сенцамі і каморай – хлявы і прасторная паветка, пастаўленыя замкнёным трохкутнікам. У паветцы – вароты, праз якія трапляеш на дзяннік. Звяртае на сябе ўвагу ланцужок плоскіх камянёў на грэбні страхі для яго ўмацавання. Крыху ўбаку – гумно з паветкай, пад якой знаходзіўся драўляны механізм коннай малацілкі (манеж). Страха гумна зроблена з закоцвін, пакладзеных на кроквы і прымацаваных драўлянымі нагелямі.

З 1921 года па 1939 год вёска апынулася ў складзе Польшчы. З цягам часу Янукі сталі адносіць да неперспектыўных вёсак.

У 1923 годзе, ёсць звесткі, тут пражывала 140 чалавек і было 36 сяліб.



Праз Янукі праходзіла цэнтральная дарога з Мядзеля на Глыбокае. Сляды "брукаванкі" захаваліся дагэтуль.

У чэрвені 2003 года Янукі наведаў былы кіраўнік урада Украіны, а з 2009 года прэзідэнт гэтай краіны, Віктар Фёдаравіч Януковіч. У Януках некалі нарадзіўся яго прадзед. Потым Віктар Фёдаравіч яшчэ раз прыязджаў у гэту вёску.

Пад час свайго нядаўняга візіту былы прэм'ер-міністар Украіны быў засмучаны тым жахлівым станам, у якім знаходзіцца малая радзіма ўсіх Януковічаў. Цяпер у вёсцы Янукі жыве ўсяго некалькі чалавек, і разруха на бацькаўшчыне продкаў непрыемна ўразіла ўкраінскага прэм'ера.



**Июнь 2003 год. Януки.**

Візіт Віктара Януковіча адбыўся, калі ўкраінцы адзначалі гадавіну "галадамору", і магчыма гэтыя абставіны паўплывалі на яго рашэнне адрадзіць радавое паселішча.

Як паведамляе “Українська правда”, цяперашні прэм’ер-міністар Украіны плануеператварыць Янукі ў сучасны катэджны пасёлак на 300 жыхароў. Каб забяспечыць працай будучых янукоўцаў пабудуюць міні-малакозавод (племянных кароў плануюць закупіць у данецкай аграфірме “Шахцёр”), склад для марожаных ягад.


МВД СССР

Сов. секретно

Экз. № 1

Начальнику УНКВД по Сталинской обл.

полковнику госбезопасности

...

Зам. начальника УНКГБ

по Барановичской обл.,

подполковник госбе... А.Зайцев

II апреля 1945 года

Приложение: на 7 /семи/ листах.

АРХИВ МВД СССР

13

Такім чынам Януковіч збіраецца даць вёсцы другое жыццё і хоча запрасіць пасяліцца ў Януках усіх Януковічаў з Беларусі і Украіны. Па ацэнкам экспертаў рэалізацыя такога праекту можа каштаваць 5 мільёнаў долараў ЗША.

А вось і дакумент, які пацвярджае, што родзічы Януковіча былі з вёскі Янукі. У гэтым лісце гаворыцца, што бацька цяперашняга, альбо былога прэм'ер-міністра Ўкраіны, паводле зместу пададзенага дакумента, супрацоўнічаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі пад акупацыяй

Цяпер у Януках пражывае 3 чалавекі.

# Янушэва

*Крулеўшчынскі сельскі Савет*

Першыя згадкі пра Янушэва адносяцца да 1795 года. Яно ўпамінаецца ў матэрыялах рэвізіі маёнткаў як фальварак маёнтка Замошша, што належаў напачатку Зяновічам, а пазней Тадэвушу Багдановічу. Тады насельніцтва Янушэва складала ўсяго 3 чалавекі. Дзесьці паміж 1800 і 1861 гадамі Янушэва адыйшло да Рудамінаў. Да маёнтка адносілася сяло Слабада і вёска Жураўлёва з насельніцтвам 24 чалавекі. За чатыры кіламетры на поўдзень існаваў таксама фальварак Малая Янушэўка, які знік з твару зямлі дзесьці ў 1944-45 годзе.

Зрэшты, непадалёк Рудамінам належалі таксама значныя абшары зямель, які раней ўваходзілі ў склад маёнтка Глыбокае Радзівілаў. У першай палове XIX стагоддзя на гэтых абшарах паўсталі фальваркі Рудамінаў Міхнаўшчына, Гойглава і Сарокі.



Паводле ўспамінаў людзей, у XIX стагоддзі маёнтак быў даволі багаты. Тады там быў заснаваны сажалкава-паркавы комплекс, які ўключаў у сябе тры сажалкі. Меўся даволі вялікі сядзібны дом і шэраг гаспадарчых пабудоваў. Па словах старажылаў, дом згарэў дзесьці каля 1920 года. У 1929 годзе 400 дзесяцін зямлі належалі Валентыне Рудамін. У 1930 годзе ў Янушэве пражывалі 37 чалавек. Па шматлікіх успамінах старажылаў, побач з Янушэвам знаходзіўся і двор памешчыцы Соф'і Ухманскай.

Звесткі пра маёнтак Янушэва можна знайсці ў "Выніках абследвання былых памешчыцкіх маёнткаў Вілейскай вобласці", праведзенага ў 1940 годзе. Гэты дакумент паведамляе, што ў маёнтку меліся 2 кароўнікі, канюшня, свіран, некалькі жылых пабудоў. Зямлі было 400 гектараў – 200 ворнай, 100 сенакосу і 100 лесу.

У часы нямецкай акупацыі, па ўспамінах старажылаў, маёнтак стаў падсобнай гаспадаркай паравознага дэпо. Кіраваў гэтай гаспадаркай Аляксей Касцюковіч.

У савецкія часы, у адрозненне ад многіх паселішчаў, Янушэву, так бы мовіць, пашанцавала. У 1950 годзе савецкія ўлады стварылі на базе маёнтка МТС, а праз восем гадоў на яе базе быў утвораны саўгас "Докшыцкі". Гэта разам з непасрэднай блізкасцю чыгуначнай станцыі Крулеўшчына і абумовіла развіццё паселішча.

У цэнры вёскі, каля будынка канторы КУХСП "Докшыцкі", на ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у

1967 годзе пастаўлены помнік: скульптурная кампазіцыя – воін і партызан, побач – прамавугольная стэла з імёнамі загінуўшых і памятным надпісам.

У 1970-я гады Янушэва ўключана ў склад Крулеўшчыны. Аднак да нашага часу шмат дзе нават ў афіцыйных дакументах пішацца назоў “Янушэва”, ім карыстаюцца мясцовыя жыхары, а на ўездзе з боку Валодзек на дарожным знаку захаваны стары назоў. Аднак маёнтак страчаны, сажалкава-паркавы комплекс дайшоў да жахлівага стану.

# Заключэнне

Фарміраванне духоўна і маральна сталай, творчай асобы на аснове нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей; выхаванне грамадзяніна і патрыёта; выхаванне павагі да сябе, іншых людзей, да сям'і, традыцый і звычаяў беларускага народа – асноўныя накірункі выхаваўчай работы.

Без вяртання ў сваёй вучэбна-выхаваўчай рабоце да народных вытокаў, да роднай спадчыны, фальклору нельга аднавіць нацыянальную культуру, нацыянальную школу. У беларусаў засталіся два шляхі: адарвацца ад сваіх вытокаў, растварыцца ў другой нацыі або займацца адраджэннем нацыянальнай культуры. Другі шлях – цяжэйшы. Але, каб "беларусамі звацца" – гэта проста неабходна рабіць, і іншага шляху ў нас не павінна быць. Вяртанне да народа – гэта зварот да дабрыні, міру і грамадскай згоды.

У працэсе фарміравання асобы трэба адрадзіць выхаванне ў сапраўдным значэнні гэтага слова. Яно павінна абапірацца на этнапедагогіку, народны фальклор, на сапраўдныя нацыянальныя каштоўнасці, традыцыі і звычаі. Гэта дае магчымасць школьнікам спасцігнуць светапогляд і душу свайго народа, фальклорнага багацця, якія заўсёды з'яўляюцца магутным фактарам выхавання нашчадкаў.

Кожны павінен любіць тое месца, дзе нарадзіўся, дзе жыве. І любоў да родных мясцін пачынаецца з маленства, са школьных гадоў. Менавіта тады ў свядомасці юных грамадзян краіны закладваюцца асновы патрыятызму і грамадзянскасці. Таму так важна не прапусціць гэты момант і выхаваць з падрастаючага пакалення сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, якія б пачалі адчуваць сябе як неад'емную частку Бацькаўшчыны.

Свой уклад у фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў-школьнікаў уносіць найперш школа, якая з`яўляецца падмуркам рэалізацыі выхаваўчых мэт. Гэта тая прыступка, дзе ў працэсе навучання і выхавання дзіця далучаецца да багацця нацыянальнай культуры, спасцігае і асэнсоўвае свае карані, спазнае скарбонку народнай мудрасці.

Такім чынам, каб пераадолець сацыяльную абыякавасць, выхаваць у школьнікаў патрыятызм, любоў да Радзімы, грамадзянскую адказнасць за дзяржаву, каб вырасціць грамадзян, якія неабыякавыя да лёсу свайго народа, нам, настаўнікам, па-першае, трэба памятаць пра неабходнасць і першачарговую важнасць арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання; па-другое, стварыць канкрэтныя ўмовы, пры якіх яно будзе магчыма. Менавіта праз дзейнасць школьных музеяў, аб'яднанняў па інтарэсах турысцка-краязнаўчага профіля існуе магчымасць выхоўваць патрыёта і грамадзяніна не на абстрактных ідэалах, а на дакладных прыкладах, на далучэнні вучняў да гістарычнай і культурнай спадчыны. Толькі ведаючы свае карані, чалавек можа стварыць сваё светлае будучае.

Настаўнікам прапаную сабраны матэрыял, які мае практычнае значэнне для выкарыстання ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

# Змест


1. Прадмова ........................................................ 1
2. Анцыпары ........................................................ 3
3. Асавы ........................................................ 4
4. Асецішча ........................................................ 6
5. Асінавік ........................................................ 9
6. Асіннікі ........................................................ 11
7. Атрахімаўка ........................................................ 12
8. Атрубак (*Беразінскі С/С*)........................................................ 13
9. Атрубак (*Крыпульскі С/С*)........................................................ 14
10. Бабцы ........................................................ 15
11. Барсукі ........................................................ 16
12. Баяры ........................................................ 17
13. Бедзіна ........................................................ 18
14. Беразіно ........................................................ 19
15. Бераснёўка ........................................................ 26
16. Бераспонне ........................................................ 30
17. Бірулі ........................................................ 31
18. Будачы ........................................................ 36
19. Будзілаўка ........................................................ 38
20. Будзічы ........................................................ 40
21. Буй ........................................................ 42
22. Бярозаўка ........................................................ 43
23. Бярозкі ........................................................ 48
24. Валасатка ........................................................ 49
25. Валкалата ........................................................ 51
26. Валодзькі ........................................................ 59
27. Варганы ........................................................ 60
28. Варлань ........................................................ 68
29. Ваўча ........................................................ 69
30. Верацеі (*Бягомльскі П/С*) ........................................................ 72
31. Верацеі (*Крулеўшчынскі С/С*) ........................................................ 74
32. Ветахмо ........................................................ 77
33. Вецяры ........................................................ 79
34. Вешкі ........................................................ 81
35. Вешняе ........................................................ 83
36. Вілейка ........................................................ 84
37. Віржы ........................................................ 88

38. Вітунічы ........................................................ 90
39. Вознаўшчына ........................................................ 95
40. Вольберавічы ........................................................ 97
41. Вуглы ........................................................ 102
42. Вускрам’е ........................................................ 103
43. Вялікае Поле ........................................................ 104
44. Гарадзёнка ........................................................ 105
45. Гарадзішча (*Бярозкаўскі С/С*) ........................................................ 106
46. Гарадзішча (*Валкалацкі С/С*) ........................................................ 108
47. Гарэлае ........................................................ 110
48. Гліннае ........................................................ 111
49. Гняздзілава ........................................................ 113
50. Горнава ........................................................ 123
51. Грабучае ........................................................ 124
52. Грабяні ........................................................ 126
53. Дабрунь ........................................................ 127
54. Далёкае ........................................................ 130
55. Дамашкавічы ........................................................ 133
56. Дармантова ........................................................ 135
57. Двор-Порплішча ........................................................ 136
58. Дзедзіна ........................................................ 138
59. Дзядкі ........................................................ 142
60. Дубавое ........................................................ 143
61. Жамойск ........................................................ 144
62. Заальхоўе ........................................................ 145
63. Забар’е ........................................................ 146
64. Заборцы ........................................................ 147
65. Загалаўе ........................................................ 149
66. Загацце ........................................................ 150
67. Заляддзе ........................................................ 151
68. Замасточча ........................................................ 152
69. Замошша (*Беразінскі С/С*)........................................................ 154
70. Замошша (*Валкалацкі С/С*) ........................................................ 155
71. Запалле ........................................................ 158
72. Зарачыцк ........................................................ 160
73. Кадлубішча ........................................................ 161
74. Казлы ........................................................ 162
75. Кальнік ........................................................ 163
76. Калягі ........................................................ 166

| | | |
|---|---|---|
| 77. | Камайск ……………………………………………………. | 167 |
| 78. | Караліно ……………………………………………………. | 170 |
| 79. | Кемешаўцы …………………………………………………. | 171 |
| 80. | Кіякова ……………………………………………………... | 172 |
| 81. | Клінікі ……………………………………………………… | 175 |
| 82. | Кляпіцы ……………………………………………………. | 176 |
| 83. | Козікі ………………………………………………………... | 177 |
| 84. | Краснікі ……………………………………………………... | 178 |
| 85. | Кромавічы …………………………………………………... | 184 |
| 86. | Крыпулі ……………………………………………………... | 187 |
| 87. | Курдзекі ……………………………………………………. | 189 |
| 88. | Лапліна ……………………………………………………... | 190 |
| 89. | Лапуты ………………………………………………………. | 191 |
| 90. | Лібараўшчына ……………………………………………. | 192 |
| 91. | Ліпаўкі ……………………………………………………… | 193 |
| 92. | Ліпск ………………………………………………………... | 194 |
| 93. | Літоўцы ……………………………………………………. | 197 |
| 94. | Лусцічы ……………………………………………………... | 198 |
| 95. | Маладзеева ………………………………………………… | 199 |
| 96. | Малажане …………………………………………………... | 202 |
| 97. | Маргавіца …………………………………………………... | 204 |
| 98. | Мацееўцы (*Бярозкаўскі С/С*)……………………………….. | 210 |
| 99. | Мацееўцы (*Крыпульскі С/С*)……………………………….. | 211 |
| 100. | Мількунь …………………………………………………… | 212 |
| 101. | Навасёлкі Кемешаўскія ………………………………… | 215 |
| 102. | Несцераўшчына …………………………………………. | 216 |
| 103. | Новае Запонне ……………………………………………... | 218 |
| 104. | Новая Вёска ………………………………………………... | 220 |
| 105. | Новая Вілейка ……………………………………………. | 225 |
| 106. | Нябышына ………………………………………………… | 226 |
| 107. | Параф’янава ………………………………………………... | 230 |
| 108. | Парэчча ……………………………………………………... | 242 |
| 109. | Пасекі ………………………………………………………. | 244 |
| 110. | Пералоі ……………………………………………………... | 245 |
| 111. | Першамайск ………………………………………………... | 246 |
| 112. | Плiскі ………………………………………………………. | 247 |
| 113. | Плітніца …………………………………………………… | 248 |
| 114. | Порплішча ………………………………………………… | 249 |
| 115. | Пруднікі …………………………………………………… | 258 |

116. Пугачова ........................................................ 259
117. Пустаселле ........................................................ 260
118. Ракітаўшчына ........................................................ 263
119. Рапяхі ........................................................ 264
120. Рачныя ........................................................ 265
121. Сасновая (Сасноўка) ........................................................ 266
122. Свіркі ........................................................ 268
123. Сітцы ........................................................ 270
124. Скураты ........................................................ 284
125. Слабада (*Бярэзінскі С/С*) ........................................................ 285
126. Слабада (*Крулеўшчынскі С/С*) ........................................................ 286
127. Станіслаўцы ........................................................ 289
128. Стараселле ........................................................ 292
129. Старое Запонне ........................................................ 294
130. Старына ........................................................ 296
131. Сценка ........................................................ 297
132. Таргуны ........................................................ 298
133. Таўшчы ........................................................ 303
134. Трасцяніца ........................................................ 304
135. Тумілавічы ........................................................ 305
136. Туркі ........................................................ 310
137. Угольцы ........................................................ 312
138. Улессе ........................................................ 314
139. Федаркі ........................................................ 316
140. Хмялеўшчына ........................................................ 317
141. Целяшы ........................................................ 319
142. Чаркасы ........................................................ 320
143. Чарніца 1 і 2 ........................................................ 322
144. Чарнічка 1,2,3,4 ........................................................ 324
145. Чачукі ........................................................ 325
146. Чырвонае Беразіно ........................................................ 326
147. Чысці Вардамскія ........................................................ 327
148. Чысці Мільчанскія ........................................................ 329
149. Шалагіры ........................................................ 331
150. Шалашы ........................................................ 332
151. Шантараўшчына ........................................................ 333
152. Шклянцы ........................................................ 334
153. Шылькі ........................................................ 338
154. Юркаўшчына ........................................................ 339

155. Юхнаўка ……………………………………………………………. 340
156. Янкі ……………………………………………………………… 344
157. Янукі ……………………………………………………………….. 351
158. Янушэва …………………………………………………………… 353
159. Заключэнне ………………………………………………………… 355